Міхась Стральцоў

ВЫБРАНАЕ



ПРОЗА
ПАЭЗІЯ
ЭСЭ



Міхась Стральцоў



ВЫБРАНАЕ

ПРОЗА
ПАЭЗІЯ
ЭСЭ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1987

ББК 84 Бел 7
С 83

С $\frac{4702120200-141}{М 302(03)-87}$ 110—87

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1987.

МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ — УЧОРА І ЗАЎТРА

Мы можам ужо гаварыць пра сапраўднае багацце нашай беларускай літаратуры, і не толькі на паэзію, як калісьці, але і прозу.

Але вось што адбываецца ў літаратуры, з літаратурай, калі яна раптоўна пабагацее — руская зноў жа можа быць тут павучальным прыкладам: нават цікавыя, «добротныя» пісьменнікі, творы XIX і пачатку XX стагоддзяў выцясняліся ў «запаснікі», не вытрымліваючы параўнання з больш вартымі чытачоўскай увагі, і такіх на рускім небасхіле паяўляецца ўсё больш і больш — цэлае сузор'е, галактыка! Калі ёсць Пушкін і Гогаль, ды Талстой з Дастаеўскім, ды Чэхаў з Буніным і шмат хто яшчэ, калі нават «сярэдні ўзровень» — гэта творы, якія маглі б упрыгожыць любую добра развітую літаратуру, тады проста «добротным» — А. К. Шэлеру-Міхайлаву, І. А. Салаву, А. А. Ціханаву-Лугавому, У. М. Патапенку проста ўжо не хапае месца ў нашай калектыўнай памяці. Час ад часу іх зноў выцягваюць, дастаюць з «запаснікаў» (як мы сёння): глядзіце, хіба не вартыя ўвагі? І глядзім, перачытваем: сапраўды — вартыя, каб іх ведалі, помнілі, добротныя: дай бог і нам такіх!

Аднак ёсць, ёсць у гэтай жарсткаватай працы самога часу па адбору і сартыроўцы, па параўнальнаму адбору (назавём гэта так) свая неабходнасць і справядлівасць. Гэта як бы своеасаблівая «пераатэстацыя», літаратурна-гістарычная: пакажы, дакажы, што адпавядаеш! Для нармальнага, здаровага функцыявання літаратурнага арганізма гэта во як карысна!

Нешта падобнае калі ўжо не адбываецца і ў нас, у беларусаў, дык непазбежна пачне рабіцца ў бліжэйшыя часы. Ды і цяпер, калі 20-я і 30-я гг. ужо не штучны вакуум, як было да 1956-га, а 60-я і 80-я дык і наогул сталі па-добраму «завозныя», багатыя на но-

выя імёны і творы, як колішнія базары-фэсты на ўсякі плён працы гаспадарскай — ужо і цяпер параўнальны адбор ідзе. У чытацкай свядомасці. У крытыкаў, навукоўцаў, саміх пісьменнікаў памяць на такія рэчы, вядома, больш учэпістая, аб'ёмная, але дойдзе.

Ну, а што застанецца «на плыву» і што пойдзе ў «запаснікі» (ці наогул знікне, як кажуць, «кане»)? Шмат чаго, бо ёсць ужо з чаго выбіраць.

Калі гадаць-прыкідваць, кожны зробіць гэта па-свойму. Я дык, напрыклад, упэўнены, што сярод таго лепшага, што будзе выразней заўважацца заўтра, хрэстаматыйна загучыць назва такіх твораў: «На чацвёртым годзе вайны», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Смаленне вепрука», «Загадка Багдановіча»...

Так — гэта творы Міхася Стральцова. А названае — жамчужыны сярод напісанага ім. Гэтаму, такому жыць доўга і побач з лепшым у літаратуры.

Іншы з сучасных, асабліва маладзейшых чытачоў, добра такі аглушаных інфармацыйным шумам (у тым ліку і літаратурным), можа недаўменна затрывожыцца-заклапаціцца: Міхась Стральцоў? Чытаў я ці не? Нешта не вельмі пра яго каб і пісалі!

Калі не чыталі — вось том яго выбранага. А наконт таго ці пісалі: учора — шмат, а што не вельмі сёння, дык будуць заўтра! Прачытаеце яго — думаю, спрачацца не пачнеце, згодзіцеся.

У літаратуру Міхась Стральцоў прыйшоў — ён нараджэння 1937 г., з Магілёўшчыны — разам з тымі, сярод каго нямала сёння ўжо знакамітых пісьменнікаў. Тых, хто выбралі паэтычную ліру (ці каго яна выбрала), Міхась нагадвае сам у адным з бліскучых сваіх артыкулаў (не чакаючы, каб пра яго, сам пра іншых часта піша):

«Калі-небудзь хто-небудзь напіша пра тую пару, калі ў нашым сталічным універсітэце на адным курсе ці паралельным (філолагі — журналісты) вучыліся Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Юрась Свірка, Сымон Блатун, Тацяна Арлова, Мікола Гіль, Алесь Станюта...»

Не, тут не толькі паэты будучыя, але і празаікі, крытыкі.

Пакаленне гэтае адразу ж атрымала вызначальную назву (ці не ад Яскевіча?) — «філалагічнага». Ну, а потым узнікла вызначэнне і больш паэтычнае: пакаленне, абпаленае вайной!

Дабавім: душу, свядомасць іх, як і ўсіх нас, абпаліла яшчэ і пякучая праўда, што адкрылася ў другой палове пяцідзесятых гадоў — пасля XX з'езда партыі...

Нам, трохі старэйшым, хлопцы гэтыя былі блізкія шмат якімі рысамі, былі ў нас агульныя і надзеі, і заблуджэнні. Хіба што імунітэт у Быкава, ці Брыля, ці Панчанкі, альбо ў Карпюка да рэцыдываў ранейшых ілюзій і паводзін быў трохі больш праяўле-

ны — бо мы больш і вірусаў таго «культу» захапілі, і куды сур'ёзней, вастрэй перахварэлі...

А так, і мы і яны — дзеці адной нязбытай да канца бяды і агульнай невымернай радасці: вайны і Перамогі. Мы ніяк з гэтым не можам у творчасці «расстацца», але не могуць і яны.

«Не скора, не адразу,— удакладняе сам Стральцоў,— абавяўся ў нашай творчасці той ваенны і пасляваенны вопыт. Усведамленне важнасці яго расло разам з намі, з чалавечым і грамадзянскім пасталеннем. Так было з усімі пісьменнікамі майго пакалення. Ужо дарослымі мы па-сапраўднаму адчулі сябе дзецьмі вайны. І тады напісалася апавяданне «На чацвёртым годзе вайны», аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь». Там — уражанні ваеннага дзяцінства, першапачатковы, можа, самы галоўны жыццёвы вопыт. Там шмат свайго, дакладна біяграфічнага».

Так, дакладнасць, «пражытасць» усяго — моцная адзнака лепшых твораў Міхася Стральцова. Але іх асаблівасць — яшчэ і ў шырокім, вольным дыханні думкі, па-сапраўднаму мастацкай. Гуманізм, чалавечнасць, што ідзе ад самой душы народнай, ёю выпраменьваецца, — вось тая н а ц ы я н а л ь н а я і д э я, на якой ён пагаджаецца найперш і канчаткова.

Не выпадкова так радасна для сябе Міхась Стральцоў адкрыў Гарэцкага, калі гэты наш класік вярнуўся да свайго чытача. І якраз драма «Антон» яго асабліва зацікавіла — мабыць, запознена адкрытым супадзеннем сваёй і Гарэцкага думкі пра нацыянальны характар беларуса. Дзед Міхалка з аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» — ці не самая затоеная і ўстойлівая праўда-думка Міхася Стральцова пра тое лепшае, што пранёс народ, збярогшы праз невымерныя пакуты свайго гістарычнага жыцця, лёсу.

Потым з'явіліся «старыя» Валянціна Распуціна і нашых — Віктара Казько, Анатоля Кудраўца, Алеся Жука, але гэта потым, пасля... А напачатку быў — калі браць не проста «тэму», а ўзровень мастацкай думкі — ён, Міхась Стральцоў, ён, дзед Міхалка...

І што яшчэ характарызуе глыбіню і ўзровень прозы Міхася Стральцова, дык гэта тая лёгкасць, з якою можам уявіць лёс яго герояў у зусім іншай сітуацыі і нават у іншым часе. Бо яны жывыя — кожнай сваёй думкай-клопатам, кожным пачуццём-перажываннем.

Чытаеш пра хлопчыка, маці, бабулю, якія неяк трымаюцца за жыццё і на чацвёртым годзе вайны, хоць столькі іх, куды мацнейшых, ужо сцёрта на порах яе бязлітаснымі жорнамі, і такое рэальнае пачуццё страху за іх — бо ўяўляеш, як гэта проста бывала: наляцелі карнікі і сям'ю гэтую таксама сцерлі з зямлі, і не за нешта, а заадно ўжо — бо некага там лавілі ці палілі.

Таксама без намаганняў уяўляеш іх і ў пасляваенны час, ужо мірны, але такі нялёгкі для іх такіх. «Ташноцікі» — дранікі з мёрзлай, вясной адкапанай бульбы,— пра якія ўспамінае не раз як пра адзнаку-памяць свайго дзяцінства сам аўтар,— і гэтаму доўга яшчэ будуць рады ў такой вось хатцы. Жорсткая спадчына ваеннага ліхалецця ў гэтых «ташноціках» і той самы бяздушны «культ» — перапляліся.

Шмат у каго з пісьменнікаў ёсць тайны субяседнік і дарадца. У літаратуры. На ім правяраеш сябе і сваё: не сорамна Яго вачыма паглядзець?!

Пачынаў Міхась Стральцоў, як і многія з яго аднагодкаў, пад моцным і дабратворным уплывам мастацкага слова Кузьмы Чорнага і іменна яго ранняй, «імпрэсіяністскай», умоўна кажучы, прозы, апавяданняў найперш.

Потым адкрыў для сябе Максіма Гарэцкага.

І заўсёды з ім — можа, як самае радаснае, творча блізкае — Максім Багдановіч. Гэта так не выпадкова для найбольшага «філолага» (у высокім значэнні) з асяродку таго самага «філалагічнага пакалення»!

Калі жывое жыццё гаспадарыць у думках, у пачуццях пісьменніка, тады кніга, кніжны вопыт яму не на шкоду як творцу — бо гэта таксама жыццё, яго неабходная частка. Тым больш што «філалагічнае» (таксама як і наша) пакаленне да кнігі, да бібліятэкі, культуры прарывалася, як да хлеба, да самога жыцця — праз здзічэнне наўкол, праз спусташэнне душ, якое спрабаваў узаконіць, нормай зрабіць фашызм.

Толькі той, хто люта галадаў, адчувае ўвесь смак хлеба. Тое ж самае можна сцвярджаць і пра «хлеб культуры». Не, «кніжнасць» Міхася Стральцова зусім не тое, што ў некаторых сённяшніх літаратурных дзяцей НТР: наіўныя «спробы,— як піша Міхась Стральцоў, — па-мастацку ілюстраваць рознага гатунку абывацельскія сенсацыі або пераказваць, як-кольвек белетрызуючы, вычытанае ўчора ці сёння з «Иностранной литературы» або з «Науки и жизни»...

Якая культура думкі, пачуцця, эстэтычная культура стаіць за адным толькі эсэ «Загадка Багдановіча»! І якое разуменне, што ў паэта не біяграфія, а — лёс. І тужліва-шчырае жаданне сабе іменна гэтага.

«Сплятайце свае вянкі. Не старайцеся адшчыкнуць хоць адзін лісток ад тых лаўраў: тыя лаўры, перш чым стаць імі, былі цернямі».

Адно з апошніх па часу апавяданняў Міхася Стральцова — «Смаленне вепрука». Піша мастацкі твор, але мучыць яго тое, ад чаго пакутуюць толькі сапраўдныя майстры: немагчымасць

дацягнуцца словам да ўсёй, што ўжо адкрылася пачуццю, паўнаты жыцця. Тое, што раней служыла спраўна, дапамагала творцу, сёння «муляе», перашкаджае — сама жанравая акрэсленасць апавядання, табой і не табой выпрабаваная, ужо перашкода. І таму не апавяданне піша, а ўжо як бы міма яго і наогул «міма» ўсёй літаратуры прарываецца да жыцця, да самых яго вытокаў, каб з ім застацца і чытача пакінуць з жыццём адзін на адзін... Не апавяданне, а «калі б я пісаў апавяданне». І гэта не адмаўленне ад дасканалай формы, не разбурэнне ў імя разбурэння — гэта абнаўленне. І формы. І сябе як мастака. Гэта — крызіс. Слова, якое крытыку нашу найчасцей палохае. І якім яна палохае.

У Міхася Стральцова да гэтай з'явы зусім іншае стаўленне.

«Надзвычай напружаны тэмп, надзвычайны дынамізм зрухаў, пераўтварэнняў, расчараванняў і надзей. Не, гэта не так проста. І крызісныя з'явы тут непазбежныя».

«У мяне пракінулася слова пра наяўнасць пэўных крызісных рысаў у сучасным беларускім рамане — і нездарма. Але толькі крызіс гэты не варта разумець як застой. Ідзе прыхаваная, несціханая творчая спрэчка (на жаль, не заўсёды хоча гэта заўважаць крытыка) пра мастацка-метадалагічны ўзровень спасціжэння рэчаіснасці. Менавіта пра ўзровень».

У стральцоўскім эсэ пра смяротна хворага Багдановіча паэту здаецца, што ў яго ялцінскім пакойчыку затаіўся Сальеры («Здагадаўся: днём ён яшчэ больш чым ноччу баяўся таго чалавека — Сальеры»).

І сёння мы, услед за Пушкіным, ніяк не супакоімся, не ўсвядоміўшы да канца: дык атруціў Сальеры Моцарта ці не было гэта на самай справе? А можа, не гэта і Пушкін, і шмат хто іншыя, пішучы, мелі на ўвазе? Не факт, а з'ява іх цікавіла. У каго толькі не стаяў ён на дарозе — Сальеры! Не стаяў хіба толькі ў таго ж Пушкіна, у Ясеніна, Кальцова, Гарсія Лоркі — у паэтаў, якія самой прыродай быццам створаны былі, як нейкі «орган паэзіі» (нешта падобнае ўжыў М. Горкі, гаворачы пра Ясеніна).

Астатнім жа ўвесь час прыходзіцца ці ўступаць, адступаць перад «Сальеры» (і тады пагражальна насоўваецца «рацыо», цясніць творчую інтуіцыю), ці, змагаючыся з ім, выкарыстоўваць яго магчымасці ў імя таго ж самага мастацтва — толькі ўжо «аналітычнага», «інтэлектуальнага».

Сапраўды, не так усё проста — у гэтай бясконцай барацьбе паміж «рацыо» і «інтуіцыю» («Моцартам» і «Сальеры»), якая бушуе і на старонках і ў душах таксама і сучасных пісьменнікаў.

І ўсё ж (нават пры такім поглядзе на «Сальеры») сэрца таленту — гэта «Моцарт».

Калісьці паспрачаўся я з Міколам Грынчыкам (думаю, пацвердзіць), нават на заклад пабіліся: я сцвярджаў, што У. Караткевіч па таленту больш празаік (гэта ў той час, калі ён яшчэ толькі вершы пісаў), што ў вершах Караткевіча,— хоць і выдатных, «запісана», што быць яму празаікам і больш таго — эпікам. Бо там быў яго «Моцарт», адтуль яго клікаў...

Ну, а хто па таленту Міхась Стральцоў — найперш паэт, якім ён выступае перад намі ўсе апошнія гады, ці ўсё ж празаік? Ці па праву паэт настолькі глуха перакрыў дарогу празаіку?

Я цаню паэзію Міхася Стральцова. Не менш, чым Алеся Разанава, ёсць, ёсць у іх агульнае.

Але калі б паэзія Буніна ды адабрала ў нас Буніна-празаіка? Не здалося б нам, што «Сальеры атруціў Моцарта»? Бо пры ўсёй сіле бунінскага паэтычнага слова, «Моцартам» быў ён усё ж у прозе, а не ў паэзіі.

Ці не тое ж і з Міхасём Стральцовым? Яго паэзія — гэта «паэзія мыслі» найперш. Такая паэзія таксама, калі на ўзроўні, законная дачка Музы. Але іменна ў прозе Міхася Стральцова жыве «Моцарт», і, значыць, гэта яго асноўны талент, у гэтым асноўнае прызванне.


Дык чаму ж, Міхась?..

Вельмі не стае чытачу Стральцова-празаіка — яго празаічнага слова с ё н н я ш н я г а. Бо мы ведаем магчымасці гэтага слова — па ўжо напісанаму ім.

І літаратуры беларускай не стае гэтага слова, стральцоўскага. О, як не лішняе было б яно — побач з брылёўскім, быкаўскім... У літаратуры так: нават усе разам і нават выдатныя не могуць замяніць аднаго — калі гэта сапраўдны талент. А калі ён яшчэ, як Стральцова талент, акрылены высокай культурай думкі і пачуцця, калі за ім выключная чысціня сумлення і незвычайная патрабавальнасць да сябе — хіба ж шматгадовае маўчанне такога празаіка не вялікая страта нават для багатай, як сёння наша, літаратуры?

Не, моцартаўскі пачатак у пісьменніку, такім як Міхась Стральцоў, усё-такі наймацнейшы. І ён верне нам Стральцова-празаіка, прадоўжыць яго — у новых апавяданнях, аповесцях.

Алесь Адамовіч



1

*... я засцярогся ад бяды —
бо сказаў: «Дабро і надзея
тут накрэслілі свой круг».*

АПАВЯДАННІ

ТРЫПЦІХ

ТРЫВОЖНА КРЫЧЫЦЬ ПТУШКА

У канцы ліпеня колькі дзён запар ішлі цёплыя дажджы. Жанчыны, што хадзілі ў лес па чарніцы, прынеслі ў фартухах сыраежкі і лісічкі.

Была субота. На лагу за вуліцай лянівы дымок чапляўся за сцены лазні, загінаўся, ападаў на мокрую і парную траву: у цёплым, няпэўна асмужаным небе слаба чулася сонца. Галасіста і радасна крычаў недзе певень.

Пастаяў я на двары, падумаў, паслухаў ваколіцу, насцярожліва-чуйную, нібы прытаптаная трава, і нечакана павесялеў ад думкі сабрацца схадзіць у лес па грыбы.

Тыдзень таму прыехаў я з горада ў вёску. Было прыемна цяпер скінуць цесныя чаравікі, абкруціць нагу сухой і шурпатай анучкай, надзець шырокі і ўвесь у латках бот: боты стаялі ў сенцах, халаднаватыя, церпка-пахучыя, з пабялелымі плямкамі прысохлай зямлі на іх і прыліплымі травінкамі. Узяў кошык, акраец хлеба і жаўтлявы мяккаваты шматок сала, вышчарблены братаў складанчык на шнурку і — пайшоў, трохі баючыся, каб не трапіць каму вельмі на вочы: у вёсцы не любяць гнацца за жураўлём у небе, калі сініца ў руцэ. Вёска хадзіла цяпер па ягады, а на грыбы яна накінецца пазней, калі баравікі пойдуць — хоць касою касі. Тады будзе рана, вельмі рана засынаць вёска, будзе рана ўзыходзіць над лесам чырвоны халодны месяц, будзе трывожна, прыглушана шалясцець таполя — уся ў цьмяным месячным мроіве, а на вуліцы — не па-летняму глухая цішыня і цёплы, не вельмі

моцны вецер. І будуць гарэць за ракою кастры начлежнікаў.

Так будзе потым... А якія ж грыбы цяпер?

І ўсё ж я пайшоў у лес.

Агародамі выйшаў я на сценку, а па ёй на вузкую дарогу, па адзін бок якой буялі кукурузныя кіяхі, а па другую густа стаяла вільготнае жыта. Пад нагу то тут, то там траплялі раструшчаныя кукурузныя пачаткі, і я ўспомніў, як нядаўна казала маці, што дзеці ядуць іх няспелыя, а потым, блазнюкі, жаляцца на жываты... Ну і няхай ядуць, блазнюкі, ну і няхай жаляцца... Так ішоў я, ішоў зялёнай дарогай і зусім не думаў, што стрэнуся з зайцам. А ён — вялікі, таўсматы, з рудымі бакамі — сядзеў сабе на дарозе і спакойна глядзеў на мяне — хоць ты вазьмі ды і стань. І я, можа, і стаў бы, каб ён раптам не валюхнуўся з месца і не пабег паціху і як бы кульгаючы. І тут я не вытрываў — свіснуў. І ён тады ўжо сакануў порстка, дарогай паўз жыта, і адразу стаў нейкі даўжэйшы, і былі відны ў яго, калі бег, адны хіба ногі ды вушы...

Навошта я спудзіў яго? Але шкадаваў я нядоўга. Я падумаў, што, як цяпер грыбы, зімою заяц, можа, пазаве мяне ў лес, і хоць мне не вельмі трэба будзе той заяц, як цяпер грыбы, я ўсё ж прыйду — і гэта добра.

А лес, цяперашні лес, быў і знаёмы нейкі, і незнаёмы. Ён пачаўся, як толькі прывяла да яго дарога, з невялічкага ўзболатка, парослага хмызамі, а потым ужо быў малады сасоннік. І завіляла, то спадаючы ў хмызовыя нізінкі, то ўзлазячы на верасовыя палянкі, ужо не такая зялёная, як у полі, дарога. І маўчаў лес. Толькі аднекуль зверху, з шараватага і цёплага неба, плыў суцішаны, мяккі шоргат: такі яшчэ бывае вясной, калі ў тумане растае снег. Хораша пахла з каляін вільготным сасновым карэннем, а з дробных хмызоў — свежай лістотай, а потым неяк нечакана і саладкавагуста патыхнула водарам ад зламанага пры дарозе куста крушыны.

Дарога выводзіла мяне на дзялянку. Гонка і высока стаялі на ёй адзінокія сосны, цвіркалі недзе на маладых бярозках, садзіліся на зарослыя травой лаўжы разамлелыя аўсянкі. То падаючы ледзь не да зямлі, то сігаючы ўгору, праляцела чорная жаўна. Быў тут нейкі тужлівы прастор, як на старым, забытым дворышчы, і ўсё тут было, як бывае ў чалавечым жыцці.

Мінуўшы дзялянку, пайшоў я торнай дарогай — волакам, і збочыў там на патаемны, свой тут, у лесе, грудок — залубелы, лішаісты, з купкай маленькіх сасоначак і крывой бярозкай. Прыгнуўшыся, абышоў я і сасоначкі, і бярозку, і рудыя бароды рэдкага верасу: неаднойчы браў тут тугія, аж чорныя, баравікі. Але ўдача любіць сваю пару, і знайшоў я ўсяго сыраежку — засохлую, з белымі плямамі на брыльку, але без ніводнай чарвінкі...

Ну і няхай, ну і далей у лес, вунь на той доўгі ўзгорачак пад высокімі соснамі, з вывернутай ветрам бярозай — там павінны абавязкова быць лісічкі! І пайшоў я, і хораша мне было ісці і пазнаваць усё наўкол. Вунь там, куды павяла ад волака дарога,— печышча: некалі гналі каланіцу; за ім — урочышча з вольхамі, асінамі ды елкамі, а бліжэй да мяне, пад узгорак, цеглавіна з ягаднікам, і вунь нейкая жанчына, разагнуўшыся, глядзіць на мяне, і пагляд у яе затуманены, нетутэйшы нейкі, і сама яна здаецца нетутэйшай — аднекуль адтуль, можа, з часу якіх крывічоў ці радзімічаў.

І так дайшоў я да напаўзаваленага нейкага бліндажа і нечакана для сябе ўбачыў у яго спадзінцы цэлую плойму жоўтых, як кветкі, і прысадзістых лісічак. Але я не спяшаўся іх браць: было і без таго за што тут зачапіцца воку.

Густа і роўна парасла спадзінка бліскучым круглячом, а на ім, ля самай купкі лісічак, ляжала бяроставая кузенька, прашытая лазовым прутком, зверху — белая, у чорных рысачках, а ў дне і па баках жоўтая, і тыя чорныя рысачкі прасвечвалі тут чырванню. І яшчэ вырастала са спадзінкі маленькая сасоначка...

Я быў ступіў ужо да бліндажа, як раптам у цеглавіне нешта зашоргалася, затрапяталася, а потым ураз трывожна піснула, палахліва заценькала, забілася нейкая птушка. І як бы хто штурхнуў мяне ў грудзі — я падаўся назад, лес хіснуўся, і я чуў ужо адно толькі неба: яно кружылася, і адтуль плыў і плыў на мяне трывожлівы бясконцы шоргат. І вось ужо нібыта я ляжаў на зямлі: не было ўжо ні выбуху, ні мяне, і змяркалася, і тарахцела па дарозе падвода, і галасіла, галасіла ў лесе мая маці...

Яшчэ раз ценькнула нейкая птушка — ага, сініца! — і я страпянуўся. Было ціха ў лесе, і чуваць было, як там, у цеглавінцы, яшчэ нешта шоргалася, але гэта,

мусіць, з патрывожанага дрэва падалі кроплі і выпрасталіся патрывожаныя галіны. І як бы нанава глянуў я на ўзгорачак, чысты, светлы, абсыпаны шыгаллем, праз якое прасвечвала сіняватая зямля, і, можа, ад таго ўзгорачак выдаваў не то фіялетавым, не то бэзавым. І мне было ўжо ніякавата за нядаўні спалох, і ўжо недзе далёка быў успамін аб тым, як сем гадоў назад падарваўся ў гэтым лесе на міне мой аднагодак хлопец, наш вясковец...

І я паціху зрэзаў лісічкі і пайшоў адсюль па рудым шыгаллі, і вока маё па дарозе прыкмячала шмат чаго, і ўсё наўкол мяне было нейкае сцішнае і светлае: яно як бы лашчылася да мяне і прасіла сябе пакратаць. І зноў папаліся лісічкі — раз, другі, а потым у бярэзніку, на ўзболатку, патрапіліся ababкі і брылястыя чырвоныя сыраежкі, а потым зноў былі лісічкі.

Нечакана азвалася сонца, коса сыпнула ружовыя мяккія промні на ствалы дрэў, на верас, і закурылася пара, а ў небе, відно было, як сплывалі і радзелі, бы туман, кудзелістыя хмаркі.

Зноў мне трапілася дарога і павяла на ўрочышча: я перайшоў ручай па залітых вадою жэрдках і выбіўся на гальную высакаватую мясціну з рэдкімі каржакаватымі соснамі. А тут быў пень, пацямнелы, шырокі, а на ім нехта, мусіць, часаў сасновы кол, бо ля пня валяліся акроечкі кары, рудой і падсохлай. Была вялікая спакуса сесці, і я сеў і пасля ўжо, агледзеўшыся, убачыў непадалёк яшчэ адзін бліндаж, а можа, і зямлянку: відзён мне быў нейкі равок, парослы травою. А можа, гэта і не зямлянка была, можа, гэта была нара: яе раскапалі некалі дзеці, а потым яна абвалілася, зарасла травой і мне цяпер здалася зямлянкай.

Як там сапраўды было, мне чамусьці не хацелася думаць.

Ружова і роўна свяціла сонца, было цёпла і парна, а за арэшнікам шумеў і булькаў ручай. І раптам адтуль, ад ручая, пачулася птушыная песня, такая порсткая, як сонечны прамень, і звонкая, вясёлая, як ручаінка. І здалося, усё — і лес, і цішыня, і ружовая парнасць — усё было для яе і ўсё нібыта ёй памагала.

І я сядзеў на шырокім, пацямнелым пні і слухаў бульканне ручая і гэту песню, такую порсткую, як сонечны прамень, і звонкую, вясёлую, як ручаіна.

Хораша спявала ў прыціхлым лесе тая птушка!

ЖУРАЎЛІНАЯ ПЕСНЯ

В. Куцэнку

У радасці свая вясна, і калі стане вясновай душа — народзіцца радасць.

І неабавязкова ёй прыходзіць да чалавека вясной: ёсць яшчэ лета і зіма, ёсць восень, і ёсць яшчэ дзень і ноч, усход і заход сонца. Зімою трашчыць уночы на рэках лёд, і гул ідзе высока, аж да неба, а раніцай ляжаць снягі, ружовыя і чыстыя, як радасць. А ў жытнёвае лета вісіць над зямлёю яблык, пераспелы і светлы, як даўняя журба; ён упадзе — і надыдзе восень, а восенню хлапчукі пякуць на полі бульбу, і ўвосень прыходзяць да чалавека ўспаміны пра маленства.

Але толькі вясною высока ў небе клічуць радасць журавы, і калі яна запазнілася да цябе, зімой ці летам, удзень ці ўночы, дык абавязкова прыйдзе з гэтаю песняй, і ты, можа, спазнаеш тады і трывогу, і шкадаванне, і журбу, але ўсё адно гэта будзе радасцю.

У сакавіку, здараецца, ноччу ідзе дождж, і ў вадасцёчнай трубе грыміць, як гром, абвальваецца намёрзлы лёд.

У сакавіку першым дажджом і вільготным пругкім ветрам грукае ў акно ранняя вясна. І потым ужо будуць трубіць журавы, а яшчэ потым ралля ў полі стане шэрай, як жураўлінае крыло.

Неяк ноччу мне здалося, што я чуў, як трубілі, летучы над горадам, журавы.

Стаяў маладзічок у купцы тоненькіх воблачкаў, стаіўшыся, як рыбіна ў траве. Была ноч, была падшэрхлая і гулкая зямля, і недзе далёка і высока гуў самалёт, і, здавалася, ад гэтага далёкага суцішнага гуду трапяталася месячнае святло, і здалося, што разам з гэтым трапятаннем ідзе да зямлі жураўліная песня.

Стаяла ноч.

Ехалі ў адзінокіх трамваях і тралейбусах запозненыя пасажыры. У гарадскім парку валтузіліся ў сасновых шатах і ляніва крычалі галкі — стаяла ноч. Ішоў па вуліцы хлопец з дзяўчынай, і пяшчотна граў у ягонай руцэ маленькі радыёпрыёмнік. Стаяла ноч. І нехта стаяў пад ліхтаром ля тралейбуснага прыпынку і чытаў газету. І недзе спаў у нечай кватэры хлапчук, і яму снілася, што ён вялікі, бо стаяла ноч. І не спаў на бу-

доўлі вартаўнік. Ён быў стары, апрануты ў кажух, тупаў ля штабеля ўжо непатрэбных дошак і ціха шкадаваў, што іх трэба аддаваць на дровы. А з дошак добрыя выйшлі б плот ці весніцы. Стаяла ноч, і вартаўніку ўспаміналася вёска яго маленства.

Стаяла ноч, і ляцелі ноччу над горадам журавы.

Стаяла ноч, і я стаяў пад высокай ноччу на вясновай зямлі.

О, ляціце, журавы, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы крыгаход! І вясновую радасць трубіце над цёмнай вясновай зямлёй. Не пытаюся, у якім краі пакінулі вы мае леты, ведаю, колькі было іх, і не пытаюся, колькі будзе.

Стаіць ноч, і я стаю пад высокай ноччу на вясновай зямлі.

Цякуць рэкі ў моры, і вырастаюць у неба дрэвы. Цякуць, як рэкі, дарогі па зямлі, і на сініх лугах маленства вырастаюць надзеі. І вырастае радасць, і Млечны Шлях сплывае ў вечнасць, і ляцяць, ляцяць сваёй млечнай дарогай над цёмнай вясновай зямлёю журавы.

ПАДАРОЖЖА ЗА ГОРАД

Вясна даўно прыйшла ў горад, але ў горадзе найлепшая вясна, калі яна яшчэ нясмелая і маладая, калі нанач замярзаюць на тратуары лужыны, калі доўга ружавее ўвечары неба і калі стаіць над вуліцамі сіні туман, а чырвоныя агеньчыкі машын ірдзеюць ярка, нібы гронкі калінавых ягад.

Быў пачатак мая, і я пайшоў паглядзець на вясну за горад.

Дзьмуў свежы вецер, на падсохлым асфальце ўжо курыўся пыл, і гулка ляскалі ў пад'ездах дзверы.

Вясною заўсёды бывае пprasторна ў горадзе: і шум машын, і вясёлае татахканне поезда, і перазвон трамваяў чуваць далёка, бо вясною бывае, можа, самае маладое рэха.

Вясною гучна стукае на сажалцы парнік, і ад гэтага таксама бывае рэха, і той, хто жыў калі-небудзь у вёсцы, пачуе яго, не ўтрывае і пойдзе за горад. Так здарылася і са мной, але ў гэтым не было нічога благога для горада, як няма нічога благога ў тым, калі сталы, далёкі ад вёскі чалавек у нейкі ласкавы і шчыры да

яго дзень нечакана ўзрадуецца, разуе чаравікі і пойдзе басанож лугавою сцяжынаю. Бо ўся, можа, вялікая ці зусім малая мудрасць у тым, каб у пару адчуць, калі да цябе будзе ласкавы і шчыры той дзень, а ўжо здагадаешся пра гэта, калі чакаеш яго і калі верыш, што такі дзень табе недзе адпушчаны.

І вось была і мне цяпер лугавая сцежка, ды толькі рана было яшчэ ісці басанож па ёй.

Канчалася вуліца, і далей вяла праз лугавіну сцежка, размытая веснавой вадой, яшчэ не вытаптаная, з падсохлай ужо дзе-нідзе і патрэсканай гразёю. А за лугавінай відны былі маленькія дамкі рабочага пасёлка, і адтуль вецер нёс гуллівую і як бы раскудлачаную музыку.

Але што за слаўная мясцінка была тут летам! І вытаптаная, гулкая сцежка была, і трава, як на лузе, і балоцвінкі, і пасвіўся на куп'істай дзяцеліне, вышэй туды, да пасялковых агародаў, кімсьці пушчаны на волю конь. І колькі разоў я прыходзіў сюды з кніжкаю, калі самая пара была касіць, калі і сапраўды на лугавіне паяўляўся касец — не раніцаю ці надвячоркам, як у вёсцы, а нават і апаўдня — высокі, з загарэлай да чарнаты шыяй, у парыжэлых ялавых ботах і ў кепцы, але без кашулі. Я ляжаў, курыў, чытаў, утаропіўшыся ў цьмяную ад сонца старонку кніжкі, а ён усё шоргаў і шоргаў касой, аж пакуль не пачынала падсыхаць і невыказна хораша пахнуць трава. А назаўтра ўжо я перабіраўся бліжэй да пракосаў, набіраў сабе колькі трэба травы і зноў лажыўся і чытаў, а потым прыходзіла нейкая жанчына ■ граблямі, таксама загарэлая, як той дзядзька. Яшчэ на другі дзень на лугавіне вырастаў стажок, а ў жанчыны на загарэлых руках відны былі белыя драпіны ад сухога шорсткага сена.

І колькі разоў пасля браў я зімой у рукі кніжку і незнарок знаходзіў паміж старонак сухую травінку, і тады ўспаміналіся і шоргат касы, і пах завялай травы ў пракосах, і белыя драпіны на руках у жанчыны, і тое, як, чытаючы на лугавіне, знайшоў я аднойчы ў Мапасана зусім нечаканую для сябе навелу. У той навеле была лодачка, слаўная лодачка, уся белая, з сіняй аздобкай уздоўж борта, і яна ціха-ціха плыла па спакойным дрымотным моры, глыбокім і сінім. З берага глядзелі на мора прыгожыя вілы, чыста бялеючы ў садах, дзе раслі пальмы, алоэ ў вечнай згодзе з сонцам.

А лодка ўсё плыла і плыла, і нейкі Поль сказаў свайму сябру:

— А ў Парыжы ўвесь час ідзе снег. Ноччу шэсць градусаў марозу.

А той, другі, нічога не адказаў яму, толькі ўдыхнуў на ўсе грудзі цёплае блакітнае паветра, глянуў на вілы, якія былі ўжо далёка, і ўбачыў высока над імі вялізныя белыя горы, што ўсё раслі і раслі, і здавалася, ніколі не было пад імі ні вінаграднікаў, ні пальмаў, ні алоэ.

А лодачка ўсё плыла і плыла, і тыя, што сядзелі ў ёй, успаміналі зімовы Парыж, нейкага Жуля, што за адзін вечар скарыў сэрца багемнай прыгажуні Сільвіі Рамон і ноччу, калі ўжо разыходзіліся ад яе госці, басанож кружыў па аснежаным двары, мыючы ногі. Вялікі дзівак і вялікае дзіця быў той Жуль!

А лодачка ўсё плыла і плыла, сінела чыстае і спякотнае неба, усё раслі і раслі на гарызонце белыя горы, і нейкі Поль вычытваў з газеты пра снежныя абвалы ў горных вёсках з дзіўнымі назвамі Пірале, Дамонта, К'ябрана, Вальпрата.

А потым лодачка павярнула назад, і ўсё бліжэў і бліжэў бераг, і не было ўжо відно высокіх белых гор, і неўзабаве не было ўжо нічога, акрамя горада і сіняга мора, і ўсё плыла, плыла па дрымотнай вадзе лодачка, слаўная лодачка з сіняй аздобкай уздоўж борта.

Дзіўныя рэчы бываюць у класікаў, а яшчэ, можа, больш дзіўна тое, што ты вось ніколі не быў ні на Міжземным моры, ні ў Парыжы, але чамусьці ведаеш іх, нібы там некалі жыў.

А спякотны дзень на лугавіне, сена ў пракосах, кніжка Мапасана — усё гэта было са мной і, можа, было яшчэ з кім-небудзь другім, але таму, другому, неабавязкова чытаць гэтыя старонкі. Важна, каб з ім было, а свае старонкі ён сам напіша. І, можа, ён, як і я, аднойчы ўвесну таксама надумае ды і пойдзе на сваю даўнюю лугавіну, бо няма нічога благога ў тым, калі чалавек ступае на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага находзяць успаміны.

Бо яшчэ вось так чалавек заўсёды знаходзіць сабе сябра ў падарожжа за горад.

1963

ДОМА

Доўгім і нізкім дваром яны дайшлі да пуні.

Сцяпан зняў з прабоя клямку, і вароты са скрыпам расчыніліся. З пуні патыхнула моцным, такім знаёмым Сцяпану пахам сырой зямлі і свежага сена. Ён дастаў з кішэні карабок і асцярожна чыркнуў запалкай.

— Ну, Сцёпа,— з дакорам сказала сястра і дыхнула на агеньчык.— Ты ж ведаеш: тата. Ён прасіў...

Стала цёмна. Сцяпан усміхнуўся: «Як яна, аднак, вырасла. Дзевяцікласніца!»

Вось ужо два гады, як ён не наведваўся дамоў. Калі ад'язджаў апошні раз з вёскі, сястра была амаль што дзіцём; ён нават помніў: часта плакала, рыхтуючы ўрокі. А цяпер — без якога тыдня нявеста.

Было вельмі цёмна пасля запалкі. Сцяпан нічога не бачыў.

— Сюды,— шэптам сказала сястра,— ці ж ты забыўся? — Сцяпан выставіў упоцемку перад сабою рукі і пайшоў за ёю.

Па драбінах падняліся на вышкі. Не паспеў Сцяпан і кроку ступіць, як сена пад яго нагамі загайдалася, зашамацела — ён не ўтрымаўся і ўпаў. Сястра засмяялася. І яму самому раптам зрабілася весела і прыемна.

— Як хораша, Ніна, га? — на ўсе грудзі выдыхнуў ён і яшчэ глыбей зашыўся ў цёплае, пахкае сена.

— Хораша, праўда,— жвава адгукнулася Ніна.— Я яшчэ да экзаменаў тут спаць збіралася, ды мама не дазволіла. Гэта яна баіцца, што буду позна прыходзіць з сяла.

— І правільна робіць. На вечарынкі, нябось, даўно ходзіш... І запіскі на ўроках палучаеш... Што, можа, скажаш, няпраўда?

Братаў голас гучаў хітравата і лагодна.

Ніна адказала з прытворным нездавальненнем:

— Якія вы, настаўнікі, бурклівыя, злосныя. А я яшчэ некалі думала, што вы не такія людзі, як усе... Ну, спі, выдумшчык, я пайшла.

Сцяпан смяяўся.

Калі Ніна выйшла, ён распрануўся і лёг. Захацелася курыць. Успомніў перасцярогу сястры і ўсміхнуўся, запаліў папяросу. Запалку раструшчыў у пальцах і адкінуў далей ад сябе. «Каб не ўбачыў часам бацька».

Ён ляжаў і думаў. Было ціха, толькі ўнізе перарывіста дыхала карова, ды над самым вухам надакучліва звінеў камар. У адным месцы праз страху прасвечвала неба, і Сцяпан доўга глядзеў туды, пакуль недзе зусім непадалёку не зайграў гармонік і не ўзрадаваўся раптам песняй высокі і прыгожы дзявочы голас. Сцяпан устрапянуўся. Нешта варухнулася, заказытала ўнутры, і ён адчуў, як незразумелая радасць агортвае яго.

Ён ужо не мог ляжаць спакойна, варочаўся. «Што гэта,— думаў ён,— чаго я так расхваляваўся?» І раптам зразумеў: «Я дома! Як жа не здагадацца? Я дома!»

А гармонік усё граў і граў, і ўсё той жа дзявочы голас спяваў пра закаханых, што ніяк не могуць расстацца, пра росную сцежку ў жыце і туманы над ракой...

І Сцяпан успомніў, як у восьмым класе закахаўся ў Кацю, жвавую тоненькую дзяўчынку са светлымі касамі, і як смешна раўнаваў яе да свайго школьнага сябра Уладзіка, разважлівага і не па гадах сталага хлопца. Уладзік нават пра маці сваю, калі тая рабіла ці гаварыла што не так, як яму хацелася, па-даросламу казаў: «Ведама, жанчына». Уладзік рос без бацькі. З дзяўчынкамі ў класе, акрамя Каці, ён не сябраваў. Утраіх яны часта хадзілі за вёску на шлях, узлазілі там на вербы і спявалі песні. Сцяпану ад такіх пагулянак было мала радасці. Уладзік тады ўжо курыў і, калі скручваў цыгарку, дастаўшы з кішэні шматок газеціны і шчопаць самасаду, заўсёды папярэджваў Кацю: «Глядзі, каб нікому ні слова». І Каця заўсёды пакорліва адказвала: «Добра, Уладзік»,— і чамусьці ўздыхала. А Сцяпан увесь час сачыў за ёю, пакутаваў і даваў сабе слова нават не глядзець на яе. Потым праходзіў нейкі час, і ён браўся за запіскі. Каця рабіла выгляд, што нічога не разумее, малявала на тых запісках смешных чалавечкаў і адсылала Сцяпану.

Так ішоў час. Неўзабаве яны скончылі дзесяцігодку. Уладзік паступіў у ваеннае вучылішча. Каця паехала да сястры ў горад, і больш Сцяпан яе не бачыў.

«Як гэта было даўно,— думаў цяпер ён.— Дзе цяпер Уладзік, дзе Каця? Ах, як нядобра: я нават не ведаю, дзе яны».

Ён папракаў сябе, і яму чамусьці стала маркотна. Ранейшы настрой адразу прапаў. Другія, непрыемныя ўспаміны агарнулі яго. Цяпер ён бачыў сябе студэнтам, нязграбным і нясмелым, які больш за ўсё на свеце

баяўся быць смешным. Студэнтам Сцяпан насіў акуляры і адчуваў сябе ў іх вельмі ж няёмка. На людзях ён амаль увесь час маўчаў, бачыў, што выглядае і недарэчным і смешным, але нічога не мог зрабіць з сабою.

Два гады, што прайшлі пасля інстытута, ён працаваў настаўнікам у палескай вёсцы Альхоўцы. Ён ніколі не задумваўся, падабаецца яму настаўнічаць або не: рыхтаваўся да ўрокаў, чытаў калгаснікам лекцыі, калі прасілі, вечарамі сумаваў у сваёй халасцяцкай кватэры — яму здавалася, што так і трэба было. Ён выкладаў літаратуру. Урокі праходзілі гладка, вучні як быццам паважалі яго, але ён адчуваў: каб быць ва ўсім аўтарытэтам для іх, яму нечага не хапала. Але чаго — Сцяпан не ведаў.

Прыходзіла лета, канчаліся экзамены, і неяк здаралася так, што Сцяпан заставаўся ў Альхоўцы і суцяшаў сябе, што нічога лепшага яму не трэба. Часам ён успамінаў горад, інстытут, сяброў. Былыя аднакурснікі даўно ўжо мелі свае сем'і, а ён пасля інстытута нават не закахаўся. У такія мінуты на душы было горка.

І вось цяпер далёка Альхоўка, ён — дома.

Гармонік ужо сціх, і ў цішыні Сцяпан добра чуў, як у кустах за пуняй конь скубе траву і як пад яго нагамі хлюпае мокрая зямля. Ён павярнуўся на другі бок і, заплюшчыўшы вочы, стараўся ўявіць сабе штонебудзь белае, мяккае, як вучыла ў дзяцінстве маці, калі ён доўга не мог заснуць. Але сон не даваўся.

Так ён ляжаў доўга, пакуль на двары не пачуліся крокі. Сцяпан насцярожыўся: хто ж гэта?

— Пастой яшчэ крыху, Ніна! — гаварыў нехта. Голас быў незнаёмы, хлапечы. Сцяпан прыўзняўся і стаў слухаць.

— Не крычы, брат пачуць можа...

Гэта гаварыла яна, сястра,— Сцяпан адразу пазнаў яе голас.

Нехта паспешліва зашаптаў, і нічога нельга было разабраць.

— Мне пара ісці,— сказала Ніна.

Потым быў зноў шэпт, і потым зноў выразна голас сястры:

— А хто Васілю сказаў, што мы з табой учора гулялі на шляху?

— Я не гаварыў, ён сам, мусіць, здагадаўся.

Запанавала маўчанне.

— Ты мне нават хусцінку даць не хочаш,— пачуў Сцяпан праз хвіліну пакрыўджаны, невясёлы голас.

— Не хачу, не хачу... А калі хто ўбачыць...

— Не ўбачыць, я панашу крыху і аддам.

«А, відаць, добры хлапчук,— падумаў Сцяпан.— Нябось, каб цяпер убачыў, дык і не пазнаў бы чый... А Ніна! Вось табе і дзевяцікласніца!»

І ён зноў стаў слухаць. Ніна гаварыла:

— Ды перастань ты пра хусцінку. Вышыю — тады і дам... Пусці руку... Мне ісці трэба...

Яны яшчэ пра нешта шапталіся, а потым Сцяпан чуў, як сястра ўзбегла на ганак і адчыніла дзверы ў сенцы.

«Вось табе і дзевяцікласніца! — зноў у думках сказаў сабе ён і са здзіўленнем адчуў, што яму стала чамусьці радасна і прыемна.— Дзіўна! Пры чым тут я? Ля ганка я не стаяў, у каханні нікому не прызнаваўся...»

Але дзесьці на дне душы жыла ўпэўненасць, што ён ашуквае сябе. Перад вачамі паўстала Каця: ён думаў, што тады, у школе, Каці было столькі ж гадоў, як цяпер сястры. А хіба гэта было даўно? «Дурны ты корч,— сказаў ён сабе,— нічога яшчэ не страчана, усё ў цябе наперадзе. А ты разводзіш розныя міноры». Ён увесь напружыўся, нейкі цёплы клубочак падкаціўся да сэрца, мякка крануў яго. Маркотнасці больш не было.

На седале залопаў крылламі певень і галасна кукарэкнуў. Яму адгукнуліся з нейчага двара, і хутка бадзёры петушыны спеў пракаціўся па вёсцы.

Спаць не хацелася.

1956

ПАСЛЯ ЗАВІРУХІ

Завіхурыла адразу пасля каляд. За які дзень куды дзелася шэрань, пасля заціхша ўзбурыўся вецер ды пагнаў па вуліцы гуллівыя снежныя круцялі. Ля платоў увачавідкі раслі седлавіністыя, высокія гурбы.

Мацей цяпер ужо шкадаваў, што не прывёз з лесу нарыхтаваных дроў. І збіраўся быў, і каня брыгадзір

абяцаў, ды збіла з панталыку жонка: дровы, бач ты, пачакаць могуць, перш пуньку ўцяпліць трэба — карова во-во ацеліцца.

Зачапіўся за пуньку, тое-сёе зрабіў, а там і свята: дровы асталіся ў лесе. Чакай цяпер, пакуль гэта каламуць скончыцца, закруціла ж не на дзень.

Старому неспакойна. Выйдзе на двор, каб кінуць карове мурагу, ды зноў у хату — глядзець, як за вокнамі гойсае завіруха. Вецер то ходзіць пругка, шырока, нібы пнецца паваліць нешта, то скуголіць прарэзліва і дзіка. Грукае недзе па шчытку адарваная дошка.

А на печы войкае старая, занядужала:

— А божачка, што ж гэта такое: з'есці нічога нельга. Во ліха, як агнём смаліць...

Мацей не слухае, зацята смокча недакурак і маўчыць.

Старая злезла з печы і, крэкчучы, пратупала да шкапчыка. Дзынкнуў посуд, паказаўся гліняны біцік з содай, аплецены бяроставымі стужкамі,— старая моршчыцца: не вельмі смачныя лекі.

— Закруціла, замяло,— мармыча сваё Мацей,— у лес цяпер ні сцежкі, ні следу...

— Занудзіўся ўжо, заенчыў,— сярдзіта сказала жонка.— Дровы яму жыць не даюць!..

— А што ж,— лагодна бароніцца Мацей,— хапіла з мяне, пакуль іх з Саўкавым хлопчыкам нашмулялі. Добрую сухастоіну знайсці нялёгка: аж пад Пугачову грыву забрылі.

— Сухастоіна яму трэба, калі дровы пад бокам. Людзі бярэзнік рэжуць — не глядзяць. Хмыль вунь вазамі цягне, свайго ён нідзе не ўпусціць.

— І чаго ты прычапілася да мяне! — пачынае злавацца Мацей і дробненька, амаль што подбегам кружыць па хаце. Не адыходзячы ад шкапчыка, старая назірае за ім. Кашчаваты і маленькі, Мацей здаецца смешным у гэты час. Картовы пінжачок абвіс на яго плячах, на патыліцы шчэпаць светлых валасоў тырчыць, як кволы пух у птушаняці: лысіна ў старога даўно пералезла за макаўку.

— Не, не надта разгуляецца Хмыль, урвіцель гэты. Возьмецца за яго калгас!

— Спужаўся ён вас. Гэта ж Наста мне казала: пасля сходу, дзе ты яго са зрубам гэтым дапёк, злаваўся ён дужа. Не можа быць, кажа, каб самога на чым-не-

будзь не злавіў, я яму гэтага не дарую... І не даруе! — нават з нейкай асалодай сказала старая і зноў палезла на печ.

Мацей нядобрым позіркам утаропіўся ў жонку, быццам не Хмыль, а яна зычыла яму бяды. Рука адразу памкнулася ўгору, раз-другі нервова тарганула бародку. Мацей цмокнуў — гук нечакана выйшаў тоненькім і звонкім. Сказаў больш спакойным голасам:

— Дурань ён, калі так... Я сваім гарбом жыву, мне баяцца няма чаго.

Старая змоўчала, на печы забубніла аб нечым сваім.

Сцямнела. Мацей прынёс з-пад паветкі бярэмца дроў, пакідаў іх у рэдкі душок астылай печы. Агню не запальваў: спаць пакладаліся рана. Накрыўшыся кажушком, Мацей думаў. Гэты самы Хмыль не ішоў у яго з галавы. І халера яго ведае, што за чалавек! Сам нетутэйшы, прыйшоў аднекуль у вёску, падбіўся тут да маладзіцы ў прымакі. Людзі казалі, што ён раней недзе крамнікам быў. Вытурылі, пэўна. Дзіва яшчэ, што ў турму не сеў. У калгасе прыладзіўся вупраж выдаваць: у старых работу адабраў. Усе дзівіліся толькі. А ён з конюхам нейкія справы завёў, пачаў на палянцы каля Васілёвага логу зруб ставіць. Лесу ж, канешне, не купляў. Думалі, пуньку якую ці імшанік зрабіць наважыў — не, зруб хаты, які потым прадаў у раён. Пакуль агледзелі, дык ён і другі ляпіць пачаў. Ах, каб табе, ліхадзей ты гэтакі, валацуга прыблудны! Мацей не сцярпеў і сказаў на сходзе. Давялося Хмылю заплаціць грошы ў калгас. Дык, бач ты, помсціць збіраецца, сумленнем папракае.

Успаміналася нядаўняя сустрэча з Хмылем у лесе. Як пілавалі з Саўкавым хлапчуком дровы, набрыў той на іх. Прысунуўся цёмны, як заўсёды, ваўкаваты. Сякера запхнута за папругу, а на плячы, пераціснуты вяровачкай, пук ляшчын: відаць, высек на абручы. Не паздароўкаўшыся, раз-пораз ускідваў галаву, глядзеў на сухую роўную елку, якая была падрэзана ўжо да сарцавіны. Гумавыя Хмылёвы боты ў пукатых, як мазалі, латках неспакойна мясілі снег.

— Такую лясіну, гы!.. На дошкі можна, клёпкі на вушацік выйшлі б, га?

— Ды яшчэ якія,— сказаў узрадавана Мацей.— Уга! Каб да лета прытрымаў ды пусціў пад пілу... Праўда твая...

Хмыль усё яшчэ таптаўся каля елкі, заклапочана круціў галавой. Аблезлая шапка аж з'ехала на патылі-цу, на мокры лоб наліплі рэдкія касмылікі чорных валасоў. Хмыль раптам кпліва прыжмурыўся на Мацея, выціснуў хрыплавата:

— Чаго ж без каня, дзядзька: калгас не дае, га?

— Дасць, калі трэба,— буркнуў Мацей і рашуча падсеў да пілы.— Бярыся, Васілёк!

Папраўляючы вязанку ляшчэўніку, Хмыль варухнуў плячом і моўчкі падаўся на дарогу. За ботамі пацягнуўся роўны, нібы за сяўцом па раллі, глыбокі след: Хмыль не дужа стараўся паднімаць ногі...

Прыкры ўспамін памалу губляў першапачатковую вастрыню: кажушковае цяпло прыемна аблягала Мацея. Вецер усё яшчэ торкаўся ў шыбы, шугаў па сценах, мякка ападаў. Мацей сцішыўся і хутка заснуў. Недзе сярод ночы яго пабудзіла старая:

— Ды прачніся ты! Спіць як пяньку прадаўшы... Карову паглядзі.

Мацей падняўся, і пакуль улазіў рукамі ў цёплы кажушок і ногі шукалі каля ложка валёнкі, сон прайшоў. Стала прыемна ад нейкай асаблівай, глыбокай і мяккай цішыні, што панавала ў хаце. І была яшчэ думка аб тым, што вось як добра прачнуцца ў такі глухі і, напэўна, падранішні час, моўчкі глядзець у цемень і ведаць, што за вокнамі праходзіць ноч. Мацей вобмацкам знайшоў у загнетцы карабок і запаліў ліхтар. Калі выйшаў на ганак, халадок прабраўся пад полы і ўшчыкнуў за калені.

Нейкая змена адбылася на дварэ — гэта Мацей заўважыў адразу. Цьмяны змылачак маладзіка даганялі абшарпаныя хмаркі: той выкоўзваўся з-пад іх і зноў прападаў. Вецер прыкметна пацішэў: у мутнаватым месячным святле кружыліся шэрыя сняжынкі. «Сціхае»,— падумаў Мацей і пайшоў у пуньку.

Карова ацялілася раніцай. Мацей прынёс мокрае, з залізанымі бакамі цялятка ў хату і асцярожна паклаў яго на загадзя растрэсены па падлозе куль саломы. Старая заспяшалася да каровы, а Мацей на двары пад паветкай знайшоў драўляную лапату — падаўся за вароты разграбаць снег.

Мяцеліца сціхла. Дзень пачынаўся пагодлівы. Свяціла сонца. Угары бялявіла неба, і толькі там, за вёскай, дзе канчалася поле, смужлівая сінь халадзела над

пасвяжэлым лесам. Ад снежнага бляску мроілася ў вачах. «Дзякаваць богу, цяпер пагодка ўсталюецца».

Пасля абеду Мацей выбраўся з двара: ішоў паглядзець, ці на месцы дровы. Нават сякеры з сабой не ўзяў, тужэй зацягнуў на кажушку папружку і рушыў.

За вёскай у лес ужо вёў санны след. «Бач, не сядзіцца людзям, у кожнага свой клопат». Зледзянелая, вылізганая палазамі дарога была перамецена толькі ў некалькіх месцах. Снег тут быў прыгладжаны ветрам і не глыбокі: пазёмка не затрымлівалася ў полі. Дарога ўзнімалася на пагорак. Мацей прайшоў яго і спусціўся ў лагчыну, парослую хмызняком, рэдкімі разлапістымі елкамі і маладым бярэзнікам. Наперадзе паказаўся роўны прагал: след цяпер ляжаў на шырокай спадзістай каляіне, пракладзенай у свой час леспрамгасаўскімі машынамі. Свіцілася рэдкалессе паабапал дарогі — рэшткі колішняга вялікага бору. Добрых лясін засталося нямнога: то тут, то там былі прыкрытыя снегам пні, круглішся белымі шапкамі лаўжы, гонкія сасонкі з высокімі кронамі, пазбаўленыя суседства магутных ствалоў, пругка выгіналіся сярод ляда. Лес тут быў калгасны, высякалі яго многа і без разбору. З гэтых сасонак каля Васілёвага логу ставіў свае зрубы і Прохар Хмыль.

Дарога ўсё больш паглыблялася ў лес, пятляла пад навіслымі галінамі арэшніку, больш стала ялін. Адчувалася нізкаватасць месца. А праз які кіламетр пачыналася Пугачова грыва. Там павінна быць яшчэ адна палянка, за ёй — Мацеевы дровы.

Стары памалу дайшоў і да гэтага месца. Санкі раптам крута з'ехалі ўбок, прыгнутая палазам елачка ўнурылася ў снег. «Пачакай,— спыніўся Мацей,— ці не па мае дровы нехта паехаў?» Ён перадыхнуў і кінуўся па следу. Снегу на паляне было многа, і санкі глыбока асядалі ў ім. Чалавек сядзеў на санках бокам, ногі яго цягнулі па белай роўнядзі перарывістую баразну. Дзенідзе ён саскокваў, а потым садзіўся зноў. «Пачакай,— цяжка дыхаў Мацей,— я цябе, зладзюгу, злаўлю».

За палянай — цяглавіна з вузкай жылкай ручая, цёмная ад змрочнай цесноты ялін, рудаватых альховых ствалоў і кусцістага арэшніку. Мацей спыніўся, яшчэ раз перадыхнуў. Прыслухаўся. Блізка зазвінела сякера: порсткі гук калыхнуўся па снежных нізах. Мацей здагадаўся: нехта збівае на дрэве сухія хрумсткія суч-

кі. Уверсе ціўкнула птушка, зашастала голлем елка. Мацей пайшоў цішэй, гледзячы сабе пад ногі. Калацілася сэрца. Елка, зноў елка, высокая купіна з вытыркнутымі ліосткамі бруснічніку, трухлявы ствол асіны на снезе. Схаваўся за куст і паглядзеў... Конік стаяў у аглоблях крыва, задраўшы галаву: падціскаў гарлавіну хамут. Прыпёршыся да ўвязанага воза, спіною да Мацея, нейкі чалавек («Ага, Хмыль!»), спяшаючыся, курыў. Раз-пораз адводзіў руку, пускаючы тугой палоскай сіні дым. Воз перахрыстаны вяроўкай, пад ёй ужо гатовая ў дарогу сякера...

Мацей кашлянуў і паволі выйшаў з-за куста. Плечы ў Хмыля перасмыкнуліся, і, яшчэ не паварочваючы галавы, ён згорбіўся. Потым Мацей убачыў яго збялелы, ураз апалы, як печаны яблык, твар. Нязграбна скрывіўшы тулава, Хмыль глядзеў, пакуль стары ішоў да рассунутых, параскіданых дроў.

Коса зірнуўшы на Хмыля, Мацей прыгнуўся, голай рукой змятаючы з камлюка снег: даўняя наледзь зашурпацела пад далонню. Разгублена крэкнуў і сеў, дастаў з кішэні пярэсты, прапахлы церпкім тытунёвым пылам капшук. Хмыль каля воза выпраставўся і кінуў недакурак у снег. Крываватая ўхмылка праступіла на яго твары:

— Дровы хацеў табе прывезці... Можа, і дзякуй не скажаш... га?

— Каня ты таксама для мяне прасіў? — спытаў, нібы адкінуў Мацей яго словы.

— Убачыў тады, як ты з дрывамі бузаваўся,— шкада стала. Дай, думаю, памагу,— усё яшчэ крывіўся бездапаможнай усмешкай Хмыль. І было незразумела: злосць валодае ім ці разгубленасць.

— Перастанеш ты... ліха тваёй матары, ну? — пружыніста ўсхапіўся Мацей, і голас яго сарваўся. Тыцнуў рукой пад шыю, падбіваючы рудую бародку. Хмыль яшчэ больш ссутуліўся. Прыпёршыся спіной да воза, ён змоўк. Мацей жа трохі супакоіўся, закурыў. На вяршалінах прабегся вецер. Конік страсянуў галавою, фыркнуў.

— Тпру!..— не гледзячы, шмаргануў за лейцы Хмыль.

Мацей прагна смактаў самасад, няпэўна пазіраў на азызлы Хмылёў твар. Злосці ўжо не было, не было і варожасці, а замест гэтага ўспаміналася чамусьці, як

Хмыль капаў у сябе на двары калодзеж. Невядома, навошта спатрэбілася гэта яму, бо студняў у вёсцы было даволі. Напэўна, былі тут у Хмыля свае меркаванні, таму і прывёз ён з раёна цэментовыя кругі, на пару з жонкай апускаў іх у сырую глыбокую яму. Ды калодзеж выйшаў няўдалы, скасабочаны. Хмыль колькі дзён пасля гэтага хадзіў спахмурнелы, на кпіны адмоўчваўся, сурова чмыхаў носам...

— Дзядзька Мацей,— ціха і працяжна загаварыў Хмыль.— Што ж з дрывамі... Не гнаць жа каня назад... Можа, табе іх адразу завязём, га? — і забегаў каля воза, папраўляючы сядзёлку. У вінавата прыгнутых плячах, у мітуслівай запаволенасці рук адчуваліся разгубленасць і чаканне.

Мацей падняўся з карчука і моўчкі пайшоў у бок дарогі. Хмыль пастаяў з лейцамі ў руках, рушыў каня з месца. Выехалі на дарогу. Конік, напружваючыся, цягнуў цяжкі воз, парыпвалі працятыя маразам санкі. Першы зноў загаварыў Хмыль:

— Гхм!.. Ты не вінаваць мяне надта, дзядзька Мацей... Па бацьку цябе як? — і слепа глянуў яму ў твар.

— Максімавіч,— абыякава сказаў Мацей.

— Зразумей, Максімавіч... та-а-ак!.. Я, можа, сам хацеў, каб ты мяне тут заспеў. Хочаш вер, хочаш не. Памятаеш, як сустрэў цябе ў лесе? Стары, думаю, колькі сілы той, а за сухастоінай па горла ў снег лезе. І тут мне дацінае: глядзі вось, які я добры, які сумленны. Жывую лясіну з пня не звалю... Злосць мяне ўзяла... Ты не сярдуй, дзядзька Мацей, што гэтак гавару...

— Гавары!.. Не кожны пра сябе такое скажа...

— А сёння, як пачаў гэтыя цяльпушкі ў санкі кідаць — рукі не бяруць. Хоць бы, думаю, налучыў хтонебудзь, вылаяў, ці што...

«Бач, выслізгваецца як, каяцца ўжо гатоў»,— падумаў Мацей, і яму адразу зрабілася прыкра. Сказаў неахвотна:

— Дык вось, злавіў я цябе — лепш табе стала? — і, глянуўшы на Хмыля, адвярнуўся.

— Я табе так скажу,— быццам і не чуў Мацеевых слоў, вёў далей Хмыль.— Жыць кожнаму трэба... Вось ты на мяне на сходзе ўз'еўся, а за што? Сам ведаеш, падзарабіць ахвота...

— Ага,— аж спыніўся Мацей,— красці, значыцца, трэба! У калгасе, маўляў, красці можна? Падзарабіць?

А ці ж многа ты працаваў, ліха тваёй матары? Хамуты выдаеш, па каня першы бяжыш... А Мацей дурань, ён няхай з касою і сякерай ідзе... Скідай дровы, урвіцель чортаў, не трэба далей везці...

Мацей вырваў з рук у Хмыля лейцы, кінуўся да воза. Рука мітуслівая шукала вузел вяроўкі. Хмыль — за ім, наваліўся бокам на дровы, недаўменна лыпаў вачамі:

— Дзядзька Мацей, чаго ты?..

Мацей плюнуў, адбег убок. Усё яшчэ ўзрушаны, садраў з галавы шапку, надзеў і — зноў:

— Бач, які ты разумны — уга!

— Но! — крыкнуў на коніка Хмыль.— Стаіш, ваўкарэзіна!

Конік адразу ўзяў з месца. На павароце Хмыль агледзеўся: расхінуўшы на грудзях кажушок, Мацей памалу ішоў услед. Прытрымаў каня і, дачакаўшыся старога, памуляўся, збянтэжана папрасіў:

— Ты ўжо не кажы, дзядзька Мацей, у вёсцы, што я хацеў... дровы твае забраць. Зрабі такую ласку.

Мацей адгукнуўся не адразу:

— Можна і памаўчаць, чаго ж не... Толькі я табе скажу: ты свае дурыкі кінь. Сярод людзей жывеш — не ў лесе...

У дарозе падабраўся надвячорак. Шарэлі прагалы, у зарасніках гусціўся змрок. Больш адчуваўся мароз. Неба на захадзе было ў халодных ружовых разводах.

Неўзабаве выехалі з лесу і падняліся на пагорак. На бугрыстай яго хрыбеціне санкі з'ехалі ўбок: адразу пачынаўся спуск. Унізе дарога ўпіралася ў невялікі масток праз ручай, за мастком пачыналася вуліца. Каля крайняй хаты стаяла машына; незаглушаны, татахкаў матор. Машыну абступілі людзі, чуліся галасы. Вецер выдзьмуў з нечай цыгаркі зыркія іскрынкі, падхапіў іх і разнёс.

Хмыль каторы раз паглядзеў наперад, спыніў каня:

— Дзядзька Мацей, што далей рабіць?.. Здагадацца могуць...

— Ага, вось яно што,— з усмешкай абышоў Хмыля Мацей, стаў да воза.— Сумленне загаварыла, людзям у вочы сорамна глядзець?.. А ты не рабі так... Што стаіш? Ідзі, па загароддзю хавайся, калі як чалавек хадзіць не ўмееш. Там ні адной душы няма, адны сляды сабачыя... Давай сюды лейцы!

Хмыль згорбіўся, саступіў з дарогі. Мацей бачком падсеў на дровы, варухнуў лейцамі. Конік затрусіў з пагорка, стала заносіць санкі. «Ого, так і перакуліцца можна!» Нацягнуў адну лейчыну, крыкнуў Хмылю:

— Каня сам завяду — чуеш? Конь калгасны: адбіраць не прыйдзеш!

Хмыль не азваўся. Санкі лёгка каціліся з гары. Перад мастком Мацей азірнуўся. Хмыль усё стаяў на пагорку, напэўна, раздумваў, ісці яму вуліцай ці па загароддзю, хаваючыся ад людскіх вачэй. «Думай, думай,— усміхнуўся Мацей,— даўно трэба». І паехаў на галасы, што чуліся ля машыны...

1959

ВОСЕНЬСКІ ЎСПАМІН

Той восенню я жыў у вёсцы. Быў верасень, стаялі цёплыя, ціхія, поўныя празрыстасці і бляску дні. Кволасць і знямога, здавалася, былі разліты ў паветры, яны адчуваліся ва ўсім: у слабым зіхаценні ўжо халаднаватай смугі, у самотным іржышчы, што млява сірацела на сонцы.

Цэлымі днямі на вуліцы рыпелі вазы — з поля звозілі авёс і грэчку. Ля калгаснага гумна гудзеў камбайн, і ў перапынках між работай дзяўчаты спявалі:

Ой, наступае
Восень халаднáя,
Ой, ды ў бярозы
Лісток ападае.

Я чуў гэтую песню амаль кожны дзень, грузячы разам з хлопцамі на машыны высахлы з лета торф: мы прыехалі сюды з горада нарыхтоўваць паліва.

Начавалі і сталаваліся мы ў вёсцы, жылі па хатах. Мая гаспадыня была ўвішная, рухавая кабета, нягледзячы на свае пяць дзесяткаў год. Кожную раніцу я прачынаўся ад яе голасу: тупаючы па хаце, старая будзіла сына, крыху гультаяватага хлопца:

— Мікіта, а-а Мікіта! — надрывалася яна.— Не, дачакаешся, лежань, што за ногі сцягну...

Мікіта адварочваўся да сцяны і нешта мармытаў.

— Выхворваешся ты ў мяне, вылежваешся,— буб-

ніла цётка Аўгіння,— а тады зноў да галубоў... Павыкідваю пустэчу гэтую — дачакаешся...

— Не выкінеш... Не ты прынесла...— агрызаўся Мікіта сонным голасам.

— Ах, каб цябе,— злавалася старая,— дваццаць гадоў мае, а дзяцініцца...

З галубамі Мікіта бавіў час, калі выпадала быць дома. Ён выпускаў іх з самаробнай скрынкі на дах, клаўся пад плот на траву і, не адрываючыся, сачыў за птушкамі. Яго драбнаваты твар мякчэў, губы кволіла ўсмешка, а ўважныя вочы глядзелі пільна з-пад доўгіх веек. Калі я быў у гэты час непадалёк, Мікіта, не паварочваючы галавы, клікаў мяне:

— Хадзі паглядзі, як галубы цалуюцца. Ты ж не бачыў мо!

Я лажыўся на траву побач з ім і глядзеў на забавы птушак. Белая галубка ціха і сумна буркавала, ля яе круціліся два галубы. Адзін — шызы, паважны — самавіта хадзіў, выпінаючы грудзі; другі — шчуплейшы, увесь час наскокваў на яго і адразу ж адбягаў.

Настырнасць шчуплага галуба па-дзіцячы радавала Мікіту.

— Ата-та! Так яго! — выгукваў ён і пляскаў далонямі па зямлі.— Бач, прыгожы, халера, як гарадская дзеўка. А скажы ты мне,— пытаўся раптам ён,— чаму гэта вашы дзеўкі прыгожыя, а нашы дык нязграбныя нейкія, га?

— Ну, што ты! — здзіўляўся я.— Бо прыглядзеліся табе свае.

— А можа, і так,— падумаўшы, згаджаўся Мікіта.— Вось Ганка... Яна яшчэ прыгажэйшая за гарадскіх.

— А хто яна, Ганка? Тут жыве?

— Во, ты і не бачыў... Яна ж да нас прыходзіць, маці памагае.

— Яна вам радня якая, ці што?

Мікіта, перш чым адказаць, зірнуў на мяне і немаведама чаго засмяяўся. Я здагадаўся, што Ганка яму ніякая не радня, а пра большае і не думаў дазнацца. Але Мікіта раптам сам загаварыў:

— Маці мяне жаніць хоча, кажа: чаго ты, дурны, да яе падступіцца баішся. А я і праўда баюся Ганкі, сорамна неяк. Толькі калі вып'ю, дык праводжу...

— Ну і як?

— Ат, не ведаю... За ёй колькі бегала ўжо, ды ўсё так. «Два — сем» ногі сабе адбіў, бегаючы...

— Які «Два — сем»?

— Не ведаеш? Ну, шафёр наш. Дзеўкі яго так празвалі. Кажа: з адной жонкай два месяцы жыў, з другой — сем... Потым яшчэ Жэнька Бохан бегаў, той, што на ляснічага недзе вучыцца. Гэты дык і праўда брыдкі нейкі: як дзеўка, рознымі мазямі мажацца ды валасіны лічыць, колькі вылезе...

Ганку я ўбачыў на другі дзень, пад вечар, калі прыйшоў з работы. Гаспадароў дома не было. Я ўспомніў, што Мікіта яшчэ ўчора збіраўся ў суседнюю вёску па махорку, а старая павезла ў горад яблыкі.

У хаце, зморанын цеплынёй, саладкаватым пахам памідораў, што ляжалі навалам на падаконні, сонна гулі мухі. Ля печы стаялі недагледжаныя чыгункі з бульбай, у парозе валяўся на смецці венік. У цёткі Аўгінні было цяпер шмат работы, і ёй не было калі зважаць на такую дробязь, як парадак у хаце. «Сытаму ды здароваму ўсё добра»,— казала яна. Дома цётка Аўгіння хадзіла ў зашмальцаванай капоце, босая, у панчохах без ступакоў.

У той дзень мы нагрузілі многа машын, і я адчуваў сябе крыху стомленым. Сеў за стол, закурыў скамечаную, напалову высыпаную папяросу і стаў глядзець у акно. За плотам стаяў маўклівы і задуменны сад. Кранутае жаўцізной лісце холадна бліпчала пад промнямі нізкага сонца, і буйныя гронкі пладоў былі залітыя роўным васковым святлом. Сад нібы дагараў у нейкай урачыстай, апошняй знямозе.

На двары ляпнулі веснічкі, я падаўся да акна. Нейкая дзяўчына, невысокая, без хусткі, ішла да ганка, крыху схіліўшы галаву ў задуменнасці ці па звычцы. Я не паспеў яшчэ што-небудзь падумаць, як яна нечакана з'явілася на парозе і, убачыўшы мяне, затрымала руку на клямцы:

— А я... мне здалося, што гэта Мікіта дома.

Я адразу адчуў сябе няёмка, быццам быў вінаваты, што таго не было ў хаце, і чамусьці перапытаў:

— Вы да Мікіты? Ён...

— Чаму?

Мяне здзівіў яе голас, тое, як яна сказала гэта «чаму». Голас быў роўны, ціхі і глыбокі — з нейкімі густымі. дрымотнымі ноткамі. Я глядзеў на яе, не ведаю-

чы, ці запрасіць астацца, ці зноў сказаць пра Мікіту. А яна заўважыла ў парозе смецце, схапіла засланку і стала завіхацца з венікам. Тады я здагадаўся, што гэта Ганка. Я з цікавасцю паглядзеў на яе. Кідаліся ў вочы чорныя яе валасы, што спадалі на шчокі, на лоб. Нос быў прамы, зграбны. Шчокі расчырваneліся: можа, ад сарамлівасці, а можа, ад старання.

Я чамусьці не стрымаў сябе і сказаў:

— Канешне, вы Ганка, і я ведаю вас.

Яна выпрасталася і без здзіўлення глянула на мяне:

— І я вас ведаю...

— Адкуль?

— Бачыла, мы ж суседзі...

Я змоўчаў. Ганка ўзяла засланку са смеццем і выйшла з хаты.

— Мне яшчэ трэба бульбы накапаць,— сказала яна, вярнуўшыся.— А можа, вы есці хочаце, дык я пашукаю.

Яе шчырая прастата ўразіла мяне, няёмкасць адразу прайшла, і я загаварыў жартаўліва:

— Не, не трэба, я лепш пайду з вамі на агарод. Памагу ды заадно пагляджу, на што вы здатныя. Можа, цётка Аўгіння благую выбрала нявестку.

Ганка зірнула на мяне спакойнымі прамяністымі вачамі, а мне аж балюча стала за іх ясную даверлівую чысціню.

— Чаму? — выдыхнула Ганка.— Я памагаю цётцы Аўгінні... Яна просіць. Навошта ж вы так?

— Я больш не буду,— паспяшаўся апраўдацца я.— Пойдзем. Возьмем рыдлёўку і пойдзем.

Мы выйшлі з хаты, пералезлі цераз невысокі абцісnуты плот і апынуліся ў агародзе. Паміж яблынямі тырчалі пачарнелыя кусты бульбоўніку; у барознах траплялліся яблыкі. Пахла падапрэлым лісцем, прэсным халадком зямлі — восень скупая на пахі.

— Як свежа,— сказаў я,— пах такі...

— Ага,— адгукнулася Ганка,— нейкі... нішчымны,— і павяла ў паветры рукой.

Мы ўзяліся за работу: я рыдлёўкай выкопваў бульбу, а Ганка падбірала яе. Неяк няўдала страсянуўшы бульбяны куст, я сыпнуў зямлёй на Ганчыны ногі. Ганка засмяялася і, скачучы на адной назе, стала здымаць тапачку, але не ўтрымалася і хіснулася ўбок.

Я выставіў рукі, каб падтрымаць яе, і незнарок крануўся дзявочых грудзей. Гэта выйшла так нечакана, што я разгубіўся, а калі падняў вочы, то якраз перад сваім тварам убачыў Ганчыны вусны, і мне на момант здалося, што я адчуў іх дрыготную цеплыню... Ганка адхіснулася і паволі стала вытрасаць пясок з тапачкі. Я падбіраў рассыпаную бульбу. Маўчалі.

— А вунь і цётка Аўгіння...— загаварыла першая Ганка.

Старая ішла не з вуліцы, а напрасткі праз поле. Яна ўбачыла нас, падышла бліжэй, торкнула рукою пад хустку, папраўляючы валасы, і, заклапочаная, паскардзілася:

— Ах, каб цябе... Зацягалася зусім... А табе Мікалай памагаў...— і яна неяк вымушана ўсміхнулася.— Дык хадзем, Ганначка, у хату: я тут селядцоў купіла, можа, сваім занясеш.

— Ой, што вы, цётка Аўгіння! Не трэба нам. Я пайду.

— От, скажы ты, не трэба ёй...— загаварыла ўслед Ганцы старая.— У цёткі, дзе яна жыве, шасцёра душ... Не пашчасціла дзеўцы: бацька памёр, як і мой гаспадар, а потым і маці... Дык я і думаю: вось каб яны з Мікітам сышліся. І мне падмога якая, і хлопца ў рукі ўзяла б. Добрая дзеўка, ой, добрая!

— Ага! — услед за старой сказаў і я.

— Ну вось і ты кажаш... Падабаецца, бачу...

Мне і праўда падабалася Ганка, і здавалася, што толькі са мной яна трымалася так шчыра, ласкава, што толькі на мяне даверліва глядзелі яе вочы.

— Охо-хо! — уздыхала старая.— Такую дзеўку хоць каму — няшчасця не меў бы... А дзе гэта сёння Мікіта?..

Мікіта прыйшоў, калі ўжо зусім сцямнела. П'янаваты, галодны, ён накінуўся на селядцы і ўсё бурчаў, што не зварылі бульбы. Я таксама прагаладаўся, і яда была мне ўсмак.

— Пайшлі гуляць,— нарэшце ўстаў з-за стала Мікіта.— У Хведарчыхі дзеўкі ўжо даўно сабраліся... Дык пойдзеш?

Я згадзіўся.

— Куды ты? — занепакоілася цётка Аўгіння.— Ля саду пабыў бы, а то залезе ліхадзей які — усё голле патрушчыць...

— Цэлы твой сад будзе,— адмахнуўся Мікіта і пацягнуў мяне з хаты...

— Бачыў тваю суседку,— сказаў я яму на вуліцы.

— Спадабалася?

— Нічога сабе. Будзеш яе сёння праводзіць?

— Чаму ты пытаеш? — усміхнуўся Мікіта.

— Ды ты ж выпіў, бачу...

— Якое там...

Мы зайшлі ў нечую хату, дзе і сапраўды было многа дзяўчат. Нікога з іх я не ведаў, акрамя Ганкі, якая ветліва ўсміхнулася нам і зашаптала нешта сваёй суседцы. Тая, убачыўшы незнаёмага, паспешліва паправіла хустку, непрыкметна выпусціўшы на лоб узбітыя кудзеркі. Мы прайшлі да стала, за якім заўзята пыхкалі цыгаркамі хлопцы, і прыладзіліся там на лаве. Закурылі. У шызых палосах дыму патрывожаная лямпа гайдалася, як на хвалях.

— Мікіта! Мікалай! — гукнула Ганка.— Ідзіце сюды! І вы, хлопцы, таксама: будзем гуляць у фанты.

Прапанова ўсім спадабалася, заядлыя дымакуры падняліся з-за стала, ажывіліся дзяўчаты. Адразу стала шумна. Гаспадароў штосьці не было відаць, толькі нехта спаў на печы. Я пайшоў да Ганкі і сеў побач з ёю.

Пачалася насцярожаная, шумлівая гульня. Ганку выклікалі часцей за другіх, а я, чамусьці засмучоны, ні разу не назваў яе.

— Чаму вы невясёлыя? — спыталася ў мяне Ганка.— Глядзіце, прайграеце — потым не адкупіцеся.

Але яна сама была няўважлівая. У яе ўжо забралі брошку, а потым, смеючыся, яна дастала з валасоў грабеньчык. У мяне забралі партабак.

— Хопіць! — выкрыкнуў нехта.— Давайце судзіць!

Двое хлопцаў адразу забралі фанты, падаліся ў парог і доўга нешта там шапталіся. Потым адзін з іх выйшаў на сярэдзіну хаты і, хаваючы рукі за спіною, спытаў:

— Што гэтаму фанту?

— Прывезці з лесу дровы! — пачуліся галасы. Нехта засмяяўся.

Хлопец выставіў перад сабою мой партабак. Я разгубіўся, не ведаючы, што трэба рабіць у такім выпадку, але мне падказалі. Я выйшаў на двор і пагрукаў у сцяну знойдзеным на двары паленам.

Надышла чарга і да Ганкі: яе прымусілі танцаваць

«Лявоніху», і, саромеючыся, яна прайшлася ў танцы па хаце. Потым судзілі два фанты разам, і Ганцы выпала цалавацца з нейкім хлопцам. Той падступіўся да яе, угаворваў, пазіраючы на прысутных: глядзіце во, я раблю сваю справу, усё залежыць не ад мяне. Але Ганка адварочвалася і штурхала занадта стараннага хлопца ў грудзі. Усе закрычалі, пачалі настойваць, Ганка раззлавалася, села на лаву і, прыціхлая, абыякава глядзела на гульню.

Самая пара была ісці дамоў. Я сказаў пра гэта Мікіту, але ён хацеў астацца: ніхто яшчэ не думаў разыходзіцца. Я неўпрыкмет выйшаў.

Над вёскай ціха распасцерлася месячная ноч. Густыя цені ляжалі на вуліцы. Дзесьці, відаць, на калгасным двары, моцна гамапілі. Залівіста брахаў сабака. Я пачуў, як нехта мяне лёгка наганяў. Я абярнуўся і ўбачыў Ганку.

— Дамоў?

— Ага...

Мы пайшлі побач — паволі, не размаўляючы. Часам плечы нашы краналіся, і тады Ганка сарамліва і ціха смяялася. Я ўзяў яе руку ў сваю і пачаў перабіраць пакорлівыя цёплыя Ганчыны пальцы. У гэтую хвіліну яна здавалася мне такой зразумелай, такой блізкай...

Мы спыніліся ля нечай хаты. На дарогу ярка клаўся чорны цень ад плота. Я лёгка прыцягнуў Ганку за рукі і, схіліўшыся, стаў цалаваць яе ў цёплыя, трошкі шурпатыя губы. Ганка тулілася да мяне і маўчала...

І я маўчаў таксама.

Ёсць хвіліны прыемнай блізкасці паміж людзьмі, нейкай ціхай узрушанасці і лагоды, светлай, як восеньскі дзень. Гэта добрыя хвіліны і добрая блізкасць, якой не трэба слоў. А мне ж падабалася Ганка, мне было хораша з ёю, не думаў я тады і пра Мікіту.

Але ён сам напомніў аб сабе. Ён ішоў па вуліцы і быў ужо непадалёк ад нас. І я, і Ганка бачылі гэта. «Не выседзеў,— з нейкай злосцю падумаў я,— Ганка ўцякла...» Не згаворваючыся, мы ціха адступілі да плота, падаліся ў двор і прытуліліся там да сянец. Мікіта прайшоў неўзабаве: ён, мусіць, бачыў нас і ўсё зразумеў...

Я нядоўга заставаўся пасля яго. І толькі тады, калі Ганкі ўжо не было са мной, мне раптам стала сорамна

за сябе і прыкра. Я ўспомніў учарашнюю размову з Мікітам, тое, як даверліва расказваў ён пра Ганку, сённяшнія словы цёткі Аўгінні і ніяк не мог ні зразумець, ні даравапь сабе нядаўні ўчынак.

Асцярожна зайшоў я ў хату, і, пакуль распранаўся, хацелася, каб Мікіта паклікаў мяне і загаварыў са мной. І ён сапраўды азваўся:

— У цябе ёсць курыць што? У мяне дык усё выкурылі — і не даць нельга...

Я ведаў, што Мікіта лгаў. Мне зрабілася яшчэ больш прыкра.

— Даўно прыйшоў? — з цяжкасцю вымавіў я.

— Я? Услед за табой... Як ты ад Хведарчыхі выйшаў...

— А-а... Ты ж яшчэ заставаўся...

Больш я не ведаў, што яму сказаць. Я паплёўся да сябе на ложак, каб доўга не заснуць у тую ноч...

А назаўтра вечарам да мяне падсела старая і, раз-пораз уздыхаючы і папраўляючы на галаве хустку, жаласліва загаварыла:

— Ці ёсць жа ў цябе, хлапечык, бацька, га? Яно добра, што ёсць: матцы падмога. А без бацькі цяжка, ой, як цяжка. Мой чалавек дык памёр, крэпкі быў мужчына, а памёр. І хвароба нейкая халерная падступілася: прастудзіў галаву, памарнеў з год — і няма чалавека... А сын дык з вайны галавы не прынёс. Прыгожы быў хлопец, не тое што Мікіта — дзеўкі гужам услед бегалі... Ах, што ж гэта я: малако трэба ў печ ставіць, за ноч, можа, і скісне.

Цётка Аўгіння мітусілася ля печы і ўсё гаварыла. «Прачула нешта,— падумаў я,— як непрыемна...» А старая зноў падышла да мяне, стала збоку, журботна схіліўшы галаву і апусціўшы рукі.

— Дзеўкі цяпер надта пераборлівыя сталі,— казала яна,— глядзяць, каб і прыгожы хлопец быў, і гарадскі яшчэ. А таго не ведаюць, што з чалавекам век векаваць: трэба, каб мужык добры быў... Мікіта вось мой. І дома памагае, і ў калгас дзень у дзень ходзіць... А другая ўсё шукае палаўчэй: ого!.. А ты жанаты, хлапечык, ці не? Гадоў табе, мусіць, многа...

Яна раптам засмяялася — нягучна, стрымана, нібы саромелася свайго смеху.

— Гэта я чула, што ты да дзеўкі нашай ходзіш,—

не гледзячы на мяне, сказала яна і чамусьці выцерла твар фартухом.— Яно што ж...

І зноў ціха паскардзілася:

— Яно што ж... Маладому пагуляць хочацца, а другая думае, што чалавек да яе ўвесь...

Мне хацелася схлусіць, сказаць, што я жанаты, тады б старая разнесла гэта па вёсцы, і Ганка старанілася б мяне. Але, збянтэжаны, я прамаўчаў.

У той вечар я не пайшоў на вуліцу і рашыў не бачыцца з Ганкай. Мікіта ўжо не клікаў мяне на гулянкі і кожны вечар знікаў некуды адзін...

Надышла пара вяртацца ў горад. Я не адступіўся ад свайго рашэння і не сустракаўся з Ганкай. Аднойчы яна зайшла да нас у хату і гаварыла аб нечым са старой. Я ўвесь час прабыў за перагародкай і не паказаўся на кухню. Калі Ганка выйшла, не стрымаўся, зазірнуў у акно і ўбачыў, як яна, схіліўшы галаву, задумення ішла да веснічак. Успомніўся першы яе прыход, стала балюча і журботна...

І вось з той пары прайшоў год, і зноў настала восень, якая ў горадзе не мае асаблівых прыкмет. У скверах шамаціць пад нагамі лісце, а пах зямлі, раскапанай экскаватарам, будзіць у памяці другую восень і другія дні. І я ўспамінаю Ганку, яе голас — роўны, глыбокі, з густымі дрымотнымі ноткамі...

Навошта я так абышоўся з ёю, чаму?

Мне хочацца зноў паехаць у вёску, убачыць Ганку, падысці да яе і сказаць: «Даруй мне, я ашукаў цябе і сябе таксама».

І мне не дае спакою восеньскі ўспамін.

1958

ДВОЕ Ў ЛЕСЕ

У. Громаву

Папалуднаваўшы, яны маўкліва вырашылі, што гадзіну якую можна і адпачыць. Месца якраз ім траплялася добрае — гальнае і сухое. За колькі крокаў адсюль баравіна спадала ў нізінку, а там купчасціўся ўжо ягаднік ля струхнелых пнёў, чарнела сатлелае

голле. Яшчэ далей цёмная сцяна ялін прашыта была тонкімі ствäламі рэдкіх бярозак: да нізінкі неўпрыкмет падступала зацішнае, змрочнае ўрочышча.

Але тут, на самым краі светлай баравіны, было суха, цёпла ад зямлі, нагрэтай сонцам, густа ўсыпанай шорсткім шыголлем і кволымі лусачкамі маладой сасновай кары. Седзячы, можна было доўга глядзець на неба, што свіцілася за калматымі хвоямі, любавацца ласкавым золатам высокіх ствалоў: адсюль, з зямлі, здавалася, што яны сыходзіліся ўгары.

Напрацаваўшыся як мае быць, рэжучы дровы, Васілю цяпер прыемна было адчуваць гарачую млявасць у руках, у плячах — ва ўсім целе. Прыемна было і тое, што вось яны, удвух толькі тут, у лесе, зараз маўчаць, пад ціхі пошум соснаў думаючы кожны сваё. Васіль дык нават і рады быў гэтаму, бо ён жа ведаў, якой нялёгкай бывае часам гаворка з чалавекам, калі ў цябе з ім выйшла нешта не зусім прыемнае, яшчэ і цяпер не яснае да канца — і таму невядома, як табе глядзець на яго, таго чалавека, і як яму глядзець на цябе...

А можа, ён, Мікола Клыбік, сённяшні Васілёў напарнік, можа, ён ні пра што і не думаў. Выцягнуўшыся на ўвесь свой немалы рост, ён ляжаў на зямлі нерухома, з заплюшчанымі вачамі, адну руку паклаўшы пад патыліцу, другою згробшы на грудзях выцвілую кашулю — шырокую, з доўгімі рукавамі, пераціснутымі гумкай вышэй локця, і без каўняра. Каўняры начэпліваліся некалі пад гальштук; у Клыбіка, школьнага рахункавода, толькі ў аднаго і былі ў вёсцы такія кашулі.

Няйначай, як Клыбік заснуў, і Васіль глядзеў на яго, на ягоны твар з ладнаватым носам, на высокія залысіны пад пукатым ілбом і не мог зразумець, змарыўся гэтак чалавек ці ўжо такая звычка ў яго — засынаць хутка. І яшчэ ён думаў, што сёння Клыбіку завельмі стамляцца і не было як: работнік ён быў так сабе, упаўсілы цягаў пілу, ды і тут цаляў, калі падразалі лясіну, каб Васіль заходзіў з левай рукі — з правай рэзаць было і лягчэй, і зручней.

Рухі ў Клыбіка вялыя і няпэўныя нейкія, і гледзячы, як ён брынкаў сякерай па суччу ці перакочваў гатовы кругляк, успамінаўся чамусьці ягоны бацька, гэткі ж высокі і гламаздаваты, як і сын. Пра бацьку ў вёсцы казалі, што праз ляноту сваю ён жыў у неда-

гледжанай хаце, а то расказвалі яшчэ, што раніцай, калі не было чым распальваць у печы, хадзіў ён на двор абчэсваць сцены старога клетушка.

Стары Клыбік вельмі ганарыўся сынам, які ў арміі нібыта пісарам быў і заадно падвучыўся там цягаць гармонік.

— Э-э, сама гэта, гэта сама,— даводзіў ён любому стрэчнаму,— Міколка дык па мне пайшоў. Гэта сама, я ў паляванні толк знаю, а ён на гармоніку... э-э... гузікі, гэта сама, як чорт, перабірае. Скажу я табе, ён у мяне і строгі. Як прыйшоў гэта са службы, старая мая перад снеданнем высыпала бульбу на ручнік, дык ён, гэта сама, як крыкне! Некультурна, кажа, есці не буду. Строгі ён у мяне, ого...

І яшчэ большы гонар займеў стары, калі сын, на здзіўленне вяскоўцам, з тутэйшай настаўніцай зладзіў вяселле.

На тое вяселле Васіль і блізка не пайшоў, бо і без чаркі на душы было горка... І ніяк не мог зразумець тады, як жа гэта здарылася так, што тая Марына, якую ледзь не лічыў сваёй, будзе цалавацца на людзях з Клыбікам і сядзець за сталом з ім побач. А можа, і замнога браў ён на сябе, так думаючы,— можа, так... І ўсё ж горка было на душы, вельмі горка. Прайшла з цягам часу, развеялася тая горыч, здавалася, вось ужо і забыта ўсё, ды дзе там: развярэдзіў старое сённяшні дзень, цыбаты Клыбік, ад якога цяпер нікуды не дзенешся, бо трэба ж працаваць разам. І ён ужо злаваўся на сябе, незадаволена думаў: «І навошта толькі згадзіўся на гэту работу?..»

Учора вечарам прыйшоў дадому бацька, сказаў, што ў школе атрымалі білет на дровы, дык дырэктар загадаў яму і Клыбіку збірацца заўтра ў лес. Яны ж з маці глядзяць школу, дык адмаўляцца няма як, ды і капейка нейкая за работу будзе. Ён і сам пайшоў бы з Клыбікам, але мужчыны будуць ставіць заўтра Цімоху Брычыкаву хату, прасілі і яго, таму няхай у лес з Клыбікам ідзе Васіль.

Толькі гэтага не хапала, і Васіль аднекваўся спачатку, але бацька нечакана пачаў злавацца. Тады ён падумаў, што, можа, і не варта псаваць старому настрой, бо ў Брычыкавых будзе заўтра талака, будзе вясёлая работа, а потым мужчыны гуртам сядуць за стол, вып'юць трохі, і для ўсіх настане як бы свята.

І Васіль згадзіўся.

Ён не пайшоў на вуліцу, а, узяўшы посцілку, раней зазвычай палез на вышкі.

Спаць не хацелася, і лежачы ён думаў шмат пра што, баючыся чапаць у думках хіба аднаго Клыбіка. Трохі запозна прывезлі з мястэчка ў магазін хлеб, і вось па вуліцы хадзілі людзі, ціха перамаўляючыся, а потым нехта галасна пытаўся, куды пагналі на начлег конюхі коней. Там, на вуліцы, быў цёплы вечар, і Васіль прыгадваў, як учора яны з хлопцамі хадзілі на ігрышча ў суседнюю вёску і якая густая цёплая і бязросная была ля дарогі трава: казалі, што гэта на змену надвор'я. І вось яму ўспамінаўся ўжо іншы вечар, такая далёкая цяпер і ўсё ж па-даўняму харошая Марына...

Тады прайшла па вёсцы чутка, што прыехала новая настаўніца. Казалі, што яна маладая і прыгожая. Праз колькі дзён пасля гэтага Васіль убачыў яе і сам. Ён бяліў у школе сцены, калі туды зусім нечакана зайшла яна, такая загарэлая ўся, светлавалосая і тонкая — зусім не падобная да настаўніцы. Неяк пахарошаму апрошчвала яе, лагодзіла даверлівая цеплыня па-дзіцячы няхітрых і шчырых вачэй: здавалася, калі глядзеў у іх, што там няспынна плавіліся блакітнаватыя льдзінкі — такое адтуль ішло суцішанае чыстае святло. Ільдзінкі — гэта так здалося, мусіць, Васілю, бо позірк быў цёплы, ласкавы і без усякай на тое прычыны зычлівы.

Дзяўчына адразу выпытала Васілёва імя і, быццам толькі і клопату было ёй, каб адкрыцца незнаёмаму чалавеку, загаварыла:

— Скажыце, вам падабаецца ў вёсцы, праўда? Вы ўвесь час тут жывяце? Я, ведаеце, дык сама напрасілася сюды, хоць вёску толькі па кніжках і знаю. Ой, вы не смейцеся толькі, добра? Бывала, дзе ў кніжцы прырода апісана, дык я ўсё чытаю, чытаю... А вы, бачыце, які вялікі, дужы... Гэта таму, што фізічна працуеце, праўда?

Ён адказваў нешта, усміхаўся шчыра і зусім не адчуваў сябе з ёю ні сарамяжліва, ні няёмка, бо гаварыць з дзяўчынаю было лёгка, ды і ніякай думкі наперад не меў Васіль тады пра яе.

А потым быў вечар, той іх першы вечар, які Васіль дагэтуль добра памятае і пра які, можа, не забылася

яшчэ яна... Тады была вечарынка, можа, лепшая, чым заўсёды. Як назнарок у яго быў на той вечар вельмі добры настрой. А ўсё пачалося з таго, што Андрэйчыкаў Хведар, трактарыст і надта баламутны хлопец, выпрасіў у Васіля казыркастую флоцкую фуражку — даўні падарунак яму ад марака, стрыечнага брата. Дык вось, гэты Хведар так узрадаваўся нечаканаму набытку, так смешна кляўся Васілю ў дружбе, пералічваючы заадно выгоды, якія будзе мець цяпер перад іншымі хлопцамі, што Васіль развесяліўся, разлагоднеў, быццам не ён сам, а Хведар зрабіў яму даўно жаданую ласку. Яны і на вечарынку прыйшлі разам, і, як гэта патрабуе даўняя звычка, пастаялі спярша ў парозе, агледзеліся... Гралі сербіянку, стары, невядома кім і калі занесены сюды танец. Танцавалі жанчыны, з прыпеўкамі, заўзята выбіваючы нагамі адна перад адной:

— Сербіянка, мая мамка,
Дзе ты абрасілася?
— На балоце я ў чароце
Танцаваць вучылася.

Гледзячы на іх, можна было здагадацца, што былі ў некага радзіны ці яшчэ якая кампанія. Мабыць, жанчыны ішлі дадому, а на дарозе ўстаў клуб са светлымі вокнамі, з пералівістым граннем гармоніка, з вясёлым лёскатам бубна — і яны не маглі стрымацца, каб не зайсці...

Граў Клыбік, вельмі сур'ёзны і заклапочаны, як заўсёды, калі цягаў гармонік. Пад нагамі ў яго быў падстаўлены нечаю рукою кругляк, на каленях — разасланая хустка: баяўся малады Клыбік працерці гармонікам штаны. І яшчэ любіў ён, калі граў, каб стаяла побач якая дзяўчына і час ад часу выцірала з ягонага твару сваёй хусцінкаю пот.

Адбыўшы сваё, пайшлі нарэшце дамоў жанчыны, і пачаліся сапраўдныя танцы. І тады падышла да Васіля Марына, можа, выпадкова як, а можа, пагаварыць ёй хацелася. Жартуючы, ён запрасіў яе і потым ледзь не вечар танцаваў з ёю, і яму было добра. А Марына ўсё баялася, што ступае не гэтак, не па-вясковаму, што гэта заўважаць і будуць смяяцца...

І вось сядзі цяпер тут, на адзіноце, з Клыбікам і думай. І як жа здарылася пасля ўсё — незразумела так і скора, чаму і навошта? І каб жа знайшла сабе

шчасце з гэтым Клыбікам, а то ж, відаць, не. Ходзіць заўжды задуменная нейкая, лепш бы не бачыць яе такой. Ды і жанчыны вось нешта кажуць: не ладзіцца ў нашай настаўніцы жыццё і наракаюць на Клыбіка. Жанчыны ведаюць, дарэмна гаварыць не стануць...

Шуміць паціху лес. Сухі духмень стаіць у бары, і толькі няўлоўна тонка, але востра пахне патрэсканымі шышкамі, падсохлым голлем і леташнім лісцем. Відаць дарога непадалёк адсюль і на той бок яе — маладым сасоннік. Яшчэ бліжэй, пасярод баравіны, спадзіна: цэлы статак серабрыстых асінак пасецца там, і адтуль, разам з сонечнымі скавышамі, што струменіста ходзяць між сасновых ствалоў, прыплывае часам нязвыкла гаркавы пах асіны, а то і негусты водар менш чым дзе нагрэтай сонцам зямлі...

Шуміць лес, і аднастайны голас яго Васілю — супакаенне і лагода. Можна доўга глядзець наўкол, і позірк тады робіцца бяздумным, падобным да таго, калі забірае тваю ўвагу полымя. І нешта шчымлівае і трошкі самотнае кладзецца на сэрца, і зноў хочацца думаць, ну, хаця б пра той іх першы з Марынаю вечар...

Само сабой здарылася так, што, калі скончылася вечарынка, яны адсталі ад усіх і пайшлі па вуліцы побач. І адразу ўзяла іх у свае абдымкі шырокая, недаступная маўклівасць цёплай ночы. Свяціў месяц, маленькія аблачынкі застылі ў небе, нібы той качыны пух на вадзе. Сцішанасць панавала наўкол, і нават тое, што наперадзе гаварылі, смяяліся хлопцы і дзяўчаты, не магло парушыць агульнага ўражання ночы: вёска спала.

Паціху ішлі яны вуліцай. Шырокая абчэсаная калода трапілася ім, і яны селі на яе пад трапятлівую засень таполі, прасвечанай зіхоткімі пераліvамі месячнага святла.

Васіль маўчаў, а Марына гаварыла ўсё да яго, гаварыла, якраз як тады, калі заходзіла ў школу, толькі больш задуменна неяк — і ўсё заглядвала Васілю ў вочы, нібы тое дзіця, што чакае ад дарослага ласкі:

— Каб вы ведалі, як мне цікава тут у вас: і вечарынка гэта, і людзі, і ўсё.— Яна ціха засмяялася.— Слухайце. Калі сёння тыя жанчыны выйшлі з прыпеўкамі, мне было неспакойна неяк, боязна... Не, не тое, як бы гэта вам сказаць? Нібы я сама вось гэтак выйшла б на круг і спявала, людзі б глядзелі на мяне, а

вы стаялі дзе-небудзь збоку і трывожыліся б за мяне, за мой голас... Вы разумееце?

І Васіль згодна ківаў галавою, усміхаючыся Марыне, яе гаворцы, сваім думкам. Быццам нейкая лёгкая і чыстая хваля падхапіла і несла яго: і гэтая ноч, і высокі месяц над вёскай, і росны выган за вуліцай у такім свежым і ядраным бляску — усё здавалася Васілю новым, нібы ўбачаным упершыню. Яму хацелася сказаць Марыне, як ён разумее яе і як яна добра зрабіла, што прыехала сюды ў вёску, але ён маўчаў, прыслухоўваючыся да нечага шырокага і лагоднага, што нараджалася і расло ў ім. Было лёгка і прыемна думаць, і гэтак жа лёгка думкі кладаліся ў словы, і ён тады размаўляў з Марынаю: «Ты харошая, Марына, ты добрая. Чакай, і я раскажу табе пра нашу вёску, пра ціхія раніцы і духмяныя ночы, пра заход сонца, калі такая ціша стаіць наўкол і лянiва сцелецца па зямлі першы дымок ад ранняга вогнішча. Я раскажу табе, як прыходзіць сюды вясна, як слаба і хвалююча пахнуць тады на дрэвах пупышкі, як чарнее сад на вечаровай ружовасці неба. Ты пачуеш, як хрумсціць тонкі лядок пад нагамі, а вось, бачыш, прайшла машына, але яшчэ доўга будзе стаяць у паветры вастраваты пах бензіну. Чуеш, недзе ляпнулі дзверы, і гук вясёлым пошчакам лапаціць па драніцы дахаў. Слухай, і ты пачуеш, як гудзе цёмнай ноччу ў полі трактар, як пяюць на малацьбе дзяўчаты,— у тую пару, калі падаюць у садзе яблыкі і падаюць з неба зоры. Слухай, і ты зразумееш, што зімою тут гэтак жа хораша, як і летам, а ў марозную ноч Млечны Шлях блішчыць, як пад месяцам торная дарога... Слухай сваё сэрца, Марына, яно ў цябе добрае — слухай, і яно цябе не падмане...»

Так, у думках, гаварыў ён з Марынаю, і, вядома ж, магло быць гэтак, што яна разумела яго, бо, калі Васіль узяў асцярожна і мякка сціснуў яе руку ў сваёй, Марына прытулілася да яго пляча і маўчала.

— Якая прыгожая, светлая ноч сёння,— сказала яна потым, і цяпер ужо Васіль не сумняваўся, што Марына здагадалася пра тое, што ён змоўчаў.

Была ноч, і месяц свяціў аднолькава і яму, і ёй...

І каб жа гэтую ноч успамінаць заўсёды, і каб жа не было таго незразумелага і балючага, што нечакана стала пасля між імі...

Колькі разоў ён думаў потым: як жа здарылася

так, хто вінаваты, і кожны раз баяўся вінаваціць сябе, бо тады б, ён ведаў, меней стала на сэрцы крыўды, але затое пабольшала б смутку. Прасцей было вінаваціць Клыбіка і шкадаваць Марыну.

І супакоіўся б, можа, на гэтай няпэўнай палёгцы, каб не апошняя стрэча з Марынай, каб не ўспамін пра яе, які хоць глушы — не заглушыш, каб не той развітальны Марынін позірк; за даўнасцю часу не забыўся ён: і дакор, і шкадаванне былі ў ім, і, можа, нават пагарда. Чаму яна паглядзела гэтак, чаму?

І калі ўжо не баяцца ўспомніць, дык усё было так. Ён стаяў пад Саўкавай клеццю, схаваўшыся ад дажджу: не вельмі спорны, ленаваты пайшоў дождж, бо з самай раніцы хмарыла і праз увесь дзень была на вуліцы мяккая цеплыня. І як жа хараша патыхнула потым разам з дожджыкам прахалодай, цвярозлівым духам зямлі, а з агародаў прыплыў водар гуркоўніку і бульбянага поля. І чамусьці адразу не захацелася стаяць пад страхой, так і падбівала скочыць на вуліцу і падставіць твар, расхрыстаныя грудзі нетаропкім струменям дажджу. Васіль, можа, і зрабіў бы гэтак, ды на двары загаварылі, рыпнулі вароты, і ён убачыў Марыну з вялікім мяшком за плячамі, а побач — яе гаспадыню, старую Сымоніху, у мокрым фартуху і з сярпом на руцэ. За Саўкавым агародам пачыналася сценка, і часта жанчыны хадзілі туды па траву.

Васіль убачыў Марыну першы, і аднаго моманту хапіла, каб здрыганулася сэрца, каб падумаць пра сябе і пра яе, пра Клыбіка, які тады ўжо стаў паміж імі. І яшчэ Васіль запомніў, якая задумлівасць была на Марыніным твары, і як, гледзячы сабе пад ногі, ішла яна да варот, і як матляўся і біў па загарэлай назе прыліплай да яе травінкай падраны раменьчык ад басаножкі... І раптам Марына ўбачыла яго. Быццам нехта штурхнуў яе ў грудзі, і яна выпрасталася, і, здавалася, усю сябе ўклала яна ў той позірк, дзе і шкадаванне было, і боль, і, можа, нават пагарда...

Было гэта пасля таго, калі Васіль упершыню пасля іх знаёмства не праводзіў Марыну дамоў.

Гэтак жа, як і раней, шуміць лес, але ўжо ні супакаення, ні лагоды не чутно Васілю ў яго аднастайным пошуме. На другую палову дня хіліцца сонца, спадаючы на сосны, і спакайнейшым робіцца яго святло

там, дзе шырэй расступаюцца дрэвы, адкрываючы дарогу. І вось пачынае тхаць адтуль пахамі пылу, і вось чуваць ужо, як парыпваюць колы і як нехта аднастайна, дзеля прыліку, нокае на каня. І можна здагадацца ўжо, што вязе нехта з піларамы ў суседнюю вёску дошкі, і можна бачыць, як бяжыць наперадзе воза сабака, шнарачы паўз густы сасоннік на той бок дарогі. Можа, птушку ўчуў ён там, а можа, не даспадобы яму непалоханая цішыня лесу, бо сабака прыпыняецца час ад часу і брэша залівіста і моцна.

І тады прачынаецца Клыбік...

Ён недаўменна глядзіць вакол сябе, пазяхае і потым ужо, заўважыўшы Васіля, пачынае здзіўляцца:

— Бач ты, думаў, паляжу трохі, адпачну, а яно вось што... А ты сядзіш усё — глядзі ты! Дык ты, можа, змарыўся не гэтак, як я. («Вельмі перабярэш ты на рабоце», — думаў Васіль.) А я дык нават і сон бачыў. Нібыта прыходзіць да мяне ў хату Ахрэмчык гэты, старшыня. Кажа, штраф табе прынёс: выган з калгаснікамі гарадзіць не хацеў, а карову ў агульны статак пускаеш... Бач ты, Ахрэмчык! А цялушку, пытаюся, я ў калгас здаў? Здаў. Чаму ж сена за яе не даеш? А ён, Ахрэмчык, так і выпрышчваецца: хадзем у пуню, кажа, я пакажу табе сена. А цялушку тваю мы за пашу возьмем. Бач ты яго! Каб ужо цябе не ведаю куды ўзялі!..

— Можа, думаў што такое, дык і прыснілася...

— Думаў!.. Дзіва што! Ахрэмчык гэты во як назаляе... Занадта ён смелы: усіх бы ў калгас загнаў. Але пачакай... Усе яны так спачатку. Яўменаў, той, ранейшы, таксама браўся, а цяпер што? Аднымі фельетонамі на яго прапаліць у печы можна.

І ён усё гаварыў, Клыбік, гаварыў, а Васіль дзівіўся толькі, з якою просткасцю выказваў сябе гэты чалавек, нібы хацеў давесці: глядзіце, вось які я, Мікола Клыбік, той самы, каго ў вёсцы празвалі «партфельчыкам». Ён то ўспамінаў, як некалі бацька яго ледзь не першым адвёў у калгас каня («А конь які быў — не конь, а качулка, не тое што ў іншых!»), то гаварыў, што мог бы застацца ў горадзе пасля арміі, а вось як прыехаў дамоў, дык усе паглядаюць скоса, няйначай, як зайздросцяць яго грашам.

І так вось памалу расхінаўся перад Васілём гэты загадкавы Клыбік, і ён тады бачыў яго то заліхвац-

кім вайсковым пісарам, то крамнікам тут, у вёсцы, то фізруком у школе, а потым рахункаводам, і нарэшце няцяжка ўжо здагадацца было, куды надалей завядзе Клыбіка дзівосная гэта партфельная логіка: чакала яго яшчэ недзе ці месца лесніка якога, ці грыбавара. І зразумела было, што, ажаніўшыся на Марыне, як бы прыхапіў сабе Клыбік чарговы партфельчык.

І нанава ўзнікала перад Васілём перабранае ў памяці, перадуманае неаднойчы.

Самае незразумелае пачыналася з аднаго вечара, з адной вечарынкі, можа, якраз гэткай, як і тады, калі ўпершыню танцаваў з Марынаю. І зноў жа — было весела ў той вечар: неяк адразу аж тры чалавекі прыехалі на пабыўку ў вёску, і з імі — Надзя, тая самая, з якою некалі Васіль вучыўся ў школе. Здаецца, практыка была ў яе тым летам, і ненадоўга, перад самымі заняткамі, завітала яна дадому. Яны бачыліся з Васілём амаль што кожны год, але, можа, таму, што не многа былых аднакласнікаў засталося ў вёсцы, гэтыя сустрэчы для іх абаіх былі заўсёды прыемныя, бо і сапраўды ж прыемна было перабіраць у памяці трапяткую нітку самых даўніх і вясёлых успамінаў. Ну, дык вось і пыталіся яны адно ў аднаго: як, што, калі і чаму — успаміналі, як хадзілі ў школу за колькі кіламетраў у суседнюю вёску, як аднойчы вясною рвалі ў дуброве сон і спазніліся на ўрокі.

А Васіль думаў пра Марыну, думаў нават тады, калі Андрэйчыкаў Хведар, той самы, што займеў з Васілёвай ласкі флоцкую фуражку, загадаў гарманісту граць факстрот (маўляў, ёсць тут людзі з горада — разумець трэба!) і калі Надзя ўзялася вучыць Васіля гэтым нязвыклым для яго танцам. А потым яны сталі яшчэ і гаварылі, і Васіль зноў думаў пра Марыну, пра тое, што ён саромеўся б з ёй гаварыць на людзях вось так, як з Надзяй.

І тады ж нечакана падышоў да іх Клыбік і адазваў Васіля ўбок. Не кальнула ў сэрца тады Васілю, не здрыгануўся ён ад нядобрага прадчування, а ненатужна неяк прыйшла ў галаву паслухмяная здагада: зараз вось папросіць пастукаць у бубен, бо Васіль лічыўся ў гэтай справе не апошнім майстрам.

— Слухай,— сказаў Клыбік, і Васіль наперад усміхнуўся.— Слухай, ты будзеш... праводзіць сёння Марыну?

Васіль перапытаў: «А што?» — і яму стала няёмка; ён падумаў, што ўсе ўжо ведаюць пра яго і Марыну.

— Бачыш, калі ты наважыў, то я...

— А што?

— Ды ў мяне, ведаеш, справа да яе школьная, трэба пагаварыць...

О, ён быў хітры, гэты Клыбік, і як Васіль здагадваўся цяпер, яму так і біў тады ў вочы той самы партфельчык! І чаму ён не абсек тады Клыбіка, не адпрэчыў: знайшоў калі гаварыць пра школьныя справы, пагаварыў бы днём! А то ён разгубіўся чамусьці, засаромеўся быццам — і таму жаданым для Клыбіка быў ягоны дазвол. І як дараваць сабе гэта, і як забыцца? Але ж і Марына... Няўжо не разумела яна нічога і няўжо яго не кахала!..

О, ён быў хітры, гэты Клыбік, бо назаўтра ж прывалокся на вечарынку з Марынаю, зайшоўшы па яе. Пра гэта сказаў Васілю Андрэйчыкаў Хведар. І тады ўжо, як бы на дакор Марыне, Васіль праводзіў Надзю дахаты і раз, і другі...

І сядзі вось цяпер і слухай, як бубніць сваё Клыбік:

— Эха-ха! Яно б у такую гарачыню толькі пад паветкай ляжаць, а тут дровы... Знайшоў дырэктар пацешычаў. Няхай паспрабуе наняць калгаснікаў, але ж хто яму за такія грошы рабіць стане...

Ён дык разамлеў пасля сну і, можа, гаварыў так доўга толькі таму, што вельмі ж не хочацца яму зноў брацца за пілу, стаяць на каленях, падразаючы лясіну, насіць на плячах гатовыя круглякі.

— А ты, значыць, усё маўчыш ды думаеш. А ты не думай, вазьмі ды ажаніся,— нібы жартуе Клыбік.— У Ганны вунь якая дзеўка расце — здаровая ды мажная. А бацька ў яе нібы той камлюк, ажэнішся — зяцю хату паставіць. А самае галоўнае, каб жонка здаровая была ды працаваць умела. («Во, во, каб за цябе гарбела»,— рабіў сабе выразнымі Клыбікавы думкі Васіль.) Мая вунь зроду сярпа ў руках не трымала, дык, думаеш, добра? Адна карысць, што грошы нейкія зарабляе...

— Дык ты, можа, і хацеў гэтага...

— Можа, я хацеў, а можа, людзі,— нейк здагадкава ўсміхнуўся Клыбік і паглядзеў на Васіля.— Тут і ты мне трохі паспрыяў...

— А як жа гэта — я? — перасільваючы цікаўнасць, нібыта абыякава, спытаў Васіль.

— А так вось, што хітрасць усюды патрэбна, нават калі да дзяўчыны ходзіш... Гляджу я на цябе, дзіўны ты нейкі: усё сала на ражончыку пячэш, калі яго і так з'есці можна. Якраз во як сёння... А што: ад каляд сала ў вас ці яшчэ пасля вепручка прыгнялі?.. Да сенакосу бераглі, кажаш? А па-мойму, дык яно лепш, калі кожны дзень скварка.

— Дык як жа паспрыяў я табе і да чаго тут сала... ну, і ражончык гэты?

— А ўсё да таго. Калі хочаш, слухай. Памятаеш той вечар, калі я хацеў пагаварыць з Марынай? Я, канешне, гэта выдумаў тады, але ж, папраўдзе, думаў, што ты адмовіш. А потым бачу... Ты ж нешта доўга гаварыў тады з Надзяй, памятаеш? Ну, я і сказаў пасля Марыне, што гэта ты мяне папрасіў яе праводзіць, выручыць быццам... І ўсё такое.

— Ты... ты сказаў гэтак? І яна паверыла?

— Ну, не адразу, вядома,— памуляўся Клыбік.— Ты ж, кажу, сам паспрыяў мне ў гэтым. Надзю ж праводзіў...

І, значыць, было ўсё гэтак і недарэчна, і проста... «Што ж, гавары, Клыбік, гавары... А можа, ты думаеш, што мне балюча гэта, і, можа, мяне шкадуеш? Проста я ніколі не думаў, што можа такая страшная пустэча легчы на сэрца і такая пакутлівая бяздумнасць на галаву... А вось чамусьці расце, вытанчаецца звіваліміі і паволі сунецца ўгару сцяна маўклівага лесу... Не, гэта толькі здалося. Шумяць, як заўсёды, сосны... А вось цяпер я адчуваю, што ў мяне ёсць рукі. Можа, ты забыў пра гэта, можа, ты думаеш, што яны дзеля таго толькі, каб цягаць пілу?»

І ён падняўся.

— Падлюга! Партфельная твая душа!.. І ты... гэткае!

Падабраў пад сябе ногі і ўвесь падаўся назад Клыбік. Разгублены, збялелы твар. Рука зграбае ігліцу...

Нібы ўпаў на водную роўнядзь камень, і моцна і гучна ад гэтага ўзвірыўся струмень. Пайшлі кругі па вадзе, слабеючы, даплылі да берага... І вось паволі ўсплывала ў памяці аблітая месячным святлом таполя, а вось нібыта Марына схілілася да Васіля, і такі яркі

за вуліцай выган у маладым і ядраным бляску. І нібыта Васіль гаворыць: «Слухай сваё сэрца, Марына, яно ў цябе добрае, слухай, і яно цябе не падмане!» І тады: «А я! Чаму ж, калі верыў сабе, не верыў Марыне і чаму адступіўся? Аддаў Марыну гаду гэтаму, Клыбіку».

І захацелася бегчы — ад сябе, ад Клыбіка, ад усяго. Бегчы, як аднойчы ў дзяцінстве, калі заблудзіўся ў лесе і, гнаны недзіцячай нейкай тугою, усё бег і бег па незнаёмай дарозе, глытаючы слёзы...

— Пайшлі,— сказаў ён глуха.— Дрывасек!..

Стаяла бяроза на самым краі баравіны, высокая, роўная, і калі ўпілася ў яе сякера, здрыгануўся адразу звонкі ствол ад шурпатага камля да зялёнага лісця — і ўся бяроза стала як шумлівая хмара трапяткіх зялёных матылёў. А потым паволі хілілася яна, і пакуль падала ў невясёлым сваім кружэнні, прывяла з сабою шэры летні дзень з ленаватым дожджыкам, пах вільготнай зямлі і гуркоўніку. Ішла Марына ад Саўкавых варот — і матляўся, і біў па загарэлай назе з прыліплай да яе травінкай парваны раменьчык ад басаножкі... І чаму ён не спыніў яе тады, чаму не растлумачыў?..

Яны падразалі лясіны яшчэ і яшчэ, і калі Васіль, схіліўшыся, сустракаў час ад часу Клыбікаў позірк, ён ведаў, што цяпер ненавідзіць гэтага чалавека ўпарта, грэбліва, ненавідзіць за дваіх: за сябе і за яе, Марыну.

І цяпер ён не баяўся, што паміж імі стаяў Клыбік.

1960

ВОЛЬКА

1

У тую далёкую пару ў вялікім горадзе на вуліцы я мог бы, незнарок азірнуўшыся, пераняць твой, не мне прызначаны, але аднаму мне зразумелы позірк і здагадацца пра цябе і пра Казіка, якога я прыдумаў ужо тады, як і цябе, дарэчы. Што ж, мы маглі ву-

чыцца з табой у адной школе, а потым падацца ў горад — шукаць там паасобку кожны сваё. Толькі не мог жа я проста так падысці да цябе на вуліцы і запытацца: «Якім рэхам вярнуўся з далечы да цябе твой голас? Ты шчаслівая, адкажы?» Бо што адказаў бы я сам, каб ты пра тое раптам спытала і ў мяне? Я ж і сам яшчэ толькі пачынаў здагадвацца, што нашы здабыткі і страты не маюць нейкай паасобнай ці непадзельнай з намі цаны. Прынамсі, так мне здавалася, калі я клікаў думкай твой вобраз і зычыў табе ў спадарожнікі Казіка.

2

...Каб жа знаццё, што будзе такое, няхай бы Казік, шылахвост гэты, аставаўся адзін пры сваім гарадскім набытку. Дурная ды маладая была, што паверыла тады розным чуткам ды гаворкам: Казік і заробак добры ў горадзе мае, і сам які спраўны з твару і чысценькі стаў — куды ж гэта глядзяць вясковыя дзеўкі! Ажэнісца ў заробках, і вяселля не пабачыш...

Весяліся цяпер у гэтым закутку!..

За шалёвачнай перагародкай жывуць гаспадары. Трэба ж, дзіця ў іх такое дурное: носіцца ўвесь час па кватэры ды бухае з разгону рукамі ў шалёўку. Во, зноў перагародка аж ходырам ходзіць, а Жэнік так і захліпаецца ад смеху — і ніхто ні крычаць, ні асадзіць не хоча.

— Жэнік,— гукае цераз перагародку Волька,— Жэнік! Ці сціхнеш ты?..

Жэнік на нейкі час сунімаецца, стаіўшыся і чакаючы, і раптам — зноў грукатлівае тупанне і захлёбісты, радасны смех.

«Усхадзіўся, халернік»,— думае Волька.

...А ў гэтым пакойчыку нават шпалеры — адна прыкрасць. Выцвілыя, старыя, яны пабраліся на перагародцы тапырыстымі складкамі, звісаюць дзе-нідзе дранымі шматкамі. Няхай звісаюць, у Волькі ўжо і рукі не ляжаць, каб прыбраць тут усё да ладу. Наважыла была спачатку, як пераехалі пасля вяселля сюды, але ж адгаварыў узвей-вецер гэты, Казік: «Не трэба, Волечка, не трэба, вось пабачыш — кватэру праз месяц дадуць...»

А цяпер няхай будзе, як ёсць,— знелюбелае, пры-

краe. Стoлькі надзей ускладала яна на гэта замужжа, на горад — і вось... «Звязалася з баламутам гэтым, трэба ж, гарадскога хлеба захацела. У вёсцы, можа, за настаўніка выйшла б...»
З нейкім асаблівым, незнаёмым раней пачуццём думала яна цяпер пра вёску, успамінала, як хораша жылося ёй там за матчынай любасцю ды бацькоўскаю ласкай: была ж яна адзіная, што ні кажы, у бацькоў дачка. Маці, бывала, як не дрыжала над ёй, над кожным яе крокам: глядзела, каб, божа барані, не перарабіла дачушка ні ў школе, ні дома. Хопіць, што сама дзень пры дні ў клопаце, што бацька да сваёй сталярскай справы жадзён, што ўсялякіх заказаў меў заўсёды аж лішне.
Спраўлялі Вольцы як не кожны месяц абновы, і, можа, яшчэ з сёмага класа пачала яна патроху нявесціцца. Тады ж упершыню здагадалася яна, што лёс не абдзяліў яе і прыгажосцю. Прыемна гэта было, і, канчаючы дзесяцігодку, падумалася Вольцы, што не астанецца ў вёсцы, а паступіць у інстытут і выйдзе там замуж за чалавека, што будзе яе варты. Будзе жыць у горадзе, і калі прыедзе ў вёску ды пройдзе з мужам пад руку па вуліцы, усе будуць гаварыць: «Глядзіце, як пашчасціла Раманькавай Вольцы!»
Потым яна паступала ў інстытут і не паступіла. «Бывай надоўга, горад»,— думала ўжо яна, але якраз тут і патрапіў ёй на вочы Казік. На той час і гэта, здавалася, нейкім выйсцем было, а тут яшчэ чамусьці падумалася Вольцы, што стане круціць Казікам, як захоча,— бачыла ж, што падабалася яму. І пра сябе перастала трывожыцца, і пра інстытут яна не думала ўжо.
«А якая карысць цяпер ад гэтага: ад яго ласкавасці, памяркоўнасці — ад усяго...»
Волька трывожылася цяпер, пакутавала, а Казік, бы знарок, маўчаў пра кватэру: можа, і ведаў што, ды не казаў жа, бач.
— Калі ж тое тваё абяцанае будзе? Калі ж будуць харомы твае? Ці ж схадзіць няможна, каб даznацца?
— От жа які ты чалавек! Дом жа яшчэ не гатовы, кажу...
Тады зводдаль, асцярожна яна загаворвала:
— Звякуеш у гэтым пакойчыку — на тое ідзе...

— Ідзе, ідзе... Скажаш, як выйдзе. Чаго ж цяпер гаварыць?

Ён дык і сам не ведаў, будзе ім сёлета кватэра ці не. Людзі і не столькі чакаюць, і не з такой сям'ёй. Але ж скажы ты Вольцы!

Год які быў згодзен Казік яшчэ жыць і тут. «Жывуць жа неяк людзі,— думаў ён,— і мы перабудзем. Кватэра дрэнная, але ж... ціха, спакойна — не была б то ўскраіна. Вёску нагадвае нечым».

Вуліца тут, дзе яны жылі, і праўда была ціхая, непрыкметная, з пакарабачаным брукам, з палісадам, з уладараннем дашчатых платоў. Між камення выбівалася на ёй улетку нямоглая трава, а на ўзбоччы, на счарсцвелых грудках, бралася яна цэлымі лапікамі, кусцістымі і густымі. Дамкі, найбольш на вясковы лад, то заходзілі ў глыб двароў, то выступалі на самую вуліцу. Раслі ў цеснаце гародчыкаў яблыні і вішні; унізе сплятаўся парасткамі разбежысты агрэст, а буйналісты бэз і калючая ружа растырквалі галіны па шчылінах платоў.

Расхінала сябе з часам захаванае ў гэтых вулачках хараство. Неяк па-свойму хораша было тут: і ранняй вясной, як трымцела першая вада ў тонкіх ручаінках і так ядрана, молада крычаў певень на макаўцы дня; і крыху пазней, калі зацвіталі сады, а вечарамі трапяткая зеленаватасць падоўгу не сыходзіла з неба; і цёплым летнім надвячоркам, калі так дурманіста, густа тхала з гародчыкаў кропам, і да паху гэтага дадавалася казытлівая прыгоркласць пылу, і ціха веяла млявай гарачынёй ад нагрэтых за дзень домікаў і платоў.

Хораша было тут. Але ж скажы ты Вольцы!

3

Стаяла прадвесне на дварэ, быў сакавік. Раніцай Казік ішоў на завод і бачыў: востраваты халадок трымаў на падворках сумных пасля золкай ночы вераб'ёў, жаўтлявымі плямамі ўзялася на застарэлай наледзі вуліц учарашняя вада. У тонкіх выслойках воблачкаў палавела над горадам неба. Паволі, нібы крыга на быстрыню, выкіроўвала сябе на прагал з-пад пасмаў дыму сонца, і ружовы марозік адпаўзаў да заценёных падмуркаў і сцен.

А як ішоў назад — сінела неба, збіралася ля тратуараў вясновая вада, але адчуваўся пад вечар у паветры халодны подых сіверу.

У такі вось дзень дазнаўся Казік пра кватэру. Ён дужа радаваўся тады; нізкаросны і мітуслівa вёрткі, з грузнай рыжаватай кучаравінай на галаве, ён проста такі ўвачавідкі святлеў ад бяздумнай нейкай, дураслівай узрушанасці і лагоды.

— Нешта ты вясёлы дужа,— сказала яму дома Волька,— глядзі, каб не плакаў.— А сама падумала: «Трэба ж быць гэтакаму чалавеку!.. Прыбег дадому: «Волечка, Волечка!» А як там кватэра, дзе і што — і знаць не знае. Ды ты ж аглянуцца, разява гэтакая, не паспееш, як кватэру хто другі займе, а тады — як жа! — вытурыш яго адтуль».

— Давай сюды ордэр! — раптам выставіла яна да Казіка руку.— Чуеш?

Яна злавалася, але Казік быццам не заўважаў гэтага. З жартаўлівай паспешлівасцю ён адступіў убок і, радасна прыгаворваючы і смеючыся, палез рукою ў кішэню пінжака. Няйначай, як яму хацелася падражніцца з Волькай, і, пэўна, таму ён знарок марудзіў: таямніча дастаўшы з кішэні гаманец, нешта ж вельмі доўга здымаў з яго перакручаную гумку... Нарэшце, кашлянуўшы з палёгкаю і папляваўшы на пальцы, лоўка падхапіў імі з гаманца ордэр — прасвятлеў ураз і ўзмахнуў паперкай перад сабою:

— Калі ласка, дарагая ахмістрынька, ва ўласныя вашы ручкі!

— Дурань! Блазнота! — выкрыкнула Волька, адбіраючы ордэр.

Яна падышла да шафы і адчыніла дзверцы: шырачэзны, адмысловай вясковай работы абрус неўзабаве шугануў адтуль і, разгарнуўшыся, лёг на падлогу. Праз якую мінуту Волька ўвязвала ўжо ў яго старое паліто, падушку, коўдру — Казік здзіўлена, нічога не разумеючы, глядзеў на жонку.

— Ты... збіраешся некуды? — асцярожна запытаўся ён.

— Маўчы, балабон! — абсекла яго Волька.— У цябе ніколі клопатаў не будзе — такі чалавек. Сам бы, каб людскі гаспадар быў, пабег бы на кватэру: і начаваў, і дняваў бы там, пільнаваўшы...

Яна зняла з паліцы гаспадарчую сумку, падхапіла

з падлогі вузляк і, на ўсю сілу ляпнуўшы дзвярамі, выбегла на вуліцу. І потым праз усю дарогу, пакуль ехала трамваем на новую кватэру, кляла разяву гэтага, Казіка...

Яна сышла на незнаёмай вуліцы. Ледзь трохі збочыла ад трамвая — адразу пачынаўся не зусім дагледжаны яшчэ, нядаўна забудованы квартал. І, як гэта бывае на неабжытым месцы, раптоўна ўразілі цёмнай глухатою вокнаў маўклівыя дамы. Многа раскапанай зямлі было навокал. Змяркалася. Ля пад'езда крайняга дома нейкая жанчына, раз-пораз адварочваючы твар, вытрасала на ветры лапоткую коўдру. Волька падышла і запытала нумар дома.

Яна стаяла перад сваёю кватэраю, трошкі яшчэ не верачы сабе і стараючыся суняць неспакойнае гохканне сэрца. Таўханула плячом у дзверы: кватэра была замкнёная. Прыклалася шчакой да вушака, прыслухалася. Было ціха: ні шораху, ні скрыпу не чуваць з-за дзвярэй — адно захліпалася ўнізе, пераліваючыся ў радыятары пад лесвічным акном, вурчлівая вада. «Бач, ужо грэюць,— падумала Волька, і з'едлівае шкадаванне закралася ў сэрца.— Дурная, трэ было адразу шукаць каменданта, забраць ключы».

Паўгадзінаю пазней, выйшаўшы ад каменданта, Волька адчула раптам, як хораша было на дварэ. Толькі цяпер яна заўважыла, што і дахі дамоў, і сходні ля пад'ездаў, і ўсё навокал акрылася маладым і ясным снегам. Такая здаровая свежасць была разліта ў паветры, што Волька не ўтрымалася і, спыніўшыся, паглядзела ўгору. Глыбокія, няроўныя размывы адкрыліся ў высокіх, здавалася, набрынялых сакавітай сінню воблачках. У нейкай халоднай самлеласці каціўся над горадам месяц — крамяны, слепкі і поўны.

Было тут высака, дзе стаяла Волька: вячэрні горад ляжаў перад ёю. Там, дзе ўвесь час мільгалі, прападаючы, чырвоныя і зялёныя агеньчыкі машын, былі, напэўна, масты і плошчы. Недзе ж зусім недалёка, у нізкіх прыцемках вуліц, звінеў трамвай, і відно было, як высякала блакітныя іскры яго дуга.

Расхінуўшы на шыі вязаную хустку, Волька намацала ў кішэні забраныя ад каменданта ключы, падумала, што тут, у новай кватэры, можа, і пачнецца тое жыццё, дзеля якога яна звязалася з баламутам гэтым Казікам і падалася ў горад. Не, цяпер яна не

ўпусціць свайго, прымусіць круціцца Казіка, каб зарабляў болей, абставіць кватэру — і ці мала чаго зробіць яшчэ яна!..

4

Яны пераехалі сюды назаўтра. Было шмат клапатаў на новым месцы.

А праз колькі дзён угледзела Волька, што кватэра побач з іхняй была нікім яшчэ не занятая. Дзіўна гэта было, і напачатку Волька не паверыла сабе, думала, што памылілася. Вечарам таго ж дня стаяла яна перад дзвярамі чужой кватэры, хвалявалася, перад тым як пастукаць, і правярала сябе: «Калі выйдзе хто, скажу, што шукаю знаёмага чалавека, і назаву любое прозвішча».

Было нешта каля адзінаццаці гадзін вечара. На стук ніхто не адказаў. Сумненні рассейваліся, і цішыня за дзвярамі прарастала здагадкаю. Волька разважала: «Чалавек, што не спяшаўся ўсяляцца сюды, няйначай быў начальнік нейкі, відная асоба, а то хто б гэта не пабаяўся трымаць так доўга кватэру пустой?»

Яна ўзрадавалася, бо нешта падказала ёй, што недарэмна думала ўчора, як начавала тут, што пасяляцца ў новым доме людзі самавітыя, найлепшым чынам гарадскія — не тое што заводскія Казікавы сябры, гэтакія ж рабочыя, як і ён. Яшчэ калі жылі на старой кватэры, не падабалася Вольцы, што тыя прыходзілі да мужа і што Казік абыходзіўся з імі, бы з якой раднёй. А то, бывала, і ў магазін бегаў, гарэлку купляў. Выпівалі, праўда, яны патроху, а падхмяліўшыся, гарачую і бязладную пачыналі гаворку пра здзельшчыну і тарыф, пра майстроў, нарады і разрады. Слухаць іх Вольцы было нудна, і, няўважна седзячы дзе-небудзь убаку, яна злавалася на Казіка, думала: «Ну, пачакай жа, пагавару з табою, як госцейкі пойдуць, памяну і гарэлачку гэтую, і грошыкі, што ты звёў. Хай бы патрэбнаму чалавеку чарку-другую паставіў, а то такім жа, як сам».

Не, не гэтакіх знаёмых шукала сабе Волька і ўсё больш спадзявалася цяпер на загадкавых будучых суседзяў. Вось хоць зірнуць бы, якія яны, дазнацца, чаму так доўга не едуць.

І Волька чакала...

Бралася на вясну, і з кожным днём цяплела на вуліцы. Колькі дзён стаяла ветранае, са свежай прыдухай надвор'е. Сплывалі мутнымі ручаінамі апошнія лапікі снегу, і ярасна, мройна свяціла на горад парнае сонца. Стань у такі час і паслухай: шумяць навокал у вясновай жвавасці вятры — гудуць, шугаюць, падтуляюцца пад мокрыя сцены дамоў, маршчынячы на тратуарах капяжовую ваду, лапацяць на дахах і ападаюць зноў у шэрыя прагалы вуліц.

Волька ішла з магазіна. Дзьмуў вецер, і непадалёк ад вуліцы падала на снег варона: адчайна крычала. Волька звярнула ў двор, і тут першае, што кінулася ў вочы, была машына, гружаная новенькай, пэўна, толькі што з магазіна, мэбляй. Далей яна бачыла: два дзядзькі, апранутыя па-рабочаму, падымаліся на прыступкі пад'езда з невялікай, зграбнай з выгляду канапкай на руках. Ім расчыняў у калідор дзверы сярэдняга росту мужчына — з поўным тварам, у зялёным капелюшы і пры белым шаліку, што ледзь вытыркваўся з-пад каўняра рудога, перацятага поясам паліто.

«Пераязджаюць... нарэшце,— падумала Волька.— Бач, колькі мэблі».

Канапка ніяк не пралазіла ў дзверы: давялося варочаць яе на бок. Дзядзькі заміналі Вольцы зайсці ў дом. Яна чакала. Устрывожаны жаночы голас прымусіў яе павярнуцца.

— Як жа ты не глядзіш, Славік, га? Пасадзілі на канапку пляму, а ты...— гаварыла, выходзячы з-за машыны, незнаёмая Вольцы жанчына.

Яна падышла да пад'езда, прыгожа і добра апранутая, і стала амаль што поруч з Волькаю, вышэйшая за яе і трошкі драбнаватая тварам.

Жанчына шкадавала канапу і дакарала чалавека ў капелюшы. Той адгаворваўся лагодна:

— Ну, чаго ты так хвалюешся, Зіначка! То ж не фарба, пачысціць можна...— І, пастражэўшы, рабочым: — Асцярожней, хлопцы! Глядзець трэба...

Тыя працісналіся нарэшце з канапкай у дзверы. Волька памкнулася ўслед і, пакуль ішла за імі, адчувала на сабе безуважна вясёлы позірк чалавека ў капелюшы: па лесвіцы ён падымаўся першы і, час ад часу наглядаючы за канапкай, пазіраў на Вольку.

Была яна прыгожая — гэта ён заўважыў адразу. Такая роўная, зусім спакойная яснасць ляжала на ма-

ладым яе, смужліва-белым твары, і так густа ўскідвалася над высокім ілбом тугая закруць цёмна-русых, пэўна, вельмі шорсткіх валасоў, што на чалавека так і дыхнула ад усяго гэтага пранізлівай сілай нерастрачанай маладосці.

І як жа хораша ахінала галаву жанчыны вязаная хустка, і як прывабліва кругліўся стан яе пад цесным, шытым у талію і даволі ўжо ношаным зімовым паліто...

Чалавек тады раптам спыніўся... Дзядзькі неслі канапу паціху, засяроджана намацваючы прыступкі нагамі. Чалавек сказаў Вольцы:

— То вы праходзьце, яны прапусцяць вас...— і паказаў рукою на рабочых.

І здарылася так, што Волька разгубілася. Незнаёмы загаварыў, і загаварыў так нечакана. Мітуслівым узмахам рукі Волька папpавіла хустку, сказала:

— Ой, што вы!.. Ой, не трэба, я так...

Голас быў разгублены нейкі і слабы — нават непрыемны ёй самой. «Вось дурная, ой, якая ж я дурная». Трэба было праходзіць ці нешта гаварыць больш пэўнае. Волька стаяла, затуліўшы хусткай твар.

Чалавеку і самому, гледзячы на яе, стала няёмка. «Дзіўная нейкая»,— падумалася яму. Ён пайшоў не аглядаючыся і толькі на трэцім паверсе, перад дзвярамі сваёй кватэры, спыніўся, прапускаючы рабочых наперад сябе. Тут якраз і Волька падышла. Нібы раздумваючы, глядзеў чалавек на яе: з палахлівай мітуслівасцю тыцкала ключыкам Волька ў гладкую абводку замка, спяшалася...

Пэўна, ён зрабіў бы нядобра, не памкнуўшыся суняць хоць трохі сумятлівы гэты жанчынін неспакой:

— Дык мы суседзі з вамі, так? — сказаў ён і тут жа падумаў, што запытаўся недарэчна.

— Дык мусіць жа так! — Волька павярнулася раптам і, нейкая іншая ўжо, з гарэзлівай смяшлівасцю глянула на чалавека. Цяпер яна не саромелася быццам, і харошая, лагодная ўсмешка была ў яе — на ўвесь твар і вельмі ж слепкая.

Чалавек не паспеў адказаць ёй: за Волькай зачыніліся дзверы.

Ён стаяў на пляцоўцы і не ведаў, як радавалася гэтая незнаёмая жанчына, што пасяліліся побач з ёю

людзі, ад якіх нібы залежала і яе цяпер, можа, інакшае, такое жаданае ёй жыццё.

А Волька: чаму не загаварыла яна на дварэ, чаму не пазнаёмілася адразу з жонкаю гэтага чалавека? Упусціла такі выпадак!

5

Ёй пашанцавала гэты раз: Зіначка неяк па-суседску зайшла пазычыць хлеба («Прабачце, ведаеце, Славік прыйшоў раней часу з работы, а я яшчэ не купіла».) і запрасіла Вольку да сябе. Волька так дзякавала, так дзякавала і — назаўтра пайшла.

Пераступіўшы парог чужой кватэры, яна сказала:

— Добры дзень вам! Мужа пакуль што няма з работы, дык я думаю: схаджу...

Падняўся чалавек з канапкі: прыкметна здзіўлены, шукаў нагамі на падлозе пантофлі. Светлыя і прамыя, доўгія яго валасы навісалі на поўныя шчокі. Соваючы ногі ў пантофлі, чалавек няўпэўнена сказаў:

— Да цябе, Зіначка?

— Гэта я запрашала, Славік,— спяшаючыся, загаварыла тая.— Суседка наша... Знаёмцеся — мой муж.

Волька ледзь утрымалася, каб не сказаць міжвольна, што яны знаёмыя. Ён жа пасля жончыных слоў лёгка і адразу ўстаў Вольцы насустрач, падаў руку:

— Вячаслаў... Вячаслаў Пятровіч, як на рабоце завуць.— Відаць было, што і тут ён не хацеў страчваць на гэта права.

— Волька,— сказала яна, чырванеючы і адразу забіраючы руку.

— За стол, за стол сядайце,— запрашаў тым часам Вячаслаў Пятровіч, падаючы крэсла,— за круглы стол...— Стол і сапраўды быў круглы.— Вы ведаеце гісторыю круглага стала? — запытаўся чамусьці ён.

— ...гэтага? — азвалася Волька. Яна паспела ўжо ўладкавацца на крэсле і пасля слоў Вячаслава Пятровіча быццам сумелася нечага, палахліва прыбрала рукі са стала.

— Не, што вы! — Вячаслаў Пятровіч быў у радасным, гуллівым узрушэнні.— Што вы! Наогул — стала. Я вам зараз раскажу... Людзі, ведаеце, раней па субардынацыі жылі. Скажам, у шаха ці караля якога госці па чыну садзіліся за стол: крый божа, каб толь-

кі не з краю! А чыноў, скажу я вам, было як у чорнай ікры вочак...

Зіначка засмяялася.

— Памятаеш, Славік, як смешна тады выйшла, калі Арнольд Піліпавіч сказаў пра гэтую ікру. Ты не ўмееш так расказваць...

Вячаслаў Пятровіч паморшчыўся крыху, але не пакрыўдзіўся, відаць, бо ўсё гэтак жа весела гаварыў далей:

— Значыцца, чыноў гэтых і залішне было, і кожны з гонарам — што ні кажыце, а паны ўсе. Пасадзі такога не там, дзе трэба,— ого! Адразу перавароты розныя, змовы — тады гэта проста было! Бач, улады кожнаму хацелася. Згаворацца графы ды мушкецёры розныя — кароль не кароль, а з крэсла далоў! Камічна людзі жылі!

Вячаслаў Пятровіч засмяяўся — шчыра так і дабрадушна — ды ўсё паглядаў тым часам на Зіначку, і позірк яго, здавалася, гаварыў: «А што? Няхай твой Арнольд Піліпавіч так раскажа! Ага!»

— Ды кажы ты ўжо,— зусім нязлосна ўпікнула мужа Зіначка.— Цягнеш, як тую гуму.

— А канец такі,— без ранейшага запалу сказаў Вячаслаў Пятровіч, стаўляючы сабе крэсла.— Нейкі кароль французскі, Генрых там ці Карл... Ты не памятаеш хто, Зіначка?

— Арнольд Піліпавіч казаў: Генрых.

— ...загадаў паставіць у сваім палацы круглы стол. Гэта каб нікому крыўдна не было: усе быццам пасярэдзіне сядзяць і ўсе роўныя...

— Яно і цяпер бывае, што глядзяць, каб да начальства бліжэй,— нейкім чужым і вельмі ж сур'ёзным голасам сказала раптам Волька.

Вячаслаў Пятровіч устрапянуўся.

— Не, не гаварыце,— жвава адгукнуўся ён.— Цяпер не тое, цяпер кожны сваё месца ведае. Арнольд Піліпавіч, скажам, начальнік мой, у трэсце інжынер. Што я скажу? Чалавек разумны, нашага брата бухгалтара цаніць умее, за тое і я яго...

— Каб не ён, дык калі б ты яшчэ такую кватэру атрымаў...— умяшалася ў гаворку Зіначка. І да Волькі: — У вас колькі пакояў?.. Адзін? Вось бачыце... Нам бы таксама на дваіх адзін далі. Гэтую кватэру, што цяпер у нас, Арнольду Піліпавічу засяляць трэба

было, ды ён не захацеў: двух пакояў малавата, кажа. Ну, і перапісаў на Славіка... Арнольд Піліпавіч потым у нас на ўваходзінах быў.

«Дык вось чаму кватэра незанятая была»,— здагадалася Волька.

Вячаславу Пятровічу, пакуль гаварыла Зіначка, аж не сядзелася на месцы, і, калі яна скончыла, ён усміхнуўся задаволена і неяк загадкава падказаў:

— Ты пакажы кватэру, Зіначка. Як яна здасца новаму чалавеку, га?

— Ой, гэта ж я і забыла. Усё ты вінаваты, Славік, загаварыў...

...Адсюль якраз і пачыналася тое, што яшчэ не раз прыводзіла Вольку да новых суседзяў: апраўдваліся загадкавыя ноткі ў голасе Вячаслава Пятровіча — Зіначка ўмела паказаць, яна быццам і старалася толькі, каб як мага пасеяць у чужой душы патаемнае зерне зайздрасці.

Сам выпадак падказваў не саромецца сваёй цікаўнасці, і зусім неабыякава глядзела Волька на новенькі мэблевы гарнітур, гаварыла нешта пра крэсла, на якім толькі што сядзела — нізкаватае, абабітае блакітным плюшам,— і ўжо з нейкім самотным пачуццём пазнавала тую самую, знаёмую з першага дня прыезду суседзяў канапку.

— Падабаецца? Вам падабаецца? — дапытвалася Зіначка.— Бачыце, вось толькі шторы мяняць трэба: яны не ў тон.

І доўга разглядвалі ў спальні дыван.

— Не, вы памацайце-такі,— накіроўвала Вольчыну цікаўнасць Зіначка.— У горадзе такога не купіш: і не дарагі, і добры. Славік спецыяльна па яго ў раён ездзіў.

Не, яна не памылілася, Зіначка; і тады ўжо, як загарэліся вочы ў Волькі пры аглядзе самых свежых яе абноў, яна затоена радавалася, заадно чытаючы пры гэтым зусім няхітрую аповесць чужых і жаданняў, і надзей...

І давяршылі ўсё туфелькі — замшавыя, з закрытым верхам і на штучнай футры. Зіначка нават прымераць іх дазволіла Вольцы, а тая, пад уражаннем ад усяго бачанага і чутага, сказала толькі:

— Ах, які ў вас муж, Зіначка,— трэба ж! Гэта ж шчасце мець такога... Ай-я-яй!

6

Вячаслаў Пятровіч падабаўся Вольцы.

Не па-асабліваму як-небудзь там, а гэтак жа, як і Зіначка, як і ціхія вечаровыя гасцяванні ў іх кватэры, калі ўтраіх садзіліся за стол, пад дрымотна-роўную засень абажура, і асцярожна гэтак выстаўляў хто-небудзь кульгавенькую папірачку першых гаворак.

— Вы ведаеце, а можа, чулі: пафарбавалі ў суседнім доме балконы, а пра колер не згаварыліся...

— Але ж, як сам не возьмешся, ніхто не зробіць.

— Дык што ж, калі дом здаюць, а потым за іх дарабляй...

І аказвалася, што прыходзіў ужо ў нечую кватэру міліцыянер і што няйначай, як вінаватых не абмінуць штрафам. А то расказвалі, як чалавек нейкі (раніцай у чарзе гаварылі) падзяліў кватэру паміж дзвюма жонкамі — трэба ж! — і дагаджае абедзвюм. Жанчыны неяк па-асабліваму смяяліся, Вячаслаў Пятровіч таксама з імі...

Вярталася Волька ад суседзяў лагодная, у нязвыклым для Казіка ціхамірным настроі. Яна расказвала:

— Ты ведаеш, Зіначка так баіцца, каб ты бачыў, як баіцца.

— Чаго ж гэта яна? — падпускаючы ў голас ледзь прыкметнай з'едлівасці, нібыта зацікаўлена пытаўся Казік.

— Гэта ж падумаць толькі, каб настрашыцца гэтак: калі яшчэ тое дзіця народзіцца, а яна: «А што, як нежывое будзе ці нягеглае якое — божа!»

— Няхай на вуліцу часцей выходзіць,— разумеў па-свойму Казік.

— Дык і я ж кажу. І Вячаслаў Пятровіч. Ён ласкавы такі, уважлівы — во за кім адна любата!

— Ты дак згаравалася, бедная, спачыну табе няма. Толькі і робіш, што ў суседзяў сядзіш...

— А табе не падабаецца, так? Бо яны людзі не такія, як ты?

— А якія ж яны? Што ты ў іх такое знайшла, скажы!

— Яны жыць умеюць, а ты...

— Чакай, ты разбярыся,— пачынаў злавацца Казік.— Што ты гаворыш! Які ж твой Вячаслаў Пятровіч асаблівы, калі ён нават вітацца з чалавекам не

хоча, ходзіць, быццам у руках лейцы ад усёй зямлі трымае... Сустрэўся я ўчора на лесвіцы з ім... Потым... ты сама гаварыла, як ён кватэру атрымаў...

— Разумны, дык і атрымаў, а ты два гады ў бакоўцы сядзеў... Кожны жыве, як можа.

— У цябе сораму няма — што ты гаворыш? Лепш працаваць бы ішла — менш часу для глупстваў мела б.

— Надакучылі твае павучэнні, чуеш? Я толькі з гэтай вясны і жыць пачала...

...Адыходзіла вясна, наставала лета. Летам паехаў Вячаслаў Пятровіч з Зіначкаю да сваіх бацькоў. Вярнуліся яны праз месяц: Зіначка з яшчэ больш папаўнелым станам, і цяпер нейкі палахлівы і няпэўны выраз застыў у яе вачах і адбіўся на драбнаватым, прыкметна засмяглым твары. Вячаслаў Пятровіч быў заклапочаны.

Прайшло яшчэ колькі часу. Волька неяк сказала Казіку:

— Зіначку завезлі ў бальніцу... Сама бачыла...

— Няхай бы ўсё добра абышлося,— толькі і сказаў Казік.

— Як гэта ёй там будзе? Страшна, нябось? — трывожылася Волька.

Яна дык даўно прывыкла ўжо да Вячаслава Пятровіча, да Зіначкі — заўсёды і думала, і гаварыла пра іх як пра сваіх. Цяпер ёй думалася: як там Зіначка? Не вытрывала і зайшла да Вячаслава Пятровіча спытаць, ці ёсць якія навіны ад жонкі.

— А-а, гэта вы? — зусім не здзівіўшыся, сустрэў яе той.

Вячаслаў Пятровіч заспаны быў трошкі, як заўважыла адразу Волька, з паблытанымі валасамі і ў выцвілай піжаме.

Волька аглядзелася.

Сіфончык з вадою стаяў на стале. Тут жа раскіданы былі па газеце агрызкі яблыкаў. Вячаслаў Пятровіч, прыгладжваючы рукой валасы, падышоў напіцца.

— Я тут задрамаў быў трохі,— беручыся за шклянку, вялавата сказаў ён.— Сядайце на канапку, не абавязкова на крэсла.

Позірк яго быў няпэўны і мірглівы нейкі, вольнай рукою ён цёр сабе скроню.

Волька села і адразу пастаралася патрапіць яго гаворцы:

— Вам цяпер клопату многа, дык не дзіва, што змарыліся... Што чуваць пра Зіначку?

Ён нечага марудзіў, нібы раздумваў, адказваць ці не. Загаварыў толькі, калі сеў на канапку, блізка прысунуўшыся да Волькі. І голас яго тады ненатуральна неяк адразу ажывіўся.

— Ну, што вы, не паспела з дому выбрацца, ёй рана яшчэ... Чаму ў вас дзяцей няма, Вольга... Вольга Раманаўна? — раптам запытаўся ён.

Ад нечаканасці Волька адсунулася ад яго, паглядзела здзіўлена. Дзіця хацеў Казік, яна не хацела. А цяпер гэты пытае... І як гэта Зіначка згадзілася на дзіця?

— Бачыце, які я,— засмяяўся Вячаслаў Пятровіч,— задаю такія пытанні... Але ж мы ведаем адно аднаго, Вольга Раманаўна. Чаму вы адсунуліся ад мяне?

Ёй было няёмка сядзець вось гэтак блізка ад Вячаслава Пятровіча побач на канапцы. Нехта галасна загаварыў на лесвіцы, чулася жвавае тупанне ног. Здавалася, людзі беглі сюды. Недзе ляпнулі дзверы. Усё. Цішыня.

Яна ўсё яшчэ не адказвала Вячаславу Пятровічу.

«Трэба ісці дадому,— у непакоі разважала Волька.— Спытала пра Зіначку — і добра. А то яшчэ падумае немаведама што».

«Маўчыць жа нечага,— пачынаў злавацца Вячаслаў Пятровіч,— саромеецца ці смяецца з мяне? Ну, няхай...»

— Каб я быў вашым мужам,— зноў загаварыў ён,— я прымусіў бы вас насіць пярсцёнак... на правай руцэ. Чаму вы не носіце? — Ён паспешліва схапіў Вольчыну руку, супакоіўся трохі, калі ўбачыў, што тая не забірала яе.— Каб усе бачылі, што вы замужам, і каб ніякіх... Я раўнаваў бы!.. Ваш муж не раўнуе?

— Да каго яму раўнаваць, Вячаслаў Пятровіч? Што вы!

— Ну, хаця б да мяне, Вольга Раманаўна, га? — Вячаслаў Пятровіч на ўсякі выпадак засмяяўся.— Ведае ж ён, што вы ходзіце да нас?

— Гэта не тое, Вячаслаў Пятровіч, не кажыце... Мне проста добра ў вас, можа, яшчэ лепш, чым дома...

— Бачу, што вам добра, куды лепш, чым мне...

— Чым вам? Што вы, Вячаслаў Пятровіч!

— Ведаеце, Вольга Раманаўна...— нейкі момант ён раздумваў: гаварыць ці не,— вас хоць муж не пілуе, а мне ад Зіначкі столькі ўсяго... і ўсё праз вас. Скора, можа, і чуб трашчаць будзе...

— Як гэта? За што?

— Ну, як сказаць вам, Вольга Раманаўна? Магла ж яна падумаць, калі вы так часта ходзіце да нас?..

Ён зусім асмялеў ужо, і рука яго, насцярожана палётаўшы ў Волькі за спіною, супакоілася раптам на яе плячы...

...І значыцца, іначай усё было, зусім іначай. І значыцца ніколі не было ні ціхіх гасцяванняў тут, у гэтай кватэры, ні сардэчнай спагады, ні любасці. Усё яна сама прыдумала, Волька — і ўсё падман. Гэтак хораша, лёгка адчувала яна сябе яшчэ нядаўна з Вячаславам Пятровічам, з Зіначкай і — трэба ж — не заўважыла нічога, і як шкада цяпер і таго спакою на сэрцы, і любасці, з якімі ішла заўжды да суседзяў... Як яны павярнулі ўсё з Зіначкай, як яны думалі!..

І Волька загаварыла тады са стрыманай злосцю, з’едліва:

— Дык вы, можа, мяне чакалі, Вячаслаў Пятровіч? А Зіначка пра гэта ведае? Як жа ёй будзе там?

Цяпер ужо і ён здагадаўся, што нейкім чынам памыліўся ў Вольцы. Але думаў ён якраз не пра гэта. Волька загаварыла пра Зіначку, яна, бач, ведала, як яму дапячы найлепш... Не, яму не трэба было распачынаць усё гэта цяпер, калі такое з жонкаю... Але дзіўна: вінаваціў ён чамусьці не сябе, а Вольку. Ён не сядзеў ужо на канапцы, а, панурыўшыся, хадзіў па пакоі.

— Зіначка, дзякаваць богу,— мякка пачаў ён,— здаровая, ды я за яе і не баюся: яна ў надзейных руках. Гэта нават добра, што яе тут цяпер няма. Мы можам пагаварыць з вамі... Я правільна сказаў, Вольга Раманаўна, ну, што вы так часта ходзіце да нас. Жонцы гэта непрыемна... Адным словам, я прашу вас...

«Дык вось ты які,— дайшло тады да Волькі,— ты яшчэ мяне зрабіць вінаватаю хочаш, ты помсціш мне...»

Яна ўскочыла з канапкі.

— Дык вы гэтак, вы такі... Як вам не сорамна!

Яна баялася, што не вытрывае, возьме вось і за-

плача, бо вельмі ж балюча і крыўдна было ўсё гэта ёй.

...І дома ўжо, дзе ніхто не мог ні чуць яе, ні бачыць, яна заплакала. Як бы палёгка прыйшла да яе за слязьмі, і яна паспакайнела: сядзела на канапцы, зноў і зноў думала пра суседзяў, і дзіўна неяк — таго, што было раней, што цешыла яе і нават захапляла, зусім, аказваецца, не захавала памяць; цяпер збіралася ў ёй і акрэслівалася другое. Ну, хоць бы тое, як рыхтаваліся спраўляць дзень нараджэння Вячаслава Пятровіча, а Волька даведалася пра гэта позна і выпадкам: была ў суседзяў, калі Зіначка загаварыла пра гасцей: «Арнольд Піліпавіч сухое віно любіць, дык глядзі, Славік, каб купіць не забыўся». Волька занепакоілася: трэба ж ад сябе нешта паднесці Вячаславу Пятровічу, каб жа ведаць раней... «Паднесці Славіку? Навошта? Як-небудзь іншым разам, заўтра, ведаеце, будзе не зусім каб сямейнае свята, збяруцца супрацоўнікі Вячаслава Пятровіча... Можа, пасля пазавём больш гасцей, і тады...» Вольку не запрасілі.

Яна не помніла цяпер, пакрыўдзілася тады на суседзяў ці не. А можа, паверыла? Якая яна дурная была, адно ўспомніць сорамна.

А яны... Гэтага Арнольда Піліпавіча на руках насіць гатовы, нябось, каб выгады ад яго не мелі — не рабілі б так. Вось якія людзі! Не, яна, Волька, шкадаваць не будзе, што пасварылася з імі!..

Яна не плакала ўжо: устала, пайшла на кухню, памылася там пад кранам, вярнулася зноў у пакой — рабіць не было чаго. Пастаяла ў роздуме, убачыла: ложак быў засланы дрэнна — паправіла. Падабрала з вазона скамечаны, парыжэлы недакурак — гэты Казік, колькі яму ні гавары, усё адно робіць па-свойму. На палічцы канапкі стаяў гліняны каток — скарбонка: Волька збірала ў яе манеткі, глядзела, каб, божа барані, не чапаў катка Казік — не вельмі шанаваў ён гэтую цацку. Каток запыліўся: Волька знайшла анучку, стала завіхацца з ёю. Каток неяк выслізнуў з рук — разбіўся! Манеткі пырснулі пад канапку, пакаціліся. Вось ужо як не павязе, дык не павязе! Волька стала адсоўваць канапку, нервавалася і раптам войкнула — балюча прыціснула палец. Так тужліва стала, так шкада сябе — і яна зноў заплакала... Ліха з імі — з кватэрай гэтай, з катком і з усімі! Ну вось, мела яна кватэру — ну і што? Быццам былі ў яе знаёмыя — і

няма іх. Казік не любіў суседзяў, гаварыў, каб не хадзіла да іх. Яму самому што: увесь час на заводзе, сходы нейкія, лекцыі, а тут сядзі дома, свету не ўбачыш. Толькі і ведае: працаваць ідзі! А каб жа людскі гаспадар быў, дык работу даўно знайшоў, не балбатаў бы дарэмна...

Потым яна стаяла ля акна: пад вячэрнім нізкім сонцам быў заліты горад. Палымяная ружовасць клалася на дахі, напружана плавілася ў вокнах дамоў. Бруднавата-жоўтым дымам абкружаўся на лініі паравоз. Цагляныя трубы, застылыя ў шурпатай нейкай велічы, узносіліся то тут, то там. Нібы піка, кінутая невядомым волатам, імкнуў у неба рэактыўны самалёт — падбівала на гэткае ўражанне наструненая белая палоска, што цягнулася следам за ім.

Вялікі горад ляжаў перад Волькаю, але быццам незнаёмы нейкі, быццам новы. Яна дык заўсёды думала і яшчэ ў вёсцы марыла пра іншы горад — быў ён з вітрынамі магазінаў, з вясёлай мітуснёй тралейбусаў і машын, з натоўпамі людзей на вуліцах. А гэты, убачаны ёю, узнімаўся ўгору стрэламі кранаў, зычна пераклікаўся паравознымі гудкамі на нябачных пераездах і станцыях...

І, каб убачыць яго, трэ было глядзець непрытоена і шырока.

7

У тую далёкую пару я мог бы, сустрэўшы дзе на вуліцы, можа, нават і пазнаць цябе. Цяпер, бадай, не пазнаю: так даўно было гэта, і так іначымся мы з часам,— але ці настолькі, каб не ўслухоўвацца ў маладое наша рэха, якое вяртаецца да нас здаля?

1961, 1985

ПЕРАД ДАРОГАЙ

Яны прыехалі ў вёску яшчэ раніцай — шафёр Сямён Захаравіч з жонкай і зусім малады яшчэ хлопец, рабочы аўтабазы Саўчанка.

Цяпер дык быў, мяркуючы па часе, позні абед.

Яны і сапраўды толькі што паабедалі, і не паспелі яшчэ вылезці з-за стала, як нечакана пашарэла на двары, зашапацеў, паліўся нетаропка надвячорні ціхі дождж — ужо другі за гэты доўгі, як усім здалося, дзень: выехалі яны з горада рана.

І вось цяпер сядзелі на кухні, не вылазячы з-за стала, гаманілі, і ўсім было добра. Пайшоў дождж — ну і няхай сабе, пальє трохі ды сціхне. Грыбоў яны назбіралі і нават ад таго першага вялікага дажджу ўратаваліся шчасліва, схаваўшыся хто ў кабіне, а хто пад машынаю. І толькі потым, калі вярталіся з лесу да знаёмых у вёску, дзівіліся дружна и нядаўняга ліўня, бачылі, што стаяла ўсюды ў нізінках мутнаватая вада, што скрозь па дарозе прыбіла шумлівымі раўчукамі то да грудка, то да купіны, то да якой ламачыны парыжэлую траву, дробнае голле, пачарнелыя сцяблінь кветак. У лужынах плаваў абабіты дажджом руды цвет падарожніку. А потым з-за хмар выбліснула сонца — і трава, і зямля, і лужыны закурыліся парай; пабеглі з крыкам за машынай, калі ўязджалі ў вёску, басаногія дзеці, а ля нечага двара ляжала навалам абчэсанае бярвенне...

І, бач, зноў жа сабралася на дождж.

Пахла на кухні грыбамі, палалі дровы ў печы, а за вокнамі шапацеў у садзе дождж — гэта было добра чуваць: акно ў сад было расчынена. А яны сядзелі прыцемкамі за сталом, глядзелі на агонь, на дождж, і ўсім было ўтульна, цёпла, і ва ўсіх блішчалі трошкі вочы — можа, таму, што глядзелі на агонь, і трошкі кружылася галава, і плылі перад вачамі, як толькі сцішышся, грыбы...

Зайшла на кухню гаспадыня, патупала ля печы, сказала:

— А можа, пойдзеце ў чысты пакой?.. Я вам і лямпу запалю.— І, прыжмурыўшыся, глядзела на гасцей — госці не згаджаліся. Навошта той чысты пакой, калі і тут добра, і, можа, яшчэ лепей, чым там.

У тым пакоі на падлозе сушыцца проса, стаяць доўгія лаўкі ля сцен, у куце — высокае, памутнелае ад часу люстра. А тут... Не, ніхто туды не пойдзе.

— Яно, маці, і тут добра,— сказаў Сямён Захаравіч,— зусім як у вёсцы...

— Ну, няхай...

— Во, сказаў: як у вёсцы,— не ўцярпела жонка

Сямёна Захаравіча і засмяялася.— А мы дзе?.. Гаворыш абы-што.

— От жа ты якая! — трохі збянтэжыўся Сямён Захаравіч і палез у кішэню па папяроску.— Та-та-та! Та-та-та! Слова чалавеку сказаць не дасі.

Але ён не зазлаваў на жонку.

У яго была густая сівізна на гладка падстрыжаных скронях, і за доўгія гады, пражытыя з жонкай, ён добра ўведаў цану і сабе і ёй; паціху ды памалу навучыўся трымацца наводдаль ад той мяжы, за якою каса, як кажуць, звычайна находзіць на камень — і людзі становяцца на дыбкі і гавораць адно аднаму зашмат крыўднага і злога. Яшчэ ён ведаў, што жонка і ў слове была лаўчэйшая за яго, і звычку мела ўстаўляць, дзе не трэба, свае тры капейкі, і што валасы ў яе, як і ў яго, пабіты сівізною — хацела іх пафарбаваць аднойчы, ды ён не дазволіў. На фатаграфіі ў іх гарадской кватэры яны абое чарнявыя і маладыя: яна — у лёгкай сукенцы прыгожага крою, ён — у вайсковай форме.

Сямён Захаравіч не зазлаваў на жонку. «Кожнаму сваё,— думаў ён,— не захацела зразумець, ну і няхай не разумее». Можа, таму, што ён увачавідкі старэў, часта думалася цяпер пра вёску — далёкую, колішнюю: яна ляжала аж за сорак год ад яго. І там былі шурпатая калодка, на якой секлі дровы, цяпло кажушка і вышчарблены сучок у столі, марозная пара над ранішняй студняй і карова ля яе — панурая, з запалымі бакамі і нягладкай поўсцю. Там, у вёсцы, былі і бацька і маці, тады яшчэ жывая, і яны, дзеці, аж восем чалавек. Так хутка ідзе час: разышліся ўсе па свеце, а старэйшы брат недзе ў Свярдлоўску аж галоўны архітэктар горада.

Так хутка ідзе час! Яму ўспаміналіся дзеці, што беглі сёння за машынай; некалі і сам ён за пяць кіламетраў імчаў з вясковымі хлапчукамі на шашу, каб зірнуць на дымны хвост маторнага дзіва. Сёння ад таго дзіва патыхала б музеем, а гэтыя дзеці — проста блазнюкі і гарэзы — убачылі незнаёмага шафёра.

У нечым яго жыццё нітавалася з чужым. Было многа падобнага, але было і тое, чаго, ён ведаў, не будзе ніколі. Ён помніў, як нялёгка жылося ў вёсцы яму, як спакушаў дзень пры дні акрайчык хлеба, загорнуты маткай у ручнічок, і што была вясною такая

пара, калі зацвітае боб: ні ягад, ні грыбоў і далёка да першай бульбы. А потым ён працаваў у горадзе і харчаваўся па картках, потым палягчэла, а потым была вайна і зноў карткі... Ён ведаў, што даўно перамянілася ўсё ў яго вёсцы, і што там жыве яго бацька — упарты такі стары, не хоча пераязджаць да сына ў горад,— і што жыць старому асталося нямнога. А ён, сын, ніяк не можа выбрацца да яго — і на душы ў сына бывала часта неспакойна.

Цяпер ён задумліва камячыў папяросіну ў пальцах, аж пакуль яна не лопнула на канцы — адарваў сапсаваны канечык, прыкурыў. А калі клаў у кішэню пінжака запалкі, пачулася там чужая нечая рука. Паглядзеў — жонка. Яна збянтэжана засмяялася, папрасіла:

— Дай...

— Чаго табе?.. Ат, не чапіся да мяне!

І ўбачыў неўразуменне і цікаўнасць у вачах маладога Саўчанкі.

— Увыкла... Смаліць, як мужчына, проста сорам... Нядаўна заходжу дома на кухню, а яна сядзіць і смокча: з маіх недакуркаў зрабіла папяроску... Даўно курыць, толькі ўсё хавалася.

— Скажы ты! Ай-я-яй! — здзіўляўся Саўчанка і торгаў худою шыяй, і яго маленькія, пад доўгімі вейкамі блакітныя вочкі бліскалі жвава, а на лобе з'яўляліся маршчынкі.

А жонка Сямёна Захаравіча тым часам раскурвала папяроску. Рабіла гэта яна бадай што па-мужчынску — хіба толькі запалку трымала неяк далікатней, за самы кончык, далёка адстаўляючы локаць ад сябе. Потым вылезла з-за стала, і, сеўшы ля акна на лаве, пасунула за локаць рукаўчык, і, абапёршыся на падаконне, курыла, выглядала нешта ў садзе, і перагаворвалася з гаспадыняй.

Сямён Захаравіч сур'ёзна, з ціха затоенай усмешкай пазіраў на жонку, пасля не вытрываў, пачаў усміхацца і весела падміргнуў маладому Саўчанку.

— Гром-баба, га? Ах, каб цябе... Пыхкае, як паравоз!

— От, Захаравіч! Скажаце ж гэткае...— зноў здзіўляўся Саўчанка, і смяяўся, і торгаў доўгай шыяй — гэта азначала прыблізна, што ён круціў галавой.

А гаспадыня сказала:

— Дык, мусіць жа, гэта можна ў горадзе, калі жанчына курыць. Гэта ў нас нязвыкла толькі...

І вінавата глядзела на гасцей, неяк баязліва ўсміхалася: а можа, не так што сказала?

— Не, тут другое, маці,— спахмурнеў адразу Сямён Захаравіч,— у вайну яна ў мяне шмат перажыла... Ледзь з дзецьмі ў Нямеччыну не трапіла, ды, шчасце яе — ўратавалася неяк. Цягалася пасля па вёсках... Дзяцей яна мне, дзякуй ёй, зберагла... А як прыйшоў з вайны — якою яе ўбачыў! Страшная, худая — заплакаць можна... Жыццё такое было...

— Ой, не дай бог, людцы, вайны,— уздыхнула гаспадыня.— Мой жа сынок недзе зямлю парыць, можа, ужо і костачак не асталося. Як успомню...— І твар яе перасмыкнуўся, і здавалася, яшчэ трошкі — і яна заплача. Прыкрыла твар рукой, адвярнулася, адышла да печы.

Госці маўчалі. Цішыня запанавала ў хаце.

За акном нетаропка шапацеў дождж, і відно было ўсё ў садзе: змакрэлыя яблыні, апалыя жоўтыя яблыкі ў прытаптанай траве, бульбоўнік на барознах і зусім блізка, ля акна, рабінка — вялікія зеленаватыя кроплі дажджу віслі на яе галінах, адрываліся, падалі долу. У суседняй хаце, за садам, відаць, таксама палілі ў печы: па мокрым даху слаўся дым.

Усе маўчалі, кожны, мусіць, думаў пра сваё, а жонка Сямёна Захаравіча ўспамінала вайну, тое, як пайшла з дзецьмі ў бежанцы. Многа іх было тады на пыльных дарогах — гараджан, што ішлі і ішлі на ўсход. Немцы перанялі іх недзе па дарозе, сагналі да незнаёмай вёскі — вёска была пустой і напалову спаленай.

Жонка Сямёна Захаравіча ўспамінала...

Яна не ведала цяпер, як выжыла тады, чаму не памерла — ад страху, ад голаду, ад тугі. Памятала толькі, што адно думала і адным жыла: як накарміць дзяцей, як зрабіць так, каб уцалелі... Потым па людзей прыйшлі машыны. Ніхто не ведаў, куды павязуць іх, казалі, што ў Нямеччыну... Ёй пашчасціла: калі пад вартай асталося зусім мала людзей, яе з дзецьмі і яшчэ іншых адпусцілі — немцам не хапіла транспарту.

Што было потым? Вёскі, па якіх яна хадзіла, вёска, дзе папрасілася ў хату — да бабулі нейкай і яе дачкі... І тады яна перастала быць гараджанкай і стала вясковай кабетай: насіла ваду, ездзіла ў лес па дровы,

палола, жала, хадзіла за сорак кіламетраў па соль у мястэчка, пляла дзецям лапці — і гэтаму навучылася,— жыла і ў хаце, і ў зямлянцы, хавалася ад немцаў і паліцаяў у лесе, ведала, што жывая сама, і не ведала, што з мужам...

Страшнае пекла было — вайна, і каб жа не ведаць яго ніколі...

Весела гарэлі дровы ў печы, і нешта закіпала ў гаршку. Пахла на кухні грыбамі, недзе сумна звінела муха пры сцяне, а госці сядзелі, маўчалі — як бы забыліся, што наперадзе была яшчэ дарога, горад, дзе раніцай чакалі ўсіх клопаты і работа.

Сямён Захаравіч устаў, падышоў да печы, качаргою выкаціў на загнетку вугольчык і яшчэ раз закурыў. Так і астаўся там, ля печы, і глядзеў на агонь, а ў вачах яго былі не то задуменне лёгкае, не то летуценнасць. Гаспадыня стаяла побач, склаўшы рукі на грудзях, і па твары яе відно было, што ёй падабаўся Сямён Захаравіч, а можа, больш за ўсё тое, што ён прыкурваў вось так, ад вугольчыка.

— Усё хачу спытаць, Захаравіч,— ціха сказала яна,— што там у газетах пра вайну пішуць... Будзе яна?

— Не будзе, маці, не будзе... Нам з табою яна не патрэбна.

— Дык і я ж так думаю, і сын суседчын, маёр, што летась у гасцях быў, таксама казаў: не павінна. А калі што якое, казаў, дык доўга яны не паваююць...

— Праўда, маці, праўда...

— Толькі вось у нас нядаўна чутка пайшла... Забегалі людзі, пачалі ў краме ўсё купляць... І я сабе солі купіла.— Яна квола засмяялася: вось якая, бачыце, дурніца.— А цяпер няхай ляжыць сабе: замаразкамі вепручка заколем, як знаходка будзе.

— Во-во! Добра... І мяне на свежаніну пазавеш, маці, га? Ты, як калоць надумаеш, мне абавязкова накажы. У мяне стрэльба ёсць, двухствольная, у рэйхстазе ўзяў... Я мігам з тваім вепручком распраўлюся...

— Не, праўда, Захаравіч, у вас ружжо ёсць?.. Нямецкае? — адгукнуўся з-за стала Саўчанка.— Як гэта вам узяць яго ўдалося? Раскажыце!

— А так... У рэйхстазе, у падвале ўзяў.

— Ну, так проста і ўзялі,— як бы пакрыўдзіўся Саўчанка,— відаць, цікава было...

Сямён Захаравіч змоўк. Ён не любіў расказваць пра вайну: пра яе гаварыць можна было або доўга і многа, або не гаварыць зусім. Пра яе гаварыць добра з тымі, хто сам сядзеў у акопах, ляжаў у шпіталях, хадзіў у атаку,— з тымі, хто адчуваў штодзень на ўласных скронях вастраваты халадок смерці. Гэтаму жаўтаротаму Саўчанку вайна была, мусіць, нечым і незвычайным і цікавым, бы нейкае кіно. А яму, Сямёну Захаравічу, вайна была проста вайной — страшнай штукай, замешанай на чалавечым жыцці і смерці. І яшчэ ён ведаў: каб не трэба было абавязкова перамагчы, вайна для яго і яго таварышаў не мела б ніякага сэнсу. Вайна, думаў ён, гэта людзі, якія чамусьці лічыліся генераламі, лейтэнантамі, радавымі, а папраўдзе былі проста салдатамі, ён сам бачыў, як за два крокі ад яго ўпаў генерал,— было гэтае ў першыя месяцы вайны — упаў, каб не ўстаць ніколі...

Яму, Сямёну Захаравічу, здавалася часам, што пражыў ён на свеце як бы два жыцці — другім жыццём была вайна. Яна адлічвала мінуты — доўгія, як чаканне смерці, яна лічыла імгненні — кароткія, як пасвісты куль. Пад Севастопалем, у рэдкія зацішкі пасля бою, калі кранадася душы пакутная нейкая яснасць, адкрываўся яму, здаралася, краёчак таго, звычайнага і амаль недаступнага ўжо жыцця. Ён бачыў мора: яно ляжала спакойнае, сіняе, светлае, ахутанае ўдалечы ласкавай смугой, дэльфіны куляліся на невысокіх хвалях, і здавалася, не было навокал ні вайны, ні смерці, ні спякотнага неба, белага, як выцвілы брызент, ні свежай крыві, што цьмяна блішчала на сонцы.

І дзіўна: многа страшнага і цяжкога забылася з часам, а вось тыя, спакойныя, хвіліны і цяпер жывыя ў памяці...

— Сеня!.. Глядзіце: дождж перастаў!

Яго вывеў з задуменнасці жончын голас.

Сямён Захаравіч паглядзеў у акно. Туманная смуга лёгкім дымком вісела ў садзе. Недзе рыпнулі на вёсцы вароты, нехта загаварыў — вёска поўнілася гукамі, нейкімі асабліва рахманымі, выразна прыцішанымі пасля дажджу. Пачынала цямнець.

— Трэба ехаць,— сказаў Сямён Захаравіч.

— А можа, астанецеся яшчэ? Вечарэе ўжо, дарога дрэнная,— загаварыла гаспадыня.— Паначавалі б, а заўтра паехалі б... Паспееце ў горад.

— Паедзем, Захаравіч, праўда? — умяшаўся Саўчанка.

— Вы ж малады, чаго вам спяшацца. І яны б, можа, асталіся,— кінула гаспадыня на Сямёна Захаравіча з жонкай.

— Ён у нас толькі ажаніўся, маці, да жонкі спяшаецца. Нічога не зробіш: моладзь,— заступіўся за Саўчанку Сямён Захаравіч.— І мне заўтра на работу рана...

Яны сабраліся, перанеслі з кухні грыбы ў машыну. Гаспадыня выйшла іх праводзіць.

— Дык вы ж глядзіце, прыязджайце,— гаварыла яна.— Цяпер грыбы добра пойдуць... Хоць у нядзелю прыязджайце...

— Дзякуй, маці, прыедзем,— глядзеў ласкава на гаспадыню Сямён Захаравіч,— у госці заўсёды ездзіць прыемна... Ну, бывай! — і ён палез у кабінку. Жонка ўжо сядзела там, прытрымлівала рукою дзверцы, чакала. Саўчанка ладкаваўся ў кузаве, захінаючыся ў брызент...

Машына кранулася з двара.

Яны ехалі вясковай вуліцай, мокрай пасля нядаўняга дажджу. Увачавідкі цямнела. Недзе іграла радыёла: музыка далёка разлягалася па вёсцы. Выходзілі з веснічак на вуліцу дзяўчаты, святочна апранутыя, маладыя — відаць, спяшаліся ў клуб. Машына мінала вёску.

Сямён Захаравіч уключыў фары. І адразу паглушэла ўсё навокал, сціснулася да вузкай палоскі святла. Сямён Захаравіч пільна ўглядаўся ў дарогу; ведаў, якая ненадзейная пасля дажджу яна,— магло занесці машыну на спуску ці на павароце. Праехалі масток праз невялічкую рэчку, падняліся на ўзгорак, спусціліся ў лясок. Потым была вёска, а за ёй пачаліся агароды — цэлае поле капусты і бручкі,— і Сямёну Захаравічу ўспомнілася, як аднойчы ўпоцемку трапілі палкавыя машыны на бахчу: лопаліся кавуны, раўлі матоары, прабуксоўвалі колы... А на світанні калону абстралялі немцы...

Сямён Захаравіч круціў баранку, і яму зноў думалася пра вайну...

Машына ішла ў горад.

У кузаве пад брызентам сядзеў, скурчыўшыся, рабочы аўтабазы Саўчанка. Было холадна, і яму хутчэй

хацелася трапіць дамоў, у цёплую кватэру, да маладой жонкі. А жонка Сямёна Захаравіча драмала ў кабінцы, схіліўшыся галавой на плячо, і ёй увесь час мроіліся грыбы, грыбы, грыбы...

1961

БЛАКІТНЫ ВЕЦЕР

Лагацкі прачнуўся як бы ад нейкага штуршка: усё адбылося ненатужна і лёгка. Колькі часу ён ляжаў, не расплюшчваючы вачэй. Тое няўлоўнае і хісткае, што яшчэ лунала над ім, было, напэўна, успамінам аб сне. Сон адыходзіў у святле, у пахах, у струменнасці ветру. Нібыта стала над нейкім возерам у духмянай парнасці сонца. Пахлі сосны, узнімаўся над вадою блакітны вецер, і такі звонкі і чысты чуўся на беразе смех. Як хораша, як лёгка! Вось нібыта Лагацкі бяжыць да вады — як прыемна жвір халодзіць босыя ногі, як засцілае вочы блакітны вецер!

У пакоі ціха. Ноч. Дзве гадзіны ночы — Лагацкі гэта ведае. Зараз вось пройдуць, калі не прайшлі, з фабрыкі работніцы: яны заўсёды праходзяць у гэты час, і так ясна чуваць тады ўночы крокі. І яшчэ гамонку. «Ой, дзеванькі, ды ён жа кажа: «Я табе гадзіннік куплю». Ой, трымайце мяне, а то ўпаду!» І смех — залівісты, нястрымны. Смех заўсёды будзіць Лагацкага, як і гэты вецер, што сніцца апошні час.

Ноч. Ціха. Мусіць, прайшлі ўжо работніцы, мусіць, таму і прытрызніўся яму гэты смех.

Якая светлая, якая чуйная ў пакоі цішыня! Тонкі прамень зламаўся ў люстэрку — таямнічыя глыбіні адкрыліся ў шкле. Павуціннай сеткай на сцяну ляглі цені: наблытаў адсюль нябачны вулічны ліхтар. І хораша ад думкі, што можна нікім не ўгледжаным стаць ля акна і гэтак сцішыцца перад маўклівасцю ночы...

Лагацкі выставіў руку, шукаючы на крэсле адзенне.

Уставаць лёгка, і няма той млявасці, што раніцай хіне да сну і зводзіць павекі. Усё было незвычайна, трошкі таямніча, было прыемна і хораша. Лагацкі пастаяў ля акна, паглядзеў на вуліцу. Ліхтар свяціў сла-

ба, з-пад аснежанай стрэшкі звісала сусолка — застылая, нерухомая жылка вады.

Пазаўчора была адліга, потым цісkануў марозік, потым усё прыцярушыла сняжком. Недабудаваны дом па той бок вуліцы, вастравата блішчыць зорка ля вежавага крана. Дахі і цішыня. Ланцужкі ліхтароў мецяць у горадзе вуліцы. Позна.

Думалася, што ўсё роўна не заснеш. Лагацкі абуўся, апрануў у калідоры паліто і выйшаў на лесвіцу. Адразу ж абступіў яго пах фарбы, халоднай тынкоўкі і пылу — заўсёдны пах пад'ездаў, скупа падпраўлены цёплым духам чалавечага жытла. Расціснутыя абцасамі, на пляцоўцы валяліся недакуркі. Лагацкі ўспомніў: учора ў суседняй кватэры спраўлялі праводзіны. Ішоў у армію Толік, токар нейкі ці будаўнік. У пад'ездзе вечарам было шумна. Потым па яго, Лагацкага, прыходзіў гэты самы Толік: «Сабраліся... Леанід Іванавіч... Разам з намі...» Дзівак нейкі, яны ж былі амаль незнаёмыя. Лагацкі не пайшоў. Ага, ён правяраў тады студэнцкія работы. Каб не забыцца заўтра ды даць гультаям гэтым добрага прачуханца. Работы здавалі позна — ясна: пісалі за адзін вечар. Які-небудзь курсавы геній будзе пасля хіхікаць: бура і націск, трохі натхнення і трохі часу. Глупства! Наогул, студэнты сталі не тыя. Многа з вытворчасці. Думаюць, што ўведалі ўжо жыццё. Чытаюць Рэмарка. Глупства!

Цяперашнія студэнты не падабаліся Лагацкаму.

Ён і не заўважыў, як у яго сапсаваўся настрой. Зноў на лесвіцы ўбачыў недакуркі, і зноў успомніўся Толік. Якраз дарэчы: не хацелася думаць пра студэнтаў. «Дарэмна ўсё ж пакрыўдзіў хлопца, не схадзіў на гэтыя праводзіны. «На адыходную» — здаецца, сказаў Толік. Палічыць, што абышоўся з ім па-свінску, і будзе мець рацыю. Не праз работы ж тыя адмовіўся... Не, не палічыць: я для яго, відаць, дужа занятая, вучоная асоба. Смешна гэтак сароме́ўся, запрашаючы да сябе, і чамусьці выцер аб палавік ногі, калі выходзіў». Лагацкаму стала сорамна: «Вучоная асоба! Нічога сабе апраўданне... Якая прыкрасць!»

Выбіта шкло ў дзвярах, на фанерцы крэйдай напісана: «Тут жыве Зоя». І стаяць тры вялікія клічнікі. «Якая-небудзь Толікава знаёмая, і, глядзі, была на провадах. Добра, што не пайшоў туды, а то давялося б прыкінуцца другам моладзі. Так сказаць, старэйшы та-

варыш і юная змена... Роля яўна не для мяне. І сваіх студэнтаў даволі».

Ён падумаў раптам, што ўсё гэта глупства, і раззлаваўся на сябе: «Ну, не пайшоў, і добра... А тут нейкія сумненні, нейкі дзіцячы самааналіз. Смешна. І нагул...»

Ён выйшаў на вуліцу, спыніўся. Нешта незразумелае з ім робіцца апошні час: ну, хоць бы гэты сон, бадзянне ноччу. Лагацкі пастаяў у роздуме, агледзеўся. Было маўкліва на вуліцы, пуста, і ў самай моцы быў марозік, такі вастраваты, жорсткі, але прыемна цвярозлівы. Няпэўна і нудна пачало паколваць у скроні: можа, ад свежага паветра. «Чаго я выйшаў?» — думаў Лагацкі.

Якраз перад ім ляжаў, нібы ў руінах, недабудаваны дом, той самы, які ён заўсёды бачыў з акна кватэры. Першыя цагліны тут паклалі яшчэ вясной, летам будаўніцтва чамусьці спынілі, а цяпер распачалі зноў. Лагацкі звыкся з домам, і ён стаў для яго нібы жывой істотаю. І, нібы чалавек, дом абрастаў патрохі ўспамінамі.

Стары знаёмец, ён дзяліўся імі цяпер з Лагацкім. А той разумеў усё і бачыў, як зямля, выкінутая некалі экскаватарам, прыцярушаная пасля сняжком, рабілася добраю горкай. Як прыходзілі на яе дзеці і вось: хто на санках, хто на нагах, а хто і на тым самым месцы, якому і належыць здаўна адказваць за нястрымныя гаспадаровы фантазіі, спрабавалі тут і крутасць горкі і разгон з яе.

«Стары знаёмец, без аблічча і нумара дом,— думаў Лагацкі,— і я расказаў бы табе, чым была для мяне гэтая незнарок падгледжаная наіўнасць. Ды ты не ведаеш, што такое пах і водар маленства, не разумееш, чаму чарнільная пляма, выпадкова ўбачаная на снезе, можа хваляваць мацней, чым самае сталае дзіва».

Ды ён, Лагацкі, і не хацеў такога. Ён ведаў: сапраўднае дзіва было ці простае, як гэта дзіцячая горка, ці наіўнае, як выцвілы паркаль. І сапраўды вецер быў блакітны, як у сне. У ім было ўсё: трывожная смуга даляглядаў і незабыўнае святло маленства; дажджы густыя, як вецер, і пах суніц; шчымлівая радасць у сэрцы і непрыкрытае вясёлае здзіўленне перад светам. Якраз усё тое, чаго не хапала цяпер Лагацкаму.

Ён адчуваў, што вельмі змарыўся. Лекцыі ў інсты-

туце стамлялі яго, і, можа, яшчэ больш — размовы ў прафесарскай. Званіў тэлефон, выходзілі і заходзілі людзі, сакратарка бегала з раскладам, выкладчыкі скардзіліся на студэнтаў, быццам усё гэта было так важна і быццам студэнты былі калі-небудзь анёламі. Лепш за ўсё было Лагацкаму, калі не турбавалі яго. І тады можна было сядзець, не слухаючы, засяродзіўшыся ў сабе,— і гэта было чаканнем дзіва. І яно прыходзіла і шчымліва кралася ў сэрца то нечым голасам, пачутым з калідора, то скразнячком, што біўся ў фортцы, то шчодрым пахам вады, невядома кім распырсканай па падлозе. Гэта блукаў недзе і трывожыў Лагацкага блакітны вецер.

І вось нібы спадала з яго плячэй і такой непатрэбнай рабілася сталасць, і, здавалася, усё пражытае і перажытае раней, паназбіранае з гадамі па кропельцы і драбніцы, не варта было і самай маленькай часцінкі чаканага дзіва. Чаму так было, Лагацкі не ведаў. Можа, гэта вярталася жыццё на паўзабыты нейкі круг маленства, можа, гэта тужыла душа па нечым, што адышло і што згубілася са сталым вопытам, а можа, тут была і проста незадаволенасць сабой — Лагацкі сказаць не браўся. Нешта незразумелае рабілася з ім, і яно шукала сабе выйсця.

Толькі ён, Лагацкі, цяпер не думаў пра гэта. Спаў горад, нязвыклая таямнічасць панавала наўкол. І такі даступны і недаступны цяпер адзіноце, Лагацкі глядзеў і слухаў — і цішыня, і ноч цяклі праз яго. Ляцелі на ліхтар сняжынкі, нячутныя і ціхія, бы начныя матылі. Сіпеў і чухкаў у шэрых прыцемках паравоз. Трапяткі і тонкі праменьчык спускаўся з неба: міргала над горадам зорка. І многае, многае адкрывалася тады і сэрцу, і зроку, і здавалася Лагацкаму, што ён чуе, як вастравата і скупа пахнуць і снег пры дарозе, і лядок на ёй, і які асаблівы, густы халадок ідзе ад цэглы, панакіданай ля дома, і які зусім іншы, скразняковы ветрык дзьме з праёмаў пустых акон. Сасновай свежасцю патыхала ад штабеля заінелых дошак. І было адчуванне, што вось яшчэ трошкі, варта толькі захацець і напружыцца, як адкрыецца недаступная раней і ніколі яшчэ нязведаная пранізлівасць думкі, як прыйдуць небывалы спакой і яснасць. І ён тады неяк па-новаму гляне на сябе і на людзей.

Але нічога не прыйшло, і на душы засталася горыч.

Са шкадаваннем успомніўся сон, светлая ціша ў пакоі, ранейшы настрой, і ён падумаў: «Куды ж адышло ўсё гэта?» Замест адказу паўстаў у памяці ўчарашні вечар, праводзіны, Толік, і цяпер ужо выразнай, неадступнай стала незадаволенасць сабой. «Я чэрствы, раўнадушны чалавек,— сказаў сабе Лагацкі,— але не хачу прызнацца ў гэтым і таму гуляю ў хованкі з сабой. Тры гады жыў побач з гэтым Толікам і амаль не ведаю яго, зрабіў яму прыкрасць — і хачу апраўдацца. Я не пайшоў таму, што проста баюся людзей, баюся, каб яны не ўбачылі, што ў мяне згубілася нешта і што ўсё мне не цікава. І гэтых новых студэнтаў я не люблю таму, што яны не такія, як я, што жывуць па-свойму і цікавей за мяне».

Так ён думаў, і яму здавалася, што ён думае шчыра. І дзіўна: у гэтай гаворцы з сабою, у гэтых непрыемных прызнаннях была для яго нейкая помслівая асалода. Яшчэ раз ён агледзеўся: падумаць толькі, гэта ж нечага прастаяў тут, папаўшыся, як дзіця на забаўку, на нейкія марныя летуценні. Брала злосць на сябе, Лагацкі адчуў нечакана, што ўвесь схаладнеў. Ён наставіў каўнер і пайшоў па вуліцы. Гэта нават яшчэ не вуліца была, а проста дарога: дамы тут стаялі з аднаго толькі боку. Справа, заціснуты нейкімі майстэрнямі, была нешырокая пустка, аж пакуль не ўставаў на яе шляху адзінокі, вясковага выгляду домік. Дарога за ім збочвала ў яшчэ адну, шырокую вуліцу. Недзе там узнімалася сцяна таполяў, і Лагацкаму відно было, як трапяталася зыркае святло ліхтара ў шэрым іх галлі. На адкрытым месцы яшчэ больш сябе даў адчуць халадок. Несучы блакітны агеньчык, з-за адзінокага дамка вышмыгнула таксі, пранеслася паўз Лагацкага. Пачулася з машыны гаворка. Стала маркотна. І, можа, так і трэба было — выплыў успамін... Генадзь Парукаў — выкладчык англійскай мовы, інстытуцкі знаёмы. Чарнявы, з коратка стрыжанымі валасамі, аднагодак Лагацкага, ён заўжды прыязджаў у інстытут на матаролеры. Да позняй восені хадзіў без шапкі. Употай Лагацкі зайздросціў яму, наогул — ён зайздросціў людзям, што ўмелі ўладкаваць сваю душэўную гаспадарку. Парукаў, здавалася яму, гэта ўмеў. Мусіць, для яго не было нявырашаных пытанняў у жыцці, бо і ў гаворцы адчувалася нейкая незразумелая Лагацкаму ўпэўненасць і сіла.

Дык вось, гэты самы ўспамін. Неяк пацягнула Лагацкага за язык — пакпіў з таго парукаўскага матаролера. Як ён цяпер разумеў: была ў гэтым неўсвядомленая яшчэ і смешная спроба як бы наперад апраўдацца перад кімсьці ў нейкай сваёй няздатнасці.

— Браце мой,— сказаў яму Парукаў,— ты разважаеш недаравальна для дарослага чалавека. Спытай у любога школьніка, ён табе скажа, што мы жывём у атамны век. Матаролер хоць і не ўзносіць мяне да вяршынь цывілізацыі, але, заўваж сабе, сведчыць пра псіхалагічныя зрухі ў маім характары. Я раблюся сучасным чалавекам.— Ён засмяяўся, пераводзячы ўсё на жарт.— Ахвяруй, браце, сваім вясковым ідэалізмам, не трэба быць «дзядзькам у Вільні». Ясна?

Чорт бы яго спазнаў, гэтага Парукава, ён умеў разважаць лагічна. Жарты жартамі, але Лагацкі адчуў сябе ніякавата: нібы вось узяў чалавек ды і даў яму мімаходзь, як малому, безуважна крыўдную пстрычку. «Ну, браце, адстаў ты ад жыцця, куды табе — не разумееш простых рэчаў»,— гэткае пачулася Лагацкаму ў тых жартаўлівых парукаўскіх словах.

«І сапраўды, як «дзядзька ў Вільні»,— думаў цяпер Лагацкі, спакойна неяк, быццам з тым непрыемным успамінам было пакончана назаўсёды і быццам усё цяпер будзе інакш. Хада супакойвала яго. Незаўважна для сябе ён пачаў прыглядацца да вуліцы, і зноў, як нядаўна, калі стаяў перад домам, убачанае навокал западала ў памяць. Ён бачыў, як сцішана, таямніча застылі ў змроку за платамі сады, як мякка лілося запозненае святло з акна драўлянага дамка, аднесенага ў глыб двара, і як, схаваўшыся ад холаду, драмаў у тэлефоннай будцы ля магазіна вартаўнік. Так, аглядаючы ўсё наўкол сябе, дайшоў Лагацкі да чыгуначнага пераезда і спыніўся там. Бліскучы прамень каўзануўся па брыжыку рэйкі і пабег аж туды, дзе пяшчотна млелі чырвоныя агеньчыкі на стрэлках і дзе ўжо іншыя, высокія і зыркія, узнімаліся насустрач агні. І як бы дачакаўшыся чалавека, пранізліва і тонка азваўся недзе наперадзе паравоз. «Трэба абавязкова з'ездзіць у вёску, да маці,— адзначыў сабе Лагацкі.— Гэта ж столькі часу не наведваўся туды». І яму стала прыемна, што ён падумаў гэтак, і непрымушанае, лагоднае прыйшло тады адчуванне: «Я спакойны — гэта добра. Але спакойны не так, як яшчэ

нядаўна, калі прачнуўся». Як бы ў нейкую новую і вялікую дарогу збіраўся ён цяпер, і ад таго, што яна наперадзе, было прыемна.

Яму ўжо не стаялася на пераездзе, ён павярнуўся і пайшоў дамоў. І нейкім радасным для яго і такім значным было цяпер гэта вяртанне.

На пустцы, мінуўшы вуліцу, ён спыніўся. Белая роўнядзь снегу кінулася яму ў вочы, і ён ступіў на яе, паволі пайшоў, прыглядаючыся, як цьмяна мроіліся каля ног сняжынкі. Ён нахіліўся і, узяўшы рукою і сціснуўшы ў далоні камячок снегу, прыклаў яго да твару. Прыемная і свежая заструменілася тады прахалода. Лагацкі выпрастаўся. «Трэба жыць,— падумаў ён,— трэба смялей і весялей жыць: пазбыцца раўнадушша, чэрствасці, замкнутасці ў сабе. І тады ніколі не пакіне мяне блакітны вецер».

Ён павярнуўся і, прыемна ўзрушаны, лагодны, пайшоў на дарогу.

1960

НА ВАКЗАЛЕ ЧАКАЕ АЎТОБУС

Усё было, як і ўчора, і ўсё пачыналася спачатку...

У калідоры Юновіча ледзь не збіў з ног загадчык аддзела інфармацыі. Няголены, дзіўна сутулы пры сваім невялікім росце, адскочыўшы ўбок, асалавела лыпаў круглымі вачамі.

— Ты? Выскачыў, нібы... нібы... Здароў!.. Слухай, а што, калі са стала знаходак інфармацыю даць? Далі, кажаш? Ну, прыдумаю пад яе новую рубрыку, рубрыка вывезе... Ведаеш новы анекдот? Муж варочаецца ў сне, мармыча, а жонка бярэ яго за руку і кажа...— ён нагнуўся да Юновіча, шэпчучы яму на вуха, і раптам закалаціўся ўвесь, зарагатаў:

— Сатыра, гумар— здарава, га? — і тыцнуў Юновічу кулаком у бок. І, не чакаючы, пакуль той будзе смяяцца, пабег да машыннага бюро.

Анекдот быў як анекдот. Смешны. Юновіч не смяяўся. Усё было, як і ўчора, і ўсё пачыналася спачатку...

Адчыніўшы ў пакоі фортку, Юновіч, не распранаючыся, сеў за стол. Яму не хацелася ні анекдотаў, ні

размоў. Хацелася памаўчаць, пабыць аднаму, пакуль не збяруцца работнікі і не закруціцца на ўсю моц рэдакцыйная машына.

І Юновіч маўчаў.

Папяроска тлела паволі, і гэтак жа паволі, але з дзіўнай яснасцю, цяклі яго думкі. Чулася праз фортку шаргаценне ног пад акном — Юновіч слухаў, і яму ўяўлялася, які там шэры, з вільготнай цёмнай зеленаватасцю снег на тратуары. Крокі сціхалі, і тады ў цішыню, няпэўную, як завязь, урывалася імклівае сіпенне аўтамабільных шын, а то і віскліва, здушаны скрыгат тармазоў. Стаялі ліпы ля агароджы праз вуліцу — галінастыя, шырокія, гладка ўкрытыя цьмяна-белым ранішнім снегам, а за імі відна была школа, і ў вокнах яе гарэла святло: жоўта і роўна свяціліся лямпы. Было пахмурна на двары, была адліга.

А ў пакоі цёпла пахла фарбай, і ў вядро, падвешанае да радыятарнага крана, скупа падала вада: учора званілі водаправодчыку,— значыць, яшчэ не прыходзіў. Юновіч устаў, прайшоўся па пакоі, пастаяў, успомніў: ага, ён хацеў сесці на канапу, старую, звыклую канапу,— прыперціся плячамі да спінкі і заплюшчыць вочы... Якраз у час успомніў: канапу ўчора загадаў вынесці рэдактар, каб супрацоўнікі не спакушаліся адпачынкам і каб не заседжваліся ў аддзеле чужыя людзі. «Зануда,— думаў Юновіч,— самы звычайны зануда»,— але думаў зусім не злосна, бо не адкрываў амерык: рэдактара ніхто не любіў. У рэдактара быў вузкі, бясстрасны і, як казалі ў рэдакцыі, халоднай штампоўкі твар; прыйшоў ён у газету нядаўна, і адразу стала многа мітусні ў рэдакцыі, лятучак, планёрак, «накачак» і яшчэ больш — размоў пошапкам у калідоры. Газета не лепшала, і ўсім хацелася, каб рэдактара хутчэй перавялі куды-небудзь, няхай нават на павышэнне.

Зрэшты, сёння Юновічу было ўсё адно: пра рэдактара ён не надта думаў...

У горадзе ёсць вакзал, і калі пайсці туды, купіць білет і сесці ў аўтобус — спачатку будзе чаканне, ціхія, стрыманыя размовы, потым — штуршок: на момант абарвецца трапяткая нітка часу і — паехалі, паехалі... Будуць прыпынкі на далёкіх кіламетрах, будзе бязладная гамана ў аўтобусе, дым, хоць сякеру вешай, будуць нязлосна лаяцца жанчыны, а дзядзькі

ў суконных паддзёўках скаліць зубы і ўсё адно курыць; будзе падсаджвацца да самотнай дзяўчыны салдацік, а глухаваты дзядок з пяньковай бародкай паказваць суседу боты, што вязе ад сына. А потым наперадзе выплывуць маленькія дамкі раённага цэнтра — Юновіч выйдзе з аўтобуса і не паспее агледзецца, як на яго насядзе, нібы мядзведзь, высокая, шырокая, такая шаматлівая, аж да звону ў вушах, нязвыклая цішыня... Калі ён прыедзе надвячоркам, у драўлянай гасцініцы будзе паліцца грубка і сядзець у дзяжурнай цёткі якая-небудзь знаёмая, за адну толькі добрую душу, за шумлівы агонь у грубцы аддаючы без жалю дзённыя навіны. Ён убачыць у нумары акуратна засланыя пасцелі, яшчэ раз услухаецца ў цішыню, і тады яму здасца: усё, што было з ім раней, да гэтага дня, недзе далёка-далёка і што жыццё можна пачынаць нанава...

Так ён часта падманваў сябе, Юновіч, так было і ў апошнюю паездку.

Спачатку, вечарам у гасцініцы, усё было, як звычайна: і нясмелае чаканне нязнанага, і ціхая радасць адзіноты, і такая ж ціхая надзея на абнаўленне. А раніцай, выходзячы на вуліцу, Юновіч ужо шкадаваў, што раён незнаёмы; учарашні настрой прападаў, а маленькі гарадок мала чаго абяцаў нязнанага. Трэба было нешта шукаць для газеты — час падганяў Юновіча. Ён пайшоў у мясцовую рэдакцыю, і там сабрат па пяру, чырванатвары, у галіфэ, у шэрым пінжаку і зімовай шапцы, адклаўшы ўбок падшыўку газет, з якіх нешта старанна спісваў, падказаў Юновічу чалавека, які, на яго думку, заслугоўваў аж цэлага нарыса. Юновіч падзякаваў і паехаў у калгас.

...Стаяў зімовы сонечны дзень, але не з тых спакойных, роўных, ясных і як бы аглухлых ад цішыні, якія бываюць звычайна ў студзені. Дзьмуў вецер, і ўжо нешта сінела, падтавала на гладкім санным следзе. Ля ганка сельмага чырыкалі вераб'і, трымцела ад ветру і залацілася на сонцы растрэсеная на вуліцы салома. Нечакана зазвінеў званок,— Юновіч схамянуўся, убачыў, што ідзе да школы: адтуль ужо гурмою высыпалі на вуліцу дзеці. Чужога чалавека заўважылі адразу: школьнікі з малодшых віталіся з Юновічам. Ішла насустрач дзяўчына, жмурылася, гледзячы на сонца, і папраўляла свабоднай рукою пад пахаю папку.

Юновіч спыніў яе і запытаў, дзе калгасная кантора.

У дзяўчыны быў ціхі і прыемны голас і нешта далікатнае ва ўсім абліччы. Гаворачы, яна па-дзіцячы моршчыла лоб, чамусьці зняла рукавічку і камячыла яе ў пальцах.

— Дык вы знойдзеце цяпер? — спытала яна.

— Кантору? Знайду як-небудзь... Дзякуй.

— Не, хадземце, я вам лепш сама пакажу...

І яны пайшлі. Дзьмуў вецер, і дрыготка, сполашна свяціла сонца. Разгаварыліся, і неўзабаве Юновіч ведаў ужо, што дзяўчына гэта настаўніца, што завуць яе Валя, працуе тут другі год, а сама з горада. Ці сумна ёй у вёсцы? Моладзі, праўда, тут нягуста. Фільмы ў клубе найбольш круцяць даўнія, але — нічога. Вось толькі работы ў школе шмат, ды яшчэ — лекцыі, даклады. Яна класны кіраўнік, і часта даводзіцца хадзіць па вёсках — да бацькоў сваіх вучняў. Ці будзе перабірацца ў горад? Яшчэ не думала пра гэта. У горадзе ўладкавацца цяжка, трэба, каб нехта памог, а яна не ўмее прасіць, ды і не хоча. Там, у горадзе, у яе сястра, маці... Маці зарабляе мала, бо працуе прыбіральшчыцай, а сястра вучыцца ў інстытуце. Калі і ўладкавацца ў горадзе, наўрад ці будзе ў яе многа гадзін, а маці ж і сястры памагаць трэба.

Ля калгаснай канторы яны развіталіся.

Да чалавека, які заслугоўваў аж цэлага нарыса, Юновіч спазніўся: нарысы пра яго ўжо напісалі. Расклаўшы перад сабой газетныя выразкі, чалавек завучана пераказваў іх, а Юновіч не перапыняў яго, запісваў, хоць запісваць, папраўдзе, і не было чаго: што павінны рабіць і нават думаць героі дрэнных нарысаў, Юновіч добра ведаў і сам. І вось цяпер гэты, зусім незнаёмы і, можа, нават цікавы, чалавек расказваў пра сябе словамі, чужымі і сцёртымі, прыдуманымі падчас нядоўгага натхнення нейкім юновічавым сабратам. Створанае вярталася да творцы: была ў гэтым іронія, якую адчуў адразу Юновіч, але думаць пра якую пакуль не хацеў. «Газета чакае нарыс,— суцяшаў сябе ён,— горшы ці лепшы, але напісаны ў тэрмін. Толькі вось... гэты чалавек: хоча ён памагчы мне ці смяецца з мяне?»

Ён так і не дазнаўся праўды: час падганяў Юновіча, трэба было вяртацца ў рэдакцыю. А праз тыдзень, калі ў газеце з'явіўся нарыс, Юновіч не мог даравацъ

сабе, што напісаў яго. Пісаць трэба было пра кагосьці іншага. Можа, нават пра Валю. Ці не пісаць зусім.

...Шарэла пахмурная раніца, і Юновіч хадзіў па рэдакцыйным пакоі.

На вакзале стаяў аўтобус, ён быў далёка, але Юновіч шмат чаго ведаў пра яго. Аўтобус быў пусты, маўклівы, і аб яго халодныя бакі біліся паравозныя гудкі, пераразвон трамваяў, маторны рокат, але аўтобус не пазнаваў яшчэ іх. Прастора і час ляжалі пад яго коламі, але ён не ведаў пра іх, як не ведае яблык пра таемную сілу семак, што схаваны ў ім. Аўтобус кранецца, і яму падуладныя стануць далёкія палі і дарогі, ціхія гасцініцы ў далёкіх гарадах і новыя людзі, а найбольш — Юновічава надзея забыцца на нядаўняе, прыкрае, што асталося ад мінулай паездкі, узяць і пачаць усё нанава...

Адзінокі, маўклівы аўтобус стаяў на вакзале.

На стале зазваніў тэлефон,— Юновіч падышоў, зняў трубку. Рэдактараў голас скупа і з націскам сказаў:

— Зайдзі.

Трубка змоўкла, потым у ёй нешта шчоўкнула. Трэба было ісці. Юновіч распранаўся. На вакзале стаяў аўтобус — ён чакаў, і нячутна ў пакоі кружыла ўжо шкадаванне: болей пра аўтобус Юновіч сёння думаць не будзе...

У прыёмным пакоі ён паволі тушыў папяросу. Сакратарка ўсміхалася, а потым з прытворнай сур'ёзнасцю кулаком пагразіла рэдактаравым дзвярам. Выходзіла зусім не смешна. Юновіч пайшоў...

Адкінуўшыся на спінку крэсла, рэдактар глядзеў у акно. Ён не варухнуўся, не павярнуў галавы, калі Юновіч увайшоў,— сашчэпленыя рукі ляжалі на каленях. Нічога новага, усё было Юновічу вельмі знаёмае. Нуднаватым і роўным голасам рэдактар сказаў:

— Трэба арганізаваць выступленне дырэктара льнокамбіната. У іх там добрая самадзейнасць... Сядай.

— У які нумар?

— У наступны.

Рэдактар усё яшчэ глядзеў у акно.

— Выступленне дырэктара давалі ўжо іншыя газеты,— сказаў Юновіч.

— Наша газета таксама «іншая». Што яшчэ?

Рэдактар усё яшчэ глядзеў у акно.

— А калі дырэктар,— чамусьці пачаў хваляваоца Юновіч,— не ўмее пісаць. Рабіць за яго... і наогул...

— Можаш наняць каго-небудзь — дзела тваё.

Рэдактар любіў гумар. І вось звычайная чалавечая слабасць рабілася сілай, выстаяць перад якою ніхто ў рэдакцыі не мог. Але сёння Юновічу чамусьці не хацелася адступаць. Ён сказаў:

— Мне здаецца, трэба даць выступленне каго-небудзь з самадзейнасці. Або рэпартаж. Будзе цікавей, і не паўторым... іншыя газеты.

— Будзе цікавей, калі табе перастане здавацца... Рабі.

Рэдактар глядзеў у акно. Гаварыць далей не было ніякага сэнсу. Юновіч устаў. «Дзівак,— думаў ён, гледзячы на рэдактара,— не хоча нават усміхнуцца. Сядзіць, як Буда,— бог, цар і воінскі начальнік, напускае на сябе суровасць... Не, браце, так у нас справа не пойдзе».

Юновічу чамусьці было шкада рэдактара.

У прыёмным пакоі зноў усміхалася сакратарка — ён моўчкі прайшоў ля яе. У канцы калідора паказаўся загадчык аддзела інфармацыі — Юновіч шмыгнуў у свой пакой. Закурыў, набраў тэлефонны нумар: ненатуральна плаўны жаночы голас тлумачыў, што дырэктара на камбінаце няма, але, мусіць, скора будзе. У тэлефоннай трубцы было чуваць, як стукала машынка. Сказаць, каб чакалі карэспандэнта? Яшчэ падумаюць, што ён прыедзе па крытычны матэрыял, і тады дырэктара сёння не знойдзеш.

— Хто гэта гаворыць? — пыталася жанчына.

Юновіч палажыў трубку.

Ён нічога яшчэ не вырашыў, калі выйшаў на вуліцу. Было пахмурна, туман не рассейваўся — спяшаліся пешаходы, аўтобусы хадзілі з запацелымі вокнамі. Па адзін бок вуліцы гарэлі ліхтары, ля піўнога ларка непадалёк ад рэдакцыі тоўпіліся мужчыны. Юновіч не спяшаўся. Колькі часу стаяў ён на мосце, гледзячы на раку,— лёд ля берагоў быў шэры, з наліплымі лапікамі снегу, а пасярэдзіне ракі цямнела вада, і галкі хадзілі па лёдзе ля самага яе краю. Юновіч пайшоў далей: пабольшала людзей на вуліцы, ля магазіна прадавалі піражкі і яблыкі — ад піражкоў ішла пара, а на яблыках быў іней. Ля кінатэатра за-

хліпаўся даўняй песенькай рэпрадуктар. Юновіч пайшоў да касы і купіў білет...

Фільм быў стары, замежны; зала маўчала, і са спакойнай цікаўнасцю наглядаў Юновіч чужое, далёкае, уціснутае ў паўтары гадзіны жыццё. І было мора — прыгожае пад ранішняй смугой і тамліваe, млявае пад дзённым сонцам. І бронзавыя твары рыбакоў былі, і ўсмешка на іх — скупая, спакойная, і былі яшчэ ён і яна, шчаслівыя,— але ён збіраўся ў вялікі горад па яшчэ большае шчасце, і з надзеяй і трывогай глядзела на яго яна... І быў горад — была мітусніна машын, былі рэкламы, бары, сустрэчы з жанчынамі, кароткія, як кінутае на хаду «хэло!» — і вось аднойчы раніцай пасля вясёлай ночы ён вяртаўся дамоў, а на рагу вуліцы стаяла яна, і позіркі іх сустрэліся, але ён не пазнаў яе: яму хацелася спаць, і гаварыць з незнаёмай жанчынай не было ахвоты. Ён пайшоў, а яна глядзела яму ўслед, і ў вачах яе, як некалі, зноў былі і трывога, і надзея... Фільм канчаўся, і гучала мелодыя, кволая і сумная, як успамін аб надзеі, што не збылася... Успыхнула святло, зарыпелі крэслы, адчыніліся на вуліцу дзверы — жыццё, чужое, далёкае, уціснутае ў паўтары гадзіны, канчалася. Людзі выходзілі з кінатэатра. Юновіч закурыў. На другім баку вуліцы ён сеў у аўтобус.

У аўтобусе было цесна, кандуктарка аж недзе на пярэдняй пляцоўцы прапаноўвала купіць білеты. Сціснуты з усіх бакоў, Юновіч стаяў тварам да аўтобусных вокнаў, трымаючыся рукамі за металічную спінку сядзення. Перад ім жанчына з дзяўчынкай на каленях гартала дзіцячую кніжку, паказвала малюнкі.

— А гэта што? — пыталася дзяўчынка.— Гэта птушкі? Мама, якія гэта птушкі?

— Гэта снегіры.

— Снегары, мама?

— Не, ты паслухай, трэба сказаць: сне-гі-ры!

— Ну, мама, я і кажу: снегары!

А Юновіч глядзеў у кніжку... Ах, якія звонкія, чырванагрудыя, чырванабокія, нібыта яблыкі, былі там снегіры! Якая даўняя, далёкая і паўзабытая ўжо казка Юновічавага маленства! І навошта дзяўчынка пыталася пра снегіроў у маці, лепш бы запыталася ў яго. І ён бы... Ён расказаў бы пра дровы, што шугаюць у печы, пра акно, ружовае ад ранішняга сонца; акно

замерзла, і цяпер калматае, квацістае ад марозных узораў яно, і на адной шыбе ледзь свіціцца сіняя ўпадзінка — там, дзе ўчора хукаў на шыбіну. Гэта — учора, а сёння раніца, і ён абуваецца на нізкім услончыку, абкручвае нагу цёплай, падсохлай на гарачай чарэні анучкай, совае яе ў цёплы, таксама толькі з печы, чунь — яму прыемна, радасна, і ён паглядае на палатняную торбачку, што вісіць на сцяне, а ў торбачцы той кніжка, самаробны сшытак і карандаш — каляровы, круглы, з тоўстай сарцавінай, ён такі чырвоны пакідае на паперы след! Карандаш купіла ўчора маці: атрымала за бацьку першую пенсію. Маці ўвечары плакала, а дзед напіўся, кляў суседа, што ў першы год вайны прывалокся з фронту дамоў, нібыта з-за параненай нагі, ды так і астаўся дома, нават у партызаны не пайшоў. Бабуля ўсхліпвала, гладзіла рукою ўнукавы стрыжакі, а ён вырваўся ад яе, забіўся ў куток на печы і ціха плакаў там, каб не чулі. Гэта было ўчора, а сёння свяціла сонца ў хату. Яму было радасна, маці сказала збегаць на двор па дровы, калі ён абуўся, і ён пабег... Якая гэта была раніца! Чырвонае стаяла ў небе сонца, дыміў комін, ружовыя ад сонца водбліскі і сінія ад дыму цені ляжалі на снезе.

За агародамі па шаранку цягнуў з дровамі санкі дзядзька Апанас — санкі суха парыпвалі, і яшчэ чутно было, як правальваўся пад дзядзькавымі нагамі снег: шах! шах! шах! А ў гародчыку каля хаты абселі парэчкавы куст снегіры,— такія звонкія, чырванагрудыя, нібыта яблыкі, снегіры. На парэчкавым кусце асыпаўся іней, церусіўся на птушак, а яны ўсё адно былі звонкія і чырвоныя...

Ах, які ён шчаслівы, што такая раніца і што ў яго ёсць каляровы карандаш, каб намаляваць птушак!..

— Мама, а гэта што? — пыталася дзяўчынка.

Юновіч глядзеў у аўтобуснае акно. Праз адзін прыпынак трэба было выходзіць.

Ён нічога яшчэ не вырашыў, Юновіч, нават калі быў ужо ў дырэктаравай прыёмнай. Ён не прыспешваў сябе, і амаль непазбежнае, тое, што столькі разоў паўтаралася ўжо, марудзіла паўтарыцца. Час не падганяў Юновіча, і гадзіны адлічваліся не там, дзе была рэдакцыя.

— Вам да каго? — пыталася сакратарка.— Да дырэктара?

— Я з газеты,— сказаў Юновіч,— перадайце там...

І кіўнуў на дзверы.

Сакратарка чамусьці разгубілася:

— Дырэктар? Пагляджу... ён быў... не ведаю...

Сакратарка пайшла.

Юновіч сядзеў у прыёмнай і чакаў. «Смешна,— думаў ён,— дырэктар возьме вось ды і заржа свой артыкул, скажа: карэспандэнта не пускаць, мяне на камбінаце няма».

Выбегла сакратарка:

— Дырэктар просіць зайсці.

Юновіч пайшоў...

Адкінуўшыся на спінку крэсла, дырэктар глядзеў у акно. Ён жвава павярнуўся, калі Юновіч увайшоў, і ўстаў з-за стала, чакаючы.

— З газеты? Чым парадуеце, га? Бачу, крытыкаваць прыехалі... З вамі, газетчыкамі, трэба вуха трымаць востра... Калі ласка, сядайце.

Дырэктар быў нізкаваты, у чорным пінжаку шырокага крою. Несамавітую, у шэрую палоску кашулю ледзь не ўсю закрываў на грудзях чырвоны, завязаны фабрычным вузлом гальштук — з тых, што на гумцы. Твар у дырэктара быў курносы, а на лысаватай галаве тырчаў хібок зляжалых светлых валасоў.

— Дык пад што ж падкоп надумалі весці? Па сакрэту, га?

Дырэктар усміхаўся. Дырэктар быў яўна ў настроі, ён жартаваў. Здавалася, даўно не меў ён такой прыемнасці, як гэты нечаканы Юновічаў прыход. «Прытвараецца,— здагадваўся Юновіч,— бо не ведае, чаго я хачу».

Ён сеў і амаль афіцыйна пачаў тлумачыць, чаго прыйшоў.

Дырэктар на вачах мяняўся. Дырэктар ужо не жартаваў. Дырэктару было ўжо сумна. Пісаць артыкул яму не ставала часу і да таго ж ён не хацеў адбіраць у газетчыкаў іх законны хлеб. У дырэктара ёсць багаты матэрыял, ён яго цалкам дасць у распараджэнне Юновіча. (Дырэктар адчыніў дзверы і сказаў сакратарцы, каб падабрала ўсё, што ёсць па самадзейнасці.) Выразкі сваіх ранейшых артыкулаў дырэктар дасць асобна.

Юновіч не пярэчыў і маўчаў. Час не падганяў яго

сёння, і амаль непазбежнае, тое, што столькі разоў паўтаралася, марудзіла паўтарыцца. Ён нічога яшчэ не вырашыў, Юновіч,— проста ведаў, што дырэктараў артыкул можа напісаць і не напісаць.

Сакратарка прынесла паперы. Ён пачаў іх гартаць.

Дырэктару было сумна, і ён хадзіў па пакоі. Падыходзіў да вешалкі, прыглядаўся нечага да паліто, пстрыкаў па ім пальцам, надзяваў на чаравікі галошы і адразу здымаў іх. Дырэктару было сумна. На стале пачаў званіць тэлефон. Дырэктару знаходзіўся занятак.

Юновіч усё яшчэ гартаў паперы.

Дырэктар гаварыў па тэлефоне:

— Іван Пятровіч? Як гэта вы надумалі пазваніць? Дзякуй... Жывём — не плачам... Ды я хоць зараз... Чаму ж — машыну ўзяць можна. Гэта вы праўду сказалі... Галаву праветрыць не пашкодзіць. Ну добра, добра... Дамовіліся.

Дырэктар палажыў трубку і запытальна паглядзеў на Юновіча. «Зараз трэба сказаць нешта,— падумаў Юновіч.— Чаго я маўчу?» — І ён адсунуў ад сябе паперы.

— Усё,— сказаў ён,— больш не трэба.

— Ну вось і добра,— узрадаваўся дырэктар,— вось і добра... Вы, газетчыкі, з налёту ўсё хапаеце — такая прафесія. Вам і пяро ў рукі. Толькі вы гэта... тэлефон мой запішыце: можа, удакладніць што трэба ці падпісаць...

— Тэлефон? — перапытаў Юновіч,— а навошта тэлефон? Вы яго самі напішаце ў канцы артыкула — такая ў нас форма...

— Дык вы...— сказаў дырэктар.

— ...артыкул пісаць не буду,— сказаў Юновіч.— Нічога не разумею ў гэтых паперах. Не ведаю спецыфікі. А вам, як кажуць, і пяро ў рукі...

Дырэктар утаропіўся на Юновіча і маўчаў. «Нямая сцэна,— думаў Юновіч,— трэба ісці». Яму было нецікава глядзець на выраз дырэктаравага твару. Ён падняўся з крэсла.

— Бывайце,— сказаў Юновіч.— Было б добра, каб артыкул падрыхтавалі да заўтра.

Юновіч пайшоў...

Ён не адразу заўважыў на вуліцы, што пачало пагаднець. Дзьмуў слабы вецер. Туману ўжо не было.

Дробныя, вільготна-белыя хмары плылі над горадам, і сінія лапікі неба высвечвалі ў іх.

Юновіч сеў у аўтобус. Было цесна. Нейкі хлопец стаяў з лыжамі на пляцоўцы, намерзлы на лыжах лядок раставаў, і ў аўтобусе па-веснавому свежа і моцна пахла вадою: была ўжо сярэдзіна лютага. І Юновічу ўспаміналася чамусьці нядаўняя паездка ў калгас, Валя, і ён цяпер шкадаваў, што не дамовіўся тады, у вёсцы, сустрэцца з ёю ў горадзе.

«Але я яшчэ сустрэнуся з ёю»,— думаў ён. Яму ўспаміналіся рэдактар, размова з дырэктарам, паездка ў вёску і зноў Валя — і ўсё гэта паўставала перад ім са спакойнай нейкай яснасцю, і ў яго было адчуванне чалавека, які ўдала завяршыў вельмі доўгі і вельмі турботлівы дзень: круг замкнуўся, на заўтра асталіся некранутая раніца і надзея.

Ля кінатэатра Юновіч выйшаў з аўтобуса.

З тэлефоннай будкі ён пазваніў у рэдакцыю — рэдактара на рабоце ўжо не было. Сказалі, што ён, мусіць, дома. Юновіч званіў другі раз. У трубцы жаночы голас пытаўся, хто звоніць і навошта. Юновіч тлумачыў, што звоняць з рэдакцыі, а рэдактар трэба тэрмінова.

— Пачакайце,— сказала жанчына.

Юновіч чакаў. «Зараз пачнецца,— думаў ён».

— Я слухаю,— сказаў рэдактараў голас.— У чым справа? Юновіч? Не будзеш пісаць выступленне? Ты разумееш, што сказаў? Ну, ведаеш... Разбяромся заўтра!

«Вось і ўсё,— думаў Юновіч, выходзячы з тэлефоннай будкі.— Заўтра ў мяне будзе цяжкі дзень. Але я растлумачу. Не можа быць, каб ён не зразумеў... А што, калі яму сказаць: «Нам, браце, яшчэ вучыцца ці перавучвацца трэба. І табе, і мне. Інакш у нас справа не пойдзе». А потым папрашуся ў камандзіроўку... Напішу нарыс... Харошы нарыс...»

Юновіч ішоў па вуліцы, і яму зноў думалася пра аўтобус. Яму думалася пра ціхія гасцініцы ў далёкіх гарадках — маленькія, чыстыя, з шырокімі масніцамі. І яшчэ яму хацелася забыцца на даўняе, прыкрае, узяць і пачаць усё нанава...

Юновіч ішоў па вуліцы, і яму думалася пра аўтобус, што стаяў на вакзале.

1962

ТАМ, ДЗЕ ЗАЦІШАК, СПАКОЙ

Сяргей Марус, інжынер-планавік, неспадзявана адчуў, што яму нечага не хапае ў горадзе, які адразу здаўся сумным, нецікавым і пыльным. І чамусьці само сабою здаралася так, што кожны раз, вяртаючыся з работы, дадому ён ішоў паўз вакзал. І вось калі чуў ён, як аб'яўлялі там адпраўленне, калі ўдыхаў ён сладкава-даўкі паравозны дым, нешта шчымлівае, прыемна-балючае кралася ў сэрца, і тады прыгадвалася рознае, і часцей за ўсё дробязь: вясковы вечар, вогнішчы на вуліцы — вараць бульбу; стук праніка на сажалцы ранняй вясной, а за ім — крык пеўня, тамліва-гучнае патуркванне жаб. А ў зялёным ветры, нечакана вострым і хвалюючым, бы ўспамін, мроіўся яму то пах гарэлага бульбоўніку, то маладога інею на яшчэ зялёнай траве. Адным словам, нечага і аднаго было б даволі, каб пасля здалася доўгаю ноч, каб назаўтра балела галава і каб пачыналася ўсё спачатку.

Сяргей Марус зразумеў, што гэта была туга па вёсцы. Праз колькі дзён ён не вытрываў, узяў адпачынак і паехаў да бацькоў у далёкую Смолку.

Ён выехаў апаўдні: сядзеў ля акна ў вагоне, глядзеў на паселішчы, на палі, на дарогі, і яму хораша думалася пра сваю вёску, дзе ўсё роднае, з дзяцінства знаёмае, дзе зацішак, спакой, дзе ён па-сапраўднаму адпачне і аціхне душою. Спаць ён лёг рана і адразу ж заснуў. Прачнуўся ноччу: схамянуўся, убачыўшы праз прачыненае акно будынак нейкай станцыі, асфальт ля яго — бліскучы, мокры, жоўтыя водсветы ліхтара ў лужынах; нечаму ўзрадаваўся, пачуўшы гуллівы, звонкі жаночы голас недзе ля вагона, а потым — густы мужчынскі, але таксама вясёлы.

— Глядзі ты, якая порсткая, яшчэ па мне сохнуць будзеш! Надта ў галаву не забірай!

«Дзяжурны які-небудзь»,— падумаў Марус і адчуў, як з акна патыхае вільгаццю: прайшоў дождж. Поезд крануўся. Сяргей сцішыўся і неўзабаве зноў заснуў.

Другі раз пабудзілі яго галасы. Была ўжо, мусіць, раніца: за акном мутнавата шарэла, а па шкле спаўзаў дрыготкімі струменьчыкамі дождж.

— Дык гэта я да дачкі ездзіў — во-о! — гугнявіў унізе, пад ім, марудлівы мужчынскі голас.— Хату яна

сабе купіла, дык пісала, каб па сталярцы памог... Во-о!..— І чуваць было, як чалавек перадыхваў.

— Дзіця ж роднае — а як жа! Хто ж, калі не бацька, паможа...— спачувальна і неўпрыкмет дагодліва сказала нейкая жанчына.

— Ну, дык паехаў я — во-о! Пагода не дай бог, дождж, бы насланнё якое, вісіць і вісіць... У калгасе — ні жаць, ні на сена ісці. Дык і адлучыцца можна — во-о!

— Дык гэта і ў вас дождж? А божа ж ты мой! А я думала — гэтая трасца ў нас толькі. Лье і лье. Без хлеба і без бульбы астанешся. Не дай бог.

— У акурат. Уга!.. Гэта ж у гародчыку касу ўбіў, дык так яно і асталося. Счарнела ўсё ў пакосах... Сена, кажу, ляжыць,— чамусьці мацней сказаў мужчына.— Во-о!

«Пра што яны гавораць? — падумаў Сяргей.— Сена нейкае, дождж... Калі гэта яны селі? Тутэйшыя, мусіць...»

Мужчына там, унізе, раптам закашляўся. Ён кашляў моцна, аж з прысвістам, а калі перастаў, нейкая бездапаможная, але дзіўна жывая цішыня запанавала ў вагоне.

— Не к дабру ўсё гэта, ой, божачка, не к дабру,— скоранька загаварыла тады жанчына.— Калі ж яны бонбы гэтыя рвуць — радыё, во, нядаўна перадавала. Ад таго, можа, і пагода сапсавалася. Зачапілі нешта ў небе...

— У акурат зачапілі, а то як жа,— спакваля і сур'ёзна сказаў мужчына.— Во-о!..

«Пра што яны гавораць? — падумаў Марус.— Глупства нейкае. Кожны мерае на свой капыл».

Яму зусім не хацелася думаць пра дождж, не хацелася іншай думкі, апроч той, што вось заўтра ён прыедзе дамоў, дзе зацішак, спакой, дзе не будзе ніякага дажджу,— ён верыў, што так будзе, бо яму так хацелася,— дзе аціхне тая невыразная і роўная трывога, што гнала яго ў вёску.

Але ён памыліўся.

Калі ён пасля поезда сядзеў у скверы, чакаючы аўтобуса, было адчуванне, нібы твар яму абляпіла павуцінне — гэтак было нязвыкла казытліва, задушліва. Дзень стаяў шэры, няпэўна ціхі нейкі і непрыемна вільготны. Але дождж пачаўся, калі Сяргей пад'-

язджаў, ужо аўтобусам, да свайго раённага гарадка.

Аўтобус прыпыніўся ля маленькага вакзальчыка. Пачалі хто куды разбягацца пасажыры — усё не перасціхаў яшчэ дождж. Тут, за шэсцьдзесят кіламетраў ад чыгункі, за дзесяць — ад дому, ён здаўся Сяргею асабліва недарэчным. Ён узяў чамадан і, спакойнаабыякавы ад прыкрага адчування, што ўсё сапсавана, што прыехаў ён не так, як хацелася, пайшоў да сталоўкі.

Гарадок сцішыўся; лапатала лісце на таполях, шархацела, калі прасыпаўся праз яго дождж; па асфальце скакалі, лопаліся бурбалкі — Сяргей успомніў, што так заўжды бывае перад аблажным нудным дажджом. Праехала жанчына на веласіпедзе: плацце ліпла да яе ног, яна здавалася нязграбнай — ехала, сагнуўшыся над рулём, у доўгім, пашытым у талію і ўсё адно шырокім жакеце.

«Хутчэй бы дамоў»,— тужліва падумаў Сяргей, заходзячы ў сталоўку.

Тут было цемнавата, пахла смажаным; ля самага парога абступілі буфет мужчыны, чакалі свежага піва: бочку толькі што распачалі — буфетчыца шчыравала ля помпы. Сяргей сеў за стол; падышла афіцыянтка — ён заказаў гуляш: ён заўсёды заказваў у такіх сталоўках гуляш — папулярную мясцовую страву. Папрасіў бутэльку вады — сядзеў, піў; забралі ўжо са стала пустыя талеркі, не меншала чарга ля буфета, а ён усё сядзеў, чакаючы, мо перасціхне дождж. Дождж неўзабаве суняўся. Сяргей выйшаў са сталовай і, завярнуўшы ў вузкую вулачку, пашыбаваў ёю ўніз, да парома цераз раку. Яму трэба было пераходзіць роў: тут вулачка канчалася, а далей вяла сцяжынка. Сяргей спусціўся па ёй — туды, дзе было халаднавата і сыра, дзе на шырокім лісці дзядоўніку ляжаў намыты ручаямі пясок, расло конскае шчаўе, дзе буялі чаромха, крушыннік, а вышэй, па схілах,— шыпшына. Бразгаў недзе ланцугом і чвякаў капытамі спутаны конь.

Сяргей сцяжынкаю выйшаў да царквы — наўкол яе ўсё парасло палыном, шорсткай травою, усюды валялася бітая цэгла. Сяргею стала маркотна, успомнілася, як даўно, яшчэ калі вучыўся ў сёмым класе, вадзіла іх піянерважатая сюды, у райцэнтр, уступаць у камсамол. Колькі было страху, хвалявання, колькі разоў перачытвалі ў райкомаўскім калідоры статут! На-

рэшце іх выклікалі: усіх прынялі, а Сяргею адмовілі — не хапіла колькі месяцаў. Яму было крыўдна, і ён заплакаў — наўзрыд, не саромеючыся, адчуваючы, што тое, да чаго ён так рыхтаваўся, чаго так баяўся і жадаў, не будзе пасля ўжо такім святочным, радасным, якім магло б быць цяпер.

Потым яны, аднакласнікі, узабраліся па вузкай лесвіцы на званіцу царквы, глядзелі на горад, войкалі, а Сяргей маўчаў, і не радавала яго другім разам, мусіць, такое вострае адчуванне вышыні.

Цяпер жа Сяргею было проста маркотна. Ён глядзеў на царкву, запушчаную, старую,— убачыў чэзлую бярозку на яе карнізе, крываватую, з дробным лісцем, чорныя пісягі і плямы на сценах і купале царквы — сляды колішняй паветранай маскіроўкі — і здзівіўся, чаму не заўважаў усяго гэтага раней.

Ён спусціўся да ракі, чакаў там, пакуль падыдзе перавозчык: яго чамусьці не было відаць. Зноў зацерусіў дождж: за ракою, над лугам, павісла шызая сумная смуга. Нехта плыў у лодцы па рацэ, выйшла — перавозчык. Падагнаў лодку, вастравата глянуў на Сяргея з-пад казырка мокрай, расплюшчанай шапкі:

— Залазь...

Веславаў ён моўчкі, толькі перад самым берагам спытаў:

— Табе куды? У Гарадзецкія?

— Не, у Смолку.

— Не прайсці будзе цераз грэблю... Дажджы... Трэба на Іванавічы. Кружна, але...

Больш ён нічога не сказаў. Сяргей астаўся адзін. Да Іванавіч па лузе было чатыры кіламетры. Марус агледзеўся. Наперадзе, за мутнай смугою, цямнеў лес, цьмяна шарэлі вясковыя дахі. Ён пайшоў лугавою дарогаю; ліў дождж, але Сяргей ужо не звяртаў на яго ўвагі: пінжак быў мокры, халадзела спіна, чвякала вада ў чаравіках. Дарога ішла паўз старыцу, з берага парослую хмызняком, высокаю травою. Халодным шызым бляскам адсвечвала вада; дождж ліў, усюды была вада — і трава, і паветра пахлі вадою. Пачынала цямнець: гледзячы наперад, ужо можна было толькі здагадацца, што там былі вёска, лес. Сяргею стала адзінока, неяк не па сабе, нават страшна. Нудна шаргацела ля берагоў старарэчышча пад дажджом трава, і Сяргею падумалася раптам, што дождж не перасціхне ніколі,

што гэта мо пачынаецца нейкі новы патоп, што ён, Сяргей, трапіў у нейкія далёкія-далёкія вякі,— і яму тады здалося, што ён чуе, як за хмызняком, у высокай траве, рохкаюць, боўтаюцца, сапуць нязграбныя страшныя жывёліны. «Зачапілі нешта ў небе»,— нечакана ўсплылі словы, сказаныя жанчынай у поездзе, і яшчэ больш зрабілася страшна, а потым здалося, што разам з дажджом асядае яму на твар, казыча лёгкія ядавіты радыеактыўны пыл. «Зачапілі нешта ў небе»,— усё стаяла ў галаве, і ён ніяк не мог адкараскацца ад гэтай думкі. Ліў дождж, а ён усё ішоў і ішоў, абыходзіў цеглавіны з вадой, губляў дарогу, зноў знаходзіў, а наўкол усё больш і больш цямнела, і ўсё пахла і пахла вадою. Нарэшце пацвярдзела дарога, наперадзе нешта зашарэлася: ага, жвірыстая дарога і паабапал хвойнічак. Сяргей перадыхнуў. Хвойнічак хутка кончыўся: Сяргей уваходзіў у Іванавічы.

Але і тут яму не стала лягчэй. Ні гуку, ні душы наўкол, усюды маўклівыя вокны. Адзінока і цёмна вытыркаліся над хатамі шпакоўні, шапацеў дождж, мутнашэрая смуга стаяла над вёскай. Ён зноў чамусьці падумаў, што дождж, мусіць, не перасціхне ніколі, што наўкол яго нейкае далёкае-далёкае, зусім нерэальнае жыццё. «Зачапілі нешта ў небе»,— білася думка, і ён усё спяшаўся, спяшаўся...

Супакоіўся ён ужо ў лесе. Тут было зацішна, пахла шыгаллем, сырой зямлёй, неба ўгары, над дарогай, здавалася святлейшым. Чуваць было, як асыпаліся з бяроз і асін дажджавыя кроплі. Сяргей ішоў не спяшаючыся, ён добра ведаў дарогу, кожны яе паварот, і пазнаваць знаёмыя мясціны было прыемна, было прыемна знарок ступаць нагой у цёплыя лужыны: ён прывык ужо да вады і цяпер адчуваў лагодную задаволенасць ад таго, што не трэба берагчыся ад дажджу, бо ён увесь даўно мокры, і што горш, чым ёсць, ужо не будзе. Ля дарогі, у мясцінах, дзе было ніжэй, бледна-зялёна гарэлі светлякі, ён браў іх у рукі — яны холадна тлелі, пакуль не адаграваліся ў далоні.

Лес прайшоў Сяргей непрыкметна. Ён быў ужо амаль дома: трэба было толькі мінуць Карму — суседнюю з ягонай вёску. Ягоная — адразу ж за Кармой, цераз лагі.

Карма спала. Тут, зусім непадалёк ад дому, ён нечакана адчуў стомленасць, захацелася піць. Дай-

шоў да першага калодзежа і прагна напіўся з цяжкога цэбра сцюдзёнай, аж калола ў зубы, вады. Яму палягчэла, а потым і зусім стала хораша, калі ўбачыў, як з акна канцавой хаты падала на вуліцу дымная палоска святла: яго радавала блізкая прысутнасць чалавека, які не спаў.

Падышоўшы, Марус глянуў на хату, пазнаў праз акно гаспадара Платона Крывашэя — той, задумаўшыся, стаяў перад сталом, высокі, белабрысы, у клубах дыму, што плавалі па хаце. Усё было Сяргею так добра відаць, што ён нават разглядзеў мятлушку, што білася, пырхала над лямпай. «Не спіцца, бач, нечага,— падумаў ён.— Стаіць як слуп. Хто ведае, якія думкі прыходзяць ноччу да чалавека».

Яшчэ падумалася, што дома, мусіць, таксама не спяць, дзверы ў сенцах не зашчэпленыя: ён ціха ўвойдзе ў хату, мокры, узрадаваны, скажа што-небудзь вясёлае, да яго кінуцца малыя сёстры, маці, будуць папікаць, што не паслаў перад прыездам ні пісьма, ні тэлеграмы.

Але ўсё было іначай.

Ён стаяў перад сенечнымі дзвярамі, на ганку пад стрэшкаю, дзе было суха і чамусьці пахла мылам. Паторгаў за дзверы — яны былі зашчэплены, нясмела пастукаў; перамагаючы хваляванне, пачаў грукаць мацней і мацней. Услухаўшыся, ён пачуў, як па хаце нехта пратэпаў, а потым бацькаў голас ужо з сянец спытаўся:

— Хто там?

Сяргей унутрана сцяўся і дрыготкім ад хвалявання, сарамліва звонкім голасам сказаў, спяшаючыся:

Мой родны кут, як ты мне мілы...

— Ах, каб цябе камар убрыкнуў! — узрадавана, здзіўлена ўскрыкнуў бацька — бразнуў кручок, Сяргей ірвануўся ў сенцы, адчуў на сабе бацькавы рукі, а на шчацэ — шорсткую, няголеную бацькаву шчаку... Бацька адчыніў дзверы, падштурхнуў яго ў хату...

На чыстай палавіне ўжо ўставала маці, шамацела адзеннем. Бацька запаліў лямпу, маці выйшла, пайшла да Сяргея — сарамліва, бы звязаная, бездапаможна выставіўшы перад сабою рукі і гэтак жа бездапаможна ўсміхаючыся. Марус руку не ўзяў; абняў, моўч-

кі цалаваў маці ў мяккую, цёплую шчаку — маці заплакала.

— А дзеці спяць? — спытаў ён. Маці адхінулася ад яго, пайшла, выціраючы слёзы, да печы.

— Спяць. Што рабіць ім... Натарнаваліся за дзень... Дождж... З хаты не выгнаць.

— А ты мокры які,— сказаў бацька.— Ты на Іванавічы ішоў ці, можа, на грэблю?

— На Іванавічы.

— Во добра, што здагадаўся... Скідай чаравікі, я табе прынясу пераадзецца.

Сяргей скінуў чаравікі. Маці ўжо завіхалася ля камінка, распальвала трэскі пад трыногай.

— Сыночак, чаму ж пісьма не напісаць? Бацька ў горад пад'ехаў бы... Ці хоць бы сам зайшоў на малочню. Нашы там штодзень бываюць з машынай.

— Нічога, мама. Яно, можа, так і лепш. Дамоў жа ідзеш — калі ні прыйшоў, усё роўна добра.

— Яно так, сыночак, так...

— Ідзі пераадзенься,— гукнуў з чыстай палавіны бацька.

Ён пераадзеўся, а калі выйшаў на кухню, на стале ўжо стаялі яечня, тварог, кіслае малако, ляжалі сырыя яйкі, хлеб.

— Давай садзіся,— сказаў бацька. Ён схадзіў у сенцы, прынёс запыленую цёмную бутэльку; з рыльца тырчала заткала з сена, абкручанае шматком анучкі.

— Ну, дык, можа, вып'ем? — сказаў бацька.— Табе, сын, не пашкодзіць з дарогі. Ісці столькі ноччу...

Ён наліў у шклянкі. Выпілі.

— Усё нічога,— сказаў Сяргей,— каб не дождж. Вісіць і вісіць. Ішоў праз Іванавічы — пуста, аж страшна. У Карме толькі ў Платона Крывашэя ў хаце лямпа гарыць.

— А, сыночак,— аж схамянулася маці,— дык гора ж у яго. Сын, дванаццаць гадоў хлопцу, стрэліў сабе з урэза ў жывот...

— Выжыў?

— Памёр... Нікога дома не было. Платон з жонкаю кароў пасвілі... Пакуль завезлі ў бальніцу, памёр.

— У Платона гэтага,— сказаў бацька,— урэз схаваны недзе яшчэ ад вайны быў. А сын знайшоў. Блазнота.

— Дык, кажаш, у іх агонь гарыць? Людзі, бач, не

манілі, што Платон цяпер цемнаты баіцца, спіць пры лямпе... О-ха-ха! — уздыхнула маці.

Сяргей пачынаў хмялець. Стала горача ў шчокі, і было туманна, неяк бяздумна ў галаве. Ён стараўся ўявіць сабе Платона Крывашэя, яго жонку — і ніяк не мог. Ён памятаў толькі, што ў Платонавай хаце, калі ішоў паўз яе, гарэў агонь, што стаяў гаспадар перад сталом і што — гэта дык ён уяўляў чамусьці добра — над лямпай пырхала, кружылася мятлушка. Мятлушка і святло — гэта ён уяўляў добра.

— Сынок, ты, мусіць, спаць хочаш? — спытала маці.

— Няхай вып'е яшчэ,— сказаў бацька.— Будзе спаць лепш. Не пашкодзіць з дарогі...

Сяргею спаць не хацелася. Выпілі яшчэ трохі, і ў галаве ў яго праяснела. Ён адчуў сябе зусім не п'яным, затое ўбачыў, што захмялеў бацька. І здзівіўся, што той гаворыць, мусіць, даўно ўжо гаворыць. Гаворыць пра вайну.

— ...Выдалі нам бялізну цёплую, шапкі, кажухі, а на ногі — бацінкі з абмоткамі. Зверху пячэ, а знізу валачэ. А мароз... Хлеб пілой разразалі — такі мароз.

— Дык сякерай жа лепш,— сказала маці.

— Сякерай нельга — крышыцца...

Потым яны паспрачаліся. Маці гнала бацьку спаць.

— Завёў — усё пра вайну ды пра вайну... Лажыся спаць... Быццам гаворкі другой няма.

— Што ты ведаеш...— агрызнуўся бацька.

— А тое ведаю, што і тут, у вёсцы, таксама вайна была.

«Вайна была і ў вёсцы,— думаў Сяргей.— Так, была». Ён помніў, як яго, соннага, цягала ў зямлянку маці, калі наляталі ўночы самалёты, як аднойчы на вуліцы ўсчалася страляніна, і яны беглі з маці ў тую ж зямлянку, а ў яго ледзь не разрывалася сэрца: здавалася, вось-вось налучыць куля — а можа, ужо налучыла? Як было страшна! І гэта запомнілася назаўсёды.

— Ідзіце спаць,— гнала цяпер іх з бацькам маці.

Яны вылезлі з-за стала...

Маці паслала пасцель, і Сяргей лёг. Усё яшчэ шапацеў за акном дождж, было цёмна; Марус чуў, як хадзіла па кухні маці, прыбірала са стала, як спачатку варочаўся за шырмаю, а потым неяк адразу заснуў

бацька — роўна і моцна задыхаў. Потым лягла спаць і маці, а Сяргей усё яшчэ ніяк не мог заснуць. Пад акном шалясцела таполя. Сяргей успомніў, як аднойчы летам бура сарвала дах з суседскай, Калячковай, хаты: ён упаў у іх агарод, на таполю. Каб не таполя, выбіла б вокны. Таполі абламала голле, паздзірала кару, але таполя выжыла — шуміць во і шуміць.

Сусед, Калячок, перабраўся пасля на другое месца, да глінішча, дзе было вышэй. А тут, побач з імі, пабудаваўся ён адразу пасля вайны, калі ўзяў з суседняй вёскі дзеўку, кірпатую, маленькую, вельмі ласкавую. Тады, адразу пасля вайны, было галаднавата, і Калячок гойсаў па лесе, спорваў птушыныя гнёзды. Ніхто асабліва за гэта не наракаў на яго: быў ён худы, доўгі, насаты, з запалымі шчокамі, аброслымі белым мохам. І чамусьці шкада было глядзець на яго маленькую, заўсёды ласкавую жонку.

А Сяргей збіраў вясной на полі гнілую бульбу, сушыў яе, тоўк у ступе — смачныя выходзілі «ташнөцікі»!

Шалясцела за акном таполя, біўся аб шыбіны дождж, і чуваць было, як шарахцеў аб сцены вецер. Сяргей не спаў, варочаўся.

— Можа, табе мулка, сынок? — азвалася з-за ширмы маці.

— Не... Нічога. Гэта, можа, што на новым месцы... Спі, мама.

Добра грэла тоўстая капа, і цяпер Марусаву было страшна падумаць, як ішоў ён з горада пад дажджом адзін такую дарогу; калі ён успамінаў пра гэта, яго пачыналі біць дрыжыкі.

А за акном усё ліў дождж, шарахцеў па сценах хаты вецер, і Сяргей думаў: «Зацішак, спакой... Які я быў наіўны... Зацішак, спакой!..» У галаву зноў лезлі розныя думкі, ён гнаў іх ад сябе, варочаўся...

Ліў дождж.

1963

СЕНА НА АСФАЛЬЦЕ

ЛІСТ ПЕРШЫ

Часта я пытаюся ў сябе: як мы сустрэліся і чаму?

Памятаю, яшчэ калі вучылася ў школе, мне неяк не па-дзіцячы хацелася смутку, таямнічага, незвычайнага лёсу. Прайшлі гады — я спазнала смутак і зразумела, што навучыцца смутку нельга, як нельга навучыцца і радасці. На ўсё свой час. Яшчэ я ведаю цяпер, што з гадамі душа цішэе, лагаднее, супакойваецца, але не засынае: яна, як і раней, шукае радасці, толькі ведае ўжо, што хоча іменна яе. Вось чаму я думаю, што пасталелы чалавек большы рамантык, чым ён быў у раннім юнацтве. І калі я зразумела гэта, я сустрэла цябе. Раней бы мы не сустрэліся, бо не зразумелі б адно аднаго.

Памятаеш нашу першую сустрэчу?

Тою раніцай я заходзіла да сваіх знаёмых па апельсіны: яны недзе дастаюць іх, сказалі, што могуць дастаць і мне. А я падумала, што добра будзе занесці іх Лёльцы, сястрыной дачушцы: ты ведаеш, малой не вельмі соладка жывецца. Сястра даўно не ладзіць з мужам, усё не можа дараваць яму нейкія мужчынскія грахі — яны часта сварацца, а малое бегае ад бацькі да маці, не ведаючы, да каго хінуцца. А дзяўчынцы пяць год, і яна такая слаўная.

Той раніцай, памятаю, ішла я паўз кінатэатр. Памятаю, як пад ягоным дахам, недзе там, за шэрымі калонамі, заўзята чырыкалі вераб'і, унізе, ля ўвахода, прыбіральшчыца шчыравала з дзеркачом, а на сцяне, над ёю, ружова білася, то святлеючы, то робячыся гусцей, трапяткая сонечная плямка. І ўедліва-церпка пахла пылам. Я люблю, калі пахне пылам, а ў тую вясновую раніцу вуліца пахла яшчэ і свежымі булкамі, і духмянай кавай, і цвярозлівым халадком маладой зялёнай лістоты. Я паціху ішла сабе тратуарам і ўглядалася ў аблічча нячастых прахожых. Ты ведаеш, ты, можа, прыкмячаў гэта сцішанае, смужліва-мройнае ззянне, што бывае вясной на тварах у людзей, на тварах, ледзь кранутых першым загарам? Такое яшчэ можна заўважыць, зазірнуўшы чалавеку ў твар, калі на вуліцы ціхі і цёплы дождж. А ты заўважаў, што ў

дождж хораша і лёгка думаецца, а на душы бывае так светла і ясна?

У тую раніцу ты быў такі спакойны, стомлена-ціхі нейкі, усмешлівы і лагодны. І ты так смешна і па-дзіцячы лёгка тады гаварыў. Памятаеш, калі я рассыпала на рагу вуліцы апельсіны і ты немаведама адкуль нахапіўся іх падбіраць?

Усё нібы ў тую раніцу спрыяла таму, каб мы сустрэліся з табою.

А якая была тады вясна! Дзе толькі не былі мы з табою тою вясной! У дождж да позняй ночы праседжвалі мы ў скверах, накрыўшыся тваім пінжаком, і, памятаеш, колькі разоў пачыналі думаць пра тое, каб некуды з'ехаць, далёка-далёка, у таямнічыя нікому не даступныя мясціны. Што за жаданні былі ў нас, няўжо каханню трэба, каб былі толькі яно і цэлы свет? Мы куплялі на вакзале білеты ўсё роўна на які цягнік — і колькі незнаёмых вёсак, рэчак, лясоў і палян неспадзявана адкрылі мы так для сябе. А кінатэатры на ўскраінах горада — старыя, са скрыпучымі лаўкамі, з вышараванай нагамі, выбітай да ямак падлогай? А сеансы, на якіх ад суседа па лаўцы часам нясцерпна пахла гарэлкай, у час якіх ірвалася лента і рабілася цёмна, хоць выкалі вока, і тады ў зале ўсчыналіся свіст, крык, не вельмі далікатныя жарты. Ніхто не ведаў там нічога пра нас, і гэта было прыемна, як, мусіць, прыемна было якому-небудзь прынцу са старога рамана, пераапранутаму жабраком.

А потым у нас пачаліся нелады. Ты як бы помсціў за нешта мне, як бы знарок стараўся абразіць мяне — які ты быў жорсткі і ў той жа час нейкі разгублены ў сваёй халоднай зласлівасці. Мне было з табою так цяжка. Навошта ты рабіў гэтак?

Толькі пазней я здагадалася, што ты раўнаваў мяне, што ты баяўся мяне страціць. І тады, зразумеўшы, я даравала табе ўсё.

Гэта было ўжо летам, пасля таго як я паехала з нашага горада, сказаўшы, што мы надакучылі адно аднаму, што нам трэба адпачыць, пабыць на адзіноце, разабрацца ў сваіх пачуццях.

Я паехала тады да цёткі, у ціхі і зялёны гарадок — былы абласны цэнтр. Мне якраз і трэба было гэта — цішыня, вузкія вуліцы, гаршкі з кветкамі, падвешаныя да ліхтарных слупоў, санлівыя жанчыны ў кіёсках

з газетамі. Усё проста, зразумела і трошкі сумна. І ніхто не здзівіўся б, каб аднойчы на вуліцы паявіліся хоць бы козы.

У тым горадзе ёсць рака, а ў яе за горадам, ля невялікай вёскі, упадае, выліваючыся ў тры ручвы, неглыбокая халодная рэчка. Над правым ручвом — пясчаны бераг, парослы лазой, за ім — гара з шатрыстымі цёмнымі соснамі.

Кожны дзень я хадзіла на тую рэчку купацца.

Ляжыш на беразе — трымціць, снуецца ў шырокіх ручвах вада, бялеюць на рачных астраўках валуны, сіняя тамлівая смуга вісіць над вадою там, дзе робіць паварот рака, дзе пад гарой насыпанага самазваламі пяску ракоча пад'ёмнік, грузячы баржы. Хлапчукі з берага ловяць вудамі рыбу. У полудзень заходзяць у рэчку каровы, стаяць у вадзе, махаючы хвастамі,— плыве, пялёхкае рака, і паволі плыве час, цягучы, як звон конікаў у вушах. О, салодкая, лянотная бяздумнасць, о, жыццё душы, дрымотнае, як звон вады, тамлівае, як сіняя намітка смугі! Вочы бачаць, чуюць вушы, і, ціха стаіўшыся, лечыцца душа. Млеюць ад гарачыні палі, цячэ, снуецца ў сонечных промнях рака, далёка на ўзмор'і тужаць аб свежым ветры караблі, і вось-вось скаланецца сонная сінь, павее вецер і пагоніць караблі ў краіну добрых сустрэч. І тады я таксама пастаўлю ветразь.

Так я вярнулася да цябе.

Лена.

ДЗЯДЗЬКА ІГНАТ

Я ішоў на спатканне з Ленай, калі на нашым двары ўбачыў дзядзьку Ігната.

Быў надвячорак. Дурманліва пахлі кветкі, вокны ў доме былі расчынены, і ў нечай кватэры задумліва вяла ціхую мелодыю радыёла. У двары на лавачках сядзелі жанчыны, мужчыны сумавалі побач з імі: курылі, нізка ўгнуўшы плечы, пыхкаючы дымам сабе ў кулак — той-сёй быў без кашулі, у майцы.

Дзядзька Ігнат стаяў ля нізкай агароджкі перад домам, глядзеў, як нейкі таўставаты чалавек у піжаме палівае са шланга газон з кветкамі.

— Пастой, Віктар, раскажы, дзе быў, што бачыў,— не паварочваючы галавы, лагодным і роўным голасам

сказаў да мяне дзядзька Ігнат. Я толькі што параўняўся з ім і хацеў быў павітацца.

Я стаў, лапнуў рукамі па кішэнях, успомніўшы раптам пра курыва,— дзядзька Ігнат зноў лагодна і спакойна сказаў:

— Яшчэ ўздумаеш рознымі «фільтрамі» частаваць — закуры лепш махры.

І падаў мне капшучок з кішэнькаю збоку: у ёй была акуратна нарэзаная газета.

— Куры.

Я закурыў.

Лілася са шланга, пырскала вада, бубацела па лісці кветак — хораша пахла сырой зямлёй. Чалавек у піжаме, не гледзячы, вадзіў шлангам перад сабой — позірк яго быў недзе далёка: можа, чалавеку сумная была яго работа, а можа, быў у яго свой, асаблівы, аднаму яму зразумелы настрой, і ён пад безуважнасцю хаваў яго, не хацеў, каб здагадаўся пра яго хто іншы.

Усё здавалася трохі загадкавым, таямнічым там, дзе быў дзядзька Ігнат.

— Ну, дык як мая махорачка — Маскву ўбачыў, га? Гэта, брат, не тое, што твая трава. Па-мойму, дык мужчыне і курыць яе брыдка: лепш ужо мох са сцяны выскубаць... Хаця дзе ты ў горадзе той мох знойдзеш!

— Махорка як махорка,— знарок абыякава сказаў я.— Масквы не ўбачыў, але горла дзярэ.

— Значыць, нічога ты не разумееш... Во, як ён,— паказаў на чалавека са шлангам.— Я кажу: навошта кветкі палівадь, калі ноччу дождж будзе, а ён не слухае, рады, што занятак знайшоў.

— Адкуль вы ведаеце, што ноччу будзе дождж?

— Я, хлопча, сорак з лішкам у вёсцы пражыў — чаму не ведаць?

— На старой кватэры гэта было,— сказаў раптам чалавек у піжаме.— Сусед у мяне, бывала, нап'ецца, уключыць у пакоі прыёмнік на ўсю моц, ляжа на канапу і слухае. Жонка ягоная лаецца, сам бы яму, здаецца, у каршэнь надаваў, а ён: не ваша, кажа, справа, дайце мне асалоду адчуць — так яшчэ сам Пушкін некалі казаў... Дзе ён пра таго Пушкіна ўзяў — чорт яго ведае... Так і я. Можа, і я хачу асалоду адчуць.

— А гэтага табе ніхто не забараняе,— строга сказаў дзядзька Ігнат.— Гэта іншая справа. Я толькі пра дождж кажу.

— Дождж дык дождж...— сказаў чалавек у піжаме.— Не пашкодзіць і дождж.

— Заўтра футбол,— сказаў я.— Навошта той дождж?

— Футбол будзе днём, а дождж сёння ноччу, кажу,— паправіў мяне дзядзька Ігнат.

— Нашы заўтра выйграюць, вось пабачыце, выйграюць,— сказаў чалавек у піжаме.— Паспрачацца магу.

— Гэта як сказаць,— запярэчыў я.— Каманда прыедзе моцная, а нашы перад гэтым такую дурную зрабілі нічыю...

— А я думаю так: з моцнай камандай лягчэй гуляць. Нашы найчасцей слабым і прайграюць.

А дзядзька Ігнат сказаў:

— Не разумею я балельшчыкаў вашых ды хіба яшчэ рыбакоў — тых, што з вудамі цэлыя дні сядзяць... Бывала, паедзеш на луг, намахаешся касой за дзень, а ўвечары — за таптуху ды ў якую застаялую азярыну. На ногі лапці абуеш. Касіць і рыбу лавіць у лапцях найлепш. Ну, яшчэ, можа, кароў пасвіць... Дык я і кажу: набоўтаешся, вылезеш на бераг — і рыба ёсць, і сам нібы ў святой вадзе выкупаўся. А потым раскладзеш цяпельца ля будана ды ў чыгунок рыбу, у чыгунок... Эх, ліха табе!..

— Вам, дзядзька Ігнат, у вёсцы жыць трэба,— сказаў я.

— Можа, і пераеду яшчэ ў вёску — адкуль ты ведаеш,— чамусьці пакрыўдзіўся дзядзька Ігнат.— А ты што — без вёскі можаш пражыць?

— Чаму? Я ведаю, што без вёскі нельга, але і без горада нельга таксама. Што я думаю, дык гэта — каб тое і другое ў чалавечай душы прымірыць...

— Бач ты яго — прымірыць! — ужо зазлаваў дзядзька Ігнат.— Харошы мір, калі такія, як ты, з вёскі ўцякаюць, з зямлі, дзе бацькі іх горб нажылі.

— Я не ўцякаў, але калі на тое пайшло, дык у вёсцы можа якіх пятнаццаць працэнтаў насельніцтва жыць,— і хлеба, і малака ўсё роўна ўсім хапаць павінна...

— Гэта па-навуковаму, ці як?

— Можа, і па-навуковаму. А чаму гэта дрэнна?

— А таму дрэнна,— усхадзіўся дзядзька Ігнат,— што некаторыя думаюць, быццам батоны на вярбе рас-

туць... А таму, што да зямлі пашаны няма. Адпрацуе на трактары калыглуз які, што дзесяць класаў скончыў і ў калгасе стаж зарабляе, каб з вёскі ўцячы,— адпрацуе змену ці менш, на чуб флакон адэкалону выльє — і да дзявок. Яму хоць трава не расці...

— Табе, Сцяпанавіч, старшынёй бы ў калгасе быць,— сказаў чалавек у піжаме. Ён кінуў ужо свой шланг, стаяў, склаўшы рукі на грудзях, і слухаў.— Па справядлівасці, Сцяпанавіч, кажу.

— А ты думаеш, не быў? — нібы здзівіўся дзядзька Ігнат.— Не старшынёй, дык брыгадзірам быў. Адразу пасля вайны... І ўспамінаць не хочацца, і каб не хацеў — успомніў бы: такі быў той час. Такую вайну на плячах вынеслі, столькі пакінулі сірот, матак няўцешных і ўдоў. Столькі аратаяў, цесляў на той вайне палягло... А ты застаўся, галавы сваёй не зложыў; ацалеўшы, дамоў прыйшоў. Табе трэба новае жыццё будаваць, удовамі табе камандаваць трэба... І вось прыходзіць да цябе ўдава і, каб прывезці дроў, каняку просіць і, здаралася, паўлітэрка з-пад палы дастае... Толькі я за паўлітэрка тое не вінавачу яе. Не з хабарам яна прыходзіла, не сумленне тваё купляць. Ведала яна, як цяжка было таго каняку даць, спачування яна прасіла твайго. А чым яна аддзякаваць магла? Сама гародчык свой арала, карову ставіла ў плуг. Дровы з лесу на саначках вазіла, у калгас летам кожны дзень ішла... Пра тое я кажу, што на хабар не здольны просты чалавек. А што былі такія — і брыгадзіры, і старшыні, і падстаршынкі былі, што на людскім горы падчаровак гадавалі, тую ўдовіну гарэлку ў глотку лілі, бо надта шырокая была,— дык няхай ім абзавецца і на гэтым свеце, і на тым, калі ён ёсць, удовіна сляза...

Дзядзька Ігнат нервова таргануў галавой, дастаў з кішэні капшук і закурыў.

— Значыць, так і не ўдалося табе, Сцяпанавіч, да старшыні дарасці? — як бы спачуваючы, сказаў чалавек у піжаме.

— Не ўдалося,— сумна ўсміхнуўся дзядзька Ігнат.— І ўсё праз гэтых удоў... Суседка ў мяне была, Арынкай звалі. Дробненькая, кірпатая, вечна ў ватоўцы хадзіла. Мужык не вярнуўся ■ вайны, хата ў акупацыю згарэла. Шкада мне было яе. Замуж другі раз не выйшла, а дзяцей аж двух ад розных прайдзісветаў

прыблудных завяла. Паставіла хату. Што там за хата была, уявіць можна: два акны, а там, дзе яшчэ павінны быць вокны,— паабтыканыя мохам цурбакі...

У нас фінінспектар быў — п'яніца. Куфрам звалі. Па куфрах іншым разам лазіў, падаткі спаганяў. Ну, бывае, няма ў чалавека грошай, дык ты пачакай: свінчо, можа, якое прадасць, расплоціцца. Дык не... А залатыя ж у нас людзі, усё разумеюць, усё могуць змагчы. У самыя цяжкія гады яны ў нашу добрую справу верылі... Дык ты ж да іх павінен падысці па-чалавечы.

Але вось пачаў гэты службіст Арынку трэсці. Да таго разышоўся — карову абрытаў. Кабета ў слёзы — не жартачкі. Пачуў я, прыбег і — цяпер не шкадую і шкадаваць не буду — набіў таму гаду тоўстую морду. Набіў. Ну, пасля гэтага і ён пастараўся, каб мне жылося не гладка. Ледзь справу на мяне не завёў, пад палітыку падводзіў... А тут жонка ў мяне хварэць пачала. Сваяк, яшчэ да вайны з вёскі паехаў, у горад заве... Адным словам, паехаў я, слабасць душэўную паказаў... Слухай, Віктар,— сказаў раптам ён,— хочаш заўтра са мной на сенакос схадзіць?

— Гэта куды, дзядзька Ігнат, у вёску?

— Навошта ў вёску? На плошчы, на газонах, вунь якая трава парасла — навесці парадак трэба... Бачыш, у мяне і ў горадзе служба па душы.

— А ўставаць рана трэба, дзядзька Ігнат?

— Рана. Хочаш, пабуджу?

— Не, я сам устану. Не трэба.

— Ну вось і добра. А касу другую ў майго напарніка возьмем. Значыць, згода?

— Добра, дзядзька Ігнат,— сказаў я.

— Ну вось і добра,— сказаў ён.— А цяпер можаш ісці. Ідзі гуляй... Тваё дзела маладое... Ідзі.

І я пайшоў.

ЛІСТ ДРУГІ

Дружа, сёння ў мяне лірычны настрой: давай уявім сабе, што мы разам, давай сядзем побач — пагрэемся ля нядымнага агню нашай дружбы. Будзь благаславёная, нечаканая сустрэча, маўчыце, трубы, бубны і фанфары,— цішыня наўкол, і мы адны. Так. Чаго не стае нам яшчэ? Мо трошкі, трошачкі смутку — мы будзем успамінаць...

Мы вучыліся з табой у адной школе. Давай закінем

за плечы яшчэ няцяжкую ношку гадоў і пойдзем туды, на парог сваёй першай навукі. Мы будзем ісці іляснои дарогай, і палявой, і сцежкай па беразе ракі, і ехаць на падводзе, але болей ісці пешкі. Няма чыгункі, няма шашы, і поезда няма, і аўтобуса — іх мы не ведалі тады.

Пойдзем пешкі.

Але, слухай, ты ведаеш, той нашай школы цяпер ужо няма. Помніш хату цёткі Аўгінні — старую, без гародчыка пад вокнамі: вокны на вуліцу, помніш шырокі мурожны двор і напаўраскрытую паветку? Хату цётка некуды прадала, сама пераехала жыць да замужняй дачкі ў суседнюю вёску. Але — нічога. Тая хата жыве ў нашай памяці: вось мы прыйшлі да яе і селі на парозе...

Ну што ж, звіні — я цябе чую і сёння, зроблены з шурпатай снараднай галоўкі школьны званок!

У тую восень, калі мы ўпершыню селі за парту, яшчэ ішла вайна. Недзе далёка былі нашы бацькі: чый ваяваў, слаў дадому пісьмы, а чый маўчаў — і тады ўсё некуды пісалі пісьмы нашы маткі. І вось адтуль, аднекуль, прыходзіў нарэшце адказ — вузкаваты лісток з друкаванымі літарамі, і ў ім, закрэсленыя чорнай рысай, нейкія словы, а тое, што аставалася, чыталася ўсюды аднолькава, чыталася так: прапаў без вестак.

Над гэткім лістком плакала ў тую восень мая маці. Яна часта плакала ў той год: і раніцай, калі выпраўляла мяне ў школу, пачапіўшы палатняную торбачку з кніжкамі на маё плячо і даўшы ў рукі новенькую трохрублёўку на Чырвоны Крыж, і раніцай, калі не пускала мяне ў школу і я сядзеў цэлы дзень на печы, бо не было чаго абуць на ногі.

Над такой паперкай плакала ў тую восень і твая маці.

Але твой бацька не загінуў, ён вярнуўся: памятаеш, ты саромеўся казаць мне, што ён быў у палоне. Ты не мог даравацъ яму гэта, і, наошта таіць, не мог дараваць і я.

Давай жа цяпер, дружа, паклонімся невядомай магіле майго бацькі, і камень той, кінуты на пакутную дарогу бацькі твайго, давай падбяром таксама. Ні мой, ні твой бацька не вінаватыя перад часам і перад вайной...

Многа чаго не разумелі мы з табою тады...

Што ж, звіні, звіні — я цябе чую і сёння, зроблены з шурпатай снараднай галоўкі школьны званок!

У хаце цёткі Аўгінні, у першай нашай з табою школе, скончылі мы чатыры класы і прайшлі, як кажуць, пяты калідор. Калідора папраўдзе не было; была звычайная кухня з шырокаю печчу, са сталом, з лаўкаю для чыгуноў і для вядра вады. Калідоры былі потым, у іншых школах — сямігадовых і дзесяцігадовых, але ўжо не ў нашай вёсцы.

Раніцаю, ледзь пачынала віднець, увосень і зімою будзілі нас маткі: на камінку гарэў агонь і закіпаў на трыножцы чыгунок з бульбай...

І дагэтуль да самых малых драбніц помню я дарогі, па якіх хадзілі мы ў школу.

Як назваць нам тыя гады? Былі яны трудныя, бедныя, але яны не паўторацца: там, у звычайнай пасляваеннай вёсцы, пачыналіся з табою мы. Памятаеш, як зачытваліся мы Тургеневым, Чарнышэўскім, памятаеш, якую ўладу мелі над намі Рахметаў, Базараў? Не ведаю, як можна назваць гэтую пастаянную напружанасць душы, гэты парыў да самаахвярнасці, да радасці і нават да тугі — і гэта было, і я думаю цяпер: якія мы былі шчаслівыя, як многа было ў нас наперадзе, якое вялікае, таямнічае жыццё чакала наперадзе нас!

Тое жыццё, што было побач, мы не прымалі ў разлік. Да глыбіні душы абражалі нас несправядлівасць, падман і няшчырасць; не райская ідылія была наўкруг нас, але гэта было ў нас, у нашай вёсцы, а сапраўднае жыццё было недзе далёка; што яно было, мы не сумняваліся,— яно чакала нас, і ніяк, ніяк не магло яно без нас абысціся! І недзе там, далёка, быў чалавек, якому мы верылі больш, чым сабе.

Цяпер мы ўжо не верым таму чалавеку. Ды яго ўжо і няма. Патроху ды памалу вучымся мы ва ўсім пакладацца на саміх сябе.

Памятаеш, за вёскаю, у бярозавым гайку, за якім пачыналася высокае камяністае поле, закапалі мы бляшаначку з-пад ваксы, і ў ёй — запіску са словамі Мікалая Астроўскага: «Самае дарагое ў чалавека — гэта жыццё...» Тады, помню, была восень, парывіста шумеў пад ветрам бярозавы гаёк. Мы закапалі тую запіску і, сцяўшыся ад хвалявання, ад трывожнай нязвыкласці толькі што зробленага, стрэлілі з самапала.

Усё было ўрачыста, таямніча, і ўсё было падобна на клятву...

Што ж, пойдзем, дружа, пад нашу бярозку, давай возьмемся за рукі, пастаім, паслухаем ноч, цішыню і сябе саміх. Што б ні здарылася з намі, як бы ні пайшло далей наша жыццё, давай дамовімся з табою, дружа, што ніколі не скажам пра сябе словамі паэта:

Что я в ту пору замышлял,
Созвав товарищей-детей,
Какие клятвы им давал,—
Пускай умрет в душе моей,
Чтоб кто-нибудь не осмеял...

Давай дамовімся, дружа. Вось табе мая рука.

Твой Віктар.

ЗАЎТРА ФУТБОЛ

Дзядзька Ігнат казаў праўду: ноччу быў дождж. Была навальніца.

На дождж пачало брацца яшчэ звечара. Мы з Ленай не сталі чакаць дажджу. Можна было схавацца ад яго ў кіно, але білеты на вячэрнія сеансы былі ўсюды прададзеныя. Я пасадзіў Лену ў перапоўнены тралейбус, і яна паехала. Я пайшоў дадому пешкі.

На горад насоўвалася цёмная маўклівая хмара. Было душна, вецер яшчэ не ўсчынаўся. Многа людзей вярталася ў горад — на матацыклах, матаролерах, у легкавушках. Над кінатэатрам бледна мігала рэклама. Ля кафэ на рагу вуліцы стаялі, сабраўшыся купкамі, святочна апранутыя хлопцы і дзяўчаты. Пахла парфумай, газіроўкай і цыгарэтным дымам. Кволым, нібы збалелым жоўтым святлом запальваліся ў дамах вокны. Нейкі дзядзька ў саламяным капелюшы нёс на плячы вудачкі, у руцэ ў яго была гаспадарчая сумка: з яе вытыркалася трава, у сумцы, мабыць, была рыба. Пасярод вуліцы стаяла міліцэйская машына: рэпрадуктар па-казённаму нудна даводзіў, што нельга парушаць правілы вулічнага руху.

Ні вулічныя, ні якія іншыя правілы парушаць мне не хацелася.

Я ішоў і думаў пра Лену, пра тое, што заўтра нядзеля і, значыць, будзе футбол. Білеты на футбол у мяне ёсць: мне і Лене. Я думаў, што заўтра раніцай, да футбола, калі распагодзіцца, мы паедзем з Ленай на

возера. Там будзе людна, але мы, калі захочам, будзем адчуваць сябе нібы адны. Нам будзе добра. Мы будзем часта і падоўгу купацца, будзем, знясіленыя, ляжаць на беразе, потым я схаджу да латка па напітак і бутэрброды, а потым мы пойдзем на трамвайны прыпынак. У трамваі будзе цесна, нават трошкі цемнавата ад густой цеснаты загарэлых твараў, плячэй і рук; мы будзем стаяць побач, блізка прыхінуўшыся адно да аднаго, я буду глядзець у стомленыя, трошкі затуманеныя Леніны вочы, бачыць бледнаваты шрамок у яе на лбе, бачыць яе разгубленыя вусны блізка ад сваіх, і мне захочацца, вельмі захочацца пацалаваць яе, і яна здагадаецца пра гэта, будзе гарэзна глядзець на мяне і смяяцца.

Я думаў пра дзядзьку Ігната, пра яго дзіўную і такую зразумелую любоў да вёскі, і мне чамусьці было трошкі шкада яго. Я думаў пра тое, што я вось ведаў і горад, і вёску, спаў у будане на лузе і ў нумары гасцініцы, смаліў кабана і ведаў, як сякуць на зіму капусту, курыў ноччу са стомленым шафёрам у таксі і піў на вясковым вяселлі самагонку, спрачаўся пра Хемінгуэя і Врубеля, падоўгу прастойваў у залах музеяў, вучыўся ў інстытуце, на канікулах касіў у калгасе, радаваўся, расчароўваўся і каяўся, марыў стаць паэтам, а стаў аспірантам па разраду, як кажуць, прыгожага пісьменства. Але справа не ў гэтым.

Мне хацелася, даўно хацелася прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была мая самая патаемная і самая душэўная думка.

А можа, праўда дзядзькі Ігната, і чалавеку па-сапраўднаму трэба што-небудзь адно: горад ці вёска, месяц над хатай ці электрычны ліхтар?

Не, мусіць, не так. Я бачыў з самалёта неба: сонца залаціла перыстыя аблокі, і яны гарэлі чыстым незямным агнём. Кучавыя воблакі ляжалі ўнізе, здавалася, на самай зямлі — зямля была далёка, і далёка было відно наўкол, і здавалася, у нейкі міг страчвала над табою ўладу ўсё зямное, і здавалася, у нейкі міг ты пазнаваў вечнасць — халодную вечнасць, прывабную і чыстую, як залацістае ззянне аблокаў. А з неба ўсё лілося і лілося невыказна чыстае святло, і, здавалася, вось-вось надломіцца нешта ў душы, і ты больш, чым жыцця, захочаш смерці, бо там, дзе душы кранаецца вечнасць, не існуе мяжы паміж жыццём і смерцю...

О зямля! Ты даеш нам тугу па небе, але не меншая наша туга па табе. З далёкіх і блізкіх дарог вяртаемся мы да цябе, і спеў жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта. Неаднойчы так было і са мной, і часта я думаў: навошта выбіраць паміж жаваранкам і рэактыўным самалётам? Хіба ж нельга, каб было і тое і другое? І, мусіць, не ўся праўда ў дзядзькі Ігната, праўда ў таго, у каго яе больш.

Не, я не дакараў дзядзьку Ігната. Я думаў, што кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі, што кожны, урэшце, мае права любіць нешта асабліва моцна,— няхай так: гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога.

Не, я ўсё ж паважаў дзядзьку Ігната. Я ішоў і думаў, як заўтра мы пойдзем касіць на плошчу, як я вазьму ў рукі касу, якую даўно ўжо не браў, як гэта добра, што мы будзем касіць у горадзе. І мне здавалася, што заўтра са мною павінна здарыцца нешта асабліва значнае і важнае, што заўтра, можа, канчаткова вырашыцца мая даўняя спрэчка з самім сабой...

А ноччу быў дождж. Была навальніца. Я даўно не бачыў такой навальніцы. Раз'ятрана білася ў трубах вада, сінія маланкі паласавалі неба, на вуліцы нешта гуло, сіпела, булькала,— водгулле грымотаў кацілася імкліва і бурна, бы гул рэактыўнага самалёта.

Потым усё сціхла. Чуваць было, як падала з даху вада. Я лёг спаць. Я засынаў, і мне ўсё мроілася; сінія маланкі, дзядзька Ігнат, заўтрашняя наша касьба. І яшчэ: Лена, Лена, Лена. Футбол, футбол, футбол...

ЛІСТ ТРЭЦІ

Добры дзень, Андрэй і Куліна!

У першых радках свайго пісьма саабшчаю вам, што мы жывыя і здаровыя, чаго і вам жадаем. Пісьмо ваша палучылі, за што дзякуй, а таксама, што не забываецеся на нас і завяце ў вёску, каб прыехалі ў гэтае лета. На гэта скажу, што не ведаю, бо адпачынак мне даюць заўсёды ўвосень: летам у мяне ў горадзе самая работа.

Толькі вы як бы адгадалі мае думкі: стары я станаўлюся і ўсё больш і больш пачынаю думаць пра нашу вёску, а як успомню, што там, дзе стаяла мая хата, чужы двор і чужая гаспадарка, дык і кажу сабе: дур-

ны ты, дурны, чаго ты са свайго гнязда сарваўся, чаго пайшоў у белы свет як у капейку!

І старая мая на тое, каб назад вярнуцца, даўно падбівае. А вы ведаеце, што калі сам хочаш вярнуцца ды яшчэ калі жонка за тое голас падае, дык тут і думаць няма чаго.

Грошай трохі мы сабралі; каб купіць халупу, хопіць, а там, як кажуць, бог-бацька; рукі ёсць, горб таксама, можна і новую хату паставіць.

Быў тут Піліпаў хлапечык у нас — такі дзівак, грошы, яшчэ студэнтам пазычаныя, прынёс. Даўно гэта было, а не забыўся. Я не пра грошы кажу, грошай тых старымі якіх пяцьдзесят рублёў, а толькі прыемна, калі чалавек харошы, ды яшчэ з тваіх мясцін. Я і не ведаў, што ён пасля інстытута ў нас у раёне ляснічым працуе. Вось гэта добра, што вярнуўся дамоў.

У мяне да цябе, Андрэй, мужчынская просьба. Як тады гэты Піліпаў хлапечык быў, пасаромеўся я слова сказаць, каб ён мяне, калі што якое, лесніком дзе прыстроіў. Скажы цяпер яму. Скажы, што я чалавек ціхі, любіцельскі: у лесе, можна сказаць, гадаваўся — і лес люблю. А то во і вы пішаце, што як пілараму ў нас паставілі, дык многа лесу без пары і толку на глум ідзе... Ён чалавек, я думаю, хоць малады, а з душой і павінен зразумець.

Навін у нас асаблівых няма. Хлопец наш малодшы служыць у арміі, астаўся яму служыць адзін год. А больш навін у нас ніякіх няма.

Адпішыце нам, а мы, як ад вас пісьмо палучым, адразу адпішам.

Бывайце здаровы.

Ігнат.

ПАРА КАСАВІЦЫ

Яшчэ не хадзілі трамваі, тралейбусы, вуліца была пустая і мокрая ад дажджу. Недзе за горадам узыходзіла сонца. Яно не абзывалася яшчэ ў горадзе, але я ведаў: сонца ўзыходзіла. Таму-сяму, як і дзядзька Ігнат, я навучыўся ў вёсцы. Было чатыры гадзіны раніцы.

Далёка-далёка, у маёй і ў дзядзькі Ігнатавай вёсках, пастух выганяў наранкі кароў.

А мы ішлі з дзядзькам Ігнатам па мокрым ад дажджу тратуары, і на плячы я нёс касу. Касу мы ўзялі ў дзядзькавага напарніка, дасталі з падстрэшка дашчанай нізенькай пунькі, крытай толем і рудой гарбатай бляхай. Было лета, і дзядзькаў напарнік спаў тут жа, у пуньцы: нам не трэба было заходзіць у дом.

Вуліца была пустая і мокрая ад дажджу. Было ціха. Па дарозе на плошчу мы ўбачылі толькі вартаўніка ля гастранома ды нейкага дзівака ля аўтамата з газіраванай вадой. Дзівак усё тыцкаў і тыцкаў пальцам у кнопку аўтамата, грукаў па ім кулаком, але вада не ішла. Дзіваку было год дзевятнаццаць: якінебудзь сасмяглы ад кахання студэнт. Салют табе, браце, і шчырыя пажаданні ўдачы! Перадавай прывітанне маёй студэнцкай маладосці!

Мы прыйшлі на плошчу.

Далёка-далёка, у маёй і ў дзядзькі Ігнатавай вёсках, нехта здымаў з пляча касу. Узыходзіла сонца. Стаяла высокая, пасівелая ад туману і густой расы трава. Звінела пад мянташкай каса...

— Пачакай,— сказаў дзядзька Ігнат, спыніўшыся на краі шырокага газона, абсаджанага роўным кустоўем.— Давай пакуль перакурым.— І асцярожна палажыў касу на шызую, набрынялую холадам елачку.— Пачынаць буду першы я...

Ён гаварыў ціха. Раніцай нельга моцна гаварыць. Я маўчаў.

— Паглядзі, як там у цябе на касільне пупок. Каб высака не быў.

— Не, у самы раз... Толькі ў нас гэта не пупок завецца, а лучок. У нас лепш...

— Як вядзецца, так і завецца. Лучок... А як у вас завецца распорка з сеткай, што да касы прыладжваюць, калі косяць грэчку? Вось гэта — дык завецца лучок!

— Як у нас завецца? Чакайце, дзядзька Ігнат... Не, нешта не ўспомню.

— Як успомніш, скажаш мне.

Ён нават не ўсміхнуўся. Сур'ёзна ён казаў ці кпіў з мяне? Але я не крыўдаваў на яго, мне нават чамусьці было прыемна, што ён правучыў так мяне.

— Дайце мне мянташку,— сказаў я,— пагляджу, можа, у маёй касе лапатуха якая завялася. Га, дзядзька Ігнат!

— Чакай, спярша я сам. Але давай лепш пакурым. Закуры махры.

— Давайце.

І вось мы стаялі, курылі моцную, аж займала дух, ядавітую махорку. Харрошая была махорка!

Было ціха, была раніца, быў горад, і мы збіраліся ў гэтым горадзе касіць.

— Як трымаць касу не забыўся? — пытаўся дзядзька Ігнат.— Эх, браце! І навошта табе кніжная навука? Марнуеш ты маладосць. Пайшоў бы я на тваім месцы ў грузчыкі, у плытагоны, у кавалі. Сілу б у плячах адчуў. Апетыт бы меў воўчы. Сіла была б, як у каня... Ты не смейся. Ты малады яшчэ, нічога ты не разумееш... Бывала, косіш: во гэтак, як сёння,— не так, канечне, я толькі для прыкладу кажу. Косіш, а потым нехта «Перакур!» — крычыць. У рэчцы касу абмыеш ды ў цянёк пад куст. А тут дзеўкі пракосы раскідаць прыйшлі... Ведаеш нашых дзевак? Загарэлыя, крамяныя, паркалёвая кофта ды спадніца, але ж дзеўкі што трэба. Засмяецца дык засмяецца, гэта не тое што хі-хі ды ха-ха!.. Ляжыш пад кустом, а яны пацвельваюцца з цябе. Не ўтрымаеш ды да іх: ну, думаеш, пакажу. Бяжыш, схапіць каторую хочаш, а яны — уцякаць... Дагоніш, канечне. Але і кухталёў надае... Але нічога, зможацца. І вось як глянеш тады ёй у вочы... Толькі што гэта я, кавалер гарохавы, табе расказваю, ведаеш сам. Але, брат, паслухай, pаківай галавою і — маўчы. Быццам нічога табе не гаварыў... Толькі, брат, маладосць, яна, брат, маладосць... Эх, і касанём мы з табою!

Ён неяк пасвятлеў увесь, па-заліхвацку кінуў недакурак, нагнуўся, падняў касу, зашчаміў касільна пад пахай, узяўся рукой за палатно касы і паласнуў па ім мянташкай:

— Джгінь-джгінь-шах! Джгінь-джгінь-шах!

Вясёлая, харошая, знаёмая з маленства музыка!

Ён падышоў да шнурка кустоўя, асцярожна пракасіў лапінку, павярнуўся, падняў над мокрай травою касу, прыгнуўся і — пайшоў...

— Насядай на пяткі, Віктар, насядай!

І тады, хвалюючыся, баючыся адстаць ад дзядзькі Ігната, узмахнуў касой і я...

. . . .

Днём ужо, едучы на футбол, я выскачыў з тралейбуса на плошчы. Пякло сонца. Трава ў пракосах завяла. Па пракосах чорныя, аж бліскучыя, жвава скакалі шпакі. Пахла сенам. Вялізны і шумны ляжаў навокал горад. На плошчы па-лугавому, па-летняму пахла сенам.

Я павярнуўся і паціху пайшоў тратуарам, і тут, на тратуары, раптам таксама ўбачыў сена — невядома кім растрэсены клок падсохлага сена. Па-лугавому, па-летняму пахла сенам. «Сена на асфальце,— падумаў я,— сена на асфальце...»

Быццам доўга я шукаў нечаму слова і раптам яго знайшоў.

«Сена на асфальце,— узрадавана думаў я.— Вёска ў горадзе...»

1963

ДОБРАЕ НЕБА

— Ну, дык глядзі ўжо тут сам, Максімка, а я пайду,— сказала сястра.— Я ўжо думала, што ты не прыедзеш. Прыходзіў стары Нічыпар, казаў, што яны адбудуць чаргу толькі за карову. Цёлку яшчэ на пашу не пускаюць — кульгае... Навязваюць на лагу. Дык заўтра твая двароўка — добра, што ты прыехаў...

— Я ведаў. Старшыня на луг прыязджаў — Нічыпар і яму наказваў... А мы сёння пастараліся ўранку і вунь які клін на расцяробах дабілі: ведаеш, там, дзе летась Аўдзея секанула маланка.

— Дык ты глядзі ўжо цяпер, Максімка, сам... Я табе хлеба спякла. Учора масла збіла. Што гэта яшчэ хацела сказаць?.. Парсюку не мяшай надта мукі — лета... Ён і бацвінку вунь як есць — цялёпкае, аж вушы трасуцца... Квактуха твая нейкая дурная: з хаты не выгнаць. Кураняты ўжо вялікія, навошта трымаць у хаце...

— Ідзі, Насця, ідзі, цяпер я ўжо сам. Дзякуй, што гэтыя дні пабыла.

— Варка ўчора праходзіла. Убачыла мяне ў цябе на двары — зайшла. Пагаварылі мы... Хоць бы ты жаніўся ўжо...

Яна ўздыхнула, папраўіла пад хусткай зляжалыя, прыліплыя да шчок валасы, глянула на свае босыя ногі і, зноў уздыхнуўшы, пайшла ў агарод. Ён маўчаў. Бачыў, як у агародзе яна падвязвала фартух, нагнуўшыся, падбірала з узмежка траву — трава, нагрэтая сонцам за дзень, упрэла і цяпер патыхала аж сюды, на двор, саладкава і горача. Насця пайшла мяжой паўз грады: зноў нечага нагнулася, зашамацела гуркоўнікам. «Укрывае гуркі-насеннікі,— падумаў ён,— каб куры не падзяўблі». Яна выйшла агародам у поле, ні разу не аглянуўшыся,— драбнаватая, у паркалёвай выцвілай кофце, у шырокай доўгай спадніцы,— ішла да сценкі, і не вельмі ўжо высокае сонца ружовіла яе, надавала ёй сярод поля нейкай сцішанай, журботнай самоты.

І тады ў яго на душы таксама нечага стала журботна, ціха — і гэта было горш, чым каб ён ведаў, пра што і чаго смуткуе.

На двары было ціха, ціха было і на суседскім, у старога Нічыпара: адно ціўкалі там, пад акном за ліштвай, маладыя вераб'і. Сонца грэла шэры пакарабачаны дах Нічыпаравай хаты, стаяла цішыня, і ўсё было наўкол такое выразнае, сапраўднае, што хацелася сысці куды, каб нічога не бачыць.

Ён пайшоў у канец двара, пад пограб, па-старому крыты саломай. Тут быў цень, была прахалода, пахла бульбай і сырой зямлёй. Бульба прарастала з-пад падруб пограба, гнала на двор бледна-ружовыя кволыя стрэлкі. Максім адчыніў у пограб дзверы, прыгнуўшыся ступіў у халаднаваты паўзмрок, пастаяў, прывыкаючы да цемені, потым знайшоў ля сцяны халодную цяжкую конаўку, зробленую са снараднай гільзы, і пачаў боўтаць ёю ў бочцы з бярозавікам. У пограбе пасвятлела: сталі відаць абкураныя сцены, засек пад бульбу, жалезная трынога пад вуголле: зімою грэў ім пограб, каб не памерзла бульба. Яму стала лепш, калі ён, заплюшчыўшы вочы, піў кіславаты, даўкі бярозавік, думаў, што трэба не забыцца сказаць Насці, каб узяла колькі вёдзер сабе: гэтага квасу яму аднаму замнога.

Ён зачарпнуў яшчэ конаўку і панёс яе ў хату.

Ужо ступаючы на ганак, ён падумаў раптам, што тое невыразнае, што мучыла яго, было, мусіць, бояззю пустой хаты, і цяпер, падумаўшы пра гэта, ён ужо ведаў усё наперад: там, у хаце, больш чым дзе апануе

яго адзінота, зноў і зноў нахлынуць успаміны пра жонку. Але не ісці ж было назад, і ён тарганўў дзверы — задрыжалі сцены, у твар патыхнула настоенай цеплынёй жытла, а на вокнах, патрывожаныя стукам дзвярэй, зазвінелі, забзымкалі мухі.

Было непазбежнае і невясёлае яго вяртанне.

Ён ішоў да стала, стараючыся не ступіць нагой на пакрышаны куранятам хлеб на падлозе. Кінуў на куфар шапку, паставіў на стол конаўку з бярозавікам, пайшоў у сенцы і, дастаўшы з торбы прывезены з лугу акрайчык хлеба, зноў вярнуўся ў хату. Пра спечаны Насцяй хлеб ён не ўспомніў. Сядзеў за сталом і нехаця піў квас, заядаючы яго хлебам і вялікай, цеплаватай цыбулінай, знойдзенай на падаконні. Яму здавалася, што ён ні пра што не думае, але, мусіць, увесь час ён проста шкадаваў сябе — гэта было падобна на боль і не падобна на думку.

Потым, перакусіўшы, ён непрыкмет задрамаў за сталом. Такое стала ў яго ўжо звычкай: варта было яму сцішыцца, як ён пачынаў драмаць. Але драмаў ён заўсёды чуйна. Вось і цяпер чуў, як нехта з некім гаварыў на вуліцы, як ціўкалі ў хаце пад квактухай кураняты, як недзе праляскаталі калёсы. Пасля змарыў сон. Снілася жонка: стаяла над ім і будзіла, і такая цеплыня да яе, пяшчота поўнілі ўсяго яго, што ён знарок не абзываўся, думаў, што гэта яму заўсёды толькі здавалася, нібыта памерла жонка: яна з ім, ён вось, калі захоча, устане і дакранецца да яе...

Заціўкалі кураняты, заквохкала курыца, і ён прахапіўся. Акно залівала чырвань, шумеў каля хаты ільмак, і раней чым ён што-небудзь падумаў, сэрца сціснула туга. О, гэта чырвонае, халоднае святло! Нічога не іначылася, заўсёды быў усё той жа летні надвячорак, як і пяць год назад, калі памірала жонка, і ён нечага выбег з хаты на двор. Чырвонае садзілася тады сонца, халодны вецер мёў пясок па вуліцы, і на ўсім была чырвань, халодная чырвань...

Колькі часу ён сядзеў за сталом, пакуль не ўспомніў, што, як ад'язджаў з лугу, мужчыны давалі яму да сваіх сямейнікаў розныя даручэнні. «Трэба схадзіць наказаць,— падумаў ён,— заўтра, мусіць, на луг пойдзе падвода». Вылазячы з-за стала, кінуў вокам на старое люстэрка, што вісела на сцяне: з фіялетава-асмужанага шкла глянуў на яго парослы шчэццю твар са

зморанымі квола-сінімі вачамі. Падумаўшы, ён дастаў з куфра нажніцы. Моршчачыся, пачаў падстрыгаць вусы і шэрае пянёўе на шчоках.

Скончыўшы, ён узяў з куфра шапку і, нібы ўспамінаючы нешта, спыніўся пасярод хаты.

Навошта, навошта ён тут адзін, навошта гэта хата, калі няма жонкі, калі раз'ехаліся, павыходзілі ў горадзе замуж дочкі, бадзяецца недзе па свеце сын, пра якога думаў, што прыедзе ў вёску, ажэніцца і стане абжываць бацькаву хату...

Дочкі клікалі ў горад, але гэта так не трэба было, несур'ёзна нават, бо не хацеў пра горад і думаць. Кожнае лета ён чакаў дадому сына: той прыязджаў заўсёды нечакана, пад вечар, мажны, лабасты, у цёмным касцюме і ў чорнай флоцкай фуражцы, якую ўжо колькі год насіў пасля службы. І тое, што прыязджаў ён заўсёды нечакана, што заўсёды быў у адной і той жа фуражцы, што прыязджаў не з чамаданам, а з рэчавым мяшком, непакоіла і палохала Максіма: ён баяўся, каб не закруціла сына жыццё, каб не прывык, халасцякуючы, браць чарку, не звязаўся з благімі людзьмі...

Увечары, паставіўшы на стол бутэльку самагонкі і такую-сякую закусь, ён асцярожна пачынаў выпытваць у сына пра жыццё, намякаў на жаніцьбу, але той чамусьці больш адмоўчваўся, выпіўшы, налягаў на агуркі, неахвотна беручы што другое, і тады, сцяўшыся ад крыўды, Максім думаў, што сын назусім адкаціўся ад яго, ад дому, што папрокамі і ўшчуваннем тут не паможаш. Ён змаўкаў, моўчкі яны вылазілі з-за стала, моўчкі лажыліся спаць, а назаўтра, устаўшы, Максім адразу ж даваў сыну якую-небудзь работу.

І так было дзень пры дні; ён прымушаў яго рабіць і дома, і ў калгасе. Не шкадаваў, не хацеў шкадаваць яго — навошта шкадаваць, калі сын не шкадуе бацьку. Паміж сабой яны цяпер амаль не гаварылі, ім было ніякавата, застаўшыся адзін на адзін: сын, Максім бачыў, пачынаў сумаваць, марнець з твару і, калі канчаўся адпачынак, пакідаў вёску з ахвотай.

А цяпер не прыязджаў да бацькі другі ўжо год...

Навошта, навошта гэтая хата, дзе жывуць толькі туга па жонцы і крыўда на сына?

Ён пастаяў пасярод хаты, убачыў на падлозе хлебныя крошкі — пайшоў у качарэжнік, узяў венік і пад-

мёў падлогу. Наліў куранятам у талерку свежай вады і выйшаў на двор.

За агародам сценкаю ішлі з поля жанчыны: нечы голас вылучаўся з усіх, не то на некага сварыўся, не то нешта расказваў. Была пара нядоўгай сцішанасці, вечаровай лагоды, пара ружовага промня і сумна-звонкай дзявочай песні. Але ніхто не спяваў. Грукаў на сажалцы пранік — рэха дрымотна кацілася па вёсцы; яно нагадвала нешта маладое, напаўзабытае, будзіла нейкую няпэўную надзею, што і праз год, праз два гэтак жа будзе кацідца яно па вёсцы, што і ён яшчэ будзе вось так стаяць на двары і слухаць яго.

І на душы ў яго паспакайнела.

Ён замяшаў парсюку тоўчанай бульбы, выліў яе ў карыта, пачакаў, пакуль той з'есць, і выйшаў на вуліцу. Трэба было б зайсці да старога Нічыпара, сказаць, што прыехаў з лугу і будзе заўтра адбываць двароўку. «Зайду потым,— падумаў ён,— спачатку развяжуся з лугам». І пайшоў паволі вуліцай.

На лажку ля студні ён убачыў хлапчукоў: падкідваючы ўгору нейкую птушку, яны з крыкам ганяліся за ёй, пакуль, ловячы, не накрывалі яе шапкай. Ён спыніўся і паклікаў іх да сябе. Хлапчукі прыціхлі, збіліся ў купку; потым, сказаўшы нешта сябрукам, да Максіма падбег брыгадзіраў Стась — самы смелы з усіх, рослы, у замурзанай шапцы, надзетай брылем назад.

— Гэта вы нам крычалі, дзядзька Максім?

— Носіцеся тут,— сказаў ён,— птушанё маленькае мучыце...

— Гэта кароза,— сказаў Стась,— а па-навуковаму — сойка.

— Кароза, сойка — усё адно,— сказаў ён.— Вы мне лепш адно дзела зрабіце...

Стась паправіў на галаве шапку і, пераступіўшы з нагі на нагу, шморгнуў носам.

— Якое дзела?

— Аббяжыце двары і скажыце, што я прыехаў з лугу, што мужчыны прасілі, каб...

— Ого, дзядзька Максім, хітрыя вы,— сказаў Стась.— Што ў нас ногі купленыя?

— Бач, разумнік які!.. Я вам таптуху дам схадзіць на рыбу.

— Праўда, дасцё? Не маніце, дзядзька Максім?

— Ты лепш слухай. Я табе зараз усё раскажу як мае быць. Толькі, глядзі, не забудзься...

Ён тлумачыў, каму і што трэба наказаць, а Стась усё ківаў галавой і шморгаў носам.

— Дык не забудзешся? Глядзі ж...

— Праўда, таптуху дасцё, дзядзька Максім?

Ён не адказаў. З кустоў, што былі за студняй, выходзіла Варка. Яна, мусіць, таксама заўважыла яго, хацела была спыніцца, можа, нават схавацца, але, зноў зірнуўшы на вуліцу, смела пайшла да яго. Ён стаяў і чакаў. Яна ішла паволі, засяроджаная, заклапочаная, ішла, не ўзнімаючы галавы, і калі параўнялася з ім, ледзь павяла на яго вокам і спакойна, ціха сказала:

— Шчаўя во трохі нашчыпала... Не расце нешта гэты год.

— На лузе такога дабра хапае,— таксама не вітаючыся, сказаў ён.— Толькі дзе ты будзеш яго шчыпаць...

Яна прыпынілася і глядзела некуды ўбок.

— Дык гэта ты адзін прыехаў ці пакасілі ўжо ўсё?

— Двароўка ў мяне,— сказаў ён.— Мужчыны яшчэ засталіся...

— Плот у мяне, такое ліха, паваліўся,— сказала яна.— Хадзіла раніцай да Іванчыкавага хлопца, а яму часу, кажа, няма. Каменне збіраць у другую брыгаду паехаў. Сказаў, можа, і заначуе там...

— Каменне ў сенакос... Нехта ж выдумаў...

— Не ад калгаса гэта... З раёна прыязджалі... За грошы.

— Даўно забурыўся твой плот?

— Пад вечар учора. Нечы парсюк падрыў. Я хацела выраўняць, а слуп гнілы — надламаўся... Падперла рыдлёўкай...

— Дык хадзем, можа,— гляну...

— Табе ж мо часу няма...

Ён, не зірнуўшы на яе, моўчкі пайшоў вуліцай, яна памкнулася следам, трымаючыся воддаль. Ён падняў з дарогі нейкі дубчык, круціў яго ў руках, потым, прымерыўшыся, кінуў у пыльную канаву пад плот.

— Можа, табе часу няма,— яшчэ раз перапытала яна.— Прыедзе Іванчыкаў хлапец... А там у майго Толіка канікулы будуць.

— Ці многа ж яму даюць гуляць?

— Месяц, пісаў... А твой гэта летась не прыязджаў?

— Нельга яму,— зманіў ён.— Не пускаюць. Работа ў яго такая.

— А няўжо... Гэта ж во Марынін хлапец са службы прыйшоў, а дзе служыў, не кажа. Не дазваляюць ім казаць...

— Твайму многа яшчэ вучыцца?

— Дзве зімы.

«Вывучыцца,— падумаў ён,— трэба яму будзе вёска... Во як майму». Ён не хацеў прызнацца сабе, але ведаў: каб Толік быў благі сын, ён, Максім, можа, знайшоў бы ў гэтым нейкае суцяшэнне сабе, і ў нечым бы ён тады зраўняўся з Варкаю. І, можа, яна не стала б тады так патураць гэтаму свайму жэўжыку, на якога Максім ужо два гады насіў у душы затоеную крыўду. У вёсцы даўно ўжо ведалі, што ён ходзіць да Варкі: ён без жонкі, яна без мужа — чаму б не сысціся. Ведаў пра гэта, мусіць, і Толік, бо неяк улетку, падпіўшы на выпускным школьным вечары, прычапіўся на вуліцы да Максіма, кідаўся біцца, грузіўся і блізка не падпусціць да матчынага парога... Прыбегла Варка і, плачучы, ушчуваючы, павяла сына дадому. І з той пары паміж ёй і Максімам як бы залягло нешта, абаіх гняла нейкая няпэўнасць, асцярожнае і ўпартае нежаданне шчырасці.

Яны і цяпер, гаворачы, як бы баяліся парушыць гэтую няпэўнасць і так, то перакідваючыся словамі, то маўчучы, дайшлі да Варчынай хаты.

— Во, бачыш,— сказала яна, спыніўшыся ля падгнілага слупка,— вецер узвінецца — зноў забурыцца...

— Забурыцца,— пакратаўшы слуп, заклапочана згадзіўся ён.— Усё перасыпаць трэба. Але пакуль хоць новы слуп укапаю... Дай гляну на двор...

— Дык глядзі ўжо, Максімка, глядзі,— неяк разгублена і ліслівa сказала яна і адступіла ўбок, пачакала, пакуль ён пройдзе ў весніцы, і потым сама ўжо зайшла на двор... Максім нешта выглядаў пад паветкай, нешта мармытаў сабе пад нос, потым адкаціў ад сцяны сукаватае сасновае палена, закарэлае ўнізе ад смалы, гопнуў па ім нагой і паклікаў:

— Ідзі сюды, глянь... На смалякі берагла? Закапаю гэтым канцом у зямлю — гнісці не будзе.

— Ды глядзі ўжо, Максімка, глядзі,— зноў неяк разгублена сказала яна,— табе відней.

— Нясі мне пілу, сякеру...

Ён сходзіў на вуліцу замераць слуп, зноў вярнуўся: з сянец вынесла пілу і сякеру Варка. Удваіх яны перапілавалі слуп, зрабілі зарэзкі для жэрдак, потым ён ужо ўсё рабіў сам: падраўноўваў на слупе сукі, капаў ямку, прыбіваў жэрдкі. Варка не паказвалася з хаты. «Мусіць, не хоча, каб нас бачылі разам,— думаў ён.— Але ўсё роўна будуць малоць языкамі: раблю ж во плот... Ну і няхай...»

Калі ён рабіў на вуліцы, бачылі яго ўсяго два чалавекі: прайшлі міма, павіталіся, але не загаварылі. «Бач, далікацтва якое!» — падумаў ён, і яму чамусьці стала прыемна. Было прыемна думаць, што недзе тут, блізка ад яго, Варка, што сённяшні дзень нешта зрушыць, можа, і ў іх адносінах. Калі ён канчаў работу, заходзіла сонца — чырвонае, халаднаватае, але на вуліцы было ціха, цёпла, і ўспамін пра жонку, у нейкі момант скалануўшы яго, неўзабаве адступіўся. «Пра гэта сёння не трэба думаць,— сказаў ён сабе.— На сёння даволі».

На ганак выйшла Варка і клікнула яго ў хату.

Ён пайшоў. Яшчэ з парога пачуў ён пах яешні, убачыў засланы свежым абрусам стол: у хаце было ўтульна, чыста, па кутах снаваўся ціхі паўзмрок, і на яго, як ён толькі ўвайшоў, адразу патыхнула нечым лагодным, такім непадобным на ягоную хату, што ён спачатку разгубіўся, стаў у парозе.

— Садзіся во, перакусі,— сказала яна.

У парозе ён памыў над вядром рукі, выцер іх чыстым ручніком, які дала яму Варка, і хацеў быў павесіць яго на цвік, але яна сказала:

— Вазьмі за стол — пасцелеш на калені.

Ён сеў за стол, палажыўшы ручнік не на калені, а на лаўку каля сябе. Яна дастала [redacted] куфра графінчык падчырвоненай гарэлкі, наліла поўную шклянку, трошкі капнула ў другую шклянку сабе і паставіла графінчык на стол.

— Раструбяць цяпер па вёсцы,— усміхнулася яна,— скажуць: Максім у прымы пайшоў...

— Ліха [redacted] імі,— нешта думаючы сваё, адказаў ён.— Насця казала, што бачыла цябе. Пытала ў мяне, чаму не жанюся...

— Выпі, Максімка, выпі,— нечага занепакоілася Варка.— Я дык ужо і не ведала, што з гэтым плотам рабіць... Выпі...

«Хітруе,— пакрыўдзіўшыся, падумаў ён.— Не хоча гаварыць... Эх, бабы!» І выпіў, скоранька чокнуўшыся з Варкай, сваю гарэлку.

— Бяры во яешню,— падказала яна.— Сыру пакаштуй... Даўно ўжо не рабіла... Толік мой любіць...

— Калі ён прыедзе?

— А тыдні, пісаў, праз два...

— Надта не патурай яму. Няхай хоць сена назапасіць паможа. З сенам цяпер людзям найбольшы клопат... Гэта ж прыязджаў на луг настаўнік наш, з калгаснікамі на дзесяць працэнтаў касіць. Дык той-сёй крывіцца... А хіба ж яму не трэба карову карміць? Ён жа тваіх дзяцей вучыць, у адной вёсцы жыве...

— Ёсць яшчэ людзі — толькі пад сябе грабуць... Можа, яшчэ, Максімка, вып'еш? Я налью...

— Не, не буду... Карова з пашы прыйдзе — трэба падаіць. Заўтра ўставаць трэба рана — зноў жа кароў пасвіць...

Яна не ўпрошвала, адшчыкнула сабе кавалачак сыру, ела, потым, склаўшы рукі на грудзях, ціха сядзела, нешта думала, а ён паглядаў на яе, на яе яшчэ не састарэлы твар, на асмужаны паўзмрокам чысты лоб пад туга зачасанымі чарнявымі валасамі,— яна заўважыла гэта, паварушылася, паглядзела ў акно.

— Змяркаецца ўжо... Гэта ж трэба, божа, такое, каб мужчына жаночую работу рабіў... Як не павязе, дык не павязе...

— Чаго шкадаваць,— як бы зазлаваўшы, сказаў ён.— Лепш бы замуж за мяне ішла... Чаго шкадаваць?..

— А я і пайшла б,— спакойна і сур'ёзна сказала яна,— каб не Толік. Каб не Толічак мой... А што ж з ім будзе? Бацька нас тады пакінуў, сышоў сабакам сена касіць... На заробкі з'ехаў... Дык як жа я цяпер сына пакіну?..

— Не ўсё ж будзе пры табе... Жэніцца — чужая станеш.

— Можа, і жэніцца... Можа, і чужая стану, ды ён жа мне не чужы... Што мы? Няхай ужо нашы дзеці жывуць...

Ён пачынаў трохі п'янець, стала шкада сябе, Варкі. «Як добра,— прыйшло ў галаву,— што не сказаў ёй праўду пра сына. Яна б думала, што ў мяне благі сын, і шкадавалася б мяне... Яна добрая... Не тое што я... Яна

шкадуе Толіка, і ён кожны год прыязджае дамоў... Дык жа ён студэнт, куды ён паедзе?» — падумалася потым, але скора ён адагнаў гэтую думку, яму здалося, што гэта ад крыўды на Толіка, ад зайздрасці да Варкі. «Падумаю, падумаю потым»,— як бы апраўдваючыся перад некім, казаў сам сабе.

— Я пайду ўжо,— сказаў ён устаючы.— Харошая ў цябе гарэлка...

— Не крыўдуй, Максімка, не крыўдуй. Пажывём — пабачым... Не крыўдуй...

— Хораша тут у цябе, не ішоў бы ў сваю хату... Пайду. Звечарэла ўжо... Здаецца, ужо і кароў прыгналі.

— Дам табе сыр з сабою,— устаючы з-за стала, замітусілася Варка.— У мяне яшчэ адзін ёсць... Вазьмі. Самому табе не зрабіць.

— Куды ж я дзену яго? Праз усю вёску несці?.. Другі, можа, калі раз.

— Я загарну табе, Максімка... Сценкаю пойдзеш.

Яна схадзіла ў сенцы, прынесла загорнуты ў чыстую полачку сыр. Ён, памуляўшыся, паадгаворваючыся, узяў. Варка выйшла за ім на ганак.

— Можа, яшчэ зайду шуляк у варотах перамяніць,— сказаў ён.— Нехта падчасаў, каб весніцы зачыняліся,— хіба гэта работа...

— А няўжо ж, Максімка, няўжо ж...

Ён выйшаў у агарод і пайшоў баразной па бульбоўніку, кіруючыся да сценкі. Ужо добра звечарэла. Лажылася раса, браўся на ўзмежках рэдзенькі туман, і, азірнуўшыся на вёску, ён убачыў на вуліцы цяпельцы: варылі бульбу. За сценкаю, у густым жыце, ужо ўсчала сваё «жаць-палоць» перапёлка. Ён ішоў, прыглядаючыся да ўсяго наўкол, услухоўваючыся.

Насоўвалася ноч, яна несла з сабой нейкую таямнічасць, хавала ў прыцемак зямлю, нібы хацела, каб чалавек, забыўшыся на гэту зямлю, паглядзеў на неба. Праразаліся, нясмела блішчалі першыя зоркі. І зноў, як удзень, калі прыехаў з лугу, на Максіма сыходзіў незразумелы, дзіўны настрой, падкрадваўся смутак, але быў ён нейкі лёгкі, не вярэдзіў болем душы. Максім думаў пра сына, невядома чаму яму прыйшло ў галаву, што вось ён тут ідзе, адзін сярод поля, а дома, можа, чакае яго сын: сядзіць на ганку, ціха, засяроджана курыць, а можа, хто пазнаў яго з вуліцы, па-

зваў, і яны цяпер стаяць ля варот і мірна гамоняць. Ён успомніў пра Варку, пра Толіка, падумаў, што, можа, ён сам вінаваты, што так доўга не едзе дадому сын. Навошта так зацята хаваў заўсёды ў сабе крыўду на яго, навошта знарок, злуючыся, прымушаў яго пеклавацца на рабоце — каб сын не хацеў памагчы бацьку, хіба прыязджаў бы ён дадому?

Ён глянуў на неба: яно было шырокае, ціхае, добрае, і зоркі, здавалася, падміргвалі яму, Максіму, бачылі яго і гаварылі з ім. Хвалюючыся, падышоў ён да сваёй хаты, асцярожна зайшоў у двор: на ганку каля дзвярэй было цёмна. Ён намацаў рукою вушак, клямку — на прабоі вісеў замок. «Не прыехаў,— падумаў ён,— не прыехаў». Карова, мусіць, пачуўшы яго, зарыкала ля варот на вуліцы. Ён упусціў яе ў двор, сеў на ганак і закурыў. Неспадзявана для самога сябе пачаў думаць, што сын, мусіць, прыедзе заўтра: ён прыгоніць надвячоркам з пашы кароў, адчыніць весніцы, а на двары будзе стаяць сын...

Адамкнуў дзверы, узяў у сенцах даёнку і пайшоў да каровы...

Вячэраў ён сырадоем і недаедзеным у абед зачарсцвелым акрайчыкам хлеба. Трэба было рана ўставаць заўтра, і ён адразу лёг. Заснуў скора і спаў спакойна, уціхамірана: яму снілася, што прыехаў дадому сын.

1964

НА ЧАЦВЁРТЫМ ГОДЗЕ ВАЙНЫ

И капля вод полна трагедий
И неизбежности полна.

К. Случэўскі

Было гэта на чацвёртым годзе вайны.

Бабуля — высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам — адсцябала матузамі малога ўнука за тое, што паабшчыпаў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага, спечанага з бульбы і ячменных шароек хлеба.

Малы не заплакаў, толькі не сваім голасам войкнуў, калі, уцякаючы ад матузоў, хацеў падшыцца пад

ложак,— на хаду перадумаў нечага, разгубіўся, і тут яго дагнала, апошні раз балюча сцебанула старая.

Маці таўкла ў хаце проса; яна ўсё бачыла, і калі сын, разгубіўшыся, зыркаў па хаце здзічэлымі, спалоханымі вачамі, ёй здалося, што ён глядзіць на яе, моліць спагады, літасці, моліць заступіцца, і ў яе тады перавярнулася ўсё нутро, і яна падумала, што і сама часам гэтак жа сцябала малога, і цяпер пашкадавала, што рабіла гэтак.

Сын жа кінуўся ад ложка да дзвярэй, з усяе сілы ціснуў рукамі на клямку, біў у дзверы нагамі: маці бачыла, як дрыжаў у яго збялелы падбародак, як захліпваўся сын ад першых крыўдлівых і роспачных слёз.

Моцна заплакаў ён ужо на двары.

І ёй тады, калі яна пачула гэты ягоны плач, чамусьці стала лягчэй, нібыта яна сама заплакала і ёй прыйшла са слязьмі палёгка.

Яна глянула на хату, на старую, што нечага мітусілася ў хаце, і больш за ўсё яе ўразіў свякроўчын твар — спустошаны і нейкі пакутліва нямы. І яна зразумела, што старая цяпер таксама шкадуе малога і што мітусіцца яна, можа, таму, што не ведае, куды ёй цяпер дзець матузы і што рабіць са сваімі рукамі.

І яна, маці, не стала глядзець на старую і знарок моцна загрукала таўкачом у ступе.

А старой і сапраўды было не па сабе. Яна не хацела, каб гэта заўважыла нявестка, і хутчэй пайшла з хаты.

Худы, як дошка, парсюк, што нудзіўся ля ганка, адразу ж кінуўся да яе на двары: яна крыкнула на яго, адпіхнула нагой — парсюк злосліва рохкнуў, патрухаў назад да ганка і, нудзячыся, пачаў торкаць лычом у сенечныя дзверы. «І гэты хоча есці,— падумала яна,— а дзе ж ты на ўсіх возьмеш?.. Няхай яно ўсё спрахне...» Яна злавалася і, зазлаваўшы, адчула раптам, што ёй няма чаго рабіць на двары. Але не хацелася вяртацца ў хату, і яна пайшла ў агарод.

Была вясна, было пуставата на градах, яшчэ ні разу не полатых, падзеленых роўнымі, яшчэ не вытаптанымі разорамі. Старая глянула на свежараскапаную прызбу, убачыла, што трухлее ў хаты ніжні вянец, падышла бліжэй і, нагнуўшыся, пачала выбіраць з зямлі падсохлы зверху руды баравы мох, якім

уцяплілі на зіму прызбу; выбірала мох і кідала яго ў баразну, бліжэй да плота, дзе кусціліся ўжо кіслец, пырнік, серабрыста-кволая лебяда, дзе ляжала, зламаўшыся, апаўшы на зямлю, нейкае бадыллё ад мінулага лета. Потым яна глядзела, як узяліся расці памідоры, капусны качан, высаджаны на насенне, думала, ці добры будзе гэты год. Стары Цімох, у якога на дубе буслянка, казаў, што, мусіць, будзе добры. Ён шмат чаго ведае, гэты Цімох: яшчэ на пачатку вайны казаў, што немец не набудзецца ў нас, бо так і ў Бібліі напісана, і во спраўдзілася ж, глядзі,— гоняць і гоняць немца нашы.

І рабіла, і думала яна цяпер спакойна, але спакой гэты быў несапраўдны нейкі, бо ведала, адчувала, што трывога жыве ў ёй, як у грудзях застарэлы кашаль, і страшнай здавалася ёй цяперашняя няўпэўненасць у сваім раней такім бясспрэчным праве караць.

Яна зноў выйшла на двор, пратупала ў пуню і па драбіне ўзлезла на вышкі. Было задушліва, цёмна пасля двара: поўзала па кутах на каленях, збірала ў прыпол курыныя яйкі. Ужо злазячы долу, абступілася на драбіне, збаялася, што можа разбіць яйкі, разгубілася і ўпала. Ударылася яна не вельмі балюча, балазе было нізка, цэлыя асталіся і яйкі, высыпаўшыся на прыцярушаны сенам сухі гной, але ёй чамусьці стала так крыўдна, так скамянела ў яе нутро, што яна не ўставала, не падбірала яек, сядзела і няўцямна глядзела перад сабой.

Пасля ўжо яна пачула, як на двары клікала малога нявестка,— спачатку строга, па імені, а потым няўпэўнена і спалохана:

— Сынок, дзе ты? Ідзі ў хату, не бойся!..

Малы не адгукаўся,— мусіць, некуды збег, і старая, толькі цяпер зразумеўшы гэта, падумала, што, шукаючы малога, можа зайсці ў пуню нявестка, хацела ўстаць, але ёй балюча кальнула ў бок: яна заплюшчыла вочы, і нешта шырокае, імклівае шуганула ёй у вушы, пераняло дыханне. Яна не варушылася, і шум у галаве аціх, як бы прыйшлі аднекуль і бліжэй пасунуліся да яе сцены пуні, і яна, агледзеўшыся, убачыла, як ярка білася святло ў дзіравай страсе, пачула, як шчабяталі на двары ластаўкі. Ляпнулі сенечныя дзверы — пайшла ў хату нявестка, і старая схамянулася, перад вачамі паўстаў малы, тое, як кідаўся ён

па хаце, бездапаможна ўгнуўшы ў плечы шэрую, стрыжаную пад нажніцы галаву. Яна бачыла ўсё гэта так выразна, і нічога ўжо на свеце не існавала для яе, акрамя гэтай безабароннай, беднай, няўмела пастрыжанай галавы. І яна шкадавала ўнука, шкадавала, што некалі, даўно, адсцябала гэтак жа матузамі сына, забітага цяпер на вайне: збіраючыся ў поле, затлумілася, забыла ў пограбе ключ, а потым, не могучы адамкнуць сенцы, вінавацiла ва ўсім сына — ён не прызнаваўся, і яна адлупцавала яго. Давялося вымаць прабой, каб улезці ў хату, а праз дзень, пайшоўшы па нешта ў пограб, яна знайшла ключ, і вось цяпер ёй балюча было ад таго, што ніколі ўжо не скажа сыну, што нізавошта пабіла яго тады,— і ёй ужо здавалася, што ў сынавай смерці вінаватая і яна і што няўцешная і горкая будзе цяпер яе старасць. І цяпер ужо ёй хацелася, каб хто-небудзь пашкадаваў яе, каб хапілася, стала яе шукаць нявестка.

А нявестка тым часам была ў хаце, малола ячмень самаробнымі дубовымі жорнамі. Ёй хацелася забыцца ў рабоце, і яна, не разгінаючыся, круціла цяжкі скрыгатлівы круг, аж пакуль не заўважыла, што круціць занадта хутка — з латачка цякла не мука, а разам з шаройкамі пырскалі, шырока лажыліся на разасланую на падлозе хустку шэрыя крупы. Тады яна паспакайнела, стала менш засыпаць ячменю ў ступку і стала круціць жорны раўней.

Пайшла яна з двара, бо ведала: сын схаваўся недзе паблізу, але цяпер, калі яна паклікала яго, не выйдзе — выйдзе крыху пазней. Яна баялася толькі, каб ён, знясілены крыўдай і плачам, не сціпшыўся дзе, не заснуў, і падумала, што скора трэба зноў выйсці, паклікаць яго. Тое, што на двары не было старой, таксама непакоіла яе. «Ат, старое, што малое»,— раззлаваўшыся, падумала яна пасля і пайшла ў хату.

Скрыгаталі, аднастайна шоргалі жорны, і пад гэты шоргат прыходзілі да яе невясёлыя думкі — пра забітага мужа, з якім жыла ўсяго тры гады, пра сына, які не помніць бацькі: бацьку забралі на кадравую службу перад самай вайной, і хто тады ведаў, што сюды прыйдуць немцы, што столькі ў гэтай калатнечы паляжа мужчын. Калі ў фінскую вайну забіла Круцікавага Цімоха, бедавала ўся вёска, а цяпер у кожнай хаце хапае свайго гора. А можа, і добра, што

сын не помніць бацьку: так будзе лепш яму, але ж затое колькі ёй трэба трывання, жорсткасці да сябе і да людзей, каб паставіць сябе ў жыцці, каб не даць у крыўду сябе і сына. Было б лягчэй, каб не быў такі свёкар — надта памяркоўны ды паблажлівы да людзей. А так — мужчына ў доме, але не гаспадар. Як распускалі калгас, бралі людзі сабе і кароў, і коней, і панарад, і хто парстчэйшы быў — цягнуў і вёў у двор лепшае.

Свёкар толькі і паспеў узяць, што каня, ды і той — конь не конь, Абарванчык, празваны так за тое, што вырвалі ваўкі некалі паўсцягна. А вось сусед, гугнявы Зміцер, дык гэты — зух! Як адступалі нашы, прыйшоў дамоў; адседжваўся, пакуль не паставілі старастам, а як нявыкрутка выйшла немцам — падаўся ў партызаны. Кажа цяпер, што старастам па заданню быў, але дзе ж ты праверыш... Няхай бы хутчэй скончылася вайна, тады б усё стала відней...

Яна кінула круціць жорны, выйшла зноў паклікаць малога. Але малы, як і першы раз, не адгукаўся. «Ну, пачакай,— падумала яна,— не абыдзецца табе добра, калі, вымерхаўшыся, прыджгаеш дамоў». Успомніла пра старую і ціха, нясмела паклікала:

— Мама! Ці тут ты? Мама!..

І, счакаўшы, паклікала яшчэ.

Рыпнулі вароты, і, сагнуўшыся, выйшла з пуні старая, моўчкі, па-нядобраму гледзячы на нявестку, патупала да сянец. Ля ганка спынілася, паправіла на галаве хустку і буркнула нешта пра яйкі.

«Чаго гэта яна? — падумала нявестка.— І ёй, мусіць, моташна, і маломy дрэнна. А мне хіба лепш?»

Яна выйшла за вароты і стала ўзірацца ў вуліцу, выглядаць малога. Але яго нідзе не было.

...Ён, стаіўшыся, сядзеў у алешніку, што атуляў лажок каля вуліцы, чуў, як клікала яго маці, але не выходзіў: нейкая помслівая асалода трымала яго ў кустах. Ён даўно ўжо не плакаў і за гэты час, як збег з двара, колькі разоў пачынаў думаць пра свае ўцёкі з вёскі, надоўга, назусім,— толькі вось каб разжыцца хлеба і выкрасці суконную світку, а там — гайда ў мястэчка, і няхай тады шукаюць, няхай паплачуць і бабуля, і матка.

Яшчэ вось дзеда шкада, шкада, што не давядзецца пабіцца з «паліцаем», Зміцеравым Васілём.

Апошні раз дык адолеў яго, нават рассек гэтаму смаўжу губу, але потым, калі прыбегла «паліцаева» матка і стала крычаць і лаяцца, па-дурному расплакаўся, а гэты «паліцай», мусіць, радаваўся, бо падбрэхваў матцы і не ішоў з вуліцы. Ну, няхай, будзе яшчэ яму. Сёння вось пераначуе ў кустах, а заўтра падпільнуе «паліцая» і адплоціць за ўсё.

Ён адчуў сябе моцным і адзінокім, і гэта было прыемна яму. Успомніў, што сёння раніцай не ўзяў яго дзед у лес, і яму цяпер зусім не шкада было сыходзіць ■ дому, і ён падумаў, што трэба пакуль неяк ладкавацца нанач — стаў ламаць альховае голле і рабіць будан.

Тут, у будане, ён і заснуў — не чуў, як яго знайшла, перанесла ў хату маці. Прачнуўся ён ужо, калі яго клалі на чыстай палавіне хаты ў ложак і ўкрывалі посцілкай. Прачнуўся і не адразу сцяміў, што з ім, але першым ягоным адчуваннем быў страх. Ён не бачыў яшчэ ні бабулі, ні маткі, адчуваў толькі, што яны тут, ён думаў страхам і неспадзявана для сябе закрычаў: «Дзед, дзед!» — і заплакаў. І адразу ж цішыня ў хаце сказала яму, што дзеда няма, што ніхто не заступіцца, калі здарыцца тое, чаго ён так баяўся.

— Сынок, сынок, чаго ты? Не бойся,— спалохана гаварыла над ім маці і накрывала яго, мацала рукою ягоны лоб. Была нястрашная, вялікая і добрая гэта рука, і ён заплюшчыў вочы і, сцішыўшыся, так ляжаў — паспакайнелы і бяздумны. Яму стала невыказна лёгка, ён не бачыў, як глядзела на яго маці, ён толькі здзівіўся, калі адчуў, як закалацілася яе цела, як яна прыпала да яго, і тады нешта страшна і моцна тузанулася ў яе грудзях, дрыготка і моцна забілася ў горле.

— А сыночак мой, а сірацінечка мая,— жалілася маці,— ніхто цябе не пашкадуе, ніхто цябе не абароніць. А ці ж ты вінаваты, што бацька недзе злажыў галаву, што ніхто не ведае, дзе яго магілка... І гэты Зміцераў смоўж цябе б'е — чаго ж ты, сыночак, яму паддаўся?

Яна забылася ўжо, што нядаўна думала пра жорсткасць да сябе і да людзей, адчувала, што гэта нядобра — так гаварыць над сынам і плакаць, але не магла стрымаць сябе і душылася плачам.

— А сыночак мой, а сіраціна ты мая...

І яна не бачыла, як да адчыненых дзвярэй, што вялі на чыстую палавіну хаты, падышла старая, ціха стаяла там, горбячы спіну — яна схамянулася, калі пачула яе ціхі, трывожліва выразны голас:

— Марусь, а Марусь?! Ідзі-тка сюды...

Яна адхіснулася ад малога, устала, паспешліва выціраючы слёзы, і пайшла да дзвярэй, не разумеючы, чаго хоча ад яе старая, але наперад абыякавая да ўсяго. І зноў каторы ўжо раз уразіў яе свякроўчын твар, пакутліва невідушчыя, стоеныя вочы. Яна не паспела яшчэ што-небудзь падумаць, як старая, здалося, пахіснулася перад ёй, сашчапіла ля твару рукі, і толькі тады яна зразумела: гора сваё не выплакаць ёй адной, старая плача пра тое, пра што плача і яна.

— Марусечка мая мілая,— не гаварыла, а шаптала, нібы дапытвалася ў некага, старая,— што ж нам цяпер рабіць без нашага Андрэйкі? За якія ж грахі асіраціў нас бог?

— Не трэба, мама, не трэба... Напалохаем малога.

Яны стаялі, як ніколі блізкія адна адной, падтрымлівалі адна адну за плечы і ціха плакалі — ужо не столькі ад гора, колькі ад гэтай роднасці адна адной.

А малы, адчуўшы нешта нядобрае, калі пайшла ад яго маці, саскочыў з ложка і цяпер стаяў у дзвярах і спалохана, разгублена глядзеў на іх. Многа разоў ён плакаў сам і часцей ад крыўды на дарослых, але гэта было не так і страшна, бо тыя ж дарослыя пасля ўшчувалі яго і ўсё даравалі яму. І цяпер, калі перад ім плакалі бабуля і маці, яму здалося, што парушылася, разышлося, як вада, нешта зразумелае, звыклае, і яму чамусьці падумалася, што гэта ён вінаваты ва ўсім, і ўпершыню, можа, не столькі зразумеў, колькі адчуў ён, якая хісткая мяжа аддзяляе яго ад дарослых і што, зразумеўшы гэта, трэба браць на свае плечы недзіцячы цяжар.

І ён тады кінуўся да бабулі і маці, угаворваў іх, ушчуваў:

— Не плачце!.. Я не буду чапаць больш хлеба... Не плачце!.. Я не баюся Зміцеравага «паліцая»... Мама, гэта я так тады плакаў, а ты не плач...

...Было гэта на чацвёртым годзе вайны.

1964

ШТО БУДЗЕ СНІЦЦА

Аднойчы ноччу яму прыснілася *яна.*

Прачнуўшыся, ён ніяк не мог даўмецца, адкуль гэты сон: пра яе ніколі, здаецца, не думаў, ды, папраўдзе, і думаць не было чаго. Была некалі, больш за дзесяць гадоў, кароткая дарожная сустрэча, і ён ужо не помніў цяпер яе імя, а можа, нават і тады не ведаў яго. Гэткі нехлямяжы, сарамлівы быў тады ён: ведама, вясковы хлопец, што першы раз выбраўся ў далёкі свет са свайго глухога селішча. Скончыў дзесяцігодку, завербаваўся з двума старэйшымі вясковымі хлопцамі на лесараспрацоўкі — лічы, было яму тады васемнаццаць гадоў.

Ён, яшчэ ва ўладзе сну, цяпер успамінаў усё гэта: сваю сарамяжлівасць, штодзённыя, штохвілінныя пакуты праз яе, паспешлівыя, несправядлівыя думкі пра людзей, смешную сваю задзірлівасць, прагу цвёрдых і мужных учынкаў, адзінокай рамантыкі і — салодкае, трывожнае заміранне сэрца перад нязведаным жыццём. Ах, маладосць, маладосць, наіўная, смешная, незваротная маладосць!

Устаў з ложка і, стараючыся ступаць як мага цішэй, каб не разбудзіць дачку і жонку, пайшоў у калідор, але, як на тое, зачапіў нагою нейкую тумбачку і, сцяўшыся, зажмурыўшы вочы, колькі часу стаяў у тугой, напятай, бы крык, цішыні, што адразу запанавала ў пакоі.

Ні жонка, ні дачка не прачнуліся, і ён супакоіўся: забраў у калідоры з кішэні паліто цыгарэты, прадыбаў на кухню і сеў у непрыемна халоднае пасля сну крэсла. Падабраў пад сябе ногі, закурыў, і яму такім смачным, казытліва-вострым здаўся цыгарэтны дым, і ён ужо з нейкай радасцю прадчуваў, як неўзабаве ў яго лёгка закружыцца галава,— як заўсёды, калі доўга не курыў.

За акном стоена і ціха ўладарыла мутнаватая зімовая ноч, і ён нечакана падумаў, што скора, мусіць, шэсць гадзін, час, у які заўсёды ўставаў яшчэ тры гады назад, калі хадзіў на завод і вучыўся ў інстытуце, і цяпер, успомніўшы пра гэта, са смуткам пашкадаваў, што мінулася тая пара, што цяпер, ходзячы ў канструктарскае бюро, ён устае пазней і не бачыць раннішняга людскога натоўпу ля трамвайных прыпынкаў, ля

заводскіх варот, не чуе, як сіплымі пасля сну галасамі гавораць людзі, не бачыць, як раздзімае ў прыцемку вецер зыркія цыгаркі, не адчувае той асаблівай еднасці з горадам, з людзьмі, якую заўсёды адчуваў у рабочым натоўпе.

Але ж чаму прысніўся яму гэты сон?

І думкі вярнуліся да той пары, калі яму было васемнаццаць гадоў.

Тады ён лічыў сябе ўжо дарослым: не саромеўся курыць пры бацьку, пачаў хадзіць на вечарынкі, дзе, седзячы побач з гарманістам і па-заліхвацку б'ючы ў бубен, ужо мог скамандаваць у круг, заслужана чакаючы вясёлага смеху:

— Вальс упрыціpачку!

Ён ужо заглядваўся на дзяўчат: калі канчаўся танец, бег у сенцы і, стаўшы пры дзвярах разам з другімі хлопцамі, крычаў дзяўчатам задзірыстыя, смешныя, як яму здавалася, словы, і яму было прыемна, калі дзяўчаты штурхалі яго, адбіваліся ад яго рукамі і прытворна вішчалі.

Прыязджалі з шахтаў на пабыўку хлопцы, па-гарадскому апранутыя, фанабэрыстыя, і ён зайздросціў ім, таму жыццю, якое пакідалі яны, прыязджаючы ў вёску, але да якога заўсёды маглі вярнуцца. Асабліва падабаўся яму адзін — Цімошыхін Лёнька, смуглявы, гладкі тварам, з доўгімі валасамі, у якіх заўсёды тырчаў адабраны ў якой-небудзь дзяўчыны грабянец. Танцаваў ён неяк абыякава, ленавата, жмурачы адно вока і не гледзячы на тую, чыя рука ляжала ў яго на плячы. Ён частаваў маладзейшых хлопцаў папяросамі, з ленаватым, самаўпэўненым умельствам цыркаў слінай скрозь зубы і спяваў сам сабе нейкую трохі жаласлівую, трохі заліхвацкую песню:

Не плачь, не плачь ты, мать моя родная,
Что без путя скитается твой сын...

«А ці ж даўно было гэта? — думаў цяпер ён.— Дзесяць — дванаццаць год — хіба гэта многа? Але ж здаецца, што многа. За гэты час скончыў інстытут, жаніўся...»

Яму захацелася піць: устаў і напіўся, не шукаючы шклянкі, проста з-пад крана. Падумаў, што яго лаяла б за гэта, каб убачыла, жонка. Яна ўжо колькі адвучвала яго ад гэтай дрэннай, як яна казала, звыч-

кі, такой жа дрэннай, як і тая, калі ён, напіўшыся чаю, піў пасля сырую ваду. Наогул дрэнных звычак у яго было многа, і жонка, настойліва, не без поспеху выкараняючы іх, павінна была вось-вось святкаваць перамогу.

Ён закруціў кран і паморшчыўся: вада была цеплаватая — трэба было спусціць яе і дачакацца халоднай, але ён баяўся нарабіць шуму і, падумаўшы пра гэтую сваю боязь, раззлаваўся на сябе, на тое, што, ідучы сюды, на кухню, зачапіў нагою тумбачку. А ўсё праз жонку, бо накупляла, нацягала ў кватэру розных падставак, тумбачак, сервантаў і падсервантнікаў, вазачак, разетак і гладышоў — няма дзе павярнуцца, не тое што ступіць. Ён успомніў, як збіраў грошы на матацыкл, як дамаўляліся з жонкай, што, калі купяць яго, адвязуць дачку летам у вёску да ягоных бацькоў, а самі паедуць назад якім-небудзь цікавым маршрутам: будуць ехаць не больш за пяцьдзесят кіламетраў у дзень, начаваць у вясковых хатах і ў ціхіх раённых гасцініцах, у капе сена і ў палатцы на беразе якой-небудзь невядомай рачулкі. Так думалася сутады, а потым жонка нагледзела недзе абсалютна сучасную мэблю, стала ўгаворваць яго купіць яе, бо, калі ўпусціш такі выпадак, будзеш пасля кусаць сабе локці, і ён нарэшце згадзіўся,— і ну яе к чорту цяпер усю гэту мэблю: плакалі ягоныя грошыкі, а разам з імі ціхія раённыя гасцініцы і начлегі ў капе сена і ў палатцы...

«Дзесяць год,— думаў ён,— малы і вялікі тэрмін».

Дзесяць год назад, упершыню выехаўшы з вёскі, ён убачыў яе. Як ён цяпер разумеў, нічога асаблівага не было ў ёй: звычайнае зялёнае дзяўчо з наіўна вытыркнутым тонкім носікам, з такімі ж наіўна вытыркнутымі прыпухлымі губамі. Праўда, была нейкая дзіўная мяккасць у паглядзе маладых круглых вачэй. Але як жа ён саромеўся яе, якім цельпукаватым, грубым адчуваў сябе побач з ёй! Яна, мусіць, была з горада, трохі паабілася ўжо каля людзей: і гаварыла, і хадзіла, і смяялася ўпэўнена, лёгка, нібы на цэлым свеце была толькі яна адна і нібы ніхто на гэтым цэлым свеце не мог за што-небудзь упікнуць яе.

Ехалі яны ў адным купэ: ён заняў верхнюю паліцу, паставіўшы туды свой чамадан, яна была на ніжняй, і, калі прыйшла пара спаць, ён саромеўся лезці

пры ёй у свой высокі бярлог. Яшчэ ён думаў, што трэба было б зняць з паліцы, паставіць куды-небудзь чамадан, каб не замінаў спаць, але ведаў, што не зробіць гэтага, і нічога не рабіў, пакуль яна сама не прымусіла яго дастаць чамадан і паставіць побач са сваім у скрыню: ніжнюю паліцу, сказала яна, можна падняць, во, глядзіце, усё робіцца проста.

Першы ён баяўся загаворваць з ёй, яго злавала, што тыя, хто ехаў з імі, не заўважалі, не разумелі, што яна была яна,— смела загаворвалі з ёй, жартавалі, а яна,— таксама знайшла каму,— ахвотна адказвала ім — то сур'ёзна, то жартам. Назаўтра раніцай, калі спыніўся поезд, яны бегалі перакусіць у станцыйны буфет, і ён зноў саромеўся яе, саромеўся есці пры ёй — і так было ўсю дарогу, пакуль ехалі ў вялікі паўночны горад. У тым горадзе іх пасадзілі на цеплаходзік і павезлі па рацэ, і ён амаль усю ноч не спаў, думаў, як бы гэта хутчэй зарабіць вялікія грошы, купіць сабе касцюм, паліто, уставіць залаты зуб, як у Цімошыхінага Лёнькі, і, можа, ажаніцца з ёй. А раніцай, калі іх высаджвалі на бераг, ён дарэмна шукаў яе ў натоўпе: яна са сваёй групай, мусіць, сышла на бераг раней...

За акном стоена і ціха ўладарыла зімовая ноч, а ён сядзеў упоцемках, курыў, думаў: што сказаў бы ён, каб раптам на кухню прыйшла жонка, спытала, чаго сядзіць ён тут, успароўшыся сярод ночы?..

1964

РОЗДУМ

> Зязюлямі гадоў пракукаваны,
> бор галавы маёй...
>
> Р. Барадулін

Трывожна і боязна бывае на душы — чамусьці ўсё часцей успамінаецца маленства. Чаму, навошта? І чаму іменна цяпер? І так хораша, жыва паўстаюць у памяці ранейшыя радасць і смутак, і так шкада, як падумаеш, што не вернеш ужо назад ні такой, як тады, радасці, ні такога смутку. А яны ж так

трэба цяпер мне: навошта мне, каб радасць, пасталеўшы, стала ціхамірнасцю, а смутак — журбой?

І так трывожна і боязна бывае на душы — няўжо так пачынаецца сталасць?

Было ж і раней у мяне маленства, і раней успамінаў аб ім, але ж мне было так добра з ім, як добра рэчцы ў берагах, а дрэвам у голлі. Дык навошта ж рэчка выходзіць з берагоў і пасля па іх сумуе? Навошта дрэва высока ўгору выносіць свае шаты, навошта сумуе па грыбных зацішках роснай зямлі?

Можа, так і са мной: і шкада, шкада ўжо маленства, і трывожна, боязна за маладую сталасць.

1964

І ЗНОЎ, ЗНОЎ ГОРАД

Травяніста-шорсткае, настылае ад лістападаўскіх нізкіх вятроў поле-аэрадром. Над ім шызае, як прамерзлая дарога, халоднае неба. Пахмурна. Дванаццаць гадзін дня. Самалёт адлятае ў трынаццаць дзесяць...

Ён дарэмна спяшаўся і трывожыўся: доктар, як і абяцаў, пазваніў ужо з мястэчка ў касу і заказаў сабе і яму білеты. Толькі самалёта яшчэ не было: спазняўся. Ды і доктар на бальнічнай машыне чамусьці не ехаў.

Доктара гэтага ён да сённяшняга дня наогул не ведаў.

Ён прагаласаваў на дарозе, аддыбаўшы кіламетраў дзесяць, грузавіку з будкай. Спыніцца — не спыніцца, яму было ўсё адно: да мястэчка заставалася кіламетры з чатыры. Машына спынілася. Шчуплаватае дзяўчо, што сядзела побач з шафёрам, паказала рукой на кузаў. Нехта адшчапіў дзверцы: ён, не прыглядаючыся, кінуў у будку старую сваю спартыўную сумку, напакаваную маткай нечым цяжкім,— ён здагадваўся, салам,— кульнуўся ў будку сам і прымасціўся там на мулкім аполку. Умомант зашчапілі дзверцы, паехалі. Ён не паспеў нават разгледзець тых, што былі ў будцы, затое нейкая жанчына пазнала яго, нібыта па тым, што ён «увесь у бацьку», і ўсё дзівілася з гэтага, і ўсё паўтарала сваё «ўвесь у бацьку-

ку», а яму было няёмка, сорамна, што жанчыны зусім не ведаў, здагадваўся толькі, што яна, мабыць, з блізкай ад ягонай вёскі. Загаварыў мужчына, які таксама нібыта ведаў ягонага бацьку, маці, нават малую сястру,— гэта і быў доктар.

Добра разгледзеў яго ён ужо ў мястэчку, калі машына спынілася ля раённай бальніцы. Доктар быў бадай аднагодак яму, чарнявы, галавасты, худы, у акулярах з шырокімі строгімі дужкамі, пацепваў высокімі плячмі, штораз папраўляў на носе акуляры і, жмурачыся, расціраў далонню падбародак.

— На самалёт? Я закажу білеты,— проста сказаў доктар.— Шыбека, так? А зваць як?

— Пятро.

— Мне таксама ў горад. Хочаш, пачакай мяне. Я зайду ў бальніцу, а потым нас падкінуць на машыне.

— Не, я лепш пайду.

Добра, што доктар не стаў упрошваць. Было горка, пагана ў роце: ад «Паміру» ледзь не блажыла. Яму мулялі вочы, а да шчок, адчуваў, часамі востра прылівала нездаровая гарачыня. Ад грошай на самалёт павінен астацца рубель з нечым. З іх трэба пакінуць на транспарт у горадзе і яшчэ капеек дваццаць на цыгарэты. Ён не хацеў прызнацца сабе, што выбраўся ў гэтую дарогу дарэмна.

У сталоўцы ён выпіў шклянку чырвонага віна і закусіў халаднавата-цвёрдымі біткамі. Гарнір быў вермішэлевы — такі ён не любіў.

Дарогу на аэрадром яму паказаў стрэчны дзядок. Пятро доўга ішоў раскоўзанай вуліцай паўз абшытыя шалёўкай прысадзістыя дамы — амаль кожны з блакітнымі аканіцамі, мінуў мост цераз незамерзлую рэчку з імклівай рудой вадой, што бубнела, булькала ля берага пад карункавай стрэшкай слаістага лёду. Пачаліся агароды, а потым неяк дзіўна ўразілі звезеныя ў адно месца і нечаканыя тут, ля мястэчка, стагі сена. Нарэшце злева, наводдаль ад дарогі, згледзеў ён драўляную будыніну, ля якой не было ні кала ні двара, толькі на высокай жэрдцы шкуматаў вецер паласатую «кішку». Пятро выправіўся туды.

У аэравакзале моцна і суха пахла застарэлым махорачным дымам, валяліся недакуркі ля грубкі. Пры акне стаялі пафарбаваныя ў белы колер вагі, сядзела

на лаве і трымала кніжку перад вачмі шыракаватая ў стане, але яшчэ маладжавая тварам жанчына — няйначай, вясковая настаўніца, а побач з ёй, прыгорбіўшыся, не міргаючы вачмі, пакутліва-мякка ўсміхаўся нейкім сваім думкам даўганосы дзядзька ў неглыбокай, на самай макаўцы, зімовай шапцы. І было нешта такое разгубленае і разам з тым наіўна пэўнае ў гэтай усмешцы, што Пятро спагадліва-шчодра адразу пагарнуўся думкай да яе і падзівіўся з сябе, з гэтай нечаканай вострай сваёй спагады, здагадаўся, што за колькі дзён у вёсцы, у бацькоў, ён стаміўся, знерваваўся, бо адчуў, як невядома чаго навярнуліся на вочы слёзы. Сеў ля дзядзькі на лаве, прыхінуўшыся плячмі да перагародкі, і стараўся ні пра што не думаць. За перагародкай нешта сіпела, патрэсквала, узрывалася шорганнем і піскам, а потым наплываў разгоніста моцны, але не вельмі выразны голас. Там, за перагародкай, была яшчэ і апаратарская рубка.

Пятро дастаў цыгарэту і доўга лапаў сябе па кішэнях, шукаючы і не знаходзячы запалкі. Нешта прымусіла яго павярнуць галаву: яму ў твар спакойна, не міргаючы, глянулі трошкі выцвілыя, усмешліва мяккія знаёмыя вочы. Ён не вытрываў і таксама ўсміхнуўся ім, неспадзявана спакойна і добразычліва, і толькі тады заўважыў, што дзядзька трымае ў руках карабок.

— Цыгарэту даць? — спытаў, беручы запалкі, Пятро.

— Накурыўся, аж язык у роце зашэрх,— ціха, нібы хвалячыся, сказаў дзядзька, але тут жа адвярнуўся і зноў сцішыўся, можа, забыўся на Пятра. Пятро ўсміхнуўся, прыкурыў і не аддаў карабок, а палажыў асцярожна на лаву. «Шанцуе мне сёння на добрых людзей»,— падумаў ён.

Час ішоў, а доктар усё не ехаў. Часта званіў тэлефон, і праз акенца ў перагародцы было відаць, як высокі, танканосы, з запалымі шчокамі мужчына здымаў трубку, цярпліва і доўга тлумачыў, што самалёт позніцца, яшчэ нават не вылецеў з абласнога цэнтра. Лажыў трубку і садзіўся за стол, застаўлены апаратурай, круціў, пераключаў там нешта,— зноў пачынала шчоўкаць, трашчаць, як у прыёмніку перад навальніцай; разбіваліся, сутыкаючыся, галасы і гукі, потым цішэла, і мужчына ў рубцы аднастайна гаварыў:

— Я Цэнтр-77, Цэнтр-77. Прыём, прыём! — І пад канец гулліва-раскаціста закругляў голас, і выходзіла неяк так:

— Пры-йо-о-омм!

Ніхто не адказваў, і мужчына пачынаў зноў.

Наогул, было б добра, каб самалёт сёння зусім не прыляцеў. Не хацелася думаць пра горад, пра тое, як, прыехаўшы, трэба будзе прасіцца ў хлопцаў, каб пераначаваць у яшчэ нядаўна сваім інтэрнаце, думаць, у каго б пазычыць грошай: два тыдні назад, пасварыўшыся з начальствам, ён звольніўся з работы, не стаў шукаць новай і паехаў да бацькоў у вёску, дзе ў яго, напэўна, будзе многа часу, каб падумаць, адпачыць, а пасля, можа, уладкавацца на работу ў калгасе ці ў мястэчку — на які-небудзь гароднінасушыльны заводзік. Цяпер ён не ведаў, чаму здарылася так, што зноў вяртаўся ў горад.

Было ўжо чатырнаццаць гадзін, але людзей у аэравакзале не большала. Гэтак жа часта, як і раней, званіў тэлефон. Жанчына ўсё чытала кніжку, дзядзька маўчаў, а Пятро разглядваў пакойчык: пабеленыя сцены з аэрафлотаўскімі плакатамі, абклееную шпалерамі перагародку, фанерныя дзверы ў нейкі другі пакойчык, адкуль чуліся калі-нікалі дзіцячы смех, плач, грукат. Дзверы адчыняліся, і выбягала на парог стрыжаная дзяўчынка ў выцвілым доўгім плацці, у валёнках — куеўдзіла ў руках самаробную лялькую — палена, абкручанае хусткай. Праз хвіліну паказваўся рыжы, таксама стрыжаны хлапчук, піхаў дзяўчынку ў плечы і зачыняўся ў пакоі. Дзяўчынка торгала дзверы, але адчыніць не магла: хлапчук не пускаў. Усчынаўся плач, выходзіў з-за перагародкі высокі танканосы мужчына ў форменнай фуражцы і моўчкі стукаў у дзверы: за імі адразу ж рабілася ціха. Дзяўчынка ішла ў пакой, а мужчына гэтак жа моўчкі — за перагародку.

Цікава, вылецеў ужо самалёт ці не? Але навошта яму ведаць гэта, хіба гэта можа перамяніць што-небудзь? Лепш было б проста аддаць білет, плюнуць на ўсё і падыбаць дадому. Дома можна сказаць, што рэйс адмянілі, ды ці мала што можна сказаць.

Ах, як было б добра, каб не прыляцеў самалёт!

А потым нешта здарылася з ім, Пятром, а можа, і з часам — час спыніўся, адно было ўладаранне ці-

шыні, гукаў, і ўсё ў пакоі і за акном зажыло ненатужным адчуваннем нечага таямнічага, таго, што ніколі не здзейсніцца вось цяпер, адразу, і чаму не будзе канца і сёння і, напэўна, заўтра — і ад гэтага не было страшна, а толькі трошачкі дзіўна, што па-за ім, Пятром, па-за ціхманым дзядзькам, што сядзеў побач, па-за цёткай з кніжкай, мужчынам за перагародкай існавала нешта, што чуйна значылася ва ўсмешцы, слове, маўчанні рук і вачэй, але чаму ніколі не выказацца цалкам у адным кароткім імгненні ці нават чалавечым жыцці. І ўжо не хацелася думаць пра самалёт: якое гэта мела значэнне, прыляціць ён ці не прыляціць?

Мужчына за перагародкай цяпер ужо, як і цётка, чытаў — і, мусіць, так трэба было, каб чытаў, і калі адчыніліся дзверы знадворку і ўвайшоў дзяцюк у форменнай, як і ў таго мужчыны за перагародкай, фуражцы, дык стала зразумела, што прыйсці мог не хто-небудзь іншы, а толькі ён.

Усё жыло непазбежнасцю, і ўсё мела таемны, у гэты час, мусіць, зразумелы толькі аднаму яму, Пятру, сэнс.

Мужчына прайшоў за перагародку: пачуліся галасы — яны гучалі раздумліва-ціха і роўна, як заўсёды, калі гавораць пра нешта зразумелае, простае, і гэтак жа зразумела, роўна і проста дайшлі раптам з-за перагародкі шчымлівыя радкі:

Я покинул родимый дом,
Голубую оставил Русь.
В три звезды березняк над прудом
Теплит матери старой грусть.

І за перагародкай гаварылі:

— Чорт яго ведае як складна, га? Мяне хоць паленам бі, нізавошта б так не прыдумаў. Гэта ўжо талент трэба мець такі, ці што?

— А ты думаеш як? Канечне, талент, ды і падвучыцца трэба. Ты Вальку Хромчанку знаеш? Ён у раённай газеце быў, а цяпер у Доме культуры: сустрэнеш на вуліцы, дык ён не скажа проста — «здароў», а слова, другое, і трэцім звяжа. Хоць бяры ды запісвай, дальбог. Я пытаюся ў яго, кажу: можа, для вас, паэтаў, школы якія ёсць? Не, кажа, мы больш адзін у аднаго вучымся... Смяецца, халера! Каб яго, скажам,

у вялікі горад, дзе такія, як ён, далёка б хлопец пайшоў...

— Але ўсё роўна так, як Ясенін, не напіша. Чытаў я ў газеце твайго Валькі вершы: пра кукурузу ўсё ды малако. А тут, брат, за душу бярэ, не адпускае.

— Ты пачакай: Вальку, можа, яшчэ рана такія вершы пісаць. Спачатку і пра кукурузу трэба, каб начальства заўважыла, пахваліла, ці як у іх там. А потым, брат, яшчэ так напіша — ого!

— Слухай, Косця, а ты сам калі-небудзь вершы пісаў?

— Адзін раз заметку ў газету пісаў. Не сам надумаў — карэспандэнт папрасіў. Пра вынікі спаборніцтва і тыр-пыр. І што ты думаеш, надрукавалі. Канец, пачатак прырабілі, каб яно прыгажэй і гладчэй,— гэта ўжо ім ведаць лепш. Слухай далей. Грошы прыслалі: сем рублёў, капеек — цэлых дваццаць. Калі па-нашаму, дык дзве «бландзінкі» ды яшчэ закусон. Толькі я з хлопцамі піць не стаў. Пахвалюся, думаю, жонцы, усё да капейкі аддам. І што, ты думаеш, яна сказала? Пашкадавала, што з хлопцамі не прапіў. З дармовых, кажа, грошай хлеба не пад'ясі... А ты пытаеш, мо вершы пісаў. Дармовыя грошы, га?

— Во напомніў. Нам жа сёння зарплату з гэтым рэйсам прывязуць.

— Ат, і не кажы лепш: мне рублёў дваццаць на крэдыт аддаваць.

— Дзівак-чалавек, грошы яму з неба падаюць, а ён капыліць нос.

— Хочаш, разгуляюся на чакушку — была не была!

— Давай у мяне, га? Я ўжо і жонку падбіў.

— Добрая баба ў цябе.

— А ў цябе хіба горшая?

— Ну што ты! Лепшая. Толькі крыўдна неяк, што і ў другіх нічога сабе жонкі ёсць.

Засмяяліся,— і так гэтак хораша выйшла ў іх, што і пазайздросціць было не грэх, і Пятро падумаў, што яны, мусіць, зразумелі б яго, каб ён, такі-сякі, залётачка, бацькаў сын, пажаліўся, што чорт ведае як заблытаўся ў гэтай жытцы: адна нага ў горадзе, а другая тут, што гадоў яму, хлопчыку, пад трыццаць,— чытаніце, браткі, з кніжачкі ды пра маю журбу! Эх, «ТУ-104» — самы лепшы ў свеце самалёт! Хацеў я

астацца дома, ды, відаць, надумаў не ў час. Ах, дом, дом! Павырасталі мае нявесты, на блакітных экспрэсах паехалі ў свет.

Эх, «ТУ-104», кукурузнічак — твой родны брат!

Толькі не ляцеў, не ляцеў пакуль самалёт, ды і доктар чамусьці не ехаў.

«Ну і чорт з ім, з самалётам,— падумаў ён.— Буду сядзець і дакурваць «Памір». Буду ўспамінаць».

Ну давай успамінай, браце, толькі з чаго пачынаць? Можа, з таго, як ехаў дадому, ахвотна і лёгка верачы, што ўсё ўладзіцца як найлепш, і многа, многа паўставала ў памяці напаўзабытага, свайго, і ўжо, здаецца, не разумеў, як мог жыць, абыходзіцца без таго роднага, свайго, спазнанага яшчэ з дзіцячых год.

Не, усё будзе добра наперадзе — памыліцца ён не мог. («Ах ты, дабрадзей са слязою кручанкай, ах ты, піжон! Трынды-брынды, вось я — ваш! Надакучыла мне, малойчыку, асфальты таптаць. О, дайце, дайце мне азону, і ганьбу я... Піжон!»)

А спачатку ўсё было так, як прыдумаў сабе дарогаю ён: радаваўся, здзіўляўся, распытваў, успамінаў, і ў кожнага для яго было добрае слова і добры ўспамін. І ён амаль па-дзіцячы цешыўся гэтым, пакуль не заўважыў, што і для другіх ён быў як дзіця: маўляў, калі табе падабаюцца нашы цацкі, ну што ж — пагуляй. Тады зразумеў ён, што ўсе з самага пачатку лічылі яго толькі госцем. Маці два разы на дзень прымушала яго піць сырадой, і гэта таму, што ён быў госць. Прыходзіла бабуля, уздыхала, жалілася на хваробы і старасць: глядзі ж, беражы сябе, дзетка, мы ўжо аджылі сваё, а ты во на капейку ўзбіўся, дык і жыві. Брат падрастае, дык ты яго дзе ля сябе прыстрой. Мы ўсяго пабачылі, няхай ужо хоць нашы дзеці пажывуць. Усе цяпер у горад едуць: што тут, у вёсцы, рабіць?

І зноў, каторы ўжо раз, бачыў ён, што ўсе глядзяць на яго не інакш як на госця.

Ён ішоў на вечарынку, і ўсё там было не так, як тады, калі ён, падлетак, першы раз адважыўся выйсці ў круг, больш за ўсё баючыся, каб на яго не сказала чаго-небудзь Матруніна Лідка — перастарак-дзеўка, што заўсёды камандавала на танцах і строга глядзела, каб не лезлі маладзейшыя без пары ў круг: тады яшчэ хапала на танцах дарослых кавалераў і нявест. Тады яшчэ не было клуба, і вечарынкі адбывалі па чарзе,

і ўжо за тыдзень пачыналі гаварыць пра тое, у чыёй хаце будуць танцы, і хто будзе іграць, і якую плату даць гарманісту, каб за сваёю музыкай не спаў. Калі гарманіст быў нетутэйшы, дык пад вечар прыводзіў з сабою цэлую армію сваіх хлопцаў: яны ішлі па вуліцы, як заваёўнікі,— ліха рэзаў гармонік, екатаў бубен, з подсвістам, з прыпеўкамі таптала вулкавы пыл развясёлае войска. («Паплач у хусцінку з каёмачкай, піжон. Гэта табе паможа, дальбог, паможа...»)

Тады гралі страданне, кракавяк, «Сямёнаўну», падэспань, а смялейшым дзеўкам заказвалі сербіянку — і яны выходзілі: спачатку адна, высока, сарамліва-цвёрда несучы галаву, дробна выстукваючы абцасамі і размахваючы перад сабой хусцінкай. Самая пара была спяваць прыпеўку, і яна спявала: гарманіст пачынаў іграць цішэй, а потым ірваў адразу на ўвесь гармонікаў дых, і тая, у крузе, ішла ўсё разгонісцей і шпарчэй і, дайшоўшы да сяброўкі, што хавалася недзе ў цесным дзявочым гурце, па-асабліваму моцна прытопвала перад ёй і махала на яе хусцінкай — запрашала ў танец...

Цяпер сядзела з гармонікам на куце нейкае хлапчанё, лянiва іграла факстроты ды вальсы, а маладзенькія дзяўчаткі — мусіць, школьніцы — танцавалі больш адна з адной, не спадзеючыся на зялёненькіх кавалераў, што туліліся на лавах, па-даросламу дымілі самакруткамі, але ў танец чамусьці не ішлі. Мужчыны тут жа, за сталом, не зважаючы на іграннне, заядла забівалі казла.

Заказвалі нават дамскі вальс, і адна, другая з дзяўчатак падыходзіла да тых кавалераў: хто ішоў, хто саромеўся,— натужна смяяўся і, адгаворваючыся, разгублена хаваў вочы. І тады ўставаў з-за стала які-небудзь жанацік, у ватоўцы, у ботах, кпіў з кавалераў і выручаў дзяўчыну: сам запрашаў на вальс.

Пятро не танцаваў: падсаджваўся да мужчын, гуляў з імі ў даміно, зацята курыў махорку, а дзядзькі падсмейваліся з яго: маўляў, гэта табе не горад, тэлевізараў ды джазаў у нас няма — забівай во казла ды радуйся. Пыталіся, ці надоўга прыехаў дамоў, і ён усур'ёз адказваў, што, можа, назусім, але ўсе чамусьці ўсміхаліся на гэта, як на дасціпны жарт. Пятро змаўкаў.

Праз тыдзень ён рашыўся: папрасіў маці, каб на-

заўтра разбудзіла як раней — трэба ехаць. Ён так і не сказаў дома, што звольніўся з работы.

«Мне хопіць і сарака рублёў,— падумаў ён.— Два дні назад у хлопцаў была палучка. Можа, назбіраюць як... У інтэрнаце пераначую дзень, другі. Пакуль не дазнаецца камендант... Трэба неяк шукаць кватэру».

Ён адчуў раптам, якім нясцерпным было для яго чаканне. Няхай бы ўжо хутчэй ляцеў самалёт. Яму б толькі трапіць у горад, дабрацца да інтэрната і — спаць. Усё вырашыцца само па сабе. Нічога страшнага. Ён проста стаміўся і таму перабольшвае.

У полі за нізкімі вокнамі аэравакзальчыка мутна шарэў, маркоціўся халаднаваты лістападаўскі дзень. Усё яшчэ не распагоджвалася: сонца не было. «І не распагодзіцца,— падумаў ён.— Дзень цяпер кароткі. Нават каб пайшоў дамоў, то прыцёгся б толькі ўвечары. Няхай бы ўжо хутчэй ляцеў самалёт».

Ён не чуў, як пад'ехала машына: на двары загамаНілі, і ў пакой адзін за адным зайшлі некалькі чалавек. З парога ўсміхаўся доктар.

— Ажур? — спытаў ён.— Ты білет узяў? Я званіў сюды ўвесь час. Мне нават добра, што самалёт спазніўся: усе свае справы ліквідаваў. Цяпер два месяцы буду як у бога за пазухай. Толькі на курсах і можна адпачыць. Уф! Зараз я даведаюся пра самалёт.

І ўсё нібы толькі чакала, каб прыехаў доктар: самалёт, як па заказу, меўся хутка быць.

Пабольшала людзей у аэравакзале, паднялася гамана. Цётка кінула чытаць кніжку — корпалася нешта ў сетцы. Страпянуўся побач з Пятром даўганосы дзядзька, закурыў, а запалкі не адважыўся забраць у кішэню, палажыў, як і Пятро, на лаву. Не абзываўся і ўсмешліва-мякка зазіраў усім у вочы.

Нарэшце аб'явілі пасадку. Усе падняліся і рушылі з аэравакзала ў поле, да жаўтлява-шэрага, несамавітага, падобнага на страказу самалёціка. «Вось і ўсё,— падумаў Пятро.— Мусіць, так трэба было. Аман».

Паўз аэрадром у поле бегла дарога: жвавы конік, запрэжаны ў калёсы, трухаў па ёй. Нокаў, круціў пугаю над галавой ездавы — хударлявы дзядзька. Захінуўшыся ў вялікую хустку, сядзела на возе жанчына. На веласіпедзе даганяў калёсы нейкі дзяцюк.

Роўнае, у рэдкіх лапіках снегу, ляжала на ўвесь шырокі абсяг, шарэла балоцвінамі, хмызамі, купкамі

дрэў над далёкімі вёскамі настылае лістападаўскае поле. Пятро азірнуўся і зноў убачыў стагі — парудзелыя, абгладжаныя дажджамі і ветрам стагі, такія нязвыклыя тут, ля мястэчка...

А потым бег, падскокваючы, па мёрзлым полі самалёт. Падняўся. Хіліўся на адзін бок, робячы круг над мястэчкам. Дыбкі стала зямля: дамы, дрэвы, гародні-насушыльны заводзік з прысадзістай цаглянай вежай, поле. І зноў Пятро ўбачыў стагі. Ён глядзеў на іх, пакуль яны не прапалі з вачэй,— за маркотна-сінім даляглядам.

1965

СВЕТ ІВАНАВІЧ, БЫЛЫ ДОНЖУАН

У тэлефоннай будцы былі двое, і я ненавідзеў іх. Я стаяў і чакаў. Яны не звярталі на мяне ніякай увагі. Гэты вечар я ненавідзеў усіх, каму было семнаццаць, дваццаць год — не болей. Мусіць, мне ўсё ж не варта было званіць, і тое, што я стаяў ля будкі, за дзвярамі якой крычалі ў трубку нейкія жаўтароцікі ў ненатуральна белых кашулях, расшпіленых на верхні гузік, у адпрасаваных вузкіх чорных штанах, загарэлыя, з акуратна падстрыжанымі, такімі самаўпэўненымі патыліцамі,— яшчэ больш злавала мяне.

— Эй, вы,— сказаў нарэшце я, грукнуўшы кулаком у шкло будкі,— давай закругляцца! Дайшло?

Ніякай увагі. Чарнявага, шчуплага, з такім зайздросным рубільнікам, што хоць пазычай, гэта не абыходзіла. Другі — белабрысы, доўгі, што стаяў бліжэй да мяне, прыпёршыся плечуком да шкла будкі, толькі ленавіта плюснуў вачмі, выняў з рота цыгарэту і, цыркнуўшы слінай сабе пад ногі, напусціў на твар прытворна-ўважлівы, блазенскі выраз. Белабрысы здзіўляўся і не разумеў. Да яго яўна не даходзіла. Ён нават не паглядзеў на мяне. Мне так хацелася заехаць яму па юнай мордзе, але я вырашыў пачакаць. Навошта ты злоўжываеш цярплівасцю маёй, о Катыліна?

— Слушай, Люсь! Обеспечь, чтобы маман не поднимала шухер. У меня пластиночки — первый номер...

Ну да — законно. Гуд бай! Леньке трубку не давать? Бусделано!.. Салют! Когда я смогу принести свои бренные останки?

Цяпер я рашыўся: раз! два! тры! — тры з адцяжкай удары ў шкло будкі. І позірк — не, чалавеку тэкі позірк не вытрываць.

Яны нешта зразумелі. Белабрысы таргануў плячмі і паглядзеў на чарнявага. Той вешаў трубку. Яны выпраствалі плечы ў будцы і, нібы змовіўшыся, нібы па камандзе, прымалі незалежны выгляд. Я, не адводзячы позірку, глядзеў на іх. Ужо на тратуары белабрысы азірнуўся і праспяваў:

...но пока наоборот:
только черному коту и не везет.

Ах, смаркачы, смаркачы,— дальбог, я такім не быў у свае семнаццаць год. Недзе толькі на трэцім курсе я адпусціў доўгія валасы — тады гэта было модна. І падняў каўнер курткі — гэта таксама, здаецца, лічылася, што няблага. Тады катастрафічна, увачавідкі вузелі ў хлопцаў штаны, затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінжакамі. Праўда, гэта ўжо мяне не датычыла. Доўгія валасы — няблага. І падняць каўнер — таксама. Я чытаў тады французскія раманы. Эміль Бландэ, Люсьен Рубампрэ... Галантны век, дасціпнасць. І скепсіс. «Страчаныя ілюзіі». Партрэт «бацькі ўсіх народаў» пыліўся ў інтэрнацкай шафекладоўцы. «Как мало пройдено дорог, как много сделано ошибок». Не было саладзейшай спакусы, чым журба. Я чытаў тады замежныя раманы. Шматпакутныя героі пад эпілог сыходзіліся на ласкавы агонь камінка. За апушчанымі шторамі выў халодны восенькі вецер. Камінак быў узнагародай. Цаной былой неўладкаванасці і нягод. І нехта павінен быў першы сказаць: «А памятаеш?..» І больш нічога. Агонь у камінку гарэў ласкава і роўна, над ім не ўладны быў асенні вецер, што зласліва шастаў за акном...

Ах, я памыляўся, як я тады памыляўся, але, дальбог, я не быў самаўпэўненым, пошлым піжонам!

Мусіць, больш за ўсё мяне злавала, што такія вось жаўтароцікі, як гэтыя, маглі пазваніць ёй. «Слушай, Лорик, мы сейчас завалимся к тебе с Эдиком. Тосты, конечно, наши — твой выпивон. Поздравляем — это законно. Ты теперь уже старуха — девятнадцать

как пить дать. Держи, старуха, хвост пистолетом». I горш за ўсё тое, што тут я нічога не мог зрабіць. Я адчуваў сябе бездапаможным, як сляпое кацяня. Можа, нават жабраком ля чужога парога. Мае трыццаць год адцягвалі мне плечы. Жабрацкая торба — лішнія дзесяць год. Я мог бы сядзець разам з усімі, але вось чамусьці павінен званіць. Навошта? Цябе запросяць зноў. I зноў ты адмовішся. I яна пакрыўдзіцца, асабліва цяпер, калі ў яе ўжо госці. I са злосці будзе танцаваць увесь вечар з якім-небудзь Эдзікам. «Ты дурань,— сказаў сабе я,— табе трэба быць там. I сядзець за сталом. Гэткім мудрым богам сярод легкадумных сатыраў. I аберагаць юную німфу. Ты лепшы, чым яны. На цэлых дзесяць год».

У тэлефоннай будцы задушліва пахла нагрэтай фарбай. Аўтамат глуха агрызнуўся, глытаючы манетку. Трубка была абыякава цёплая, і няўклюдна прычэпленым да яе стальным ланцугом. Трубка на ланцугу, як шалёны сабака.

Я націскаў на кнопку — аўтамат падключыўся сам. З гулам разбілася цішыня, і потым страшная, няўмольна безгалосая расхінулася пустата. Яшчэ потым шоргат і голас:

— Вера Фёдараўна ля тэлефона — хто гаворыць?

Які малады, высокі голас, няўжо — маці?

— Мне трэба Ларысу. Паклічце, калі ласка, Ларысу.

Я чуў нейкі шоргат, галасы, абрыўкі музыкі. Радыёла ці тэлевізар? Мне чамусьці хацелася, каб тэлевізар.

— Вы павінны былі прыйсці да нас на вечар? Вы спазніліся?

Які малады, упэўнены, цвёрды голас! Ларыса казала, што маці курыць. Значыць, мана, што ад курэння ў жанчын грубее голас.

— Не, я не спазніўся. Я не ведаў, што ў вас вечар... Ларыса дома?

— Яна пайшла з дзяўчаткамі ў магазін. Па марожанае. Паслалі хлопцаў, а іх чамусьці доўга няма. Яны хутка вернуцца... Што ёй перадаць?

— Нічога не трэба. Я, можа, пазваню потым.

Я хлусіў. Ёй хапіла здагадлівасці не пытацца, хто звоніць. Хаця яна ўсё роўна не ведала мяне. Я бачыў неяк яе выпадкова ў горадзе. Яна была разам з Lары-

сай. Высокая, круглы падбародак, цвёрда сцятыя вусны і, здаецца, строгі пагляд. І разам з тым нейкая дзіцячая разгубленасць, ледзь не жаласлівасць у твары. Бацька, казала Ларыса, яе раўнаваў. «Ларыса, скажы маці, каб глядзела ў сваю талерку». Гэта аднойчы ў гасцях.

— Усяго добрага,— сказаў я і неспадзявана дадаў: — Вера Фёдараўна.— Выйшла неяк гулліва і нават пяшчотна. Не, трэба вешаць трубку. Усё.

— А можа, усё ж я перадам Ларысе, што...

Я павесіў трубку.

Я выйшаў на тратуар. У мяне чамусьці крыху кружылася галава. Я нібы ўсплываў на паверхню з-пад вады. Мяне, пагойдваючыся, страчала вуліца: дамы, людзі, дрэвы станавіліся на свае месцы і набывалі непазбежную, строгую пэўнасць, цяпер абыякавую да мяне. Я стаяў, раздумваючы, што рабіць далей. У грудзях было пуста. У галаве ляніва круцілася нешта накшталт: «Эх, Жэнька, Жэнька, свет Іванавіч, маральна ўстойлівага халасцяка ■ цябе не выйшла — давядзецца зноў перакваліфікавацца ў донжуана».

Нічога не заставалася, як ісці дамоў.

Пачынала цямнець, і вуліца глушэла ад святла, ад хісткіх ценяў, ад дзіўнай маўклівасці тралейбусаў, за сінім шклом якіх неяк паволі, бяздумна рухаліся людзі, безгалоса смяяліся, невідушча глядзелі перад сабой. Аднекуль далятаілі водгаласы слоў, шалясценне лістоты, наплывала прахалода, а потым да абмарачэння млява і соладка патыхала яшчэ неастылым асфальтам, парфумай, пылам, аброненым некім пад ногі марожаным. Ліхтары гарэлі асуджана-роўна, нібы не верачы ў сваё святло, і лістота ліп пад імі была непрыемна зялёная, халодна-яркая, і гэтак жа холадна пералівалася на захадзе над горадам палахліва-жоўтае, фіялетавае, бэзавае неба.

Было сіратліва і холадна ў мяне на душы.

Я перайшоў на той бок вуліцы, дзе было менш людзей і магазінных вітрын, і агні ліхтароў пад невясёлай шпалерай цёмных ліп пазначылі мне дарогу дамоў, да пустой кватэры, якая не абяцала нічога, акрамя адзіноты, і два разы я прыбіваўся да людскога гурту на тралейбусных прыпынках, проста каб пакурыць, і зноў ішоў, і недзе ля гастранома нагнаў двух жаўтароцікаў, што кацілі перад сабой бляшанку кансерваў,

як футбольны мяч: і зноў халодная злосць скаланула маё нутро. Я ведаў, што гэта дурная, несамавітая злосць, што ніхто не вінаваты і ніхто не паможа мне, але ўсё адно злаваўся і дзёрзка глядзеў сустрэчным у вочы, нібы ведаў за кожным самы найцяжэйшы грэх. Нейкія дзве пары ішлі наперадзе мяне. Адзін — даўганогі, сутулы, з высока пастрыжанай шылаватай галавой, заклаўшы рукі за спіну, сумаваў побач з кароценькай, порсткай дзяўчынкай; другі — цыганаваты, кучаравы, з сухарлявай, загарэлай патыліцай, на якой цёмна ільснілася западзінка-равок, нешта ўсё выдурняўся і рагатаў і незаўважна клаў руку на талію сваёй мажнай рыжаватай сяброўкі, на зіхотнае плацце з тафты, а тая ляніва паварочвалася цераз плячо і біла яго па руцэ, а ён смяяўся і клаў руку ўжо на плячо і пытаўся: «А сюды можна?» — і зноў рагатаў. Ах, якая была ідылія, чорт вазьмі,— я бачыў усё навылёт, я бачыў іх, калі яны застануцца ўдваіх, і, дальбог, я аддаў бы ім маю пустую кватэру — гэтай дзяўчыне і гэтаму нахабнаму хлопцу, няхай бы толькі ён быў нахабны да канца.

На рагу вуліцы я павярнуў налева — яны пайшлі далей. Мая вуліца спадала ўніз, да парку, і тут было зацішней, цямней — бледна свяціліся неонавыя лямпы. Я быў дома. Ступіў у цень тунеля і пад яго высокім скляпеннем пратэпаў у двор, зайшоў у пад'езд і падняўся на пляцоўку з ліфтам. Нейкая абыякавасць апанавала мяне. Злосць прапала. Я нічога не хацеў. Карабель прычаліў да берага, і ў ягоны борт ляніва біла стомленая хваля. Мяне закалыхвала адзінота. Я зайшоў у ліфт і паволі націснуў на кнопку паверха. Пагасла і зноў успыхнула святло. Ліфт плыў угору, і я быў адзін. Я закурыў. Я не ведаў, ці часта бывае з чалавекам, калі ён у трыццаць год заходзіць у тупік. Асабліва тады, калі вельмі старанна выхоўваў сябе ў юнацтве. Калі стараўся ўсё зразумець. І вельмі мала дзейнічаў. І таму не дасягнуў у жыцці нічога. Зрэшты, гэта глупства — дасягнуць. Мяне гэта, здаецца, ніколі і не вабіла. Я хацеў другога. На адной рачулцы я бачыў некалі рыбалова. Ён рабіў тое ж, што і я: гібеў з вудай на беразе, чакаючы паклёўкі. Розніца была толькі ў тым, што ў яго лавілася рыба, а ў мяне — не. Гэта цяжка было зразумець. Рыба сама ішла да яго. На ім быў стары парудзелы плашч, на галаве несама-

вітая кепка, на нагах — брызентавыя чаравікі. Пякло сонца, а яму было не горача. Я падкасаў калашыны, каб не замачыць штаноў,— для яго быццам не існавала вады, быццам рака была не рака, а люстраны паркет. Брызентавыя туфлі былі сухія. З плеценага кошыка, абкручанага анучай, ён даставаў параную бульбу, асцярожна разразаў яе, затуліўшы далонню, на маленькія кавалачкі і, нібы бласлаўляючы раку, таямнічым жэстам раскідаў крышаны ля берага. Потым, падкурчыўшы ногі, заміраў на камяні, што выступаў ля берага з вады, і чакаў. Як ні наглядаў я за ім, не мог падпільнаваць таго моманту, калі пачынаўся клёў: я бачыў толькі рыбіну, што трапяталася ў ягонай руцэ, і як страшэнна доўгім позіркам жылі прыглушана-цёмныя, глыбокія вочы.

Я нічога не разумеў. Пасля ўжо, калі зразумеў, я зразумеў не так і мала. Я зразумеў, што галоўнае не ў тым, каб дасягнуць, не ў выніку, які ўяўляецца проста як вынік, адасоблены ад усяго, а ў адпаведнасці гэтаму выніку нас саміх. У адпаведнасці мэты выніку. Звычайны падлешчык для таго рыбалова быў звычайным падлешчыкам, але, затрапятаўшы на далоні, ён мог быць і залатой рыбкай. Толькі перш за ўсё ён быў падлешчыкам. Удачы не было — была ўзнагарода за цярплівасць. І гэтая цярплівасць не прыніжала чалавека, як не прыніжалі ні стары парудзелы плашч, ні пацёртая кепачка, ні брызентавыя чаравікі. Галоўным быў спачатку не вынік, а паўната прадчування яго. Я спяшаўся, нерваваўся, я думаў пра падзею, вынік і не заўважаў, як мой унутраны голас глух, як удача пачынала здавацца цудам, а падлешчык — недасягальнай залатой рыбкай. Але не было ні падлешчыка, ні залатой рыбкі.

Мне трэба, вельмі трэба вучыцца цярплівасці.

Новую цыгарэту я ўжо закурыў у кватэры. На кухні. Я любіў гэтую кухню, бо тут гаспадарыла Міла. Чужая жонка, мужава жонка, якая заўсёды старалася зрабіць так, каб я адчуваў сябе ў гэтай кватэры, як свой, а не проста як кватарант-прыблуда. Кухня была тым месцам, дзе развіналіся на ўсю шыр зайздросныя Мілiны здольнасці. Кухня была эмблемай кватэры, нават, калі хочаце, яе душой. І Міла была ідэальнай жонкай. Для мужа з такой жонкай ніколі не будзе існаваць праблемы кухні — у прамым і пераносным

сэнсе. Ён можа прывесці дадому хоць сотню сяброў, і ўсе яны будуць накормлены, і яму, калі ён толькі не дурань і не бурбон, ніколі не засвярбіць язык сказаць, што ў жонкі малы адукацыйны цэнз, і што паміж высокай разумовай сферай і кухняй ляжыць невымерная бездань, і што яму, такім чынам, як паветра, не хапае высокаінтэлектуальных размоў. Урэшце, гаварыць з Мілай пра цэны на прадукты мне было цікавей, чым пра кібернетыку з яе кандыдатам-мужам.

Я сядзеў за сталом на кухні, і позірк мой незнарок упаў на разгорнутую палоску тэлеграмы, атрыманай два дні назад,— я ўзяў яе ў рукі і зноў прачытаў: «Почему не пишешь Что случилось Станислав Мила». Памятаю, на той дзень я пакрывіўся ад гэтага фамільярнага — Станіслаў: мы ніколі не звалі адзін аднаго па імені, а толькі па бацьку. Міла — іншая справа: з ёй мы былі на «вы», але затое, дзякуй богу, не пайшлі на гэтую камедыю з Мілай Пятроўнай і Яўгенам Іванавічам. І яшчэ мне здалося, быццам тэлеграму трэба чытаць інакш, неяк так: «Как поживают рыбы в аквариуме? Исполняешь ли ты мой наказ?» «Чорта з два,— падумаў я,— у мяне яшчэ зварыць мазгаўня, каб не карміць рыб сырым, дробна пасечаным мясам, як наказала ваша міласць. Ты б там, на паўднёвым сонцы, схуднеў на шэсць лішніх кіло, каб даведаўся, што я скора знайшоў дарогу ў магазін «Прырода» і перавёў тваіх рыбак на разгрузачную дзяржаўную дыету. Салют, Станіслаў Бацькавіч, цешцеся прыемнымі надзеямі».

Я трымаў лісток у руках, стараючыся ўявіць, як была паслана тэлеграма. Дурны, чаму я адразу не падумаў, што тэлеграму паслала Міла. Ну, вядома, яна, і знарок падпісала Станіслава Бацькавіча першым, і паказала тэлеграму яму, і здолела пераканаць, як гэта яна ўмее, што ім не абысціся без такой тэлеграмы і што гэта будзе прыемна мне, адзінокаму, беднаму, няшчаснаму халасцяку, і Станіслаў Бацькавіч, можа, расчуліўся і нават палічыў усю гісторыю з тэлеграмай найвялікшым актам чалавекалюбства.

Ах, Міла, Міла, харошая Міла, мужава жонка! Толькі цяпер я па-сапраўднаму адчуў, як не хапае мне яе, па сутнасці, можа, адзінай жанчыны, якая трэба была мне і якой трэба я, але пра тое ўжо мы, бадай, не скажам адно аднаму. Досыць і таго, што мы ведаем

гэта. Не трэба, каб гэта перарасло нас. Няхай яно будзе з намі, як магчымасць, якой немагчыма здзейсніцца. Я мог бы ўзяць ад Мілы ўсё, каб захацеў, але дрэнна быць гусарам побач з мужам, які дзеля жонкі, хаваючыся, падбрывае валасы на грудзях. Аднойчы я здагадаўся пра гэта, і мяне з таго часу, калі думаю пра Мілу, не пакідае журба. А цяпер... Я любіў Мілу ў гэты момант, я нават чуў, як білася маё сэрца, мне хацелася, каб недзе там, у доме адпачынку, яна думала зараз пра мяне, і я верыў у сваю сілу праз ноч, адлегласць прымусіць яе думаць пра мяне. Я праверу гэта, калі яна вернецца, і асцярожна як-небудзь спытаю яе. А можа, кінуць усё і, пазычыўшы грошай, махнуць на поўдзень на дзень-другі? Такая вялікая бяда — пісаць пасля дырэктару музеума тлумачальную запіску, каяцца, што гэта легкадумнасць,— страціць свае восемдзесят рублёў і месца малодшага навуковага супрацоўніка, што я не меў намеру абразіць дружны музейны калектыў і што ў дадзеным выпадку толькі старанная праца ў будучым можа паставіць мяне на ранейшае месца ў гэтым калектыве. Эх!..

Здаецца, званіў тэлефон.

Я ўстаў з-за стала і, не спяшаючыся, пайшоў у прыхожую, і калі ўжо здымаў трубку, здагадаўся, што гэта, можа, звоніць Ларыса, але чамусьці не ўзрадаваўся,— і гэта было нешта новае, і я ў думках пахваліў сябе: нават прыемна стала ад упэўненасці, што зараз, калі буду гаварыць ■ Ларысай, абавязкова знайду патрэбныя словы, каб, не абражаючы яе, сказаць тое, што можна і трэба сказаць мне, мужчыне, дзевятнаццацігадовай дзяўчынцы ў такі вось момант. Але трубка маўчала, я адно чуў, як у ёй цяжка калыхалася цішыня.

— Ало! Ало!

І зноў маўчала трубка, і я пачуў, як на другім канцы проваду нехта часта, непрыемна коратка дыхаў,— чорт ведае які дурань смяяўся з мяне!

— Гэта ты, Ларыса? Аддыхайся. Я цябе слухаю...

Нехта таропка, вельмі таропка палажыў трубку.

Містыка, нейкая чыстай вады містыка — не можа быць, каб гэта Ларыса. Урэшце, чаму яна павінна званіць? Мусіць, я перабольшваю, калі думаю, быццам што-небудзь значу для яе. Дзесяць год — высакаватая сцяна, і ёй, Ларысе, трэба станавіцца на дыбачкі, каб

падаць праз яе руку. А навошта ёй станавіцца на дыбачкі? Каб паказаць мяне сваёй кампаніі і сваім бацькам? Але ж я ўжо вырашыў, што мне там няма чаго рабіць. А можа, я памыляюся, можа, трэба было інакш? Заявіцца, як належыць навуковаму супрацоўніку, нават калі ён і малодшы — гэтую дробязь у размове асцярожна абысці,— энергічна пацiснуць Ларысінаму бацьку руку і, цвёрда зазірнуўшы ў вочы, назваць сябе. І абаяльна гэтак усміхнуцца і пажартаваць:

— Папярэджваю, Ферапонт Дармідонтавіч, другі тост пасля вас буду гаварыць я. І нават магу ўзяць на сябе ролю тамады, калі вы, вядома, не супраць.

Ферапонт Дармідонтавіч — фі! Як бы ён паглядзеў на мяне, каб я назваў яго гэтак? Ён падумаў бы, што я звар'яцеў. Але ціха! Па праву дарослага мужчыны я цалую ў Ларысінай маці руку (чаму не пацалаваць!). Вера Фёдараўна прыемна ўражана і крадком выцірае слязу. Ага! Ба, якія незнаёмыя ўсё аблiччы! «Ну што ты,— прыходзіць на дапамогу Ларыса,— гэта ж вось Валік, памятаеш, я табе гаварыла, што ён... А гэта вось Валерка — ён умее шавяліць вушамі... Валерка, пакажы!..» Ідылія! І ўюнашы абступаюць мяне і пытаюць, якія я куру цыгарэты.

Папраўдзе, я баяўся не гэтага. Можа, больш за ўсё я баяўся пераканацца, што Ларыса — адна мая выдумка, міраж. Чаго я хацеў ад Ларысы? Можа, я нават думаў, што яна — маё выратаванне. Маладосць, шчырасць, непасрэднасць, чысціня. Што з яе дапамогай усё гэта вярну сабе і я. І абнаўлюся разам з ёю. (Які халаднавата чысты, строгі ў яе пагляд і якія чуйныя, акуратна зграбныя рукі — ідучы, яна трымае іх неяк трошкі перад сабой, самаўпэўнена чуйныя рукі, такія нейкія безуважна пагардлівыя да закасаных рукаўчыкаў летніка-плашча.) Я адкіну са свайго вопыту ўсю горыч, а лепшы мой вопыт перадасца ёй, і яна стане такою, якім хацеў, але не стаў некалі я. І, можа, я здолею зрабіць гэтак, што яна будзе разумець мяне. І тады...

Здаецца, зноў званіў тэлефон. Я вырашыў, што пачакаю, пакуль той, на провадзе, дасць трэці званок. І калі будзе чацвёрты, здыму трубку. Быў чацвёрты званок.

— Ало! Калі вы нешта хочаце сказаць, спяшайцеся — я слухаю.

І зноў выразна пачуў нечае дыханне і хацеў ужо раззлавацца і вылаяцца ў трубку, але нешта падказала мне, што трэба пачакаць.

— Спяшайцеся, у вашым распараджэнні дзесяць секунд.

— Гэта я, Лёня,— сказаў раптам нехта ў трубку,— а вы... дзядзя?

Чорт ведае што такое. Ды яшчэ нейкі дзіцячы голас.

— Лёня? Які Лёня?.. Скажы мне, калі ласка, Лёня, што табе трэба і дзе ты ўзяў мой тэлефон?

— А вы добры дзядзя і сварыцца не будзеце? Не будзеце, га?

Цудоўная магчымасць пахваліць самога сябе.

— Ці добры я дзядзя, не ведаю, але сварыцца не буду. Ну давай...

— Мне, дзядзя, сумна, і я сам выдумаў ваш тэлефон. Сядзеў, сядзеў і выдумаў. І яшчэ тэлефоны выдумаў, але яны не хацелі гаварыць, толькі піпіпкалі, і я іх забыў. А ваш я першы выдумаў...

— Ты харошы хлопчык, Лёня. Колькі табе год?

— Я ўжо вялікі, дзядзя, і ўвосень у школу пайду. Мне толькі не хапае двух месяцаў. Але тата з мамай кажуць, што ўсё роўна ў школу возьмуць. Праўда, дзядзя, возьмуць?

— Як табе сказаць, Лёня... Па-мойму, павінны ўзяць... А ты што — дома адзін?

— Тата з мамай на дачы. І я там быў, і наша Лілька. Я, дзядзя, там у нагу стрэмку загнаў. Ух, як балюча было!

— Ты харошы хлопчык, Лёня. Я ведаю, ты цярпеў...

— Я нават не плакаў, дзядзя. Нага ў мяне ноччу балела, ведаеце як: дорг! дорг! дорг! І гарачая была. Я ноччу ўстаў і на другой назе паскакаў на кухню напіцца вады. А мама прачнулася і на руках аднесла мяне ў пасцель. Мама ўсё думае, што я малы...

— Не, ты дарослы, калі ўмееш цярпець.

— А Лілька наша яшчэ больш дарослая, дзядзя. Яна ў тэхнікуме вучыцца. Толькі яна дзяўчынка, і мама кажа, што ёй рана дарослай быць. Лілька хацела ісці ў водны паход, а мама не пусціла. Лілька плакала і хацела з дачы ўцячы.

— Ну, брат, дрэнныя ў яе справы... А дзе цяпер яна?

— Вам я магу сказаць, дзядзя. Мне з ёй чыстая бяда. Да нас заўтра дзядзя Вася прыедзе, ну, татаў брат. А мы з Лількай пойдзем яго сустракаць. Дзядзя Вася не ведае, дзе наша дача стаіць... А Лілька хітрая: пакінула мяне дома аднаго, а сама з Толікам Сотнікавым пабегла ў кіно. Мама кажа, што гэты Толік дрэнны хлопчык. Калі ягоная мама ў бальніцы ляжала, дык ён да сябе дрэнных хлапчукоў вадзіў, і яны пілі віно і курылі. А потым Толік ключ ад кватэры згубіў і праз акно дамоў лазіў. Мама кажа, каб Лілька не сябравала з ім. А Лілька во не слухае. Буду цярпець, цярпець, а потым маме ўсё скажу...

— Яно дык так, браце, але ж ты, мусіць, ужо цукеркі, якія табе купіла Лілька, каб маўчаў пра кіно, даўно з'еў.

— І зусім не цукеркі, дзядзя, а зефір. Яна толькі абяцала, што цукеркі купіць, а купіла зефір. Трэба ён мне. Лілька яго сама з'ела.

— Ну, брат, тут трэба падумаць, што рабіць. Па-мойму, калі ты дарослы хлопчык, дык можаш і без Лількі прабавіць час. Плакаць ты не ўмееш, а цукеркі... што цукеркі — я дык іх вось ужо дзесяць год не ем. Есці цукеркі — адно зубы псаваць. Галоўнае, брат, сумаваць не трэба. Па-мойму, так.

— Я не буду, дзядзя,— сказаў ён.— Як Лілька прыйдзе, я вам пазваню. Пазваніць, дзядзя?

— Ведаеш што,— сказаў я,— кладзіся лепш спаць. Я сам вось пасяджу трохі, падумаю і таксама лягу спаць. Я таксама, брат, дома адзін. Куды нам з табой гнацца за Лількамі...

Можа, мне не трэба было так гаварыць. Я адчуў раптам, як ён там, у далёкай пустой кватэры, не падзіцячы пасур'ёзнеў, сцішыўся — навошта мне было так гаварыць? Мяне выдаў мой голас. Такая гэта атрута — дарослая туга.

— Будзем спаць, Лёня,— сказаў я весялей.— Спаць, спаць усім рабятам, спаць, спаць па палатах... Ведаеш гэтую песеньку? А то ёсць яшчэ... Плакса, вакса, гуталін — еў, не з'еў гарачы блін... Смешна, праўда?

— Ага,— сказаў ён узрадавана.— Я буду спаць, дзядзя. Спакойнай ночы.

— Спакойнай ночы.

Я палажыў трубку.

Вядома, я і не думаў спаць, хоць і не ведаў, што можна было прыдумаць такое, каб лягчэй прабавіць час. Пайсці ў кіно? Купіць два білеты, прадаць адзін якой-небудзь аматарцы позніх сеансаў, калі захоча купіць, а то і запрасіць з сабой так. Я рабіў так некалі, у тую пару, калі прынцыпова не хацеў мець сваёй дзяўчыны, якую на вуліцы трэба было браць пад руку, знаёміць са сваімі сябрамі, сустракацца ледзь не штодзень, якой трэба было купляць марожанае і кветкі і абавязкова праводзіць дамоў, каб адстаяць з ёй свае паўгадзіны ў пад'ездзе. Я не хацеў тады, каб хто-небудзь меў на мяне правы. Мне трэба было, каб я мог прыйсці да яе, калі захачу, і каб яна не брала з мяне слова, што я абавязкова прыйду да яе яшчэ і заўтра. Тады ў мяне ўсё разладзілася з Эмай, хоць яна ніколі і не пыталася ў мяне, ці прыйду я да яе заўтра. Я купляў ёй марожанае і кветкі, хоць мне неабавязкова было прастойваць з ёй у пад'ездзе, бо мы тады ўжо скончылі інстытут, і яна працавала ўжо і жыла на прыватнай кватэры, дзе займала пакойчык з асобным ходам. І я працаваў ужо тады, і, здаралася, мы раніцай разам ішлі на работу, але ўсё адно яна ніколі не прасіла, каб заўтра на работу мы пайшлі разам таксама.

Не, сёння ў кіно мне не выпадала ісці: я даўно адчуваў, што перарос усё гэта. Аставаўся рэстаран, і я на момант уявіў сабе шырокую залу, залітую густа-залацістым, хісткім святлом, шызыя палосы дыму, стук нажоў аб металічныя падносы, напружаную, цёмную адчужанасць людзей, занятых, па сутнасці, адным і тым жа, тамліва-доўгія позіркі жанчын, узмахі рук, гаману, дурманлівы водар кухні. Я ішоў па зале, шукаючы свабоднае месца, падсвядома старонячыся кампаній з жанчынамі, і вось ужо нейкія падпітыя рабацягі махалі рукамі мне, і гэта азначала, што яны нядаўна прыйшлі сюды, перад тым ужо недзе добра паддаўшы, паспеўшы надакучыць адзін аднаму,— інакш не ўзрадаваліся б невядома чаму свежаму чалавеку. Я садзіўся за стол, яны налівалі мне, і я піў, бо адмаўляцца не мела сэнсу, а потым заказваў я, і пачыналася звычайная п'яная безладзь: доўгія поціскі рук, абернуты на абрус фужэр з півам, настойлівыя спробы наладзіць кантакты з суседнім сталом, крыўда на афіцыянтку, якая не хацела браць чарку. Я ўсё прадбачыў наперад — нічога арыгінальнага, самы банальны спосаб

зглуміць вечар і назаўтра адчуваць сябе нібы апушчаным у ваду.

Не, і гэта сёння не падыходзіла мне.

Я закурыў цыгарэту: яна была туга набітая і гарэла дрэнна. Камячыў яе ў пальцах, пакуль не сплюшчылася і не стала мяккай, але ўсё роўна яна курылася дрэнна, і ў роце была ад яе такая саладкава-брыдкая горыч — я расціснуў цыгарэту ў попельніцы і дастаў з палічкі над сталом пачак махоркі, купленай на выпадак, калі выйдуць цыгарэты і будзе позні час, каб бегчы па новыя ў магазін. Сухі, гарачы махорачны дым востра заказытаў у носе, і неяк адразу праяснела ў галаве, і неспадзявана ўспомнілася далёкая восень, калі мы на першым курсе ездзілі ў калгас капаць бульбу. Аднаго дня быў дождж, і мы вымаклі на полі, прыбеглі да гаспадыні ў хату і распалілі грубку. Пад акном шкуматаў грушу вецер, перашчукаў і зноў усчынаўся дождж, сядзелі на складзеных пад хлявом дошках куры, а потым гаспадыня выйшла на двор і выліла ў карыта вядро мешанкі і адчыніла ў хляве вароты. Засакаталі, пазляталі з дошак і пабеглі, смешна валюхаючыся, да карыта куры, выскачылі з хлява два парсюкі, і большы пачаў адразу хламкаць з карыта, час ад часу злосна задзіраючы лыч, а меншы ўсё вішчаў, бегаў наўкол і не ведаў, як падступіцца да мешанкі. Сабака вылез з будкі і хадзіў па двары, бразгаючы ланцугом і да нечага прыслухоўваючыся. А мы тады ў хаце курылі махорку, і, памятаю, так хораша было ў мяне на душы, і такое выразнае, азначанае дарэшты было ўсё на двары, у агародзе, і так неяк па-стараму весяліў 'душу разгоністы, косы бег ветру за акном, у полі, над якім туманна, кудзелiста, жвава снаваліся разлапістыя хмаркі, збіваліся ў купкі, цямнелі, расхінаючы раптам у небе акенца незвычайнай, густой сінізны. Мне было семнаццаць год у тую восень, і быў цяпер тут, у горадзе, бадай што адзін чалавек, з якім бы я мог пра гэта, каб захацеў, пагаварыць. Эма. Эма тады таксама была з намі ў вёсцы, і я ўжо ведаў, што пайду сёння да яе.

Я не супраціўляўся сабе, я нават падумаў, што Эме мог бы сказаць пра Ларысу, і яна зразумела б мяне, без асаблівай шкоды для сябе. Паміж намі было ўжо ўсё, што толькі магло быць, і больш нічога не будзе. Я ведаю гэта. Мы разышліся без крыўды — паміж муж-

чынам і жанчынай такое не часта бывае. Эма добрая дзяўчына: я з радасцю стаў бы сябрам яе мужа, калі б яна выйшла замуж, і мужу гэта нічым бы не пагражала. За мяне яна ніколі не выйшла б замуж: ёсць шмат такога, у чым мы вельмі ж падобны адно на аднаго. І ў Эмы даволі чуцця, каб зразумець гэта.

На вуліцы я паглядзеў на гадзіннік: было без пятнаццаці мінут адзінаццаць. Наогул, позна. І ў Эмы няма цяпер пакойчыка з асобным ходам, яна жыла ў нейкіх пенсіянераў, пры якіх быў яшчэ жанаты сын з бяздзетнаю жонкай. Гэта была арыгінальная пара. Жонка не прызнавала за сабой ніякай ганьбы. Бяздзетным лічыўся муж. Даўняя спрэчка паміж зацікаўленымі асобамі вырашалася звычайна прочкамі. Сыходзіла жонка — быў вінаваты муж, сыходзіў муж — лічылася пераможанай жонка. Адным словам, вясёленькая гісторыя. Аднаго баюся я, што Эма, нагледзеўшыся такой сямейнай ідыліі, яшчэ на колькі год адкладзе замужжа. Наогул, мяне пачынае палохаць яе абыякавасць да ўласнага лёсу, і не разумею я, што трымае яе на той кватэры. Прывычка? Пагарда да дробязей быту? Не такое ўжо шчасце — адчуваць сябе запхнутай у куток. У літаральным сэнсе. Невялікі пакойчык з зашклёнымі дзвярамі ў калідор ды яшчэ абсталяваны па апошнім слове пенсіянерскай логікі. Сплавілі ў пакой усе лішнія рэчы. І выкінуць нічога нельга, каб купіць сваё. І цяпер Эма — вартаўнік пры складзе непатрэбных рэчаў. Заложніца сярод прапыленых, пабітых моллю канапак, гардзін і пуфаў з патрыярхальнымі пампончыкамі...

Ішло таксі, і я падняў руку.

Мы ехалі ахінутай прыцемкам вуліцай — на агні рэклам, на рдзянае мігценне стопсігналаў, і мне было відно, як машыны наперадзе гналі перад сабой у хісткім сутонні няўлоўна сінія, пудлівыя цені, і, не зважаючы на позні час, яшчэ калі-нікалі чутно было, як у шырокіх сутаргах шуму сцінаўся і выпростваўся горад. Я ўгледзеў нейкую жанчыну, што ішла напярэймы нашай машыне, нікольկі не прыспешваючы крок, і калі да яе аставалася ўжо метраў з дзесяць, я зразумеў, што яна нічога не бачыць перад сабой. Таксіст тармазнуў, і жанчына падняла галаву, ненатуральна цвёрда выпрасталася, а потым разгублена прыклала руку да лба. І высільвалася ўсміхнуцца.

— Эй ты, графіня,— крыкнуў таксіст, прачыняючы дзверцы,— вочы твае дзе? Якую сябе данясеш мужу?

І з ляскатам зачыніў дзверцы і чамусьці павесялеў. Намацаў рукой на шчытку кнопку прыёмніка — і палілася музыка, такія знаёмыя акорды: быццам над вадой калыхаўся туман, а праз яго ўсё намагалася і намагалася прабіцца сонца, і прабівалася нарэшце, паволі праганяючы змрок, паволі разліваючыся журблівым у сваёй нетаропкай упэўненасці святлом.

— «Паланез» Агінскага,— сказаў таксіст.— Класная музыка.

Ах, Міхал Кляофас, які ў цябе зайздросны лёс! Табе выдумалі прыгажосць, бездакорныя манеры, салодкае, хоць і нешчаслівае, каханне да нейкай кволай паненкі, і вечары за клавесінам, і яшчэ адзін, апошні вечар з ёю, ужо чужою жонкай, перад развітаннем з радзімай. Во і гэты таксіст, круглатвары, малады яшчэ мужчына, не больш за сорак год, з густымі светлымі валасамі, з нізка напушчаным на шчокі мысікам бакенбардаў, са шрамам на падбародку,— во і гэты таксіст нахвальвае і твой «Паланез», і «Танец маленькіх лебедзяў», і яшчэ нешта, ну тое, дзе спяваюць: «Ах, зачем мы, горемычные, родились на этот свет?» Во, во, «Аскольдава магіла». Ён кажа, што цяпер не пішуць ні музыкі, ні кніг, як некалі, што тады пісалі дзеля душы, сядзелі ў маёнтках і пісалі, і таму музыка была — першы клас, а цяпер ён ведае аднаго пісьменніка, якому памагаў даставаць новыя скаты, і той пісьменнік прызнаўся яму, што трэба рамантаваць «Масквіча», а грошай няма і таму трэба хутчэй садзіцца за новую кніжку. І нібыта той пісьменнік падарыў яму адну сваю кніжку, але ён, таксіст, чытаць яе не стаў.

Ён паблажлівы, праставаты і адначасова самаўпэўнены, гэты таксіст.

Я разумею: у яго свой новенькі дом недзе на ўскраіне горада, і халадзільнік, і тэлевізар, і на двары сабака на ланцугу, і школьнік-сын іграе на нейкім інструменце, і жонка, якую ён прывёз некалі ў горад аднекуль з-пад Плешчаніц, ужо начамі не спіць, думаючы, як бы ўладкаваць дачку ў школу з англійскай мовай навучання. А ў мяне няма пакуль ні ўласнага дома, ні «Масквіча», дык чаму мне не заступіцца за сучаснасць? І я кажу яму, што не, ён памыляецца, што і кніжку таго пісьменніка трэба прачытаць, і што мас-

тацтва наогул належыць народу, і што, калі ёсць тэлевізар, можна не хадзіць у кіно, і што цяпер кожны ведае, што Шэкспір — гэта галава, і Аркадзь Райкін — галава таксама. І што ён, гэты незадаволены таксіст, можа запатрабаваць, калі захоча, у любога кампазітара песеньку пра зялёны агеньчык свайго таксі ды і наогул пацікавіцца, калі той кампазітар апошні раз быў у камандзіроўцы.

Ён не пагаджаецца са мной, злуецца, і яму раптам пачынае не падабацца дым цыгарэты, якую я куру, і ён кажа, што многа нас такіх бывае ў яго за дзень і калі кожны стане... Адным словам, я тушу цыгарэту і маўчу, а ён выключае прыёмнік. На развітанне я падаю яму рубель, і ён бурчыць, што не зможа знайсці дробязі на здачу, але я маўчу і не думаю вылазіць з машыны: мне цяпер ужо зусім не хочацца ўласнымі рукамі пакласці цагліну ў той мураваны скляпок пры садзе, якога яму, відаць, адно не хапае, каб цалкам пераключыцца на жыццё для душы.

Я чакаў, і ён пачаў адлічваць здачу, усім сваім выглядам выказваючы пагарду да мяне, знарок вышукваючы, я бачыў гэта, адны медзякі. Ён шырока кінуў мне іх на далонь і адразу ж выключыў у таксі верхняе святло — і гэта была зноў пагарда, і тады я сказаў, што грошы, наогул, любяць падлік, і папрасіў, каб ён усё ж уключыў святло. Ён, мусіць, не чакаў ад мяне такой настырнасці, бо адразу ж, паспешліва ўключыў святло: цяпер ужо я паволі, знарок паволі пералічваў медзякі, вырашаючы, даць адзін з іх яму на чай ці не. Потым я падумаў, што дастаткова правучыў яго, і толькі дазволіў сабе падкрэслена далікатна развітацца і, не спяшаючыся, зачыніць з другога боку дзверцы. Ён газануў так моцна, што ледзь не заглух матор: машына рванула з месца, суха стрэліўшы ў мяне дымам. Цяпер я не зайздросціў пасажыру, які пасля мяне сядзе да яго.

Неспадзяваная прыгода крыху развесяліла мяне, і толькі перад дзвярамі Эмінай кватэры я ўспомніў, што ўжо даволі позна і што, мусіць, гэта нядобра так зняпацку парушаць сумленна заслужаны пенсіянерскі спакой ды яшчэ падымаць з пасцелі тую пару, асабліва калі яны, можа, якраз памірыліся цяпер і не наракаюць адно на аднаго, хіба, можа, на лёс ці на бога. Пазваніўшы, я ўслухоўваўся ў цішыню за дзвярамі і

ўзрадаваўся, калі ў калідоры неўзабаве нехта гучна зашлэпаў: дзверы нечакана адчыніліся, мне ў твар ударыла святло, і я міжвольна адступіў убок. На парозе стаяла нейкая высокая, як падалося мне, жанчына — можа, такою рабілі яе доўгі, з таліяй ледзь не пад пахамі, халат і маленькая галава, абкручаная нанач хусткай, з-пад якой неяк бездапаможна наіўна вытыркваліся вялавата-ружовыя, прыплюснутыя вушы. Жанчына войкнула і захінула халат на грудзях і, перагінаючыся, дробна патэпала ў заліты святлом калідор, неяк прама, нягнутка стаўляючы ногі, учапілася за ручку дзвярэй, што вялі, мусіць, у залу, і, ужо супакоеная, востра глядзела на мяне. Мне было смешна, я моўчкі ступіў за парог: у жанчыны цяпер быў той непрыемна пэўны, аголены выраз твару, калі чалавеку ўсё роўна, што думаюць пра яго.

— Эма дома? — як мага абыякава спытаў я, і жанчына раптам, нібы спахапіўшыся, павяла плячом і моўчкі схавалася за дзвярамі. Бог ведае што хацела яна гэтым сказаць: мусіць, зноў у яе сышоў муж, і яна паказвала, што наогул не хоча мець справу з нашым братам.

Добра, што якраз выйшла Эма, і мне спадабалася, што яна не здзівілася, убачыўшы мяне, заўсміхалася і неяк трошкі манерна падала руку.

— Ах, Жэнік,— сказала яна,— які ты смешны! Ты сёння не выпіў, не?

— И вот за подвиги награда,— знарок журботна сказаў я.— Чаго ты не радуешся? Чаму глыбакадумна не кажаш: лепш позна, чым ніколі? Навошта расчароўваеш мяне?

— Я цябе не бачыла цэлую вечнасць...

Яна ўсміхалася, трошкі ленавата ўсміхалася, як заўсёды, і жмурыла вочы, схіляючы набок галаву, і, дальбог жа, неяк закахана глядзела на мяне, і мне было гэта прыемна. Толькі нейкая перамена была ў ёй, але якая, я не мог адразу вызначыць.

— Заходзь,— сказала яна і расчыніла дзверы, і я прытрымаў іх рукой, другой узяў яе за плечы і асцярожна падштурхнуў у пакой... Яна стаяла пасярод пакоя, усміхалася, жмурачы вочы, і ўсё глядзела на мяне: мне нават стала няёмка. Я сапраўды даўнавата быў у яе і, мусіць, адвык ад яе, ад яе звычкі ўсміхацца і трошкі перабольшваць у манерах — я цяпер успа-

мінаў гэта, і чамусьці ўпершыню падумалася, што яе звычка ўсміхацца — мусіць, ад блізарукасці. Дзіўна, раней гэта ніколі не прыходзіла мне ў галаву, ды і акуляраў у яе ніколі не бачыў.

— Ты сёння ў плацці,— сказаў я.

— Ты смешны, дальбог, смешны... Хаця...

Відаць, яна здагадалася, чаму я так сказаў. Яна не любіла плаццяў і ніколі не насіла іх. Акрамя як, здаецца, на першым курсе. Цёмнае плацце з карункавым каўнерыкам, з высокімі плечыкамі. І яшчэ шырокі пояс з blішчастай фігурнаю спражкай. Тады гэта было модна. Ці, можа, наадварот, тады яе не цікавілі моды. Высокія плечы ёй не пасавалі. У яе і без таго былі высакаватыя, вузкія плечы, і трошкі даўгаваты стан, і вузкаватыя клубы, і стройныя маленькія ногі.

— Сядай,— сказала яна і сама села на канапу.— Сядай, калі хочаш, да стала... Я так стамілася сёння...

Я маўчаў. Яна зрабілася нейкай другой, непрыемна і нават нецікава ленаватай. Вочы не смяяліся больш, яна жмурыла іх, але яны не смяяліся, і, можа, ад таго ў яе моршчыўся лоб. Я сеў у крэсла, пазыркаў вачмі па стале, шукаючы попельніцу,— яе не было. Эма бачыла, што я шукаю попельніцу, але маўчала. Я падсунуў да сябе нейкую пустую накрыўку ад памады і закурыў.

— Дай і мне,— папрасіла Эма. Я кінуў ёй цыгарэту і карабок: яна смешна лавіла іх, саставіўшы локаць у локаць рукі перад грудзьмі.— Я была сёння на возеры. Вядома, пасля работы. Людзей — процьма. І нейкія артысты выступалі проста на пляжы. Па-мойму, гэта смешна. Уяўляеш?

— Уяўляю. Ты была адна?

— ...такі банальны ваш брат. Нідзе не схавацца. І лічаць сваім абавязкам не даваць сумаваць. Божа, але як гэта робіцца!..

— Ну навошта так? Тое-сёе мы ведаем і пра вас...

— Дальбог, хоць вазьмі і напішы кішэнны дапаможнік па знаёмству з жанчынай на вуліцы, у тралейбусе, на пляжы... Жах!

— Зрабі гэта лепш у сябе на радыё... Аўдыторыя і ўсё такое. І слава... Ты ж, здаецца, яшчэ не перастала марыць пра персанальныя перадачы...

— Не смейся... Чаму ты не паступаеш у аспірантуру? Ну, не захацеў тады, але цяпер?

— Ведаеш, давай лепш не будзем...

Што я мог ёй адказаць? Тады, пасля інстытута, мяне сапраўды пакідалі ў аспірантуры. Але я выпрасіў свабодны дыплом. І кніжная навука, і замежныя рамáны агорклі мне. Я адчуў, што нічога не ведаю ў жыцці. Гэта было балюча. Я баяўся і старанаіўся людзей. Я не ведаў, як сябе паводзіць між іх. Я быў нехлямяжы, сарамлівы і гарачліва, затоена хварэў на самалюбства. І я выпрасіў сабе свабодны дыплом. Мне хацелася простага, звычайнага жыцця, хацелася згубіцца сярод людзей, і я ўладкаваўся на працу ў камунгас. Тое, што ў мяне быў дыплом, я ўтаіў. Адукацыю запісаў: дзесяць класаў. Прапіска ў мяне была сталая: тады яшчэ ў студэнтаў была сталая прапіска. Я высаджваў на вуліцах дрэвы, фарбаваў дахі, а зімою разграбаў снег — хацеў быць толькі рабочым, і больш нічым. У мяне не было сям'і, і мне падабалася такую-сякую капейку ад такой-сякой левай работкі пускаць на круг. Мне хацелася ва ўсім быць мужчынам: я не адмаўляўся ад гарэлкі пасля віна і, наадварот, ад віна пасля гарэлкі, і выпіваў запар па два вялікія куфлі піва — раней мяне кідала ў дрыжыкі пры адной думцы аб ім. Калі-нікалі я хадзіў у бібліятэку: было прыемна гартаць часопісы, не спяшаючыся чытаць што-небудзь,— мінімум духоўнага спажытку, неабходны і прыемны, як папяроса пасля абеду. І яшчэ мяне пачалі цікавіць жанчыны. Не ведаю, ці быў у мяне талент да гэтага. Я проста адкрываў для сябе маленькія ісціны: можа, яны даліся мне лёгка, але ўсё ж я ведаю, што не такія і простыя яны. Пасля мне надакучыла ўсё гэта — і выпіўкі, і спатканні, ці, можа, я нават збаяўся за сябе — і пераняміў работу. І стаў былым студэнтам, былым донжуанам, былым рабочым. З пасведчаннем малодшага навуковага супрацоўніка аднаго не вельмі тлумнага музеума.

Аспірантура... Што аспірантура? Я, можа, і не забыўся пра яе. Але з нейкага часу мне вельмі складанымі пачалі здавацца некаторыя ісціны, і я забыўся ўжо, як трэба дысертабельна афармляць іх. Мне цяпер хацелася б да ўсяго дайсці самому, але я не ўпэўнены, ці хопіць у мяне цярплівасці, сілы волі, нарэшце, каб зрабіць гэта. Я нічога не ведаю пакуль, нічога не ведаю...

— Глупства гэта ўсё,— кажу я Эме.— Я зноў ха-

чу жыць. Проста жыць. («Можа, сказаць пра Ларысу?») Як тады, пасля інстытута.

— У тваім узросце людзі жывуць ужо дзеля сям'і.

— Ты хочаш сказаць, што мне трэба жаніцца?

— Хаця б...

— Тады ты, можа, скажаш і з кім? Якая ў яе кватэра, хто цесць і які характар у цешчы?

Я злаваўся. Мне надакучылі ўжо гэтыя размовы пра жаніцьбу. Калі табе трыццаць год і ты не зрабіў да гэтага часу тое, што зрабілі іншыя, кожны лічыць сваім абавязкам апекаваць над табой, паблажліва жартаваць і наогул шкадаваць цябе. Але навошта, каб яшчэ і Эма? І каб гэта сапраўды цікавіла яе, але ж я ведаў, што яна не можа думаць, быццам жаніцьба — найлепшы выхад для мяне. І што гэта нібыта важна. З халасцяка можна пакпіць, можна паблажліва паляпаць яго па плячы; з жанчынай, калі ёй трыццаць год, пра замужжа не гавораць. І гэта, па-мойму, яшчэ горш. А можа, Эма, гаворачы пра мяне, гаворыць пра сябе?

— Ты вось казала пра возера. Ты была там з ім?

Я знарок спытаў так, бо чамусці раптам падумаў, што ён, той малады рабочы хлопец, здаецца, спартсмен, пра якога нехта гаварыў мне і якога Эма нібыта брала з сабой нават у кампаніі з так званымі інтэлектуальнымі выпіўкамі,— на іх ён моўчкі сядзеў пры ёй, загадкавы і спакойна насцярожаны, як целаахоўнік,— можа, ён і ёсць тое галоўнае для яе, чаго я не ведаю і не магу зразумець. І, можа, ён для яе, як для мяне Ларыса?

— Ты позна надумаў пра яго спытаць,— сказала Эма.

— Па-мойму, мы даўно дамовіліся не дакучаць адно аднаму такімі пытаннямі.

— Але ж ты спытаў...

— Ты захацела мяне ажаніць.

— Калі так, то ён для мяне не існуе.

— І не існаваў? Раней — таксама?

— Я цяпер бачу,— сказала яна ціха,— што гэта была банальная гісторыя. Проста... ён у турме...

— Ён заступіўся за цябе, набіў некаму морду і...— Я адчуваў, што гэта не так, але ж мне трэба было сказаць нешта.

— Не, самыя банальныя махінацыі з аўтамабілямі. Капеечны бізнес. Страхавалі старыя машыны, аб-

дзіралі іх, завозілі кузаў у лес і званілі ў міліцыю. Даставалі ці кралі запчасткі. І яшчэ там нешта... Банальна... Ён адтуль нават не напісаў мне.

— Глупства ўсё гэта. Па-мойму, не варта і перажываць... Ведаеш, чаго я ішоў да цябе? Мне захацелася пагаварыць. Успомніць студэнцкія гады. Чамусьці мне падалося, што гэта важна. Помніш наш першы камсамольскі сход? Мы былі ў калгасе на бульбе. А потым абіралі ў садзе яблыкі. І нехта з хлопцаў набраў сетку тых яблыкаў і прынёс дамоў на кватэру. Гэта было чэпэ.

— Чакай, чакай, хто ж гэта?

Здаецца, мне ўдалося зацікавіць яе. Яна ўстала з канапы, каб патушыць цыгарэту, нервова скамячыла яе ў маёй накрыўцы ад памады, села зноў на канапу, падкурчыўшы ногі і неяк здзіўлена гледзячы на мяне.

— Хіба ты забылася? Колька-масквіч. Хоць ніякі ён быў не масквіч. Мы даведаліся пасля. Аднекуль з Падмаскоўя. Памятаеш, тады, на бульбе, ён у капе саломы яшчэ чытаў Ясеніна, і гэта таксама не падабалася нам. Валодзя Дзямешка, дзетдомавец, той, што пасля інстытута падбіў хлопцаў паехаць на Далёкі Усход,— на сходзе здорава за гэта адсцябаў яго. І Васька Столін. Ведаеш, што дзіўна. Тое, што Васька быў год на дзесяць ці болей старэй ад нас, былы партызан, а думаў і адчуваў так, як мы.

— Васька быў харошы хлопец. Таварыскі, бескарыслівы. Ён недзе цяпер на раёне. Мне нехта казаў.

— Ага, на раёне. Я ж летась бачыў яго. Быў там у камандзіроўцы. Няўдала неяк усё склалася ў яго. Жаніўся адразу ж пасля інстытута. Ты ведаеш, у яго ўжо чацвёра дзяцей. І ўсё дзяўчаткі. Жонка ў школе. І сам ён спачатку выкладаў. А пасля заеўся з дырэктарам. Не ведаю за што. Наогул, у яго нейкая манія справядлівасці. Ён стаў накшталт раённага донкіхота. Усё нешта выкрывае, усё з кім-небудзь ваюе. Са школы пайшоў і ўладкаваўся ў канторы «Саюздруку». Тады, як я быў там, рабілі ў яго рамонт. Другі ўжо месяц. Ты ўяўляеш, гэта ў раёне. Ён са сваім табарам абеды варыць на двары. Нават палатку нейкую паставіў. Я кажу: што ты робіш, дзівак? Не ведаеш, як трэба дагаворвацца з людзьмі? Прынцыпова, кажа, не буду і не хачу. Няхай хоць да зімы робяць рамонт. А тады я іх выведу на чыстую ваду. Ты ўяўляеш, ён у іх там за дзі-

вака. А я і яго разумею, і тых раённых людзей. І зло непрываблівае, і дабро, калі яго аж занадта, можа апрыкраць больш, чым зло. Чаму гэта так бывае? Шкада мне стала Ваську. Прапіў я з ім са злосці ўсе камандзіровачныя і хутчэй паехаў адтуль.

— А я не ўяўляю, як ён там жыве, у раёне. Адвыкла я. Дома, у вёсцы, не магу пражыць больш за два дні. Гэта дрэнна, скажы.

— Не ведаю. Гэта, можа, таму, што ты жанчына... Слухай, я ўсё думаю пра тое, якія мы былі тады. Ідэалізм, рамантызм, наіўнасць... Ружовыя акуляры... Смешна, вядома. Але мне чамусьці таго часу шкада. Пасля нас перавярнулася ўсё. Мы былі, здаецца, прадапошнім курсам, які проста перасеў са школьнай парты за інстытуцкі стол. Мы скончылі інстытут, а на нашы месцы прыйшлі другія, з вытворчасці — порскія, грубаватыя, самаўпэўненыя,— на чорта ім быў наш ідэалізм? Ды мы і самі не ведалі, што рабіць з ім. Прэч, прэч ранейшае, нам трэба было паверыць у сябе. Ты мне цяпер не скажаш, што гэта так проста і лёгка. І я не скажу. Ёсць такое паняцце — пераломны ўзрост. Мне здаецца, ён зацягнуўся ў нас. У мяне, у цябе, можа. Не ведаю яшчэ ў каго. Аспірантура тут не выратуе. Мне трэба зноў паверыць у ідэалізм. Не ў той, ранейшы, а можа, у другі нейкі, які не замінаў бы жыццю і жыццё якому не замінала б таксама. Зноў наіўна?.. Чаму ты маўчыш?

— Не ведаю, можа, ты кажаш і праўду. Я таксама... думала неяк так... пра сябе... Я толькі не ўмела ці не адважвалася абагульняць... Ты ўмееш думаць. Я ведаю. Ты заўсёды быў такі.

Яна гаварыла паволі, блытаючыся ў словах, але я адчуваў, што ўнутрана яна спяшалася, нібы старалася як найхутчэй адбыць непрыемную чаргу, і, можа, ад гэтай сваёй разгубленасці сказала камплімент, няўдалы і недарэчны камплімент, думаў я,— хіба я гаварыў дзеля гэтага? Я змоўк і адчужана, нібы ўпершыню, паглядзеў на яе. І мне цяпер стала зразумела тая перамена, сэнс якой адразу не выснаваўся для мяне: яна памажнела, але нейкай той знябытлівай, сіратлівай памажнеласцю, што кладзе на чалавека адбітак не зразумелай нават яму самому трывогі і разгубленасці. І яшчэ гэтае плацце — пляжнага крою паласатае плацце з расклёшаным нізам, з каўнерыкам на манер як у

жакецiку. Плацце было трохi зашырокае i неяк па-няўклюднаму апрошчвала, зблажала яе. Мяне брала шкадаванне. Навошта я прыйшоў сёння да яе? Адкуль мне было ведаць, што нешта перамянiлася, надламiлася ў ёй, што не мне ад яе, а ёй ад мяне па-сапраўднаму трэба было б чакаць палёгкi? А што сказаў я ёй? Кiнуўся ў нейкiя чуллiвыя разважаннi — каму ад гэтага лепш? Ёй не трэба гэтага. Яна жанчына, яна прывыкла i адчуваць, i думаць канкрэтна. Сёння я не памочнiк ёй. Сёння я вельмi сабой заняты. Мне трэба яшчэ прыйсцi да яе. Урэшце, гэта добра, што я сёння прыйшоў. Я падумаю. Мне трэба прыйсцi яшчэ.

— Я пайду,— сказаў я.— Прабач, што зайшоў так позна.

Я ўстаў з-за стала. Яна, не зварухнуўшыся, сядзела на канапе — я падышоў да яе. Узяў за плечы i пастараўся ўсмiхнуцца.

— Уставай,— сказаў я.— На тваiм месцы я перамянiў бы кватэру. Час ад часу гэта трэба рабiць. Мы не ўяўляем нават, як многа значыць для чалавека новае месца. Павер мне.

Я падняў яе з канапы за плечы i асцярожна паставiў перад сабой. Яна не баранiлася, не супрацiўлялася, пакорлiва стаяла, апусцiўшы рукi. Я гладзiў яе валасы. Мне не трэба было рабiць гэта, i праз хвiлiну я жартаўлiва адштурхнуў яе ад сябе.

— Пайду.

На душы ў мяне было горка.

— Чакай,— схамянулася Эма.— Я забыла табе прапанаваць... Ну хаця б кавы. Хочаш? I яшчэ недзе ў мяне ёсць каньяк.

— Не, лепш я пайду. Позна. Лепш другiм разам калi.

Шчыра кажучы, я адчуваў, што сёння мне не зашкодзiла б выпiць. Але, бадай што, не тут i не з Эмай. Мне цяпер найлепш падышла б мужчынская кампанiя. Толькi вось рэстараны, мусiць, закрываюцца ўжо, i каб цяпер трапiць туды, трэба яшчэ падумаць, як спадабацца швейцару. Не, на сённяшнi вечар выпiўка выключаецца. Мне трэба яшчэ ўсё вырашыць з Ларысай. Адна iдэя мiльганулася ў мяне ў галаве. Але перш я павiнен быў зноў знайсцi таксi.

— Я пайду. Не праводзь,— сказаў я Эме.— Зайду пасля.

Яна ўсё ж праводзіла мяне ў калідор да дзвярэй. Я таропка збег уніз па лесвіцы, у пад'ездзе ледзь не збіўшы з ног нейкую закаханую парачку, і апынуўся на вуліцы. Я спыніўся. Вуліца тут была глухаватая, і нельга было разлічваць на тое, каб спыніць таксі. Я ўспомніў, што непадалёк адсюль трамвайная лінія і калі дайсці да яе, блізка будзе перакрыжаванне з кафэ на рагу вуліцы — і недзе там, пастаяўшы, можна чаго-небудзь прычакаць. І нават тое-сёе ўспомніць, бавячы час. Там, у кафэ, некалі пазнаёміўся я з афіцыянткай, з якой ледзь не закруціў быў раман. Але ў той афіцыянткі былі халодныя, незразумела халодныя рукі; праз увесь першы вечар, калі мы пайшлі з ёю ў кіно, я не змог адагрэць іх. І я збег ад яе, а пасля і блізка баяўся падыходзіць да таго кафэ. Мне было і прыкра, і нядобра, і сорамна. Прыкры ўспамін. Я чамусьці шкадаваў цяпер тую афіцыянтку, вельмі востра шкадаваў, нібы абышоўся з ёю так нядобра толькі ўчора. Хваля нейкай незразумелай шкадобліваеці найшла на мяне. Я ўспомніў раптам пра таго хлапчука, Лёню, што званіў сёння мне, і зноў пашкадаваў, што не дазволіў яму яшчэ раз пазваніць мне. А можа, ён званіў? Можа, не прыходзіла доўга тая Лілька і ён не лажыўся спаць?.. Нічога, нічога, надта не перажывай, стары, усё будзе добра — заўтра ён пазвоніць табе. Ва ўсіх будзе добра,— паглядзіш. Вернецца Лілька, прыдумае што-небудзь для сябе Эма — ты паможаш ёй. Толькі трэба давесці ўсё да канца з Ларысай. Паставіць кропку, і ўсё. Не трэба ні міражоў, ні ілюзій, ні юных німфаў,— не трэба ганяцца за хімерамі. Трэба ўзяць сябе ў рукі.

На вуліцы з трамвайнай лініяй сталі пападацца таксі, але ні адно з іх не ўзяло мяне. Гарэў зялёны агеньчык спераду машыны, але таксі не спынялася, і я злаваў, пакуль не здагадаўся, што недзе тут блізка таксапарк і што машыны, мусіць, ідуць на перазменку. І я тады стаў выбягаць наперад кожнай легкавой машыне, і адна спынілася — гэта было якраз таксі, у якім на заднім сядзенні, забіўшыся ў куток, насцярожана туліўся нехта сухарлявы і маленькі ў цёмным простым плашчы. Я сеў побач з таксістам, і мы паехалі, і не паспелі мінуць, можа, якіх два кварталы, як той, на заднім сядзенні, папрасіў спыніцца і хуценька сунуў у далонь таксісту плату, якую, мусіць, даўно ўжо адлічыў. Таксіст, не глянуўшы, апусціў яе ў кішэню,

праверыў за насцярожаным пасажырам дзверцу — ці добра зачыніў, і мы зноў паехалі. Таксіст дастаў пачак папярос і намагаўся закурыць, але ў яго гэта дрэнна выходзіла, і ён сказаў:

— Наступі!

Я патрымаў у руках пачак, і ён дастаў папяросу, прыкурыў ад маёй запалкі і заклапочана пачухаў астрыжаную патыліцу. Ён быў маладзей за мяне, лабасты, бязбровы, з вузкім унізе тварам, якому надавалі нейкую хлапечую няўклюднасць адтапыраная верхняя губа і кароткі падбародак?

— Ехаць куды?

— Чыгуначная, сем, насупраць аптэкі.

— Ага, ведаю той дом. Жывеш?

— Не, даўно не бачыў. Хачу паглядзець.

— Ну, ну...

Ён, мусіць, падумаў, што я жартаваў. Але я не казаў больш нічога, і ён змоўк, і так мы маўчалі, аж пакуль не прыехалі пад той дом, і я папрасіў яго спыніцца якраз насупраць балкона.

— Так,— сказаў я.— Цяпер трэба пасігналіць. Раз, два, тры... Як гучней.

Дзверы на балкон былі расчынены: люстра ззяла пад столлю, чулася музыка, але, мусіць, не з гэтага, што з балконам, пакоя, а з бакавога. Каб танцавалі, не было чуваць.

— Мы павінны тут некага ўзяць?

— Не. Пасігналь, друг, прашу. Нічога страшнага — тут не праспект.

Ён пачаў сігналіць: трэба сказаць, стараўся ён добра. І вось на балконе паявіўся жаўтароцік, а за ім другі, з круглатварай дзяўчынай,— яна ўсё чаплялася за хлопцаву руку. Я прачыніў дзверцу і пачаў наглядаць.

— Воўка,— сказаў другому першы,— машыну калі-небудзь бачыў? Глядзі! Во гэта і ёсць машына.

— Што, што? — знарок грозна пасунуўся той на яго, прыціснуў грудзьмі да балкона і, крэкчучы, стаў нагінаць яму галаву. Дзяўчына аж заходзілася ад прытворнага смеху і вісла ў свайго хлопца на плячы. Але ім скора надакучыла гэта, і, перагнуўшыся цераз балкон, яны сталі цікавацца за намі.

— Эй, таксіст,— крыкнуў той, што выйшаў з дзяўчынай,— горад Рыо-дэ-Жанейра прыгожы — скажы?

— Які ён таксіст! Ён вадзіцель калгаснай кабылы.

— Хлопчыкі, я зараз скокну з балкона. Хто за мной?

— Пасігналь яшчэ,— папрасіў я таксіста.

— Дурнота,— сказаў ён.— Розуму на капейку, а прыкідваюцца на рубель.

Пакуль ён сігналіў, яны гарлапанілі там, на балконе, а потым адразу сціхлі, як толькі мы перасталі сігналіць. Таксіст выйшаў з машыны і пачаў нечага прыглядацца да дзверцы, адчыняў яе і зноў зачыняў.

— Што там такое? — спытаў я.

— Прыватнік адзін, разява, пацалаваў. На павароце. У стаяк дзверцы гваздануў. Каб не туды — прашыла б наскрозь... Адкручваўся, не хацеў чырвонец на рамонт даваць. Ды міліцыі збаяўся, каб не наскочыла...

— А ў самога што?

— Фару паплюшчыла трохі. Ярунда! Нават лямпачку не пабіў. Паедзем, ці што?

— Зараз паедзем.

Няхай бы гэтыя, што на балконе, хутчэй ужо ішлі. Урэшце, не падслухоўваць жа, не вывіжоўваць прыехаў я сюды. Там, у Эмы, калі мільганулася думка пра таксі, спакуслівa пamроілася мне развітанне. Банальнае развітанне, як у старым рамане, хіба толькі з умоўна пралітай слязой. Прапылены пілігрым стаіць ля чужога парога. І ніхто не пазнае яго. Нават яна. І ніхто не ведае, што тут разбіта ягонае сэрца... Шкада... Рамантыка разладжвалася; якая там рамантыка, калі во гэтыя вісяць на балконе, падбіваючы на зусім не сентыментальныя пачуцці. І яна не выходзіць на балкон.

— Ларыса! Ларыса! — крыкнуў раптам нехта на балконе, і ў мяне ёкнула сэрца.— Ідзі сюды!

— Не крычы,— сказала дзяўчына.— Яны там са Светкай мыюць на кухні посуд... Пайшоў бы памог.

— Мярсі! Я згодзен, але толькі з табой...

— Паедзем? — зноў спытаў таксіст.

— Паедзем? А хто сказаў, не паедзем? Мы ўжо едзем,— сказаў я. Рамантыка разладжвалася. «Яны там са Светкай мыюць на кухні посуд». Рамантыка канчаткова разладжвалася... Ну што ж, няхай будзе горш для яе.

— Газуй! — сказаў я, і мы паехалі.

— Смаркачы,— загаварыў таксіст.— Яны сапсавалі табе ўсё. Хто і хацеў пачуць сігнал, падумаў, што прыехалі да гэтых... Што ў іх, выпіўка там?

— Відаць.

— У мяне ў гэтым доме знаёмы быў. Жыў тут. Пасля развёўся з жонкай, нават кватэру пакінуў ёй. Але ў нядзелю, як падап'е, заўсёды прыязджаў сварыцца. На таксі яго сюды вазіў.

— У мяне другое,— сказаў я.— Доўга расказваць. Калі-небудзь другі раз.

Як толькі паехалі, мне раптам абыякавае стала ўсё: Ларыса, тыя яе жаўтароцікі, няўдалае развітанне,— мне проста хацелася дамоў. Справа зроблена, і ўсё. Даволі. Хопіць на гэты дзень. Ларыса... Што Ларыса? Ніхто мне не паможа, калі не памагу сабе сам... Мне проста хацелася дамоў. Але мне не шанцавала, вельмі не шанцавала, як на злосць: мінут на пятнаццаць нас затрымаў чыгуначны пераезд, а потым мы не змаглі завярнуць у адну вуліцу — там быў перакапаны брук, і нам давялося рабіць круг і ехаць на вакзал, дзе, нягледзячы на позні час, была яшчэ чарга на таксі і сталі на доўгай пустой плошчы, выстраіўшыся ў рад, палівачныя машыны. Мы выкіравалі адтуль на праспект, пустынны і нейкі асабліва шырокі цяпер, скупа прывіднены жаўтлява-зялёным святлом, і ехалі амаль сярэдзінай асфальтавага палатна, абганяючы нячастыя ўжо аўтобусы і тралейбусы. А потым завярнулі ў маю вуліцу, хоць мне можна было выйсці і на праспекце,— я разлічыўся з таксістам і пайшоў, не чакаючы, пакуль ён развернецца, каб ехаць назад.

І зноў быў ліфт, была непрыемная расслабленасць ва ўсім целе — і потым зноў я сядзеў на кухні і перачытваў Міліну тэлеграму, але цяпер яна чамусьці не кранала мяне і нават не хацелася думаць, навошта паслала яе Міла. Ну паслала, ну і што? І падпісала яшчэ Станіслава Бацькавіча, а я вось сяджу ў іхняй кватэры,— ну і што далей? І, наогул, навошта я тут? Хто я пры іх: друг дома, бедны сваяк, кватарант-нахлебнік ці проста кватарант? Мне заўсёды было прыемна думаць, што я тут, як свой. Міла, пэўна, і хацела, каб так было, але што думае пра гэта Станіслаў Бацькавіч і што ён наогул павінен думаць пра мяне,— чаму гэта заўсёды было мне ўсё роўна? Ах, як гэта дасціпна: раіць Эме перамяніць кватэру і не бачыць, што самому, можа, даўно пара ўжо з'ехаць адсюль.

Я згроб са стала тэлеграму, скамячыў яе і кінуў у вядро для смецця. У роце ў мяне было пагана, горка, і

я падумаў, што сёння больш не трэба курыць, а лепш хутчэй бы легчы спаць,— вось хіба не зашкодзіла б перад тым залезці ў ванну. І я, не спяшаючыся, напусціў у ванну вады... Я ляжаў, заплюшчыўшы вочы, слухаючы, як аднастайна, напорна б'е з-пад крана шумлівы струмень, і цела маё паступова прывыкала да гарачыні, і я не хацеў ні пра што думаць, акрамя хіба таго, што мне прыемна. Шумела вада, ішоў час, і ўсё тое, што яшчэ нядаўна здавалася значным, турботлівым ці балючым, адступіла некуды і ўжо не мела ўлады нада мной, і калі я праз колькі часу вылез з ванны і, седзячы за сталом, піў гарачы, крута заварaны чай, было адчуванне, нібы я другі раз нарадзіўся на свет. Затуманіліся, запацелі ад пары, нібы заінелі, на кухні вокны, і мне здавалася, што на дварэ зіма, што я не ў горадзе, а недзе ў вёсцы: прыйшоў з лазні па рыплівай ад марозу, мутнавата-іскрыстай сцежцы, бо яшчэ шыза, малінава гарыць над лесам халоднае неба,— кінуў у сенцах мяккі, распараны, вострапахучы венік, адчыніў дзверы ў хату, дзе ярка ўскідваецца на камінку агонь і кіпіць на трынозе чыгунок з вадой, куды ўжо маці кінула вехцік сухога маліннiку... І вось я сяджу за сталом і п'ю чай, і блакітна адсвечвае замерзлае акно, і гуляюць па хаце пудлівыя, вясёлыя цені... Хораша!

Але што гэта? Ах, звоніць тэлефон... Тэлефон? «Дык гэта ж, мусіць, Лёня!» — думаю я і, устрывожаны, бягу ў прыхожую, здымаю трубку і адразу кажу:

— Лёня? Што там такое, Лёня? Яшчэ не прыйшла Лілька?

І мне ў адказ цішыня,— нейкая незразумелая цішыня, і я адчуваю, што нешта сказаў не так і што не тое, што я чакаю, мне хочуць сказаць, але я нічога не разумею, і мне пакутліва цяжка. І потым голас, такі знаёмы, трошкі разгублены голас,— як яму цяжка перайначыць сябе:

— «Гэта я, Чырвоная Шапачка,— сказаў Шэры Воўк бабуліным голасам».

— Ларыса? Адкуль ты звоніш, Ларыса? Ты яшчэ не спіш?

— Я ў горадзе... Званю з аўтамата. Што гэта ў цябе там... за Лілька?

— Лілька? Аднаго хлопчыка сястра. Ты ўсё роўна не зразумееш... Я потым раскажу...

Я не чакаў гэтага званка: я быў разгублены і па-

дзіцячы, па-дурному рады,— о, хоць бы не паказаць ёй гэтую радасць!

— Я праводзіла гасцей... І цяпер у горадзе. Блізка ля твайго дома... Чаму ты не прыйшоў? Я табе званіла. Дзе ты быў?

— Блукаў па горадзе і аплакваў свае дзевятнаццаць год... Ты цяпер адна? Дзе мы сустрэнемся? Я зараз прыйду цябе праводзіць...

— Бедны мой,— сказала яна,— табе, можа, было сумна? Хочаш, я прыйду пад твой дом? Я скора... Тут блізка. А потым ты правядзеш мяне дамоў. Згода?

Яна павесіла трубку.

Я раптам адчуў прыемную, да абмарачэння, да кружэння ў галаве, слабасць. Можа, гэта таму, што нядаўна з ванны. Цела маё было лёгкае, як пушынка. І яшчэ я адчуваў свой твар. Я адчуваў, што ён сумны. Я радаваўся, а твар быў сумны, ён нібы застыў. Тады я ўключыў у прыхожай святло, падышоў да люстра і глянуў на сябе. З туманнага шкла мяне адчужана і сур'ёзна вывучалі нерухома сухія, нязвыкла светлыя вочы, і свbadіўся бледнаю маскаю твар, схуднелы, з нейкай хваравітай кволасцю ў рысах твар. «Ну што, сумуем? — сказаў я ўголас.— Трэба ўсміхацца. Паспрабуем усміхнуцца — ну давай!..» І я ўсміхнуўся: мне здалося, што затрымцела шкло, у ім тарганулася, калыхнулася бледная маска, а потым кругла, зіхатліва-мякка праступіў твар, і на ім ажылі, заіскрыліся, пацямнеўшы, паглыбеўшы, вочы...

«Вось так,— сказаў я сабе,— вось так, Свет Іванавіч, былы донжуан».

У мяне шырока гохкала сэрца, і я быў па-дзіцячы, па-дурному разгублены і шчаслівы.

1965

СМАЛЕННЕ ВЕПРУКА

Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным, ільсняна халодным зяленівам б'е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва, пасівела ў

гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымнела паветра. Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі. Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле.

І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою ў вёсках свяжуюць вепрукоў.

Мне даўно хацелася напісаць адно апавяданне і назваць яго так: «Смаленне вепрука». Цяпер я ведаю, што, бадай, не напішу: баюся, каб тое, пра што хацеў напісаць, не прыцішылася няўзнак, а то і не згубілася там, у здзейсненай пісаніне, а яно ж мне самае важнае. Дык навошта ж тады згадваю і навошта пішу? Мне проста падумалася, што, можа, усё ж абзавецца на астачу нейкай логікай тое, што тут раскажу. Паглядзім.

Я жыў тады ў нечапанай частцы горада, калі надумаўся пісаць, у старым раёне, забудаваным няўклюднымі цаглянымі, а найбольш драўлянымі дамкамі, што ўсцяж патаналі ў садах. Цяпер мала засталося ад таго раёна — адны лапінкі, астраўкі, заціснутыя кварталамі несамавітых бязверхіх дамоў. Засталіся ля новых будынін, побач з дзіцячымі пляцоўкамі, то крывая кашчавая яблыня, то вішня, што вырасла ў дрэва,— купчастая ў кроне і тоўстая ў камлі. І засталася яшчэ вуліца, хоць і старая, але шыракаватая і роўная, бо быў гэта некалі брукаваны тракт. Назву яму памянялі, адхрышчваючыся ад даўніны, але не памянялі і нават забыліся даць назву базару, што месціцца пры той вуліцы і завецца ён па-старому — Конскі базар.

Увосень, кожнай раніцы ў нядзелю, чуваць было, як парыпваюць на маёй асфальтаванай вуліцы вясковыя вазы, як цокаюць капытамі коні і як вішчаць і рохкаюць у драбінах падсвінкі. Пазней, калі ўстанеш, расходзішся ад сну, паснедаеш, а потым пойдзеш па цыгарэты ў блізкую краму — не прабіцца будзе да прылаўка праз чужых, негарадскіх людзей. Таўканіна, гармідар, і нетутэйшыя дзядзькі гукаюць нечага ад касы да цётак, што стаяць у чарзе, і для большай пэўнасці на мігах нешта паказваюць ім... А на пустцы ля крамы ўжо атабарыліся цыганы. Жанчыны сядзяць з дзецьмі; гарлапаняць, нібы ў полі, увелькі з сваёй модай кудлатыя дзецюкі. Конь, выпражаны з калёсаў,

цягне сена з драбін, клыча яго ды матляе галавой, нібы: «так, браткі, так!» — хоча сказаць гаманкой кампаніі падпітых мужчын. Нібыта конь той ведае, што цыганы ёсць цыганы,— ім усё можна...

Вось так было, а можа, бывае і цяпер на тым гарадскім лапіку, дзе застаўся Конскі базар, вось так было тою парою, калі ідуць халады, калі бяруцца ўранку прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы.

Тою парою, калі ў вёсках свяжуюць вепрукоў.

І ў апавяданні павінна была згадвацца тая пара і павінна была чуцца вёска: пах падмерзлых трэсак на дрывотні, тарахценне трактарка ля фермы, і на шумавым фоне гэтым — гулкім ёкатам галасы людзей, спалоханы гэгат гусака на тарфянішчы, настылы звон калодзежнага вядра і нечакана — пругкі выпад ветру канаўскасы, а над усім, а ва ўсім павінна была быць каменная, зацятая маўклівасць зямлі, травы і схаладнелага, шурпата-шызага неба. Вось што трэба было *загнаць у падтэкст*. А як загнаць, я не ведаў. Трэба было, каб адчувалася, як выходзіць на ганак чалавек, як ляскае за ім, а пасля дробна брынчыць клямка; ён чуе гэта, але і наваколле пачынае ўжо валодаць ім, і вось тут, на самай трэшчынцы ўвагі, услед за скавышлівым павевам ветру, сарока з-за пуні махнецца яму ў вочы тугою сваёй чарнатой, спалохаецца, кульнецца ўгору, востра бліснуўшы гэткай жа тугою беллю, і саслізне, падламаўшы крылы, у агарод, і на плот сігане адтуль, і трывожна зачачэкае, закалышацца там... «Бач, як бы чуе ўжо»,— раптоўна падумае ён і ўспомніць свой сённяшні клопат і знарок безуважную жончыну стараннасць, калі раніцой стаўляла ў печ вядзерныя чыгуны з вадой... Ён падманна, нібы нейкі другі знайшоўшы сабе клопат, прыпыніцца на ганку і твар падставіць ветру, і вочы яго трывожна будуць убіраць у сябе наваколле, і нябачна накрэсліць там яму гонкі вецер і сум палёў, і халодны вобмарак травы, і перадзімовае трыванне дрэваў...

Так ён будзе стаяць, і ў яго будуць варушыцца бровы. Ён пачуе, як зарохкае ў пуні вяпрук...

...есці яму сягоння дадуць чым пазней, каб так, угаладаўшыся, лягчэй абмінуў ён здагадку пра тое, што прызначана яму на гэты дзень. Але ж гэта, можа, і насцярожвае яго. Ён яшчэ і не здагадваецца ні пра што, адно трывожыць яго, чаму *гаспадыня*, выходзячы з сен-

цаў на двор, не хоча падаць на ягонае рохканне голас, чаму з дурным кэрханнем, з бязладным лопатам крылаў пазляталі з седала і раней часу кінуліся да ганка куры. Пах пракіслага хлеба і паранкі чуваць яму, чутно, як нямірна сакочуць, не падзяліўшы нешта, куры на двары і цвёрда шкрэбае аб ганак дзюбаю певень, як разладжана, роспачным нейкім голасам, злуецца на курэй гаспадыня. Але аціхае пасля ўсё, і зноўку трэба чакаць і нудзіцца. Ды вось, нарэшце, тое, што не можа быць падобным на падман: тупанне ў сенцах, знаёмы шоргат мешалкі і галасы, і другі, глушэйшы і спакайнейшы голас,— гэта *гаспадар*. І адчыняюцца сенцы, і бухаюць дзверы, прадракаючы міг нечакана хісткай, поўнай незразумелага сэнсу цішыні. У ёй і галасы інакш чуваць: таропка-сцішаны — гаспадынін і коратка-круглы, цёмны — гаспадароў. Тады зноў як бы рушыцца, абрынаецца ўсё, паглынутае новай, яшчэ больш незразумелай цішынёй. Гаспадара не чуваць (застаўся на ганку?), і ўсё бліжэй, бліжэй да пуні гаспадыніны крокі...

Ён пачынае хламкаць, сутаргава і рашуча, як бы напярэймы той няпэўнасці, што раптоўна пасялілася ўжо ў ім і гняце яго. І гэтак жа рашуча, як пачаў, у нейкі міг перастае ён есці і, злосна рохнуўшы, востра ўскідвае лыч і нюхае паветра, але хваравіта-няўцямна, тужліва глядзяць у пустату яго маленькія, кволыя вочкі, і ўжо чамусьці няможна даверыцца яму ні асцярожлівай ласцы ў гаспадыніным голасе, ні паспешлівай яе руцэ, што дрыготка казыча за вухам. Рашуча і злосна ён зарохкае зноў, а потым нечакана жорстка калыхнецца ўбок аграмадна-гладкім сваім і грузным тулавам і напружыць карак, адступаючы назад і перастаўляючы пад сабой недарэчна круглыя, кароткія ногі. Каб умеў, падзівіцца мог бы ён, як тое рохканне неспадзеўкі слаба і нудліва абзавецца ў ім, не прарочачы ўжо нічога, акрамя бяды, бо не так убачыць ён, як учуе, што гаспадарова постаць непазбежна і цёмна набліжаецца ўжо да варот і забірае, засланяе сабою светлы прахон на двор. Не будзе ўжо гаспадыні, і застанецца ён сам-насам з гаспадаром. І будзе ён кідацца па пуні, рохкаць і тужыць, і нерухома будзе стаяць гаспадар, мусіць, беспамылкова зазнаўшы, што цяпер непатрэбны і марны быў бы любы падман: трэба лепей набрацца цярплівасці і чакаць, можа, нават выйсці за

вароты, на двор — набрацца цярплівасці і чакаць. Ён і зробіць гэтак, і ўжо з-за варот пачуе, як ураз аціхне, перастане рохкаць вяпрук, як потым будзе бэрсаць ён лычом падсцілку, то прыслухоўваючыся, то пачынаючы непакоіцца зноў, як аберне ён цэбар з мешанкай, і, нарэшце, рашыўшыся, пойдзе да варот. Гэта будзе самы трудны міг, калі трэба спакойна хіснуцца з-за вушака напярэймы яму і выставіць перад сабою дула ружжа, і старацца не чуць, як у грудзях цёмна чохкае, шырыцца сэрца, і цэліцца, блізка наставіўшы дула, ва ўяўную плямінку пад брывом, пад кароткімі, белымі, пруткімі вейкамі, і бачыць тужлівую, амаль па-чалавечы асэнсаваную пакору ў тым, як, змірыўшыся з непазбежнасцю, усё чухае, чухае ён безабаронным каркам аб вушак... Вось і ўсё.

І далей ужо няцяжка будзе ўявіць працяг. Уявіць ладнаватыя санкі, ну тыя, і фасон і памер якіх чалавек свядома ды з разлікам падладжваў пад сваю мажлівасць ды пад свой імпэт, каб выпадкам можна было і добрую вязанку дроў па шаранку прывезці з лесу, каб і малое магло ўправіцца з імі на зледзянелай горцы, каб і нядужага дзядка можна было прытарабаніць марозікам дамоў з суседавай лазні. Вось і абернуць тыя самыя санкі, і ўскоцяць яго на іх, і павалакуць па рэдкіх лапіках ранняга снегу ці па камлыжнай восеньскай зямлі куды-небудзь за пуню, у алешнікавы зацішак на лажку, і непарадак нейкі ўраз угледзіць сарока ў тамтэйшым гаспадарчым жыцці — застракоча, зашастае па алешніку ды па платах.

Вось і ўсё. Вось што, акрамя ўсяго іншага, павінна было адчувацца, трызніцца ў тым апавяданні.

А сама задума мыслілася так: ну, скажам, недзе ў нейкім горадзе, у вялікім свеце сярод людзей, жыве *сын* — магчыма, жанаты, а можа, і не. У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве, гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук — хударлявы, бледны, шыракароты; парывісты і адначасна ціхмяны, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа, і можна сказаць, што яна была надзелена здольнасцю разумення і хацення дабра, і разумення людзей, але не таго хцівага, саманадзейнага разумення, заручанага з адным днём, а другога, журботнага і трохі безнадзейнага, без выгодаў для сябе: яно благога чалавека прымушала шкадаваць гэтак жа,

як і добрага,— хаця б за тое, што ён благі. Але гэта — пасля. Пачаць трэба было б з ранняга юнацтва, з той пары, калі чалавек адчувацць сябе можа бадай што вясновай пупышкай; вось толькі што ўзарвала тугую сваю абалонку яна,— о, салодкі міг вызвалення, небяспечная ласка сонца ў трызненні далёкіх дажджоў! І навальніца прыйдзе, і сутаргава разарве неба маланка — не раз і не два,— і выблісне сонца, і ападзе цёплы дым над арэшынай, і не скажа маланка, для якой завязі згубны быў яе халодны зялёны прамень... Але вось — маладосць, і герой наш і жыць спяшаецца, і адчуваць жыццё прыспешвае сябе. «Бывай жа, родная засень, і родная хата,— думае ён,— і ты, маці, не глядзі так трывожна ўслед»,— і галаву яшчэ не горача пячэ ранішняе сонца, і ў крыніцы, што так сцішна жыве пад засенню родных ліп, яшчэ так багата бруістай вады.

Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё. Ды і што тут было ашчаджаць ці шкадаваць! Яму здавалася, што не можа быць на свеце чалавека, які, уведаўшы, не палюбіў бы яго: ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові, нечакана задумлівым рабіўся ягоны пагляд, і здавалася тады, што цішыня, высокая і сцярожкая, вырастала за ім, і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за спіной. І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва-вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца.

І вось сядзеў ён аднойчы ў добрага знаёмага ў ягонай кватэры за на скорую руку, без жаночай помачы накрытым сталом. Гаварылі, маўчалі, бралі чарку і маўчалі зноў. Гаспадар, лысаваты, цыбаты, біты жыццём і разумны чалавек, доўга нешта — ламаліся запалкі — не мог прыкурыць цыгарэту. Нарэшце натрапілася добрая запалка, і ён прыкурыў, і нечакана, з нейкай незразумелай горыччу, засмяяўся сам сабе, а потым сказаў:

— Ведаеш, быў я ў маці... Зіма. Сумнавата. Вечарам старая паставіць чыгунок з бульбай на комінак: сядзім з ёю, глядзім на агонь, гаворым ці маўчым —

во як зараз з табой... І хораша неяк, то бяздумна, то трывожна мне. Закуру крамную папяросу, а яна патухне зноў. І зноў я запалкай чырк ды чырк. А маці тады ціха так кажа мне: «Дык няможна так псаваць запалкі, сынок... Можа, ад вугольчыка прыкуры, га?» І, ведаеш, аж скаланула мяне ўсяго... Не тое каб сорамна стала перад ёй,— не запалак жа маіх шкадавала яна мне,— а падалося мне, браце... — ён лёгка, усмешліва зыркнуў на субяседніка і, нібы збаяўшыся сваёй той расчуленасці, зарагатаў: — Што скажаш, га? А каб жа ты ведала, думаю, колькі мы, такія харошыя, тых запалак рублёвых па рэстаранах ды піўных у адзін вечар кідаем, га?

І пасмяяліся, і памаўчалі, і ўзялі па чарцы яшчэ.

Пасля ўсталі яны з-за стала, і гаспадар хацеў праводзіць госця, але той адмовіўся, сказаў пра гэта прабачліва і ціха, і гаспадар зразумеў, што, можа, так і трэба, што пасядзелі і памаўчалі яны добра, а ў чым паразумеліся, здагадаецца кожны сам.

Тады госць наш развітаўся і памалу пайшоў на вуліцу. Вечарэла. Сонца нізка стаяла над горадам і лена, холадна біла ў вокны, у бляшаныя дахі дамоў залаціста-барвовым, безуважным святлом. Трамвай звінеў недзе, і пах, астываючы, нагрэты за дзень асфальт, і пахла, можа, чуйней за ўсё, прапыленай цэглай і фарбай. Была пустою вуліца; ён ішоў, а даўгалыгі цень лажыўся на дарогу і соўгаўся паволі, нібы папіхаючы сябе, і раптам побач, ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна ціўкнула птушанё. Гэта як бы знак нейкі быў, і ён спыніўся і паглядзеў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэз, павеў скразняковага ветру калыхнуў лісцё, і цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне, і зноў прыцішана-жаласна ціўкала птушанё. Тады ён прыгледзеўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блізка, тое сумна натапыранае, шэрае птушанё, гэтак бясконца, незразумела адзінокае ў знаёмай яму і, мусіць, не першы раз аблюбаванай засені падвечаровага куста. На сцяне, на лісці, на вялікіх прасцягах горада памірала сонца, і што адчуваў, каму і на што жаліўся ён, гэты жывы маленькі камячок, натомлены за дзень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо зусім і незразумелым клопатам? Што гэта было: страх, натужнае чаканне непасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна адчутая адасобленасць ад усяго

і разлад з усім? І ці не так трывожыць, гняце незразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека тужлівая палоска расхінутай на захадзе вечаровай зары?..

Так падумалася яму, і ён сцепануўся ад іншай, непрадбачна вострай думкі, што прыйшла разам з гэтай, але якая ўжо, мусіць, жыла ў ім з той пары, як сядзеў у гасцях і браў чарку, і слухаў сябе і ў самім сабе гаспадаровы словы. Гэта думка *пра маці* была, яна так увачавідкі падступілася да яго, што зусім невыпадковым, несумненна і адзіна значным падалося яму імгненне, у якое цень ад бэзавага лісця калыхнуўся на сцяне і неспадзеўна ціўкнула за плотам птушка. У маркотным, дзіўна запаволеным одуме ішоў ён дамоў, і разам з ім думка пра маці ішла, ці, дакладней, памяць аб нейкай віне парад ёй, успамін пра марна растрачаную сілу любові, якая, можа, не сагрэла нікога. Бруілася крыніца пад засенню родных ліп, і, прыклаўшы руку да вачэй, углядалася ўдалеч маці...

З таго дня неспакой і трывога пасяліліся ў ім.

Аднаго разу яму сасніўся сон. Напачатку то быў лагодны сон, то было панаванне прыцемку на мяжы святла, калі ўсё азначала і ясніла сабой не лінія, адно абрыс, няўлоўна пэўны, нібы вобраз птушкі, якая толькі што пераляцела дарогу перад табой. Высокім полем, бярозавым шляхам нібыта ехаў на веласіпедзе ён, захмарана-ціхай і цёплай чулася наперадзе далеч, і гулі ў бярозавым веццці хрушчы. І так расхіналася насустрач невядомасці душа, і так было добра. Куды, куды, чаго ехаў ён? Але такім знаёмым, хоць і не знаёмым дагэтуль, быў краявід, так даверліва лашчыла вочы супакойнае неба, што немагчыма не думаць было, што ўсё гэта было ўжо некалі з ім, калі не ў сапраўдным, дык у душэўна прыдуманым жыцці. «Ага, дык гэта ж я еду дамоў,— нечакана весела, радасна здагадаўся ён,— вунь там скончыцца шлях і зачарнеецца вёска». І далей ехаў ён, але чамусьці не канчаўся шлях, і знаёмае, пакутна знаёмае нешта, чым свіціўся, жыў і вабіў краявід, ніяк не магло акрэсліцца ні здагадкай, ні сэнсам. Азірнуцца захацелася яму, ён ужо і намерыўся, але не мог. І тады як бы парыў ветру нечакана напружыўся, ураз раскідаўся ў яго за спіной: зашалясцела, зашастала, невядома адкуль узяўшыся і асыпаючыся долу, сіберна-калянае лісце. Стала ціха. Холад і спусташэнне чуў ён за сабой. Падалося на момант,

што ён заплюшчыў вочы, адно чуючы, як іначылася, незразумела іначылася ўсё наўкол яго, а можа, і ў ім; і страх працінаў ягонае сэрца. І ён тады ўбачыў... О, ён убачыў усё так дакладна — у той кароткі міг, калі нехта, дачасна схаваны ў ім, адным балючым штуршком расхінуў яму вочы і грудзі! І тады ён убачыў сцены, якія адразу пазнаў: прапахлыя павуціннем, негабляваныя сцены, і тапчан у куце, закіданы старой вопраткай, і старыя начоўкі на ім, і лаву ля дзвярэй, і вёдры на ёй, і на падлозе кашы з бульбай, і чыгуны, і цэбар з мешанкай, і вузкае, на адно бервяно прарэзанае акенца ў сцяне, і нейкі слоік на ім, і шклянку з гусіным тлушчам на ім (ён гэта ведаў), і адно замурзанае (ці не поклад?) курынае яйка... О, навошта, навошта такое знаёмае ўсё гэта, і навошта стаіць перад лавай маці, і навошта чыгуны каля яе ног, навошта яна павярнула галаву да яго,— о, які цёмны, невідушчы, цяжкі, нібы плёскат вады ў вядры, у яе пагляд! Ён хацеў ступіць да яе, але яна, засланяючыся, павяла рукой, і тады, нібы па хаценню яе, расхінуліся сцены, і трывожна, квола зашамацела, бліснула яму пад святлом ліхтара салома. То была пуня. Нейкая постаць стаяла на каленях, спіной да яго, і нешта хрыпела, трэпала па саломе за тою спіной, і сцішана блішчэла параскіданая ўсюды салома, і шкрэбаліся на седале куры... І чыгуны стаялі ў сенцах, і цэбар з мешанкай, і кашы з бульбай!.. Так ён прачнуўся ўночы. А ўдзень яму прынеслі тэлеграму.

Ва ўсіх нас ёсць ці была некалі маці, і, на жаль, не заўсёды добрыя прыходзяць да нас тэлеграмы...

Вось і ўсё. Ізноў ідуць халады, бяруцца прымаразкі — ападаюць долу інеем сырыя туманы. Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле. І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою пішу я эпітафію апавяданню, якое магло б называцца «Смаленне вепрука». О, вядома, не шмат логікі ў ім, але ж не шмат логікі і ў стратах, што прыносяць нам лета ці вясна, зіма ці восень. Ёсць, на жаль, рэчы, непадуладныя нам, але ж ёсць і суцяшэнне, ёсць і надзея. У таго, хто бярэ ў рукі пяро, надзея ёсць таксама. О, паэт да таго ж бывае яшчэ крыху за-

бабонным. Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засцярогся ад бяды — бо сказаў. Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг.

1973

ДЗЕНЬ У ШЭСЦЬДЗЕСЯТ СУТАК

Згадка пра Поўнач

ПАЧАТАК

Вось жыву я цяпер у адным добрым месцы на адзіноце з лесам, восеньскай цішынёй, з незразумелым пакуль мне самому набыткам свае душы. Днём лес свіціцца, засланы скурчаным сухім лісцем, халадок цверазіць скроні, і такое адчуванне ў мяне, што калі разгадаю я цяперашнюю патаемнасць лесу, адзінокага на галінцы лістка, калі спасцігну простым словам пругкую выразнасць чорнага крушынавага ствала, калі спалучу я ў адным адчуванні скупы водар халоднай зямлі, журблівае святло неба, і далёкі рокат трактара, і сарочы порсткі чэкат,— скрозь восень гляну я сабе ў душу, нібы ў крыніцу, адвяду рукой апалыя ў ваду пажоўклыя лісты. «Здароў быў, чалавеча-браце,— скажа мне мая крыніца,— чаго ж так доўга не глядзеўся ты ў мяне, навошта чакаў адно восені?» А што адкажу я ёй? Што не галіўся перад тым, не харашыўся, і такі быў і сякі. «Даруй мне, мая крыніца, дай і цвярозлівасць сваю, і яснату, і бляск свой дай, і сінюю смужлівасць!..»

Цяпер жа няпэўна ў мяне на душы, як у прыродзе туманным ранкам. І лес, і восень пакуль не адкрываюцца мне, і я зайздрошчу сябру, што з вялікага далёкага горада піша мне пра гэтую мясціну, дзе цяпер я, пра апалае лісце, пра халодны шызы пасак асфальту ў лесе, пра гайню сабак, што трухаюць па дарожцы следам за людзьмі, настроенымі на спаважна-летуценны лад, узброенымі дзеля легкадумнай акрасы няструганымі арэхавымі кіямі. Я зайздрошчу сябру, акрэсленасці яго тугі, зайздрошчу той восені, якую ён далёка адсюль носіць у сабе. А можа, усё ў тым, каб быць далёка? Чамусьці вось і мне б'е ў вочы другая ясната — з таго

краю і з таго лета, дзе ўдзень і ўночы свеціць сонца, дзе празрыстае, аж белае, паветра, дзе наступае на бераг і адступае мора: зелянеюць на камянях водарасці, вострa пахнучы; з падпаленай кучы скрынь, дошак, гумы, пакінутых на беразе морам, валіць дым, дзьме свежы вецер, і свеціць, свеціць сонца. Стаіць у вушах маіх нязвыклая тая цішыня над шэрымі сопкамі, закіданымі каменнем, скупа аздобленымі па адхонах кусцістымі нізкімі бярозкамі, падобнымі на лазу, і лазой, падобнай на бярозкі. І ўсё так выразна, проста на той зямлі, што адчуванне роднасці табе прыроды прыходзіць адразу, спадаюць непатрэбныя адзежыны з душы, і, адзін сярод белай глушэчы, адчуваеш, імгненна спасцігаеш ты, што не будзеш тут адзінокі: будзеш як сонца, як трава, як вада: ці надоўга ўсцешышся гэтым, не ведаеш, але адзіноты тут не баішся. Памятаю, дзіўныя думкі прыходзілі да мяне на Поўначы: ну хоць бы пра гэтую ж адзіноту. Не ведаю, ці здолею перадаць цяпер іх, баюся, што гэта хутчэй не думкі былі, а думкі-адчуванні, калі ўяўленне сігае наіўна і далёка; слова не паспявае за ім, але праз гэта, як ні дзіўна, не адчуваеш прыкрасці. Памятаю, мне вельмі зразумела было, чаму чалавек можа адчуць сябе і адчувае часам адзінокім сярод людзей. Цяпер мне цяжка ўзнавіць усё гэта, але тады, памятаю, думаў я пра тое, што мы па-рознаму разумеем сябе ў прыродзе і ў жыцці: чалавек індывідуальны, прырода безасабовая і, да таго ж, абыякавая да нас. У жыцці мы перш за ўсё адчуваем сябе як асобу, усё ідзе ад нас і ўсё вяртаецца да нас: мы як бы пасылаем сігналы і самі ж прымаем адказы на іх. Калі ж нешта псуецца ў гэтай добра наладжанай сувязі, яна перастае быць зваротнай: мы чуем свае сігналы, але перастаём прымаць, разумець чужыя адказы на іх. Магчыма, усе чорныя меланхоліі, усе мерліхлюндыі бываюць ад гэтага. Бяжы тады, чалавек, бяжы, хутчэй ідзі да прыроды: яна безупынна шле табе свае сігналы, як сонца праменні, але ёй не трэба твой адказ. Няхай не бянтэжыць цябе гэта. У яе абыякавасці не пагарда да нас — толькі вялікі спакой і паўната жыцця. На хвіліну забудзь сваю асобу, кажа нам прырода, адчуй сябе аднaчасова і травінкай, і морам, і самім сабой. Я твая маці, а ты маё блуднае дзіця. Пабудзь са мной трохі, а тады, калі хочаш, вярніся да людзей.

Поўнач у нейкай ступені робіць чалавека ідэалі-

стам, але калі і адчужае яго ад людзей, дык затым толькі, каб зноў прылучыць да іх. Як ні зайздросцілі б мы існаванню травінкі і лістка, у рэшце рэшт мы разумеем: наш шлях да вялікай еднасці з жыццём, са светам другі, чым у прыроды. І сувязь наша другая. Нам не пазбыцца яе, і ў гэтым не толькі прычына некаторых нашых горкіх хвілін, але і нашае шчасце — у мностве нашых асобных «я». Уявіце сабе: адзін чалавек, нешта накшталт чалавека-бога. Але ці здолеў бы ён зразумець гэтую сувязь, расказаць пра яе, ці здолеў бы ён усвядоміць сябе творцам? Мусіць, не. Наша «я», разуменне чалавека і прыроды праз сябе робіць нас асобамі і творцамі. Будзем імкнуцца быць лепшымі, але навошта шкадаваць, што мы ёсць мы?!

Мне шкада было развітвацца з Поўначчу. У дзень ад'езду я не здолеў купіць білет на першы паветраны рэйс і ў чаканні позняга самалёта блукаў па Мурманску. Канчалася лета, зелянкова-блакітнае неба сеяла над горадам бязлітасна празрыстае, халаднаватае святло, прасторнымі выдавалі вуліцы, і такімі выразнымі, звышрэальнымі да прывіднасці выглядалі дамы, сціпла пафарбаваныя ў жаўтавата-бледны ці зеленаваты колер. Магчыма, самае цяжкае, з чым сутыкнуўся б мастак, малюючы паўночны краявід,— гэта паветра, тамтэйшае неба. На Поўначы не адчуваеш паветра так, як у нашай, лічы, паўднёвай паласе: у ім няма той насычанасці фарбаў, той густой, залацістай сонечнасці, тых чаргаванняў святла і ценю, якія ў нас розныя ў розную пару дня. На Поўначы ёсць проста паветра і святло, нечым падобныя на нашыя дні бабінага лета. Бесцялеснасць і празрыстасць, глыбіня і адсутнасць глыбіні.

Я прыглядаўся да горада і з нейкай радасцю адзначаў сабе, што ён не такі, якім здаўся мне, калі ўбачыў яго ўпершыню. Тады ён зусім не спадабаўся: горад як горад, здавалася, нічога адметнага, паўночнага, дамы — як шмат у якіх нашых гарадах. Дзе тутэйшы стыль, дзе тутэйшая архітэктура? Цяпер вось пачынаю вылучаць позіркам адзін дом, другі, пачынаю бачыць у іх нейкую адметнасць, разумею, чаму на Поўначы не робяць ніякага ўражання, а, наадварот, раздражняюць усе гэтыя калоны, пілястры, карнізы. Іншая справа — гладкая прастора сцяны, падкрэсленая сціплай, прамой архітэктурнай лініяй, іншая справа — прамавугольная

вежа над домам, доўгі, як галерэя, балкон. Яшчэ падабаюцца мне драўляныя дамы, двухпавярховыя, складзеныя з надзіва роўных бярвенняў, пафарбаваных у цёплы руды колер: здаецца, сасна, гонкая, імклівая, як ссечана, так і пакладзена, неабкораная, у зруб, і ляжаць ёй тут доўга-доўга, у суседстве з цяжкімі, шырокімі гмахамі камяніц.

Дзіўнае гэта адчуванне — ведаць, што ты неўзабаве надоўга або назусім паедзеш аднекуль: ходзіш па вуліцах, праводзіш позіркам незнаёмых людзей, якія бог ведае што, сустракаючы, думаюць пра цябе, а хутчэй нічога не думаюць, акрамя таго, што лічаць цябе тутэйшым. А прыемна і дзіўна табе таму, што ў цябе ад усіх свой маленькі сакрэт: ага, вы нічога не ведаеце, вы прыйдзеце дамоў ці на работу, будзеце абедаць ці спаць, а мяне ўжо тут не будзе, і ніхто, ніхто ў цэлым горадзе не дазнаецца пра гэта. Ага, ага... Я запомніў і колер вось гэтага неба, і гэтае кафэ на рагу вуліцы, і падпітага мужчыну, што ледзь не трапіў пад тралейбус, і прыгожую дзяўчыну з высокай, як стог, прычоскай — усё гэта астанецца ў маёй памяці так, як было ў тую хвіліну. Усё будзе жыць тут пасля сваім безупынным звычайным жыццём, не падазраючы, што ў памяці аднаго чалавека яно спынілася, застыла, як кадр на экране, калі рвецца кіналента і прападае гук.

Павопі іду я вуліцай: вось аўтобусны вакзал, вось стадыён, вось універмаг, вось вялізны шчыт на сцяне драўлянага дома, а на шчыце напісана: «Газета — надзейны памочнік працаўнікоў сацыялістычных палёў». Стань, калі хочаш, падумай, дзе ты: у Маладзечна ці ў Мурманску. З якой гэта пары рыбакі сталі працаўнікамі сацыялістычных палёў? Вось помнік Анатолю Брэдаву: напружаная бронзавая фігура, рука сціскае гранату, расшпілена гімнасцёрка, калена ўпіраецца ў вялізны прыродны валун — пастамент помніка. Можа, гэты валун прывезены ад сопак, што абступаюць імклівую Вялікую Заходнюю Ліцу — раку, даліна якой у час вайны названа была «Далінай смерці». Там, на гарбатых, абдзьмутых вятрамі сопках, загінуў слаўнай смерцю Анатоль Брэдаў — камсамолец-мурманчанін. Я быў там: бачыў камяністае вілястае рэчышча Заходняй Ліцы, доты на сопках, складзеныя з камянёў, кавалкі кулямётных лент, галоўкі ад снарадаў, іржавыя асколкі і зусім не страшную цяпер «Даліну смерці», пераме-

ценую пяском, усю ў лапіках сухога белага моху, жаўтлявай рэдкай травы. Успамінаю, як з фотакарэспандэнтам газеты Паўночнага флоту поўзалі мы на каленях па жвіры, па моху, набіралі ў шкатулку зямлі на падарунак першаму Герою Савецкага Саюза на Поўначы Васілю Паўлавічу Кіслякову. Нам хацелася, каб у шкатулцы было ўсё: і касмылікі моху, і ружовыя пялёсткі іван-чаю, і рознай велічыні каменьчыкі, а мне яшчэ, памятаю, хацелася знайсці ў расшчэпе скалы бесцябліну багуну, таго самага, што расце і ў нас, у Беларусі: я шукаў яго доўга, ды так на той раз і не знайшоў.

Васіль Паўлавіч, які нядаўна прыехаў на Поўнач з Масквы, расказваў маракам, што былі тут з экскурсіяй, пра былыя баі ў «Даліне смерці». Прысадзісты,васпаваты, з сівой шчэцню валасоў на круглай галаве, ён стаяў на камені над кручай, гаварыў не надта складна, мусіць, хвалюючыся, і ўсё паказваў і паказваў кароткапалай рукой за раку, на чорныя голыя сопкі, дзе трымалі абарону фашысты. А я спачуваў яму ў той час, думаў, што яму, упершыню пасля вайны прыехаўшы сюды, добра было б пабыць тут аднаму, сам-насам з гэтымі сопкамі, гэтай ракой, са смерцю сваіх таварышаў і сваёй памяццю аб іх. Яму было цяжка. Я бачыў, як у нейкую хвіліну ён заплюшчыў вочы, прыклаў руку даланёй да лба і пахіснуўся. Але яго асцярожна ўзялі пад пахі, памаглі сысці з каменя на зямлю... Потым ён дастаў папяросу: сядзеў на камені, курыў, не зважаючы, што на яго ўтароплена было столькі позіркаў. Што ўспамінаў ён? Тое, як астаўся на сопцы адзін, прыкрываючы адыход свайго ўзвода? Як сабраў вінтоўкі забітых таварышаў, палажыў іх у розных месцах паміж камянёў — страляў па фашыстах, перапаўзаючы ад аднаго каменя да другога: няхай думаюць, што нашых тут многа, няхай марудзяць і баяцца. Колькі разоў у яго канчаліся патроны, усё бліжэй падпаўзалі фашысты, і ён, нібы ў гарачцы, кідаўся з гранатамі і вінтоўкай у атаку, здабываў сабе зброю, зноў страляў — і зноў канчаліся патроны. Нешта каля сотні немцаў палажыў ён на сопцы, і вось ужо не аставалася ў руках нічога, акрамя апошняй гранаты: ён гатовы быў зрабіць тое, што зрабіў Анатоль Брэдаў — падарваць гранатай сябе і фашыстаў. Яму пашчасціла: падаспелі на падмогу нашы з суседняга падраздзялення...

Успамінаю маладога капітан-лейтэнанта, што ўручаў Васілю Паўлавічу шкатулку: ён гаварыў натхнёна і выразна, чамусьці не забываючы пры гэтым кінуць вокам на мяне; можа, ён лішні раз хацеў напомніць мне, каб не забыў назваць, калі буду пісаць справаздачу ў газету, ягонае прозвішча. Прозвішча ягонае ў справаздачы я назваў. Цяпер я стаяў перад помнікам Брэдаву, і мне неспадзявана падумалася, што вось зараз я выпадкова сустрэну, убачу таго капітан-лейтэнанта, толькі ён, я быў чамусьці ўпэўнены, не пазнае мяне.

Я пастаяў яшчэ трохі і пайшоў абедаць у рэстаран. Вялізная зала, застаўленая лёгкімі зграбнымі столікамі, яшчэ пуставала. Непадалёк ад мяне, у адным радзе, сядзелі афіцэр і дзяўчына, за столікам пасярод залы — каратка падстрыжаны таўсматы хлопец з цяжкой, як чыгуннае ядро, патыліцай. Высока задзіраючы ўгору падбародак, да хлопца не ішла, а паволі плыла праходам між столікаў нейкая дзяўчына, загарэлая да такой неверагодна тугой чарнаты, што, здалося, у зале адразу стала цямней. Хлопец прыхінуўся спіной да крэсла, дастаў цыгарэту. Дзяўчына села за столік, палажыла нагу на нагу. Хлопец пстрыкнуў пальцам па пачку цыгарэт — ён слізгануў па стале да дзяўчыны ў рукі: яна ўзяла цыгарэту, дастала з сумачкі запалкі, прыкурыла, а карабок кінула хлопцу. Той таксама прыкурыў і потым увесь час, пускаючы дым, свядома рабіў каменна-мужны твар. Афіцыянткі ля буфета на ўсю залу абмяркоўвалі нейкую пакупку, смяяліся з нейчага раўнівага мужыка.

Часу было многа: я сядзеў, наглядаў, слухаў. Таўсматы хлопец з экзатычнай дзяўчынай вялі «на публіку» падкрэслена абыякавую, прадуманую да шавялення брывом размову. Нічога ў зале не існавала для іх, а можа, наадварот, для залы, паводле іхняй ідэі, існавалі толькі яны. А я пачынаў думаць пра дарогу дамоў, на поўдзень; уяўлялася бліпчастае чэрава самалёта, засяроджаныя пасажыры ў крэслах, сцюардэса з абавязковымі цукеркамі, ад якіх прыкра-салодка ў роце,— і трывожліва, няўпэўнена думна было ў прадчуванні новага свайго быцця.

Падышла афіцыянтка з блакноцікам у руках, стала, чакаючы, падняўшы вочы на столь.

— Што будзеце заказваць?

— Палову порцыі салянкі. І яшчэ...

— У нас палову порцыі нельга.

— Чаму?

Паціскае плячамі:

— Ніхто яшчэ ніколі не заказваў.

— Але я не хачу ўсю!

Падумала, хацела некуды ісці, а потым кажа:

— Не буду ж я вам масліну напалам разразаць!..

Смяюся, а яна чамусьці здзіўлена глядзіць на мяне.

— Ну добра, добра, давайце порцыю цалкам.

Супакоілася, усё запісала, пайшла. Эх, браце-коце, падарожнік ліпавы,— думаю сабе,— вастры, пакуль не позна, лыжы на Мінск, дзе можна з'есці без асаблівых канфліктаў гэтую палову порцыі салянкі!

А пад вечар, ужо на аэрадроме, перажываў я хвіліны нечакана вострай тугі па сваіх шасцідзесяці днях, што аставаліся тут, на Поўначы, і шкадаванне, і няпэўнасць гнялі мяне, і чамусьці страшнай здавалася невядомасць трох-чатырох гадзін, што аддзялялі ад дому. Потым, у самалёце, я злаваў на сябе: ну што, што табе гэтая Поўнач, ах, якое гэта дурное пачуццё — любіць тое, што іншыя любяць па праву свайго нараджэння тут, па праву вялікіх і малых здарэнняў у сваім жыцці, сведкамі якім — гэтая пустэча і гэтае неба. А што, што табе гэта ўсё? Табе, які не так ужо добра ведае нават сваю Беларусь. І думка ж была перад летам у цябе: сабрацца дамоў, на Магілёўшчыну, а перш, па дарозе, заехаць у які-небудзь Чэрыкаўскі заказнік, папрасіцца ў леснічоўку, уставаць рана, блукаць па лесе, весці дзённік, а потым пеша пайсці дамоў — той дарогай, тымі кіламетрамі, якія адолелі аднойчы, едучы з Мінска, на машыне. Была тады вясна. У Слаўгарадзе, за Сожам, не прасохла яшчэ дарога цераз луг. За горадам, ніжэй па рацэ, дзе было сушэй, нядаўна знялі, як высветлілася, паром: ліквідавалі якраз раён, і гэты паром палічылі лішнім. І вось, каб трапіць у маю вёску, замест пятнаццаці кіламетраў напрасткі ехалі мы кругам добрых шэсцьдзесят ці болей, і ўсё лесам, лесам, спыняючыся ў кожнай вёсачцы, каб распытаць дарогу. У Пільні не пускаў нас далей стары высокі мост на падгнілых па́лях: шмат у якіх месцах на ім праваліўся насціл і свіціўся, як рэшата, над светлай плынню шыракаватай быстрай рачулкі. Стаяў над высокім берагам векавы бор — сасна да сасны, не раў-

нуючы як каноплі. А другі бераг быў ніжэйшы, у рэдкіх альховых хмызах, за якімі шарэлі вясковыя стрэхі, млелі ў сонечным святле купчаста-белыя вербы. «Чакай, чакай,— як бы сказаў нехта мне,— чакай незабыўнай хвіліны». І тады з-за павароту ракі, з-за кручы і з-за хмызоў вынырнуў лёгкі човен: хлапчук стаяў на карме, папіхаючыся жэрдкай; трымцела плынь ракі, пахла алешнікам, травой, смалой ад бярвення, наваленага на беразе; пракукавала, нібы заслала вочы смугою, аднекуль зязюля. І такой паганскай, парна-сонечнай даўнінай патыхнула на мяне і ад лесу, і ад хлапчука ў чоўне, і ад падгнілага шэрага моста, што благаславіў я ціха ў душы і тую хвіліну, і блізкасць сваю да тых мясцін.

І як гэта так здараецца,— думаў у самалёце я,— што роднае, сваё мы неяк заўсёды пакідаем на потым, на пасля, саманадзейна ўпэўненыя, што не ўцячэ яно ад нас. І з роднымі мясцінамі так бывае, і з блізкімі людзьмі: не песцім іх увагай і ласкай, упэўненыя, што пачакаюць, што не ўсумняцца ж наогул, калі на тое, у гэтай нашай увазе і ласцы, і не разумеем, злуёмся, калі блізкія крыўдзяцца на нас і незаўважна, паціху нас пакідаюць.

І, пішучы гэта, сёння думаю: «Няўжо так трэба, няўжо так лепш мы пазнаём сваё і цану свае роднасці з ім?» «Ах, если любит кто кого, зачем ума искать и ездить так далеко?» А можа, усё ж варта?

Як бы там ні было, я пішу сёння пра Поўнач.

СОСНАМ СНЯЦЦА ПАЛЬМЫ

Тады, у чэрвені, у Мурманск мы таксама ляцелі самалётам. Мы — гэта паэт Уладзімір Паўлаў, ці проста «дзед Валодзя», і я. Не ведаю, як адчувае сябе чалавек, калі адзін выпраўляецца пазнаваць невядомыя далёкія мясціны, дзе няма яму ніводнай знаёмай душы, а мы адчувалі сябе даволі ўпэўнена: быў план не толькі незаўважна, назнарок згубіцца ў тамтэйшай жыццёвай стыхіі, але, калі трэба, дык сваёй «беларускай ячэйкай» і супрацьстаяць ёй. Адным словам, наперадзе ў нас не было нічога, акрамя дружбы. І што ж, пражылі мы на Поўначы свае шэсцьдзесят сонечных сутак надзіва дружна, роўна, амаль настолькі ж сонечна і бязвоблачна, наколькі сонечнае і бязвоблачнае

бывае там летняе неба. А людзі, якія многа ўжо год пражылі на Поўначы, казалі нам, што такога лета, як тое, што стала і нашым, даўно ўжо ў Запаляр'і не было.

Неяк здарылася так, што, закончыўшы сваю паўночную адысею і прыехаўшы ў Мінск, не бачыліся мы са «старым» даволі доўгі час. Сышліся неяк выпадкова на вуліцы, зайшлі ў адно перанаселенае культурнай публікай месца і, забаўляючыся кіслым вінцом, успаміналі тое-сёе, сядзелі так, а потым раптам «стары» і кажа:

— Слухай, а можа, га?

Паглядзеў я на яго, састроіў на твары мудрагеліста-няпэўную міну: быў у гэтым «га» адзін патаемны сэнс, які ведалі ён ды я, ды яшчэ хто, можа, і я зразумеў усё так, як звычайна і разумець было трэба, але «стары» ўсміхнуўся на тое і сказаў:

— А можа, га?.. Паедзем яшчэ куды-небудзь... на Далёкі Усход?

— Шчаслівая галава ў цябе, стары. А можа, і сапраўды, га?

Можа, будзе тое, можа, не, але адно сапраўды было: у чэрвені, летам, мы ляцелі на Поўнач. Яна, па сутнасці, пачалася для нас ужо ў Ленінградзе: тут мы засталі яшчэ белыя ночы. У Беларусі больш за месяц нясцерпна паліла сонца: вялі кветкі, рудзелі ў парках на ліпах лісты, а ў вёсцы выгаралі ячмень, гуркоўнік на градах; нібы ў прысаку, млела ў зямлі бульба. У Ленінградзе перад нашым прыездам ішлі дажджы; цяпер жа ўдзень было ветрана, часамі сонечна, часамі пахмурна, і на ўсім ляжала нейкае асаблівае, хісткае, няўлоўнае святло.

Як вылецелі з Ленінграда, прыпалі да ілюмінатара: здавалася, дасюль было ўсё знаёмае, звычайнае, а тут павінна было адразу пачацца нешта адметнае, не падобнае ні на што. Дарэмна! Усё той жа неабдымна шырокі гарызонт, засланы воблакамі, воблакі — таксама ўнізе, а паміж імі відна была зямля: лапікі азёр, цёмныя астраўкі лесу, лініі шасейных і чыгуначных дарог, купкі цацачных домікаў. Потым бачылі Ладагу — шызую прастору вады. Як ні ўглядаўся, хочучы ўбачыць якую-небудзь чорную ці белую кропку судна, нічога не ўбачыў. Убачыў другі самалёт — ніжэй пад намі і трохі ўперадзе. Самалёт прапаў, пра-

пала возера, прайшло яшчэ з паўгадзіны. Пейзаж пачаў мяняцца: прыкметныя сталі гарбылі чорных гор, шызыя лункі вады паміж імі, і раптам заўважаеш: то ў адным, то ў другім месцы нешта бялее. Ці не воблакі ляжаць так нізка на зямлі? Снег! Снег у чэрвені!

Тады і падумалася, што на Поўначы яшчэ, мусіць, вясна, самае лепшае — пара першага лісця. Калі ж самалёт, доўга зніжаючыся над сопкамі, азярынамі і хмызамі, сеў нарэшце на аэрадроме, мы зразумелі, што памыліліся: і на Поўначы было лета. Роўна свяціла белае іскрыстае і не вельмі высокае сонца. Узбоч дарогі, што аднекуль з-за пакрыўленых, замшэлых хмызоў падступала да аэрадрома, навалам ляжала вялікае каменне. Яго панакідана так густа, што багата якія дрэўцы, заціснутыя паміж ім, пасохлі: нема тырчаць угору тонкія кашчавыя ствалы. Здаецца, у нейкую страшную хвіліну хмызы спаліла, высушыла таемным, бязлітасным і злым агнём. А вось паміж дарогай і сопкай цяглавіна з цёмнай вадой, абкружаная там-сям роўнай шчэццю сакавіта-зялёнай асакі; бярозка пахілілася над вадой, зламалася, нібы рука ў локці, і прама, невысока пайшла ўгору, густа пераплёўшы пасечаныя, пакалечаныя ветрам сукі. А з вады выступаюць на паверхню, шарэюць сухія спіны валуноў. Едзеш далей: зялёныя, пульхныя, нібы падушкі, купіны паміж лазы, рабін і бярэзін — таксама камяні, засланыя ягаднікам і мохам. А што гэта? Я пазнаю цябе, высокая голая сопка з каржакаватай лермантаўскай сасной на кручы: магутна, страшна агалілася парода, і страшна і адзінока, мусіць, на кручы сасне з шатром, раскідзістым і рэдкім, як лісце папараці. Што табе сніцца, сасна, сярод гэтай пустэчы? Цудоўная зялёная пальма, якую песціць залатое, мройнае сонца? Блакітны шум мора і белыя параходы? Аксамітна-цёмныя ночы з буйнымі зорамі? Зялёныя, белыя казачныя гарады? Ці не тваю тугу нясуць далёка правады — ад слупа да слупа, абкладзенага ўнізе шэрым каменем?

Але навошта я пішу цяпер гэта? Тады, у першыя хвіліны на Поўначы, я не разумеў яшчэ тугі адзінокай сасны па цудоўнай пальме: была гэта літаратурная асацыяцыя — не болей. Па дарозе ў Мурманск я жыў іншым. Тыя першыя хвіліны поўніліся для мяне асаб-

лівым, непараўнальным ні з чым сэнсам і значэннем, нібы мне трэба было праз гэтыя сопкі, дрэвы і неба, праз увесь гэты абсяг, падобны на будаўнічую пляцоўку, упершыню пазнаць жыццё зямлі, і, памятаю, мой настрой, і настрой першых хвілін быў нейкі святочны, ранішні — настрой першага дня стварэння свету. I так хацелася хутчэй убачыць тутэйшага чалавека, і калі я ўбачыў яго — глядзеў як на дзіва, як на разгадку таямніцы. Можа, было віною гэтаму паўночнае яркае святло, але твары першых людзей здаваліся мне такімі прасветленымі, незвычайна адухоўленымі, нібы чалавек ніколі не ведаў ні сумненняў, ні гора, ні тугі, нібы адно радаваўся прытоенай ціхай радасцю...

Сопкі, скалы, валуны. Глядзіш, і такое ўражанне ў цябе, што тут, пад гэтым небам, прайшоў, забаўляючыся сваёй сілай, няйначай як волат: ён ніколі ўжо не вернецца сюды, але ўсё тут жыве ягонай безнадзейна-разгульнай воляй, на ўсім пячатка ягонай цяжкой, невымернай сілы рукі. Здаецца, і дрэвы хінуцца да зямлі таму — таму не маюць адвагі расці ўгору, што ўражаны гэтай волатнай сілай і знемагаюць пад ёй.

Шмат што нагадвае тут пра маладосць Зямлі. Пра тое, як плавілася, клекатала гарачая магма, як тысячагоддзямі ліліся на зямлю шумлівыя дажджы — зямля ўсё клекатала, булькала, ападала паволі, як цеста ў дзяжы. Зямля астывала, расколвалася, мяняліся месцамі суша і мора, узнімаліся ўгору касцямі хрыбтоў, праходзілі мезазоі і палеазоі, перайначваючы на свой лад мрочныя ландшафты, і вось ужо зямля закавана ў ледавік: можа, трыццаць, а можа, дваццаць тысячагоддзяў назад. Недзе там, дзе сходзяцца цяпер межы Фінляндыі, Нарвегіі і Расіі, быў асяродак ледавіка, халоднае царства якога канчалася не бліжэй як ля Кіева. Колькі часу спатрэбілася, каб парушыўся спакой халоднай магілы, каб прыйшлі ў рух ільды, знішчаючы ўсё на сваім шляху, руйнуючы горы, капаючы азёры, заграбаючы за сабой зямлю? Шырокая спіна ледавіка несла на сабе каменныя глыбы, а ледавіковыя воды далёка на поўдзень змывалі глей. Ледавік спусташаў зямлю ў адным месцы, каб аддаць яе багацці людзям у другім. Жыццё красавала на Поўдні, а на Поўначы былі холад і пустэча, мёртвая зямля і чэзлая расліннасць. Так Поўнач ахвяравала са-

бой. З гэтай акалічнасці і ў чалавеку, можа, вякамі нараджалася да яе, выхоўвалася тое, што мы завём бескарыслівасцю. Чалавек сяліўся на беднай, неўрадлівай зямлі, пасвіў аленяў, лавіў рыбу, карчаваў, дзе можна было, лес і засяваў лапік камяністага долу жытам — і так ён жыў і любіў гэты суровы край па праву свайго нараджэння тут. Як нідзе, на Поўначы чалавек мог радавацца нялёгкім плёнам свае працы, тым больш радасным, што ён нялёгкі. Недзе ў нататках Прышвіна прачытаў я нядаўна, як свае, радкі пра тое, «чаму і на Крайняй Поўначы людзі задаволены сваёй прыродай часта больш, чым на багатым Поўдні: у прыродзе трэба дзейнічаць, і тады пры дрэнным надвор'і на яе не звяртаеш увагі — трэба ж быць і дрэннаму надвор'ю; калі ж часіна добрая надыдзе, дык гэта як бы верх жаданняў, і яна тады дзейнічае надзвычай жыватворна».

На Поўначы прырода не абяцае чалавеку нічога, а дае толькі тое, чаго варты ён сам. Вось чаму, мне здаецца, Поўнач павінна выхоўваць, прымушаць чалавека часцей зазіраць у самога сябе, забывацца на неістотнае, непатрэбнае, благое, бачыць вялікае ў простым, а складанасць вымяраць прастатой. І па што б сёння ні ехаў чалавек на Поўнач: па прыгоды і рамантыку, па лекі для душы ці па доўгі рубель,— ён знойдзе тут і тое, чаго шукаў, і яшчэ, трэба думаць, нешта і звыш таго: Поўнач, я ўпэўнены, не праходзіць для чалавека дарма.

Але вярнуся да свайго першага дня ў Запаляр'і. Гэта быў незвычайна доўгі дзень: ён пачаўся ў Мінску, а скончыўся больш за дзве тысячы кіламетраў адтуль, ля самага Баранцавага мора. І не толькі ўражанні, памножаныя на многія кіламетры, зрабілі яго такім доўгім для мяне, ён і сапраўды быў доўгі: дзень як быццам канчаўся, але не заходзіла сонца, ноч была ўсё тым жа днём. Як перадаць словам гэта роўнае, пастаяннае напружанне святла, што льецца з неба: ад яго не схавацца, не ўцячы, і не адбіцца ад чамусьці страшнай думкі, што вось ты стомішся, ляжаш спаць, а твой сон, цёмныя нетры твайго забыцця — усяго толькі спадман: сонца ўсё адно будзе стаяць у небе, будзе дзень, будзе трымцець, пераліваецца светлай хваляй мора, будзе расці трава і будуць спяваць птушкі. Жыццё будзе ісці без цябе, і ўжо не дагнаць, не вяр-

нуць таго, што прайшло без твайго ўдзелу. Як недарэчна і дзіка спаць, калі на вуліцы дзень!

А тым часам ты блукаеш па горадзе. Праз паўгадзіны ты ведаеш яго ўвесь: кінатэатр, рэстаран, магазіны, стадыён. Тут ты будзеш жыць, на гэтых вуліцах табе не абмінуць свой учарашні дзень. Сцеражыся, каб ён не быў падобны на сёняшні: тады на гэтых вуліцах табе не разысціся і з нудой, што будзе хадзіць за табой неадчэпна, як цень. Але чакай, навошта забягаць наперад, няўжо ты прыехаў сюды, каб сумаваць?

Сонца ўсё свеціць і свеціць, лёгкія аблачынкі ляжаць на даляглядзе, неба блекла-сіняе; шарэюць, праменяцца мройліва вострым, рафінадным нейкім святлом камяністыя сопкі, і табе пачынае здавацца, што ўсё навокал зачаравана гэтым бязлітасна белым сонцам, што ты ідзеш пад ім, як самнамбула, што нават думку тваю вядзе сонечнае святло; ты злуешся на сябе, стараешся пераключыцца на што другое, але праз хвіліну нешта неўсвядомленае, прыкрае, як адчуванне, калі твар аблепіць павуцінне, пачынае непакоіць цябе. Пакутліва думаеш: што ж гэта такое, адкуль такое адчуванне, і раптам спахопліваешся: ага, дык гэта ўсё тое ж белае святло, усё тое ж сонца, негарачае, іскрыстае!

А вось гэтыя людзі, што жывуць тут, ходзяць па вуліцах, няўжо яны не адчуваюць усяго гэтага? А можа, яны проста зачараваны белым святлом? Вунь якія засяроджаныя, ціхія — ідуць, нібы прыслухоўваюцца да сябе. Няўжо яны не могуць адчуваць так, як я, няўжо не заўважаюць яны, што я зусім з іншага свету, дзе людзі ўмеюць смяяцца, кахаць, глядзець адно аднаму ў вочы? Не, вунь тыя, што ідуць насустрач, здаецца, смяюцца? Але чаму не чуваць іхняга смеху? Нямая ўсмешка застывае на твары, а потым паволі, нібы сплываючы, пачынае сыходзіць з яго. Твар робіцца маўклівы, зацяты, а вось усмешка ўжо лунае ў паветры, трымціць святлом, мройліва лезе ў вочы. Здаецца гэта? Вядома, здаецца. Не думаць, не думаць, не думаць! Да д'ябла ўсё!

Пазней ужо, калі мы жылі на караблі, пачуў я неяк у кают-кампаніі, як адзін афіцэр скардзіўся доктару, што доўга не можа заснуць: не бярэ сон, і ўсё.

— Сонечныя ночы,— сказаў доктар.— Нервы. Бывае.

— Сонечная хвароба? — засмяяўся нехта.

— Марская ёсць, чаму ж не быць сонечнай? — строга адказаў доктар.

На сонечнае святло «хварэеш» асабліва ў першыя дні жыцця на Поўначы. Ты не стаміўся яшчэ запамінаць, глядзець, здзіўляцца, у цябе яшчэ няма спакойнага інстынкту тутэйшага жыцця, ёсць хваравітая ўражлівасць — не болей. Ты як дрэва, якое перасадзілі на новае месца: пакуль карані ўрастуць у глебу, дрэва павінна «перахварэць». І ты таксама «хварэеш».

Восем, дзевяць, дзесяць гадзін вечара. Ні вышэй, ні ніжэй на небе сонца. Няўжо гэта тое сонца, што за дзве тысячы кіламетраў адсюль зараз барвова і нізка вісіць над лесам, заліваючы ўсё навокал ружовым мяккім святлом: даўжэйшыя робяцца цені, збіраецца над ракою туман, і змрок снуецца ў густых хмызах. Стаіць цішыня. Шчодра нагрэтая за дзень, спяшаецца аддаць сваё цяпло зямля; пахне з гародчыкаў кропам, кветкамі, падсохлай травой. Сонца зайшло. Палымнее, пераліваецца ружовымі, жоўтымі, бэзавымі колерамі захад. Ападае на траву раса. Халаднее. Крычыць у хмызах ля рэчкі драч. Тарахцяць, пераязджаючы мост, калёсы. Цямнее. Доўгачаканы спачын зямлі, лагода і сон чалавеку!

А тут адзінаццаць гадзін вечара. Нічога не мяняецца. Сонца. Дзень. Ідзём на апошні сеанс у кіно. Паказваюць фільм пра Штрауса. У нейкім пашлаватым стрыкулісце трэба пазнаць музычнага караля Вены, паверыць, што ён быў дэмакратычны, просты, дасціпны, таленавіты, мог адначасова кахаць, пісаць музыку, рабіць глупствы, гаварыць рэвалюцыйныя прамовы. Фільм дрэнь, музыка цудоўная. У зале паўзмрок, на экране сонечны каскад фарбаў. Ён не стамляе. Адпачываеш. Людзей на сеансе — раз, два, тры — і пачынай лічыць спачатку. Здагадваешся: лета, усе на Поўдні.

Фільм канчаецца. Ідзём у гасцініцу. Горад спіць. На вуліцы ні душы, калі не лічыць катоў. Іх мноства. На ганках, на тратуарах, ля пад'ездаў. Выйшлі на начны шпацыр. А мы ідзём спаць.

— Колькі на тваім не залатым, дзед Валодзя?

— Без пяці гадзіна. А можа, паблукаем яшчэ?

— Будзем лічыць катоў? Ліха з імі! Пасядзім лепш у гасцініцы.

Прыйшлі ў нумар, селі, курым. У акно відзён заліў, гарбылі сопак за ім, караблі на рэйдзе. І сонца над залівам. Ледзь не пад самым акном палатачны гарадок.

— Не думалі, дзед Валодзя, што так далёка заедзем, га?

— Якое далёка! Каб здавалася далёка, трэба было ехаць цягніком.

— Цывілізацыя сапсавала нас, дзед. Завабілі сцюардэсы цукеркамі.

— Точна так, дзед Міша. Колькі цяпер на тваім не залатым?

— Дзве гадзіны. Давай спаць.

Закрываем шырмай сонца, заліў. Канчаецца самы доўгі для нас у гэтым годзе дзень.

КАЮТА І КАЮТ-КАМПАНІЯ

Жыць у гасцініцы ці на караблі? Спаць у нумары ці ў каюце? Абедаць у рэстаране ці ў каюткампаніі? Так мы сталі перад неабходнасцю выбару. Але навошта доўга думаць? Ехаць на Поўнач толькі дзеля таго, каб жыць, як звычайныя камандзіровачныя? Не. Выбіраем каюту і каюткампанію. Цяпер трэба па-новаму запраграмаваць свой быт. З гэтага дня сходні завуцца трапам, кухня — камбузам, кухар — кокам, святло не выключаеш, а «высякаеш», ваду не перакрываеш, а «высякаеш» таксама. Акна няма — ёсць ілюмінатар, яго нельга закрыць, можна толькі задраіць. Жыццё неспадзявана абнаўляецца, ты адчуваеш сябе ў ім нібы дзікун.

Форма пачынаецца са зместу ці змест з формы? Для нас новы змест пачынаецца з формы — звычайнай, марской: кіцель, фуражка, пагоны, чаравікі. Жыццё пачынаецца з кантрольна-прапускнога пункта. Але гэта між іншым. Важна другое: пачыналася новае цікавае жыццё.

Мінеш кантрольна-прапускны пункт, пойдзеш асфальтаваным палатном прычала, акантаваным па краях пакладзеным упрытык і пабеленым бярвеннем, па трапе ўзыдзеш на карабель, аддаўшы чэсць флагу,

і, трымаючыся правага борта, дасягнеш кают-кампаніі, па трапе спусцішся ўніз, дзе, падзеленыя прахадам, адна супроць другой каюты. Твая якраз пад трапам: размяшчэнне — лепш не трэба, якраз ля бойкіх карабельных дарог.

Адчыняй металічныя, пафарбаваныя ў жаўтлявы колер, дзверы, і ты дома. Прадзеды нашы, кажуць, будавалі дамы без адзінага цвіка. Тут усё наадварот: амаль поўная адсутнасць дрэва, толькі метал. Металічны стол, металічныя шуфляды ў ім, металічныя шафы; цяжкія, выгнутыя з бліскучых трубак крэслы лёгка ўвінчваюцца ў падлогу. Попельніца ўманціравана ў стол, для графіна з вадой адпаведна зроблена надзейнае гняздо. Зеленавата-цёмнага колеру шырма захінае два ярусы засланых суконнай коўдрай ложкаў. У галавах, над падушкай, прадаўгаваты чорны каўпачок лямпы, да сцяны прымацаваны рамяні — запрывязвацца ў час гайданкі. Марак павінен умець засынаць у любую хвіліну дня і ночы, спаць сном праведніка ці «сном Напалеона пасля Ватэрлоо». Сон — таксама служба, прадугледжаная вайсковым статутам. Марак спіць, а служба ідзе.

Першую сваю ноч на караблі мы спалі дрэнна. Перашкаджалі тупат ног па трапе, званкі, галасы. Гадзін у шэсць раніцы зноў тупат, званкі, галасы: нехта спяваў, нехта граў на баяне. Нічога не зробіш — трэба ўставаць. Галава гудзе, млосна, адчуванне такое, нібы на табе чэрці ўсю ноч малацілі боб. «Ну і ўліплі»,— падумалася тады. Але ўсё было не такое і страшнае. Прайшло колькі часу, і мы навучыліся спаць калі давядзецца, пасяваць у рэдакцыю газеты, дзе ўпарта асвойвалі вайсковую спецыфіку, і зноў на карабель. Нарэшце справа дайшла да таго, што пераблыталі дзень і ноч: лажыліся спаць у чатыры-пяць гадзін раніцы, а ўставалі ў дванаццаць.

Каюта паступова рабілася родным домам. Тут пісалі пісьмы, матэрыялы ў газету, тут два разы на дзень высыпалі ў вядро недакуркі з шырачэзнай, як шахматная дошка, попельніцы.

Запомніліся хвіліны, у якія чамусьці раптам здагадваўся, якое гэта асаблівае, не параўнальнае ні з чым месца — твая каюта. Часцей за ўсё гэта было тады, калі табе тэрмінова трэба было пісаць у газету: пісаць не вельмі хацелася, ты ўсё марудзіў, хадзіў па

каюце, ляжаў, курыў,— вось ужо часу аставалася роўна столькі, колькі трэба, каб паспець напісаць. І тады ты садзіўся за стол. І — о дзіва! — словы пачыналі ліцца лёгка, радкі лажыліся на паперу таропка і роўна: ты пісаў, а нейкае другое тваё «я» сачыла за табой, радавалася за цябе, бачыла цябе ўпэўненым, упартым, вясёлым ад работы. Яно ляцела недзе побач з тваёй думкай, і ўяўлялася яму, нібы ты — гэта не ты, а спрактыкаваны марскі воўк — штурман, капітан, старпом, які да драбніц ведае сваю карабельную справу, які прадублены тысячамі вятроў, выпрабаваны тысячамі чалавечых лёсаў, што прайшлі праз яго. І вось гэты марскі воўк, упарта, шырока палажыўшы рукі на стол, цяпер піша: яму не трэба ні кабінеты, ні Дом творчасці, яму не трэба вывучаць жыццё. Жыццё для яго — ён сам, карабель, які ён ведае так, што можа разабраць і сабраць яго, як гадзіннік. Ах, якая свежая, здаровая, цвярозая ў гэтага капітана-пісьменніка галава! Як ён дакладна, пранізліва ведае ўсё, пра што піша!

Цяпер разумею — гэта была зайздрасць. Цяпер разумею — гэта было шкадаванне. Зайздрасць да тых, хто ўсё ведаў на гэтым караблі, які для цябе быў проста карабель — пасудзіна на вадзе, не болей. Шкадаванне аб тым, што ў цябе няма ніводнай з тых спецыяльнасцей, якіх так многа на караблі. Ты можаш пісаць пра тое, пра сёе, але нічога, нічога ты не ведаеш вычарпальна і дакладна. Кінь, кінь, пакуль не позна, пяро, аддай яго капітану! І цяпер, і сёння жывуць са мной тыя шкадаванне і зайздрасць.

У каюце, найчасцей перад сном, вялі мы са «старым» задушэўныя, раздумліва-ціхія размовы, але выдараліся і такія хвіліны, калі не хочацца ні слоў, ні размоў, калі захінешся ад усяго свету шырмай, адно варочаешся на ложку і маўчыш. І той, другі ў каюце, разумее ўсё, таксама маўчыць і, мусіць, думае: «Заела ў цябе там нешта, псіхапат няшчасны! Ну добра, добра, маўчы, перацірай сабе заржавелыя вінцікі». І ператрэш, і, глядзіш,— назаўтра па-новаму ціктакае твой душэўны механізм.

Былі яшчэ хвіліны, калі «старога» пацягне раптам на «пиитический восторг», сядзе за стол і піша, а цябе грызе з такой прычыны не то крыўда, не то туга. Ляжаш на ложак, заплюшчыш вочы, слухаеш, як хры-

піць на сцяне дынамік, як хрыплавата-мінорна выводзіць нейкую мелодыю спявачка, а потым выявіцца, што «стары» растрачваў свой бліскучы талент на вузка мясцовыя тэмы, пісаў не вершы, а вершыкі, нешта накшталт:

Службой замучен,
Женой затискан
В «козла» везучий
Иван Фетискин.

Ці варта мне было праз гэта перажываць?!

— Ты думаеш, вершыкам адпомсціш Івану Якаўлевічу за шашачны пройгрыш?

— Не. Проста хачу яго ўсебакова абмаляваць. Быў ён героем вершаванага рэпартажу, няхай цяпер пабудзе героем пашквіля.

— На «саржы» пацягнула, га? А адкуль ты ведаеш, што тут Гогалі і Шчадрыны патрэбны?

Дурная, неабавязкова-лянівая размова, вядома. Апошні час заўважаю за сабой такую вось змрочнаабыякавую інтанацыю. Што гэта — уплывае Поўнач?

— Хадзем гуляць,— рашуча зграбаючы са стала паперы, прапануе раптам «стары».

Што ж, залатыя словы, да таго ж, сказаныя ў час. Выходзім. Сустракаем на палубе якраз Івана Якаўлевіча. «Стары» чытае яму свой «пашквіль». Ніякай увагі. Ні крыўды, ні здзіўлення, ні заахвочвання, якое, кажуць, трэба таленту, як каніфоль смычку.

— Піса-а-целі! — нарэшце грозна і змрочна кажа Іван Якаўлевіч і, нібы і не ён сказаў, пачынае глядзець некуды ўбок, на палубу суседняга карабля, з борта якога на наш борт перакінуты трап. Ад Івана Якаўлевіча цяпер нічога не даб'ешся: колькі ні стой ля яго, не выцісне з сябе ні ўсмешкі, ні нават вокам не міргне, вось хіба толькі ні з таго ні з сяго, счакаўшы, вылаецца, і каб ты не ведаў яго, мусіць, пакрыўдзіўся б на гэта, падумаў бы, што ён, не ведаючы, як адагнаць цябе, дае табе зразумець гэта другім спосабам. Але думаючы так, ты памыліўся б: Іван Якаўлевіч быў надзвычай добрай душы чалавек. Калі мы ўведалі гэта, калі супаставілі ягоную змрочнасць, бурклівасць, грубаватасць нават, якая была, несумненна, няўдалай маскай безабароннай дабраты,— калі супаставілі гэта з сапраўдным ягоным чалавечым нутром, то сталі зваць Івана Якаўлевіча па-свойму —

Максім Максімыч, у гонар арыгінальнага лермантаўскага служакі. Для нас ён быў менавіта Максім Максімыч, той дабрадушна-бурклівы дзядзька, якога мы шчасліва адкрылі для сябе.

І, мусіць жа, сакрэт Івана Якаўлевіча ведалі не адны мы. Здаралася наглядаць, як яму, скажам, дакладваў пра нешта матрос: дакладваў голасам выразным і энергічным, выпінаючы грудзі, старанна цягнучыся рукою да скроні, а Іван Якаўлевіч глядзеў тым часам, па сваёй звычцы, абыякава некуды ўбок, і такую пакуту выказвала ўсё яго аблічча, што аж брала злосць на матроса, які, нібы заведзены, так і сячэ словамі.

— Дазвольце ісці, таварыш капітан-лейтэнант?

Прамаўчыць або адвернецца: маўляў, гэта відно і без таго, што можна ісці, ідзі, маўляў, браце,— сваю справу ты зрабіў, а пра мяне думай як хочаш; неабавязкова мне цябе, як ты, вачамі есці: прыйдзе мая чарга, і я, як ты, перад кім трэба стаяць буду. А табе я, можа, і не дазволіў бы так стаяць, але ж парадак ёсць парадак: што будзе, калі ўсе яго стануць парушаць?

Можа, так думаў Іван Якаўлевіч, можа, інакш, але матрос, я ўпэўнены, разумеў усё іменна так, і каб на месцы Івана Якаўлевіча быў хто другі, не дараваў бы яму гэткай своеасаблівай манеры прымаць рапарты, палічыў бы яе самым звычайным, не вельмі вынаходлівым хамствам. Але, трэба думаць, матросы ведалі за Іванам Якаўлевічам іншыя, больш несумненныя якасці, бо непрыкметна было, каб асуджалі яго за такое не то дзівацтва, не то наіўную гульню з самім сабой.

Чытач можа падумаць, што Іван Якаўлевіч — чалавек пажылы, але самае дзіўнае якраз тое, што яму не больш за трыццаць пяць год — узрост, яшчэ далёкі ад канчатковага падвядзення жыццёвых рахункаў. У такія гады другія толькі канчаюць халасцякаваць, а Івану Якаўлевічу можна ўжо тым часам паставіць у заслугу чацвярых дзяцей і калі як след памеркаваць пра гэта, дык выйдзе, што клопат для чалавека, занятага на службе, як быццам немалы. І ўсё ж не даводзілася бачыць, каб клопат гэты асабліва прыгнятаў Івана Якаўлевіча,— наадварот, ён, мусіць, даваў яму своеасаблівае адчуванне паўнаты, грунтоўнасці свайго жыцця, той грунтоўнасці, якой не заўважаў ён

у іншых карабельных афіцэраў-аднагодкаў і маладзейшых. У іхніх паводзінах, размовах было, вядома, больш казацкага, разбэрсанага, безуважнага да дробязей быту, і гэта, відаць, не асабліва падабалася Івану Якаўлевічу, і ён сваю жыцейскую перавагу іншы раз бяскрыўдна, дабрадушна даваў зразумець. Хаця, што і казаць, перавага гэтая была відочная і без таго: у ягоную каюту ледзь не кожную хвіліну ішлі хто па нітку з іголкай, хто па шчотку і ваксу, хто па асідол — наводзіць бляск на гузікі. Бывалі ў той каюце і мы — не часцей і не радзей за іншых.

Але даволі, бо, здаецца, Іван Якаўлевіч выйшаў у мяне завельмі ідылічны. Сябе ён, мусіць, не пазнаў бы ў гэтых радках і выказаўся б пра іх, як і пра «дзедаў» вершык, адным словам: «Піса-а-целі!» Таму, можа, варта неяк ураўнаважыць нашу ідылію нясмелаю спробаю шаржа — расказаць хоць крышку пра Пятра Нікіціна, які ў нейкім плане поўная працілегласць Івану Якаўлевічу, не кажучы пра тое, што і маладзейшы за яго, і чынам ніжэй — толькі год як з вучылішча. З Нікіціным мы, па некалькі разоў на дзень сустракаючыся ў каюткампаніі, абмяркоўвалі, як кажуць, высокія матэрыі. Размову звычайна пачынаў першы ён, выбраўшы для «затраўкі» які-небудзь кур'ёзны факт, вычытаны перад тым у газеце ці часопісе. Фактаў такіх ён наогул ведаў шмат — гэта стала ягонай страсцю. Да таго ж былі ў яго, як нам здавалася, і даволі грунтоўныя тэхнічныя веды, і ён падкрэслена задзірыста іншы раз казыраў імі, як і сваёй думкай наконт іншых не зусім тэхнічных пытанняў: быў наш Пятро іранічна-сучасны, востры на слова чалавек і яшчэ крыху... педант. І, як у кожнага педанта, была ў яго, вядома, прадуманая да апошняга вінціка душэўная канструкцыя. Што ж датычыць ягонай службовай ідэі, дык яна заключалася ў тым, што матроса трэба выхоўваць на дробязях, што гэта — найлепшы ды і найбольш перспектыўны спосаб. Канкрэтна ягоная метода выглядала прыкладна так. Прыносіць матрос Нікіціну на подпіс нейкую паперу. Той бярэ яе, паднімае ад паперы галаву і, цвёрда гледзячы матросу ў вочы, кажа:

— Give me a pen, please [1].

[1] Дайце мне, калі ласка, ручку.

Матрос лыпае вачамі.

— Я прашу ў вас ручку.

— У мяне, таварыш старшы лейтэнант, няма.

— У мяне няма таксама. Што будзем рабіць?

— Я збегаю, таварыш старшы лейтэнант, прынясу.

Нікіцін, зрабіўшы грацыёзны жэст рукой, дастае сваю ручку, падпісвае паперу.

— Вы зразумелі, таварыш матрос? Я не ў кабінеце, у мяне ручкі з сабой можа і не быць. Пакуль вы будзеце бегаць, пройдуць хвіліны. Зразумелі?

— Так точна, зразумеў.

— Ідзіце.

Матрос ідзе.

— Вось бачыце,— кажа Нікіцін,— усё пачынаецца з дробязей.— І развівае сваю думку наконт найлепшага і найбольш перспектыўнага спосабу выхавання матросаў.

Што ж, можа, і праўду кажа карабельны «англаман» Нікіцін, але давайце лепш не будзем абмяркоўваць гэтую высокую матэрыю, пакінем і нашага Івана Якаўлевіча, пойдзем паглядзім, што робіцца на прычале.

А на прычале выстраілася некалькі чалавек каманды і нашага карабля: такі ж, як наш, карабель павінен швартавацца да сценкі з другога боку прычала. Людзі з нашай каманды, калі падыдзе да прычала карабель, прымуць ад другой каманды канцы, будуць заводзіць тросы за цяжкія, круглыя, як бочкі, тумбы.

Карабель, падышоўшы, паволі сунецца паўз сценку прычала, з капітанскага мосціка чуюцца каманды, і матросы на баку і на юце круцяць лябёдкі, вызваляючы тросы. Цяжкі доўгі трос не перакінеш адразу на прычал: да канца троса прывязваецца некалькі больш тонкіх звенняў, і заканчваецца ўсё гэта самай звычайнай вяроўкай, і яна ўжо трапляе ў рукі да матросаў, што будуць памагаць карабельнай камандзе на прычале.

Вось ужо заведзены, закручаны за тумбы тросы, і карабель цяпер, як рыбіна на кручку. Карабель — вялізная рыбіна, якую трэба весці да берага, баючыся, каб не парвала лёску, каб не кідалася ў бакі,— знясільваць яе трэба асцярожна і разумна. Пярэдні трос напінаецца, як струна: карабель замірае на нейкае імгненне, потым пачынае паволі сунуцца назад, але

другі трос ужо далёка яго не пусціць. Тросы, накручваючыся на лябёдкі, цяпер падвядуць яго да самай сценкі, і тут матросы, што, перагнуўшыся за палубу, чакаюць з мяшкамі ў руках, набітымі вяроўкамі ці лямцам, не дадуць караблю церціся аб край прычала. Цяпер застаецца палажыць трап — і ўсё гатова.

Тыдзень-два пражыўшы на караблі, можна ўжо штокольвек заўважаць у навакольным жыцці. Памятаю, у першыя дні мы нічога ці амаль нічога не заўважалі тут: усё здавалася невядомым, безгалосым нейкім, нават варожым нам. Па трапе на карабель ты бег спяшаючыся, чамусьці баючыся паглядзець у вочы дзяжурнаму; заходзячы ў каюту, абавязкова чапляўся за парог нагой; ідучы паўз борт і сустракаючы матроса, пачынаў манілаўска-чычыкаўскую камедыю: стараўся прапусціць матроса наперад, а той адступаў убок і даваў дарогу табе. Так і тыцкаешся туды-сюды, покуль табе не скажуць настойліва: «Праходзьце!» — а потым ужо, злуючыся на сябе, здагадаешся: «Ды ў мяне ж пагоны!..» Ты забыў пра гэта, ты адчуваў сябе цывільным чалавекам, і выйшла, урэшце, з твайго боку не далікацтва, а канфуз. Адным словам, салага!

А потым, з часамі, ты спакайнеў, далей затрымліваўся позіркам на тым, другім, прыкмячаў, параўноўваў, пра нешта здагадваўся, пра нешта распытваў. Заўважаў, як раніцай і на сярэдзіне дня стаіць трап: раніцай — сходні ўніз — прыліў; на сярэдзіне дня апускаўся карабельны борт — вада адступала, і ты, выйшаўшы на прычал, чакаў ужо, калі патыхне водарасцямі, гніллю, глядзеў на бераг, дзе на камянях сядзелі чайкі. А выходзячы на прычал гадзін у дзевяць вечара, успамінаў пра матросаў-рыбакоў, што лавілі траску вудачкай проста з кацера, ля прычальнай сценкі. Вудзільна не было, быў кручок, на руку накручаная лёска, нажыўка — кавалачкі селядца. Рыбак стаяў і ўсё торгаў лёску, а недзе пад вадой, вясёлкавай ад нафтавых плям, зацярушанай трэскамі, сухой травой і лушпіннем, кідалася на селядца траска, брала кручок беспамылкова і адразу. Вось бы такую ўдачу нашым азёрным ды рачным рыбакам!

Паглядзелі мы, як швартуецца карабель, пастаялі над душой у рыбакоў, дакучаючы непазбежнымі ў такіх выпадках парадамі, а што рабіць далей? Ісці ў горад па білеты ў кіно? Але, здаецца, у кают-кампаніі

сёння кіношны дзень: цікавей і прасцей паглядзець кінафільм там. Эўрыка! Хадзем карміць Васюту!

Што такое Васюта? Самы звычайны, плебейскага паходжання кот, якому не пашанцавала нарадзіцца хаця б сібірскім, затое пашчасціла жыць на Поўначы. Самы звычайны гультай, пястун, які за сваё жыццё, відаць, і блізка не нюхаў мышы. Але ж які пераборлівы! Еў выключна адно сырое мяса і сырую рыбу. Паспрабуй, не ведаючы, даць яму хлеба з маслам ці скрылёк кілбасы — чмыхне носам, задзярэ хвост, выгне спіну і са спакойнай пагардай адыдзе ад цябе. Якраз нібы чалавек, што яшчэ хвіліну назад лічыў цябе, самае малое, падпольным мільянерам, а тут выявілася раптам, што ў цябе набытку, як у царкоўнага пацука. Васюта ў той час, калі мы мелі гонар пазнаёміцца з ім, займаў адзін апартаменты з пакоя, кухні і калідора. Гэта — удзень, а ўночы вольна шпацыраваў па двары, па вуліцах, меў нейкія свае справы ў чужых пад'ездах.

Васюту мы чамусьці не вельмі любілі, але цярпелі дзеля ягонага гаспадара Аляксандра Акімавіча — капітана трэцяга ранга і нашага карабля. Аляксандр Акімавіч быў нам сябрам, начальствам, добраахвотным хадайнікам па нашых больш ці менш важных справах — наогул, быў добрым геніем усяго нашага карабельнага жыцця. Адзінае, чым мы маглі аддзячыць яму — гэта ўзяць на сябе клопат пра Васюту, тым больш, што Аляксандр Акімавіч амаль не паказваўся дамоў, на кватэру, дняваў і начаваў на караблі, а пра Васюту пыталіся ў Аляксандра Акімавіча ў кожным пісьме школьнікі-сыны, што адпачывалі з маці недзе ў Геленджыку. І Аляксандр Акімавіч са спакойным сумленнем адпісваў сынам, што Васюта жывы, здаровы, чаго і вам, маўляў, жадае, а мы іншы раз кармілі ката, выпускалі на вуліцу і таксама са спакойным сумленнем забываліся пра яго да наступнага разу. А потым з Васютам здарылася няшчасце. У адзін, мусіць, не вельмі цудоўны дзень Васютавы апартаменты, якія паступова сталі і нашымі, захапіў на ноч нейкі гаспадароў знаёмы, паводле атэстацыі Аляксандра Акімавіча, вельмі сур'ёзны таварыш і душа-чалавек. Што і як там было, не ведаю, але назаўтра мы дазналіся, што гэты «сур'ёзны таварыш» выпусціў Васюту на вуліцу з перабітай нагой, а сам недзе знік у невядомым кірунку. Кату перавязалі пакалечаную нагу, а наш Аляксандр

Акімавіч чамусьці ўжо не называў свайго знаёмага «сур'ёзным таварышам», а выказаўся пра яго неяк туманна, прыкладна так, што дрэнныя ўчынкі можа рабіць толькі дрэнны чалавек. Мы сказалі, што, вядома, яно так, і пакаяліся перад сабой, што не заўсёды былі ўважлівыя да Васюты.

Сынам пра каціную бяду Аляксандр Акімавіч, параіўшыся з намі, не напісаў. Памятаю, мы радаваліся, калі Васютава нага праз нейкі час пачала загойвацца — мы знялі з яе павязку, і наш катафей зноў як новенькі стаў шпацыраваць па пад'ездах і вуліцах.

Як ты там жывеш цяпер, ганарлівец Васюта?

P. S. Вечарам таго ж дня ў кают-кампаніі, старанна захінуўшы фіранкамі вокны, каб не прасочвалася сонечнае святло, глядзелі мы фільм. Перад пачаткам кінамеханік мінут трыццаць пускаў ленту, склееную з кавалкаў, панавыбіраных бог ведае з якіх фільмаў. Лента мела поспех надзвычайны. Потым пайшоў «Пятнаццацігадовы капітан». Была магчымасць выбару: «Балада пра салдата» ці гэты фільм. Мы са «старым» галасавалі за «Баладу», але пацярпелі ганебнае фіяска. Перамог, набраўшы абсалютную большасць галасоў, «Пятнаццацігадовы капітан». Мы скарыліся: нічога не зробіш — большасць!

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ РЫБЫ-ЛОЦМАНА!

Адступленне літаратурнае

Праглядаючы сваю запісную кніжку, спыніўся думкай на словах, накрэмзаных алоўкам: «Быў кепскі настрой. Чытаў Хемінгуэя на стадыёне». Успомніў усё, як было: тое, які сапраўды кепскі быў у мяне настрой пасля аднаго не вельмі прыемнага ліста, як хадзіў, аж стукала ў скроні, амаль бязлюдным ранішнім горадам без мэты, без жадання мэты — абы ісці, як, перасільваючы сябе, падышоў да кніжнага кіёска, узяў у рукі часопіс: пакутліва-безуважна гартаў яго, пакуль не ўбачыў вілястае, гнуткае, як вялізная рыбіна, прозвішча — Хемінгуэй, пакуль не прачытаў пад ім: «Свята, якое заўсёды з табой».

Купіў часопіс і з нейкай няпэўнай надзеяй у сэрцы пайшоў на стадыён; пераступіў, не шукаючы варотцаў, невысокую дашчаную агароджу і сеў, здзьмухнуўшы

пыл, на ўгрэтую сонцам лаўку — высока, так, каб відзён быў увесь стадыён, і вуліца паўз кінатэатр, і дамы на ўзгорку злева, і віядук, перакінуты там цераз вуліцу. Я сядзеў і чытаў пра Парыж далёкіх дваццатых гадоў, пра маленькія кафэ, булачныя, пра брукаваную старую вулачку Нотр-Дам-дэ-Шан, на якой быў дом нумар 113, а ў тым доме, над лесапілкай, пакой, у якім нікому невядомы малады чалавек з прасветлена-дабрадушным, спакойна-ўважлівым тварам пісаў уранку ля расчыненага акна, час ад часу паднімаў галаву ад папер, глядзеў на мокры пасля дажджу брук, на пастуха, што гнаў па вуліцы статак коз, на сабаку, што трухаў за статкам.

І ўсё было так выразна, проста, зразумела мне на тых вуліцах, у тых рэстаранчыках і кафэ, на скачках, і жывое пачуццё чалавека, што праз многа год успамінаў усё гэта, перадавалася мне: я бачыў яго такім, які ён быў у юнацтве, якім быў ці хацеў быць цяпер, калі расказваў пра гэта, але я ведаў, што гэтага чалавека ўжо няма, і неўсвядомлена востра шкадаваў, што той Парыж, які ён так любіў, ва ўспамінах будзе цяпер падуладны не яму, а мне,— але гэта ўсё адно быў ягоны Парыж той пары, калі ён быў малады і вучыўся пісаць сапраўдную прозу, калі перайшоў Сену, як Рубікон, спаліўшы за сабой усе масты. Адсюль, з Парыжа, не было ўжо для яго звароту ў журналістыку, ён павінен быў стаць пісьменнікам, чаго б гэта ні каштавала яму.

«Добра, падумаў я, цяпер я навучыўся пісаць апавяданні так, што іх не разумеюць. Гэта абсалютна так. І ўжо абсалютна несумненна тое, што на іх няма попыту. Але іх зразумеюць — падобна на тое, як гэта бывае з карцінамі. Трэба толькі час і вера ў сябе». Пазней, можа, вяртаючыся думкай да гэтай свае парыжскай пары, ён напіша: «Толькі рамантыкі думаюць, што на свеце ёсць «невядомыя майстры». Ён не любіў гучных слоў, ведаў, што пісаць «сапраўдную прозу» «па-д'ябальску цяжка», і толькі гэта, такое простае і высакароднае ў сваёй прадуманай шчырасці, сказаў сваім даследчыкам і чытачам, але, вядома, ён мог бы падпісацца і пад зацяганай фразай, што выводзіць талент з працы, хоць яму, трэба думаць, бліжэй было б такое, напрыклад, выказванне Паскаля: «Геній — гэта цярпенне думкі, засяроджанай у адным кірунку».

Нехта сказаў, што вялікімі пісьменнікі робяцца толькі пасля смерці. Хемінгуэй быў прызнаны пры жыцці, але думкі пра ўласную веліч, мусіць, не надта надакучалі яму, пісьменніку, які бачыў лепшую ўзнагароду мастаку не ва універсальным слоўным вадалействе крытыкаў, што з незвычайнай лёгкасцю могуць перабягаць з-пад аднаго сцяга пад другі, не ў паблажлівай увазе літаратурных мецэнатаў, для якіх талент існуе толькі для таго, каб яго можна было купіць. Не надта спакушаўся ён і так званай усеагульнай любоўю чытачоў на той простай падставе, што не пісаў бестселераў. Літаратура была для яго адным з даступных чалавеку сродкаў сцвярджаць сваю годнасць, і таму натуральна, што пра пісьменніцкае сумленне, «абсалютна нязменнае, як метр-эталон у Парыжы», ён клапаціўся больш, чым пра лаўры для юбілейнай поліўкі. Ва ўсім астатнім ён зусім сур'ёзна задавальняўся славай добрага паляўнічага і рыбака.

Мала хто з пісьменнікаў так абсалютна давяраў жыццю, як гэта рабіў Хемінгуэй. Я не хачу сказаць, што ён, як можа каму здацца, прымаў жыццё такім, якое яно ёсць,— не, проста ён не ведаў для пісьменніка іншага матэрыялу, акрамя жыцця: было б недарэчна скульптару пагарджаць глінай толькі таму, што сама па сабе яна яшчэ не галава Апалона. Ён не мог ахвяраваць праўдай жыцця дзеля ўяўнай значнасці ідэі: для яго гэта азначала б ні больш ні менш як навіваць думку на папяровыя папільёткі. Міс Стайн, пра якую Хемінгуэй піша з цвярозай паслядоўнасцю аб'ектыўнага наглядальніка, магла дазваляць сабе быць і паблажліванаймяркоўнай да людзей і залішне строгай. Яна магла павучаць Хемінгуэя, якую думку, вядома, перадавую, павінен ён мець наконт гомасексуалізму, але павучаць так, каб субяседнік у той жа час адчуваў, што ёсць розніца паміж смелым вальнадумствам салонаў і тым, што тут завецца разбэшчанасцю і злачыннасцю, якія, бачыце,— прыналежнасць сацыяльных нізоў.

«Усё гэта так, Хемінгуэй,— заявіла яна.— Але вы жылі ў асяроддзі, дзе панавалі разбэшчанасць і злачыннасць.

Я не стаў спрачацца наконт гэтага, хоць падумаў, што я жыў у свеце, які ён ёсць, і былі там розныя людзі, і я стараўся зразумець іх, хоць некаторыя з іх мне не падабаліся, а другіх я ненавіджу да гэтай пары».

Талент, як і сумленне, павінен быць непадкупны, галава павінна быць цвярозая, жыццёвы інстынкт здаровы, зрок востры, слых абсалютны. Талент — інструмент, пры дапамозе якога чалавек пазнае жыццё, ён — люстра, у якім адбіваецца свет, а карціна гэтага свету будзе тым дакладнейшая, чым дакладнейшы сам інструмент. Свет, магчыма, трэба лячыць. Але найперш трэба паставіць дакладны дыягназ хваробы. Ён, Хемінгуэй, не заўсёды ведаў, як трэба лячыць. Наогул, найчасцей ён любіў ставіць дыягназ. Магчыма, ён памыляўся, але мы зараз гаворым не пра тое. Больш за ўсё ён баяўся стаць тым доктарам, якому аднойчы шчасліва ўдалося вылечыць пацыента: практыка расце, слава расце, і доктар неяк незаўважна пачынае прапісваць «страждущей» палавіне роду чалавечага замест горкіх пілюль мятныя пернікі. Так было са Скотам Фіцджэральдам, аўтарам рамана «Вялікі Гэтсбі», які Хемінгуэй надзвычай высока цаніў, з пісьменнікам, якому Хемінгуэй прысвяціў, нібы эпітафію, праніклёна журботныя словы: «Яго талент быў такі ж натуральны, як узор, утвораны пыльцой на крылах матыля. Адзін час ён разумеў гэта не болей, чым матыль, і не заўважыў, як узор сцёрся і паблякнуў. Пазней ён зразумеў, што крылы яго пашкоджаны, і зразумеў, якія яны, і навучыўся думаць, але лятаць больш не мог, бо любоў да палётаў прайшла, а ў памяці засталося толькі, як лёгка гэта было некалі».

Фіцджэральда загубіў літаратурны поспех. Закружылася галава. І прыйшла «рыба-лоцман». «У багацеяў заўсёды ёсць свая рыба-лоцман, яна разведвае ім дарогу — іншы раз яна дрэнна чуе, іншы раз дрэнна бачыць, але заўсёды вынюхвае падатлівых і занадта выхаваных». Усё здавалася простым: талент усемагутны, гэта ён скарыў «рыбу-лоцмана», што так прыніжана просіцца хоць хвіліну паплаваць у вольных глыбінях ягоных вод. Здавалася, «рыба-лоцман» трапіла ў цянёты. Выйшла наадварот: у іх трапіў сам пісьменнік. Фіцджэральд мог называць сябе ў пісьмах да Хемінгуэя «старой шлюхай» і ў той жа час акуратна запісваць у спецыяльную кніжку лічбы сваіх высокіх заробкаў. Выйсця ўжо не было.

І да Хемінгуэя прыходзіла «рыба-лоцман». Але няхай ён лепш раскажа пра гэта сам: «Паддаўшыся абаяльнасці... багацеяў, я стаў даверлівы і дурны, як

пойнтэр, што гатовы ісці за любым чалавекам з ружжом, або як дрэсіраваная свіння, якая, нарэшце, знайшла некага, хто яе любіць і цэніць дзеля яе самой... Я нават прачытаў уголас урывак з рамана, над якім працаваў, а ніжэй за гэта ніякі пісьменнік пасці не можа...»

Хемінгуэй вырваўся з цянётаў. Магчыма, урок Фіцджэральда памог яму, а магчыма, і нават хутчэй за ўсё, памог яму чалавек з краіны, у якой Хемінгуэй ніколі не быў,— вялікі рускі пісьменнік Леў Талстой. У «Свяце, якое заўсёды з табой» Хемінгуэй, расказваючы пра «другі свет, які дарылі... пісьменнікі», недвухсэнсоўна працягвае думку: «Спачатку рускія, а потым і ўсе астатнія. Але доўгі час толькі рускія». І тут жа пра Талстога: «У параўнанні з Талстым апісанне нашай грамадзянскай вайны ў Стывена Крэйна здавалася бліскучай выдумкай хворага хлопчыка, які ніколі не бачыў вайны...» А Стывен Крэйн быў у ліку тых сапраўдных і нешматлікіх пісьменнікаў, якія, паводле прызнання Хемінгуэя ў іншым месцы, паўплывалі на яго. Далей ідзе параўнанне Талстога са Стэндалем: «Пакуль я не прачытаў «Chartreuse de Parme»[1] Стэндаля, я ні ў кога, акрамя Талстога, не сустракаў такога паказу вайны; да таго ж, цудоўныя карціны Ватэрлоо ў Стэндаля выглядаюць чужароднымі ў гэтым даволі сумным рамане». Старонкі другога твора Хемінгуэя — «Зялёных узгоркаў Афрыкі» — сведчаць нам пра выключнае ўражанне, якое зрабілі на пісьменніка «Казакі» і «Вайна і мір» геніяльнага рускага мастака слова.

Талстой закончыў «Севастопаль у маі» гордымі словамі пра тое, што герой ягонай аповесці, якога ён любіць «усімі сіламі свае душы, заўсёды быў, ёсць і будзе цудоўны — праўда». Хемінгуэй падхоплівае талстоўскую думку: «Задача пісьменніка нязменная. Сам ён мяняецца, але задача ягоная застаецца той жа. Яна заўсёды ў тым, каб пісаць праўдзіва і, зразумеўшы, у чым праўда, выказаць яе так, каб яна ўвайшла ў свядомасць чытача часткай ягонага ўласнага вопыту».

Бясспрэчна, Талстой уплываў на Хемінгуэя. Але гэта была не толькі адна ўлада магутнага таленту, якую лёгка вытлумачыць і зразумець, але і нешта большае:

---

[1] «Пармскі манастыр».

Хемінгуэй бачыў у Талстым узор таго натуральнага, моцнага здаровым жыццёвым інстынктам пісьменніка, якому арганічна варожыя фальш, танныя сантыменты, самаздаволенасць, пустая ганарыстасць, падмена жывога жыцця худасочным тэарэтызаваннем наконт яго. Вядома, Талстой быў узорам таго, як трэба гранічна праўдзіва напісаць і вайну, і перажыванні каня Халстамера, і паляванне, і тое інтымнае ў жыцці чалавека, перад чым абавязкова спасуе пісьменнік-ханжа, але Хемінгуэй мала чаму навучыўся б у вялікага празарліўцы, калі б не меў у душы чагосьці роднаснага Талстому і ягонаму незвычайна цвярозаму погляду на свет. І яшчэ нейкімі сваімі рысамі пісьменніка і чалавека Хемінгуэй нагадвае Чэхава. І выключнай прастатой і выразнасцю мастацкай дэталі, і амаль забабоннымі адносінамі да ўсяго, што складае святая святых пісьменніка. Хіба можна ўявіць Хемінгуэя, як і Чэхава, у позе натхнёнага, красамоўнага прапаведніка вядомых ісцін? Ён ведаў, што ісціны добрыя самі па сабе, але яны перастаюць быць ісцінамі, калі імі неасцярожна кідацца, як мячыкам. А можа, хто ведае, што Хемінгуэй любіў разважаць пра натхненне? Не, ён проста працаваў, хоць, вядома, многія выдатныя старонкі ягоных твораў не абышліся без таго, што завецца натхненнем. Чэхаў мог пісаць толькі тады, калі яго ніхто не бачыў. Нельга таксама ўявіць, каб ён, скажам, толькі што напісаны твор чытаў перад так званымі прыхільнікамі яго таленту. Хемінгуэй, як мы ведаем, асцерагаўся чытаць што-небудзь «зацікаўленай публіцы» і выслухоўваць водгукі, накшталт такіх: «Гэта геніяльна, Эрнест. Праўда, геніяльна. Вы проста не ведаеце, што гэта такое». Сёння тая ж «зацікаўленая публіка» ім гаварыла б: «Гэта каласальна, Антон Паўлавіч! Гэта жалезна, Эрнест. Без дурняў. Са страшнай сілай».

Раніцою таго дня, у які я чытаў на стадыёне Хемінгуэя, у мяне быў кепскі настрой, і здавалася, што нічога не існуе на свеце, акрамя мяне і гэтага майго настрою. Цяпер жа я памятаю ўсё толькі таму, што чытаў тады Хемінгуэя: загортваў на каленях часопіс, глядзеў на стадыён, цяпер пустынны, а яшчэ пазаўчора поўны людзей — была сустрэча мясцовых каманд,— і думаў, як бы апісаў усё гэта ён: поле без травы, пасыпанае пяском, густа пафарбаваны шчыт, на якім выстаўляліся фанеркі з назвамі каманд і ачкамі, баскетбольную

пляцоўку за футбольным полем, летні павільёнчык з каляровым пластыкавым дахам, паўночнае сонца і паўночнае неба. Я думаў, што яму спадабалася б тут, у гэтым невялікім горадзе ля мора, у яго было б тут, вядома, куды больш сяброў, чым у мяне: не таму, што ведалі б, хто ён, а таму, што ён ведаў людзей і ўмеў сябраваць. Зноў браў у рукі часопіс і чытаў, і зноў мяне брала ў палон даведзеная да самай звычайнай рэальнасці ілюзія перададзенага словам жыцця. Здавалася, гэта мог зрабіць не чалавек, а маг, які сказаў імгненню: «Спыніся», і яно спынілася ва ўсёй сваёй непаўторнасці і красе.

У той жа сваёй запісной кніжцы знайшоў я такія радкі: «14.07.64 г. Падумаў, чым будуць для мяне гэтыя дні на Поўначы. Ці проста нешта ўбачу, запомню, ці душой адчую, зразумею нешта, адкрыю новую краіну ў сваёй душы?» Адкрыў ці не адкрыў я тую новую краіну, няхай мне будзе дазволена ўтаіць гэта. А вось што тут, на Поўначы, я лепш зразумеў, па-новаму адкрыў для сябе Хемінгуэя — гэта абсалютна так.

КАЮТА І КАЮТ-КАМПАНІЯ. МОРА

Заканчэнне

Тут неабходна кароткае тлумачэнне. Аўтар перапыніў сваё апавяданне таму, што не ведаў, як яму надалей абысціся з Аляксандрам Акімавічам. Можна было б, вядома, добрасумленна выкласці сякія-такія нагляданні над ім, і аўтар, магчыма, і зрабіў бы так, калі б не ўспомніў на той час пра другога чалавека з пяром, які завецца крытыкам і які, хоча таго аўтар ці не, будзе рабіць на палях энергічныя заўвагі, прыкідваць і так і сяк, а потым выкажацца накшталт таго, што аўтар, вядома, меў пад рукамі надзвычай цікавы, удзячны матэрыял, але чамусьці не падумаў, што матэрыял — гэта адно, а ўменне абагульняць, тыпізаваць — другое. Аляксандр Акімавіч, несумненна і безумоўна, у жыцці куды больш цікавы чалавек, чым гэта здалося аўтару, і проста дзіўна, як асмеліўся ён так паспешліва выдаваць бытавыя дробязі за партрэт, чаму заўважыў нейкага ката Васюту і не заўважыў, што Аляксандр Акімавіч на самай справе заклапочаны нечым большым, чым тое, трэба ці не трэба пісаць сынам пра пакалечаную кацінаю лапу.

Крытыку заўсёды відней, і аўтар, памятаючы пра гэта, пачаў прыглядацца да свайго Аляксандра Акімавіча больш пільна, і тут нечакана здарылася вось што: Аляксандр Акімавіч пачаў двоіцца, нават траіцца ў ягоных вачах, і аўтар зразумеў, што ніякага Аляксандра Акімавіча няма, а ёсць, калі хочаце, і тое, і другое, і трэцяе. Ёсць, сапраўды ёсць Аляксандр Акімавіч з яўнай прэтэнзіяй на бязгрэшнага героя. Гэта ён цэлы дзень на нагах, на абед у кают-кампанію прыходзіць стомлены, але, нягледзячы на гэта, і тут не можа легкадумна дазволіць сабе аддзяліць грамадскае ад прыватнага: і тут знаходзіць пытанні, якія можна вырашыць і абмеркаваць. Дзверы ў ягонай каюце заўсёды расчынены напята: няхай ведае матрос, што ў любы момант можа зайсці сюды, не надта пакутуючы ад думкі, што не даў капітану трэцяга рангу адпачыць. Яшчэ не паспеўшы распрануцца ў сваёй гарадской кватэры, куды прыходзіць, самае большае, на тыдзень раз, Аляксандр Акімавіч бяжыць да тэлефона: а ці не здарылася што без яго на караблі? У кватэры, якую летам займае Васюта адзін, Аляксандр Акімавіч месціцца з жонкай і двума дзецьмі. І абсталявана кватэра так, каб у любы час можна было сабраць чамадан, аддаць суседу крэслы і канапу і пераехаць на другое месца, а куды — гэта ўжо начальству відней. Давалі нядаўна новую, двухпакаёвую кватэру, але дазнаўся, што камусьці яна патрэбна больш: кватэру аддаў, а сам згадзіўся невядома яшчэ колькі часу пачакаць. І адпачынак выпадае нашаму Аляксандру Акімавічу не ў ліпені, не ў жніўні і нават не ў верасні, а недзе пад канец года, калі ўжо не надта вабіць і поўдзень і здаецца прасцейшым паехаць у вёску да бацькоў.

Такі Аляксандр Акімавіч нумар адзін. Аўтар сапраўды ведаў яго і такім і мог бы, калі на тое, яго папрыгажэй намаляваць, але, на шчасце, ён трошкі ведае і свайго крытыка. Асаблівасць гэтага крытыка ў тым, што яму абавязкова трэба знайсці недахопы ў любым творы і што ні адзін герой не дацягвае да ягонай, недаступнай аўтарскаму разуменню, меркі. Ну чым благі, скажыце, Аляксандр Акімавіч нумар адзін? Чытач, не сапсаваны нашым крытыкам, абавязкова скажа: «Дай бог нам пабольш гэткіх людзей!» А наш крытык на тое адкажа, што яно, вядома, Аляксандр Акімавіч добры чалавек, але ж занадта аскетычны нейкі і

непатрабавальны да жыцця, і мірыцца шмат з чым, і ці не падабаецца, наогул, аўтару гэтая ягоная пасіўнасць, бо ён, відаць, спачувае герою, а далей гэтага не ідзе.

І што пасля гэтага рабіць аўтару? Моўчкі праглынуць пілюлю і паспрабаваць намаляваць Аляксандра Акімавіча нумар два? Што ж, Аляксандр Акімавіч нумар два такі. Ён прыкладны сем'янін. На календары ў ягонай кватэры вось ужо другі месяц усё той жа дзень, у які паехала на поўдзень жонка з дзецьмі: час спыніўся для Аляксандра Акімавіча. Жонцы ён піша ледзь не кожны дзень, жонка, здаецца, піша яму часта таксама. Аляксандр Акімавіч можа і «палубу» ў кватэры «надраіць», і пасуду памыць. У вольныя хвіліны ён пачытвае вершы Эдуарда Асадава і ў той жа час, забыўшыся, называе вяселле «мерапрыемствам»...

«Не, не тое,— зноў скажа наш крытык,— гэта, можа, і добра для нядзельнай старонкі ў газеце, але толькі не для нарыса. Ідылічна, абмежавана, камерна. Вось каб у Аляксандра Акімавіча быў канфлікт з жонкай з-за легкадумна аддадзенай кватэры, вось каб кот Васюта выступаў сімвалічным увасабленнем гэтага... ну, самі ведаеце, мяшчанства!.. Вось каб...» І не стане ж пасля гэтага аўтар, нібы тапелец за саломінку, хапацца за яшчэ аднаго Аляксандра Акімавіча, якога таксама ведае і які зусім ужо не варты ні ідыліі, ні оды. Гэты падпольны Аляксандр Акімавіч пабойваецца жонкі, і калі, скажам, здараецца выручыць сябра двума чырвонцамі, дык робіць усё так, каб пра гэта не ведала ніводная душа. Гэты Аляксандр Акімавіч, калі зойдзе да яго той жа сябар, а жонкі не будзе дома і яны вып'юць бутэлечку «старлейту», прыхавае пасля пасудзіну так, што яе не знойдзе ніякі Шэрлак Холмс, няхай ён нават будзе і ў спадніцы. І ад моладзі сучаснай не ў захапленні Аляксандр Акімавіч, і любіць сяды-тады пахваліць сябе і свой маладжавы выгляд, які ў яго таму, што жыве «правільным жыццём».

Вось якая справа з Аляксандрам Акімавічам, дарагі чытач; вось і вазьмі яго пасля гэтага ў героі нарыса. Няхай ужо лепш будзе ён проста службовай асобай, без якой аўтару не абысціся хаця б таму, што ў адзін цудоўны дзень пачуў ад яе навіну: карабель выходзіць у мора! Рыхтуйся, браце!

Мора!.. Ляжала яно недзе за сопкамі, заваблівае і

блізкае, але недаступнае пакуль. I вяла да яго гарлавіна заліва, што тут, ля горада, раздвойвалася, і было дзіўна, што гэта, сур'ёзна выдрукаванае на карце, недзе ў Беларусі здавалася бог ведае чым, а тут яно — проста нешырокае ўлонне вады: шукай не шукай параўнання, а параўнаеш усё адно з возерам, што бачыў дзе-небудзь ля Мядзеля ці ў Глыбокім. I зусім ужо дзіўна, што невысокая сопачка з разбураным дотам, што астаўся ад вайны, тая сопачка, на якую штодзень падымаўся, ідучы ў горад, на якой дзень пры дні пасвіўся буланы гладкі конь, на адхоне якой гібеў драўляны домік, абабіты фанерай, дошкамі і лістамі толю,— зусім ужо дзіўна, што ўсё гэта завецца мысам і таксама недзе значыцца на карце.

Карта скажа табе, што ты на краі зямлі. Толькі гэта адчуеш і так, калі пакручастай сцяжынай ці па дашчаных сходнях узыдзеш на сопку, даўгую і гарбатую, як сумёт, пярэстую ад шэрых пралапін гладкіх парод, ад вялізных трэшчын, парослых ягаднікам, мохам і сакавіта-кволай травой, калі, абышоўшы дзветры рудавата-зялёныя лугавінкі, куп'істыя і неспадзявана гразкія на гэткай цвердзі і вышыні, сядзеш на камень і станеш глядзець на заліў.

Позірк твой памкне ўдалеч, туды, дзе неба ў прагаліне сопак нізка вісне над вадой, дзе, нарэшце, не відно ніякай вады, а відны толькі сопкі і неба, і неба цячэ над сопкамі, і здаецца, што сопкі — гэта парогі, а неба — рака, што страшна абрываецца там, на даляглядзе, у бездань.

I вось наш першы выхад у мора: стаім на капітанскім мосціку ў адкрытай ячэйцы-баковачцы, побач з сігнальшчыкам, глядзім, як паволі адплываюць назад сопкі, як аддаляецца горад: збіваюцца ў гурт дамы, шырэе за імі далягляд, а карабель усё ідзе, і малахітава-зялёная дарожка сцелецца следам за ім, доўга не разыходзячыся на вадзе. Цікава наглядаць, як паступова да чыстых, празрыстых колераў дарожкі дадаецца фіялетавы тон, як вада гусцее, набываючы шызы бляск і часам яшчэ востра адсвечваючы холадна-чыстым блакітам. Паглядзіш наперад: з двух бакоў ляжаць цёмныя ўзвалы сопак. Чым далей ад горада, тым змрачнейшымі выглядаюць яны, і не відно на іх ні дрэўца, а толькі там-сям ва ўпадзінах бялее снег. Глядзіш уніз: бушуе, пеніцца ля борта вада, напінаецца,

вагаецца наструненая, нібы пража, хваля і, калыхнуўшыся апошні раз, разбіваецца з шумам, уся ў белых пухірах, якія растаюць умомант, і цяпер там, дзе былі яны, блакітны вір вады.

Здаецца, зусім нядаўна прапаў з вачэй горад, а ўжо астаўся ззаду і праліў. Злева цямнее, паступова звужаючыся на захадзе і хаваючыся ў туманнай смузе, палоска зямлі, а справа велічна, аграмадна, нібы айсберг, выплыў востраў Кільдзін, падобны на пастамент помніка Пятру Вялікаму: выгінастая строма ўзнята над вадой, а ніжэй — магутная плаўнасць складак, што паласуюць аграмаду адхонна і ўдоўж. І пад аграмадай, асветленай з аднаго боку сонцам, сілуэтна зацененай з другога,— роўная пляцоўка жоўтага берага, на якім відзён нейкі дамок, здаецца, пабудаваны толькі для таго, каб было з чым параўнаць каменную веліч магутных скал.

На Кільдзіне ёсць возера, названае «шматпавярховым» і не падобнае ні на адно з азёраў на свеце. Утварылася яно з мора: суша паднялася, зачарпнуўшы каменнай далоняй вады, і многа розных прычын трэба было для таго, каб семнаццаціметровая тоўшча вады адстаялася, утварыўшы тры слаі. Ніжні слой мёртвы, бо ў вадзе ёсць серавадарод, у другім звычайная салёная, а ў трэцім — апрэсненая. Ніжні і сярэдні слаі раздзелены плёнкай ружовых бактэрый. Акісляльныя працэсы, што адбываюцца ў плёнцы, не прапускаюць серавадарод у верхнія слаі, таму ў сярэднім слаі жывуць марскія арганізмы, у прыватнасці траска, а ў верхнім — прэснаводныя.

Востраў Кільдзін як бы вартуе выхад з заліва ў мора. Прышвіну ў час яго паўночнага падарожжа лапары, карэнныя жыхары гэтых мясцін, расказвалі пра Кільдзін такое паданне. Нібыта злая вядзьмарка, за нешта помсцячы лапарам, хацела заперці іх у Кольскай губе і выцягнула востраў з акіяна на вяроўцы. Калі яна была ўжо амаль ля самай губы, нейкі чалавек, што аказаўся паблізу, здагадаўся пра вядзьмарчын намер і крыкнуў. Вяроўка парвалася, вядзьмарка спалохалася і акамянела, а востраў як спыніўся ў акіяне, так і стаіць там да гэтай пары. Цікава, што праз дваццаць пяць год пасля наведвання Кольшчыны нешта падобнае да гэтага падання запісаў Прышвін у другім месцы, у Сібіры,— там народная фантазія акру-

жыла паэтычнай выдумкай паходжанне скалы, што тырчыць з вады пры выхадзе Ангары з Байкала. Гісторыя, паводле падання, была такая. Ангара, жонка Байкала, аднойчы, калі падняўся над возерам туман, надумала ўцячы да Енісея. Байкал, спахапіўшыся жонкі, кінуў ёй скалу наўздагон, але не пацэліў. Пра злосць раўнівага Байкала і нагадвае цяпер людзям гэтая скала.

Які цудоўны матэрыял для разваг пра народную фантазію, колькі невычэрпную, столькі і пастаянную ў любві да пэўных паэтычных рашэнняў. Пішучы гэта, я ўспамінаю паданне пра адну крыніцу на Магілёўшчыне: ваду з той крыніцы людзі лічаць гаючай, «святой». Расказваюць, што некалі, вядома, даўно, пасваталіся да прыгожай дзяўчыны два хлопцы — адзін багаты, другі бедны. Прыгажуні падабаўся багаты, але, каб не пакрыўдзіць беднага, прыдумала яна кідаць каменні: хто далей кіне, за таго і замуж пойдзе. Першы камень кідаў багаты: кінуў далёка, і ўпаў той камень у лесе, ля рэчкі Галубы, дзе ляжыць і цяпер,— паміж Нямільным і Крамянкай. Самы вялікі выбраў сабе камень бедны жаніх, і паляцеў той камень яшчэ далей і ўпаў пад Клінамі. Заплакала тады прыгажуня і стала крыніцай. Вось якое расказваюць у нашай мясцовасці паданне: яму не ўсе вераць, але пра яго ведаюць усе.

І я, ведаючы паданне пра Кільдзін, глядзеў на яго цяпер як бы вачамі таго чалавека, што спудзіў вядзьмарку і якому, мусіць, было адначасна і боязна, і рызыкоўна, і весела сярод гэтай суровай і простай прыроды — інакш бы ён не прыдумаў такую наіўна-страшную гісторыю пра Кільдзін. Я думаў пра тое, як ён павінен быў адчуваць сябе, седзячы ў маленькай сваёй пасудзіне, якую ў любы момант магла праглынуць калі не вядзьмарка, дык хваля, далёка ад берага, сярод гэтага мора.

Павінен прызнацца, што хваль вялікіх мы не бачылі. Стаяла надзіва спакойнае лета, ды і наогул штормы тут бываюць пад восень, пазней. Быў амаль што штыль, і чайкі спакойна сядзелі на хвалях, сушачы дзюбы на ветры: маракі казалі, што па тым, як сядзяць чайкі, можна вызначыць напрамак ветру з дакладнасцю да градуса. Мы назіралі за чайкамі, глядзелі на пенназялёны след ад карабля, на другі след —

ад сонца, да болю ў вачах узіраліся ў гарызонт, стараючыся разгледзець далёкія абрысы паўвострава, а калі надакучала стаяць на мосціку, спускаліся ўніз у каюту, дзе прыкметна адчувалася гайданка, але, вядома, не так, каб хапацца за сцены і баяцца за сваё нутро. Гэта была прыемная гайданка, і, памятаю, я нешта ў каюце чытаў, калі моцна страсянуўся карабель, нешта сарвалася са сцяны і, упаўшы на стол, пырснула мне на рукі шклом. Барометр!.. Пачаліся вучэнні.

Потым ужо, вярнуўшыся з плавання, ты адчуваў сябе так, нібы пераступіў апошні рубеж, за якім адкрылася самае галоўнае ў гэтым краі. У вольныя хвіліны ў каюце, абклаўшыся сякімі-такімі кнігамі пра Поўнач, ты мог ужо без правінцыяльнага здзіўлення чытаць пра тое, што дрэва тут вырастае па сантыметру ў год, што птушкі ляцяць тут на зіму ў вырай на поўнач і што цёплыя вятры таксама дзьмуць адтуль (Гальфштрым!), што сярэдняя тэмпература зімы тут такая ж, як у Астрахані. Траплялiся і больш цікавыя рэчы.

У старажытным летапісе пра Поўнач напісана як пра край незлічоных багаццяў: векшы (вавёркі) і «оленцы малы» там нібыта падаюць з воблакаў на зямлю і, падросшы, разыходзяцца па ёй. А калі ў 80-х гадах мінулага стагоддзя нястомны даследчык Пячоры, зямляк Ламаносава, вучоны М. К. Сідараў зрабіў спробу зацікавіць лёсам Поўначы будучага цара Аляксандра III і напісаў на яго імя дакладную запіску з прапановамі аб выкарыстанні багаццяў краю, аб паляпшэнні жыцця насельніцтва, нехта генерал Зіноўеў яму адказаў: «Таму, што на Поўначы пастаянныя льды і земляробства немагчыма і ніякія іншыя промыслы нямыслімыя, то, на думку маю і маіх сяброў, трэба народ выдаліць з Поўначы ва ўнутраныя вобласці дзяржавы, а вы клапоціцеся наадварот і тлумачыце пра нейкі Гальфштрым, якога на Поўначы быць не можа». Сапраўды, навошта яму быць: яго не можа быць таму, што быць не можа. Якраз як у чэхаўскага «вучонага суседа»! Колькі наіўнай паэзіі, праўдзівай няпраўды ў словах летапісу і колькі змрочнага, педантычнага невуцтва ў канцылярскіх выкрунтасах тупога салдафона, не кажучы ўжо аб сляпой пагардзе да лёсу насельніцтва цэлага краю, якое можна ні больш ні менш як узяць і «выдаліць».

Не дзіва пасля гэтага, што доляй Поўначы доўгія гады былі цемра і галеча. У 1867 годзе архангельскі віцэ-губернатар знайшоў у Коле аднаго толькі чыноўніка, які быў адначасова спраўнікам, гараднічым, суддзёй, казначэем. Праз больш чым сорак год тут нічога не змянілася. У 1913 годзе на ўвесь край быў адзін фельчар, які жыў у Аляксандраўску (цяперашні Палярны).

Сёння ў гэта цяжка паверыць. Калі ў Пулвозеры пачаўся тыфус, той жа адзіны на ўвесь край фельчар здолеў прыехаць туды толькі праз два месяцы, калі ўсе хворыя памерлі. Раней на Поўнач можна было дабрацца толькі за год. Сёння самалётам даляціш туды [redacted] Ленінграда за паўтары гадзіны. Але справа, вядома, не толькі ў гэтым. Справа ў тых новых людзях, што жывуць цяпер на Поўначы, у тым рытме жыцця, які аднолькавы сёння для ўсіх куткоў нашай краіны.

Поўнач, вядома, змянілася. Я мог бы напісаць пра новыя заводы, дарогі і гарады, але гэтым нікога не здзівіш. Да гэтага прывыклі. Пра гэта можна прачытаць у любым даведніку. Я стараўся пісаць толькі пра тое, што так ці інакш стала маім уласным вопытам, набыткам мае душы за тыя шэсцьдзесят сутак, што запомніліся як адзін доўгі, бясконца багаты ўражаннямі дзень.

Вось і прыйшла мне пара злучыць у адно

КАНЕЦ І ПАЧАТАК

...Зразумеў я, вяртаючыся думкай назад, на пачатак нарыса, чаму не адкрывалася мне восень, і падзівіўся з сябе: як было не здагадацца раней? А пасля ўжо само па сабе выснавалася: нішто не прыходзіць да чалавека раней прызначанага часу. Каб зразумець пачатак, трэба ведаць канец.

А напачатку была восень з апошнімі днямі спакойна-рашучай нейкай красы, і была ва ўсім незразумелая цярплівасць адзінокага лістка, што біўся на галінцы, не хочучы ці не могучы адарвацца і ўпасці. Удзень свяціла сонца, і пустое поле засцілала смуга, а ў лесе на прагалах было суха, свежа і пападаліся дзе-нідзе ля дарог на ўгрэвах баравікі — брыслятыя, жаўтлява-белыя пад нізам і нібы пакалупаныя нечым зверху: было ўжо ім нялёгка з-пад травы і шыгалля

расці. Раніцай на траве ляжаў рэдкі іней, зляталіся да ляснога дамка сарокі і сойкі, а бэзавы куст ля ганка стаяў ненатуральна голы, закіданы ўнізе цёмна-зялёным блішчастым лісцем. Прыгравала сонца, і з сосен цурком бегла вада, узнімалася, кучаравячыся, ад сукоў пара: спачатку ад сухіх, потым ад тых, дзе радзейшыя шаты, а потым ужо курыліся парай, зіхацелі на сонцы зялёныя купы лапак. Праз дзень на ганку ў вазоне для кветак узялася лёдам вада, і лёд не растаў да вечара, а яшчэ праз дзень за адну ноч агаліўся лес, і знаёмая елка стаяла абсыпаная ад макаўкі да зямлі асінавым лісцем, і не стала яблыкаў пад знаёмай лясоўкай: пазашываліся ў лісце. Туман як лёг з раніцы, так і трымаўся праз увесь дзень: у бары на ўзвышшы радзейшы, ля дарогі ў цяглавіне — густы і нізкі. Дзве ночы не было зор, сеялася імжака, пакуль вецер не разагнаў туман і не высыпалі вечарам зоры. Падшэрхла зямля, а раніцай было зноў сонца. Удзень наплылі хмары і пайшоў снег, каб растаць неўзабаве,— і зноў ішлі дажджы, і зноў падсыхала зямля, але не ападаў ужо вецер, золкі і пранізлівы. І калі так было дзень, другі, а потым настаў і трэці, спыніўся, падышоў к канцу мой нарыс. Тады агляну́ўся я назад і зразумеў, што прайшла восень, і зразумеў, чаму раней не адкрывалася яна мне: у мяне не было ключа да яе, і Поўнач дала яго мне, забраўшы маю думку і скіраваўшы яе ў адно. І зразумеў я, што прырода адкрываецца чалавеку не проста так, а тады, калі ідзе ён да яе са сваёй думкай і сваёй меркай.

1964

АПОВЕСЦІ

АДЗІН ЛАПАЦЬ, АДЗІН ЧУНЬ

ЗАМЕСТ УСТУПУ

Сон.
Сон.
Сон.
Ноччу, бязлюднай і цёмнай,
Іду па зямлі.
Вышэзны і лёгкі,
Пакалыхваюся ад тугі.
Галава прыгнута пад небам.
Я плачу.
Зоркі — слёзы мае.
Спяць гарады і вёскі,
Я над імі іду.
Высокі, пахілы і лёгкі,
Пакалыхваюся ад тугі.
Шукаю шэрую вёску,
Вёску сваю.
Баюся:
Вышэзны і лёгкі,
Не прысяду там на парог,
Як самалёт рэактыўны не сядзе
На травяністым аэрадроме...
Я плачу.
Зоркі — слёзы мае.

1

...раптам казытліва стала спіне: над стрэшкай пограба імглістa ўсхапіўся снежны ўзвей, калюча зацерусіў у вочы; потым разам аціхла — чуваць было, як з

шаргаценнем спаўзаў па сцяне і ападаў долу вецер. Снежны пыл на вейках і на шчоках раставаў, і рабілася цёпла.

На раскапаным ля пограба сумёце таксама была стрэшка, сутонліва-белая і лёгкая, як аблачынка ці птушынае пяро, і — мройлівая ў сваёй прыцемненай белі. Пазёмка сцішана шоргала па сумёце, празрыста-дымна распаўзаючыся за агародам у полі.

Ён увабраў галаву ў плечы, не зважаючы, што непрыемна-холадна дакранаўся да шчакі зледзянелы матузок ад аблавушкі, і — глядзеў...

Птушкі ляцелі на разлатую Піліпчыкаву лясоўку, пад вецер, і таму зніжаліся над пуняй, але не селі — зноў ляцелі ў поле, робячы круг: вераб'і пырхнулі тугой чародкай, пад імі, ніжэй, ішла сініца, і цяжка, нібы бамбавоз, імкнула следам, ціўкаючы і адстаючы, здурнелая аўсянка.

Ён тады пашкадаваў, што ў яго парвалася рагатка.

Дастаў яе праз дзіравую кішэню з-за падкладкі світы і разглядваў, торгаў за канцы парваную стволку, парваную другі ўжо раз: той, першы раз ён надтачыў адзін яе канец не надта пругкім, затое тоўстым пасакам, у брыжыках, бо выразаны пасак быў з проціваґаза якраз паўз круглае шкельца. Надтачыў, пераццяўшы канцы тонкай меднай драцінкай, а не суровай ніткай, як трэба было зрабіць, і вось драцінка, урэзаўшыся ў гуму, пераела яе. Але навошта цяпер шкадаваць пра гэта: усё адно ў яго ніякіх «боепрыпасаў» для рагаткі няма. Летам назбіраеш колькі хочаш каменьчыкаў, а цяпер хіба што цэглы наб'еш, ды толькі лёгкая яна, пусціш з рагаткі — ажно фурчыць.

У яго азалелі рукі, і ён пачаў хукаць на іх, не хаваючы ў кішэню рагатку,— гума пахла востра, набрынялая пякучым холадам, і зусім па-іншаму, прыглушана-сіратлівым нейкім водарам патыхала ад скураной, пацёртай латкі —«мяшэчка», у якім заціскаў, страляючы, пальцамі каменьчык, а тронак самой рагулькі, выгладжаны даланёй, быў, здавалася, і зусім цёплы, казытаў нос тонкім, нават трохі саладкаватым, такім зразумелым, добрым пахам, што чамусьці ад гэтага балюча сціскалася сэрца.

Над вёскай, у полі была імглістая, зажураная смуга, быў прыхаваны смутак, няўлоўны нейкі і незразумелы, як настрой то сцішанага — і тады светлага,—

то шумліва-порсткага, роспачна-вясёлага, нават аж зіхоткага ўваччу і ўсё адно цёмнага ветру. Гэта нельга было выказаць словамі: ён, стоячы пад пограбам, бачыў сябе жаўтлява-светлай саломінкай, вытыркнутай са страхі, — яна трымцела, грала, смуткавала і гарэзіла разам з ветрам; вецер шкуматаў яе, але ўсё адно любіў, і яна любіла яго, і баялася, і не баялася ягонай моцы.

Птушкі зноў ляцелі на Пілпчыкаву лясоўку, зноў, зніжаючыся, рабілі круг: вераб'і лапатліва пырхнулі на дрэва ледзь не ад самай зямлі, толькі аўсянка адстала, цяжка паляцела пад страху Піліпчыкавай пуні. Сініцы з імі ўжо не было.

Ён схаваў у кішэню рагатку, адчуў, што ў яго расслабілася пад шапкай, ссунулася на патыліцу хустка: тужэй завязаў яе пад барадой, глыбей насунуў на галаву шапку. Рукі ён схаваў у рукавы світы: ужо даўнавата стаяў на двары і яму рабілася холадна. Халадна, можа, было яму яшчэ і таму, што з яго нядаўна здзекаваліся, дражніліся з ім на гульбішчы ў Аўдулінай хаце старэйшыя хлопцы, а больш за ўсіх Аўдулін Паўлік. І Іванка плакаў.

Яму яшчэ і цяпер было гаркава і суха ў горле, і калі ён на ўсе грудзі дыхаў, нешта аж хрыпела там і ўсярэдзіне рабілася непрыемна-саладка, нудліва. Адчуваў ён таксама, што нечым цяжкім, мулкім набрынялі ў яго павекі, што пад вачамі ўвесь час была нейкая не такая, як на ўсім твары, нейкая застылая сцюдзёнасць, і яшчэ адчуваў ён, што ў яго напялася на шчоках, як бы патанчэла скура і прыпухлі вусны.

І яго пачыналі ўжо біць дрыжыкі.

2

Ягоным горам, ягонай пакутай і слязьмі быў крывароты Аўдулін Паўлік, ці, па вясковай мянушцы, Цяўлік, якому капсулем ад гранаты парвала летась шчаку, якога баяліся не толькі малыя, але і аднагодкі-хлопцы, бо Цяўлік надта любіў разяўляцца на ўсіх, пастыляўся нават ■ дарослымі, лез на кожнага, як жаба на корч. Быў ён нізкарослы, з высокай грудзінай і нейкі аж зялёны ў твары, якраз бы ягоная маці, і гэтак жа, не выпускаючы з рота, смактаў цыгарку, як яна, і гэтак жа кашляў. Маці ягоную ў вёсцы інакш

не называлі, як салдатам, бо і хадзіла, і гаварыла яна па-мужчынску, і па-мужчынску ўпраўлялася з касой і сякерай: узяла і паставіла сама, пасля таго як спалілі немцы, новую хату.

Цяўлік яшчэ да вайны хадзіў у чацвёрты клас і зноў пайшоў у чацвёрты, калі пазалетась адкрылася школа. У пяты яго летась не перавялі, пакінулі на другі год — і, можа, таму гэты Цяўлік быў цяпер заўсёды такі злосны, і, можа, таму не рос. Дзе ты ўжо вырасцеш там, калі злосці поўныя косці. Гэта дзед так аднойчы пра яго сказаў.

І навошта было сёння ісці да гэтага Цяўліка? Ён бы і не пайшоў, можа, каб хоць які занятак прымеў сабе на вуліцы, каб хоць хто з таварышаў паказаўся на вочы яму, а то сядзелі, мусіць, сабе ціха па хатах ды грэліся на печы. Ды і што ім было рабіць на той вуліцы: за мінулую ноч столькі ўсюды панасыпала снегу, што і кроку ў бок ад дарогі нельга ступіць, не тое што праехаць, начапіўшы канёк на нагу, з канца ў канец усю вёску. Хлопцам добра, ім можна і на печы пасядзець, яны і так на вуліцы кожны дзень, а яму гэтая печ апрыкрала ўжо горш за ўсё: сядзі ды сядзі, бо стапталіся лапці, а новых няма. Каб была ў дзеда пянька, даўно б яму чуні ўжо сплёў. Ён і плесці быў пачаў, ды аборак толькі на адзін чунь хапіла. Дзед сказаў пацярпець, бо прыдумае што-небудзь, не можа быць, каб нельга было што-небудзь прыдумаць. Дзед нават засмяяўся і весела так сказаў: «Адзін лапаць, другі — чунь, хоць ты дома не начуй» — і нават нагой прытупнуў, нібы ў скокі пусціцца хацеў, але потым адразу пачаў нечага сварыцца на маці і спахмурнеў. А нядаўна прыходзіў бацькаў дзед (ён жыве на другім канцы вёскі), даведаўся, што ў Іванкі аднаго чуня няма, і ўсё божкаў ды божкаў, стоячы ў парозе. А матчын дзед, і бабуля, і сама маці ўпрошвалі яго хоць трохі пасядзець ля стала на лаве, але ён адгаворваўся: не было яму часу, казаў,— гэта ён заўсёды так, заўсёды яму часу няма. Яму толькі ў Ганны, дачкі сваёй, ёсць час сядзець. І Трахіміха яго адтуль не вылазіць, усё па загароддзю, па сцежцы прыцемкамі ходзіць туды, усё нешта ў кашолцы носіць. Маці кажа, што яны да вайны ў гэтага дзеда жылі, а як пайшоў бацька на вайну, перабраліся да дзеда Міхалкі. І ён, Іванка, ужо тады нібыта быў, калі ў таго дзеда жылі, толькі нічога

во не помніць. Маці кажа, што яны ніколі ўжо не пойдуць да дзеда Трахіма жыць, бо забілі на вайне бацьку,— каму яны трэба цяпер там. Трахімісе і тады, пры бацьку, не ўладзіць было, а цяпер яна ім і зусім чужая. Яна і дзеда Трахіма падбівае супраць іх. Як пенсію далі за бацьку, дык пасылала дзеда судзіцца, каб палавіну пенсіі сабе забраў. Дзед і паслухаўся б, можа, каб Ганна іхняя не заступілася за маці. Трахіміха баіцца цёткі Ганны.

Дзед Трахім усё стаяў у парозе, божкаў. Угакаў усё. «Столькі снегу наваліла — уга! Гэта ж вялікдзень будзе позні, да самай радаўніцы снег будзе ляжаць. У Ганны вунь гурбу ўровень з хатай намяло — уга!— пяклуецца, бедная, рады не можа даць. А ў хаце халадзіна хоць ты ваўкоў ганяй. Выпшыкаецца з печы дух за дзень, і нанач паленне сырое на под пакідае — дык дзе ж ты бачыў, каб падсохла, нават не правяне ніззвання... А ў вас во цёпла, бачу,— уга! Сват во, чаму ж не, аблету назапасіў з восені... Яно ж каб і ў самога сіла была... Халера на яе, якая ўжо тут сіла... Каб жа маладзейшы быў — уга!»

А дзед Міхалка на тое казаў, што і ў яго ўжо сілы няма. Скажа і змоўкне. А дзед Трахім усё гаворыць. Дзед Міхалка проста так на нядужасць жаліўся, каб не маўчаць. Не любіць дзед жаліцца, не тое што дзед Трахім, якому заўсёды здаецца, што ва ўсіх усё лепш, чым у яго. Маці кажа, што ён знарок нагаворвае так на сябе, благога вока ды чужой зайздрасці баіцца. Дзед, кажа маці, лепей як хто ў вёсцы жыве.

Калі адыходзіў, дзед паклікаў яго, Іванку, да сябе. «Дык ідзі ж сюды, ідзі, суччын кот. Чаго ты баішся? Ты ж вунь увелькі з дзеда вырас — уга!» І гладзіў Іванку па галаве. А потым пачаў шкадаваць, што гасцінца не ўзяў. «Гэта ж так яно выйшла, што выпадкам зайшоў. Гэта ж не збіраўся зусім. Ганна прасіла, каб прыйшоў авечку паглядзець: не есць авечка ні ў знак, зарэзаць давядзецца, а-ёй! Цяпер авечак адно гора дзяржаць. Каб не аўчынка, дык ці яе дзяржаў бы — уга! Сышла на нецькі авечка ўся. Нудзіцца, божачка мой, як чалавек. І ўсё мэкае, а есці — не есць. Каб жа знаццё, дык бы з восені прыгнёў. А цяпер што з яе? Ну, аўчынка, аўчынка будзе, як тэй казаў, а больш што — уга!»

Дзед, мусіць, ужо забыўся пра той свой гасцінец.

«Дык ты нас з бабай адведай калі. Надумайся і прыбяжы». Але ён, Іванка, не такі дурны, каб абяцаць. Быццам дзед не ведае, што ў яго няма чаго на ногі абуць, быццам не гаварылі пры ім пра гэты самы чунь. І таму ён маўчаў, нішкам адхінаючы ад дзедавай рукі галаву, і тут пачала ўжо гаварыць маці. «Дык далёка ж, тата, да вас,— сказала яна,— ды і ён во цэлымі днямі ў хаце сядзіць. Няхай сядзіць, няма чаго тарнавацца на вуліцы. Стаптаў во ўсё — няхай і сядзіць. Яму хоць вечнае дай, усё пратрэ ды падзярэ, на ім яно — як гарыць. Вазьму во яшчэ ды і закіну куды гэты чунь!» Гэта яна знарок так гаварыла, Іванка ведаў,— не хацела, каб яго хто шкадаваў. «Ну навошта ты так на дзіцёнка,— пачаў бараніць Іванку дзед.— Ці не ёсць гэта ў мяне — дай бог памяць, каб не салгаць,— ці не закінулася дзе ў мяне трохі пянькоВага вярхоўя? Трэба будзе пашукаць. Я канапель, халера на іх, той год мала сеяў, з імі ж важдацца — не дай бог. Старая мяне і за тэя, што пасеяў, закляла, затукала — уга! Ты ўжо мне, сват Міхалка, мерку дай з чуня зняць, а я пагляджу...»

Так вось і падмеўся дзед Трахім сплесці гэты самы другі чунь. Чакай цяпер, калі прынясе.

Ён, Іванка, чакаў-чакаў, ды і чакаць перастаў. Успомніў, што бачыў летам на гарышчы нейкія старыя бацькавы чаравікі, паўсыханыя і пакарабачаныя, аж не разагнуць, з вышмараванымі пабялелымі перадамі, разяўленымі, як шчупакова пашча. Летам тыя чаравікі не трэба былі, а цяпер во добра, што ўспомніў пра іх: дастаў з гарышча, абгарнуў нанач мокрай анучай — яны і памякчэлі, аджылі. Адно нядобра — пачалі адвальвацца ў іх падэшвы. Але ён і на гэта ратунак скора знайшоў: дзе драцінкай падшыў, дзе вяровачкай падвязаў — выбраўся сёння на вуліцу. І заўтра пойдзе, і паслязаўтра: дзед той чунь свой, калі хоча, можа не несці — абыдзецца і так як-небудзь. І маці не будзе асабліва глядзець, парваў ты гэтыя чаравікі ці не парваў,— не яна ж справіла, сам прыдбаў.

І ўсё было сёння так добра ў яго, пакуль гад гэты, Цяўлік, на ім сілу сваю ды злосць паказваць не пачаў, не пачаў насміхацца з яго ды здзекавацца. Гад гэты крывароты! Ён думае, што калі ў карты ўмее гуляць, дык ужо і вялікая цаца. А ён, Іванка, у карты не хоча гуляць, бо дзед сказаў, што дзецям гуляць у карты

няможна, і дарослым, сказаў, ад картаў ніякай карысці няма. А дзеда ён слухае, бо дзед самы разумны ў вёсцы: ён яшчэ пры панах, казала маці, як малады быў, дзяцей па хатах вучыў, і яму за гэта муку і бульбу давалі. Дык хіба за тое, што ён, Іванка, у карты гуляць не хоча, яго трэба біць? Ды яшчэ страшыць, што як дзед памрэ, дык і зусім яго, Іванку, са свету зжыве: надта разумнымі хочуць яны быць з дзедам. Страшыў, што дакажа на дзеда за тое, што ён у вайну школьную дошку, на якой крэйдаю пішуць, дамоў узяў, каб вучыць Іванку грамаце. І чаго яму грамата гэта спакою не дае? Злуецца, што ён, Іванка, хоць у школу яшчэ толькі налета пойдзе, а ўмее ўжо чытаць, і пісаць, і рашае ўжо задачы. Цяўлік крычыць, што ён граматных гэтых, вучоных гэтых, каб яго права было, на край бы свету сагнаў: ведае, якія яны,— такія, як іхні былы настаўнік, што ў паліцаях служыў. Расстралялі, гада печанага, партызаны, ён і сам яго, каб далі, з паганай вінтоўкі забіў бы. А што яго не пераводзяць у пяты клас, дык такой бяды,— ён і сам, можа, не хоча: знайшлі дурня ў тым класе нямецкую мову вучыць. Няхай яму лепш язык адсохне, калі ён будзе вучыць яе, гергетаць, як фрыцы паганыя тыя. Яны бацьку забілі і хату спалілі, а ён будзе па-іхняму гергетаць! Кіне вясною школу і ў калгас конюхам пойдзе рабіць.

Хо, знайшоў чым страшыць! Няхай ідзе ў гэтыя свае конюхі, можа, там галаву сабе скруціць хутчэй. Ён, Іванка, па ім плакаць не будзе. Было б чаго!

3

Птушак на Філіпчыкавай лясоўцы ўжо не было: ён не бачыў, куды яны паляцелі і калі. У полі, то набіраючы моцы, то ападаючы, лапатаў і шастаў вецер, неба было сівое, ні хмар на ім, ні прагалін — адна суцэльная, скупа прасветленая смуга. За полем азначаўся шэрай вузкай палоскаю лес — ён быў у нізіне. Калі вецер спадаў, здавалася, што там, у лесе, рабілася ціха і аж да вусцішнасці глуха. Там, здавалася, было нейкае сваё, непадуладнае ветру жыццё.

І сама па сабе была, гібеючы на холадзе, цягнучыся ўгору кашчавымі доўгімі сукамі, высокая, усохлая на адзін ствол Піліпчыкава лясоўка. Нейкая панурая зацятасць адзіноты выдавала ў ёй, нейкае цярплівае і

звыклае трыванне перад усім — перад ветрам, перад небам, якое было святлейшым і вышэйшым там, дзе свіціліся вымкнутыя ўгору і застылыя ў тугой нерухомасці голыя шаты, і нават ветру не ставала сілы растрывожыць пануры іх спакой, і ён злосліва шумеў і шоргаўся ўнізе, у трывожлівай цёмнай купе вішань і сліў.

Вецер, вецер, вецер... Было холадна. Але ў хату ўсё адно не хацелася ісці. Ён баяўся патрапіць на вочы дзеду: той бы адразу здагадаўся, што ён пакрыўджаны нечым, здагадаўся б, што плакаў, і пачаў бы распытваць, і ён, Іванка, мусіў бы прызнацца ва ўсім, але яму не хацелася гэтага, не хацелася жаліцца дзеду, хоць і не здолеў бы растлумачыць чаму. Можа, нават таму, што ён ужо неяк падсвядома адчуваў: дзед спатрэбіцца яму яшчэ некалі, у больш важных выпадках, і пакідаў гэтую магчымасць на пасля, думаў пра дзеда, як пра самае надзейнае сваё апірышча і як пра абаронцу.

Маці ён таксама бачыць не хацеў. Можна было б паціху прашмыгнуць на печ і стаіцца там, думаючы сваё. Але ён ведаў: гэта і будзе самае падазронае для яе, яна адразу здагадаецца, што нешта з ім не так, што недзе ён ці не правініўся ў чым, і пачне наперад, агулам, наракаць на яго і гразіцца не пускаць больш з хаты, а потым ужо неяк незаўважна пачне шкадаваць сябе і клясці сваю долю. І гэта будзе горш за ўсё.

І ён баяўся гэтага.

Ён падумаў, што лепш за ўсё яму пакуль схавацца ў пограбе.

Як гэта ён не падумаў адразу! Так ціхшна, цёпла было тут, у цемені,— колькі ні ўзірайся, колькі ні напружвай зрок, усё адно нічога не ўбачыш. Але ён ведае і так, дзе тут высыпае кожнай раніцы маці на жалязку вуголле: там і прысесці на кукішкі можна, і рукі над вуголлем пагрэць. І ён ступіў асцярожна да сцяны, прыгнуўшыся, выставіўшы наперад рукі, і адчуў тварам, рукамі, як на яго шчыкотна-ласкава павеяў цёплы дух, як востра запахла попелам і адначасна халаднавата-сырой зямлёй, пракуранымі сухімі сценамі. Ён прывыкаў да ўсяго гэтага, асцярожна ладкуючыся ля жалязкі з вуголлем, якое яшчэ недзе тлела, мусіць, бо інакш адкуль бы ішоў гэты рэдкаваты струменісты дух. Было глуха і цёмна, але пахі былі ўзнагародай за ўсё. Пахла бульба ў засеку, капуста ў бочцы, пахлі буракі, сваім пахам і яшчэ нейкім другім — падсохлай на

іх зямлёй. І яму здавалася нават, што ён чуе, як пахне пад столлю павуцінне.

Яму адусюль мроіліся пахі, і спачатку было прыемна распазнаваць іх, было прыемна ад няўтольнай, прагнай, аж да пранізлівасці, яснаты ў галаве, ад ненатужнай лёгкасці ва ўсім целе. Але неўпрыкмет гэта перайшло ў нейкую другую, нудлівую і ўладную прагу — хацелася есці.

Цяпер яму пахла ўжо чутней за ўсё паранай бульбай, той, што засталася ад раніцы і стаяла ў печы за засланкай у чыгунку,— падсохлая бульба, з падсмяглай аж да чырвані скуркай, такая духмяная, калі расціснуць яе, і цёплая. Пахла яму і каржом, таксама падсохлым, у жаўтлявых іскрынках прасяных шароек зверху і з прыліплым спадыспаду попелам,— ах, які гэта смак, калі адламаць сабе адно з тых «акенцаў», на якія дзеляць корж перад тым як саджаюць яго на лапаце ў печ!

Ён запусціў руку ў падраную кішэню світы і шчопцем грэбаў там за падкладкай, спадзеючыся хоць штокольвек знайсці на падман голаду: хоць крошку каржа ці хлеба, хоць пшанічнае ці жытняе зернетка. І хлебную крошку ён знайшоў, сухую і гаркавую, як паспытаў на зуб, і аж дзве пшанічыны на астачу: расcмакаваўся і захацелася больш. Сама была пара прыдумаць нешта яшчэ, і на памяць паслухмяна ўсплыло гарышча з гронкамі мерзлай рабіны, падвешанай да шастка, у падсуседдзе да венікаў, з матчынымі журавінамі, насыпанымі на стары задубелы жакецік, і як успомніў пра гэта, не схацелася ўжо сядзець у пограбе. З асцярогаю прачыніў дзверы: ці не бачыць хто?— і скоранька выкаціўся на двор, а потым ужо знарок паволі, нібы забаўляючыся, ляскаў доўгім ключом у дзірцы, пракручанай у вушаку,— замыкаў дзверы на засаўку. Аставалася самае страшнае, нікім не ўбачаным, зайсці ў сенцы і па драбіне ціха, каб не нарабіць грукату, залезці на вышкі.

Усё абышлося добра, здаецца, і гэты раз. Цяпер ужо такой турботы: дапаўзці да шастка за комінам; ён гэта зробіць так, што ніхто не ўчуе ў хаце, што ніводная пясчынка не прасыплецца праз столь.

Вось і дапоўз, вось і можна перадыхнуць — ура! Яму нават смешна стала, што нечакана падумаў, як дзед Трахім. «Во брахун, во лёгенькі Савачка: падмеў-

ся чунь сплесці, а не нясе». Так сказала пра дзеда маці. І гэта таксама смешна было. Іванку замроіўся, замільгаўся перад вачамі, не то дзед Трахім, не то матчын лёгенькі Савачка: захаканы, з белай бародкай, у белых споднікаx, шыбуе подбегам, аж ногі зыбаюцца ў каленях, і нечага ўсё азіраецца. Можа, сабакі гоняцца за ім? «Во, халера на іх! Уга!» Сапраўды было смешна.

Ён спахапіўся на думцы, што яму пацяплела. Бач ты, адагрэўся, мусіць-такі, у пограбе, ды і тут зацішна, а ля коміна дык і цёпла зусім: добра цяпер, зімою, паляць у печы. Ён набраў сабе ў жменю журавін, адшчыкнуў рабінавую гронку: сядзеў, прыхінуўшыся плячамі да коміна, і паволі, жмурачыся, спрабаваў на зуб, качаў у роце гаркава-кіслыя, сцюдзёныя ягады. Скора яму надакучыла гэта, ды і ў горле перасела і нешта ўжо балюча казытала там. Ён назнарок сцішыўся: можа, пачуе, што робіцца ў хаце. Аднастайна гуло ў коміне, торкаўся знадворку ў шчыток вецер, а там, у хаце, было ціха, як бы павымерла ўсё, і ён быў забыўся чакаць і слухаць, як у хаце раптам бразнула клямка — зачыніліся дзверы, зарыпела прамерзлая падлога ў сенцах і нехта выйшаў на двор. Ён здагадаўся: дзед. Ну і няхай сабе, ён не баяўся дзеда. Снег рыпеў ужо на двары, было чуваць, як дзед біў нагой па мерзлай ражцы, у якой запарвалі карове сечку з мякінай: абсыпалася ў ражку і звонка шастала наледзь, з віскам аддзіралася дзішча ад зляжалага пад ёй, намерзлага снегу. Іванку не трэба было глядзець, што рабіў дзед, яму пра ўсё расказвалі гукі. Рыпелі вароты ў пуні, дзед нешта гаварыў да каровы, вішчаў і рохкаў парсюк, зноў рыпелі вароты, потым чуваць было, як дзед пералазіў цераз агароджу да гуменца з токам — прыбудоўкі да пуні. Во зноў рыпяць вароты, во нешта стала не чуваць ужо дзеда, а потым — шах! шах! шах! — дзед гатаваў карове сечку.

Гуло і гуло ў коміне, ціха было і, здавалася, сонна ў хаце. Што там робіць цяпер матка? Бабуля, мусіць, спіць на печы, спіць і не ведае, што ён тут, на вышках, што цяпло ад печы грэе і яго. На Іванку находзіла млявасць, цяжэлі павекі. Ён сядзеў, падкурчыўшы пад сябе ногі, глыбока схаваўшы рукі ў рукавы світкі. Ногі добра грэліся пад ім, і ён адчуў, што левая нага як бы пабольшала, стала як бы не свая. Мусіць, замлела. Але

Іванку не хацелася нават паварушыцца. Сон находзіў на яго.

У сне быў зімовы дзень, зыркае сонца і белая вуліца, уся ў раскапаных гурбах, і ён, Іванка, бег гэтай вуліцай, і ногі так лёгка неслі яго, можа, таму, што на іх былі новыя, падшытыя гумай чуні. Дзед Міхалка яшчэ нічога не ведае пра чуні: паехаў ■ раніцы ў лес па дровы, і цяпер Іванка бяжыць, каб сустрэць яго... Вось ужо канчаецца вёска, вось і поле. А вунь, на дарозе, і конік матляе галавой, а ўзбоч коніка ідзе дзед. «Дзед, дзедка! — закрычаў Іванка.— Я табе скажу нештачка!» Але што гэта? Толькі што быў навокал снег, былі гурбы высокія, а тут раптам дзед на калёсах едзе. «Дзедка, чаму так, дзедка? — хоча запытацца Іванка.— Чаму ты на калёсах?» Але дзед далёка яшчэ, не пачуе. Азірнуўся на вёску і ўбачыў: грае, пераліваецца ў небе сонца, пара дымнымі слупамі стаіць над стрэхамі хат, а ўнізе, над зямлёю, снуецца імглiста-зыркі туман, і ў тым тумане молада, чыста, аж у адказ шчыруе, абміраючы ў шчымлівай знямозе, душа, крычаць і перагукваюцца пеўні. І так хораша ад усяго гэтага Іванку і чамусьці балюча. Глянуў ён пад ногі сабе: на дарозе снегу нізвання, нібы абструганы кімсьці, ляжыць ссівелы пясок, усцяж пазначаны, куды ні глянь, пакручастым шнуроўем ад пазганяных у адно месца, няйначай як ручаямі, трэсачак, чорных карэньчыкаў, шэрых сцяблін. «Калі гэта было,— думае Іванка,— чаму я не бачыў?» Дзе-нідзе на дарозе выгнала ўжо кволае пер'е трава, расла астраўкамі-кучомкамі, а як глянуць наўзбоч, бралася трава між дарогай і полем роўнай зялёнаю шчоткай, ільснілася, глушыла, забівала маладую жаўтлявасць, што свіцілася знізу, ад зямлі. Шкада раптам стала нечага Іванку, і зноў ён глянуў пад ногі сабе. Чуні! Навошта яму цяпер чуні, што ён будзе з імі рабіць? Ён жа так чакаў іх, так хацеў пахваліцца імі дзеду! Крыўда сціснула Іванкава сэрца, і ён заплакаў. Паглушэла тады наўкол, і стала страшна. Вусцішнасць запанавала наўкол, схавалася некуды сонца. Шах! Шах! Шах! — пачулася адусюль, нібы нехта вялікі ішоў па саломе ці сене. Іванка сцяўся і заплюшчыў вочы. А той вялікі ўсё ішоў і ішоў. Іванка чуў яго і чакаў, як чуюць і чакаюць вецер, калі ягоным дыханнем, ягоным прадчуваннем пачынае жыць наваколле. Вось той, вялікі, быў ужо за спіной, вось ён паволі, ні-

бы знарок паволі, распасціраў рукі, прыпыніўшыся на хвіліну і стаіўшы дыханне... Іванка закрычаў. І зноў тады стала ціха. Іванка расплюшчыў вочы. Дробненькі-дробненькі дожджычак сеяўся над полем, стаяла чуйная, прывідная ў сваёй сцішанасці імгла. Час нібы на момант спыніўся і цяпер паволі, як бы нехаця, зноў пачынаў свой бег. Пахла сырою зямлёю, самотна гудзеў недзе жук. Проста на Іванку з пакрытай нечым, падобным да фартуха, галавою ішоў чалавек. Быў ён зусім не страшны і не вялікі, увелькі, як дзед. Ішоў ён сумны і ціхі, і Іванку стала шкада яго. Ужо зусім без страху чакаў Іванка, калі чалавек падыдзе да яго. Ён і падышоў, стаў і, як бы ў роздуме, з нейкай абыякавай марудлівасцю зняў з галавы фартух, і рукі яго бяссільна павіслі ўздоўж цела, і фартух выпаў з іх. «Не трэба,— сказаў чалавек нeяк незадаволена і ў той жа час спакойна,— не падымай»,— нібы быў упэўнены, што Іванка абавязкова кінецца падымаць той фартух.

У чалавека на галаве была кубанка, такая, як у аднаго партызана, што ў часе вайны неяк пад раніцу пастукаўся ў дзедаву хату, папрасіў малака, а як адыходзіў, пакінуў лістоўкі і тоўсценькую, але не шырокую, можа, з далонь, кніжачку. І дзед, і маці пасля чыталі яе, называлася тая кніжачка «Солнцеворот». Іванка добра гэта запомніў.

Чалавек і шапку, як фартух, з галавы зняў: настабурыліся доўгія, аж у дзве рэдзі, валасы, бо зачасаны былі ўгору, а потым яшчэ загнуты ад патыліцы напэрад. Ну якраз як у таго ўпаўнаважанага з раёна, што летась кватараваў колькі дзён у іхняй хаце. Вясёлы быў чалавек, чорны, белазубы, у вайсковай форме, капітан, і прозвішча ў яго было смешнае — Маламуж. Украінец, казаў дзед. Прынёс аднойчы белай мукі і прасіў маці, каб зварыла яму лапшы, і маці зварыла. Доўгавалосы ўвішна сёрбаў, задзіраючы галаву ўгору, сваю лапшу і ўсё смяяўся: «Лапша — вочы ў столь!»

Хто ж ён такі, гэты цяперашні чалавек?

«Ты пазнаеш мяне?» — спытаў чалавек у Іванкі, трымаючы шапку ў руцэ і трохі павярнуўшы ўбок галаву, як бы прыслухоўваўся да нечага. «Дзядзечка, я не ведаю вас»,— ледзь не заплакаў Іванка. «Не трэба мне гаварыць — дзядзечка,— сказаў чалавек.— Я — гэта ты, Іванка. Толькі я дарослы, а ты малы. Багаты я, мусіць, буду, калі ты не пазнаў мяне». Дзіўна ўсё

гэта было чуць Іванку, і ён не ведаў, што адказаць. «Во, глядзі,— сказаў чалавек,— пазнаеш? — і выцягнуў з кішэні самаробны наган, той, што нядаўна адабраў у Іванкі дзед.— Бачыш, твой наган, праўда? Толькі што ж гэта ты так няўдала зрабіў яго? Ствол з дзядоўніку. Ды яшчэ аўтаматны патрон загнаў. Стрэліш — разнясе... Напомні мне заўтра, я табе з жалезнай трубкі ствол зраблю...» — «Ты будзеш і заўтра?» — спытаў Іванка. «Я буду цяпер заўсёды з табой».— «А чаму раней не сказаў мне, дзе наган дзед хаваў?» — «Дык мяне ж не было тут,— як бы здзівіўся чалавек.— Я на вайне быў, я ваяваў. Бацьку забілі, дык я помсціў за яго. Я многа фрыцаў пабіў. Потым мяне як шандарахнула ў левую нагу! Яшчэ і цяпер баліць. Ну, скажы, праўда баліць?» Дзіўна, чаму ён так пытае ў Іванкі. Але і праўда: прыслухаўся Іванка — левая нага і яму баліць. Што за праява? І толькі цяпер заўважыў Іванка, што правая нага ў дзіўнага гэтага чалавека абута ў бацінак, а левая босая, тоўстая ў ступні, як набрынялая ўся. «Гэта я бацінак скінуў, каб ямчэй ісці,— сказаў чалавек.— Мне далёка было ісці. Я ў шпіталі ляжаў. Я зарок сабе яшчэ перад тым даў: калі жывы астануся, дамоў пехатой пайду... Скажы мне,— страпянуўся ён раптам,— у каго б я мог урэзак здабыць?» — І пранікліва глянуў на Іванку, утаропіўся позіркам і маўчаў, і нейкі сум быў у ягоных вачах і як бы шкадаванне, што Іванка, можа, не ведае, у каго і дзе той урэзак. «Дык жа, дык жа ў Валодзькі цётчынага,— ледзь варочае языком Іванка,— урэзак быў... Цётка казала, што закінула яго некуды, ды ты ёй не вер. Закапала дзе-небудзь, каб не знайшлі. Валодзька ў хаце з цэлага патрона стрэліў, цётку напужаў. Я ведаю, я ў іх быў. Аж шыбіна дзынкнула, мне вушы залажыла, яй-бо. А цётка як збялее ўся ды як закрычыць. Кінулася да Валодзькі, думала, што і нежывы ўжо. А ён, як дурны, стаіць, урэзак з рук не выпускае...» — «Ну добра, хопіць,— рашуча сказаў чалавек,— вядзі мяне да Валодзькі».— «Дык што ж гэта? Дык што... цяпер? — нібы збаяўся нечага Іванка.— А ты сабе... лепш вінтоўку знайдзі. Вінтоўка... лепш, я ведаю. Вінтоўка...» — «Ты баішся? Баішся? — Чалавек узяў яго за руку.— Дык адразу скажы. Мне не трэба вінтоўка, мне трэба паганае ружжо, урэзак. Я пайду Цяўліка забіваць. Ты паможаш мне? Ты толькі не бойся, хадзем. Я там, ля

лесу, ужо і яму выкапаў. Чуеш, як пахне зямля?» Ён павярнуўся і стаў тварам да лесу і нечага нават рукі падняў, як бы запрашаючы слухаць. І тады Іванка пачуў... Верашчаў, крычаў, екатаў, прасіўся недзе Цяўлік. «Ой, мамачка!» — крычаў. Вецер аднекуль нахапіўся і далёка разносіў той плач. «Не хачу! Не хачу! — закрычаў тады Іванка.— Не чапайце яго, не трэба яго чапаць! Ён дурны яшчэ, нічога не разумее. Яго ў пяты клас не перавялі, і таму ён злы». Чалавек тады раптам павярнуўся да Іванкі і зарагатаў. Яшчэ больш ўзняўся вецер, холадам і страхам працінаў Іванку, аж сэрца як не выскоквала з грудзей. А Цяўлік усё плакаў недзе, і вецер насіў па полі, шкуматаў яго плач...

Іванка прачнуўся.

Ён не адразу ўцяміў, што тое страшнае, што адбылося з ім, быў усяго толькі сон. Цела ягонае ныла. Было сцюдзёна ў спіну і ў шыю. Калі ён паспрабаваў павярнуць галаву, нешта аж хруснула ў патыліцы, і потым стала горача ўваччу. Левая нага пад ім здранцвела, было страшна нават падумаць, каб устаць.

На вышках увачавідкі пашарэла. Вецер гуў у коміне, не сціхаў. Іванка прыслухаўся. З гуменца ўсё яшчэ чулася: шах! шах! шах! Колькі ж ён спаў?

4

— Дзед,— сказаў Іванка,— ну аддай мне наган. Ты чуеш, дзедка, га?

У гуменца [redacted] двара залятаді сняжынкі. Было тут зацішна, але холадна: сцюдзёнасцю тхала ад настылага току, скразнякі гулялі пад страхой. Але дзед такі добра ўпарыўся. Выцертая аблавушка [redacted] завязанымі наверсе матузамі з'ехала яму на патыліцу: у дзеда ўзмакрэла і аж пабялела лысіна. Ля дзеда расла, абступаючы яго з усіх бакоў, ладнаватая ўжо куча сечкі. Дзед стаяў на каленях, пад ім паслана была на ток салома.

— Дзед,— сказаў Іванка.— Ну, дзедка... Чаму ты маўчыш?

— Глядзі-тка, узмакрэў я саўсім,— сказаў дзед, глыбока ўздыхнуўшы і апусціўшы рукі. Глядзеў нечага наўкол сябе, хакаў усё ды пакрэктваў: — Спярша, слухай сюды, як стаў на калені, ток, што той бубен, быў, аж гудзеў. Як ад жалязякі якой халернай, ад яго

стынню нясло. А цяпер во, нібы ў лазні пабыў... Узяў бы ты ды дзеду памог...

Несур'ёзна, канечне, кажа ўсё гэта дзед. Во і сам усміхаецца на тое. Дзед хітруе, проста не хоча яму, Іванку, нічога пра наган казаць.

— Ва ўсіх дык і тое, і тое ёсць. Толькі ў мяне нічога няма. Адна рагатка, можа,— ды і тая парвалася. Ну, хочаш, дзед, паглядзі... У цябе, дзед, нават дратвы няма, каб звязаць парваную стволку.

— Ну, гэта ты ўжо шэльму строіш, унучак. Ой, шэльму! У бабы суровую нітку папрасі. Хіба не дасць? А што дратва? Вунь смалы вазьмі, нітку насмыч — будзе табе дратва... Ай, шэльма ты, шэльма,— і дзедківаў галавой, усміхаўся.

— А чуні ў мяне ёсць? Скажы, дзед, ёсць? Ну, скажы!

— Будуць табе і чуні, ты толькі пачакай. Пацярпі. Бог, унучак, цярпеў і нам цярпець вялеў. Вось паглядзіш: убачу я дзеда Трахіма і спытаю ў яго... Ну, можа, не спытаю зразу, а так скажу: «Добрага здароўечка табе, сват. Як жывеш? Унучак наш перадае табе паклон». А дзед Трахім спытае: «А як ён там, унучак мой?» — «Грэх пра яго, сват, што-небудзь кепскае сказаць. І бабу, і дзеда слухае, і матку ўважае. Да цябе з бабай у госцейкі збіраецца. Во які наш унучак!» — «Ай-яй! — скажа дзед.— Гэта ж і праўда такі харошы хлапечык — уга! Не так жа сабе я чунь яму падмеўся сплесці! Уга! Ты так і перадай яму, сват, што не хлушу, спляту!» Во як, Іванка, будзе, добра будзе, паглядзіш.

— Ты выдумляеш, дзед. Усё ў цябе добра ды добра... добра ды добра ўсё.

— Слухай ты сюды, якую я табе ціка-а-вую гісторыю раскажу. Прадзед твой, Ігнат, бацька мой, нябожчык, любіў яе часта расказваць. Жыў-быў, слухай сюды, адзін чалавек, не то дзіваком лічыўся, не то святым. Слова хоць каму благога не скажа, не накрычыць, не папракне. Дрэнна чалавек зробіць, ён у душы пашкадуе, галавой паківае, скажа толькі: ой-я-яй! Бы на дзіцця неразумнае паглядзіць. І чалавеку таму тады совісна. Вось як было. А ў жыцці, унучак, усяляк бывае. Бывае, што з такога чалавека смяяцца стануць: які ж ты, такі-сякі, добры, калі нястрашны? Аж не. Такі ўжо быў той чалавек дабрэнны, што не смяяўся, не знушчаўся з яго ніхто. І былі ў яго, значыцца, тры сыны. Харо-

шых дзяцей яму бог даў. Але ж дужа дзівіліся і яны: чаму такі бацька? Што яны ні зробяць, усё яму добра. Благое не замеціць, а на добрае пакажа ды і пахваліць яшчэ. Вось і надумалі сыны: што б ім такое зрабіць, каб бацька раззлаваўся, каб і на іх сярдзіты стаў. Не ад злосці, слухай сюды, надумалі яны так. Надта ўжо ім цікава было праверыць свайго бацьку. А дзела на сенакосе было. Пасцягалі яны сена ў копы, да вечара яшчэ часу шмат засталося: што рабіць? Старэйшы і кажа: «Давайце капу падпалім, паглядзім, што наш бацька будзе рабіць». Падпалілі, сталі і як бы грэюцца. Тут і бацька падышоў. І што б ты думаў, ён зрабіў? Стаў да іх, рукі грэе, а сам прыгаворвае: «На сонцы цёпла, цёпла, а пры капе яшчэ цяплей!» — і засмяяўся дзед, лагодненька так засмяяўся, як бы сам сабе. Як бы забыўся, што пры ім сядзеў Іванка. Барада ў дзеда рыжая, ну, не зусім рыжая, а так сабе. І мяккая. Гэта ведае Іванка. Надта клычыцца дзедава барада, як ён хлебныя крошкі з яе выбірае. Дзед во і цяпер, як смяяўся, нечага хапаўся за бараду. Губы ў яго сталі белыя, і ён ціхенька калаціўся ўвесь. Адвярнуўся во нечага, спішыўся нечага дзед. «А можа, ён плача?» — падумаў Іванка. Шапку вунь зняў, выцірае рукавом лысіну. Галава ў дзеда зусім голая, а шыя ўся пасечана баразёнкамі.

— І ветру, бач, няма, а залезла нешта ў вочы. Тут глядзі ды глядзі,— нібы апраўдваўся дзед.

Ён павярнуўся да Іванкі, плюскаў вачамі, павекі ў яго былі чырвоныя, а вочы аж белыя — памутнелі ў дзеда вочы. І жаль працяў Іванкава сэрца, падумаў ён, што нядужы ўжо дзед.

— Дзедка, хопіць табе ўжо. Бач, колькі нарэзаў! А то дай я табе памагу.

— Трапляецца, кажаш, і рачку малому злавіць рыбку скарэй, як старому,— павесялеўшы, зірнуў на Іванку дзед.— А не, унучак. Стары, што малы. І малы, што стары. Дос мне ўжо. Нарэзаў аж у запас. Добра, што саломка хоць ёсць. Выведзем на вясну кароўку. Пераб'ёмся неяк. А вунь як калгаснай скацінцы да вясны дацярпець?.. Калгасная не калгасная — чым яна вінавата, усё адно шкада. Яшчэ на каляды ездзілі па дварах, сена ў гаспадароў прасілі. Хто даваў, а хто б і даў, ды ў самога няма. Вось як! Звядзецца ўся скацінка, будуць ваўкі косці гладаць... Кароўнік раскрылі, салому

скармілі. Салома тая — званне адно. На ёй зялёны мох парос, у руках рассыпаецца — гніль. Карова зялёныя лапкі лепей, чым тую салому, есць. Свіцiцца ў кароўніку ўся страха. Ляжа карова — бакі прымярзаюць.

— Дзед, а няхай бы ўзялі кароў у двары, няхай бы перазімавалі...

— Э, унучак, каб жа ўзялі, ды каб жа далі. Узяць— возьмеш, а карміць чым будзеш? А другі разважае так: вазьму, а што мне з гэтага будзе? Малака не дасць: запусцілася, якое ўжо там малако. Сена страўлю, а хто яго мне верне?.. Працадні запішуць? А што мне будзе на тыя працадні? Сена? Ды сена і ў калгасе няма. Ды і начальства не дазволіць, каб кароў ці коней разабралі. Пабаіцца, каб людзі не падумалі, што калгасы будуць распускаць. Калі людзей не пабаіцца, дык таго начальства, што над ім, што вышэй.

— Дзед, а старшыня таксама начальства?

— Начальства, унучак. Нам з табой начальства.

Іванка як бы ўзрадаваўся нечаму і засмяяўся.

— Дзед,— сказаў ён,— дык і ты б начальствам, каб захацеў, мог быць. Памятаеш, як цябе старшынёй хацелі паставіць, як цябе на сход выклікалі і ты не хацеў ісці, а пайшоў?..

— Не магу я, унучак, начальствам быць. Гады не тыя, ды і які з мяне начальнік... Я сам сабе начальнік благі. А над людзьмі дык і зусім няма ў мяне хацення стаяць. Не магу я пастыляцца з людзьмі.

— Маці казала, што ты добры, што на табе людзі, як захочуць, так і паедуць, вінаватым зробяць, і ты будзеш вінаваты.

— І праўда, унучак. Хто з нас не вінаваты перад богам і перад людзьмі?

— Чаго ты, дзед, усё кажаш: бог ды бог. Не хачу я, каб ты казаў пра бога. І маці таксама не любіць, калі ты ўспамінаеш яго.

— Ну, добра, унучак. Не буду, унучак, бог з табой.

— Во, зноў, дзед. Усё ты — бог...

Дзед нічога не адказаў, адно зірнуў на Іванку. Дзіўна нeяк, здалося Іванку, зірнуў. Бездапаможна, разгублена, а потым чамусьці вочы заплюшчыў: павекі ў дзеда дрыжалі, як быццам балюча дзеду было, як быццам перасільваў ён, стаіўшы дыханне, гэты боль.

— Дзед,— сказаў Іванка,— гэта я так пра бога... Дзед...

«Чаму я так шкадую яго? — думаў дзед.— У мяне ўсё нутро аж сыходзіць болем. Ці трэба так, ці памагу я так малому? Што чакае яго? Божа, ці трэба мне так яго шкадаваць?»

Вечарэла ўжо, сутоньвалася на дварэ. Хмурнела ў гуменцы, вецер хадзіў пад страхою цішэй і цямней. І пацяплела быццам. Дзед, стоячы на каленях, грэбаў рукамі каля сябе, зграбаў да кучы рассунутую па таку сечку.

— Іванка, вазьмі, унучак, у кашы мех. Насып да палавіны мякінай. Рэзкай потым дасыплем, у сенцы занясём. Каб пад рукамі было, каб не хадзіць.

— От даўно б так, дзед. Цяпер я табе памагу.

Насыпалі мех, абціснулі яго рукамі і каленямі.

— Зараз мы яго — гуп! — сказаў дзед,— і панясём.

— Дзед,— сказаў Іванка,— аддай мне наган. Во, ісцінны бог, я страляць з яго не буду. Мне трубачкі шкада. Не той, што з дзядоўніку, а той, жалезнай, дзе ходзіць баёк... Аддай, дзед.

— Не ведаю я, Іванка, што з табой і рабіць...

— А ты не рабі, ты дай...

— Хто яго ведае, куды яго дзеў? Ты думаеш, мне ў галаве...

— Не мані, дзед. Я ведаю: ты схаваў.

— А што, калі нам вунь там, дзе снапы зложаны, ля сцяны паглядзець?

— Ой, чаму я не здагадаўся! Дзед!..

Паглядзеў, пашукаў Іванка рукамі: ёсць!

«Ох, малое, што дурное. Але ж і я дурны...»

— Дай-ка сюды, я патрон выму. Дай мне гэтую рагазу.

Што ён умее, гэты дзед? Туды-сюды рукой торкаецца, не, сасмаргнуў-такі гумку з байка. Ну, правільна, трубку жалезную цяпер трэба на сябе падаць, нічога, што яна перацята другой гумкай. Гумку не трэба чапаць, трубка і так пойдзе.

Дзіўнае нешта рабілася з дзедам, і не разумеў сябе дзед. Стараўся зірнуць на ўсё староннім вокам і не мог. Адчуваў, што не так нешта, не трэба было яму гэты наган Іванку даваць, але ж во душы паслабку даў, разжальбіўся, бач ты. І хацеў, і не мог зірнуць на сябе староннім вокам дзед, і пакутліва было яму ад гэтага.

— Ай, рабі ўжо сам,— зусім разгубіўся ён.

Іванка выняў зубамі патрон, абцёр яго далонню.
— На, бяры, калі шкада табе, дзед.
«Ох, стары, што малы. Што галава, то й розум».
І што ты тут зробіш: узяў патрон дзед.

5

«Божа, не пакінь мяне без помачы,— думаў дзед.— Нешта здарылася са мной. У мяне надбілася душа. У мяне не стала душы — засталося адно шкадаванне. Мне ўсіх шкада, жальба сціскае мне сэрца, і мне хочацца плакаць. Так, мусіць, нельга. Адкуль у мяне гэта? Ці, можа, я нядобра жыў? Ці гэта ты завеш так да сябе, і, можа, гэта знак мне твой? Скажы. Не, не думай, я не баюся смерці. Скажы мне толькі — я ведаць хачу, я прашу цябе: скажы мне, колькі трэба мець чалавеку дабраты ў сэрцы? Я доўга жыў, я стараўся шанаваць закон твой. Але скажы мне, якая табой палажана мера дабру? Я доўга жыў, я бачыў, як дабро спараджала зло і як зло спараджала дабро. Ці трэба так, божа? Чаму ты не зробіш так, каб адно дабро спараджала дабро? Грэшнікаў ты не адлучаеш ад сябе, але дзе ты шануеш дабрачыннасць больш: на зямлі ці на небе? Я доўга жыў, і я не ведаю, як жыць. Даруй мне, божа...

Я нічога не прашу ў цябе. Судзі, як хочаш, мяне, я ўсё прыму. Прашу цябе за ўнука. Ён сірата, ты ведаеш, і не зрабі так, каб ён быў сіратою і між людзей. У яго добрая душа, ты ведаеш гэта. Пашлі выпрабаванні яму па сіле. Не зрабі так, каб надламалася яго душа пад цяжарам дабра, але не зрабі і так, каб душа яго стала зласлівай. Палажы яму тую меру, якую не палажыў ты мне.

Я баюся дабра, але я не вінаваты ў гэтым. Не за сябе я баюся, за ўнука.

Супакой сэрца дачцэ маёй: яна шмат за вайну перажыла, стала зласлівым яе сэрца. Пашлі добрага чалавека ёй, пашлі ўнуку майму бацьку. Дай яшчэ пажыць маёй старой — не будзе табе шкоды ад гэтага, божа...

Амінь!»

6

Мяцеліца аціхала. Вецер слабеў: яшчэ ўскідваўся час ад часу, паволі, як бы нехаця набіраючы сілу, але потым раптоўна ападаў, супакойна веючы на дарогу снежным пылам. Смутлівай беллю свіціліся на вуліцы вярхі гурбаў. Нягледзячы на скон дня, на дварэ ўвачавідкі святлела. Смуга над полем празрысцела, танчэла,— зменлівая і неазначальная для вока смуга.

На захадзе, высока ў небе, не могучы прабіцца праз шчыльную роўнядзь хмар, часамі ўсё яшчэ млела трывожлівае ў сваёй залацістасці панурае святло. Але чарната ўжо глушэла і залягла над лесам.

Супакойная і ціхамірная стаяла цяпер Піліпчыкава лясоўка.

Ішоў вечар.

Абабіўшы ў сенцах ад снегу ногі, зайшоў тым часам у хату да дзеда Міхалкі дзед Трахім.

Вось як убачыў гэта Іванка.

У хаце весела гарэў на камінку агонь, кідаючы мітусліва-гарачае святло на сцены, на руды стол з драўлянаю сальніцаю, на светлую і, здавалася адсюль, ад камінка, цёплую лаву, на мокрыя ад хаты шыбіны акна, то цёмна-глыбокія, калі на іх падаў цень, то чырвона-імглістыя, калі ў іх адбіваліся языкі полымя. Вада была разліта на падлозе, і ў ёй таксама скакаў агонь. Дзынкала маці вядром, наліваючы ваду ў чыгун, дзе празрыста бялела зверху толькі што начышчаная бульба. Зноў дзынкала дужка аб вядро — мокра і ядрана, маці ставіла вядро на ўслон: чуваць было, як на дне вядра пачынала плёхаць вада. Ціха было ў хаце. Дзед ляжаў на ложку ў бакоўцы, зрэдку суха і коратка кашляў, бабуля спала на печы. Адзін Іванка сядзеў ля камінка, блізка падставіўшы твар сухому, гарачаму цяплу. Яму добра такі пякло ў шчокі, аж неяк туманна рабілася ў вачах: ён адхінаў тады галаву, і было прыемна адчуваць, як доўга яшчэ гарачыня казытала, калола твар, як роўна разлівалася па шчоках,— паветра лёгкім токам аблягала твар, і ад гэтага неяк прыемна яснілася ў галаве — было добра.

Калі ляснула клямка ў сенцах, калі нехта пачаў дзугаць перад дзвярмі нагамі, абтрасаючы з іх снег, Іванку нават і ў галаву не прыйшло, што гэта мог быць дзед Трахім.

Перш чым убачыць дзеда, Іванка ўбачыў, як у дзверы прасунулася кашолка, і ён не пазнаў бы адразу яе, звычайную кашолку, такую, як і ў іх, каб не была завязана яна зверху махрыстай цёмнаю хусткай: так заўжды хадзілі да цёткі Ганны і сама Трахіміха і дзед Трахім.

Дзед, нічога яшчэ не кажучы, затупаў у парозе, зачыняючы пасля сябе дзверы, потым павярнуўся і неяк выпрастаўся адразу, пацішэў. Вельмі сур'ёзны з твару, нават урачысты стаў дзед. Правёў па барадзе рукой: ён, бачыў Іванка, хацеў глядзець прама, але вочы ягоныя бегалі — дзеду, можа, нязвычна было пасля вуліцы глядзець на святло.

— Ну, дык добры вечар у хату вам,— аддыхваючыся, сказаў дзед. Маці разагнулася пасярод хаты, мокрай рукой паправіла валасы, потым апусціла рукі і неяк збянтэжана, палахліва глядзела на дзеда.

— Як у вас цёпла тут — уга! — жвава, мусіць, каб апярэдзіць маці, выгукнуў дзед.— Вечар добры табе, Праскута,— сказаў ён цішэй і зняў з галавы шапку.— А дзе ж гэта сват Міхалка?

Дзед Трахім паставіў у парозе кашолку.

— Дык што ж гэта я... Праходзьце сюды во, да стала,— не вельмі каб увішным голасам сказала маці і зноў падняла да твару руку, паправіла валасы.— Тата! — гукнула потым моцна, на ўсю хату.— Уставай ужо, паглядзі, хто прыйшоў...

— А ты тут грэешся — уга! Ну, добры вечар табе, суччын кот,— нібы толькі цяпер убачыў Іванку, памкнуўся да камінка дзед Трахім. Уціснуў у сваю шурпатую руку Іванкаву вялую далонь, а другою, таксама шурпатай і цвёрдай, пагладзіў па галаве ў Іванкі стрыжакі.— Уга, вялікі вырас, суччын кот. Дай во пагрэцца і дзеду.

Маці ўзяла ад стала ўслон, паставіла перад камінкам, схадзіла ў парог па анучу і колькі разоў шмарганула ёй па ўслончыку.

— Хо! Такой бяды, уга! — сказаў дзед.— Ды не клапаціся ты ўжо, Праскутка,— лагодна і задаволена казаў ён, нібы не заўважаючы ўтупленага позірку Іванкавай маці. «Злуецца маці,— думаў Іванка.— Бацькаву пенсію не можа дзеду даравацЬ».

Дзед Трахім адсунуў трохі ад камінка ўслончык, паазіраўся і сеў. Шапку паклаў сабе на калені.

Цікава, прынёс ён Іванку чунь ці не?

У бакоўцы закрактаў ложак: уставаў дзед Міхалка. Уздыхнула на печы, але не азвалася бабуля. У хаце стала ціха. Маці зноў пачала брынчэць вёдрамі. З бакоўкі выйшаў дзед Міхалка, круціў галавой, жмурачыся на святло.

— Авой! Здароў быў, сват. Прылёг я пад вечар троху. Пагода такая, што толькі і ляжаць...

Дзед Трахім устаў з услона: яны здароўкаліся. Было як бы не па сабе дзеду Міхалку: ён плюскаў вачамі, касавурыўся, глядзеў нечага сабе то на плячо, то на грудзі. «Засмуціўся, мусіць, што дзед Трахім яго на ложку застаў»,— і тут здагадаўся Іванка.

— Ага, ты праўду, сват, кажаш,— загаварыў, адразу нечага ўзрадаваўшыся, дзед Трахім.— Круціла, халера, цэлы дзень. Але цяпер во ці не ўляжацца за ноч. Аціхае як быццам. Будзе мароз... Сядай во, сват, да мяне.

— Сядзі, сядзі, а я на калодку сяду. Мне так звычней... А ты чаму гэта не распранаешся, сват? Іванка! Памажы распрануцца дзеду... Распраніся, сват, у хаце цёпла.

— Цёпла дык цёпла, уга! Ды я не забаўлюся... Гэта ж у Ганны быў. Дамоў бегчы трэба. Старая не ўправіцца без мяне. Затукае, закляне, як запазнюся... Гэта ўжо т-а-ак...

— Распраніся, сват, распраніся,— казаў дзед Міхалка.— Пасядзі... Столькі бачымся...

— Хе-хе-хе! Дык гэта ўжо так! — зноў павесялеў і аж падскочыў на ўслончыку, заўсміхаўся дзед Трахім. Пагладзіў абедзвюма рукамі шчокі, пагладзіў бараду. Выпнуўся неяк увесь, задраў галаву. Твар у дзеда гладкі, чырвоны, галава з кароткімі сівымі валасамі сядзіць стырчком. Зубы ў дзеда белыя, частыя, як часнок. А смяецца коратка і дробненька так.

— Ну дык памажы тады ўжо, Іванка, памажы,— кажа дзед Трахім.— Памажы, суччын кот,— і ўстае, распранае суконную світу, аддае Іванку разам з шапкай. Пад світай у дзеда суконная кашуля, суконнікі штаны, на нагах — валёнкі.

«Багаты гэты дзед,— думае Іванка, несучы світку і шапку, каб палажыць на куфар.— Дзіва што такі чырвоны ды крэпкі»,— і шкада яму робіцца дзеда Міхалку. Няма ў таго світы — носіць дзед ватоўку. Ка-

шуля ў дзеда палатняная, падчорненая ў выварцы з талакнянніку. Штаны-ватнікі залаплены на каленях. Абувае дзед старыя, аж чорныя ўжо, чуні.

Іванка кладзе на куфар світку і шапку, ідзе да дзеда Міхалкі і туліцца галавой да яго. Дзед Міхалка ўгнуўся на нізкай калодцы каля дзвярэй сваёй бакоўкі, пазірае на печ, дзе спіць бабуля. Дзеду Трахіму бабулі не відно: ён сядзіць на ўслоне з другога боку камінка, ля саменькага агню. Круціць галавой, жмурыць вочы ды выцягвае шыю — грэецца.

«Ці прынёс ён мне чунь?» — карціць ведаць Іванку.

— Іду гэта я,— пачынае расказваць дзед Трахім,— бачу, з лазні Івана Мядзвёдкава дым ідзе. Няўжо субота сёння, думаю, няўжо я так затлуміўся, што не ведаю, які дзень? Іваніха нешта скоранька ад лазні бяжыць, клопатна так, спяшаецца. «Чаго б гэта,— думаю,— яна?» Гляджу, Іван з лазні выбег: «Варка! Варка!» — крычыць. Спынілася тая ды трушком назад. Сталі каля лазні, як бы ў змове якой, Іван нешта скоранька гаворыць ёй, рукамі паказвае...

— Няйначай, з сельсавета нехта прыехаў, а гэтыя ўжо зацягнулі да сябе. У лазні паляць... Во падкалоднікі ўжо, во супараты людскія... Во каб ім...— загаварыла раптам, усё больш і больш злуючыся, маці.— І як гэта зямля такіх на сабе носіць?

— Дык гэта ты праўду кажаш, уга! — узрадаваўся дзед Трахім.

— Заганяў ён бабу сваю, гэты Іван. Трэба ж, каб жанчына так мужыка баялася...— як бы сам сабе разважыў дзед Міхалка.

— Во шкарад! Во хітрун! Як гэта ніхто не дакажа на яго? Людзі ваявалі, а ён адседжваўся, крыкун гэты, тарбахват... Служыў і нашым і вашым. І тады яму было добра, і цяпер. Ён — і стараста, ён і партызанам парсючкоў рэзаў... Тых, што ў людзей нарабаваў. Валёнкі ды вязёнкі немцам збіраў. Не так немцам, як сабе. Агледзела я аднойчы. У Грышчыхі, маці ягонай, свае вязёнкі на руках убачыла. Што ж я, не пазнаю сваё? «Як вам, цётка, цёпла ў маіх вязёнках?» — кажу. Заплюскала вачамі, галавой заныкала: «Што ты кажаш, таечка, мае вязёнкі гэта, мае». І ходу ад мяне. У-у, зладзюгі! І добра ім, яны чыстыя, іх не зачапі. Чаму гэта мужчыны нашы маўчаць? Хаця якія гэта мужчыны! — грэбліва скрывілася маці.— Ацалелі ад

вайны і рады. Да спадніц прыбіліся. Хто ў брыгадзіры точыцца, хто ў леспрамгас. «Мы ваявалі, мы заслужоныя, нам выгоды давай!» А мы тут не ваявалі? Мы тут мёд елі, піва пілі? Ты, Мядзвёдак пракляты, ты мёд еў, ты людскія слёзы піў,— каб ты ўдовінай слязой папярхнуўся!

Маці прыклала руку да вачэй, заплакала.

— Мама! Мама! Не плач! — закрычаў, спалохаўшыся, Іванка.

— Усяго ў вайну было,— не то асуджаючы маці, не то спачуваючы ёй, сказаў дзед Міхалка.

— Ой, і кепскі ён чалавек, гэты Іван, уга,— ужо не радуючыся, а ўздыхаючы, загаварыў дзед Трахім.— Летась луг дзялілі — ён у камісію ўбіўся. Дзялілі па дварах, па парадку, каб крыўдна не было. Дзялілі, дзялілі — даходзіць да яго чарга. Якраз ля Ананнявай лазні, ля рэчкі, да выгана бліжэй, яму паласа прыпадае. Ну, канечне, там лубяк. Кароў на пашу гоняць — абавязкова каторая ўскочыць. З пашы гоняць — зноў не без таго. Тут ужо як ні пільнуй. Закруціўся Іван, як вуж. «Мне,— кажа,— з пляменнікам маім, з Васілём, у адным месцы дайце. А тут няхай другому каму. Мне пляменніку ўсё адно касіць трэба памагаць. Касу накляпаць ці асадзіць, ды і перавезці сена трэба памагчы. Які ж ён яшчэ гаспадар?» Бач, як загаварыў! А за ім, па чарзе, ішоў Аўдулін Цяўлік. Дзіця ж горкае, як і Васіль той, таксама. Такі ж гаспадар. Але ж і зацяты ён. Малы, малы, але хлопец порсткі. Упёрся, хоць кол на галаве чашы. Во ўжо малайчына хлапечык! Тут і Аўдуля аднекуль прыбегла. Як закрычыць, як загалосіць. Мужчыны каторыя пачалі на Івана наракаць. Адступіўся...

— Во так бы раз, другі, дык і наўчылі б,— сказала ўжо нават неяк абыякава маці. Яна зноў ужоваждалася ў парозе з чыгункамі ды вёдрамі, плёхала вадой, потым пачала выціраць анучай падлогу. Узяла на рукі вялікі чыгун з бульбай, асцярожна несла яго да камінка, адстаўляючы ад грудзей. Абышла дзеда Трахіма (той убачыў, занепакоіўся, адсунуўся разам з услончыкам), прымерылася і гупнула чыгун на трыногу. Падгарнула да чыгуна галавешак.

— Падкінь яшчэ паленцаў, Іванка, няхай гарыць,— сказаў дзед Міхалка. І да дзеда Трахіма: — Я ж тады на лузе разам з мужчынамі быў, калі туды Цяўліка

гэтага немцы прывезлі. Дзівам ды з божай помаччу ўратаваўся я...

— Дзед, а я дык бачыў, як немцы іхнюю хату палілі,— гукнуў Іванка да дзеда Міхалкі.

— Лепш бы не бачыць гэтага, суччын кот,— сказаў дзед Трахім.— А ўсё праз розум дзіцячы малы, усё праз дурасць. І як яго пацягнула тую вінтоўку нямецкую браць! Хлапечыка гэтага, Аўдулінага. І тыя ж немцы неяк забыліся. Выцягнулі грузавік з гразі і паехалі. А вінтоўку пакінулі ляжаць... Потым вярнуліся ж, бач. А таго Цяўліка,— божачка, што галава, то й розум,— як бы азяліў хто: вінтоўку на печ зацягнуў, укрыў посцілкаю. І як яны, немцы, дакапаліся, хто і ў каго... Расказвалі, гергечуць, едуць. І машына ўжо легкавая з імі, і афіцэр...

— Яшчэ добра, што толькі адну Петрачкову хату спалілі,— сказала маці.— Асцерагаліся яны яшчэ тады паліць, на пачатку вайны. Цімохава хата з Петрачковай амаль упрытык. Дык немцы на Цімохавай страсе пасталі, паліваюць яе нечым, не пускаюць на яе агонь... А як Петрачыха бедная, Аўдуля, кідалася, галасіла. Бабы абступілі яе, трымаюць пад рукі... А як Цяўліка гэтага пасадзілі ў машыну ды сказалі, што на луг павязуць, каб паказаў, дзе бацька ды ўсе нашы мужчыны, зайшлося сэрца ў мяне. Немцы ўсё гергечуць: парцізан ды парцізан. Ну, думаю, будзе і нам бяда: там жа на лузе тата...

— Нічагусенькі ж мы не ведалі тады,— лаўчэй пачаў усаджвацца на калодцы дзед Міхалка. «Можа, трохі разгаворыцца дзед,— падумаў Іванка.— А то ўсё нечага маўчыць сёння ды маўчыць».— Якраз абед быў. Мужчыны ля будак паселі. Я ўправіўся неяк раней і пайшоў да азерца міскі мыць. Колькі там часу прайшло, не ведаю, толькі чую: машына фурчыць. Мужчыны нашы, чую, загаманілі, а потым пацішэла ў іх там. Пахаваліся, думаю. Ды дзе там пахаваліся! Разгубіліся яны... А я, калі ўжо машына да табара пад'ехала і немцы пачалі гергетаць, калі крык там узняўся,— шуснуў я ў ваду, пад лазовы куст забіўся, рукою за сук трымаюся, каб не захлынуцца, гляджу...

— Гэта ж усіх і ўзялі іх там,— заключыў дзед Трахім.— А я ж перад тым з лугу паехаў.

— Даніла Талялюй з Цімохам Кундылам уратава-

ліся,— сказаў дзед Міхалка.— У Дубкі на той час па брэдзень пайшлі, пабоўтацца ў канаве хацелі.

Пачала закіпаць на трынозе бульба, гонячы шумавінне цераз край і залiваючы агонь. Іванка адкаціў ад чыгунка галавешкі — яны сіпелі, тхнулі на хату дымам і горкай парай. Падышла з лыжкай маці, сабрала з бульбы шумавінне. Пакаштавала вар з лыжкі — ці даволі паклала солі, патупала да стала.

— Заседзеўся я ў вас, уга! — занепакоіўся дзед Трахім.— Трэба, мусіць, і мне ўжо на вячэру.

«Так і не прынёс чунь,— з жалем, з гнятлівай роспаччу ў сэрцы падумаў Іванка.— Чаго было прыходзіць тады?»

— Не, не, сват, пачакай,— устаў з калодкі дзед Міхалка.— Павячэраем з намі. Так не адпушчу. Павінен ты яшчэ маёй кіслушкі пакаштаваць. Выціснуў нядаўна трохі я. Да Маланніных шасцін.

— Дык гэта ўжо шэсць тыдняў будзе, як памерла?

— У наступны будзе чацвер.

— Царствія ёй нябеснае,— перахрысціўся дзед Трахім.— Во, забыў я саўсім. Іванка, суччын кот, паглядзі, што я табе прынёс. Каб ты не думаў, што дзед твой узвей-вецер: падмецца — падмеўся, а не зрабіў...

Дзед павярнуўся і пайшоў да парога, дзе стаяла кашолка.

— Чунь! Чунь! Дзед прынёс чунь! — закрычаў Іванка, пазіраючы шчаслівымі, пакруглелымі вачамі то на дзеда Міхалку, то на маці.

— А божачка, мусіць, і праўда,— не то спалохалася, не то здзівілася маці.

Дзед Трахім, прысеўшы ў парозе на кукішкі, развязваў кашолку.

7

Ад высыпанай на ручнік бульбы густа і высока, аж пад столь, ішла пара. Тут жа, на ручніку, жаўтлявым мяккім каптурком ляжалі і тоўчаныя канаплі: мачаць бульбу. У шызую алюмініевую не надта выраблёную міску наліта была сыракваша. Яшчэ такая ж міска стаяла з агуркамі. Дзед Міхалка, стоячы перад сталом, абчышчаў цыбуліну. На камінку сквірчэла патэльня: трохі пакарабачаных, сасмяглых скварак, трохі затаўкі.

На акне ў рудым ад колішняй самагонкі графіне стаяла свежая дзедава «кіслушка».

Бабуля заварушылася на печы, пазяхнула. Потым ля коміна зашамацела лучына — бабуля, мусіць, уставала.

— Куліна! Злазь ужо, вячэраць будзем,— гукнуў дзед Міхалка. Кінуў абчышчаць цыбуліну і прыслухаўся.

— А вячэрайце, вячэрайце ўжо... Ты ж ведаеш, як я вячэраю... Вячэрайце сабе.— І зноў на печы стала ціха.

— Сваццця Куліна, дык чаго ж гэта ты? Ці гэта так табе кепска? — падаў голас дзед Трахім.

— А-а, гэта ты, сват Трахім? А я ляжу, сплю — не сплю. У галаве гудзе, бы званы б'юць. І голас як быццам знаёмы, а не пазнаю. От, старасць не радасць... Як жа там сваццця?

— Мадзее трохі. Мусіць, як і ты. З жыватом у яе. Можа, язва якая. Содай толькі і ратуецца. А яе во нідзе не дастаць, уга.

— Хіба што язва. А то ж яна маладзей за мяне.

— Злазь-ка, злазь, сваццця. Дай на цябе хоць паглядзець.

— На запечак хіба злезу. Пасяджу. А вы вячэрайце без мяне. Нічога нешта ў рот не ідзе.

Бабуля злезла з печы і села на запечку, паставіўшы ногі на дошку-прыступку. Цёмная хустка была нізка насунута ў яе на лоб, з пад хусткі рэзка азначаўся худы, з цяжкім надброўем твар, з кручкаватым тонкім носам і застылымі, як бы прыпухлымі, вуснамі.

— Во мая дарога: ад печы да парога.

— Анічога,— сказаў дзед Трахім.— Перажывём зіму, летам будзе лацвей. Пагрэем косці, уга!

— Тата,— сказала да дзеда Міхалкі Іванкава маці,— прасі, каб садзіліся за стол.

— Бабуля,— падышоў да запечка Іванка,— паглядзі, што ў мяне на нагах. Мне дзед Трахім чунь сплёў. І аборы аж дзве. Адну ў запас даў. Анучкі во толькі трохі карэлыя. Маці сказала, заўтра памые...

— Ну добра, ну і няхай,— скоранька сказала бабуля, і Іванку крыўдна стала ад гэткай яе безуважнасці. «Нядобрая гэта бабуля,— падумаў ён.— Спала на печы, спала, нават не чула, як дзед Трахім прыйшоў. А мо і знарок не абазвалася. А цяпер і вячэраць не

хоча: упрошвай яе. Не хоча, не хоча, а ноччу ўстане і пачне шукаць сабе чаго паесці. Быццам ёй не даюць. Дзед і той за гэта на яе сварыўся... Нічога не буду ніколі паказваць ёй. Пайду лепш да дзеда Міхалкі».

— Дзед,— сказаў Іванка,— паглядзі, якія ў мяне доўгія аборы. Я вось так закруціў, і яшчэ вось так. Заўтра мне мама анучы памые... А ты мне адну сваю суконку дасі? У цябе вялікія, дык мне [redacted] адной будзе дзве. Скажы, дасі, дзед?

— Ну што з табой зробіш? Давядзецца даць...

«Божа, навошта я аддаў яму наган? — падумаў раптам ён.— Што гэта я? Што робіцца са мной? Душа ў мяне стала мяккая, як воск. Не давядзе гэта да дабра».

— Іванка,— сказаў дзед,— заві дзеда Трахіма садзіцца за стол...— Сват, хадзем-ка, а то ўсё астыне зусім.

Пастаўшы перад сталом, яны хрысціліся: дзед Міхалка задумліва і пакорліва, слаба шэпчучы нешта, дзед Трахім скоранька і дробна, ненатуральна задраўшы галаву і няўцямна, палахліва плюскаючы вейкамі.

Потым селі за стол.

— Колькі ж гэта ёй было... нябожчыцы Маланні? — спытаў дзед Трахім.

— Ды было ёй нямнога, год, можа, пяцьдзесят пяць... Куліна, колькі Маланні было год?

— Во не падумаў бы... Уга... А выглядала ж на ўсе шэсцьдзесят.

— Жыццё халернае было,— сказала бабуля.— Ды яшчэ табаку гэтую курыла, як мужчына,— сасмягла ў яе нутро... А радзілася ж яна, калі мне было ўжо дзесяць ці дванаццаць год. Я ж ужо за табой, Міхалка, замужам была, як няшчасце тое навалілася на нас, як тата і мама грыбамі атруціліся. Перад японскай вайной гэта было...

— Ну, так яно і будзе, год ёй пяцьдзесят пяць,— сказаў дзед Міхалка.

— Не пашанцавала нябожчыцы ў гэтай жыцці,— страпянуўся дзед Трахім і заківаў галавой і сам неяк увесь выпрастаўся за сталом, цвёрда абапершыся рукамі аб лаву.

Каторы ўжо раз за вечар здзівіла Іванку неадпаведнасць таго, што казаў дзед, усяму таму, што вы-

казвалі ягоны голас і ягоная пастава. І як бы сам радаваўся гэтай неадпаведнасці дзед, як бы любаваўся на свой голас, які праз увесь час быў аднолькава порсткі і жвавы.

— Анічога ад яе не бачылі, акрамя дабра,— няхай ёй будзе лёгка на тым свеце,— пасмешліва і безуважна загаварыў дзед Міхалка, а Іванка здагадаўся, што гэтая безуважнасць у дзеда знарок: як бы хацеў ён абысці так, прытупіць тую порсткую жвавасць, што неўтаймавана, нядобра чулася ў голасе дзеда Трахіма.— Сорак год з намі пражыла, слова благога ад яе ніхто не чуў. А пра яе сказаць дрэннае грэх было. Нага хворая — змалку гэта ў яе, ад гэтага і ў дзеўках засталася,— а яна ўсё кульгець ды кульгець, за ўсё бярэцца, нароўні са здаровымі.

— Памерла неспадзёўкі,— сказала Іванкава маці.— Запарылі мы перад тым бялізну, яна ваду насіла ўсё. Ніхто тады нічога не западозрыў, ды і ў яе, мусіць, прадчування не было. Спаць, праўда, у той вечар раней лягла. Ноччу мама чула: уставала колькі разоў ваду піць. «Чаго ты, Маланн\u0027я? Баліць што?» — «У хаце нечага душна. Ты спі». Пад раніцу спахапіліся мы, ды позна...

— Давайце вячэраць,— сказаў дзед Міхалка.— Паспрабуй во кіслушкі, сват... Не ўмею я гнаць яе... Гэта таму толькі, што трэба. Сядай ты, Праскута, ужо, так і да ночы не ўправішся...

— Нябожчыца Маланн\u0027я парадак за сталом любіла, ой, любіла,— азвалася з прыпечка, загаварыла бабуля.— Да абеду ці вячэры нічога, бывала, у рот не возьме. Іванку ўсё прывучала, каб не круціўся без пары ля стала. Міхалку шанавала, любіла ў доме гаспадара.

— Выпі, выпі, сват. Пробу знімі.

Дзед Трахім паднёс шклянку да рота, узяў глыток, паплямкаў губамі, гледзячы ў столь.

— Харошая кіслушка, ага! Навошта ты ганіш яе? Куды лепшая, чым у мяне, як апошні раз гнаў.

— Ну тады выпівай, сват, выпівай... А ты чаго глядзіш на яе, Праскута?

Узнялі шклянкі ўсе разам, на нейкі момант адвялі адно ад аднаго вочы.

— Ну, дык царствія нябеснае нябожчыцы,— сказаў дзед Трахім і рашуча, хораша выпіў усё да дна,

перахрысціўся і выцер далонню вусы.— Ох, злая, халера! Уга!

— Бяры, сват, скварку. Ці мачай во ў тлушч агурок. А і праўда, кіслушка нішто... Каб уся такая была, як у гэтым графіне. Першачок сюды зліў.

— Ці не ідзе нехта да нас? Во, слухайце,— сказала Іванкава маці і павярнула галаву да дзвярэй.

У сенцах і сапраўды ляскатала клямка, потым нехта тупаў нагамі, здавалася, нават гаварыў, але слоў нельга было разабраць, як і нельга было здагадацца, гаварыў адзін чалавек ці яшчэ хто быў з ім.

— Няйначай, Ляксей Гурмак,— першая здагадалася Іванкава маці.— Памянеце мае слова: ён. Дурань, дурань, а чуе, дзе селі за стол.

— Дурань не дурань,— усё адно чалавек. Есці кожнаму хочацца,— чамусьці незалюбіў даччыны словы дзед Міхалка, і потым праз увесь час, пакуль Ляксей Гурмак (дачка не памылілася — гэта быў ён), зайшоўшы ў хату, таптаўся ў парозе, прыдзірліва і доўга, з разлікам на ўхвалу гаспадароў, аббіваючы свае палапленыя, латка на латцы, буркі,— ці не засталося на іх снегу,— праз увесь гэты час з дзедавага твару не сыходзіў выраз пакутліва-ціхай, заклапочанай нейкай думы і крыўдлівай зацятасці ў сабе.

— Іду я з таго канца ў гэты і думаю: куды зайсці? Ты думаеш, я да благога чалавека зайду? Нізавошта не зайду. Скажы, праўду я гавару? — невядома да каго звяртаючыся, загаманіў, загугнявіў Ляксей Гурмак, бязладна махаючы рукамі і адзічэла круглячы гарачыя вочы.

На камінку на той час шырока і светла ўсхапіўся агонь, зашумеў, затрашчаў іскрамі.

— А людцы добрыя,— схамянуўся адразу Гурмак,— хата згарыць, а яны нічога не бачаць,— і кумельгам кінуўся грэбаць па падлозе рукамі. Шапка з'язджала яму на вочы, ён галавой стараўся падбіць яе на патыліцу, але гэта не памагала, і ён хапаўся за шапку рукамі, зноў грэбаў па падлозе, але цяпер яму ўжо замінала пала світкі.

— А людцы добрыя, хата згарыць, тушыць трэба хутчэй, хутчэй тушыць! — і ён злаўчыўся, схапіў у руку вугольчык і, перакідваючы яго з далоні на далонь, зарагатаў, ліхаманкава зазіркаў вачамі па застоллю.

— Скажы, добра, што я пахапіўся, добра, што я

зайшоў? Каб не я, дык згарэлі б вы: седзіцё тут, нічога не бачыце... Ты думаеш, я дурны? Мне твайго розуму не трэба, я сваім розумам жыву,— і ён, задаволены, спаважна падняўся з падлогі і кінуў вугольчык на камінак.

— Дзякую, Ляксейка, што выручыў нас, а то мы, і праўда, заюшыліся тут, нічога не бачым. Згарэлі б, каб не ты,— лагодна сказаў дзед Міхалка.— Хадзі во пасядзі з намі. Я табе выпіць налью.

— А што я казаў? Што? Я хіба да благога чалавека зайду? — зноў ажывіўся, забліскаў вачамі Гурмак.— Што я, галавы не маю, што я, не ведаю, каму памагчы?

«Як трапечацца чалавек,— падумаў дзед Міхалка.— Бог не даў розуму, але даў добрую душу. Ці справядліва гэта? Ці можна замяніць адно другім? І адкуль, навошта ў яго гэты неспакой, жаданне даказаць сабе, што ён такі ж, як і ўсе. Увесь час гаворыць пра розум. Божа, ты не даў розуму, але чаму ты не даў няведання пра яго? Не мець і ведаць ці здагадвацца пра гэта — хіба ж не пакута?.. Што гэта са мной? — падумаў потым ён.— Навошта я так часта трывожу бога, навошта хачу несправядлівым бачыць яго?..»

— Выпі, Ляксейка,— сказаў ён.— Дзякуй, што зайшоў.

— Ты кажаш — мне выпіць? Ты думаеш, я не вып'ю? Я вып'ю, але навошта ты самагонку гоніш, скажы? Ты такі багаты стаў? У цябе жыта і бульбы многа? Ты думаеш, я, калі вып'ю, дык буду маўчаць?

— Ты выпівай, пакуль даюць, пакуль пад локаць не таўхаюць,— сказала Іванкава маці.— Разумнік такі знайшоўся. Без цябе ведаюць, што рабіць.

— Ты чуеш, Міхалка, ты чуеш, што яна гаворыць? Я хіба да яе прыйшоў? Я да цябе прыйшоў. Ты бачыш, як яна камандуе? Я за цябе, Міхалка, вып'ю, а за яе не буду піць.

— Ды пі ты ўжо хутчэй. Хоць памаўчыш... Дурное слухаць.

Гурмак аж скалануўся ўвесь і нерухома, злосна вырачыўся на Іванкаву маці. Павекі ў яго задрыжалі, а вочы глядзелі няўцямна і змрочна — ён хацеў нешта сказаць і не мог: такім вялікім было хваляванне. Дзед Трахім задаволена выпнуў грудзіну і ўсміхаўся, гладзіў рукою бараду. Дзед Міхалка, апусціўшы вочы, маўчаў.

— Пі ўжо, халера... — сказала Іванкава маці лагодней.— Скінуў бы хоць свае лахманы. За стол пасадзілі... Во глядзіць, а людцы мае!..

Гурмак паволі адвёў позірк ад Іванкавай маці і гэтак жа паволі паставіў на стол шклянку з гарэлкай. Ён увесь згорбіўся неяк, ліхаманкавая напружанасць ураз сышла з яго,— засталася няўцямнасць, але не такая, як перад тым, а смутлівая нейкая, бездапаможная і пакорлівая. Крыўды зусім не выказваў ягоны твар, на ім адно была пакутлівая прыкрасць да сябе, усведамленне якой прыйшло, мусіць, адразу, як здагадка,— і прыціснула, і прыдушыла, і прыгняла, і ўсім тады на імгненне стала зразумелым, што Гурмаку было вельмі сорамна, вельмі балюча падняць ад стала вочы.

І ўсе маўчалі.

Потым Гурмакова рука ліхаманкава тарганулася, вочы мітусліва забегалі,— ён схапіў шклянку і паспешліва, гучна каўтаючы, выпіў. За ім адразу ж, але кожны як бы сам па сабе, не чокаючыся, выпілі і ўсе.

— Дайце... яму,— неспадзёўкі цёмна і глуха сказаў Гурмак, і ўсе зразумелі, што ён сказаў пра Іванку.

— А няхай вып'е... Ідзі сюды, суччын кот,— неяк вінавата паклікаў Іванку дзед Трахім.— Можа, нам станцуеш у новых чунях... Хе-хе-хе! Калі ўзяць трохі, дык яно, як лякарства, уга!

— Налі яму, Праскута, кроплю,— сказаў і дзед Міхалка.

«Трэба, мусіць, паслухацца,— падумаў Іванка,— а то ён вунь нейкі няшчасны, гэты Гурмак».

Маці, прымерыўшыся, пачала асцярожна наліваць з графіна ў пустую шклянку — нясцерпны і нейкі незразумела страшны міг, і Іванка, бянтэжачыся, схаваўся за матчынай спіной. Невядома скуль узяўшыся, востры, неперhaмoжна-гарачы сорам ударыў у галаву, у шчокі, сэрца забілася холадна, цяжка і балюча: ён адчуў, што зараз вось павінна здарыцца нешта такое, пасля чаго ён, Іванка, будзе ўжо не ён, а нехта другі, незразумелы, невядомы і страшны цяперашняму яму, і гэтага нельга ўжо абысці і нельга спыніць. Было ў гэтым нешта раптоўна-непамернае і страшнае.

Ён паспешліва дрыготкімі рукамі ўзяў ад маці шклянку, пачуў, як яму гаварылі нешта з-за стала, і, хочучы, каб усё скончылася найхутчэй, адчуваючы,

як дрыжала ў яго рука, паднёс шклянку да рота і неўсвядомлена, сутаргава хапнуў паветра. Яму адразу ж заняло дых, і калі ўжо горла апякла вострая і душная гарката, калі на вочы горача навярнуліся злыя слёзы, невыносна стала ад думкі, што гэта, мабыць, не скончыцца ніколі: у грудзях не хапала паветра і падступаў да горла саладкавā-балючы, нейкі агністы кашаль.

— Закусі, закусі хутчэй! — гаварыла над ім маці.— Ну што ты? Што з табой? — і ў голасе яе непрыемна, крыўдна пачуліся зласлівасць і раздражненне.

Ён схапіў агурок і таропка, не разбіраючы смаку, еў; у вушах у яго нешта шумела, і ліхаманкава білася думка: хутчэй, хутчэй! — ён не бачыў, што рабілася наўкол, ён быў увесь ва ўладзе адной, цяперашняй думкі і спахапіўся толькі тады, калі ў яго пяшчотна, млява пацяплела ўсярэдзіне, і ён адчуў, што пачаў аціхаць шум у галаве, неспадзявана перарабіўшыся на нейкі далёкі, наструнены звон. Было ўжо адно адчуванне напятай, незразумелай пустаты і гэтага, смутлівага і тонкага, звону.

Ён зірнуў на застолле, і яму здалося, што святло ў хаце стала і мякчэй і цяплей і памякчэлі, палагаднелі абрысы твараў у дзеда Міхалкі, у дзеда Трахіма, у маці, і яшчэ ён бачыў, як асцярожна, паціху ўстаў з-за стала Ляксей Гурмак, выйшаў на хату і пачаў распранацца ля куфра. Ён бачыў, які лагодна-ўважлівы, нават дагодлівы быў выраз твару ў Гурмака, калі той, марудліва складаючы на куфар руды свой шынелак, глядзеў на застолле,— мусіць, зноў, як заўсёды, чакаў ухвалы сабе і поўніўся добрасцю да сябе, да ўсяго, што рабіў дзеля гэтай думкі — спадабацца другім. Іванка доўга, няўцямна глядзеў на яго, на яго шынелак з залапленай нечым чорным палой — яму адбірала вочы гэта пала, ён хацеў, вельмі хацеў адарваць ад яе позірк і не мог.

— Брысь, халера на цябе! Брысь! З вядра ваду жлукціць,— пачуў ён матчын голас, пачуў, як яна пляснула ў далоні і як потым гоцнуў у парог з услона кот.

— А ты чаго сядзіш? Еш,— сказала маці ўжо да яго.

Іванка еў.

Дзіўнае, вельмі дзіўнае нешта рабілася за сталом.

Усе гаварылі штосьці, запаволена, аж да непрыемнасці запаволена размахвалі рукамі: застывалі на тварах усмешкі, кругліліся і надоўга заставаліся нерухомымі, бяздонна-страшнымі вочы. Усё нешта пачынаў і ніяк не мог скончыць гаварыць дзед Трахім.

— ...папрасіла набіць драчку... А я люблю дранку з малаком, уга! Старая калі б і садрала бульбы, ды драчка дужа дрэнная. Пачаў я набіваць новую, а ранейшую палажыў на акно, ручкамі ўверх. У акне там дзірка была. Во Сымоніхін кот як скокне ў тую дзірку ды прама ў драчку — уга! А божа ж мой, як стаў ён бегаць па сенцах ды гэтай драчкай ляскатаць...

— Брысь, халера на цябе! Зноў лезеш!.. Апсік!

— Бяры, сват, скварку, закусі...

— Што ты шукаеш, тата? Лыжка вунь у цябе пад рукой...

— ...п'яны будзе... паглядзі-ка на мяне... вочы асалавелі зусім...

— ...адчыніў бы дзверы, але ж драчку знясе і людзі папужаюцца, скажуць — кот ашалеў... Я стаю і не знаю, што мне рабіць... Толькі дзверы адчыніў у хату, каб старую на помач паклікаць, дык ён жа — як скокне ў хату каля маіх ног. Чуць драчкай ногі не абадраў... І заляскатаў жа, заляскатаў...

— Што я дурны, каб піць? Няхай той п'е, у каго галавы няма... Ты ледзь пажару не нарабіў, я прыйшоў, бачу — будзе бяда. Я табе добра зрабіў, скажы? Ты мяне пачаставаў, я выпіў. Я сказаў, каб малому даў. Ён выпіў, усе выпілі — больш я не буду піць...

— ...далі ёй лесу, дык яна і сама вазіла, і бацька памагаў. Ёй і дошак бацька накупляў, і печ сам злажыў. Дык яна казала, што такому бацьку трэба ў руку цалаваць...

«Навошта я аддаў яму наган?» — думаў дзед Міхалка.

— Што я дурны, каб піць? Няхай той п'е, у каго галавы няма...

— Ды памаўчы ты, памаўчы!..

— ...кот драчкаю ляскоча, а мы са старой, як дурныя, стаім, рукі распасцёршы. Толькі я хацеў яго схапіць, а ён у акно як скокне, уга! Акно разбіў і сам выскачыў з драчкай. Я за ім наўздагон: во нейк так ён стаў ля куста і мурчыць, аж страшна...

— Іванка, ты спіш, ці што? Змарыла цябе, скакун

ты гэтакі. А дзед Трахім казаў яшчэ, каб ты станцаваў...

— Гы, гы! — засмяяўся Ляксей Гурмак.— А што я кажу? I я кажу, каб станцаваў. Дыл-дылі-дылі-ды! Дылі-дылі-дылі-дыда! Няхай ідзе, танцуе няхай. Дылі-дылі-ды...

Загаманілі за сталом яшчэ мацней, яшчэ бязладней, і ўсё глядзелі на Іванку, і нехта падштурхоўваў ужо яго на падлогу,— імгненне, што яшчэ нядаўна адчувалася як бясконцасць, як запаволены рух, распадалася, ірвалася, асыпалася, як пясок,— паміж ім, Іванкам, і застоллем уставала пустата, і яму тады нечакана радасна прыдалося, што нічога страшнага няма ў гэтай пустаце, бо раптам адчуў праз яе самога сябе, аднаго сябе і застолле, ён як бы зазірнуў у сябе і не спалохаўся, а толькі ўпэўніўся ў сваёй да часу схаванай сіле.

— Дылі-дылі-дылі-ды! — гугнявіў, выкрыкваў Гурмак, і ўсё закруцілася, загуло, пачало аддаляцца ад Іванкі, і ён, каб утрымаць раўнавагу, каб не адстаць, тупнуў нагой, распасцёр рукі,— невядомасць насоўвалася на яго, і не было інакшага выйсця, акрамя як ісці ёй насустрач.

Як быццам нейкая да часу напятая спружына раскручвалася ў ім, як быццам вызвалялася, ірвалася на волю невядомае дагэтуль пачуццё: цёплымі, агністымі плямамі скакала святло ў хаце, набліжалася і аддалялася застолле, калыхаліся сцены, але ён, Іванка, быў цэнтрам усяго, усё існавала толькі таму, што быў ён.

Пачуццё, шырокае, вольнае, кружыла і кружыла яго, і ён ужо адчуваў, што яму, гэтаму пачуццю, рабілася цесна ў хаце, і зноў, зноў нейкая невядомасць насоўвалася на Іванку, але не страшная зусім; шырокая і да шчымлівасці звонкая, напятая, як струна, яна клікала, вабіла да сябе, забірала думкі — і што былі перад ёй і гэтая хата, і застолле, і бабуля, што так да шкадавання адзінока, роспачна сядзела, угнуўшыся на сваім прыпечку, што перад ёй быў яшчэ нядаўна такі страшны і незразумелы Цяўлік!

О гэтая невядомасць, гэтае пачуццё — непамернасць адчутых на ўсё жыццё наперад і радасцей, і шчасця, і тугі!

Але што гэта? Чаму стала ціха ў хаце? Чаму маўчыць Гурмак? Чаму плача дзед Трахім?

— ...яна ж затукала, закляла, заездзіла мяне зусім... Яна ж нават есці мне разам з сабой не дае... Усё жыццё, усё жыццё мучыўся, г-гонь яе пекані! Ох!..

Што гэта, чаму гэта, чаму так? Чаму плача дзед Трахім? Бедны, бедны дзед Трахім, бедны дзед Міхалка, бедныя бабуля і маці! Ніколі, ніколі нічога такога не будзе ў жыцці з ім, Іванкам... Ніколі не будзе.

8

«Дарагі дружа!

Не крыўдуй, што рэдка пішу. Гэта не так ад лянoты, як ад боязі сказаць не тое і не так, як хацеў бы. Каб напісаць сапраўднае пісьмо, трэба мець многа часу, трэба хоць крыху душэўнай настроенасці мець. Пісаць пісьмы ў наш час можна хіба што па натхненню, назапасіўшы перад тым хоць збольшага думак і пачуцця. А так, куды прасцей паслаць тэлеграму: жыў, здароў. Наогул, кажуць, так званы эпісталярны жанр адмірае ў наш час. Жыццё ўсё набірае тэмп, усё ўскладняецца і адначасова аўтаматызуецца. Рэчы, канструкцыі, формы, у мільёнах варыянтаў трансфармуючы змест, урэшце адасабляюцца ад яго. «Добры дзень» гучыць занадта канкрэтна, куды лягчэй сказаць «Прывітанне!» ці «Салют!». Вось і выходзіць, што тэлеграма ці тэлефонны званок лепш, чым пісьмо. У тэлеграме некалькі слоў, а на тэлефоне не будзеш сядзець паўгадзіны, калі ты толькі не вар'ят.

Такая тэорыя (праўда, яшчэ невядома, ці правільная яна), а практыка вось якая: я пішу табе пісьмо.

Браце, я жыць спяшаўся, я пачуццямі падганяў сябе — я стаміўся. Дабіваў дысертацыю і раптам — стоп! — ні радка ў дзень: страшэнна баліць галава, літары скачуць перад вачамі. І немагчыма засяродзіцца.

Пішу цяпер табе з аднаго цудоўнага, хоць і парадкам здратаванага дачнікамі і арганізаванымі адпачываючымі месца — завецца яно Сівое возера. Канец жніўня. Людзей паменшала: я п'ю малако, раніцай купаюся (загартоўка, брат), хаджу ў дом адпачынку гуляць у даміно. Папісваю вершыкі, вядома, любоўныя, афіцыянткам з паплаўка. Афіцыянткі рады, і я

рад. У кніжкі не зазіраю, ненавіджу кніжачкі, як Скалазуб.

Маці пра ўсё гэта ні-ні! Я ў яе хоць і блудны, але адзіны сын. І яна ў мяне адна. Цяпер да цябе просьба. Паводле маіх разлікаў, у вас там, у вёсцы, вось-вось пачнуць капаць бульбу. Калгасную, мусіць, капаюць ужо. Дык вось: пакуль не выкапаюць калгасную, старой брыгадзір каня на ўчастак не дасць. Гэта я ведаю ўжо. Летась я сам прасіў у яго. Ён падышоў да справы тэарэтычна, сказаў, што як чалавек адукаваны я павінен зразумець: аднаму дай, другія захочуць, непарадак будзе, будзе калгасная бульба стаяць. Як чалавек адукаваны я мусіў папрасіць прабачэння ў яго і, як ты ведаеш, наладжваць кантакт з прыватным сектарам: ісці на паклон да апошняга нашага аднаасобніка Сідара Лабка. Табе як дырэктару школы раю другое выйсце: схадзі да нашага ўчастковага міліцыянера, папрасі каня ў яго. Ты гэта лепш ведаеш, ды і ў Сідара, здаецца, каня ўжо сёлета няма.

Памажы старой, памажы знайсці людзей, каб парабілі на бульбе хоць дзень. Няхай старая не адкладвае надоўга. Бяда мне з ёй. Пабыла зіму ў горадзе, і апрыкрала ёй тут усё. Нават слухаць не хоча, калі гаварыць стану, каб назусім перабіралася да мяне.

Ах, браце! Былі тут у мяне незабыўныя, поўныя глыбокага сэнсу хвіліны: як бы збоку паглядзеў я на сябе, на сваё жыццё і злятаў душою і думкаю ў маленства. Гэта было няйначай як напружанне духоўнага зроку, і адкрыўся мне дзед Міхалка — праз дваццаць год пасля ягонай смерці. Я і не ведаў, што так даўно і так кроўна люблю яго. І зразумеў я, што няма інакшай мудрасці для нас, чалавекаў, акрамя той, што трэба быць па-чалавечы добрым і мужным,— у часы бурнаплыннай маладосці і на марудлівым сконе дзён. Павіншуй мяне з гэтым, браце.

Твой Іван».

9

Сярод ночы дзед Міхалка прачнуўся.

Ён часта прачынаўся ноччу апошні час, і абуджэнне тады было лёгкім, сон імгненна злятаў з павек: яму здавалася нават, што, мусіць, міжвольнае трымценне павек, казытліва набрынялых холадам ад настылай за

ноч хаты, і будзіла яго. Такі лёгкі і чуйны быў яго сон. Звычайна ён ціха і доўга ляжаў, не хочучы паварушыцца ці ўстаць, і было прыемна думаць, што гэта так проста — узяць і ўстаць з ложка, бо ніякай слабасці ці млявасці ён не адчуваў: была адно ціхамірнасць і незразумелая пакорлівасць нечаму, думкі пра што гэтак жа, як і рашэнне ўставаць ці не ўставаць, ён адкладваў на пасля. Было яшчэ адчуванне пустаты ў галаве і ў сэрцы, але гэта было не вострае адчуванне, і яно не трывожыла яго. Удзень ён здагадваўся, што так кранапася яго сваім крылом празрыста-халодная вечнасць, ці іначай — небыццё. Але і ўдзень яго не палохала гэта.

Цяпер жа было інакш: ён прачнуўся адразу, але з нейкім як бы высілкам, і разам з думкай пра абуджэнне прыйшлі яшчэ неўсвядомленыя, востра адчутыя шкадаванне і трывога. І ён спалохаўся. Патыхнула ад акна холадам, і ён адчуў, як да непрыемнасці востра пачало ясніцца ў галаве. Яго абступілі пахі, і зноў жа здаліся яны нясцерпна, аж да пакутлівасці, вострымі, і зноў усяго яго скаланула трывога. Пахі не адступалі, і за імі прыйшла слабасць і прыкрасць да сябе. Прыйшла, і зрабілася душна: ужо не яснілася ў галаве; нудна і слаба пачало стукаць у скроні. Ён не мог ужо так ляжаць, яму захацелася ўстаць, і, устаючы, нават узрадаваўся, што рашыўся на гэта: ён ужо ведаў, што яму трэба зрабіць.

Рэдкі шэры прыцемак, што панаваў у бакоўцы, здаўся яму імглістым і душным. Ён глянуў на акно — яно было мутнавата-сінім; лёгкія, хісткія цені струменіліся па шкле і палахліва трымцелі. Святло і цень як бы змагаліся паміж сабой, толькі нельга было разабраць, ці то змрок залягаў і ўсё глушэў за акном, ці то святло праганяла імглістую шэрань. Якая пара ночы была на дварэ, дзед Міхалка не ведаў. Ён толькі здагадваўся, што да раніцы яшчэ далёка.

Ён ступіў на падлогу. Яна была халодная, надта халодная, здалося яму, але так здалося толькі напачатку; нагам адразу ж стала цёпла, нават горача, і млява было пад каленямі. Ён ведаў, што гэта не ад прастуды, і таму не баяўся босы ступаць на падлогу. Пашукаў і знайшоў ля прыпечка старыя валёнкі, надзеў іх на босую нагу, знайшоў і апрануў стары свой кажух, парваны пад пахамі, і, падумаўшы, асцярожна і ціха

пайшоў на тую палавіну хаты, дзе спала дачка з Іванкам. Тут ён агледзеўся. І тут панаваў шэры прыцемак, але святлейшы, чым у бакоўцы; святлей мільгаліся на вокнах цені, і было нават відно, як на дварэ, мутнавата пабліскваючы ў няпэўным месячным святле, самотна сеяліся, пырхалі дробныя сняжынкі.

Ля дзвярэй, на дашчанай перагародцы, ён убачыў тое, дзеля чаго прыйшоў: там вісела Іванкава світа. Ён прыгнуўся і, стаўшы на кукішкі, пачаў абмацваць у світце кішэні. Рука адчула нешта доўгае і цвёрдае — ён узрадаваўся: наган малы яшчэ не паспеў схаваць. Кішэня была дзіравая, і рукаятка нагана асела за падкладку. Ён асцярожна, прытрымліваючы світку рукой, дастаў наган і, нібы баючыся некага, каб не згледзеў, прыціснуў яго да кажуха і так, прыгнуўшыся, выйшаў. Вярнуўся ў сваю бакоўку і з патаемнай кішэні ватоўкі дастаў патрон... Не забыць бы перахаваць і яго.

На ганку яго працяла холадам, ён на імгненне заплюшчыў вочы, стараючыся адолець дрыготку, унутрана напружваючыся, супраціўляючыся холаду і прывыкаючы да яго. Цела паступова расслаблялася, скразнякі ацІхалі пад поламі кажуха, холад пачынаў прыемна студзіць грудзі. Праходзіла млявасць. Востры, здаровы марозны пах кружыў галаву. Скакалі, вяяліся, мутнавата выблісквалі перад вачамі сняжынкі, і яму пачулася раптам, як моцна, па-роднаму блізка і цёпла запахла саломай. Танчэй і казытлівей пахла мякінай, свежа і густа чуўся пах гліны, пах прамерзлага току: ён бачыў яго выразна, карычнева-цёмны, загладжаны ток, прыбіты цапамі і пранікамі, увесь у лусачках-ямачках, што пакінула пасля сябе духмянае, цвёрдае зерне. Ён ведаў, што ўсё гэта толькі здавалася яму: пахі неадчэпна і востра мроіліся яму апошні час.

Ён зірнуў на неба. Дробныя шэрыя хмаркі беглі па ім, з-пад хмарак выслізгваўся, гойдаўся, бы на хвалях, жаўтлявы месяц. Па дахах, па гурбах нячутна снавалі цені, залягалі то празрысцей, то глушэй, і калі ўсё наўкол глушэла, сцішвалася, таямнічым, прывідным рабілася месячнае святло — было вусцішна.

Была ноч, і ён сярод ночы, перад ноччу быў адзін.

Зноў выбліснуў месяц, і расхінулася далеч. Заіскрыліся, пасвятлелі гурбы, прывідна-светлая палоска пацягнулася праз поле ў лес, над якім імглістае, сутонліва зыбалася неба. Нешта нараджалася і не магло нара-

дзіцца там; здавалася, адтуль ішлі ўсе цені, здавалася, месяц выводзіў іх адтуль. І зноў пачало глушэць, пачала сціскацца і ападаць далеч. З-пад лесу ішоў цень, і яшчэ нехта ці нешта ішло за ім. Дзеду Міхалку зрабілася цяжка дыхаць. Рука адчула, успомніла пра Іванкаў наган. Ён падняў яго над галавой, размахнуўся і далёка кінуў за плот у гурбу...

Ён стаяў і чакаў. Змрок насоўваўся на дахі, на гурбы, засцілаў сабой поле. У галаве ў дзеда Міхалкі шумела, і больш за ўсё яго не так палохаў, як раздражняў, здаваўся нясцерпна прыкрым гэты шум — ён перашкаджаў засяродзіцца, сабрацца з думкамі ці, можа, нават з адной, апошняй думкай, яна ж павінна была быць і самай галоўнай і самай патрэбнай яму...

Невядома праз колькі часу пачало віднець, і ён схамянуўся. На сінюю прагаліну ў хмарах выплываў месяц. Роўна і светла ахінала наваколле цішыня. Пад блакітнай смугой тонка празрысцелі гурбы.

Страху не было. Ён ведаў, сёння ці заўтра — гэтага не мінеш.

10

Я — рыба.
Я толькі што выкінута з вады.
Кругі гарачыя ліюцца прад вачамі.
Травой мне пахне.
О, як пахне мне травою!
Мне здаецца: я — чалавек
І на траве ляжу. Ад сонца змогся.
Але я рыба
І — я паміраю...

11

Ноч. Ноч. Ноч.

Над вёскай, над усім светам стаіць ноч. Спіць бабуля, спіць Іванкава маці. Спіць Іванка. Ніхто не ведае, што сніцца яму. Пад ложкам, абкручаныя аборамі, ляжаць новыя чуні. Прачнецца заўтра Іванка, і першая ягоная думка будзе пра іх. Узрадуецца тады Іванка. Добра заўтра будзе Іванку. Добра будзе яму.

Ну, то няхай!

1966

ЗАГАДКА БАГДАНОВІЧА

МАЛАДОМУ ВЕРАБ'Ю БЛАГА

Надзеі на папраўку амаль не было: ён гэта ведаў добра. І ўсё ж паехаў. Можа, нават і таму, каб хоць трохі супакоіць сяброў. Дзіўная рэч: за ўсе іхнія клопаты ён мог аддзячыць хіба што згодай на гэтую паездку.

Ён надта не любіў усялякіх клопатаў аб сабе.

Грошы на дарогу і лячэнне яму сабралі. Пра гэта ён не ведаў да самага апошняга часу. Паставілі, так сказаць, перад фактам. На руках было і рэкамендацыйнае пісьмо ў Ялту.

Ну што ж, Ялта. Добра яшчэ, што хоць знаёмая мясціна. Упершыню ён быў там у 1909 годзе. Малочная ферма «Шалаш», блізка ад Аутკі, непадалёк ад дачы Чэхава.

Чэхава ўжо няма. Усё тое ж — сухоты.

Брат Вадзім памёр ад сухотаў у 1908 годзе. Праз год адкрыўся гэты самы працэс і ў яго. Яраслаўскі доктар Берндт супакойваў: маўляў, марная трывога. Ялцінскі доктар (як яго прозвішча?) сказаў больш пэўна: трэба сур'ёзна лячыцца. Надзею на папраўку ўсё ж падаў. Ах, гэтыя дактары, так лёгка, як рэцэпт, выпісваюць яны надзеі.

Але тут усё надта проста. Звычайная арыфметыка. Маці памерла ад сухотаў у 27 год. Нарадзілася ў 1869 годзе, памерла ў 1896. Ператасаваны дзве апошнія лічбы. Паводле гэтай логікі, ён памрэ ў 1919 годзе. Два гады ў запасе. Што ж, добра было б. Толькі не верыцца ў гэта. Брату Вадзіму было ўсяго 18 год. А яму хутка 27, як маці. І ўсё ж так хочацца верыць няхай нават у містыку лічбаў. Два гады ў запасе — гэта добра.

Пра Ялту напісана ў чэхаўскай «Даме з сабачкам». Як гэта там? «І тут выразна кідаліся ў вочы дзве асаблівасці шыкоўнага ялцінскага натоўпу: пажылыя дамы былі апранутыя, як маладыя, і было многа генералаў». Ну, генералаў, мусіць, цяпер паменшала: вайна. Хаця...

Шкада, што ён, Багдановіч, нічога не напісаў пра Чэхава. Нейкую там нататку пра выданне яго пісьмаў — хіба гэта можна лічыць? Якое самотнае жыццё,

якая мужнасць і незалежнасць ва ўсім. І загадкавае, нікім не спазнанае майстэрства. «Над апавяданнямі можна плакаць і стагнаць, можна пакутаваць супольна са сваімі героямі, але, мяркую, трэба гэта рабіць так, каб чытач не заўважыў. Чым больш аб'ектыўна, тым больш моцнае ўражанне». Нешта падобнае ёсць і ў яго, Багдановіча:

Что с того, что стих в душе кипит?
Он через холод мысли протекает.
Поэт всегда обдуманно творит.

Ну, гэта, брат, дрэнная цытата. Вось тут у цябе, мабыць, выйшла лепш:

Сальеры ў творчасці усё хацеў паняць,
Ва ўсім упэўніцца, усё абмеркаваць,
Абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту,
І горача любіў сваю свядомасць гэту.
У творчасці яго раптоўнага няма:
Аснова да яе — спакойная дума.

Але якая самаўпэўненасць, браце,— цягацца з Пушкіным, з самім Аляксандрам Сяргеевічам. Сказана ж: «гений и злодейство — две вещи несовместные». Ну, а калі ў адчаі чалавек, калі больш, чым бога, увазлюбіў сваё рамяство (так, рамяство, гэта ж харошае слова!), а ўзнагароды няма. Калі хоча жыць у келлі, а не ў карчме? І хіба ён не лічыў Моцарта геніем? Канечне, лічыў! Не, тут было другое: абраза за прафанацыю мастацтва! Хоць несвядомую, але прафанацыю, так! І самае галоўнае — цаной геніяльнасці. Сальеры думаў, што гэтага нельга даравадь навата Моцарту.

«Абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту».

Але калі ўсё-ткі зайздрасць? Нізкая, ганебная зайздрасць. Творчае бяссілле, бясплённае напружанне думкі. Не, не, гэта, мусіць, прыдумана. Каб круглей, каб для легенды. А паэту гэта трэба для драмы. Буало гэта не трэба. Гётэ гэта не спатрэбілася б таксама. Ураўнаважаны, спакойны, як бог, Гётэ і страсны, неўраўнаважаны Шылер. Дзе тут трагедыя, драма? Для каго? Для Гётэ? Для Шылера? Хутчэй, можа, для апошняга.

І ўсё ж дарэмна ты звязаўся з Сальеры. З легендай табе не справіцца. І не абараніць сябе. Рацыяналіст і дэкадэнт — вось што будуць гаварыць пра цябе нашчадкі. І будуць помніць хіба па тым, што некалі ты пісаў неблагія рэцэнзіі на Купалу, на страснага, неў-

раўнаважанага Купалу. Купала — Шылер. Дзе знайсці Гётэ яму на пару?

Цягнік усё ішоў і ішоў на поўдзень.

Была зіма, мяцеліца. І гаварылі пра рэвалюцыю. Ён ехаў насустрач ёй ці ад яе? Эх, каб яшчэ хоць два гады жыцця!

За Гомелем на тры дні цягнік запынілі снежныя заносы. Апынуліся між станцыямі, як паміж небам і зямлёй. Цемень, завіруха. Страшныя, апакаліптычныя ночы. Палілі свечкі. Скончылася яда.

Ён думаў пра бацьку: той павінен быў выехаць з Яраслаўля на два дні пазней. Сустрэча была прызначана ў Сімферопалі. Бацьку туды пераводзілі на службу.

Пасля сямі дзён дарогі быў нарэшце Сімферопаль. Бацькі ў Сімферопалі ён не знайшоў. Ён не пакрыўдзіўся: неспакойны стаў час, усё магло здарыцца. Але хутчэй за ўсё бацьку затрымалі грамадскія справы. Яго наогул заўсёды аж надта цікавілі грамадскія справы. Максім Адамавіч, сын, разумеў: бацька чалавек няшчасны, жыццё ў яго не выходзіла і пакуль не выйшла, хоць той нікому не прызнаваўся ў гэтым, нават сабе. Выратоўваць усё павінна была «шырыня інтарэсаў», грамадскія памкненні. Максім Адамавіч разумеў бацьку, а таму шкадаваў.

Была нарэшце і Ялта.

І ў Ялце таксама была рэвалюцыя.

Кватэру было знайсці не так лёгка, як яму думалася напачатку: чамусьці сталі баяцца чужых людзей. Цэлы дзень ён блукаў па горадзе. Вынікаў ніякіх. Пад вечар здабыў адрас: вуліца Мікалаеўская, дом нумар восем, гаспадыня Марыя Цамко.

Гаспадыня павяла яго дваром. Па крутой знадворнай лесвіцы падняліся на другі паверх. Пакой быў даволі прасторны, але недагледжаны: адчувалася, што ў ім даўно не жылі. Яму было ўсё роўна. Ён зморана сеў на табурэт, выпрастаў ногі. «Больш я нікуды не пайду»,— сказаў ён. «Ну, дык жывіце сабе»,— адказала гаспадыня.

За акном відно было мора. «Блізка, сыра»,— падумаў ён. Адольвала стома. Гаспадыня пайшла. Ён слухаў яе тупаценне па лесвіцы. «Затое я буду тут зусім адзін»,— з нечаканай палёгкай падумаў ён. І ўспомніў, што не дагаварыўся з гаспадыняй пра харчы. «Бу-

ду хадзіць у сталоўку,— суцешыў сябе.— Нічога мне не трэба. Так будзе лепш. Буду пісаць».

Так ён стаў жыць у Ялце.

Ішлі дні. Пятру Гапановічу, стрыечнаму брату, ён пісаў: «Надвор'е страшэннае — дождж, вецер, холадна». І дадаваў, што гаспадыня дрэнна паліла ў печы, «эканомію наганяла». Гапановічу пра гэта можна было напісаць. Ён быў амаль ніхто яму: ну, брат, гэта праўда — брат, але ж такі далёкі чалавек. Заўсёды кпіў з яго «беларушчыны»: «самасційнасці», маўляў, захацелася. Так і гаварыў — «самасційнасць», на «хахлацкі» лад: адразу двух зайцоў забіваў. «Ты расскажи всю правду ей, пустого сердца не жалей»,— пішучы, горка падумаў ён. Можа, ён меў на ўвазе і Анюту, родную Пятрову сястру? Што ж, няхай бы гэта прачытала і яна. «Пускай она поплачет: ей ничего не значит». Ён задумаўся, а потым напісаў далей: «Бацьку пра хваробу пісаў без усялякіх падрабязнасцей. Лячуся, маўляў, у Ялце — і ўсё тут. І ты не распісвай».

Бацька даўно ўжо быў у Сімферопалі.

«Шырокае ў яго цяпер поле для дзейнасці»,— як бы са шкадаваннем падумаў сын. Ён заўсёды разумеў бацьку. І не хацеў яго турбаваць. Нават пісьмамі. Несур'ёзна гэта — пісаць пісьмы за якія-небудзь семдзесят вёрст. Такая была адлегласць паміж Сімферопалем і Ялтай.

Ён не крыўдаваў на бацьку. Так ужо звыклася: бацька, на яго думку, быў няшчасны чалавек.

Ён спрабаваў пісаць; чамусьці пісалася не надта. Тады браўся папраўляць старое. Доўга сядзеў над «Слуцкімі ткачыхамі». Работа ішла вяла. Самае непрыемнае было тое, што ён не быў упэўнены, ці трэба папраўляць. Цяжка было вечарам. Сагнуты, зморany цень Сальеры ўставаў ад дзвярэй, соўгаўся па сцяне. Шыпела газа ў лямпе. Нязвыкла пуста і яснотна рабілася ў галаве. Ён баяўся, што не вытрывае і закрычыць. Цень Сальеры затойваўся ў куце. Колькі цяпер часу? Час сеяўся праз пакой, як вада праз сіта. Думкі разбягаліся, ірваліся, як сатлелая нітка. «Дык няхай жа, няхай сабе рвецца мне жыццё, як сагніўшая ніць». Хто гэта напісаў? Ён? Добра гэта ці дрэнна? Калі дрэнна, дык можна яшчэ паправіць, яшчэ можна, можна... так...

Цень Сальеры пачынаў калыхацца ў куце. Ён ня-

ўцямна глядзеў у кут. Цень тады стойваўся. Шыпела газа ў лямпе.

Ён стараўся не глядзець у кут. Напружваў слых, імкнучыся ўчуць, што робіцца там, знадворку. І думкі стараўся скіроўваць туды. Яму здавалася, што ён чуе, як шуміць мора. А мо гэта толькі вецер? Трэба прыдумаць нешта выратавальнае. Падарожнічаць у думках. Пачаць адсюль, ад Мікалаеўскай, дом нумар восем. Давай сёння пойдзем да аднаго загадкавага чалавека, да пісьменніка Антона Паўлавіча Чэхава. Ах, яго ўжо няма? Але ж ёсць дача. Ён ведае. Яшчэ ў першы прыезд свой у Крым быў там. Верхняя Аутка. Вінаграднікі над рэчкай Учан-Су. Маленькі дамок. Садок таксама маленькі. Сонца і цішыня. Сухая патрэсканая зямля на падворку. Яшчэ там павінен быць журавель, журавель, прыручаны Чэхавым. Недзе ён чытаў ці чуў пра гэта. Колькі год можа пражыць журавель?

Ён заплюшчыў вочы... Так ярка, але супакойна свяціла сонца, і ад яго сухога бляску як бы цень ляжаў на зямлі. З высокіх, але вузкаватых дзвярэй дачы на ганак выйшаў чалавек. Задраў галаву і глядзеў некуды ў пустату, жмурачыся ад сонца. Востра паблісквала пенснэ. Нізка, ледзь не да вушэй, насунуты быў на галаву мяккі капялюшык — «піражком». Лёгкае паліто зашпілена на верхні гузік. Чалавек ступаў роўна, прама, але нейкая скаванасць адчувалася ў нагах. Можа, праз жаданне трымаць паставу. Чалавек сеў на лаўку і абшчапіў рукамі вострыя калені. Раптам твар у чалавека пасвятлеў, ён рукою дакрануўся да пенснэ. На падворку стаяў журавель, падабраўшы адну нагу, але ўвесь як бы цягнучыся ўгору. Развіналіся і ападалі долу крылы, чыркаючы аб сухую шорсткую зямлю. Абабітыя, ужо злінялыя крылы. Журавель танцаваў. Чалавек зняў з галавы і палажыў на калені капялюш. Валасы на галаве былі зляжалыя — станчэлыя і нібы хворыя валасы. Журавель рабіў па надворку кругі, набліжаючыся да чалавека. Той усміхнуўся і лёгка ўзмахнуў рукой. Журавель скокнуў убок і, трымаючы раўнавагу, шырэй замахаў крыламі. Бег, падскокваючы, па двары. Адарваўся ад зямлі і зрабіў паўкруг над садам. Чалавек глядзеў, ледзь павярнуўшы галаву,— твар быў разгублена ўважлівы і тым часам безабаронны, як амаль заўсёды ў чалавека, калі ён адзін.

Над клумбай пачала пырхаць мятлушка, залаціста-

рудая, з чорнымі закрайкамі крылаў. Было так ціха, што чутно было шалясценне гэтых крылаў. Свяціла сонца, і ад яго сухога бляску як бы нейкі цень ляжаў на зямлі...

Багдановіч расплюшчыў вочы. Ціха. Гарэла лямпа. Фіялетавым змрокам набрыняла акно. Ён павярнуў галаву і паглядзеў у кут. Сагнутага ценю таго чалавека там ужо не было.

Так праходзілі ночы. Наставалі дні.

У Ялце была вясна.

Ён пачаў часцей выходзіць на вуліцу. Гадзінамі ён мог сядзець, знерухомеўшы, і грэцца на сонцы. Хада стамляла яго. Забівала дыханне. Тады горача, неўтаймавана стукала ў скроні. Калі праходзіла гэта, казытліва і суха пачынаў гарэць лоб. І балела чамусьці над брывом. «Так, жыццё,— думаў ён.— Што ж рабіць? Можа, найбольшая мудрасць для безнадзейна хворага — прымірыцца з ім. Спакойна глядзець, думаць і адчуваць. Што павінен ён зразумець, калі надыдзе апошняя яго хвіліна?»

Думкі зноў былі пра вершы.

У Мінску ён перачытаў «Вянок». Тады думалася так: недахватаў розных гібель, бо кніжка, што ні кажы, маладая, пісалася ў 17—20 год. Але ж... Але ж ёсць у ёй і творчасць, і натхненне, і сур'ёзная праца. Частку вершаў ён выкасаваў, другія пры выпадку трэба было б абгладзіць.

Тут, у Ялце, абгладжваліся вершы цяжка. «І не трэба,— падумаў ён.— Гэта ўсё праз хваробу. Праз хваравлівы стан душы. Проста выкасаваць — і ўсё». І здзівіўся палёгцы, што прыйшла з гэтай думкай. Здагадаўся: днём ён яшчэ больш, чым ноччу, баяўся таго чалавека — Сальеры.

Як бы там ні было, у яго ўсё ж ёсць кніжка. І ёсць яшчэ вершы беларускага складу. Можа, на гэтым яго зразумеюць і апраўдаюць нашчадкі. І даруюць тое, чаго не паспеў зрабіць. Зробяць іншыя, зробіць Купала. Бессумненна, у таго вялікая будучыня. Такая здольнасць да абнаўлення, да пашырэння абсягу тэм і думак. І якія рытмы, якая лексіка, якое пачуццё мовы!

Што сказаць, ён зайздросціў Купалу і не баяўся прызнацца сабе ў гэтым. Яго ж, Багдановіча, песенька была спета.

На вуліцы, здаралася, ён прыпыніўшыся, разгляд-

ваў сябе ў шкле вітрын. Божа, так схуднець! І здзіўляла яшчэ другое: так стаў падобны на бацьку! Раней ён заўсёды думаў, што падобны на маці. А цяпер, як у бацькі, выпукліліся надброўі і гэтаксама панурыліся вусы. І прабіўся ў вачах сухі, насцярожлівы бляск.

І гэта было яшчэ адным, што мірыла яго цяпер з бацькам.

Пісаць яму пакуль, праўда, не хацеў. Ведае ж, што сын у Ялце. Колькі разоў пісаў яму? Здаецца, два. Ну і даволі. Але неўзабаве ён стаў пачуваць сябе надта блага. Колькі дзён запар не выходзіў з дома. Гаспадыня прывяла бальнічную сястру. Сястра была пры ім толькі ўдзень. Начамі, страшэнна стамляючыся, ён пісаў бацьку пісьмо. Пісаў так: «Дзень добры, стары верабей. Маладому вераб'ю блага... Макротаў у мяне шмат, тэмпературы высокія, два разы ішла кроў, другі раз адпляваў я яе дзён за дзесяць, але з гэтага часу з ложка ўжо не ўстаю — аслабеў дарэшты. Скора пачнецца гарачыня, трэба будзе ехаць з Ялты, а як у такім стане паедзеш?..»

За дзень перад смерцю яму палягчэла. Ён папрасіў гаспадыню купіць свежых клубніц. З'еў дзве-тры ягады і больш не мог.

(Ён не ведаў, як паміраў Чэхаў. Паміраў ён у Бадэнвейлеры, у атэлі. Быў позні вечар, ці пачатак ночы, калі ён, прачнуўшыся, папрасіў паслаць па доктара. Раней ніколі ён сам гэтага не рабіў. Жонка выбегла ў пусты, маўклівы калідор начнога атэля — папрасіць каго-небудзь прывесці доктара. Чэхаў ляжаў і чакаў. Стоеная і душная цішыня панавала ў атэлі. У цёмных клетках паверхаў, скурчыўшыся ў нагрэтых пасцелях, спалі, абліваючыся потам, пажылыя сямейныя пары; вінны перагар стаяў у пакоях адзінокіх халасцякоў,— о, як душна было за сценамі, якое бязлюддзе было ў калідорах! Рыпеў пясок пад нечымі нагамі ля пад'езда атэля. Які ядраны, смачны і чысты хруст!

Жонка прынесла лёд. Прыйшоў доктар. «Шампанскага!» — сказаў доктар. Антон Паўлавіч сеў, узяў бакал. Доктар глядзеў на Чэхава. Яму здалося, што хворы хацеў нешта сказаць. Доктар нахіліўся да Чэхава. Моцна, нібы побач з ім быў глухі, Чэхаў сказаў: «Іх штэрбэ...» («Я паміраю»). Выпіў шампанскае. Усміхнуўся і дадаў: «Даўно я не піў шампанскага...» Асцярожна і ціха лёг на бок...

Вялізная чорная мятлушка пырхнула праз фортку ў пакой. Цень мітусіўся па сцяне, па сталі, падаў на твар чалавека, што нерухома ляжаў на ложку,— ляжаў як трэба, перавернуты ўжо на спіну. Стаяла цішыня. Потым як бы выбух скалануў пакой — з бутэлькі выбіла корак...)

...Багдановіч ляжаў выпрастаўшыся: адна рука падціснута была пад падушку, другая — далёка адкінута ўбок. Стаяла цішыня. Гаспадыня, яшчэ ні пра што не здагадваючыся, запынілася на парозе. Асцярожна прачыніла за сабой дзверы. Ступіла ў пакой і зразумела ўсё.

На табурэце каля ложка ляжаў кулёк з клубніцамі. Папера густа набрыняла чырванню. Нейкі скурчаны лісток валяўся на падлозе. Гаспадыня падняла яго і прачытала: «Дзень добры, стары верабей. Маладому вераб'ю блага...» Канверта нідзе не было. Не было, значыць, і адраса. Гаспадыня пачала шукаць адрас. На адным са старых канвертаў было пазначана: «Яраслаўль... А. Я. Багдановіч».

Гаспадыня не ведала, што бацька Багдановіча жыў у Сімферопалі.

Ад Сімферопаля да Ялты было семдзесят вёрст.

СТАРЫ ВЕРАБЕЙ

Адам Ягоравіч пісаў успаміны пра сына праз шэсць год пасля ягонай смерці. Прасілі аб тым з Мінска. Падобна на тое, што Адам Ягоравіч быў здзіўлены. Значыцца, у Мінску надаюць надзвычайнае значэнне сынавай працы, магчыма, нават лічаць яго класікам. Хто-хто, а ён, Адам Ягоравіч, у бібліятэцы якога «было ўсё, што было лепшага ў свеце, і нічога пошлага» (так ён пісаў сам і, магчыма, трохі перабіраў меру, як заначаў з гэтага выпадку акадэмік І. Замоцін), хто-хто, а ён добра ведае, што такое класік.

Лёгкая, але ўсё-ткі адчувальная крыўда прабіваецца ва ўспамінах Адама Ягоравіча. Крыўда на сына? Не, хутчэй зайздрасць. І крыўда на свой лёс. Але ці не здаецца нам гэта, ці былі падставы да такой крыўды?

У Адама Ягоравіча даўно ўжо былі парваны амаль усялякія зносіны з Беларуссю. Ён памятаў, вядома, што на гродзенскіх могілках спачывала яго першая жонка, Максімава маці. Памерла яна ў 1896 годзе.

У тым жа годзе Адам Ягоравіч разам з сям'ёй пераехаў у Ніжні Ноўгарад. «Над магілай было даручана апекавацъ маім сябрам, але нікога з іх у Гродна ўжо няма». Сам Адам Ягоравіч у Гродна ніколі больш не быў.

Але ён памятаў не толькі гэта. Ён не мог не ўспомніць, што некалі сам напісаў брашуру пад навукова бясстраснай і адначасова грунтоўнай назвай «Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў». Гэта была добрая кніжка, самастойная і змястоўная, напісаная з пазіцый, якія тады, як і цяпер, не маглі не лічыцца прагрэсіўнымі. На кнігу звярнулі ўвагу буйныя польскія і рускія фалькларысты, прадракаючы аўтару зайздросную навуковую будучыню... А гэта ж быў, па сутнасці, толькі дэбют.

Што ж сталася потым, як сталася так, што А. Я. Багдановіча-вучонага мы адкрываем для сябе толькі цяпер, і то як бы ўскосна: зразумела кожнаму, што адной з не апошніх прычын нашай цікавасці да яго ёсць тая, што ён бацька паэта Максіма Багдановіча.

Адказаць на гэта пытанне не так проста. Не проста было разабрацца ў сваім лёсе і самому Адаму Ягоравічу, прынамсі, у той дзень, калі ён атрымаў з Мінска ліст, дзе была выкладзена просьба напісаць успаміны аб сыне.

Мы пішам не навуковую працу пра А. Я. Багдановіча. Агаворымся зноў, што і яго навуковыя памкненні, і яго жыццё цікавяць нас толькі ў сувязі з жыццём і творчасцю яго сына. Гэта — не жорсткасць. Гэта толькі спецыфіка ўзятай намі на сябе задачы. Вось чаму нас будуць цікавіць найбольш тыя моманты, якія наўрад ці знайшлі б месца ў акадэмічна вытрыманым даследаванні. Моманты гэтыя — псіхалагічныя. Інакш, больш агульна і шырока, гэта трэба было б назваць праекцыяй лёсу чалавека, асабістага і грамадскага, на тое, што завецца гісторыяй.

Была іронія гісторыі, іронія ўласнага лёсу ў тым, што, магчыма, не здолеў да канца зразумець Адам Ягоравіч. Іронію, праўда, ён адчуў і выказаў гэта так: «Якая неадпаведнасць у тым, што не ён пра мяне, а я пра яго павінен пісаць успаміны». Толькі справа тут не толькі ў тым, што бацька перажыў сына, хоць Адам Ягоравіч піша як быццам пра гэта.

Не, сапраўды: якая трагічная неадпаведнасць! Проста вучоны, непрызнаны вучоны А. Я. Багдановіч паві-

нен пісаць успаміны пра свайго сына, найвыдатнейшага беларускага паэта, якому, калі ён памёр, не было нават 27 год. Проста вучоны, непрызнаны вучоны А. Я. Багдановіч пазней піша ўспаміны пра вялікага рускага пісьменніка Горкага, успаміны, якія праз многа год упершыню будуць выдадзены ў Беларусі, на яго і на сынавай радзіме.

Як бы ні аддаляўся Адам Ягоравіч ад радзімы, здзеклівы лёс прыводзіў яго толькі сюды.

Не мы судзім за нешта Адама Ягоравіча, судзіць гісторыя, судзіць і шмат што даруе радзіма, бо яна бачыць: тут трагедыя, і трагедыя не аднаго толькі Адама Ягоравіча. Гэта трагедыя часу. Максім Багдановіч апярэджваў час, і ён перамог. Адам Ягоравіч можа перамагчы, і то толькі часткова, дзякуючы сыну.

Лёс кідаў Адама Ягоравіча з аднаго расійскага горада ў другі, ён стараўся і нідзе не здолеў пусціць глыбока карэнні. Чаму не вярнуўся ён на Беларусь? Магчыма, ён думаў, што як вучоны ён зможа працаваць усюды. Ён пачынаў як этнограф, пачынаў у той час, калі гэта навука менавіта на беларускім матэрыяле дасягнула, бадай, самых бліскучых сваіх вышынь. Беларускі матэрыял натхняў Шпілеўскага, Пыпіна, Карскага, Раманава, Нікіфароўскага, Насовіча, Доўнар-Запольскага. Найбольшая этнаграфічная цікавасць да «беларушчыны» прыпадае на 70—90 гады. Пазней яна паступова глухне. Гэта натуральна. Былі на тое розныя прычыны, сярод якіх не апошняя самая звычайная: беларуская праблема амаль вычарпала сябе сродкамі этнаграфічнымі. Тэзіс Дабралюбава — «паглядзім, што скажуць самі беларусы»,— пачаў уладна рэалізавацца жыццём. Гэта быў ужо другі, уласна беларускі этап праблемы. Адам Ягоравіч не здолеў звязаць сябе з ім. Магчыма, ён проста недаацаніў яго. Справа тут тычыцца ўжо светапогляду.

А. Я. Багдановіч як вучоны, хоць і вучоны-самавук, належыць усё ж да дарэвалюцыйнай навуковай этнаграфічнай школы, якая, прызнаючы несумненную таленавітасць беларускага народа, яго самабытнасць, самабытнасць форм яго жыцця ў мінулым, часта разам з тым сумнявалася ў яго здатнасці да будучага самастойнага нацыянальнага жыцця. Як вучоныя, як аб'ектыўныя, добрасумленныя вучоныя, мы пасведчылі тое, што было і што ёсць,— што будзе далей, нас

не датычыць. Што ж, «чыстая, аб'ектыўная» навука заўсёды гаворыць так. «Чыстая» навука заўсёды ў дастатковай ступені касмапалітычная (гэта ў лепшым выпадку), у горшым выпадку яна можа абаперціся і на шавінізм. Навука сапраўды дэмакратычная выключае тое і другое. Дабралюбаў зазначаў: паглядзім, што скажуць самі беларусы. Ад сябе зазначым, што гэта было сказана трошкі раней, чым у дзевяностыя гады. Чарнышэўскі рашуча абвяргаў навуковы касмапалітызм. Пры гэтым ён кіраваўся не абстрактнай ідэяй (з пункту гледжання абстрактнай ідэі мы павінны прызнаць касмапалітызм навукі і заканамерным і неабходным), а зыходзіў з канкрэтных гістарычных умоў, з ідэі служэння навукі грамадству. Ход думкі Чарнышэўскага надзвычай цікавы, і мы не можам адмовіць сабе ў задавальненні прасачыць яго. Тым больш што гэта мае да нашай гаворкі самае непасрэднае дачыненне.

Касмапалітызму ў навуцы і ў мастацтве Чарнышэўскі супрацьпастаўляе паняцце патрыятызму, заўважаючы тым часам, што, як усе высокія словы, слова гэтае іншы раз ужываецца нядобрасумленнымі людзьмі для азначэння рэчаў, якія нічога не маюць агульнага з сапраўдным патрыятызмам — гэтым страсным, бязмежным хаценнем дабра радзіме, гэтым пачуццём, якое здольна надаць сэнс і накіраваць усю дзейнасць чалавека. У «Нарысах гогалеўскага перыяду рускай літаратуры» Чарнышэўскі піша: «Разумеючы патрыятызм у гэтым адзіна правільным сэнсе, мы заўважаем, што лёс Расіі ў адносінах да задушэўных пачуццяў, што кіруюць дзейнасцю людзей, якімі наша радзіма можа ганарыцца, дагэтуль адрозніваўся ад таго, што ўяўляе гісторыя многіх іншых краін. Многія з вялікіх людзей Германіі, Францыі, Англіі здабываюць сабе славу, імкнучыся да мэт, якія не маюць прамой сувязі з дабротамі радзімы... Бэкан, Дэкарт, Галілей, Лейбніц, Ньютан, цяпер Гумбальд і Лібіх, Кюўе і Фарадэ працавалі і працуюць, думаючы пра карысць навукі наогул, а не пра тое, што ў гэты момант трэба на карысць пэўнай краіны, якая з'яўляецца іх радзімай... Яны, як дзеячы разумовага свету, касмапаліты. Тое ж трэба сказаць пра шмат якіх вялікіх паэтаў Заходняй Еўропы». «У нас не тое»,— піша Чарнышэўскі і, называючы імёны Ламаносава, Дзяржавіна, Карамзіна, Пушкіна, гаворыць, што гэтыя людзі лічацца вялікімі па пры-

чыне сваіх заслуг перад радзімай, бо «зрабілі вялікія паслугі асвеце і эстэтычнаму выхаванню свайго народа». Вядома, Чарнышэўскі далёкі ад думкі, каб такім чынам сцвердзіць «перавагу» рускай навукі ці мастацтва над навукай і мастацтвам заходнееўрапейскім. Гэта было б падобна на «квасны патрыятызм», а ў такіх грахах мы, пры ўсім жаданні, ніяк не змаглі б абвінаваціць Чарнышэўскага. Патрыятызм — жывое патрабаванне, жывы змест пэўнага гістарычнага моманту, а вялікі рэвалюцыйны дэмакрат, як ніхто пасля Бялінскага, разумеў, што служыць вечнасці і абсалюту можна толькі праз служэнне свайму часу. І для Расіі ён лічыць жаданай тую пару, калі з'явяцца ў ёй, як у іншых народаў, «мысліцелі і мастакі, якія дзейнічаюць чыста толькі ў інтарэсах навукі або мастацтва». А пакуль... пакуль гэта прывілея найбольш развітых у грамадскім, мастацкім і палітычным сэнсе краін, дзе існуе, як кажа Чарнышэўскі, «падзел працы паміж рознымі галінамі разумовай дзейнасці, з якіх у нас вядомая толькі адна — літаратура».

Няцяжка здагадацца, што ў паняцце «разумовай дзейнасці» Чарнышэўскі ўключаў больш, чым азначалі гэтыя словы: ён гаварыў пра адсутнасць свабоды выказвання думкі, пра адсутнасць дэмакратычных форм грамадскага жыцця: вось чаму літаратура павінна была браць на сябе тыя функцыі, якія не маглі ўзяць на сябе ні грамадскія інстытуты (іх проста не было), ні нават навука.

«Чыстая» навука, якая са зне гаварыла пра Беларусь (дзякуй ёй за тое, што гаварыла, бо ў саміх нас не было тады каму гаварыць), вычарпала сябе якраз у той момант, калі загаварылі самі беларусы, калі жывой, дзейснай сілай стаў менавіта патрыятызм, «мясцовы», нацыянальны патрыятызм.

Этап Адама Багдановіча скончыўся, пачынаўся этап Максіма Багдановіча. Гэта мы разумеем сёння. Але ці разумеў гэта Адам Ягоравіч? Ці разумеў ён, што тут заканамерны працяг таго, да чаго ён воляю лёсу як вучоны быў далучаны на нейкі кароткі, можа, самы шчаслівы ў сваім жыцці момант?

Не, навука не скасоўвалася, проста цяпер мелася патрэба ў грамадска і нацыянальна зацікаўленай навуцы. Яшчэ большая патрэба была ў паэтах — непасрэдных выказніках народных дум. Максім Багдано-

віч мусіў быць і вучоным, і публіцыстам, і крытыкам — і ўсё толькі таму, што ён быў паэтам. Як тут зноў не ўспомніць Чарнышэўскага!

Ранняга, даўняга Адама Багдановіча вяртаем мы сёння Беларусі дзеля яго самога. Адаму Багдановічу, лёс якога як вучонага ў больш позні час склаўся няўдала (не будзем гаварыць па чыёй — яго ці каго іншага — віне), мы можам толькі спачуваць.

Адам Ягоравіч быў таленавіты чалавек. Варта прачытаць яго ўспаміны, асабліва тыя старонкі з іх, дзе расказана пра дзяцінства, пра цяжкі шлях у навуку, каб пераканацца, што наш субяседнік — асоба, да якой наўрад ці падыдзеш з сярэдняй чалавечай меркай. Гаворым не пра Адама Ягоравіча — вучонага і перакананага, заўсёднага энтузіяста грамадскай справы, гаворым пра яго магчымасці менавіта як асобы, пра тыя шчаслівыя рысы характару, пэўнасць і жывасць якіх дае нам у канчатковым выніку адчувальны вобраз таленту.

Адама Багдановіча — вучонага яшчэ няма, ёсць надзвычай цікаўлівы, па-вясковаму кемлівы хлапчук, душа якога з непатольнай прагавітасцю ўбірае ў сябе паэтычныя і сумныя з'явішчы жыцця, прасякаецца трапяткім токам народнай гаворкі, народнай песні і казкі. І пры ўсім гэтым — здаровая, учэпістая памяць на дэталі побыту, пры ўсім гэтым здаровы сялянскі практыцызм, не ў сэнсе яго жыццёвай, прыкладной функцыі, а ў сэнсе самой здольнасці вызначаць і пазнаваць з'яву ў яе жыццёва-лагічнай абумоўленасці.

Старонкі, прысвечаныя вясковаму дзяцінству вучонага, бадай, лепшыя ва ўспамінах і, бадай, найцікавейшыя для нас. Адам Ягоравіч пісаў свае ўспаміны па-руску, аднак там, дзе глыбока самабытныя з'явы і паняцці беларускага вясковага жыцця выходзілі за межы рускай моўнай стыхіі, карыстаўся мовай беларускай. Па-беларуску, між іншым, пададзена ўсюды гаворка бабкі Рузалі, жанчыны з характарам моцным і дзейсным, нястомнай працаўніцы, знахаркі, казачніцы і пяюхі. І якая гэта гаворка! Колькі ў ёй каларыту і колькі зграбнай выяўленчай сілы! І няблага, тым часам, ведаў родную мову Адам Ягоравіч, калі здолеў усё гэта захаваць у сабе, а потым і нам, чытачам, перадаць. Што ж, дарэчы, датычыць яго рускай мовы, дык яна, шчыра кажучы, не вызначаецца якімі-небудзь асаблі-

вымі вартасцямі, а наадварот, адчуваюцца ў ёй тыя залішнія правільнасць, закругленасць і грунтоўнасць, якія адразу выдаюць пераважна кніжнае веданне мовы. Між іншым, рускай мове нават самога Максіма Багдановіча ўласцівы амаль тыя ж недахопы — факт, які лішні раз пацвярджае тую простую ісціну, што мова, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і з'ява псіхалагічная.

У Адама Ягоравіча было цяжкае дзяцінства. Бацька ягоны не меў надзелу, і сям'і даводзілася жыць з няпэўных і непастаянных заробкаў, на ўсім купленым. Пастаянны, гнятлівы клопат — дзе, як дастаць капейку, каб купіць бульбы, мукі, алею і нават... лучыны. «Думаць, гэта думаць,— бедавала бабка Рузаля,— руб сем грывен аржаная мука стала!»

У сям'і Багдановічаў было даволі своеасаблівае становішча: сям'я залежала ад вёскі і ў той час як бы і не залежала, яе эканамічныя, маральныя сувязі з вёскай вызначаліся даволі высокай рухомасцю, што асабліва важна, калі мець на ўвазе далейшы лёс Адама Ягоравіча. Гаспадаром яму наўрад ці можна было стаць: усё паказвала на тое, каб шукаць нейкай іншай дарогі ў жыццё, нейкай спецыяльнасці, а гэта, у сваю чаргу, магло здзейсніцца праз тую ці іншую навуку.

З другога боку (адзначым і гэта), менавіта тут, у вёсцы, і менавіта з выпадку асаблівага становішча сям'і Адам Ягоравіч меў больш чым дастаткова ўражанняў і нагляданняў таго парадку, які пазней склаўся ў сістэму своеасабліва асэнсаваных адносін да народнага вясковага жыцця. Тут, у вёсцы, адбылося, па сутнасці, нараджэнне Багдановіча-этнографа.

Значыцца, так: Адам Ягоравіч ідзе ў навуку. Праз многа год, агдядаючыся ў думках на той дзень, калі ён упершыню пераступіў школьны парог, Адам Ягоравіч напіша: «Гэта быў год маёй асуджанасці на цяжкую працу, працу нястомную і бясконцую, з недасяжнай мэтай — абняць неабдымнае, і прытым з непрыдатнымі сродкамі». Адчуваеце вы ў гэтых словах і шкадаванне, і крыўду, і горкае пасміханне з самога сябе? Адчуваеце? Тады слухайце далей: «...І каб я ведаў, чым гэта пахне і да якіх павядзе мяне вынікаў, то, бадай, не бег бы, падскокваючы, калі мяне вёў бацька ў школу, і не трапятаў бы ад радасці і страху, звычайных перад рызыкоўнай барацьбой, у якой можна і перамагчы, але і пацярпець жорсткае паражэнне». Якая

сумная, трагічная выснова! І гэта гаворыць чалавек, для якога навука праз усё жыццё была ўсім, якой ён быў абавязаны не толькі кавалкам хлеба, не толькі месцам у грамадстве, але, самае галоўнае, магчымасцю і здольнасцю адчуваць сябе чалавекам, здольнасцю пазнання і магчымасцю задавальнення ад яго. Якой жа дарагой цаной куплена было ім гэтае пазнанне, колькі, трэба думаць, расчараванняў прынесла яно яму, калі з-пад ягонага пяра выходзяць такія балючыя, амаль знішчальныя словы!

Ёсць нейкая трагічная заканамернасць у лёсе Адама Ягоравіча. Як назваць, як растлумачыць яе? Чэхаву належаць словы пра тое, што дваране бралі дармова ад прыроды тое, што разначынцы купляюць цаной маладосці. Дзед Чэхава быў прыгонны, Адам Ягоравіч нарадзіўся праз нейкі год пасля таго, як яго бацька перастаў быць прыгонным. Чэхаў пісаў пра чалавека, які цаной неймаверных намаганняў змушаны быў «выціскаць з сябе па кроплі раба». Адчуць сябе чалавекам можна толькі праз навуку, веды. З незвычайнай прагаю цягнецца Адам Ягоравіч да ведаў. Душа і розум яго кіпяць і рвуцца насустрач жыццю. Ён нават як бы ашаломлены тою безліччу магчымасцей, якія адкрывае перад ім навука і наогул любое ўмельства ў жыцці. Ён падобны на чалавека, які нечакана апынуўся перад грудаю золата, срэбра, каштоўнага камення і які не ведае, што ў першую чаргу ўзяць і колькі ўзяць. Вось ён вучыцца ў школе, вось ён уладкоўваецца вучнем у чыгуначныя майстэрні — не, не тое, вось ён навучаецца кандытарскай справе — зноў расчараванне, вось ён паступае да слесара, а праз колькі часу ён ужо стаіць за буфетам, потым — зноў вяртаецца да слясарнай справы. І разам з усім гэтым, над усім гэтым — кніга. Нарэшце рашэнне выспела: ноччу, крадком, ён пакідае гаспадара — наперадзе Нясвіжская семінарыя. Адам Ягоравіч прыстае да жаданага берага. Навука! Магчымасць чытаць, спрачацца, быць прылучаным да сапраўднага жыцця. Не будзем пералічваць, што чытаў, чым цікавіўся ў семінарыі Адам Ягоравіч, але несумненна, што тая шырыня інтарэсаў — навуковых і грамадскіх,— якая будзе спадарожнічаць яму праз усё жыццё, бярэ пачатак адсюль, са шчаслівай пары навучання ў семінарыі. Тут, дарэчы, Адам Ягоравіч пазнаёміўся з перадавымі тэорыямі часу, з гісторы-

яй рэвалюцыйнай думкі. У год сканчэння семінарыі ён наладжвае сувязь з прадстаўнікамі народніцтва: з гэтага часу Адам Ягоравіч пачынае дзяліць сваё жыццё паміж службай, навуковымі заняткамі і грамадскай ці рэвалюцыйнай работай. І так будзе заўсёды. Адам Ягоравіч не ашчаджаў ды і не ўмеў ашчаджаць свае сілы. Ён, здаецца, не жыў, а высільваўся. Пазней Адам Ягоравіч пашкадуе пра гэта, прынамсі, як вучоны. Але інакш, мусіць, ён не мог. Магчыма, ён жыў бы інакш, каб мог трохі больш узяць «дармова ад прыроды». А ён жа быў, як ні кажыце, усё ж самавук: афіцыйная навука, ды яшчэ семінарская, як бы добра ні была пастаўлена яна, не магла яму даць і дзесятай долі таго, што ён уведаў, што ўзяў ад кнігі, адно дзякуючы сваёй незвычайнай цікаўлівасці і, магчыма, яшчэ самалюбству. Што самалюбства ў Адама Ягоравіча было вялікае, няцяжка здагадацца. Пра гэта, праўда, мімаходзь, піша ён і сам, расказваючы пра гады навучання яшчэ ў пачатковай школе. Піша пра крыўду, пра пакуты самалюбства, якія цярпеў праз тое, што нейкі час быў не першым вучнем. Крыўда не толькі для яго, але і для бацькі — «асабліва пры самалюбстве майго бацькі і маім, праўда, меншым, але ўсё ж дастатковым».

Адукаваў і выхаваў сябе Адам Ягоравіч сам — і толькі сам. Тут, папраўдзе, было чым ганарыцца, і Адам Ягоравіч, мусіць, ганарыўся, прынамсі, не прапускаў выпадку, каб не падкрэсліць гэта. Ганна Валасовіч-Гразнова, стрыечная сястра Максіма Багдановіча, успамінае: «Адам Ягоравіч ведаў сабе цану. Часта казаў: «Спытайся ў свайго дзядзькі (г. зн. яго), ён скажа табе ўсё»; «у бібліятэку табе не варта хадзіць, усё, што табе трэба, ты знойдзеш у свайго дзядзькі». Памятаеце словы Адама Ягоравіча пра ягоную бібліятэку, дзе «было ўсё, што было лепшага ў свеце, і нічога пошлага», словы, якія здаліся акадэміку Замоціну трохі залішнімі?

Толькі справядліва і другое: навуковым памкненням Адама Ягоравіча нельга адмовіць у пэўнай ступені энцыклапедычнасці. Паводле характару сваёй навуковай і жыццёвай зацікаўленасці ён быў, несумненна, тым, каго завуць ёмістым і высакародным словам «асветнік». Наколькі быў арыгінальны Адам Ягоравіч пры асэнсаванні таго, што ён так шчодра браў з кніг і з жыцця,— гэта ўжо іншая справа, пра гэта ня-

хай скажуць спецыялісты, толькі відочна пры ўсім тым, што цэнтры яго навуковай увагі не былі пастаянныя і што гэтай яго дзейнасці не хапала самай звычайнай мэтанакіраванасці — не ў сэнсе разумення і жадання карысці, якая магла б ажыццявіцца праз гэта, а ў сэнсе амаль непазбежнай для сур'ёзнага вучонага лакалізацыі пошуку. Адама Ягоравіча цікавілі сацыяльна-грамадскія тэорыі, педагагічныя сістэмы, літаратура і тэатр, банкаўская і горная справа, надзённая публіцыстыка і магчымасць практычнай рэвалюцыйнай работы, але толькі ў этнаграфіі і ў галінах, сумежных з ёй, ён пакінуў нешта па-навуковаму сапраўды вартае. Сапраўдным ягоным укладам у навуку была і астаецца яго праца «Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў» — «юнацкая», як кажа Адам Ягоравіч, праца.

Дарэчы, ёсць сэнс паслухаць нам і самога Адама Ягоравіча.

Тое, што ён як бы крыўдаваў на навуку, якая не апраўдала яго спадзяванняў, мы ўжо ведаем. «Абняць неабдымнае, і прытым з непрыдатнымі сродкамі» — памятаеце гэта? Пад канец жыцця Адам Ягоравіч падводзіў вынікі. Пісаў успаміны. Магчыма, як ніколі рашуча, думка яго павярнулася да роднага народа. Гэта не здагадка: можна адпаведна Адама Ягоравіча працытаваць, і калі мы не робім гэтага, дык таму толькі, каб не перагружаць наш расказ цытатамі. Былі трыццатыя гады. Беларусь упэўнена заняла той «пачэсны пасад» між народамі, пра які марылі лепшыя яе сыны, у тым ліку і Максім Багдановіч. Бурна развівалася нацыянальная культура — на роднай мове і на роднай глебе. Здавалася недарэчным, што яшчэ зусім нядаўна, у пачатку дваццатых гадоў, нават такі вучоны, як Карскі, чалавек, які паклаў столькі працы на тое, каб даказаць гістарычную і культурную адметнасць беларусаў сярод іншых славянскіх народаў, мог лічыць яшчэ праблематычным паспяховае развіццё беларускай культуры ў бліжэйшым часе і на нацыянальнай глебе.

О гэтая «аб'ектыўная» навука! Як цяжка ёй быць аб'ектыўнай і як цяжка ўтрывацца ад таго, каб не прарочыць!

Адам Ягоравіч падводзіў вынікі. Як усякі больш-менш рэалістычна настроены чалавек, ён не мог не

бачыць плёну ў той справе, да якой далучаны быў у юнацтве і ад якой так ці інакш адышоў у пазнейшыя гады. Што павінен быў адчуваць, што павінен быў думаць цяпер Адам Ягоравіч? Лічыць, што марна пражыў жыццё, што ашукаў сябе ў нечым галоўным, не заўважыўшы, як размінуўся з часам у самы адказны момант супрацьстаяння з ім? Але калі, калі быў гэты найгалоўнейшы, найшчаслівейшы момант? Можа, тады, калі ён пісаў сваю першую, «юнацкую» працу?

Так ці інакш думаў Адам Ягоравіч, сказаць пэўна цяжка, але тое, што ён балюча перажываў свае жыццёвыя падрахункі, не выклікае ніякіх сумненняў — інакш адкуль было б гэтае трагічнае для вучонага расчараванне ў самім інструменце працы — «непрыдатныя сродкі»! А можа, усё тую ж «аб'ектыўную» навуку меў на ўвазе пры гэтым Адам Ягоравіч?

Так, ён падводзіў вынікі: «Напісаў я, уласна, шмат, каля ста і нават больш друкаваных аркушаў, лічачы, што ў рукапісах. Гэта надта многа, калі мець на ўвазе, што *я ніколі не займаўся адной справай, а дзвюма-трыма паралельнымі* (падкрэслена мною.— *М. С.*), якія, як рэвалюцыйная работа, захаплялі мяне часамі амаль столькі ж, колькі служба, а тузалі нервы яшчэ больш. Напісаў я шмат, але карысці мала: усё гэта абрынулася ў Лету правінцыяльных пачасовых выданняў, дзе іх і заўзяты бібліёграф не адшукае. Адны толькі «Перажыткі...» ды тое, што надрукавана ў зборніках Акадэміі навук, могуць мець дзейснае значэнне».

Як бачыце, амаль тое ж, што гаворым мы цяпер пра навуковую дзейнасць Адама Ягоравіча.

Ён бачыць дзейсны сэнс сваёй працы ў захаванні для новых пакаленняў часцінкі тых народных скарбаў, якія, можа, не здагадваючыся пра іх сапраўдную каштоўнасць, перадала ўнуку вясковая беларуская кабета — бабка Рузаля. «Ужо яе праўнук Максім, які пераняў нешта ад яе духу, паспеў у свой кароткі век пакарыстацца тым-сім з гэтай скарбонкі, аздобіць яго ў вершаваныя формы. І з бабуліных казак ён упершыню пазнаёміўся з беларускай гаворкай.

Значыць [маё] сядзенне на грубцы не прайшло дарэмна, і баба Рузаля прайшла праз сваё доўгае і цяжкае жыццё з вялізнай ношкай даўніны за плячыма недарэмна...

Што і трэба было даказаць!..»

«Што і трэба было даказаць»,— дададзім і мы ад сябе і пакінем пакуль Адама Ягоравіча на слове ўдзячнасці чалавеку, якому некалі, у дзяцінстве, пашчасціла грэцца ля свяшчэннага агню продкаў і які сэрцам адчуў, зразумеў, што трэба захаваць для нашчадкаў, пераказаць шчаслівыя тыя хвіліны, падараныя тады яму. Так ён, свядома ці несвядома верны памяці сэрца, і зрабіў у юнацтве. Цяпло таго агню перадалося ягонаму сыну. Гэта быў той агонь, пры ясных водблісках якога Максім Багдановіч разгледзеў сваю будучыню.

ГІСТОРЫЯ ФРАНЦУЗА ШАМІСО

Загадка ёсць у лёсе амаль кожнага мастака. Гэта загадка ракі: яна нараджаецца недзе ў вытоках, трымціць і мроіцца там, і толькі мора, у якое ўпадае рака, цалкам разгадвае яе. Мора — гэта час, жыццё народа і літаратуры, да якіх прылучаецца мастак. У асобе, у адзінкавым лёсе — загадка, у жыцці народа і літаратуры — вырашэнне яе.

Цікавую гісторыю француза Шамісо расказаў некалі Томас Ман. Паслухаем яго. У дзяцінстве, гаворыць ён, яму пашчасціла вучыцца па падручніку, які так не падобны быў на розныя «Правілы» і «Элементы» і вылучаўся сваёй чалавечнасцю і даступнасцю зместу. Падручнік быў, як гэта ні дзіўна, проста цікавы. Называўся ён «Кнігай для чытання па нямецкай мове». Там і сапраўды, мусіць, было ўсё дарэшты нямецкае, калі дзеці, звычайна такія ўражлівыя на фальш, эмацыянальныя па складу свайго ўспрыняцця, не заўважалі ў тых гісторыях, песеньках і баладах, з якіх складалася кніжка, нічога наўмыснага, чужароднага. Толькі пазней Томас Ман даведаўся, што аўтарам чытанкі быў вядомы нямецкі паэт і празаік, стваральнік славутай «Дзіўнай гісторыі Пецера Шлеміля», чалавека, які страціў уласны свой цень. І што ў самога аўтара была не менш дзіўная гісторыя: па нараджэнню і выхаванню ён быў француз, а стаў нямецкім пісьменнікам і настолькі немцам, як мала хто з немцаў. Пазбавіўшыся аднаго ценю, ён набыў другі.

Сапраўды, ці не дзіўнае, ці не фенаменальнае такое пераўвасабленне, ці магчыма такое наогул, бо і нацыянальная псіхалогія, і склад мыслення, і пачуццё мовы — гэта тое, што даецца як бы ад нараджэння, як бы з малаком маткі. «Паветра, вада і хлеб Францыі ўзрасцілі яго цела, рытмам французскай гаворкі былі прасякнуты ўсе яго пачуцці і памкненні, пакуль ён не ператварыўся ў падлетка. І толькі тады, у чатырнаццацігадовым узросце, прыехаў ён да нас». І, значыцца, новае асяроддзе, новая моўная стыхія цалкам выцеснілі з яго свядомасці, з яго душы ўсё, што даецца чалавеку адзін раз і як бы назаўсёды? Не, усё, мусіць, было не так проста. Томас Ман піша, што Шаміссо доўга не адважваўся лічыць сябе нямецкім паэтам, доўга вагаўся паверыць у сябе як нямецкага паэта. Нават у сорак пяць год ён не лічыў сябе ім. «Ён так ніколі і не навучыўся шпарка гаварыць на нашай мове. Ён лічыў па-французску. Расказваюць, што да апошніх дзён свайго жыцця ён выказваў самому сабе ўслых на французскай мове свае задумы, перш чым яны вылілiся ў вершы, і, аднак, тое, што выходзіла з-пад яго-нага пяра, было класічнай нямецкай паэзіяй». «Гэта дзіўна,— зазначае далей Томас Ман,— не, гэта нават недаступна разуменню». І Томас Ман не імкнецца якім-небудзь пэўным чынам вытлумачыць гэты феномен. Ён нават схільны думаць, што Шаміссо меў права лічыць, што, каб была на тое воля лёсу, ён гэтак жа знайшоў бы прыстанішча ў любой іншай краіне, як знайшоў яго ў Германіі. Бо ці не сам жа, маўляў, Шаміссо выказваўся наконт таго, што ён вынайшаў у сабе здольнасць «усюды аднолькава адчуваць сябе як дома». Тут як бы нейкая універсальная духоўная субстанцыя, якая набывае рэальнасць праз пэўнае асяроддзе, а якое — не так і важна.

Не так і важна, мусіць, было вытлумачваць феномен Шаміссо і самому Томасу Ману. Гэта зразумела. Шаміссо належаў нацыям, якія былі прыблізна на аднолькавай ступені гістарычнага, культурнага і грамадскага развіцця. І Францыя, і Германія маглі мець патрэбу ў Шаміссо ў аднолькавай ступені. І калі ён стаў нямецкім паэтам, дык тут сапраўды, мусіць, толькі воля лёсу. Томас Ман не мог, ды і не меў патрэбы надаваць гісторыі Шаміссо ні сацыяльнага, ні нацыянальнага значэння. Яго цікавіў феномен сам па сабе.

Нам гісторыя Шамісо трэба для другога.

Ёсць многа прыкладаў, калі асоба, узрошчаная духам аднаго народа, яго побытам, паветрам яго зямлі, яго песнямі, прылучаецца да духоўнага жыцця іншага народа і часам займае ў ім адно з самых выдатных месц. Ёсць прыклады, якія патрабуюць не проста разгляду іх як фенаменальных, а якія могуць быць і часта даволі лёгка вытлумачваюцца прычынамі менавіта нацыянальнага і сацыяльнага парадку.

Так было з Адамам Міцкевічам, так было шмат з кім.

Фальклор, прырода, побыт і звычаі народа, сярод якога рос, выспелілі паэтычны геній Адама Міцкевіча, далі яму матэрыял для творчасці. Беларусы далі яму песні і казкі, але, на жаль, не маглі даць распрацаванай у пэўным сэнсе літаратурнай мовы. Яны далі яму радзіму, аднак не маглі даць таго, што аздабляе яе — тую нацыянальную, палітычную і эканамічную незалежнасць, што дазваляе генію адчуваць сябе часткай вялікага цэлага і надае сілы працаваць для ўзвелічэння свайго народа, адначасова ўзбагачаючыся і падымаючыся разам з ім. Вось чаму мы, падзяляючы славу Міцкевіча разам з палякамі, вышэйшае права на яе аддаём усё ж ім.

Ён трошкі «мужыцкі», Адам Міцкевіч, побач з другім, падкрэслена цалкам польскім, «шляхетным» праяўленнем нацыянальнага генія — Юліушам Славацкім. У яго заўсёды будзе многа ад той зямлі, на якой ён гадаваўся і рос, той зямлі, гісторыя якой натхніла яго на стварэнне «Гражыны» і «Конрада Валенрода», «Пана Тадэвуша», у значнай ступені «Дзядаў». «Litwo, ojczizno moja!»,— з замілаваннем прызнаецца ён, пачынаючы адзін з самых задушэўных сваіх твораў — «Пана Тадэвуша». «Мой родны кут, як ты мне мілы» — па-нашаму, па-беларуску загучыць у Коласа, у новы час і ў новых умовах, вяшчуючы наступленне жаданай для беларускага слова пары, абзываючыся жыватворным уплывам вялікага Міцкевіча. Так Міцкевіч-Колас пачынае сваю «Новую зямлю» — рэч, як і «Пан Тадэвуш», эпічную, але не ў даўніну звернута яна, а ў будучыню: яна будзе расці разам з ростам нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай літаратуры, той літаратуры, дзе поплеч з Коласам стаяць велічныя постаці Купалы і Багдановіча.

Гісторыя як бы ўзнагароджвае нас за мінулыя страты.

Час вяртае Радзіме яе сыноў.

Ні на кім не адбілася прадвызначэнне часу так, як на лёсе Багдановіча.

КРАІНА-БРАНАЧКА

Адам Ягоравіч пакінуў Беларусь у год смерці жонкі. Максіму Багдановічу было тады пяць год. З гэтага часу ён выхоўваецца, вучыцца, сталее па-за Беларуссю. Пяцігадовы ўзрост — магчыма, самы ўражлівы ўзрост, аднак у сэнсе ўласна беларускіх уражанняў наўрад ці даў ён што-небудзь істотнае Багдановічу. Асяроддзе інтэлігенцыі, няхай нават і дэмакратычнай, народнай, у якой ён выхоўваўся ў Мінску і Гродна, трэба думаць, не надта шанавала нацыянальны элемент у выхаванні і побыце. Інтэлігенцыя і дома і на людзях гаварыла па-руску. Сям'я Адама Ягоравіча тут таксама не выключэнне. Бо нездарма ж сам ён піша, што «на няўдзячнай ніве пісання вершаў па-беларуску» ў Мінску спрабаваў свае сілы хіба адзін толькі Янка Лучына (Неслухоўскі). Кропля ў моры! На гэта амаль ніхто не звяртаў сур'ёзнай увагі. У тым ліку і сам Адам Ягоравіч. Ён быў заняты іншым. «Беларусіка» (ягоны тэрмін) магла цікавіць хіба што з этнаграфічнага боку. Нават куды пазней, у год першай паездкі сына на радзіму (1911), куды той прыехаў ужо вядомым беларускім паэтам, Адам Ягоравіч схільны лічыць «карціну беларускага адраджэння даволі бязрадаснай», але, праўда, тут жа дадае, што «не рабіў спробы расхалоджваць яго (г. зн. сынавага.— *М. С.*) парыву». Што ж, і на гэтым дзякуй.

Самым моцным «беларускім» уражаннем Максіма Багдановіча была смерць маці. Калі ўсёй меры трагедыі ён не мог разумець, дык перажываць яе ён мог несумненна. Нездарма ж у яго была матчына, а гэта значыць, надта ўражлівая натура. Так сведчыць сам бацька. Гэта засталося на ўсё жыццё. Рана пазбаўлены матчынай ласкі, ён усё жыццё сумаваў па ёй. Здагадацца пра тое мы можам і па ягонай творчасці: найвышэйшы ідэал жанчыны для яго — мадонна, маці. Трапяткая і пяшчотная, ласкава-трывожлівая ў сваёй мацярынскай любві.

Смерць маці пазбавіла яго радзімы, любоў да памяці маці, любоў да радзімы, якую так часта і справядліва звязваюць з іменем маці, вярнула яго на зямлю продкаў.

Калі і як навучыўся ён беларускай мове, калі ў ягонай свядомасці, сэрцы паўстаў, разрастаючыся і падпарадкоўваючы сабе ўсё, вобраз «краіны-браначкі», вобраз Беларусі? Бацька сведчыць: пісаць вершы па-беларуску пачаў ён рана, у дзесяцігадовым-адзінаццацігадовым узросце. Што падтрымлівала, што жывіла яго ў гэтых памкненнях, хто быў той чалавек, што стаўся добрым геніем такога ранняга парыву таленавітага хлапчука? Бацька? Што бацька нейкім чынам уплываў на абуджэнне ў сына цікавасці да радзімы і роднага слова — гэта справядліва і гэтага нельга адмаўляць. Уплываў хаця б праз тое, што сын мог карыстацца ягонымі этнаграфічнымі працамі і тымі фальклорнымі запісамі, што былі ў ягоным архіве. Але, з другога боку, ці не перабольшваем мы часта ўплыву бацькі? Мы звыкліся з гэтым уплывам, канстатацыя яго стала агульным месцам. Але давайце спакойна паспрабуем паразважаць. Пра першыя вершаваныя спробы Багдановіча мы ведаем са слоў таго ж бацькі: ён памятае, што сын паказваў іх сваёй хроснай Вользе Сёмавай у яе прыезд у Ніжні Ноўгарад. Нам трэба запомніць яе імя. Нам не пашкодзіла б звярнуць увагу і на тое, што вершы сын упершыню паказвае не бацьку, што было б натуральна, а хроснай, якая нават не жыве ў адным з ім горадзе і пра магчымую рэакцыю якой на вершы (беларускія вершы!) ён мог толькі здагадвацца. Скажуць: ён мог паказваць вершы бацьку раней. Дапусцім. Але тады якая патрэба была б бацьку пісаць, што ён запомніў пра першыя спробы сына ў сувязі з тым, што той паказваў іх некаму — у дадзеным выпадку сваёй хроснай. Навошта Адам Ягоравіч стаў бы сказаць ісціну з яўнай невыгодаю для сябе? І наогул: ці не паслухаць нам лепш самога яго? Бацька піша: «Яго (г. зн., сынавы.— *М. С.*) заняткі беларусікай ішлі абсалютна непрыкметна для мяне і акружаючых: прынамсі, не я падштурхнуў яго на гэту дарогу, але, вядома, і не перашкаджаў». Дакладней дакладнага напісана — пра які ж нейкі асаблівы ўплыў можам мы пасля гэтага гаварыць? «Не перашкаджаць» — было прынцыпам Ада-

ма Ягоравіча ў выхаванні дзяцей. «Я не перашкаджаў сваім дзецям быць, кім яны хочуць, але, па сутнасці, ніколі не быў задаволены тым, чым яны ёсць». Адам Ягоравіч кажа, што бацька дрэнны суддзя сваім дзецям. Не надта хочацца і нам быць суддзёю яму самому, толькі нешта вельмі ўжо супярэчлівай, пры ўсёй сваёй закругленасці, выдае ягоная формула. «Не перашкаджаць і не быць задаволеным». Не перашкаджаць — што гэта значыць? Не браць удзелу, не быць зацікаўленым, дазволіць чалавеку выхоўваць самому сябе. Але навошта тады быць незадаволеным? Якое можна мець на гэта права?

Што наша здзіўленне небеспадстаўнае, пераконваюць успаміны Ганны Валасовіч-Гразновай, на якія мы раней спасылаліся ўжо. І яе не задавальняе калі не сам дзядзькаў прынцып выхавання, дык вынік яго. Прынамсі, у дачыненні да Максіма Багдановіча. Яна піша: «Мне думаецца, што ў той час і Адам Ягоравіч належным чынам не цаніў таленту і значэння Максіма. Інакш, не зважаючы ні на што, ён павінен быў памагчы Максіму паехаць вучыцца ў Пецярбург, дзе пад кіраўніцтвам прафесара Шахматава ён прысвяціў бы сябе любай справе, вывучэнню мовы, этнаграфіі і гісторыі Беларусі. Максім да гэтага імкнуўся ўсёю душою, а яму прыйшлося пяць год траціць на вывучэнне юрыдычных навук, да якіх не гарнулася яго душа. Так яму прыйшлося ахвяраваць сваім прызваннем дзеля брата, бо Адам Ягоравіч лічыў, што Лёву неабходна вучыцца ў Маскоўскім універсітэце — ён жа мае такія матэматычныя здольнасці (у 1911 годзе Лёву было толькі 17 год)... Так Адам Ягоравіч не выканаў свайго дэвізу: «Я не перашкаджаў сваім дзецям быць, кім яны хочуць».

Не будзем перабольшваць, але мусім сказаць, што з тых, хто акружаў Максіма ў ніжненаўгародскі, а пасля і яраслаўскі перыяд жыцця, мала хто разумеў яго памкненні, у лепшым выпадку глядзелі на іх як на дзівацтва. На берагах Волгі, за тысячу, калі не болей, кіламетраў ад Паўночна-Заходняга краю марыць пра нейкую там «самастойную» Беларусь? Сапраўды, хіба не дзівацтва? Горай за ўсё было тое, што не разумелі ў родным, сямейным асяроддзі. Бацька не разумеў і «не перашкаджаў». Праўда, хросная Вольга Епіфанаўна, тая, якой Максім паказваў свае першыя вершы па-

беларуску, хоць і не разумела, не спачувала ў галоўным, але, добрая душа, не адмовіла хросніку ў просьбе выпісаць для яго спачатку «Нашу долю», а потым і «Нашу ніву».

Як мала яшчэ мы вадем людзей, побач з якімі жыў Максім Багдановіч! Хто такая гэта Вольга Сёмава? Якім чынам звязана была яна з сям'ёй Багдановічаў? Які яе далейшы лёс? Багдановіч пісаў да яе. Дзе іх перапіска? А ведаць пра гэта нам трэба было б хаця б таму, што Сёмава, можа, і не разумеючы ўсёй аграмаднасці сваёй паслугі, зрабіла сапраўды паслугу таму Багдановічу, якім цяпер ганарыцца цэлы народ,— і праз гэта так невыказна дарагі нам па-чалавечы высакародны жэст жанчыны, якая так хораша спраўджвала сваё званне «хроснай».

Па-рознаму, значыцца, можна «не перашкаджаць»!

Ну а тыя, хто ўсё ж перашкаджаў? Не па прыроднай схільнасці зласлівага розуму ці душы, а, так сказаць, на прынцыповай, ідэйнай аснове. Трэба думаць, і такія былі, і не ў адзінкавай колькасці. «Забіць трывогу аб тэй мове, якой азваўся беларус» — ахвотнікаў заўсёды многа было. Глядзелі і выносілі прысуд з высокіх, «дзяржаўных» пазіцый. Навошта гэтыя мясцовыя тэндэнцыі, навошта заводзіць сваркі ў доме? У доме павінен быць адзін гаспадар, адзін бацька. І дзеці павінны слухацца бацьку. Ну, а славянская, святая славянская ідэя? Што ж, і яе вы хочаце падраць на пярэстыя шматкі, імі вы хочаце перавязваць свае «мясцовыя» раны? Не, у ідэі павінен быць адзін штандар.

Так ці прыблізна так маглі думаць у асяроддзі, дзе жыў Багдановіч.

Адзін з «ідэйных» — брат Анюты Гапановіч, стрыечнай Максімавай сястры, той Анюты, у якую быў закаханы паэт, Пётр Гапановіч. Сваяк і як быццам друг. І прынцыповы, так сказаць, праціўнік. Яны спрачаліся. Па нацыянальным пытанні. Гапановіч — «разважлівы, халаднаваты», «непараўнальна валодаў сілагізмам». «І Максім — гарачы, страсны, амаль апантаны». Яны спрачаліся. «Волна и камень», «лёд и пламень» усё ж надта розняцца між сабой. Гапановіч лічыць нацыянальную, «мясцовую» ідэю фікцыяй, выдумкай гарачых галоў, якія прымаюць мару за рэаль-

насць. Дзе факты? Немалая колькасць бясплатных карэспандэнтаў «Нашай нівы»? Гульня! На адным энтузіязме далёка не паедзеш. Трэба хаця б такі-сякі, не кажучы пра іншае, фінансавы грунт. Бясплатныя карэспандэнты! Дык гэта ж ад беднасці. Філантропія, адна філантропія. Правінцыяльная філантропія.

Спрачаліся — можа, так, а можа, і не так. Несумненна адно: Максім для Гапановіча — ідэаліст. Ідэя ягоная нічога не вартая. Не прадмет спрэчкі захапляе Гапановіча, а магчымасць адточваць свае сілагізмы. Няхай цешыцца, няхай, урэшце, верыць. Справа яго. На іншае ён не здатны. Не задурыў бы толькі Анюце галаву. Яна, здаецца, разважлівая дзяўчына, але ж... Такога кавалера, як Максім, ён, «разважлівы, халаднаваты», сястры, вядома, не жадаў. Ён па-сапраўднаму ўстрывожаны, гэты «логік», калі дазнаецца пра намер Максіма прыехаць з Яраслаўля ў Ніжні. Перад Багдановічам тым часам востра паўстала праблема ўладкавання жыцця пасля сканчэння ліцэя. Куды падацца? Што рабіць? Ехаць у Мінск? Але ідзе наступленне немцаў, і яшчэ не вядома, чым яно скончыцца. Ёсць пагроза акупацыі. А потым — Анюта. Трэба было б неяк праясніць адносіны.

Гэтых адносін Пётр Гапановіч баіцца больш за ўсё. Не, ён раскрые вочы на тое, хто гэты Багдановіч. І ён піша. Ён выдае Багдановічу характарыстыку, лепш ад якой наўрад ці мог бы, на наш сённяшні погляд, хто-небудзь даць. Ён упэўнены, што сястра, да якой ён піша (не Анюта, а другая сястра — Вера Іванаўна), зразумее ўсё як трэба і зробіць усё належнае, каб перашкодзіць адносінам паміж Багдановічам і Анютай. Гапановіч піша: «Заўзятыя адносіны да «самасційнай» Беларусі дарэшты паглыналі ўсе яго турботы і ўсю ўвагу. Ён замыкаўся ў сваім пакоі, паглыбляўся ў гэтыя пытанні і ў такой шчыльнай двайной абалонцы, ізаляваны ад жыцця, правёў усе апошнія гады.

Так абмалёўваецца яго цяперашняе становішча, і адсюль ідзе яго рашэнне кінуць дом свайго бацькі і Аляксандры Афанасьеўны і набаку пачаць новае жыццё».

Гэта напісана ў 1915 годзе. Багдановіч ужо аўтар «Вянка». Вянок славы, будучай вялікай славы ляжыць ужо на яго галаве, але «логік» Гапановіч не бачыць

гэтага. Вецер часу шуміць у лаўровым лісці гэтага вянка, але «сілагістык» Гапановіч не чуе гэтага, ён мармыча нешта пра «двайную абалонку», пра ізаляцыю ад жыцця. О чалавечы практыцызм, о цвярозы рэалізм мяшчанства, колькі разоў ты браўся выносіць прысуд генію і колькі разоў выносіў прысуд сабе самому!

Жыццё... Ізаляцыя ад жыцця. Мешчанін разумее толькі «жыццё», але ніколі не спасцігае ягонай меры — часу. «Ізаляваны ад жыцця» Багдановіч насіў у сабе жыццё ў яго найвышэйшым і найшырэйшым вымярэнні. У маленькім пакойчыку таго, каго празвалі Максімам Кніжнікам, жыў сам час. Там, у цесным пакойчыку, месцілася ўся Беларусь. Далёкая і блізкая Беларусь, «краіна-бранчачка». Бацька кажа: выбарам жыццёвага шляху, выбарам мэты сын абавязаны «непераадольнай цязе, роднай стыхіі, інтуіцыі, што далася ад продкаў». Магчыма, і так. Але ці можна растлумачыць усё толькі гэтым? Сам жа Адам Ягоравіч стаяў яшчэ бліжэй да продкаў, чым сын. І бліжэй да скарбаў «бабкі Рузалі». «Астатняе зрабіла цвёрдая воля і ўпартасць у працы». Ну добра. Дадзім яшчэ і талент, пра які чамусьці забыўся Адам Ягоравіч. Мы растлумачым сабе Багдановіча — надзвычай патрабавальнага паэта-майстра, але як растлумачыць нараджэнне ў Багдановічу менавіта беларускага паэта? Адам Ягоравіч меў і талент, і інтуіцыю, што далася ад продкаў, і зайздросную настойлівасць у працы, і цвёрдую волю, аднак не стаў фігурай такога маштабу, як сын, хоць і намнога пераажыў яго. Не, мусіць, і «кліч продкаў», і талент, і воля маюць значэнне тады, калі іх прыводзіць у рух якая-небудзь вялікая, па-грамадску значная ідэя. Для Багдановіча такой ідэяй была ідэя нацыянальнага і сацыяльнага разняволення роднага народа. А падказаў яе Багдановічу час.

Слухайце час! — гаворыць нам сваім прыкладам Багдановіч. Запомнім гэта.

АРЫГІНАЛ І КОПІЯ...

І як няпроста было Багдановічу стаць беларускім паэтам! Пачаць хаця б з таго, што сваёй мове ён павінен быў вучыцца, як чужой: напачатку ён проста не

ведаў яе! І, што самае прыкрае для пісьменніка не ведаў яе жывых гаворак. Не ведаў ён, вядома, не па сваёй віне. Проста так складвалася ягонае жыццё. Усё, бы знарок, было супраць таго, каб ён адчуў сябе беларусам. Упершыню на радзіму ён прыязджае ў дваццаць год. Дваццаць год — гэта многа толькі для Багдановіча, бо ён ужо вядомы беларускі паэт. Але вось якая парадаксальная і адначасова зварушлівая рыса: беларускі паэт амаль не ўмее гаварыць па-беларуску! Нібы іншаземец, ён просіць кожнага, з кім размаўляе, папраўляць яго гаворку.

І ў той жа час ён заклапочаны беларускімі праблемамі, як мала хто з «цэнтрыстаў», людзей, якія займаліся грамадскай ці літаратурнай дзейнасцю непасрэдна «на месцах». Адзін з тых, хто сустракаўся з Багдановічам у яго першы прыезд на Беларусь, піша: «М. Багдановіч прыехаў у Вільню ўжо як актыўны і свядомы працаўнік беларускага адраджэння, глыбей сягаючы думкай у будучыню нашага народа, чым мы, працаўнікі, згрупаваныя ў цэнтры». Знамянальнае прызнанне! Менавіта прызнанне, а не паблажлівы камплімент: які сэнс «цэнтрысту», параўноўваючы заслугі цэлай групы людзей, да якой належыць ён і сам, з заслугамі аднаго чалавека, ды яшчэ ў пэўнай ступені «чужака», аддаваць перавагу апошняму? Але «чужак» быў бескарыслівы — вось што хінула да яго людзей, вось што дазваляла належным чынам ацаніць і яго талент, і яго памкненні. І потым: сам факт з'яўлення Багдановіча — ці не быў ён яшчэ адным, можа, самым сур'ёзным пацверджаннем важнасці і жыццёвасці той справы, якой аддавалі ўсе свае сілы лепшыя з беларускіх інтэлігентаў?

Вялікае відно на адлегласці, і Багдановіч сваім прыкладам бліскуча пацвердзіў гэта. Усё яго жыццё — гэта подзвіг. Напорлівае і роўнае гарэнне адной страсці. І кароткатэрміновае. Вось чаму яго жыццё нагадвае нам успышку метэора. Вось чаму мы часта і гаворым пра яго менавіта так. Можа, гэта нават лепш, чым гаварыць «подзвіг», «ахвяра», «самаадданасць». «У творчасці яго раптоўнага няма». Багдановіч як бы не ведае высільвання. Тое, што мы завём подзвігам,— для яго натуральная манера мысліць і жыць. І, вядома, тварыць. Паняцце подзвігу ўключае ў сабе нешта такое, што, аддаючы належнае чалавеку, тым часам і як бы

прыніжае, як бы робіць звышнатуральнай для яго самога ягоную дзейнасць. Подзвіг?

Багдановіч не адчувае ўсяго гэтага.

Вывучаць сваю родную мову — што ж тут звышнатуральнага? Вывучаць толькі па слоўніках, па фальклорных запісах, з дапамогай параўнальных граматык славянскіх моў? Але хто ж вінаваты ў гэтым? Ён не нарадзіўся ў беларускай вёсцы, не жыў у ёй, не чуў, як гавораць сяляне — каго ж вінаваціць за гэта? Ён не ведае, дзе трэба паставіць націск у тым ці іншым слове. Ён наогул не ўпэўнены, ці па-беларуску ў яго гучыць вось гэтае слова. Яму сорамна, але які ж тут подзвіг? Яму кажуць, што ў ягонай беларускай мове многа русізмаў. Яму кажуць, што ў ягонай рускай мове многа беларусізмаў. Ён пагаджаецца і з тым, і з другім і ў змрочныя хвіліны, мабыць, кажа сабе, што ўзяўся не за сваю справу.

Не, не трэба гучных слоў. Зразумеем лепш, што Багдановічу было цяжка.

У ягонай беларускай мове сапраўды было, асабліва ў пачатковым перыядзе творчасці, багата русізмаў. Суб'ектыўныя прычыны тут зразумелыя, але не забудзьцеся разам з тым, што беларуская літаратурная мова тады толькі фарміравалася і яшчэ не мела трывала замацаваных ні лексічных, ні стылістычных, ні граматычных норм. Багдановічу ў сваёй творчасці даводзілася пераадольваць як бы падвойныя цяжкасці. Беларусізмы ў ягонай рускай мове? Для яго гэта павінна было гучаць як ухвала.

Ён, які амаль усё свядомае жыццё пражыў у рускім асяроддзі, і пісаў і думаў па-беларуску. Ён пісаў і па-руску, і па-ўкраінску, але мастаком ён быў толькі на роднай беларускай мове. Гэта — ісціна, якую няцяжка даказаць. Справа аблягчаецца тым, што мы маем пераклады вершаў Багдановіча на рускую мову, зробленыя ім самім.

У 1913 годзе ў Яраслаўль, дзе вучыўся ў юрыдычным ліцэі паэт, прыехала з Ніжняга Ноўгарада Анюта Гапановіч. Сустрэчы гэтай Багдановіч быў рады. Настолькі рады, што падарыў Анюце рукапісны зборнічак сваіх вершаў, пераклаўшы іх на рускую мову. Сшытачак гэты, перадрукаваны ў першым акадэмічным выданні твораў паэта, доўгі час лічыўся страчаным. І толькі нядаўна ён адшуканы намаганнямі старшага

бібліёграфа Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна Н. Б. Ватацы, энтузіязму і настойлівасці якой мы і дагэтуль былі ўжо абавязаны шмат якімі новымі матэрыяламі і дакументамі, што характарызуюць жыццё і творчасць паэта. У зборнічку, названым Багдановічам «Зеленя», змешчана дваццаць два вершы. І тое, што зборнічак мае назву, і тое, што яму надасланы хоць і трошкі гарэзлівы, але выразна выбачальны эпіграф («Переводы стихотворений — словно женщины: если красивы, то неверны; если верны, то некрасивы»), сведчыць, што паэт надаваў сваім перакладам даволі істотнае значэнне. Ды і як інакш: Анюце Гапановіч, да якой быў неабыякавы Багдановіч, належала, можа, упершыню пазнаёміцца па гэтай кніжачцы са стрыечным братам-паэтам. Няхай нават Багдановіч і не надта пакладаўся на густ сваёй сястры, але ж аўтарскае самалюбства ў яго было, і, пэўна, немалое! (Якое гэта хвалюючае, амаль невытлумачальнае адчуванне — быць як бы запозненым сведкам таго, што не прызначалася ні табе, ні каму другому, што не цярпела чужога, староннягa вока. Так вось глядзіш на гэты сшытачак, зроблены з гладкай, лінованай (сіняя лінейка!) паперы, на роўны, акуратны, прыгожы паэтаў почырк. І як бы на тое, каб азначылася ўсё да канца, каб сышлося ўсё разам,— пад рукамі вось першы том збору паэтавых твораў, і на тытульным лісце яго Адамам Ягоравічам напісана: «Нюте на память о брате-поэте. А. Богданович. 11/4—28 г.». «Старэчы, дрыготкі почырк. Напісана алоўкам).

Першы ў зборнічку ідзе верш «Сонет», той, да якога эпіграфам пушкінскае: «Суровый Дант не презирал сонета». Паралельнага беларускага варыянта да яго няма, калі не лічыць апошнія шэсць радкоў, дзе параўноўваецца працэс і сутнасць творчасці з метэорам, што крэсліць начное неба вогненнаю дугой, «а ў глыбіні халодным астаецца». Маем мы тут справу з перакладам самастойнага верша, які не дайшоў да нас, ці рускую адвольную варыяцыю на тэму беларускага верша? Нам думаецца, усё ж з перакладам,— і вось чаму. У беларускім тэксце «Санета» цалкам выпалі першая частка верша, яго прадвыснова, тэза, у якой сцвярджаецца свядомы пачатак у творчасці:

Поэт всегда обдуманно творит.
В тот миг, когда вал чувства грудь вздымает,

С мерилом ум холодный выступает:
Он взвесит все, проверит, расчленит.

У беларускім тэксце «Санета» — гаворка пра іншае:

Прынадна ззяюць вочы да мяне;
Чароўна усміхаючыся, губы
Адкрылі буйныя бялеючыя зубы...
Ласкавы шэпт... Гарачай хваляй мкне
Кроў к сэрцу маяму. Мана ўсё або не?
Ці верыць мілым абяцанкам любы?
Мо гэта жар, пылаючы для згубы,
Хавае сцюжу пад сабой на дне?

І далей — вядомае параўнанне з метэорам. Здавалася б, нягледзячы на супадзенне канцовак, два розныя вершы. Па сутнасці, такімі яны і з'яўляюцца цяпер. Але, разам з тым, больш чым верагодна, што ў той час, калі Багдановіч рабіў пераклад, існаваў аўтэнтычны тэкст беларускага верша. Звернем увагу на наступнае. У той час, калі напісаны два варыянты «Санета» (рускі і беларускі), у 1913 годзе, Багдановіч піша вершаваны «Ліст...», адрасаваны аднаму з супрацоўнікаў «Нашай нівы», у якім выкладае свае погляды на мастацтва. Гэта той славуты верш, дзе паэт рашуча становіцца на абарону Сальеры, спрачаючыся з Пушкіным, у якога, на думку Багдановіча, «Сальеры атрымаў несправядлівы суд». Паэт горача, палемічна сцвярджае правы творцы на «спакойную думу», яму здаецца несумненным, што ў працэсе творчасці раўнапраўна ўдзельнічаюць не толькі сэрца, пачуццё, але і розум. Адным словам, гаворка пра тое ж, што і ў рускім варыянце «Санета». Памятаеце? «Паэт всегда обдуманно творит». Што ж магло здарыцца? Проста трэба дапусціць, што вершаваны «Ліст...» напісаны пасля беларускага і рускага варыянтаў «Санета». Думка, выказаная ў рускім «Санеце», уяўляецца Багдановічу настолькі важнай, што ён спакушаецца выказаць яе яшчэ раз, абраўшы для яе доказу форму ліста (вельмі добра прыдумана) і стараючыся разгарнуць яе і наглядна (тэма Моцарта і Сальеры, трактоўка яе Пушкіным), і дастаткова шырока. Багдановіч дасягнуў гэтага. Трэба думаць, ён і сам быў задаволены зробленым. Натуральна дапусціць таму, што ён, не жадаючы цалкам ахвяраваць першапачатковым накідам гэтай думкі (беларускі тэкст «Санета»), выкасаваў у ім тое, што ўвайшло ў «Ліст...», а да астатняга датасаваў новую прадвыснову. А рускі тэкст «Санета», гэты пераклад першапачаткова-

га верша, захаваў ход і ўзбагачэнне паэтавай думкі, даў магчымасць зазірнуць у ягоную майстэрню. Зазначым, што пастаянная ўвага да якой-небудзь адной думкі, варыяцыі яе, імкненне да гранічнай выразнасці і нагляднасці пры вырашэнні задумы, паўторнае скарыстанне якога-небудзь аднаго вобраза — характэрныя наогул для Багдановіча. Тут, дарэчы, ёсць нешта такое, што родніць яго з Лермантавым, паэтам, які, як і Багдановіч, надзелены выключнай інтэнсіўнасцю духоўнага жыцця, нават раннія праяўленні якога здзіўляюць сваёй глыбінёй. Не кажам ужо аб падабенстве жыццёвых лёсаў, якія рана абарвала смерць.

Але мы трохі адхіліліся ад галоўнай думкі. Наша задача — параўнаць арыгіналы паэтавых вершаў з іх перакладамі, і параўнаць на карысць першых. Перакладчык, як вядома, сам Багдановіч. І не проста звычайны перакладчык, але і аўтар, гаспадар і, значыцца, больш, чым звычайны перакладчык, творца. Акцэнтаваць гэта важна, бо мы хочам выявіць здольнасці Багдановіча-мастака ў рускай мове.

Возьмем для пачатку верш «Трыялет». У арыгінале ён гучыць так:

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.
Няхай усе з мяне рагочуць,
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.

Той жа верш па-руску:

На солнце загляделся я.
И солнце очи ослепило.
Затем, что сердце свет любило,
На солнце загляделся я,
На ощупь я пошел, но была
Не в стыд мне слепота моя:
На солнце загляделся я,
И солнце очи ослепило.

Гаворачы, што мы імкнёмся вызначыць здольнасці Багдановіча-мастака, выяўленыя ў рускай мове, мы гэтым як бы ўмовіліся, што нас у першую чаргу будзе цікавіць не тое, у якой ступені перакладчык захаваў асаблівасці арыгінала, а тое, што вышэй у мастацкіх адносінах — арыгінал ці пераклад (пры гэтым дапускаецца, што пераклад можа мець самастойнае значэнне і

нават вылучацца мастацкімі якасцямі, вышэйшымі, чым у арыгінала). Паспрабуем жа зрабіць выбар у карысць аднаго з тэкстаў. Наогул наш выбар, скажам адразу, прадвырашаны, таму пастараемся пераканаць у ім чытача.

Першае, што адрознівае беларускі верш ад рускага — гэта інтанацыя. «На солнце загляделся я» і «Калісь глядзеў на сонца я» — тут ёсць розніца. Не проста фармальнае несупадзенне ў часе, а істотная розніца. Чалавек канстатуе, гаворыць пра тое, што з ім адбываецца, і чалавек зноў, нанава перажывае тое, што з ім адбылося: лёгкая нота шкадавання гучыць у голасе («Калісь глядзеў» — г. зн. тады, калі меў зрок), нота шкадавання, не зважаючы на тое, што ёсць усё-ткі суцяшэнне — усё ж сонца, вялікае сонца, боскае сонца, крыніца жыцця «асляпіла вочы». Няхай смяюцца людзі: дурныя, яны не ведаюць, што ён быў далучаны да вялікага, хоць і пацярпеў ад яго. Адным словам, зірні на Неапаль, а пасля памірай. Чалавечнасць перажывання, складаная гама пачуцця — вось што адрознівае першы верш ад другога. Гэтая чалавечнасць і пэўнасць інтанацыі ствараецца ўсім рытмічным і вобразным ладам твора, раздумным па інтанацыі і выразным, зграбным па малюнку. Звярніце ўвагу на апорныя рыфмы. У беларускім тэксце рыфмуюцца «вочы — ночы». Не кажучы пра тое, што рыфмоўка тут і выразней і энергічней, чым у выпадку з дзеяслоўнымі «ослепило — любило», яна яшчэ і кантрастная: «*вочы* — святло» і «*ночы* — змрок». Кантраст падтрымліваецца, развіваецца ўсёй вобразнай сістэмай:

Мне сонца асляпіла вочы,
Ды што мне цемень вечнай ночы...

А што ў рускім варыянце? «Затем, что сердце свет любило, на солнце загляделся я». Тут ёсць новы нюанс думкі, якога няма ў арыгінале, але як гэта нязграбна выказана па-руску: «Затем, что сердце свет любило»! І далей:

На ощупь я пошел, но была
Не в стыд мне слепота моя.

Па-першае, «была» замест «была́» — да дзіўнага не па-руску, па-другое, слепата, якая «не в стыд» — не менш нязграбна і не менш не па-руску. У чарнавым на-

кідзе да арыгінала таксама было гэтае: «Ня ў сорам слепата мая» — але ж адмовіўся ад яго паэт!

Здаецца, доказы больш непатрэбны. Але каб чытач не падумаў, што мы ўзялі выключны выпадак, спынімся яшчэ на вершы «Возера» і на яго рускім варыянце. Для зручнасці аналізу параўнаем толькі першыя строфы.

Стаяў калісь тут бор стары,
І жыў лясун у тым бары.
Зрубалі бор — лясун загінуў.
Во след яго ад той пары:
Сваё люстэрка ён пакінуў.

Цытуем па-руску:

Тут рос густой, суровый бор.
И леший жил; когда ж топор
В бору раздался — леший сгинул
И, уж невиданный с тех пор,
Нам зеркальце свое покинул.

І зноў жа, як і ў выпадку з першым вершам,— у беларускім варыянце — выразнасць інтанацыі і выразнасць малюнка. Зайздросны лаканізм формы. Пачатак, энергічны і адначасова сціплы, нагадвае зачын казкі ці народнага апавядання. У перакладзе ўдакладненне «густой, суровый бор» выдае і непатрэбным, і вялым, і трафарэтным. «Во след яго ад той пары». Тут выразна адчуваецца і сам апавядальнік, і яго інтанацыйны жэст — зноў жа энергічны і выразны. Варта звярнуць увагу і яшчэ на адну акалічнасць: у кожным з трох першых радкоў беларускага верша — новая думка, якая паслядоўна вынікае з папярэдняй. Радок метрычна, інтанацыйна супадае з думкай. Два ж апошнія радкі — дзве грані адной думкі ці, дакладней, гэта думка і яе адбітак. Гэтаксама, як люстэрка — возера — адбітак лесуновага следу.

Прыемна ўсё-ткі мець справу з Багдановічам-паэтам! Здаецца, просценькі вершык, а прыглядзішся — якое майстэрства! І думка не замінае пачуццю, а пачуццё думцы. Нават не хочацца пасля гэтага вяртацца да другога лесуна, да «лешего», які чамусьці «невиданный», замест таго, каб быць «неведомым», «незнаемым» ці яшчэ якім.

Не, выдатна мысліў і адчуваў па-беларуску Багдановіч! Інтуіцыя мастака перамагала недастатковае веданне мовы, каб сцвердзіць сябе ў ёй, і толькі ў ёй. Во

дзе загадка і во дзе дзіва! Дык што ж: пачнём разгадваць яе? Але ці зможам і ці трэба гэта? Бо, урэшце, разгадаць загадку ці тайну — гэта значыць, напалову пазбавіць яе прывабнасці.

Падзівімся лепш на гэтую загадку і на гэтую тайну Багдановіча.

...ЯШЧЭ І КРЫТЫК

Адчуванне значнасці сваёй місіі — гэта тое, што пастаянна жыло ў ім. Не, ён не строіў з сябе ні прарока, не мысліў сябе ні цэнтральнай фігурай, ні настаўнікам, што паказвае, як дзецям малым, дарогу ў светлае царства тым, хто па кволасці сваёй духоўнай даверыўся яму. Проста ён добра ўсведамляў, што ягоныя веды і ягоныя здольнасці найбольш прыдадуцца тут, на Беларусі, на радзіме, думку пра якую ён, юнак, выпеставаў у сваім сэрцы ўдалечы ад яе. Надта дарагой цаной заплаціў ён за сваю мару, такімі пакручастымі, далёкімі шляхамі ішоў ён да радзімы, прыглядаючыся дарогаю да чужых набыткаў і скарбаў, што было б недаравальным цяпер, заваяваўшы права быць беларусам, супакоіцца на гэтым прыемным і, што казаць, нават гордым адчуванні. Я дасягнуў свайго, няхай цяпер зробяць больш за мяне! Не, так якраз ён не думаў. Толькі, толькі сцвердзіўшыся як паэт («дэкадэнт» — той-сёй гаварыў пра яго), гаспадарскім вокам аглядае ён нешырокі яшчэ загон літаратурнай нівы. Што загон нешырокі — гэта яму з ягонай ваколіцы лепш, чым каму іншаму, відаць. Дык што ж рабіць яму? Пастарацца не заўважаць гэтага, каб не расхалоджваць сябе і другіх, тых, у каго веры, можа, менш, чым у яго, а сумненняў, адпаведна, больш? Потым — яму ж могуць сказаць: а хто ты такі, каб крытыкаваць парадкі ў нашай хаце? У нас хоць беднае ўсё, ды сваё. Мы людзі простыя, да дэкадэнцкіх штучак мы не прывыклі. Ну і што ж, няхай кажуць. Ён, Багдановіч, нягледзячы ні на што, беларускі паэт — і гэтым усё сказана. Ён не будзе ні знявервацца, ні спакушацца лёгкімі перамогамі. І ён не хоча, каб імі спакушаліся іншыя. Столькі працы наперадзе! Столькі нявырашаных задач! Цвярозая ацэнка і вера. Толькі гэта трэба цяпер. Менш «мясцовай» пыхі, смялей позірк наперад і часцей позірк назад.

У 1911 годзе Багдановіч піша артыкул «Глыбы і слаі. Агляд беларускай краснай пісьменнасці 1910 г.».

Перш за ўсё для яго важна вызначыць, што літаратура сапраўды мае на сваім рахунку на сённяшні для яе дзень. Ці намнога пасунулася яна наперад у параўнанні з мінулымі гадамі? Год, пра які піша, Багдановіч лічыць у пэўнай ступені пераломным. Ён лічыць, што колькаснае накапленне літаратурных твораў і літаратурных імёнаў пачынае нарэшце пераходзіць у якасць. «Аднакалёрная» маса пісьменнікаў, найчасцей паслядоўнікаў Багушэвіча, тых, што знікалі амаль бясследна пасля аднаго-двух твораў, пачынае адслойвацца ў «глыбы» — прыходзяць пісьменнікі яркіх, акрэсленых індывідуальнасцей, а «ўсякі выясніўшыся, абасобіўшыся пісьменнік хоць бы праз адно гэта стаіць на крок уперадзе пісьменнікаў-аднаднёвак, вабіць іх сваёй яркасцю, як аганёк матылькоў, і, прывабіўшы, гуртуе вакол сябе, творыць літаратурны кірунак». Багдановіч, не ўжываючы тэрмін «прафесіянальная літаратура», гаворыць, па сутнасці, менавіта пра яе, пра змену літаратурнага аматарства літаратурай з пэўным мастацкім і ідэйным кірункам. Выпрацоўка самастойных мастацкіх каштоўнасцей — вось у чым ён бачыць мэту літаратуры, не адзіную, вядома, мэту, а, бадай, адну з найважнейшых, бо ў ажыццяўленні яе літаратура толькі і можа выявіць як магчымасці самой мовы (тады гэта важна было), так і здатнасць самога народа да самабытнага духоўнага жыцця. Час, калі беларуская літаратура «не толькі свайму народу, але і ўсясветнай культуры» панясе свой дар,— для яго самы жаданы час. Пра гэта, праўда, ён напіша праз тры гады, у чарговым сваім аглядзе «краснага пісьменства».

Той-сёй можа падумаць, што Багдановіч недаацэньваў пры гэтым сацыяльнай, грамадскай ролі літаратуры. Сапраўды, ён не рабіў у сваіх аглядах надта моцнага акцэнту на гэтым яе прызначэнні, але ж, трэба думаць, не таму, што не надаваў яму ўвагі, а таму, што ў такой акцэнтоўцы недахопу не было, што сацыяльныя, грамадскія матывы і без таго былі галоўнымі, ледзь не адзінымі ў ранняй творчасці і Купалы, і Коласа, і шмат яшчэ каго. Багдановіч гаварыў пра тое, пра што не гаварылі ці забываліся гаварыць іншыя. Выдзяляючы з новай плеяды паэтаў Купалу, аддаючы належнае яго

грамадзянскім памкненням, захапленню «вобразам прападаючай Беларусі», Багдановіч чакае ад яго, аднак, большай мастацкай рознабаковасці, больш шырокага і арганічнага выяўлення ўсіх складанасцей жыцця. Вось чаму ён з задавальненнем зазначае, што «талент Купалы ўзрастае, пашырае круг сваіх тэм і ўжо не галосіць (ці — лепей — не толькі галосіць), а ўжо павявае смеласцю, жыццёвай сілай і пагардай». Праз тры гады ён не абмінае сказаць, гаворачы пра Купалу, прыкладна тое ж: «З радасцю бачым, што талент Купалы развіваецца, з'яўляюцца новыя мэты, новыя спосабы творчасці, новыя формы і вобразы. Не толькі нядоля нашай вёскі ды нацыянальныя справы Беларушчыны цікавяць яго. Ужо і краса прыроды, і краса кахання знайшлі сабе месца ў яго творах».

Думка гэтая, надта цвярозая і своечасовая думка, уяўлялася Багдановічу настолькі важнай, што ён вяртаецца да яе і ў вершы:

Кінь вечны плач свой аб старонцы!
Няўжо за цёмнай ночкай ты
Не бачыш, што глядзіцца сонца
Ў люстэрка — месяц залаты?

Не перабольшваем, але трэба была вялікая перакананасць у высакародным прызначэнні мастацтва (у тым ліку і грамадскім), вялікая любоў да самога мастацтва, каб сказаць гэта, бо ва ўсе часы для чалавека па-сапраўднаму сумленнага, самастойнага ў поглядах існуе небяспека быць незразуметым, і заўсёды ёсць небяспека, што яго назавуць адсталым, калі ён не падзеліць разам з усімі празмернага, а таму часта і няшчырага, моднага, захаплення той ці іншай добрай і карыснай думкай.

Смешна было б даказваць высакародства грамадскіх памкненняў Багдановіча, а вось тое, як па-сапраўднаму даражыў ён імі, як баяўся ўсякага, нават несвядомага апашлення іх, падкрэсліць трэба. І як жа меў рацыю Багдановіч! Тыя, хто раней спяваў і плакаў пад Багушэвіча, неўзабаве пачнуць «плакаць» і «заклікаць» пад Купалу і Коласа — і якраз у той час, калі і Купала і Колас будуць вырашаць новыя (і вырашаць па-новаму) грамадскія і мастацкія задачы. А ўспомніце, якім жыццёва важным стане неўзабаве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераадоленне традыцыйных «нашаніўскіх»

канонаў і матываў, тых канонаў і матываў, тых стылёвых і жанравых нормаў, якія паспелі ўжо стаць пад той час безадносна літаратурнымі і нават эпігонскімі. І стылёвы «выбух» стане непазбежны.

Так, Багдановіч меў рацыю. Яму нельга адмовіць у шырыні і глыбіні погляду на літаратуру. Часовае, надзённае не засланяла яму галоўнае. Літаратура для яго значыла надта многа, прынамсі, дастаткова для таго, каб бачыць яе карысць, яе грамадскую функцыю перш за ўсё ў яе мастацкім самавызначэнні, у самавызначэнні яе, як адметнага, найвышэйшага роду чалавечай дзейнасці. Літаратуры, якой за дзесяткі год належала прайсці шлях, які іншыя, больш развітыя літаратуры праходзілі ў лепшым выпадку за стагоддзе, нішто не магло пашкодзіць так, як аднабаковасць мастацкіх ці грамадскіх захапленняў і сімпатый. «У нас кожны кірунак можа мець цэннасць»,— вось што кажа Багдановіч. Менавіта так, у сувязі са своеасаблівымі задачамі беларускай літаратуры, якія вынікалі з яе маладосці, можам мы правільна зразумець Багдановіча. Пры гэтым нам не трэба баяцца, што Багдановіч для каго-небудзь будзе выглядаць ледзь не прыхільнікам «чыстага мастацтва», якім ён, вядома, ніколі не быў. Зразумець адметнасць пазіцыі Багдановіча — наш абавязак. Урэшце гэта і мера нашай павагі да яго. Вось чаму нам не трэба «прыхарошваць» Багдановіча, нібыта абараняючы яго, баючыся, каб не зразумелі не так, як трэба, яго пазіцыю. А. Лойка, напрыклад, аналізуючы ў сваёй кнізе пра Багдановіча ацэнку паэтам зборніка Купалы «Гусляр», спыняючыся на тым месцы, дзе Багдановіч піша, што зборнік «не вызначаецца асаблівай глыбінёй і надзвычайнасцю», што ў ім часта перапяваюцца «старыя грамадзянскія», «горкаўскія матывы», чуюцца «водгукі так званага мадэрнізму», прыходзіць да высновы: «Строгі крытык, ён патрабаваў не перапеваў ужо сыграўшых сваю *грамадскую* (падкрэслена мною.— *М. С.*) ролю песень, а ўзлёту новых, нечуваных яшчэ, а таму яшчэ больш грамадскі дзейсных, наступальных песень». «Абараняючы» Багдановіча, А. Лойка як бы не хоча зразумець Багдановіча, знарачытага акцэнту яго думкі. Ён хоча абараніць і Багдановіча, і Купалу адначасова, заўважаючы тым часам, што «справа са «старымі матывамі» была куды складаней, чым гэта ў сваім аглядзе паказаў Багдановіч».

Добра, дапусцім, што так, але ж і справа з Багдановічам куды складаней, чым гэта паказаў А. Лойка. Багдановіч, сапраўды, не супраць «новых» грамадзянскіх матываў, але вось што важна і што, па сутнасці, падкрэслівае крытык: адных грамадзянскіх матываў яму, крытыку, мала. Калі ён піша пра «смеласць», якой пазяваюць лепшыя вершы зборніка, дык мае на ўвазе не толькі грамадзянскую смеласць, а і смеласць мастацкую, арыгінальную распрацоўку новых тэм і матываў. «Ужо і краса прыроды, і краса кахання знайшлі сабе месца ў ягоных творах» — вось за што, як вядома, хваліць Багдановіч Купалу ў другім сваім аглядзе, згадваючы наступны паэтаў зборнік «Шляхам жыцця». Багдановіч, як бачым, паслядоўны. Не заўважыць гэтага, не заўважыць акцэнту яго думкі нельга. А да чаго ж яна, гэтая думка, зводзіцца ў А. Лойкі? Калі ўважліва прачытаць яго, прасякнуцца ягонай логікай, дык выйдзе, нібыта Багдановіч патрабаваў нейкага простага паднаўлення старых «грамадзянскіх матываў». Састарэлі адны — падавай новыя, «нечуваныя яшчэ», «яшчэ больш грамадскі дзейсныя, наступальныя». А тыя, «сыграўшы сваю грамадскую ролю»,— у архіў. Можа, не так хацеў сказаць А. Лойка, але аб'ектыўна ў яго выйшла так. І Багдановіч у яго стаў падобны на вульгарна-сацыялагічнага крытыка.

Думка Багдановіча — важная думка, яна не страціла каштоўнасці і на сённяшні дзень. І сёння мы яшчэ недастаткова клапоцімся пра тую сапраўдную дзейснасць мастацтва, якая ва ўсебаковым, арганічным выяўленні яго магчымасцей, у яго жыццёвай паўнаце, ва ўсведамленні таго, што для мастацтва няма забаронных тэм, што выхоўвае яно не простай ілюстрацыяй тых ці іншых думак і ідэй, а сваім чалавеказнаўчым пафасам і, урэшце, сваімі пошукамі прыгажосці, сцвярджаючы ці адмаўляючы пры гэтым — усё роўна.

Літаратура, несумненна, і выхоўвае і вучыць, але, здаецца нам, толькі тады, калі застаецца літаратурай у арганічным сэнсе гэтага слова. Прызначэнне літаратуры перш за ўсё — даследаваць жыццё, даследаваць адпаведна сваім, закладзеным у ёй законам.

Багдановіч на самым пачатку сваёй творчасці разумеў гэта. Ён хацеў, каб гэта зразумелі і іншыя. Надта блізка да сэрца браў ён усе праблемы маладой нашай літаратуры, надта хацеў ён, каб з найбольшай карыс-

цю для нацыі, для «ўсясветнай культуры» ішла яна сваім паскораным, бяспрыкладным крокам.

Вось чаму Багдановіч пастаянна вучыцца сам і вучыць іншых. Творыць і аналізуе. Аналізуе і творыць. І пастаянна трымае руку на пульсе літаратурнага працэсу.

У ЗАВАЯВАНЫМ ЦАРСТВЕ

Вершы, якія ўпершыню па-сапраўднаму звярнулі ўвагу на Багдановіча як паэта, былі вершы з міфалагічнага цыкла «У зачарованым царстве». Рэакцыя на гэтыя творы была даволі супярэчлівая — ад прынцыповага іх непрыняцця (тады ж было выказана ўпершыню ў дачыненні да Багдановіча абвінавачванне «дэкадэнт») да безагаворачнага, аплагетычнага нават прызнання,— вядома, у самой сваёй накіраванасці палемічнага, супроцьпастаўленага другім, таксама крайнім, ацэнкам. Як ні дзіўна, і сёння, калі мы хочам адвесці ад Багдановіча абвінавачванне ў дэкадэнцтве, ламаем свае крытычныя коп'і менавіта над гэтымі вершамі, як бы паўтараючы «памылку» тых першых крытыкаў Багдановіча, якім засцілі вочы менавіта гэтыя вершы паэта і якім не хапіла адвагі быць паслядоўнымі да канца. Бо той, хто хацеў бы ўпарта бачыць Багдановіча сімвалістам, дэкадэнтам, мог бы знайсці для сваіх, вядома, тэндэнцыйных, высноў дастаткова матэрыялу (і нават больш прыдатнага) і ў больш позніх, так званых «класічных» вершах. Але такая ўжо сіла інерцыі!

Мы ж ведаем (і сёння гэта можна лічыць даказаным), што Багдановіч ніколі не быў сімвалістам, калі бачым у сімвалізме не суму пэўных фармальных прыёмаў, тэм, а перш за ўсё светапогляд, сістэму погляду на мастацтва і свет, на чалавека ў яго грамадскай дзейнасці (апошняе сімвалістаў якраз прынцыпова не цікавіла). Сімвалізм з самага пачатку настойліва імкнуўся сцвердзіць сябе ні больш ні менш, як светапогляд. В. Брусаў, адзін з мэтраў сімвалізму, пісаў пасля рэвалюцыі, у той час, калі ад сімвалізму засталіся адны ўспаміны: «Сімвалісты адмаўляліся служыць у літаратуры практычным мэтам, хацелі знайсці больш шырокае абаснаванне ёй і звярнуліся да

выказвання агульных ідэй, аднолькава каштоўных, як здавалася ім, не аднаму якому-небудзь класу грамадства, але ўсяму чалавецтву».

Што ж датычыць фармальных заваёў сімвалізму, дык было б проста неразумна іх адмаўляць, і было б нават недаравальна таму самаму Багдановічу не пераняць таго-сяго ад сімвалістаў і не пастарацца, арганічна засвоіўшы, перасадзіць гэта тое-сёе на толькі што ўзараную беларускую глебу. У свой час і нам даводзілася пісаць пра гэта, тлумачачы, чаму Багдановіч, пры частковым знешнім падабенстве з сімвалісцкай практыкай, ніколі не быў і нават не мог быць сімвалістам, бо ў нашага паэта, у адрозненне ад сімвалістаў, была пад нагамі менавіта трывалая глеба — сацыяльная і нацыянальная глеба, было ўсведамленне гістарычнай перспектывы, думка аб узвелічэнні роднай літаратуры і роднага народа.

Ну а цыкл «У зачарованым царстве»? Ці трэба зноў і зноў паўтараць, што ён не сімвалісцкі і не дэкадэнцкі? Не, нам пара ўжо ісці трошкі далей, пара паглядзець на яго больш канкрэтна.

Справядліва піша А. Лойка, кажучы пра нашу крытыку, што «вершы з міфалагічнымі вобразамі і параўнаннямі [яна] разглядала не ў кантэксце ўсяго цыкла, а вырваўшы з яго. У Багдановіча яны — паэтызацыя сутыкнення чалавека са светам прыроды, калі яна над ім панавала. За імі як працяг раскрыцця тэмы яднання чалавека з прыродай Багдановіч паставіў іншыя вершы, у якіх паказаў, як чалавек ужо ўзняўся над прыродай, адчуў яе хараство, супаставіў яго са сваім грамадскім становішчам і г. д.». Нарэшце, нарэшце мы зрушыліся з месца! А. Лойка, на нашу думку, у асноўным правільна зразумеў задуму Багдановіча ці, дакладней, адзінства яе. Удакладняем таму, што, разам з прызнаннем прынцыповай навізны поглядаў А. Лойкі, не падзяляем, аднак, шмат якіх яго акцэнтаў у вытлумачэнні задумы цыкла. Акцэнты гэтыя мы лёгка выявім з прыведзенай цытаты, на жаль, адзінай цытаты, якую нам давядзецца скарыстаць, бо А. Лойка, выказаўшы сапраўды цікавую думку, чамусьці не паклапаціўся яе развіць больш канкрэтна і шырока, а адразу перайшоў у сваёй гаворцы пра Багдановіча да іншага, хоць і цікавага, але не звязанага з цыклам. Прыгадаем яшчэ, што ў пачатку свайго да-

следавання, увогуле характарызуючы праблематыку вершаў паэта, звязаных з тэмай роднага краю, А. Лойка мімаходзь і зноў жа слушна зазначае, што цыкл «У зачарованым царстве» з'яўляецца «першымі спробамі падглядзець самабытнае і непаўторнае ў родным краі».

Здзіўляюча заканамерны ў сваім творчым узыходжанні Багдановіч. Лесуны, вадзянікі, змяіныя цары — колькі ўсім гэтым ужо займалася этнаграфія! Але ж Багдановіч не этнограф, ён паэт. І вось этнаграфію ён робіць паэзіяй, робіць разам з маладой літаратурай заканамерны якасны скачок. Здавалася б, што тут незвычайнае, што незразумелае, чаму гэта трэба прымаць як «дэкадэншчыну», як збочванне з прамой дарогі літаратуры?

У Багдановіча часта будзе так: ён ідзе разам з усімі, але тым часам ці наперадзе, ці трохі збоч. Заявіць жа ён нечакана ў 1915 годзе, што «беларускіх вершаў у нас няма, ёсць толькі вершы на беларускай мове»! Заявіць адразу пасля свайго ж прызнання, што літаратура наша за нейкі дзесятак год прайшла шлях, які адбіў так ці інакш усе блуканні еўрапейскай мастацкай думкі на працягу цэлай сотні год. Парадокс? Магчыма. Але хіба парадокс не форма развіцця думкі, не адна, урэшце, з форм развіцця і самой літаратуры?

Архаіка і навізна перапляліся ў Багдановічавым цыкле. Але яна палемічная нейкая, загадкавая, гэтая архаіка, у ёй няйначай чуецца выклік — ну, канечне, тут дэкаданс! Як было падумаць інача!

Багдановіч уключае цыкл у зборнік «Вянок», той «Вянок», якому ўласцівы найашчаднейшы адбор з усяго, што створана паэтам, той «Вянок», якому, як мала з каторых зборнікаў у гісторыі літаратуры наогул, уласцівыя строгая гарманічнасць, сімфанічнасць пабудовы,— ён адно цэлае, адно дыялектычна цэлае. Цыклы спрачаюцца паміж сабой — у часе, у жанры, у стылі, у тэмах, у метадах паказу адзінкавага і цэлага і — адначасова дапаўняюць адзін аднаго, не суіснуюць, а жывуць.

Цыкл «У зачарованым царстве» — адно з аконцаў гэтага цэлага. Аконца, праз якое паэт зазірнуў у свет. Для Багдановіча жыццё, свет ніколі не існавалі разарванымі, абмежаванымі нейкім суб'ектыўным момантам, для яго не існавала «кавалачкаў жыцця». Вось,

дарэчы, яшчэ адно з істотных адрозненняў Багдановіча ад мадэрністаў.

Міфалогія — толькі першая цагліна ў яго пабудове, яе падмурак. Адсюль паэтава думка ўзнімаецца вышэй, ідучы тым часам і далей.

Адам Ягоравіч, бацька, піша «Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў». Для этнографа паганства — гэта сапраўды перажытак, рарытэт на фоне сучаснага яму жыцця. Этнограф суадносіць з сённяшнім днём, паэт з кавалка таго, што некалі было цэлым, творыць гэтае цэлае ў прыналежным яму часе, творыць па законах, што некалі былі ўласцівыя гэтаму цэламу.

А. Лойка, нам думаецца, памыляецца, калі піша «пра паэтызацыю сутыкнення чалавека са светам прыроды, калі яна панавала над ім». Справа ў тым, што ў Багдановіча ў дадзеным выпадку прынцыпова няма больш-менш адасобленага чалавека, як гэтага непазбежна патрабуе «сутыкненне». Ён, наадварот, піша пра прыроду, якая ўключае ў сабе чалавека нароўні з лесуном, вадзянікам і г. д. і якая проста не дарасла яшчэ да чалавека.

Скажуць: але ж і вадзянік, і лясун — спараджэнне чалавечай фантазіі. Што ж, справядліва. Толькі ж, разам з тым, гэта спараджэнне хоць і паэтычнай, але бездапаможнай фантазіі, якая моцная нутраным адчуваннем, але не аналітычнай здольнасцю, якая толькі і робіць чалавека чалавекам. Мы, вядома, абвастраем праблему. Ніжэй мы ўбачым, што яе, здаецца, абвастрае і Багдановіч.

Звернем увагу вось на што. Той жа лясун — бажок, у нейкім сэнсе творца і хавальнік таямніцы, але ў Багдановіча ён не ў стане асэнсаваць тое, творцам і ўвасабленнем чаго лічыцца. Як урэшце і старажытны чалавек не ў стане асэнсаваць створанае ягонай фантазіяй.

Давайце паглядзім, як малююцца паэтам міфалагічныя персанажы. Думаеце, яны адчуваюць радасць ад таго, што ўвасабляюць сабой нешта цэлае — вядома, адносна цэлае, бо побач з лесуном ёсць яшчэ вадзянік і інш.?

> Брыдзець, пахіліўшысь панура,
> Лясун на раздоллі дарог.

Абшарпана старая скура,
Зламаўся аб дзерава рог.

Гэта лесавік з аднаго верша. А вось з другога.

Ўсё дзіка, пустынна імшыцца.
Агністая спёка стаіць.
На моху між спелай брушніцы
Лясун адзінокі ляжыць.
Каравая моршчыцца скура,
Аброс цёмным мохам, як пень,
Трасе галавою панура,
Бакі выгравае ўвесь дзень.

А вадзянік? У той жа танальнасці, тымі ж фарбамі абмаляваны і ён. Тут ужо нават сам ён гаворыць, і не проста гаворыць, а скардзіцца:

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся — сплю на дне ракі.
Твар травой аблутаны, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі.

«Панура», «дзіка», «пустынна», «адзінокі» — вось тыя словы, якімі характарызуе створанае ім царства паэт. Panыласцю і няўклюднасцю патыхае ад яго, і ўсе гэтыя вадзянікі, лесуны — не багі, не бажкі нават, а ахвяры, што знемагаюць пад цяжарам таго, што павінны несці ў сабе і ўвасабляць. Думкі, думкі, усведамленне сябе саміх і прыроды праз сябе — вось чаго не хапае ім! І гэтая іх туга, іх паныласць — усё ад таго ж. Гэта як бы пакутлівае прадчуванне думкі, няпэўнае жаданне яе і немагчымасць да яе падняцца. І таму іх лёс — нейкая страшная, жахлівая бяздзейнасць, жывёльнае ў самым сапраўдным значэнні гэтага слова існаванне. (Памятаеце вы ва Урубеля карціну «Пан»? Змрок, хмызы, а ў хмызах аброслы, сівы Пан. Чуйна і няўцямна прыслухоўваецца да нечага. Збоч таямніча, дзіка праразаецца месяц. І такая туга, пакута ў вачах, у якіх вось-вось, здаецца, адаб'ецца нешта асэнсаванае і разумнае.)

Не, паэтызацыі сутыкнення чалавека з прыродай, яднання з ёй якраз і няма ў Багдановіча. Калі і ёсць у яго паэтызацыя, дык паэтызацыя таго чалавека, якога хочуць і не могуць «празарэць» вадзянік ці лясун.

Значыцца, чалавек усё ж ёсць? Так, ёсць, але ён не «персанаж» у Багдановіча. Чалавека, па сутнасці, ня-

ма, ёсць думка аб ім. І як ні дзіўна, ні парадаксальна — гэта «думка» саміх «бажкоў». Але затое наколькі па-мастацку ўражлівая гэтая думка!

І ні паэтызацыі, ні яднання з прыродай, такім чынам, няма, ёсць страх перад ірацыянальным, зусім не дэкадэнцкі страх «рацыяналіста» Багдановіча.

Як бы двайную задачу вырашае сваімі міфалагічнымі вершамі Багдановіч: дападае фантазіяй да змрочнага, хоць і па-свойму паэтычнага свету паганства, да першаасноў вобразнай творчасці і па-філасофску ставіць, вырашае пытанне аб «законнасці», «благодатнасці» розуму, таго розуму, з якога знушчаліся і здзекаваліся дэкадэнты, ды ці адны яны толькі!

Бо калі ўжо бараніць Багдановіча ад дэкадэнтаў, дык трэба бараніць сур'ёзна, на ўзроўні ягонай думкі. Інакш нам давядзецца «абяляць» яго, як гэта робіць, напрыклад, адзін з даследчыкаў Багдановіча,— тым, што, маўляў, лясун у паэта пададзены на рэалістычным фоне асенняга пейзажу, што «паэт дасягае поўнай злітнасці міфалагічнага вобраза з асноўным рэалістычным фонам». Дзіва што! Лясун жа сам — прырода!

Толькі — досыць. Паглядзім лепш, куды ідзе далей паэтава думка, адштурхоўваючыся ад уласна міфалагічных вершаў.

Багдановіч будуе цыкл на прынцыпе паступовага ўзыходжання ад ніжэйшага да вышэйшага, ад хаосу да гармоніі. Гармонія, яе мажлівасць падаецца праз чалавека — не праз таго паганскага чалавека, які, па сутнасці, не выдзяляе сябе з прыроды, а праз чалавека, надзеленага дарам сузірання і, такім чынам, выдзеленага гэтай сваёй здольнасцю з прыроды. Праблему розуму Багдановіч заканамерна звязвае з праблемай асобы.

Вось тут, на новым этапе, і пачынаецца ўжо тое, што можам назваць і сутыкненнем чалавека з прыродай, і паэтызацыяй яе.

Пераходны, па-свойму цэнтральны верш у цыкле — «Бура». Гэта як бы масток ад паганскага хаосу да ўпарадкаванага, так сказаць, успрымання з'яў прыроды сучасным чалавекам, успрымання, упарадкаванага менавіта сузіраннем.

Супрацьпастаўлены, зближаны па кантрасту два погляды на адну і тую ж з'яву:

Панурая, вялізная жывёла
Па шыры неба ўдаль марудна праплывае.
Усё сціхла. Але вось паветра рассякае
Агністы меч і зіхаціць вясёла.

Ударыў ён — і грукат пракаціўся;
Мігае грозны меч, удары не сціхаюць,
І ўніз халодныя бічы крыві сцякаюць,
А людзі кажуць: гэта дождж праліўся.

Паэтызацыі тут яшчэ няма, ёсць проста канстатацыя рознасці ўспрымання. Ці, можа, дэпаэтызацыя «нармальнага» ўспрыняцця? («А людзі кажуць: гэта дождж праліўся».) Але давайце не будзем спяшацца рабіць з гэтага высновы. Ход думкі Багдановіча не канчаецца на гэтым. Звернем тым часам увагу вось на што. Бура, навальніца персаніфікуецца Багдановічам у трагедыйнае па сваёй сутнасці дзеянне. Чалавек жа гэтай трагедыі не заўважае, яна па-за ім, яна не ў ягонай сферы ўспрымання. Чалавек пазбаўляе трагедыю трагедыйнасці і простым прызнаннем «дождж праліўся» ўпарадкоўвае хаос, які варожы яму сляпой бязмэтнасцю, адсутнасцю ўсялякай «маральнай» ацэнкі. Бо агністы меч, з-пад якога сцякаюць «бічы крыві», «зіхаціць вясёла»! Бо вецер з другога, безназоўнага верша, які ідзе адразу за «Бурай», разнёсшы хмары, што «зліцца жадалі», «над смерцю іх радасна вые»!

Але, можа, чалавек, адмаўляючы «трагедыйнасць» прыроды, тым самым страчвае магчымасць суперажывання з ёй? Не, Багдановіч, «рацыяналіст» Багдановіч так не думае. Чалавек, выдзеліўшыся з прыроды, не страчвае здольнасці разумець і слухаць яе, адчуваць сябе яе душой і думкай, пры гэтым зусім неабавязкова, каб настрой прыроды супадаў з настроем чалавека, каб чалавек, яго духоўны свет быў простым адбіткам жыцця прыроды:

У чарцы цёмнай і глыбокай
Плешча, пеніцца віно;
Хмелем светлым і халодным
Калыхаецца яно.
І хістаецца асока,
І шуміць высокі бор,
А ў душы не замаўкае
Струн вясёлых перабор.

«У чарцы цёмнай і глыбокай плешча, пеніцца віно» — гэта паэтычны вобраз возера, гэта сама прыро-

да, эстэтычна асэнсаваная, гэта хаос, падпарадкаваны і пераўтвораны дадзенай яму формай. Вось чаму «светлы і халодны» хмель прыроды трансфармуецца ў душы чалавека ў «струн вясёлых перабор».

Свет прыроды мае свае вымярэнні, сваю перспектыву і аб'ём, свой верх і ніз. Ён рухомы, як думка, і адухоўлены, як пачуццё:

Блішчыць у небе зор пасеў;
У полі — рунь і ў небе — рунь.
Да рэчкі лецячы, ўзляцеў
Між імі марай белы лунь.

Чалавек імкнецца да зліцця з прыродай, але не да растварэння ў ёй. Бо чалавек жа перш за ўсё асоба, надзеленая пэўнай духоўнай аўтаномнасцю:

Знічка коціцца агністаю слязой,
Прашумела мякка скрыдламі сава;
Бачу я, з прыродай зліўшыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую ў цішы, як расце трава.

«З прыродай зліўшыся душой», чалавек не перастае чуць і бачыць, не перастае аналізаваць свае адчуванні, але гэта не перашкаджае яму мець задавальненне і радасць ад «зліцця»: наадварот, менавіта элемент асэнсаванасці і аналізу надае ягонаму судачыненню з прыродай высокі эстэтычны і духоўны сэнс. Якая вялікая, невымерная розніца паміж тым, як зліваецца з прыродай лясун, не могучы ні асэнсаваць, ні адчуць гэтага зліцця, а значыць, не могучы мець ад яго ніякай радасці, і паміж тым, як далучаецца да прыроды чалавек, адчуваючы сябе яе душой і думкай!

Мы бачым цяпер, што нічога загадкавага, экзатычнага, тым больш дэкадэнцкага, няма ў міфалагічных вершах Багдановіча, якія зусім не былі для яго самамэтай. Не проста паэзіяй паганскага светаадчування захапіўся ён, а выказаў на яго аснове і з яго дапамогай надта сучасныя для яго, надзённыя і глыбокія думкі. Не паганства было ягоным ідэалам, а гарманічна развітая чалавечая асоба, надзеленая здольнасцю чуйна ўспрымаць прыгожае ў прыродзе і ў свеце.

МАДОННЫ

У анкеце, пасланай Адаму Ягоравічу Камісіяй Інбелкульта па спадчыне Багдановіча, быў і такі пункт: «Адносіны да дзяўчат». Бацька напісаў: «Я ніколі яго не бачыў у жаночай кампаніі, за выключэннем яго стрыечных сясцёр. Думаю, што ён ніколі яе і не шукаў. Ён занадта быў сур'ёзны і чысты для фрывольных сувязей і надта чэсны, каб уводзіць каго-небудзь у зман наконт сур'ёзнасці сваіх намераў, а пра жаніцьбу ён, мусіць, не думаў з выпадку сваёй хваробы».

Што ж, фрывольныя сувязі — гэта сапраўды было не для Багдановіча. І ў жаночым асяроддзі ён таксама, мусіць, не надта часта бываў. І надзеі на ўласнае сямейнае шчасце з прычыны ўсё той жа хваробы ён таксама, мусіць, не меў ці, дакладней, мець не хацеў. І ўсё ж як натуру ўражлівую, надзеленую выключнай эмацыянальнай памяццю і несумненна артыстычную яго не мог не вабіць да сябе і пастаянна не хваляваць вобраз жанчыны. Ды, зрэшты, і пра «кружэнні» ягонага сэрца мы сёння можам меркаваць і грунтоўней і глыбей, чым гэта здавалася Адаму Ягоравічу. Бацька, напрыклад, згадвае, што падчас першай паездкі ў Крым, жывучы на малочнай ферме «Шалаш», Максім пазнаёміўся з маладой дзяўчынай Кіціцынай, містычныя настроі якой, мусіць, зрабілі на паэта даволі моцнае ўражанне. Іхняя перапіска (прынамсі, яна існавала тады, калі Адам Ягоравіч пісаў свае ўспаміны пра сына,— цяпер яна загінула), на думку бацькі, не дае ўсё ж падстаў гаварыць пра нейкае сур'ёзнае і моцнае захапленне. Праўда, Адам Ягоравіч агаворваецца, што перапіску ён чытаў няўважліва, і не настойвае, такім чынам, на сваёй думцы. Як там было на самай справе, устанавіць мы цяпер, бадай што, не здолеем. Шукаць сляды гэтага юнацкага захаплення паэта, мусіць, трэба ў ягонай творчасці. Бацька выказвае меркаванне, што Кіціцынай прысвечаны верш «Я, бальны, бяскрыдлаты паэт...». З ім можна згадзіцца: гаворыць за тое як дата напісання верша — 1909 год — якраз год паездкі ў Крым, так і спамінак пра прывет, які «чуда зрабіў», і вось «бальны, бяскрыдлаты паэт на гадзіну забыў сваё гора». Верш, трэба думаць, напісаны пасля вяртання ў Ніжні Ноўгарад, ён напісаны на фотакарт-

цы, толькі чамусьці тую фотакартку паэт адрасатцы не адаслаў. Не будзем гадаць, з якой прычыны. Можна сказаць адно: калі і было ў Багдановіча якое пачуццё да Кіціцынай, дык было яно гнятлівым, трудным і сапраўднай радасці кахання яму не прынесла. Агульны тон верша, яго змест сведчаць пра гэта. Ды і не толькі гэты верш. Безнадзейнасць, змрочная і трохі нават экзальтаваная акцэнтоўка на блізкасці скону («Мо жыцця майго верш ужо спет...») у другім вершы — «Цемень», прысвячэнне якога — «Ахвярую М. А. Кіціцынай» — выразна паказвае на адрасата, пераходзяць ледзь не ў роспач:

> Я сяджу без агню. Я стаміўся, прамок.
> Над Зямлёю — імгла, у душы маёй змрок.

Дзе выратаванне, дзе?

> Але вось цераз цемень маланка блішчыць,
> Асвячае мне вобраз Хрыста... яго крыж...
> Аджываеш, здаецца, душою гарыш.

Як асуджана-мерна, гнятлівай ступою калывае радок, і здаецца ўжо, што надзея на Хрыста-выратавальніка забіта ў самым зародку: гэта як бы парыў без хацення, надзея без надзеі на радасць. І, сапраўды, далей паэт гаворыць:

> Але толькі чаму ж так малы гэты час?!
> Зноў навокала цемень. Свет зірнуў і пагас.
> Не глядзіць на мяне ясны вобраз Хрыста.
> Над зямлёю імгла, у душы пустата.

Гэта — безвыходнасць. Не безвыходнасць наогул, а знемажэнне душы пад цяжарам экзальтавана-змрочнай, хваравітай і да таго ж чужой думкі. Гэта як бы часовая хвароба душы. Бо вось што яшчэ спыняе нашу ўвагу. Верш, прысвечаны дзяўчыне, можа, нават каханай дзяўчыне, і ў ім тым часам ніводнага слова пра каханне, пра зямную, пачуццёвую блізкасць дзвюх душ. Няхай нават не так. Няхай нават каханне перанесена ў іншую, «боскую» сферу, няхай гаворка ідзе пра любоў «во Христе», але дзе ж тут тады «сорадование», урачыстае і святочнае зліццё дзвюх роднасных душ у «вобразе Хрыста»? Няма гэтага, не адчуваецца яно! Паэт, наадварот, як бы аддзяляе сябе ад каханай, як бы скардзіцца ёй, што «боскае» насланнё і празарэнне не даюцца яму, што «боскія» радасці недаступныя яму гэтак жа, як зямныя.

Наконт апошніх, зямных радасцяў паэт, мусіць, салгаў сам сабе. Прызнаючыся, што рэлігійны аскетызм не пад сілу яму, ён аб'ектыўна сцвярджаў тым самым здатнасць сваёй душы да ўспрыняцця па-зямному паўнакроўных і здаровых уражанняў. Калі няма радасцяў «боскіх», гэта яшчэ не значыць, што няма радасцяў зямных. Шчыра Багдановіч не мог так сказаць. Гэта было не інакш як тактоўнае апраўданне перад каханай, апраўданне ў духоўнай, рэлігійнай здрадзе ёй («Свет зірнуў і пагас». «Не глядзіць на мяне ясны вобраз Хрыста»). І спроба прыглушыць для яе гэту здраду як бы ўсведамленнем пакарання за тое («Над зямлёю імгла, у душы пустата»).

Артыстычнай, уражлівай душы Багдановіча з яе пастаяннымі парываннямі да гармоніі і красы («Красу, і светласць, і прастор шукаў...») былі, вядома, чужыя экзальтавана-містычныя настроі ягонай сяброўкі, хоць нельга і адмаўляць таго, што на нейкі час ён мог падпасці пад іх і паверыць у іх як спараджэнне сваёй жа душы. Але скора, скора спаў туман з ягоных вачэй! Багдановіч, які не спакусіўся, як многія яго сучаснікі-дэкадэнты, змрочна-самабытнай паэзіяй паганства дзеля яе самой, Багдановіч, які адрынуў спакуслівасалодкае падполле ірацыяналізму дзеля светлай хароміны прасветленага жывой думкай і пачуццём жыцця, той Багдановіч не мог не адрынуць сябе і ад хваравітазгублівай ахвярнасці дзеля «яснага вобраза Хрыста».

Песня каханню не ўдалася ў Багдановіча з той, каму прысвечаны быў верш «Цемень». Затое праз год-другі напіша ён верш «Першая любоў», і будзе ён прысвечаны ўжо некаму іншаму:

Ўжо позна. Мрок вясенняй ночы
На вузкіх вуліцах ляжыць.
А мне — вясёла. Блішчаць вочы,
І кроў ад шчасця аж кіпіць.

Іду я радасны, харошы,
Знікае з сэрца пустата...
А пад разінавай калошай
Ціхутка хлюпае слата.

І ці не тыя гэта «імгла» і «мрок», што былі ў вершы «Цемень», не палохаюць цяпер паэта, ці не тая гэта «пустата» «знікае з сэрца»?

І ўсё ж чамусьці не хочацца думаць, што тая невя-

домая дзяўчына Кіцыцына з тым пакутна-супярэчлівым вершам «Цемень» назаўсёды сышла з душы паэта і з ягоных думак. Мне чамусьці хочацца думаць так. Вось ёсць у Багдановіча цудоўны верш пра зорку Венеру, якая светла ўзышла над зямлёю, пра апошні вечар расстання, пра згадку аб тым вечары «ў далёкім краю» — і ёсць у вершы найцудоўнейшыя радкі, у якіх паэт просіць каханую глянуць іншы раз на тую зорку — «у расстанні там з ёй зліём мы пагляды свае...». Найцудоўнейшыя радкі, роўныя па сіле ўздзеяння, па сваёй высокай паэтычнай прастаце, можа, нават славутаму лермантаўскаму — «и звезда с звездою говорит». І вось я думаю: каму аддаць гэтыя радкі? Проста нейкай дзяўчыне, у якой нават няма ні прозвішча, ні імя, дзяўчыне, пра якую мы нават нічога не ведаем, дзе жыла: у Яраслаўлі, у Вільні, у Мінску — ці, можа, палічыць іх проста выдумкай паэтавай галавы, як Вераніку з аднайменнага паэтавага вершаванага апавядання? Шкада, нават неяк вельмі шкада пакідаць гэты верш без адрасата. Хацелася, каб, як у выпадку з пушкінскім «Я помню чудное мгновенье...», згадвалася імя жанчыны — і неабавязкова думаць, што яна, тая жанчына, абавязкова павінна быць вартая такога верша. Папраўдзе, ці так ужо і Керн была вартая геніяльнага верша, ці так ужо і Наталля Мікалаеўна была вартая не менш выдатнай пушкінскай «Мадонны»? Ёсць паэзія, ёсць высокая мара паэта пра каханне — ці так ужо гэта мала?!

Я аддаў бы Багдановічаў «Раманс» так мала знаёмай нам дзяўчыне Кіцыцынай. Няхай! Яна спыніла на сабе ўвагу Багдановіча: яму тады было васемнаццаць год. Ён не меў, мусіць, з ёй па-сапраўднаму шчаслівага кахання, але хто сказаў, што каханне абавязкова павінна быць шчаслівым? Я ўяўляю: гаворкі з ёю захаплялі яго. Яе непадобнасць да другіх, яе містычны парыў у надземнае. І хвалявалі яе пакуты. Абое яны былі хворыя. Але ён быў мацнейшы за яе — ён быў мастак. І вось мне думаецца. З гадамі па-інакшаму паўстаў перад ім яе вобраз. Зняты быў з яго хваравіты арэол, бо перажыў даўно ўжо сам Багдановіч тое хваравіта-містычнае насланнё: застаўся сум, засталося шкадаванне, прыпомніліся колішнія гаворкі пра якое-небудзь перасяленне душ ці пра адгадванне думак на адлегласці — і вось ужо — хто ведае, якою каляінаю ідзе паэ-

тава думка,— нараджаецца гэты верш. Ён увесь ірвецца пад неба, як бы пад урачысты харальны спеў; выразна, востра малюецца ў мяккім небе вежа касцёла, а збоч і вышэй ззяе, трымціць, пераліваецца ў небе ранняя зорка. І як хараша, як светла, як прасветлена сумна там, у небе, і не ў нейкім містычным царстве паднебным зліваюцца душы яго і яе,— не, думкі і пачуцці іх свецяць яснай вечаровай зоркай над цёплай вечаровай зямлёй...

Багдановічу не асабліва шанцавала ў каханні. Сказаўшы так, мы маем права задумацца — чаму? Тое, што Багдановіч быў варты кахання і сам быў несумненна здольны на моцнае пачуццё,— даказваць гэта сёння не трэба, і колькі палкіх сённяшніх прыхільніц ягонага таленту з радасцю захацелі б узнагародзіць яго за колішнюю несправядлівасць лёсу! Толькі Багдановічу сёння гэта не трэба, ды і не ўпэўнены мы, што, каб з'явіўся Багдановіч сёння, усё не паўтарылася б спачатку.

Ёсць на тое свае прычыны, і, гаворачы так, мы менш за ўсё схільныя вінаваціць у сардэчных драмах Багдановіча каго-небудзь, акрамя яго самога. Гучыць такое трохі дзіўна, але ўсё ж, мусіць, гэта так.

Тут трэба тлумачэнне.

Раман з Анютай Гапановіч — адна з чарговых ягоных няўдач. Мы мала ведаем пра Анюту Гапановіч, падказаць хоць нешта, можа, здолее яе партрэт. З партрэта глядзіць на нас маладая дзяўчына са светлымі, наіўна-легкадумнымі вачамі, з капрызлівым абрысам вуснаў, са слабаватым і нервова-мяккім падбародкам. Мякка падвітыя валасы адцяняюць гладкі невысокі лоб. Рысы твару хваравіта і зноў жа капрызліва драбнаватыя — ураджанне падказвае вобраз адной з тых натур, у якіх жаноцкасць абуджаецца рана, у якіх наіўнасць заканамерна і дзіўна ўжываецца разам з душэўным эгаізмам, якія інстынктыўна адчуваюць сваю прыцягальнасць для паэтычных натур і на гэтай падставе выпешчваюць недзе ў глыбіні душы перабольшанае ўяўленне аб сабе. Непасільныя для іх прэтэнзіі, такія мілыя і, здаецца, прывабныя ў маладосці, з часам балюча раз'ядаюць ім душу: яны пачынаюць думаць, што свет не зразумеў іх, ім хочацца рэспектабельнага бляску, забяспечанага і поўнага, як чаша, жыцця, а жыццё зычыць ім у кавалеры не надта перспектыўных,

як пасля выяўляецца, чыноўнікаў ці гімназічных выкладчыкаў. Паэты, вядома, бракуюцца з самага пачатку — якое ўжо там рэспектабельнае жыццё з паэтам! Замужам яны адчуваюць сябе няшчаснымі, год-два высільваюцца з сябе і — нарэшце... апускаюцца да самай банальнай сварлівасці кухаркі.

Праўда, гэта не адзіны варыянт лёсу так званых «рамантычных» натур. Пячорын у Лермантава з'едліва іранізуе з «рамантыка» Грушніцкага, якому, на яго думку, прыгатаваны лёс «мірнага памешчыка» з усімі непазбежнымі ў дадзеным выпадку атрыбутамі сентыментальна-пошлага жыцця. Гэтак жа і гераіню Багдановічавага рамана магла чакаць ціхая сямейная прыстань з тым самым не надта перспектыўным чыноўнікам ці інжынерам, толькі тады ён у яе вачах быў бы ўжо не самай звычайнай пасрэднасцю, накшталт «мірнага» Грушніцкага, а чалавекам-анёлам, незаслужана пакрыўджаным зайздрослівымі людзьмі. І тады наша гераіня ледзь не малілася б на яго і на сваіх незвычайна таленавітых фемістоклюсаў і алкідаў, уздыхала б і ахала, а муж у кампаніі сваіх сяброў пагардліва называў бы жанчын «низшей расой», як чэхаўскі Гураў, і здраджваў бы мілай жоначцы пры першым зручным выпадку.

Ах, сумна, сумна ўсё гэта, і што можа вабіць да такіх натур паэта?

Дзіўная рэч: на думку разумных людзей, вялікі Талстой робіць недаравальнае глупства, пазбаўляючы рамантычнага і паэтычнага арэола Наташу Растову, прымусіўшы яе ў канцы рамана квактаць і трапятацца над цэлым вывадкам дзяцей, хваляваца за іх і за мужа. Дзіўная рэч, Томас Ман у сваёй выдатнай навеле «Тоніо Крэгер» прымушае пісьменніка, якога надзяляе нават сваімі знешнімі рысамі, да неверагоднасці востра зайздросціць пошламу шчасцю яго і яе — былых аднакашнікаў, сяброў дзяцінства. Сябра ў дзяцінстве не спакусіў Шылераў «Дон Карлос», якога так настойліва падсоўваў яму Тоніо Крэгер, яе ж пасля не спакусіла нават пісьменніцкая слава Тоніо. Выпадкова сустрэўшы іх на курорціку ў маленькім гарадку, ён, славуты пісьменнік, хаваючыся, наглядае за імі ў час па-правінцыяльнаму пошлай і вясёлай вечарынкі і зайздросціць ім — няпрошаны госць на чужым свяце. Тоніо Крэгер піша пасля сваёй рускай знаёмай, мастачцы Лі-

завеце Іванаўне: «Не, нам, незвычайным людзям, жыццё ўяўляецца не незвычайнасцю, не прывідам крывавай велічы і дзікай прыгажосці, а адвечнай супрацьлегласцю мастацтву і духу; нармальнае, дабрачыннае, мілае — жыццё ва ўсёй яго спакуслівай банальнасці — вось царства, па якім мы сумуем. Паверце, дарагая, той не мастак, хто толькі і марыць, толькі і прагне рафінаванага, эксцэнтрычнага, дэманічнага, хто не ведае тугі па наіўнаму, прастадушнаму, жывому, па маленькай часцінцы дружбы, адданасці, даверлівасці, па чалавечаму шчасцю,— патаемнай і вострай тугі, Лізавета, па шчасцю абыдзённасці!»

Гэту «патаемную і вострую тугу» ведае кожная пасапраўднаму артыстычная натура, і справа тут не ў хваравіта-вытанчанай цязе да пошласці, як можа каму-небудзь здацца, а ў такім зразумелым існаванні мастака як бы на грані двух светаў — свету жывой рэчаіснасці і свету, створанага фантазіяй, арганізаванага па законах мастацтва. «Патаемная і вострая туга» — ад усведамлення таго «стану бязважкасці», у якім амаль пастаянна знаходзіцца мастак,— вось чаму яго так вабяць самыя простыя, часам прымітыўныя радасці жывога жыцця і вось чаму празарліўца Бальзак, пакідаючы начны свет сваіх паэтычных мрояў, у жыцці адчувае сябе бездапаможным, як дзіця; геніяльны сацыёлаг, палітык, палкаводзец у сваіх творах, у паўсядзённым жыцці ён іншы раз развважае, робіць учынкі на ўзроўні якога-небудзь клерка. Ён хоча самай звычайнай чалавечай ласкі, жаночай увагі, і ён не разумее, чаму тыя жанчыны, якія гатовы ледзь не на руках насіць яго за ягоныя творы, не могуць зразумець яго проста як звычайнага чалавека. І як жа пакутавалі ад такога трагічнага разладу ўсе гэтыя Бальзакі і Гогалі, тыя Гогалі, што ў наіўнай і смешнай сямейнай ідыліі Пульхерыі Іванаўны і Афанасія Іванавіча сумавалі, як справядліва зазначыў нехта, па магчымасці паўнацэннага чалавечага шчасця, гарманічных адносін паміж людзьмі.

І хто ведае, што прываблівала ў Анюце Гапановіч Багдановіча: ці тая, інтуітыўна спасцігнутая ёю жаноцкасць, спалучаная з маладым мілым какецтвам і, можа, яшчэ з чыста жаночым эгаізмам: як ні дзіўна, і гэта часта прываблівае ў жанчыне людзей, надзеленых высокай ступенню духоўнасці, той духоўнасці, якая

так мала ведае пра пачуццёвы, інтуітыўны эгаізм, а таму часам прымае яго за адзнаку арыгінальнасці і даравітасці натуры.

А можа, у яе позірку, у рысах твару мільганулася яму аднойчы тое, што свеціць у позірках і абліччах мадоннаў, створаных геніяльнымі мастакамі ў дабратворную пару італьянскага Адраджэння — загадка жаноцкасці, загадка, якая і вабіць да сябе, і абяцае, і... не паддаецца разгадцы.

Загадка гэтая, безумоўна, вабіла да сябе і Багдановіча. Не чалавек, а мастак Багдановіч вінаваты ў тым, што здольны быў бачыць у Анюце Гапановіч ці яшчэ ў кім нешта такое, чаго ў іх, магчыма, не было. Пушкін-мастак невінаваты, што ўяўляў Наталлю Мікалаеўну зноў жа ў вобразе мадонны. Анюта Гапановіч невінаватая, што не зразумела Багдановіча: проста зразумець яго ёй было не пад сілу.

Нас цікавіць не «віна» Анюты Гапановіч, нас цікавіць Багдановічава «віна». Вышэйшую, мастацкую сваю віну ён выкупіў душэўнымі пакутамі, зямную сваю віну перад ім мы можам выкупіць няйначай як любоўю да яго, да высакароднага яго мастацтва, якое славіла жыццё ва ўсіх праяўленнях і праспявала, дарэчы, адзін п самых магутных гімнаў, якія калі-небудзь складаліся на нашай мове, чалавечаму каханню і жанчыне-маці.

Ягоны цыкл «Мадонны» — унікальнейшы ў нашай паэзіі. Не толькі тым, што тут паэт паспрабаваў перанесці ў новую гістарычную і геаграфічную рэчаіснасць замацаваны пэўнай традыцыяй вобраз, а тым, што ён, як ніхто з сучаснікаў, адчуў і па-мастацку ўзаконіў рэнесансныя тэндэнцыі беларускай рэчаіснасці — не ў сэнсе толькі нацыянальнай іх спецыфічнасці, а ў сэнсе іх усялюдскасці. Пры гэтым ён засцярогся як дыдактычнага асветніцтва ў галіне думкі, так і наіўнага стылізатарства ў галіне формы. І вось што хораша: яго мадонны — беларускія мадонны. «Мадонны» — гэта не «Маленькія трагедыі» Пушкіна, у якіх пазнанне драматычнай формы і ўвасабленне побыту, духу, характараў чужой нацыі было адной з важнейшых задач. Багдановіч сабе ставіць адваротную задачу. Пушкін цалкам абстрагаваўся ад сваёй нацыянальнай рэчаіснасці, Багдановіч думку, выпрацаваную чужой культурай, цалкам рабіў сваёй, беларускай. Ці трэба

казаць пры гэтым: такое магчыма было таму, што Багдановіч надзвычай чуйна схопліваў, аддзяляў агульналюдскае ў любой думцы. Яго адметнасць якраз і была заўсёды ў тым, што ён як бы ішоў да нацыянальнага ад агульналюдскага, а не наадварот. Гэтым ён, дарэчы, розніцца ад Купалы, які і псіхалагічна і спосабам свайго мастацкага мыслення цалкам залежны ад канкрэтна-нацыянальнага матэрыялу. Не лішне будзе параўнаць у сувязі з гэтым выдатную Купалаву паэму «Яна і я» і Багдановічаў цыкл «У зачарованым царстве». Родніць іх пэўным чынам матэрыял — цікавасць да элементаў паганства ў светаадчуванні беларусаў. Толькі гэты матэрыял цікавіць кожнага паэта па-рознаму. Багдановіч творыць свой цыкл менавіта на матэрыяле паганства, робячы яго толькі грунтам для сцвярджэння гуманістычнай думкі аб найвышэйшым шчасці жыць, мысліць і адчуваць чалавечна, у адпаведнасці з магчымасцямі чалавечай свядомасці і розуму. Хоць Багдановіч у сваіх высновах лагічна і як бы ідзе ад канкрэтнага матэрыялу, несумненна, што гэты матэрыял не мае для яго псіхалагічна таго значэння, якое ён мае для Купалы. Менавіта непрыманне ірацыяналізму прывяло Багдановіча ў свет паганства і, вядома, не дзеля таго, каб паэтызаваць яго. Матэрыял у Багдановіча асвоены і арганізаваны ў першую чаргу думкай — і толькі ёй. Купала ў паэме таксама ўслаўляе высокую радасць быцця, але робіць гэта ён шляхам псіхалагічнага зліцця чалавека, яго пачуццяў, яго побыту і прыроды, што акаляе яго, у адзіным комплексе прасветлена-паганскага светаадчування, якое выступае ў яго і глыбінна-нацыянальным і ў той жа час агульнаславянскім. У Купалы адчуванне комплекснае, у Багдановіча — індывідуалізаванае, бо апошняга цікавіць праблема цэлага (паганскага) і асобы. Праблема вырастання адзінкавага з цэлага. Вось чаму Купала ў паэме і эпічны і манументальны, Багдановіч у сваім цыкле — аналітычны ў развіцці думкі і сімфанічны ў мастацкім афармленні яе.

Вернемся да цыкла «Мадонны». Калі ў цыкле «У зачарованым царстве» свет паганскі кантрастуе са светам сучаснай паэту рэчаіснасці, то ў «Мадоннах» такога кантрасту няма: тут усюды гарманічна, мякка ўзяты адзін свет — свет, умоўна кажучы, «хрысціянскі», бо не станем жа мы адмаўляць, што ідэя «мадон-

ны», як увасабленне зямной, а ў гэтым сэнсе і боскай прыгажосці, ёсць ідэя адраджэнчая і «хрысціянская». Іншая справа, што мадонна ў Багдановіча, як было ўжо сказана, усюды беларуская, паколькі і «хрысціянская» ідэя даўно ўжо стала і «беларускай» — у свеце маральных вызначэнняў, а цяпер, пасля цыкла Багдановіча, набыла і мастацкае вызначэнне.

Мадонна для Багдановіча — гэта не проста ўвасабленне жаночай прыгажосці. Жаночая прыгажосць набывае для паэта сэнс і знаходзіць сабе апраўданне тады, калі яна ўвысакароджана святым прызначэннем жанчыны-маці. Менавіта вось так чытаюцца вяршаваныя апавяданні «У вёсцы» і «Вераніка» з Багдановічавага цыкла, на якіх усюды светла ляжыць ціхамірны водбліск далёкага італьянскага Адраджэння, у якіх праз рысы вясковай дзяўчынкі і паненкі Веранікі праступае несмяротны вобраз Рафаэлевай мадонны, той мадонны, што натхняла Пушкіна і Дастаеўскага (ды і ці адных толькі іх!), пра якую старэйшы сучаснік Пушкіна і яго настаўнік Жукоўскі пісаў так: «Расказваюць, што Рафаэль, нацягнуўшы палатно сваё для гэтай карціны, доўга не ведаў, што на ім будзе: натхненне не прыходзіла. Аднойчы ён заснуў з думкай пра Мадонну, і, мусіць, нейкі анёл разбудзіў яго. Ён прахапіўся: яна тут, закрычаў ён, паказаўшы на палатно, і накрэсліў першы малюнак... На яе твары нічога не выказана, гэта значыць, на ім няма выразу зразумелага, які б меў пэўнае імя; але ў ім знаходзіш, у нейкім таямнічым спалучэнні, усё: спакой, чысціню, веліч і нават пачуццё, але пачуццё, якое перайшло ўжо за мяжу зямнога, значыцца, мірнае, пастаяннае — яно не ў стане ўжо замуціць яснасці душэўнай... Яна не падтрымлівае Дзіцёнка, але рукі яе пакорліва і свабодна служаць яму прастолам... І ён, як цар зямлі і неба, сядзіць на гэтым прастоле».

На «крывой і вузкай» вясковай вулачцы, сярод «вясковай нуды» паэт робіцца сведкам таго хвалюючага, высокага пачуцця, той прыгажосці душэўнай, ад якой і сам харашэе душой. І не так важна, што яго Мадонна — «так год васьмі дзяўчынка», а яе дзіцёнак — замурзаны вясковы хлопчык, можа, брацік той дзяўчынкі, якой маці, ідучы ў поле, строга наказала быць нянькай.

Важна не гэта, а вось што:

Дзяўчынка к хлопчыку нагнулася і, слёзкі
Сціраючы яму, штось пачала казаць,
Каб заспакоіць плач — зусім, як быццам маць,
І саліваліся ў жывы абраз ядыны
Той выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны
Дзіцячым, цененькім...

Ад ідылічнай і ў той жа час нейкай трывожна-трапяткой карцінкі, падгледжанай паэтам, павеяла «якойсь шырокаю, радзімаю красою». Але далей паэт піша:

А можа, не краса была ў дзяўчынцы той,—
Дзяўчынцы ўпэцканай, і хілай, і худой,—
А штось вышэйшае, што Рафаэль вялікі
Стараўся выявіць праз маці божай лікі.

У «дзяўчынкі ўпэцканай, і хілай, і худой» па-зямному няма нічога прыгожага (ды гэта і не краса — так і кажа ці, дакладней, сумняваецца ў такой красе паэт), проста зямной красы няма, зямная краса будзе красою тады, калі яна стане «радзімаю» — г. зн. аплодненай нечым «вышэйшым», красою.

Вядома, Багдановіч думае над тым, што так добра сфармуляваў сучасны рускі паэт Мікалай Забалоцкі:

...что есть красота
И почему ее обожествляют люди?
Сосуд она, в котором пустота,
Или огонь, мерцающий в сосуде?

Дарэчы, верш, з якога ўзяты гэтыя радкі, у Забалоцкага называецца «Непрыгожая дзяўчынка». І ў яе, у гэтай дзяўчынкі, і блізка няма таго, што ў жыццёвай звычайнасці завуць прыгажосцю: «...рот длинен, зубки кривы, черты лица остры и некрасивы». Розніца ў тым, што сучасны паэт усведамляе гэта як трагедыю — і ў дачыненні да яе, «бедной дурнушки» (яна яшчэ не здагадваецца пра гэтую трагедыю, але нам, чытачам, робіцца яшчэ вусцішней і самотней ад таго), і ў дачыненні да самой прыгажосці, бо магчымасць трагедыі «непрыгожай дзяўчынкі» — гэта балючае паражэнне ў чалавечым свеце ўсё той жа красы, вышэйшай, трэба сказаць, красы.

Для Багдановіча ніякай трагедыі тут няма. Не таму, што ён не здагадваецца пра магчымасць яе, а хаця б проста таму, што не гэта трагедыя цікавіць яго. Ён ведае іншыя трагедыі і драмы, іншую меру і іншую трагедыю прыгажосці. Вераніка з аднайменнага вершава-

нага апавядання і прывабная і маладая, але ж не гэта істотнае для аўтара. Праўда, нейкім чынам (і то на самым пачатку) гэта мае нейкае значэнне для апавядальніка, які закахаўся ў Вераніку і вершам прызнаўся ёй у каханні. З хваляваннем чакае ён і не можа дачакацца адказу. Калі ж надараецца спаткацца з Веранікай і загаварыць,—

Яна зірнула на мяне,
І раптам з вусн яе сарваўся
Такі бязвінны, чысты смех,
Што на яго злавацца — грэх.

Злавацца, вядома, трэба было б, бо смех гэты для нашага героя — па сутнасці, слёзы. Вераніка не абяцае яму ўзаемнасці. Тут не іначай як драма незразуметага, адрынутага пачуцця, але заўважым, што Багдановіч здымае саму магчымасць такой драмы. Чаму?

Накрыла ясны твар дзявочы
Задумы сумная імгла,
На плечы ручка мне лягла,
Спагадліва зірнулі вочы,
І даляцеў к маім вушам
Ласкавы шэпт: «Мо больна вам?»

Каханне разбурана, затое здабыта права іншых, не менш высакародных адносін. Драма знята чалавечнасцю, тою шчыраю, высакароднаю мераю спагады, якая не абражае, не крыўдзіць, а ўзвышае. І яе, і яго. Усведамленнем гэтай драмы тою, хто несвядома, не па сваёй волі вінаватая ў ёй. Драму адчуваюць абое — так сказаць, і суб'ект і аб'ект,— і вось чаму гэта драма ачышчэння.

І прад высокаю красою,
Увесь зачараваны ёй,
Скланіўся я душой маёй,
Натхнёнай, радаснай такою,
А ў сэрцы хораша было,
Там запалілася цяпло.

І зноў жа, мы не сцвярджаем, што Багдановіч не ведаў пра звычайную, будзённую драму кахання і драму прыгажосці. Ён яе якраз ведае, і, можа, таму, што ведае надзвычай добра, пастаянна паўстае перад яго ўнутраным зрокам вобраз «той, што з постаццю дзяўчыны злівала мацеры чарты».

Мацярынскае пачуццё, комплекс, як мы можам сёння сказаць, Мадонны — для яго найдаражэйшае ў

жанчыне, высокае прызначэнне якой прымірачь, уціхамірваць згублівыя страсці, надаваць ім варты чалавека накірунак і сэнс. «Яна — выдумка маёй галавы» — так перакладаецца італьянскі эпіграф да «Веранікі». Ну і што ж, няхай сабе выдумка, але гэта выдумка і паэтычная, і высокая.

Багдановіч паслядоўны ў сваёй «выдумцы». Цыкл «Мадонны» ён дапаўняе цыклам «Каханне і смерць», дзе зноў жа славіць жанчыну-маці, беручы ўжо яе не ў ідэальна-рамантычным вобразе мадонны, а ў празаічна-жыццёвым, рэалістычна падкрэсленым вобразе «пачуццю цёмнаму падлеглай жанчыны». І як тактоўна гэта робіць!

Яго прыклад лішні раз даказвае, што для сапраўднага мастака паэзія разліта ўсюды: ён яе знаходзіць і бачыць ва ўсіх праяўленнях чалавечага жыцця, у тым ліку і ў тых, якія непазбежна паўстануць пошлымі, натуралістычна і хваравіта эратычнымі пад пяром крывадушнага і бяздарнага пісакі. Бо «нравственное отношение к изображаемому предмету», на якім так настойваў вялікі Талстой,— найпершае, мусіць, патрабаванне да мастацкага таленту, і чым больш мастак прасякаецца ім, тым больш каштоўная ягоная творчасць.

І «шлюбнае ложа», і першая трывога, і радасць маладой маці, якая адчула пад сваім сэрцам дзіця, і забабонны, амаль містычны страх перад невядомасцю, і нечалавечыя пакуты, у якіх нараджаецца новае жыццё, і... смерць — усё гэта ёсць у Багдановічавым цыкле, поўным пяшчоты, замілавання, болю, поўным сапраўднага драматызму. Драма, як бы хоча сказаць Багдановіч, гэта драма мацярынства. У ёй усё: любоў і пакута, «грэх» і «выкупленне», ахвяра і подзвіг:

Слава тым, хто сілу мае
Смерць, не дрогнуўшы, спаткаць,
Хто ў мучэннях памірае,
Каб жыццё дзіцёнку даць!

Драма мацярынства — драма ахвярнасці. «Мацярынскае» гэта пачуццё Багдановіч хоча бачыць і ў мастацтве. Толькі пра тое пагаворым асобна.

ІСКРЫ З ХАЛОДНЫХ КАМЕННЯЎ

У слаўнай плеядзе нашых класікаў Багдановіч — фігура самая складаная. І ў той жа час самая простая па закончанасці, пэўнасці сваёй «пісьменніцкай канструкцыі» — хочацца дадаць.

Супярэчнасці тут няма: прастата — адваротны бок складанасці. Няма такой складанасці, якая б не правяралася ці не імкнулася праверыць сябе прастатой.

Справа ў тым, што па складу свайго мыслення, па творчым тэмпераменце, па спосабу трансфармацыі дум і ўражанняў Багдановіч — класік, як ніхто з нашых класікаў. Прыблізна і груба кажучы, разуменне класічнага звязана ў першую чаргу не столькі з прызнаннем нарматыўнасці тых ці іншых эстэтычных з'яў (класічнымі ў гэтым сэнсе могуць быць любыя «ізмы»), а з характарам адносін мастака да рэчаіснасці, з вызначэннем ім ролі мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, са здатнасцю разумець мастацтва як сацыяльную, культурную і нацыянальную з'яву адначасова. Зразумела пасля гэтага, што класічнае ў поўным сэнсе гэтага слова — з'ява рэдкая і патрабуе для свайго ажыццяўлення пэўных як гістарычных, сацыяльных, так і чыста літаратурных умоў.

Мы пісалі ўжо аднойчы, што беларуская літаратура, з выпадку запозненасці свайго развіцця, даволі своеасабліва дэфармавала многія працэсы, уласцівыя станаўленню мастацкай думкі наогул. Не могучы цалкам абмінуць пэўныя раннія градацыі гэтай думкі, яна сінтэзавала іх з пазнейшымі, сінтэзавала адначасова, у кароткі гістарычны прамежак і нават у творчасці аднаго мастака. Мы дагэтуль спрачаемся, спрабуючы вызначыць, скажам, месца Дуніна-Марцінкевіча ў нашай літаратуры, стараючыся аддзяліць у яго творчасці сентыменталізм ад рамантызму, этнаграфізм ад рэалізму — столькі школ, напрамкаў, уплываў сышлося ў адным ім. Потым: суадносіны рамантычнага і рэалістычнага ў Купалавым творчым метадзе. Можна сказаць, што мы не мелі нейкага літаратурнага напрамку, школы ў «чыстым» выглядзе.

Станаўленне рэалістычнага метаду ў рускай літаратуры цалкам і непасрэдна звязваецца з іменем вялікага Пушкіна, які, паводле вядомага азначэння, для рус-

кіх — «пачатак усіх пачаткаў». У нас, у найлепшы момант нашага літаратурнага развіцця, адначасова тварылі тры выдатныя паэты, ажыццявіўшы такім чынам паміж сабой як бы «падзел працы». «У сэнсе ўласна літаратурным гэта быў найвялікшы выйгрыш» — неяк ужо даводзілася пісаць нам пра гэта. (Няхай чытач прабачыць нам самацытату: самаплагіят без указання на яго — рэч таксама не вельмі добрая.) Багдановіч узяў на сябе тое, што не маглі ўзяць Купала і Колас. Яго задачай было ўзвесці дах над пабудаваным імі домам літаратуры.

І ажыццявіць прывязку гэтага дома на вуліцы літаратуры сусветнай.

Багдановіч здзейсніў гэта.

Багдановіч нёс у сабе і Коласа, і Купалу, гарманічна, класічна спалучаючы іх, і ў той жа час ён быў сам па сабе, ён быў Багдановіч.

А. Лойка ў сваёй кнізе пра паэта справядліва піша пра найгалоўнейшую асаблівасць Багдановіча як лірыка. Ён піша, што паэт як асоба ў лірыцы Багдановіча пачаў праяўляцца значна раней, чым у творчасці Купалы ці Коласа. У Багдановіча выказаны па-іншаму «ўзаемаадносіны народа і асобы паэта». Мы можам зразумець гэта, улічваючы хаця б ранейшае наша сцвярджэнне, што Багдановіч да нацыянальнага, свайго ішоў ад агульначалавечага.

Тут выказаўся яго асабісты лёс як беларускага паэта і высокі інтэлектуальны ўзровень яго таленту наогул.

Зразумець трэба і яшчэ адно. Характар выяўлення асобы ў лірыцы Багдановіча пераважна аналітычны. Пры гэтым сацыяльны аналіз спалучаны ў яго з аналізам маральна-эстэтычным. Багдановіч бярэ сучаснага яму чалавека цалкам, ва ўсіх даступных яму вымярэннях.

Такім чынам Багдановіч дасягае гарманічнасці ў паказе з'яў жыцця. З гэтай прычыны і ў першую чаргу ў сваёй творчасці ён класік, бо выяўляе класічны тып адносін мастака да рэчаіснасці. Колас пераважна эпік, Купала — лірык. (Цікава, між іншым, што ў лірыцы Колас, як ні дзіўна гэта, быў больш «асабісты», чым Купала,— не ў сэнсе сілы непасрэдна-лірычнага пачуцця, а ў значэнні сузіральнага адасаблення ад прадмета выяўлення.) У Багдановіча ніводная са шматлікіх

вартасцей ягонага таленту не пераважае над другой, і, нягледзячы на гэта, мы маем па-мастацку закончаную, выразную творчую індывідуальнасць. Многаснае, стракатае Багдановіч сінтэзаваў менавіта класічна.

Лепш зразумець паэта паможа нам «тэхналогія» яго творчасці, само стаўленне яго да мастацтва, вызначэнне ім ролі мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства.

Багдановіч быў якраз з тых творцаў, што пастаянна думаюць не толькі над «дзіцячымі пытаннямі» быцця — чаму і навошта? — але і не могуць не думаць аб правамернасці, «законнасці» ці «незаконнасці» і самога мастацкага таленту, стараючыся спасцігнуць ягоную прыроду.

Творчасць Багдановіча дае багаты матэрыял для выяўлення ягоных поглядаў на мастацтва. Станаўленне новай беларускай літаратуры, у якім так зацікаўлены быў паэт, непазбежна прымушала яго звяртацца да асноўных пытанняў эстэтыкі, лічыць распрацоўку іх самай неадкладнай справай. Трэба заўважыць пры гэтым, што тэзіс аб грамадскім прызначэнні мастацтва прымаўся Багдановічам адразу, ён быў як бы па-за спрэчкай: вось чаму Багдановіч найчасцей скіроўвае сваю ўвагу на іншыя бакі праблемы, звязаныя з вызначэннем мастацтва як спецыфічнага роду чалавечай дзейнасці, як асаблівай формы адлюстравання рэчаіснасці ў свядомасці чалавека. І тут, прымаючы гэты аспект, Багдановіч выразна праводзіць тэзіс аб першаснасці жыцця ў адносінах да мастацтва. Толькі робіць гэта ён па-свойму. Яго цікавіць у першую чаргу асоба мастака як інструмент творчасці, як засяродак паэтычнай свядомасці: мастацтва для яго — тая духоўная арэна, на якой вырашаюцца і асэнсоўваюцца трагедыі жыцця.

І ў самім працэсе творчасці Багдановіч перш за ўсё бачыць, выдзяляе трагічны пачатак. Мастацтва патрабуе ахвяр — вось што хоча сказаць Багдановіч. Паэт творыць красу, іменна творыць, а не бяздумна трансфармуе яе, узятую ад жыцця, у вершы. Прыгожае, вядома,— жыццё, але ж у жыцця і ў мастацтва свае формы, якія не заўсёды супадаюць.

І вось чаму жыццё для паэта часта можа здавацца «грубым»:

Калі ў ракавіну цёмнаю жамчужніцы
Упадзе пясчынка хоць адна,—
Жомчугам патрохі робіцца яна!
Калі ў дух мой западзе і заварушыцца
Там кавалак грубага жыцця,—
У жомчуг звернецца ён сілай пачуцця!

Багдановіч неаднойчы падкрэслівае гэтую думку. У жыцці нараджаюцца песні «ціхія» і «цёмныя, як вугаль чорны», але зноў жа толькі пачуццё, толькі думка здольныя ўзняць іх на вышыню мастацтва, надаць ім эстэтычную каштоўнасць, выкрасаць «іскры з халодных каменняў»:

Але ўсё ж яны засвецяць, калі я ў агні мучэння
Іх разжару, распалю...

І тут пачынае ўжо гучаць матыў ахвярнасці мастацтва.

У адным з вершаў выказаны ён і больш пэўна, больш катэгарычна. Гэта верш пра матылька, прываблёнага з імглы агнём,— даволі празрысты сімвал «шукальніка красы»:

Ён рынуўся туды без волі
І смерць сваю спаткаў у ём.
Свяча гарыць. З яе ліецца
За кропляй кропля, як раса,
А матылёк ужо не б'ецца:
Табе ахвяра ён, краса!

Думка Багдановіча прыгожая ў сваёй паслядоўнасці, але мы недаравальна збеднілі б яе, каб знайшлі ў Багдановіча толькі гэта: чытачу мы так ці інакш далі б магчымасць думаць, што паэт бачыць у мастаку нешта накшталт зацятага і змрочнага аскета, які ў парыве пагардлівай самаахвярнасці нішчыць «кавалкі грубага жыцця», таго жыцця, над якім ён узнесены мастацтвам.

Лагічна разважаючы, такая думка Максіма Багдановіча ў канчатковым выглядзе будзе нясцерпна рацыяналістычнай думкай. І той, хто хоць збольшага ведае творчасць Багдановіча, хто хоць аднойчы адчуў яе дух, не пагодзіцца з такой думкай. І — справядліва!

Справа ў тым, што такая думка — не ўся Багдановічава думка. Сіла Багдановіча як паэта і мысліцеля ў тым, што ён заўсёды засцерагаецца адназначных ра-

шэнняў, што прадмет, з'яву разглядае ён усебакова, у дыялектычнай узаемаабумоўленасці і супярэчнасці.

Думаеце, Багдановіч не адчувае, што вось так, у сэнсе алімпійскай ролі мастацтва, можна вытлумачыць яго тэзіс аб «грубасці жыцця» і аб «жамчужных» россыпах паэзіі? Вельмі нават адчувае, бо тут жа, палемічна абвастраючы, знарок агрубляючы сваю думку, аддаючы яе сваім магчымым праціўнікам як зброю супраць сябе, у другім вершы піша:

Вы кажаце мне, што душа у паэта,
Калі спараджае ён дзіўныя вершы,
Нябесным агнём абагрэта
І ў час той між люду ён — першы...
Ах дзякуй вам, дзякуй на гэтай прамове;
Душа мая, пэўна, шчаслівай была бы,
Калі б я не ведаў, панове,
Што пекна спяваюць і жабы.

Што хоча сказаць гэтым Багдановіч? А. Лойка зазначае: «І ў гэтым было прызнанне творчага працэсу такой жа звычайнай з'явай, як і крэкт жаб». Праўда, даследчык не абмяжоўвае змест паэтавага верша толькі гэтым і гаворыць, што формулу «пекна спяваюць і жабы» растлумачыць «у адрыве ад усёй сістэмы эстэтычных прынцыпаў Багдановіча наўрад ці можна». Сцвярджэнне слушнае, і калі А. Лойка пераходзіць да канкрэтнага аналізу ўяўлення паэта пра мастацтва, грунтуючыся пераважна на «Апокрыфе» і «Апавяданні аб іконніку і залатару...», мы іначай як без ухвалы не можам сустрэць гэта. Канкрэтны змест гэтых рэчаў інтэрпрэтаваны дасціпна і тонка, хоць, папраўдзе, трохі і адарвана ад першапачатковай пасылкі. Тым больш нас здзіўляе, што пасля даволі доўгіх разважанняў А. Лойка канчае тым жа, з чаго пачаў, як бы забыўшыся пра тыя дадатковыя нюансы паэтавай формулы, дзеля якіх і быў распачаты разгляд «усёй сістэмы эстэтычных прынцыпаў Багдановіча». Даследчык робіць выснову: «Жыццё для Багдановіча заўсёды было першаснай з'явай, мастацтва — другаснай. Прыгожае ў жыцці, прыгожае — жыццё.

Пагэтаму і сказаў Багдановіч, што «пекна спяваюць і жабы».

Вядома, мы згодны з А. Лойкам і наконт «першаснасці» жыцця, і наконт «другаснасці» мастацтва, і

наконт таго, што прыгожае — гэта жыццё, але ж не гэта, зусім не гэта хацеў сказаць сваім вершам Багдановіч, і ўжо зусім не тое, што даследчык называе «прызнаннем творчага працэсу такой жа звычайнай з'явай, як і крэкт жаб». Зусім наадварот, нам думаецца: Багдановіч якраз хацеў сказаць, што «творчы працэс» — гэта не тое, што «крэкт жаб». Мы не іранізуем: запэўняем чытача, што ўсведамляем Багдановічаву алегорыю, толькі не хочам, каб яна разумелася надта шырока.

Проста нам трэба ўважліва прачытаць Багдановічаў верш і па магчымасці паставіць яго ў сувязь з іншымі вершамі, прысвечанымі мастацтву. І тады мы заўважым вось што. Мы заўважым інтанацыю, з якой Багдановіч гаворыць пра гэты «крэкт жаб». Багдановіч гаворыць, што душа яго «пэўна, шчаслівай была бы», каб ён не ведаў пра ўсё тое ж «пекнае спяванне жаб».

Не прыроўнівае паэт «творчы працэс» да гэтага спявання, а наадварот, абражаецца магчымасцю такога параўнання, абражаецца як мастак, што глядзіць на творчасць як на свядомы працэс, на працэс, які патрабуе агромністага выдаткавання пачуццяў і думкі. Бо «кавалак грубага жыцця» ператвараецца ў «жомчуг» усё той жа сілай усвядомленага пачуцця, бо песні засвецяць, калі распаляцца ў «агні мучэння». Вось чаму паэта бянтэжыць, не дае яму спакою гэты неўсвядомлены, інстынктыўны, але прыгожы «крэкт жаб». І справа, такім чынам, не ў абстрактна-сузіральным сцвярджэнні «прыгажосці», «мастацкасці» жыцця, а ў драматычна ўсвядомленым творчым акце. Далёкі, неадчэпны цень Сальеры бачыцца паэту і тут, і тут прысутнічае даўняя думка паэта пра свядомае і падсвядомае ў творчым працэсе, зноў і зноў абражаецца Багдановіч «гулякамі праздными» і «птичками божьими» ў мастацтве, зноў яго здаровы, «рацыяналістычны» дух паўстае супроць боскага наслання і ўсялякай містыкі ў творчым акце.

Каштоўнасць Багдановічавых вершаў аб мастацтве не ў дэкларацыях, а ў драматычным, глыбока чалавечным і як бы асабістым спасціжэнні прыроды красы.

Драматызм — як у ахвярнасці мастацтва, так і ў непазбежнасці яго саперніцтва з жыццём, з пры-

дай, з «пекным спяваннем жаб». Драматызм яшчэ і ў тым, што не заўсёды гэта саперніцтва заканчваецца перамогай мастацтва. Багдановіч, як сумленны мысліцель і мастак, не можа паказаць на магчымасць такога зыходу, ён, напрыклад, так піша пра «срэбныя цвяты», якія ўзрасціў на шкле мароз:

Ім, бледным, мёртвым, не збудзіць
Былога пачуцця,
Як не змагу яго збудзіць
Халодным вершам я.

Толькі не трэба, вядома, шчырае і горкае паэтава прызнанне прымаць за расчараванне ў магчымасцях мастацтва наогул.

Неўсвядомленай, інтуітыўнай творчасці прыроды чалавек-творца павінен супрацьпаставіць свядомы пачатак. Так добра вядомыя тэзісы аб «нераптоўнасці» ў творчасці, аб «спакойнай думе», аб метэоры, які крэсліць у небе бліскучую дугу, а ў «глыбіні халодным застаецца», так добра вядомы Багдановічаў культ майстэрства — гэта не толькі яго індывідуальна-творчае крэда, гэта вынік філасофскага спасціжэння ім карэнных праблем мастацкай эстэтыкі.

Багдановіч-тэарэтык і Багдановіч-паэт ідуць усюды поруч. Яму, патрабавальнаму майстру, здаецца, што ступень майстэрства таго ці іншага твора можа быць вызначана з дапамогай адпаведным чынам распрацаванай матэматычнай шкалы. Мы не ведаем дакладна, які канкрэтны прынцып хацеў пакласці Багдановіч у аснову сваёй шкалы: думка паэта перадаецца ягонымі сучаснікамі даволі спрошчана — можа, хаця б таму, што ў той «ідэалістычны» перыяд нашай літаратуры, на тым узроўні літаратурнай тэорыі гэты матэматычны прынцып Багдановіча ў дачыненні да мастацтва выглядаў проста дзівацтвам. Успомнім, што прыкладна ў гэты час у Расіі Брусаў з палемічным запалам прапагандаваў ідэі так званай «навуковай паэзіі», заснавальнікам якой лічыўся Рэнэ Гіль, прапагандаваў не сказаць каб паспяхова, бо гэтая школа нават на радзіме яе творцы, у Францыі, таксама не шмат мела прыхільнікаў. Нагадваючы пра «навуковую паэзію», мы ніякім чынам не хочам паставіць пошукі Багдановіча ў залежнасць ад яе. Рэчы гэта зусім розныя. Там былі пошукі паэтаў у галіне матэ-

рыялу самой паэзіі, у Багдановіча — пошукі паэта ў галіне навукі аб вершы. Кажучы мовай сучаснага літаратуразнаўства і лінгвістыкі, Багдановіч падступаўся да структуральнага аналізу мастацкай сістэмы верша, таго аналізу, які немагчымы без прымянення матэматычных метадаў апісання і аналізу. Тое, што магло здавацца дзівацтвам некалі, стала сёння ўжо нормай у пэўнай галіне літаратуразнаўчай тэорыі.

Справядліва думаць, што цэнтр усялякіх эстэтычных пошукаў ляжыць у вырашэнні кардынальнага пытання эстэтыкі — адносін мастацтва да жыцця. Толькі недаравальна абмяжоўваць думку Багдановіча адным прызнаннем эстэтычнай прыдатнасці гэтага жыцця (маўляў, прыгожае — у жыцці, прыгожае — жыццё).

Для Багдановіча гэта было ўжо само па сабе зразумелае. Таму, дарэчы, ён не асабліва і акцэнтаваў сваю думку на такім, даволі агульным вырашэнні пытання, на вырашэнні, якое б задаволіла «чыстага» філосафа, але толькі не філосафа-мастака, якім быў Багдановіч. Прыгожае ў яго жыццёвай функцыі — вось што пастаянна турбуе Багдановіча. Чым павінна быць мастацтва — сродкам ці мэтай? Калі сродкам, то ці павінен паэт цалкам залежыць ад спажыўца? Калі мэтай, то хто павінен быць суддзёй паэту? Багдановіч рашуча стаіць за самавызначэнне мастацтва — не ў сэнсе ягонай адарванасці ад жыцця і самамэтнасці, а ў сэнсе прызнання своеасаблівасці ягонай ролі ў жыцці чалавека. Каб быць карысным, мастацтва павінна адпавядаць пэўным эстэтычным нормам, але вось бяда: гэтыя нормы не заўсёды, як мы ведаем, супадаюць з нормамі жывога, непасрэднага жыцця. Вось чаму паэт не застрахаваны ад несправядлівага суда, вось чаму ён можа сумнявацца ў сваім прызначэнні як мастака наогул. Ці патрэбна каму яго мастацтва? Дастаеўскі неяк пісаў: «Нават у Пушкіна была гэтая рыса: вялікі паэт неаднойчы саромеўся таго, што ён толькі паэт. Магчыма, гэтая рыса сустракаецца і ў другіх народнасцях, але, аднак, наўрад. Наўрад, прынамсі, у такой ступені, як у нас. Там ад даўняй звычкі да справы ўсіх і кожнага паспелі рассартавацца заняткі і значэнні людзей, і амаль кожны там ведае, разумее і паважае сябе — і ў сваім занятку, і ў сваім

значэнні. У нас жа... трошкі іначай. Затоеная глыбокая ўнутраная непавага да сябе не мінае нават такіх людзей, як Пушкін і Граноўскі». Прыгадваецца, гэта нешта падобнае на думку Чарнышэўскага аб «падзеле працы» ў грамадстве, аб тым, што ў маладым грамадстве літаратура не можа быць толькі літаратурай. Пушкіну сорамна, што ён «толькі паэт», хоць, вядома, толькі паэтам ён не быў. Хоць і заяўляў, што паэт народжаны «не для житейского волненья, не для корысти, не для битв». Але ж гэта было зразумелай рэакцыяй на тыя пачварныя формы залежнасці паэта ад грамадства, якія часта выпрацоўвае жыццё. І Багдановічу было сорамна, што ён паэт. У «Апокрыфе» музыка кажа Хрысту: «...сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля яе; адзін я нікчэмны чалавек». І Багдановіч, як і Пушкін, у іншыя хвіліны горача і страсна абараняе свае права на званне мастака. Хрыстос адказвае музыку: «Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты — лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: вось надойдзе да яго (селяніна.— *М. С.*) гадзіна горычы — і чым ён разважыць смутак свой, апроч песні тваёй? Таксама і ў дзень радасці ён прызавець цябе». І яшчэ вось такія словы ёсць у «Апокрыфе»: «Я ж гавару вам: добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?»

Васілёк і каласы, прыгожае і карыснае, узрошчаны на адной ніве. Такая выпакутаваная, а таму простая Багдановічава выснова.

«Радзімай васілька» назаве Багдановіч сваю старонку — Беларусь. Ён хацеў сказаць, што гэта тая зямля, якая нараджае паэтаў.

ЦІ ПАМЫЛЯЎСЯ БАГДАНОВІЧ?

Вось яшчэ адна з ягоных загадак.

Мы ведаем ужо, што ў артыкуле «Забыты шлях», напісаным у 1915 годзе, ён нечакана заявіць: «Беларускіх вершаў у нас яшчэ не было,— былі толькі вершы, пісаныя беларускай мовай». Сцвярджэнне занадта катэгарычнае, калі не сказаць больш. Нейкую долю перабольшвання Багдановіч, вядома, мог дапусціць з разлікам на палемічнасць, але ж сэнс выказа-

ны настолькі акрэслена, настолькі думка гэтая прасякае ўвесь артыкул, што не лічыцца з ёю нельга: яе варта прыняць такой, як яна сфармулявана Багдановічам.

Думка палохае сваёй вастрынёй нават сёння. Цікава, якая рэакцыя была б на яе тады, у год напісання артыкула, каб Багдановіч правёў гэтую думку праз друк. Ён яе чамусьці не правёў — і, мабыць, не па сваёй віне. Цяжкія абставіны першай сусветнай вайны перашкодзілі, адсутнасць друкаваных органаў ці яшчэ што, але артыкул убачыў свет толькі ў 1918 годзе, пасля смерці паэта, і быў надрукаваны як ілюстрацыя да некаторых вершаў так званага «беларускага складу». І тое, што публікацыя непазбежна насіла мемарыяльны характар, і тое, што Беларусь уступала ў новую гістарычную паласу свайго развіцця, што многае іначылася, забывалася пад напорам новага,— хутчэй за ўсё, трэба думаць, прыглушыла высокую страснасць Багдановічавага артыкула, які, дарэчы, да самага апошняга часу і прыгадваўся не часта і амаль не цытаваўся. Багдановічавы вершы «беларускага складу» ўваходзілі ва ўсе выданні паэта, жылі самі па сабе, артыкул жыў, бадай, толькі ў свядомасці даследчыкаў творчасці паэта, чакаючы сваёй інтэрпрэтацыі ў цеснай сувязі ўсё з тымі ж вершамі.

Паставім яго ў такую сувязь і мы.

Катэгарычнасць пастаўленага Багдановічам пытання патрабавала пэўнасці ў адказе на яго. Былі ў нас беларускія вершы ці не былі? Перабольшваў Багдановіч у сваім сцвярджэнні ці меў на ўвазе зусім не тое, што, паводле вонкавай логікі, вынікае з ягонага артыкула?

Адну з першых спроб вытлумачыць пазіцыю Багдановіча зрабіў А. Лойка. Мы часта звярталіся да яго кнігі, часта палемізавалі з ёй — і не таму, што аўтар сказаў якія-небудзь ісціны, што сталі бясспрэчныя ў дачыненні да паэта, ці занадта суб'ектыўна асвятляў ягоную творчасць. Кніга А. Лойкі — сур'ёзная і грунтоўная кніга. Менавіта таму, што даследчыку шмат якія аспекты творчасці вялікага нацыянальнага паэта даводзілася разглядаць ледзь не ўпершыню і як бы нанава ствараць «макет» ягонай творчасці, ён, натуральна, не мог засцерагчыся і ад некаторых памылак, што непазбежна вынікалі якраз з таго, што даследчык

часта надта паслядоўна праводзіў у дачыненні да Багдановіча тую ці іншую думку, ахвяруючы некаторымі важнымі нюансамі на карысць стройнасці канцэпцыі. Памыляўся ці не памыляўся Багдановіч у сваіх пошуках «беларускага складу»? А. Лойка адказвае пэўна: так, памыляўся. Дадае: памыляўся «шчыра». Як аргументуе А. Лойка сваё сцвярджэнне? Ён кажа, што вядомае Багдановічава захапленне пачалося з пошукаў «арыгінальнага ўкладу ў сусветную паэзію», што нібыта Багдановічу прыйшло на думку шукаць гэтае «арыгінальнае» па-за ўсім тым, што пісаў сам паэт дагэтуль, што пісалі да 1915 года «Купала, Колас, Цётка, іх папярэднік Багушэвіч і інш.». «Пошукі «чыста» беларускага,— піша А. Лойка,— паэт пачаў, не ўлічваючы таго, што не можа быць нацыянальнай паэзіі па-за вопытам агульначалавечым».

Скажам адразу: нам здаецца трохі дзіўным такое сцвярджэнне даследчыка. «Шлях любой паэзіі — у арганічным творчым яднанні традыцый нацыянальных і агульначалавечых». Гэта бясспрэчна, з гэтым мы згодныя, як кажуць, на ўсе сто працэнтаў. Але ж ці можна думаць, што з гэтым не згадзіўся б сам Багдановіч, той Багдановіч, для якога вопыт сусветнай паэзіі заўсёды быў, практычна быў адной з найгалоўнейшых крыніц узбагачэння нацыянальнага мастацтва.

Тут якраз была тая асноўная і першая думка, з якой ён прыйшоў у беларускую паэзію. Аддзяляць нацыянальнае ад агульначалавечага і наадварот Багдановіч ніяк не мог. Дапусціць, што Багдановіч у 1915 годзе адмовіўся не толькі ад сваёй галоўнай думкі, але і ад сваёй практыкі, мы таксама не можам. Добра, нават дапусцім: ён мог бязлітасна паставіцца да сябе, да сваёй творчасці і нават цалкам закасаваць яе, але ж творчасць усіх тых жа «Купалы, Коласа, Цёткі, іх папярэдніка Багушэвіча і інш.» так проста закасаваць ён не мог — гэта было б занадта наіўна для яго, занадта па-дзіцячы: няма мяне, няхай не будзе і вас! Не, тут нешта не так. У Ялце, хворы, на сконе сваіх дзён, Багдановіч знаходзіць суцяшэнне ў тым, што кніжку мае «з друкарні пана Марціна Кухты» — славуты «Вянок», у які густа ўплецены побач з васількамі кветкі з чужых палёў, дзе агульначалавечае і нацыянальнае паўстае ў непарыўным, гарма-

нічным, арганічным адзінстве. Не, не адракаецца ад сваёй творчасці Багдановіч!

Разгадку павінны мы шукаць у іншым.

Дарэчы, А. Лойка, калі пераходзіць да канкрэтнага разгляду вершаў «беларускага складу», як бы забываецца на «памылку» Багдановіча і даволі пераканаўча звязвае гэтыя творы з Багдановічавымі пошукамі эпасу, праўда, агаворваючыся, што мы маем тут справу са стылізацыяй пад фальклор. Стылізацыя — гэта закід Багдановічу, бо даследчык хацеў бы бачыць яго эпікам іншага, канкрэтна-аб'ектыўнага плана, накшталт таго, у якім выявіў сябе Колас, ствараючы «Новую зямлю». На думку даследчыка, «на пачатку XX ст. заставалася надзённай задача далейшага адкрыцця бытавой сферы жыцця, адкрыцця, якое спалучалася б з раскрыццём духоўнага складу народа і ўсебаковым паказам рэчаіснасці на ўзроўні дасягненняў самых развітых літаратур свету — самых лепшых іх традыцый». Багдановіч, паводле А. Лойкі, не робіць гэтага, бо памыляецца, і таму становіцца на ўсё той жа шлях стылізацыі.

Згаджаемся з А. Лойкам мы вось у чым. Вершы «беларускага складу» — сапраўды спробы эпічнага асэнсавання Багдановічам жыцця. Гэта эпас, але жанрава і метадалагічна адметны, свядома адметны ад таго эпасу, які здзяйсняўся ці здзяйсніўся пасля Коласам.

Гэта не подступы да такога эпасу, як схільны думаць А. Лойка, а нешта зусім самастойнае, цэльнае, пэўнае па сваёй канцэпцыі, задачах і жанру.

Вельмі важна помніць пра час, у які быў напісаны артыкул, бо менавіта з ім звязваў і палемічна завастраў свае высновы Багдановіч. Ён якраз і пачынае свой артыкул з абмалёўкі гістарычнай сітуацыі. Багдановіч піша: «Цяжкі ўдар прыняла на сябе наша краіна: на яе абшарах зышліся мільённыя арміі, точуцца бітвы, усё нішчыцца, гаспадарка гібеець, не тысячы, а сотні тысяч людзей павінны кідаць сваё дыісці па нязмераным дарогам далей, а куды — няведама; ісці, не знаходзячы прытулку, не маючы скарынкі хлеба, паміраючы і ад голаду, і ад пошасцей, не ведаючы, якую даць сабе раду». Багдановіч піша пра жахі першай імперыялістычнай вайны; напал вялікай народнай трагедыі, трывога за лёс свайго краю, праз які

так часта пралягалі крыжавыя дарогі гісторыі, чуецца ў гэтых словах Багдановіча. І як бы прадчуванне будучых вялікіх катастроф захавана ў іх. «І мы, беларуская інтэлігенцыя, будзем ратаваць іх (землякоў.— *М. С.*), як ратавалі і дасюль будзьма ратаваць і ў сваім краі і на чужыне, памінаючы ў гэтыя грозныя часы абяцанне, каторае ў сэрцы сваім даваў кожны з нас: сілы свае ахвяраваць роднаму краю». Вось у якія часы, вось з якімі думкамі прыступае Багдановіч да гаворкі «аб адным дужа вялікім недахваце ў беларускай паэзіі». І вось чаму гэты «недахват» здаецца яму менавіта «вялікім» — паэт хвалюецца за лёс усяго «беларускага». Можна зразумець Багдановіча: у мірныя часы магла і павінна была развівацца літаратура, маглі і павінны былі весціся прафесіянальныя спрэчкі на карысць гэтай літаратуры, якая пераважна была справай і клопатам інтэлігентаў і якая, у мірных умовах, павінна была, паступова вызначаючы сябе як мастацтва, і прасякацца народным духам і несці тым часам свой дар у народ. Вайна, народная трагедыя, магчымасць «неслыханных перемен» і «невиданных мятежей», усё зрушыла і ўсё перайначыла. Багдановіч баіцца, што літаратура ў тым выглядзе, як яна існавала тады, не здолее прынесці істотную карысць народу, што між ёй і народам развінецца бездань,— і вось чаму ён бачыць выратаванне ў вершах «беларускага складу», вось чаму ён, па сутнасці, ставіць пытанне аб народнай культуры, ступенню да якой ён хоча бачыць узведзены сродкамі літаратуры народны эпас. Гераічны эпас, дададзім яшчэ мы.

Багдановіч чуйна, як ніхто, успрыняў і адгукнуўся на новы сацыяльны заказ, ён адчуў, што гісторыя неўзабаве напіша самыя трагічныя і тым часам гераічныя старонкі ў лёсе роднага краю, што наперадзе новы ўздым нацыянальнай самасвядомасці. Ён выконваў заказ часу.

Калі ў пачатку XIX стагоддзя ў Чэхіі, разам з узнікненнем нацыянальнай буржуазіі, пачаўся імклівы працэс выпрацоўкі самабытных форм мясцовага жыцця, насуперак тым, хто ў культуры і грамадскім жыцці быў прыхільнікам і правадніком германізацыі, тады ўзнікла патрэба ў народным гераічным эпасе — гэтым заўсёдным пашпарце нацыі, і тады студэнт Пражскага універсітэта Іосіф Лінда знайшоў на лубках старадаў-

няй кнігі вершаваны ўрывак у 32 радкі. Гэтага было дастаткова, каб пачалася «ланцуговая рэакцыя», якая прывяла да стварэння ў кароткі тэрмін нацыянальнага гераічнага эпасу,— неўзабаве ён налічваў тысячу вершаваных радкоў. І не так тады важна было тое, што нават першапачатковыя 32 радкі, як пасля выявілася, зусім не былі старадаўнімі, што Вячаслаў Ганка, які следам за Ліндам апублікаваў некалькі гераічных паэм, проста падрабіў іх тэксты — справа была зроблена, «эпас» саслужыў сваю службу.

Багдановіч быў мастак, хавацца яму не было чаго. Ён верыў у магчымасць справы, распачатай ім, і не сумняваўся ў ажыццяўленні яе. Народнае — гэта аснова, гэта «дух» і «асаблівы склад». Не паўтараць народ, а ўзяць лепшае ад яго і аздобіць у формы, адпаведныя народнаму духу і складу. Даць энцыклапедыю народных, самабытна-нацыянальных уяўленняў аб свеце.

І такім чынам далучыць народ да культуры. Узятае ад яго вярнуць яму.

Багдановіч бліскуча справіўся са сваёй задачай. Яго «Максім і Магдалена», «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык», «Страцім-лебедзь», «Як Базыль у паходзе канаў», «Скірпуся», не перастаючы быць арыгінальнымі тварэннямі Багдановічавага генія, нясуць у сабе ўсе прыкметы фальклорнага мыслення, у ачышчаным, скандэнсаваным выглядзе выяўляюць найвялікшую эстэтычную і этычную каштоўнасць народных поглядаў, выпрацаваных на працягу аж цэлых стагоддзяў.

Не трэба думаць, што шлях, на які скіроўваў Багдановіч паэзію, прызначаўся ёй толькі ў адным гэтым, народным, рэчышчы, і тым больш на ўсе часы. Сам жа ён папярэджваў: «Намагаючыся зрабіць паэзію не толькі мовай, але і духам, складам твораў шчыра беларускай, мы зрабілі б цяжкую памылку, калі б кінулі тую вывучку, што нам давала светавая (найчасцей еўрапейская) паэзія. Апошняя праца павінна ісці поўным ходам.

«Памылка» Багдановіча была ў тым, што ён хацеў выправіць памылку самой гісторыі, якая не дала магчымасці нашаму народу стварыць сваю «Песню пра Раланда» ці «Песню Нібелунгаў», «Калевалу» ці «Эду». «Памылка» Багдановіча ў тым, што ён нейкім

чынам паўтарыў «памылку» Пушкіна, які пасля «Яўгенія Анегіна» і «Барыса Гадунова» даў цыкл выдатных сваіх казак, пераклаў на рускую мову «Песні заходніх славян». Песні гэтыя, дарэчы, з'яўляюцца таленавітай падробкай Мерымэ, які, трэба думаць, ведаў, хто і дзе мае патрэбу ў эпасе.

У «памылкі» Багдановіча, такім чынам, даволі даўняя гісторыя.

Незадоўга да смерці М. Забалоцкі працаваў над артыкулам, у якім выказваў неабходнасць па-літаратурнаму сістэматызаваць усё багацце рускіх былін, надаўшы ім сюжэтную цэласнасць, адкінуўшы ўсё другараднае, выпадковае, неістотнае. «...Аднак патрэба ў кампазіцыі,— піша ён,— непазбежна прымусіць адкінуць некаторыя трэцеступенныя сюжэты ці прыпісаць некаторыя дзеянні другім героям. Бянтэжыцца гэтага не трэба».

М. Забалоцкі зрабіў цудоўны вершаваны пераказ «Слова аб палку Ігаравым». Такую ж працу прарабіў на беларускай мове Янка Купала. Між іншым, і цікавасць Багдановіча да народнага эпасу і яго форм была творча зразумета Купалам, які напісаў сваю «Бандароўну», якраз кіруючыся прынцыпамі, якія спавядаў Багдановіч. Да новых форм рэвалюцыйна-канкрэтнага эпасу Купала ішоў дарогай Багдановіча. Абмінуць яе было цяжка.

І гэта яшчэ раз даказвае справядлівасць памкненняў нашага крытыка і паэта.

АПАЛОГІЯ

Усё гэта добра, скажуць нам, але нешта надта падазроным здаецца ваша імкненне зрабіць Багдановіча чалавекам, які ніколі не ведаў творчых паражэнняў і, тым больш, ніколі не памыляўся. Багдановіч — выдатны паэт, магчыма, нават геній, але ці азначае гэта, што ён быў поўнасцю застрахаваны ад памылак і няўдач?

Не, не азначае, адкажам мы.

Багдановіч, несумненна, як і ўсе, ведаў і горыч творчых паражэнняў, і пакутлівыя хваробы росту, а славутая музыкальнасць і гарманічнасць верша далася яму дарагой цаной: ён тварыў, вучачыся мове, і

вывучаў мову, творачы. Ён жа быў і стваральнікам мовы — у такой ступені, як Купала і Колас. І разам з тым ён, як і яго паплечнікі, шмат у чым сёння траціць з выпадку ўсё той жа нераспрацаванасці тагачаснай літаратурнай мовы. Пра гэта аднойчы справядліва пісаў Янка Брыль. І «рацыяналізм» Багдановіча, яго ўстаноўка на «спакойную думу» там-сям згубна адбіліся на некаторых вершах, але што значыць усе гэтыя плямінкі ў параўнанні з жывой, рухомай, бясконца разнастайнай матэрыяй ягонага верша, з тым вышэйшым, прасветленым пачуццём і думкай суладдзем, што пануе ў свеце ягонай паэзіі! Памылкі? У Багдановіча іх, дальбог, менш, чым нават прыпісвалася яму. Мы ведаем, які ён быў «дэкадэнт», ведаем, які ён быў «паэта чыстай красы». Багдановіча неяк заўсёды хацелі паставіць як бы збоч літаратуры і яе цэнтральнай плыні, а вось гэта і было памылкай, толькі не Багдановічавай, вядома. Больш цэнтральнай фігуры, чым Багдановіч, у нас не было. Па шырыні непасрэдна-творчага асваення нацыянальнай рэчаіснасці ён, можа, і ўступае, напрыклад, Купалу, але чым замяніць нам тое, што зрабіў Багдановіч як крытык і тэарэтык літаратуры, як эксперыментатар і перакладчык, наогул як асветнік у самым высакародным значэнні гэтага слова?

Ды нават і зробленае Купалам і Коласам, як паэтамі, не вызначалася б так сёння ў сваіх контурах і межах, каб побач з імі не было Багдановіча з яго здольнасцю адною рысаю пазначыць і назваць тое, што ў іншых разрасталася ў цыклы і паэмы. Багдановіч, як ніхто, умеў «закрываць» адны тэмы і адкрываць другія. Ягоны заўсёдны лаканізм, ягоная здольнасць бачыць з'яву цалкам, у мастацкай і сацыяльнай перспектыве — вялікая заваёва нашай літаратуры і Багдановічаў запавет ёй.

Багдановіч, побач з Купалам і Коласам,— тое трэцяе вымярэнне, без якога немагчыма перспектыва. З Багдановічам нам стала далёка відаць ва ўсе канцы свету.

І такая ранняя смерць! Каб пражыў ён больш, хто ведае, чым маглі б мы быць сёння, працу колькіх людзей мог бы зрабіць ён адзін — спакойна, аберуч, з яснай галавой і шчырым сэрцам. Дзе сёння былі б


яго гарачлівыя, ускінутыя над роднай старонкай коні?

Яго няма — ляціць яго «Пагоня».

Няма чытача ў яго «Маладзіка», «Красавіка», «Шыпшыны», «Пярсцёнка» — ва ўсіх тых зборнікаў, якія паэт планаваў наперад, якія меўся напісаць. Іх ён не напісаў. Застаўся адзін «Вянок». Не старайцеся ўплятаць туды новыя кветкі: тыя, што там, ніколі не завянуць. Сплятайце свае вянкі. Не старайцеся адшчыкнуць хоць адзін лісток ад тых лаўраў: тыя лаўры, перш чым стаць імі, былі цернямі. Паглядзіце лепш наўкол сябе: красуе жыта, і красуюць у ім васількі. Віруе жыццё, і нараджаецца ў ім прыгажосць. Жыве паэзія. І вечна свеціць нам і вабіць сваёй загадкай.

...У далёкай Ялце на магіле Багдановіча цвітуць касачы.

1967—1968



2

Прысніўся верш —не верш, а два радкі.
Абломак лодкі ўсплыў са дна ракі,
І кружыць вір счарнелую траву.
З абломкам лодкі к берагу плыву.
Прачнуўся. Дзень трывогаю прапах,
І два радкі гаркотай на губах.

З КНІГІ

«ЯДЛОЎЦАВЫ КУСТ»

1973



ШЧАСЛІВАЯ ХВІЛІНА

Азвалася сонца —
і птушка пяе.
Ельнік.
Вада.
Шэры снег у шыголлі, у лусках кары.
Прыпыніўся,
голаў падняў і слухаю так,
быццам апошні дзень жыву на зямлі.

МАЖОРНАЕ

Зноў вясна! —
прэч, адзежы зімы,
з цела, з душы, з учарашняй надзеі!
Вольны цяпер:
захачу —
горадам прарасту,
камяніцамі ў цёмнае неба.

Страпянуўся ад тупату ног,
ад крыку травы,
ад трызнення вады,
ад сп'янелага ветру,
што рвецца ў трамвайныя дзверы.

Стану смерчам рэклам,
стану ноччу і днём
і заложнікам першага грому.
Вольны цяпер! —
захачу —
над зімою паплачу.

* * *

Уздыхае мора, калышучы ўлонне хваль;
Тоіцца ўздых у начы, прахалодаю дыхае вечар,
На світанні ўздыхае, прачнуўшыся, вецер,—
А ўсё пайшло ад уздыху твайго і майго.

* * *

Разбіраюць барак пад маім акном,
разбіраюць спаважна,
як быццам дом новы будуюць.
Чуцен скрыгат і трэск,—
пыл ляціць,
і ляцяць
над баракам шпакі,
непазбежна і пругка, як вецер.
І ўсё дзеецца так, як трэба.
Хлопчык малы
тым часам на дрэва залез,
гушкаецца на галлі,—
дарослыя на яго
не звяртаюць увагі.
Дрэва, як цацку, яму аддалі,
каб не плакаў.

МОКРАЕ ДРЭВА

Дрэва кронай хістае,
нада мной навісае,
як лёс.
Ствол рыпіць,
як над безданню
цяжка нагружаны воз.
О, галлё заламі,
упадзі,—
на галінах столькі расы,
столькі расы,—
як слёз!..

ЭПІГРАФ

Я хачу напісаць радок,
толькі адзін радок,
які наіўны паэт
з галавой, кучаравай, як воблака,
мог бы ўзяць за эпіграф.

Напішу хоць бы так:
«Я аднойчы бачыў кепскага чалавека».

* * *

Неспадзяванкі чакаеш:
Грукне ў шыбіну гром —
Прарасце прадчуванне.
Дзверцамі грукне таксі —
Радасць у сваты прыехала.
Развярнулася, знікла таксі,
Твой пад'езд абмінула...
Неспадзяванкі чакаеш,
Забываеш
Проста жыць.

* * *

Новы дзень. Вітаю новы дзень.
З незнаёмай да таго пакорай
Я прымаю дождж ык, што ідзе,—
Можа, нават скончыцца не скора.

Вераб'ям не страшна пад даждж ом,
Ціўкаюць — мо жаласна, мо светла.
Пад шапоткім сцішаным святлом
Чалавечы твар нязвыкла ветлы.

Новы дзень — ні радасць, ні журба.
Прарастае парастак увагі.
У сціхуткай флейце спіць труба,
У малой дажджынцы — завязь смагі.

* * *

Такая цёплая вада,
Такая жоўтая вада —
Ад сонца, можа, у якога
Агністым вехцем барада.
Стаю ў вадзе, малы і босы,
Між пальцы шчэміцца трава.
А жабы кумкаюць. Як восы,
У вочы промні. Галава
Цвіце здзічэлаю сурэпкай.
Ад рабацiння твар пячэ...
І ўладай нечай, гэткай чэпкай,
Я і дагэтуль там яшчэ.

* * *

Хачу я з тым, з маленства хлапчуком,
Свае гады ў дарозе пераняўшы,
Спаткацца. Таргане ён плечуком,
Святло вачэй насустрач разаслаўшы.

Ступлю туды, на тую паласу
Таго святла, хоць нельга двойчы рэчку,
Філосаф кажа, перайсці. Нясу
Туды не стогн, не боль,
Тым больш — не спрэчку.

Ні ў чым, ні ў чым ён тут не вінават,
І я яму ніколечкі не вінен.
Хачу пабачыць толькі той пагляд,
Яго пагляд,— я помню, быў ён сіні.

І ўсё, і ўсё. Сагрэцца б толькі ім.
Цяпер бывай,— пара і развітацца.
І больш нічога.
Захад стаў як дым.
Залеглі цені. Стала нанач брацца.

ГЛУХАТА

Ноч. Сон не йдзе.
Чую, як гарыць цыгарэта,
Кінутая некім на вуліцы,—
Пад ліпу, на ссохлы прапалены дол.
Нянавісці да сябе
Праз сцяну не пачую.

ЗАСЦЯРОГА

Калі маўчыць душа, гібее розум наш,
Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру.
Жыццё лічы на дні альбо на кіламетры —
Вакол цябе адно панылы антураж.
І ўсё, што словам ты ні назавеш,
Маўчыць, як цішыня ці як вятрак без ветру,
І не даецца сэнс, нібы руцэ паветра.
Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш.

* * *

Ты пайшла,
ты чамусьці пайшла,
і я
стаў калодзежам без вады,
стаў вясновым кустом без лісця,
але болей за ўсё
стаў падобны на клетку,
якую пакінула птушка...

Чую, у садзе чужым пяе,
бачу між дрэў залачоную клетку.

* * *

І нехта з горачкі спускаўся,
І нехта некага чакаў,
І нехта ў нечым спавядаўся
І блізкі лес за сведку браў.

І я там быў і нешта клікаў —
Ды толькі тое ўсё сплыло
У свет, што стаў такі вялікі,
Што трошкі болей за сяло.

* * *

Ты — сяло, і я — сяло.
Нас звяло і развяло.
Рассадзілі нас па лавах,
Злыбяда — на покуце.
Ты — са славай, я — з няславай —
Налучыць бы польку дзе?

Ах ты, полечка-трасуха,
Дождж ідзе, дарога суха!

А ў вачах кругі, кругі,
Усміхаюцца багі
Тыя, што на покуце...

Ціха! Было гэта даўно
У нейкай вёсцы там.

* * *

Мяне пакінула ў пакоі —
Знарок, напэўна, каб я спаў,
Затым, каб грэшнае, зямное
Сюды парог не прапускаў.

І мне прысніліся дубровы
І на таку дзіцячы след,
Раней не сказаныя словы
І на касьбе скупы абед.

Дзень сарамлівы, дзень уцешны
Глядзеў з-пад дзедавай страхі.
І сон мой быў не так і грэшны,
Хоць сніліся мне і грахі.

ЭПІГРАМА

— Я выкарчую глупства,— ён сказаў,—
Глядзіце вось. А вам дзеля расады
Аддам вярхоўе — будзеце вы рады.

І павырасталі там пустазелля свечкі,—
Дурныя пасвяцца і мэкаюць авечкі.

* * *

Трамвай, як сараканожка,—
марудна імклівы і доўгі,
яшчэ да таго ж сляпы.
Асаджаны глуха і вусцішна
над стукатам нізкіх ног.
Трамвай, як сараканожка...
Не, не падабаецца мне гэтае параўнанне.
Параўнаю трамвай лепш з вожыкам,
што цвёрда і шпарка
бяжыць па падлозе — тук! тук!

* * *

Ноччу, тым часам, як спаў,
Зорка свяціла ў акно.
Ціха самотны павук
Ткаў для той зоркі мярэжы.

Потым ляцеў самалёт —
Гул яго біўся аб шыбы.
Кінуў мярэжы павук,
На падваконні стаіўся.

Тою хвілінаю я
Вочы расплюшчыў, прачнуўся.
Плакала зорка ў акне —
Ну а чаго, яшчэ ў сне
Я здагадаўся.

ЛЕТА. НОЧ

Неба хмаркамі парасло, як травой.
У прагаліне маладзік, расяны і тонкі,
Адзінокую зорку пасе.
Вострым промнем яна
Коле вока. Комін кацельні, як дрэва,

Угору расце, накрыўшыся шапкаю дыму.
Горад спіць. Пагляджу яшчэ ўвысь.
У аксамітавых неба затоках
Вунь і яшчэ зоркі цвітуць.

НА АДПАЧЫНКУ

Такі няпэўны час:
З натхненнем у нязгодзе.
Распрэжаны Пегас
Гладчэе на выгодзе.

Падковы есць іржа.
І прозе на спажыву
Дзядоўе (проста жах!)
Абсела хвост і грыву.

Шаленства у вачах.
Імчыць туды штосілы,
Дзе пасвяцца ў кустах
Звычайныя кабылы.

* * *

Жыць у суседстве дрэў, і траў, і купін,
Жыць у суседстве жыта і раллі.
Так бессмяротнасць, можа, і не купім
На гэтай ненадзейлівай зямлі.

Але ж і тое-гэтае спазнаем
У гэтым ненадзейлівым жыцці,
Каб сівізной расквеціцца, як маем,
І ў новы свет паціху адплысці.

* * *

Мне спавядаўся чалавек.
Яго уважліва я слухаў
І думаў: «Тое і ў мяне.
Ўсё гэтак, гэтак аж дарэшты».
Мяне спытаў ён: «Ну а ты?
Усё ў цябе, канешне, лепей?»
І я сказаў: «Канешне, лепш,
Але цябе я разумею».

НА АЎТОБУСНАЙ СТАНЦЫІ

«Не забуду матку родну».
Шрам яшчэ вунь на шчацэ.
Між станцыйнага народу
Ён з авоськай у руцэ.
Словы тыя: «Не забуду» —
Мне у вочы, нібы дым.
А яму цяжэй: усюды
Неадлучна яны з ім.
Мо па дурасці, мо шчыра
Вывеў — горычы таўром —
Іх тады, як горад вырваў
З роднай вёскі, дзе быў дом.
Што ж цяпер? Спацехі мала.
Як сабе даруе ён,
Што вязе ў абмен на сала
Мінскай выпечкі батон?
Што і лёс не так варожыць,
Што нялёгкі матчын век,
Што забраць яе не можа,
Ды і быць пры ёй не можа,—
І сумуе чалавек.
І стаіць. Блукаюць думкі,
Твар у ранніх змаршчаках.
Ну і я стаю. Ні сумкі,
Ні авоські у руках,

КОНСКІ БАЗАР

Вы бачылі ўскраіну,
дзе хаткі,
дамкі
і будыніны,
дзе няма магазінаў —
ёсць крамы,
кнігарні,
ларкі,
дзе тралейбус з апошнім
ці перадапошнім нумарам
валюхаецца вузкай вуліцай,
чапляючыся за платы?
Вы бачылі ўскраіну,
дзе рокі,
і твісты,
і шэйкі
гучнейшыя, чым у горадзе,
і дзе, калі рэзне гармонік,
разляжацца гэткае рэха,
што бубнамі робяцца
дахі,
падвойныя ніцыя вокны,
і весніцы,
і платы?
Вы бачылі гэтую ўскраіну?
Не бачылі?
Нават не чулі,
што недзе ёсць гэткае дзіва,—
празваны некалі Конскім,
адзін на ўвесь горад базар?
Паслухайце!
Гэта ж там!

ЛЕТНЯЙ НОЧЧУ ПАД ЗОРНЫМ НЕБАМ

Лёг, маленькі-маленькі,
На шамоткім плашчы
І падціснуў каленкі
Перад мечам начы.

«Хто ты? Што ты?» — пытае,
Ды адказу майго
Не чакае, карае:
«Хто ты? Што? Для чаго?»

Безадхланна, бясконца
Ноч пытанні прадзе.
О, хутчэй бы ўжо сонца
Новы вывела дзень!

ПРА МУДРАСЦЬ

Во сівізна — а мудрасць дзе?
А мо пакорлівасць бядзе
Завецца словам гэтым?
Бяда ідзе, бяду вядзе:
Калі міне, сустрэне дзе,
Пасварыць дзе са светам,—
Няўжо так важна? Прападзе
Няхай яно!
Ды дзе там!
Як ні стараешся — дарма.
Ні кроплі мудрасці няма!

НЕРВЫ

Прыйшлі — і пасталі, добрыя-добрыя.
Прыйшлі і пасталі, высакародныя.
Хто — ушчуваць, ну а хто — шкадаваць.
«Ах, як не сорамна!» «Эх, галава!»
Хто кіне прымаўку, хто — параду.
Чым жа аддзячыць ім за спагаду,
Чым заплаціць ім за пафасу звон?
Перш чым надумаўся, крыкнуў:
— Вон!

* * *

Цяжар душы — цяжар паднебных хмар.
Яны ідуць — грымотаў спелых сховы —
Самлелыя, як грузныя каровы,
Што не падоены праз ліпеньскі прыпар.

Пральецца дождж. Аціхне шэпт і звон
Жывой вады. І сіні дым павісне
Над стрэхамі. І скончыцца палон,
Зямны палон душы, што скрухай цісне.

Абноўленая, блішча далячынь.
І думаецца хораша: так трэба,
Каб хмары на зямлі знайшлі спачын,
Душы адкрыўшы светлы лапік неба.

* * *

Неўладкаваным быць паэт павінен,
Неўтаймаваным. Што тут гаварыць!
Сапраўднасці куды ён болей вінен
Таго, чым зможа заўтра аддарыць.

Балючым сэрцам, зрокам, галавою
Заложнік часу, служка — не герой,
Суддзю ахвотна ўзяў бы над сабою,
Каб толькі ўмеў не быць сабе суддзёй.

Глядзіце — вось! — не ў золаце апратка.
Маланка б'е. Цярусіцца імжа.
І час ідзе. І твар рассекла складка —
Сучаснасці і вечнасці мяжа.

* * *

Не было,
дальбог, раней не было
  столькі круглых і свежых вачэй, маладых,
  як раса на шурпатым лістку парэчак.

Матавасць смуглых шчок
    вось-вось румянцам пральецца.

Разумею,
    чаму так гавораць:
    кроў з малаком.
Няўжо і раней гэтак многа было
    круглых і свежых вачэй, маладых,
як раса на шурпатым лістку парэчак?
Азначае ўсё гэта —
старэем.

ПАРТРЭТ

То Скары́на. З-пад цяжкіх павек
Ён глядзіць з вякоў былых у век
Новых дум, трагедый, парыванняў.
О, глядзі, убач усё дазвання!
Гавары са мною — не хлушу.
Ты скажы — усё я запішу.

ХАЛАДЗІЛЬНІК

У халадзільніка ёсць душа.
У халадзільніка ёсць настрой,
які ў тэхнічным пашпарце
    пазначаны так: 60W і 100W.
Здаецца, інакш гэта завецца рэжымам, але я слаба
    разбіраюся ў тэхніцы, і мне прасцей думаць, што
    у халадзільніка ёсць настрой.
Калі я сяджу на кухні,— думаю ці чытаю,—
халадзільнік

    ля бока вуркоча, лагодна і мірна, бы кот.
Павуркоча і сціхне — і я пра яго забываю.
Пройдзе колькі хвілін, і раптам пачуецца шоргат,
а пасля ўжо —
    штуршок: адчуванне такое, быццам кот пад
    руку табе тыцкае пысай. І зноўку мурчыць.

Вы можаце мне не паверыць,
але паглядзіце ў тэхнічны
пашпарт,— там вы знойдзеце лічбы: 60W і 100W.
І вы тады ўбачыце, што я не салгаў.

ПОМСТА

Скажыце мне,
колькі вам год:
я вам пажадаю шчэ столькі,
шчэ столькі,
шчэ столькі
ну і паўстолькі,—
колькі,
пакуль не памёр,
жадалі і мне.

ПРАЗАРЭННЕ

Усё радзей мы кажам слова «друг».
Ёсць сябра, ёсць сусед, ёсць прыяцель, таварыш.
Сустрэнешся — «Здароў!» Гаворкі — тары-бары.
Ахвяр няма. Ёсць графікі паслуг.
І што ж рабіць? І хто тут вінават?
Маніць хіба сабе, што сам ты дружбы варты,
Што ставіў на яе — не тыя выйшлі карты,
Што роўны спіс ахвяр рэестру здрад —
Чужых, чужых! Канечне, не тваіх!
О, дзе ты, міг жальбы, здагадка, празарэнне,
Што роспач нашых здрад і холад адчужэння —
Усё дзяліць нам трэба на дваіх?
Балючы, страшны міг,
Выратавальны міг!

* * *

З дрэў
падалі кроплі,
і ў косым промні —
бачна было —
машкара таўклася.
На затуманенай вуліцы
ціха дзеці гулялі.
Сяду пад ясень
на лаўку:
стома
і сталасць —
побач,
маленства —
непадалёк.

* * *

Прысніўся верш — не верш, а два радкі.
Абломак лодкі ўсплыў са дна ракі,
І кружыць вір счарнелую траву.
З абломкам лодкі к берагу плыву.
Прачнуўся. Дзень трывогаю прапах,
І два радкі гаркотай на губах.

СКОНЧЫЛАСЯ ЛЕТА

Дзень ціхі, дзень дрымотны, як вада.
Смуглява-залацісты. Цёплы промень
Забавіўся на твары. Так пчала
Апошні раз цалуе памяць кветак.
Скупой журботай дыхае зямля.
Лісток альховы, скурчаны лісток
Спіць у абдымку з мёртваю казюркай...
І сонны бляск, і пробліск павуціння.

Вы здагадаліся: то скончылася лета.

РАЗМОВА З ЧАСАМ

Прыходзіць пара, настае той час,
І вось ужо я вывяраю і мераю
Табою сябе — мой уладны Час —
Тваёю,
        пакутна здабытаю мераю.

Не!
Я не хачу прад табой трапятаць!
Што ты без мяне? Без цябе таксама
Не здолеў бы скруху ў сабе затаптаць,
Не здолеў бы выгукнуць: «Веру! Асана!»

І ўсё ж ты не бацька мне. Я — не дзіця.
Сапернік я твой, хоць тваё спараджэнне.
Законы спазнаўшы твае, з небыцця
Не стану выводзіць сваё нараджэнне.

Ды зноўку і зноўку кажу я «але».
Не мыслі мной гэтак, як мыслю я робатам.
Не робат я, хоць і ў прысаку, тле
Стагоддзяў,— мільённая нейкая проба там.

Я — голас і думка, я — праўда і зрок.
Даў мову я камню, траве і расінцы.
Мой дзень — не імгненне, планеты віток,
Друкую свой крок на сусветным гасцінцы.

Спасцігнуць усё праз цябе я хачу,
Табою маё ўсё няхай апякуецца.
Знай пункты гульні.
А паруш — закрычу,
Аж голас у веку наступным пачуецца.

* * *

О як я вернасці баюся,
О як я вернасці жадаю!
Плачу даніну дзіўнай скрусе,
Калі табе кажу: «Кахаю!»

Плачу даніну дзіўнай здрадзе,
Што між пялёсткамі лілеі,
Прыдатная чужой уладзе,
Быць пэўнай пэўны час умее.

І ты, лілея, ты, лілея!..
Спякотны дзень трымціць бясконца.
Тады ўжо я паразумнею,
Калі цябе сасмажыць сонца!..

ЖАЎТАЦВЕТ

Сонца — сланечнік на сіняй градзе.
Промень-пялёстак на дол упадзе.
Промень падыме смуглявае лета,
Быццам істужку, у косу ўпляце
Дрэвам,
Гуркоўніку,
А закаханым ложак засцеліць
Колерам блізкай разлукі.

Жоўтым агнём разгараецца восень.

ЗАМЕСТ САНЕТА

Разумным сказана, што дурасці мяжу
Пазначыць гэтак цяжка — спрыту мала! —
Як высушыць у непагадзь кажух
Ці як бажка нізрынуць з п'едэстала.

Разумныя, глядзім: тут логікі няма,
Тут белай ніткай шыта надта груба,
Ды суцяшаемся — і часта так дарма:
Вось дурань. Прыйдзе час — і дасць ён дуба.

Але ж... Але ж смяротныя і мы.
Пенсіянерам па Інфарктэнштрасэ
Пацягнеш за сабою ўсе свае тамы
І ўсё, з чым пры жыцці недазмагаўся.

І дурасць за табой, як выжла, папаўзе,
Падсцерагаючы цябе ў смяротнай скрусе,
Чакаючы, што ў роспачы, тузе
Сцяг белы выкінеш і вымавіш: «Здаюся!»

О, каб мне мужнасць мець тады! Каб, як цяпер,
Вяршыць свой суд над ёй, над дурасцю сляпою!
Калі ж памру, мой друг, то не бядуй і вер,
Што тым грудком зямлі я ўзвысіўся над ёю.

* * *

Які прастор!
Які прастор!
Рукой падаць,
Рукой дастаць
Да зор!
Лячу увысь. Шчаслівае імгненне!
Ураз парваны путы прыцягнення —
І вольны я. І прагай распылення,
Пакутай гордаю самазнішчэння
Душа напоўнена.
    Вось выбух!
    На зямлі
Вы ў гэты міг хіба яшчэ жылі?

ПЛАЧ ПА ГАРСІЯ ЛОРКУ

У маіх вушах
                гудзе зямля —
грамчэй,
          чым тупат,
          чым тупат
тваёй кавалерыі...
                    Гарсія Лорка...
Над мёртвым схіліўся я.
Схаваны ты ў посцілку —
і не памераны.

Які ты быў,
як прывезлі цябе?
Ці ты падаўжэў,
ці паменеў?
Жандары,
мне кажуць,
стаялі
ў журбе?
Стаялі
маўчком на каленях?

І навошта — ім,
зразумець як іх?
Ім не быў — сваім,
не хацеў,
не меў
сярод іх
сваіх.

Ты жонку, скажы, адбіў у іх?
— Не!
Дзяцей іх вучыў хіба подласці?
— Не!
Паслухай, што я скажу табе...
Паслухай... Адкуль я знаю цябе?
З Гранадскай хіба,
з Магілёўскае вобласці?
Непадобны такі,
неспазнаненькі,—
на цябе ручнікі,
прынясёны з ракі,
пакладуць
заўтра
раненька.

* * *

І безуважна, як пятак,
Лісток мне жнівень пасылае.
Няхай. Бяру. Ніхто не знае,
Што можна гаварыць і так.

На ім пішу. Пазначыў год
Дакладны — вёсны, лістапады.
Лісток мне родны той. Прыгод
Адных мы — бо спазналі страты.

Радок знячэўку напішу —
Няхай ляціць у свет крылаты.
Вазьму на прывязь я душу,
Мы з ёю вернемся дахаты.

Лісток ляціць у свет крылаты.

* * *

У горадзе,
пасля дажджу,
на плошчы знаёмай,
дзе болей машын,
чым знаёмых людзей,
ля брыжыка тратуара,—
адшліфаванага так нагамі,
як у пад'ездзе колішнім
нашым
лесвіца,—
у лужыне з восеньскім жоўтым лістком
мільгнуўся адбітак твой...
Ты была ці не ты?

Рушылі людзі.
Быў светафор і машыны.
Ты была ці не ты?..
...не разглядзеў.

* * *

І зняверваўся колькі, і колькі разоў
Апасля прараслалі надзеі —
Як рыпенне тугіх палазоў
З белай замеці, з белай завеі.

Ды не жвавы стаеннік-агонь —
Знак заручынаў і збавення —
Вынікаў — проста конь, проста конь,
Цёмны прывід твайго адчужэння.

Не суняць, не суняць, не суняць
Яго цяжкакапытнага бегу,
Не растаць, не растаць, не растаць
У той грыве завейнаму снегу.

* * *

Ты — ты, якую не спазнаў,
Якую блізка ці спазнаю,
Чаму цябе, навошта ўзяў
Суддзёю строгаю — не знаю.
Глядзі, вунь тая ягамосць
Бяду прынесла — так, бядую.
А гэтую, як маладосць,—
Чужую ці сваю,— шкадую.
А тая (ёй не навіна)
Пайшла — яшчэ палае памяць,
А перад гэтаю віна
Яшчэ дагэтуль сэрца паліць.
Мне б павініцца: на зямлі
Адной жывём. Ды ёсць імгненні
Для іх, пакрыўджаных, калі
Страшней, чым здрада, прабачэнні.
А ты, бясстрасная, а ты
Што мне параіш, што падкажаш?
Неправаты, як нематы,
Баюся я. Дык што, разважыш?
Не скажаш ты, што ўсё міне,
Саюз наш строгасцю пазначыш...
Ты па сабе або па мне,
Рукамі твар закрыўшы, плачаш?

* * *

Згасаеш? Ну, згасай! Навошта варушыць
Вуголле шэрае, каб іскрынку пабачыць?
Згасаеш — ну згасай! Хоць горка на душы,
Хоць ведаю, што гэта ўрэшце значыць.

О гэты дым! Казыча уваччу —
Так здрадліва слязу, прытворна выбівае.
Не, плакаць не хачу, смяяцца — не хачу,
Зацяўся і маўчу. Хай так цяжар спадае.

Я пісем не палю. І песень не кляну:
Яны былі, прайшлі і, значыцца, прапеты.
А пісьмы? Хіба што рукою іх крану —
Жахліва! Бы знайшоў трамвайныя білеты,

Схаваныя на шчасце. І цяпер
Глядзіш на іх, спакойна разважаеш,
Якое шчасце браў ты напавер,
Калі, чаму? І хоць забі — не знаеш.

НЕПАГОДЛІВЫ ДЗЕНЬ У ГАРАХ

«Глядзі, імглою хмарнаю спавіт
Халодных гораў вечны краявід.
Як змрочна! Долам сонца не стае».
— За хмарай строма неба дастае.

«Які пануры, надакучны дзень!»
— Шануеш сонца, дык шануй і цень!
Прагляне сонца — і табе яшчэ
Гарачай смагай губы апячэ.

«Як хмары, думкі чорныя паўзуць,
А ім арлом бы ў паднябессе мкнуць».
— Пральецца хмара сонцам і дажджом,
Павісне думка раненым крылом.

Чым вышай горы, бліжай да нябёс,
Чым вышай думка, нешчаслівей лёс.
«Маўчы! Мне сонца не аслепіць воч!»
— Ты не заўважыў, што настала ноч...

* * *

Лене

І зноў цябе заву,
Маленькую, малую,
Схіляю галаву
І холад воч цалую.

Навошта верыш мне,
З якой такой нагоды?
Хоць не сказаў я «не»,
Ды не сказаў і «згода».

Так згубна, знаю я,
Забыць ратунак меры.
Балюча мне ўдвая
Ад той наіўнай веры.

Не, не, я не хачу
Пакарыстацца ёю,
Хоць знаю — заплачу
За кожны міг з табою.

Я зведаў больш, чым ты,
І ў часе адцвітання
Мне як дакор кветы
Нясмелага кахання.

Мне б лепей у журбе,
У думках і здалёку,
Ў табе і пры табе
Шукаць сабе палёгку.

Чаму ж цябе заву,
Маленькую, малую,
Схіляю галаву
І холад воч цалую?

* * *

Над словам і над гукам,
Даўмеўшыся пары,
Спярша на рукі хукай,
Пасля ужо твары.

* * *

Яны талмудзяць і глякуюць,
У іх сабака ў доме ёсць.
Прадбачу хвілю, у якую
Да іх прыходзіць раптам госць.

З якой, з якой, з якой пустыні?
Абтрос ён пыл вунь з тых дарог.
Няхай вячэра ваша стыне.
Хацелі бога вы? Ёсць бог.

ФАЛЬКЛОРНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ

— Ну й мы з табой народнікі,
Прыгоднікі — ля-ля!
Калодзежна-калоднікі
Асвера жураўля!..
— Мацвейка, чуеш?.. Што ты — «ох»!
— Я чую, брат. А-ёй...
Не пусціць жонка на парог...
Забыў? Прыехалі удвох
І сталі на пастой.
— Чакай, чаму мы тут з табой?
— Абраз адзін шчэ таргаваў
І самагонку нюхаў...
— Уга, мне не ставала спраў...
— Хадорчык ледзь не даў ім плюху.
— Каб знаць, ні каліва б не браў:
Баліць, сват, нешта галава.
— Маўчы, бо ўчуюць тыя два.

Людзей па свеце носіць,
Няведама што просяць.
Цішэй, а то запратэстуюць,
Калі размову нашу ўчуюць!..

І праспяваў тут певень раз —
Стары, як прызба і абраз.

* * *

Памыўся снегам ён,
Павыціраўся ветрам.
Імчаўся наўздагон
Бясконцым кіламетрам.

Ты верна, конь, служы
Яму часінай тою,
Калі няма мяжы
Між небам і зямлёю.

ПАРТРЭТЫ

Памяці Сымона Блатуна

1

Каб павучацца нам чытаць партрэты...
Глядзяць адтуль нязнаныя прыкметы,
І лес глядзіць, як пад'ярэмны вол,
Вяшчуючы, калі ранеты-светы
Пападаюць да вечнасці ў прыпол.

2

Аблічча сябра ўчора я сустрэў —
Не сярод красак, ці травы, ці дрэў
(Я не трымаю дзень той у сакрэце) —
У выпадкова купленай газеце.

3

Які ты стаў — раптоўна не жывы —
Маёй мне не ставала галавы,
Каб зразумець...
Ну што ж, фатограф той
За тое не адкажа галавой...

4

Знаёмы твар, нявыразны пагляд.
Знаёмы твар — нябожчыцкі квадрат,
Што незнаёма-чорны і густы...

5

Навошта мне з сініцамі кусты,
Кустоўе тое, дзе калісь і мной
Быў птушак спеў прыручаны зімой,
Быў птушак спеў прыручаны і ўвесну?
Хай сёння не згаджаюцца на песню.
О сябра мой, хай будзе супакой...

6

Глядзіць партрэт —
Хто выраз той пазначыў?
Чаму ж раней я гэтага не ўбачыў,
Чаму ж раней не здагадаўся я?

7

Хай будзе пульхнай для яго зямля...

З НАРОДНАГА

— Шчасце вырвеш,
Шчасце вырвеш,
З горам развітаешся!
Шчасце — выйгрыш,
Шчасце — выйгрыш,
Як ты, браце, маешся?

— А я маюся,
Не хістаюся,
Ах, я шчасцем у другіх
Пазычаюся.

— Пазычаўся, брат, і я
Да палучкі-шчасцейка.
Дружбакоў, сяброў — сям'я!
Толькі выйшла застаўка...
Конь стаіць вунь пад гарой.
На ім збруя ўся...
Адыходнаю парой
Па-ца-лу-ем-ся!..

* * *

Зіма. Навошта сумаваць,
Гібець у снегавым прымусе?
Хачу я думкай веславаць
Туды, дзе лета доўжаць гусі.

Не думаць: вырай ім палон.
Хіба палон ім — сонца гранне.
І лёт за сонцам наўздагон,
Дзе сам адлёт і ёсць вяртанне?

Лячу за імі. Санцавей
Увысь падняў, залоціць крылы.
Матлюгай аж да самых вей
Зямля аблічча засланіла.

* * *

Над комінам дым — журба,
Хмарка на небе — журба.
Навокал вясна, вясна,—
Як молада пеўні пяюць!
Чарствее капытны след,
Чарствее пад ветрам твар,
І ўсё за лес, за лес
Хмаркі плывуць.

МЕСЯЦ ЛЮТЫ

Вясёлы месяц люты,
Мяцеліцай раскуты,—
Шумі вятрамі, грай!
Вятры пабралі лютні,
Імчаць у свет бязлюдны.
Праводзіны?
Адходзіны?
Зіме?
Гэй, пачынай!
Давай!
Давай!

Ах, ах, ды ў гэтым месяцы
Яшчэ забіты весніцы,
Марозам прымарожана,
Прымружана
Шчэ лужына
Завейлівым сняжком.

Гудзе вятрамі вуліца,
Як бубен дом.

Мяцеліца пасцелецца
Ад рання да цямна.
Апоўначы насмеліцца
Адліга —
Месяц крыгай
Да самага відна.
А зорка — во свавольніца! —
Пад раніцу расколецца
Аб шыбіну акна.

— Скажыце! Навіна!

Кажыце не кажыце,
Ідзе вясна!

НА АДЫХОД ЗІМЫ

1

Марозны дзень. Ледзь чутна сіняе,
Паветра стыне. Вунь гара,
Дзе елкі несуцэльнай лініяй
Высока значаць небакрай.

А мне відно як на далоні
Паставу кожнай і абрыс.
У паасобку па адхоне
Яны ідуць спаважна ўніз.

Ідуць падобна — непадобна,
А снег на вецці — як пасаг.
І ў кожнай, як дазвол асобны,—
Свая асобная краса.

Вунь вёска. Там дымок узняўся
Над комінам — заляжа цень...
Не хочацца, каб паўтараўся
Днём учарашнім гэты дзень.

2

Назаўтра вецер быў — і пабяднелі елкі.
Перамяло палі сумётамі. Пагоркі
Шурпата-шэрыя. Здалёк відаць: ільсняцца
Сухім і шорсткім бляскам — пралыселі.

Бяда ўжо будзе лыжніку. Яму
Так схочацца хутчэй туды, дзе беллю
Хрупастка-чыстаю азначана лагчына.
(Зляжалы, белы, нетутэйшы снег!
Рукаў мятлюгі, выпетраны ветрам.)
Крычыць здурнела грузная варона,
Ёй вецер пер'е рве, калі яна садзіцца,
Зрабіўшы круг няўмелы, на камлыгу.
Дарогай гонкай едуць цыганы.
(Бульдозер ранкам быў,
Пасля ішлі машыны.
Цяпер на ёй цыганскі санны след.)
Ускраіна бо тут. Жывуць тут цыганы.

3

Жаўрук, ты тут зазімаваў
Ля сметнікаў, каля сумётаў.
І дзень пры дні — так многа спраў!
І столькі многа пералётаў!

А крылцы — кволае вясло —
Знайшлі табе упынак.
Перанясло і занясло
Цябе на мой прыпынак.

Чакаў аўтобус. Наўпрасткі
Ішоў з таго пагорка я.
Не клюй, не клюй з маёй рукі
Табакі крошкі горкія.

4

Вечар быў, вечар. Вось раніца.
У гэтым адкінутым шкле
Фортачкі адбіваецца
Лыжніца звонка.
                    Але
Помню, як сонца з'інелае
(Барвы сухія былі)
Нераспела-даспелае
Ціха зайшло за палі.
Што не збылося — збывалася.
Ты прачакаў мяне, конь!
Шчасце ціхутка падкралася
І казытнула далонь.

5

«Дождж-грыбасей, снег-крупасей...»
Адкуль вы мне прысніліся?
«Касіць касе, бываць расе» —
Са мной дзе разлучыліся?

А я-то думаў, думаў я
Пра песню непрапетую:
Злаўлю пад паху салаўя,
Зіму з ім пералетую.

Ах, салавейка, салаўчо,
Галоўка несуцешная!
Ды ў любай лёгкае плячо,
Душа такая грэшная...
. . . .
Дождж-грыбасей, снег-крупасей,
Зглуміце ўсе няўроды!
І год, і два, і год, і два —
Ідуць гады і годы.
— Э-э-х!

6

Весялей глядзі на свет!
Не забыўся, помніш гэта?
Бо сярод другіх прыкмет
То — найлепшая прыкмета.

Ёсць бяда, і гора ёсць?
Але ж радасць ёсць таксама.
На зямлі яна не госць —
Змрочнай драмы антыдрама.

Весялей глядзі на свет!
Не забыўся, помніш гэта?
Бо сярод другіх прыкмет
То — найлепшая прыкмета.

ДРУГАЯ ВЯСНА

Вясну ізноў я сустракаю так,
Як і мінулы год. Адліга, снег, узгоркі,
І лыжнікі, і каміноў пах горкі
Ад блізкай вёскі. Ды без іх, аднак,
Тых цыганоў, без коней іх — сваіх,
Не крадзеных у добрых ці ліхіх.
Без іх сабак, што не на ланцугах,—
Без іх цыганскіх, сцерагуць якія,
Не баючыся стрэльбы альбо кія,
Знаёмы пах, знаёмы дах.

Тут вёска блізка, блізка каміны...
Сюды не заязджаюць цыганы...

* * *

Душа не то поет, что море...
Ф. Цютчаў

Прайшло, мінулася, як дым...
Няпраўда. Жыў я не затым.

Няхай у гордай паняверцы
Сабе мы кажам «трын-трава»,
Зусім не тое тчэцца ў сэрцы,
Што часам трызніць галава.

І боль, і смех, сваім павевам
Ускалыхнуўшы сон душы,
Памруць, але не згінуць. Дрэвам
Такой не дадзена мяжы.

Свайго няма для іх. І травы,
Хоць імі прарастаем мы,
Не пад цяжарам гнуцца славы,
І не ад скрухі лес нямы.

Няхай не так. На гэтым свеце,
Калі закончыцца мой век,
Жальбу травы усё ж не вецер
Спасцігне — родны чалавек.

* * *

Абнаўлення хачу я, хачу абнаўлення!
Ад нудоты, ляноты, ад сумоты збаўлення.
Хай пакута, хай роспач, хай бессань трывог.
О вясновае поле! Абноўлены плуга нарог!

Цёмны гром прагрукоча над шэраю пусткай
аблог.

ОДА ПРОЗЕ

Люблю я прозы дух цвярозы,
Яе густы, зямляны дух.
Яна і жартам, як сур'ёзам,
Карчы варочае за двух.

І не стамляецца тым часам,
Глядзі, паэце-рызыкант.
Заместа жвавага Пегаса —
Худы каняга Расінант.

Цішэй — далей. Не ведаць згубы.
У слоту цягне і ў буран.
Ды не глядзі яму ты ў зубы,
Паэце-браце, як цыган.

Ты мо здзіўляешся, што прозе
Я оды вершыкам пішу?
Яшчэ мне з ёю па дарозе,
З дарогі селавой на возе
Шчэ з ёй уз'еду на шашу.

З КНІГІ
«ЦЕНЬ АД ВЯСЛА»
1979



* * *

Так! Пад ценем вясла
утрапёнай вады вуркатанне,
пеннай бурбалкі ўсхліп,—
так! Пад ценем вясла —
цень на дне, цень, стракаты ад сонца,
ад кропак і косак маўчання,
трывання,
працяжнікаў, клічнікаў перасцярогі,
ад строгіх фігур дапушчэння,
здзяйснення,
здзіўлення,
ад вектараў сілы,
што ў наступ ідзе без адхлання,
перамагае і нішчыцца
паўзаю раўнавагі...
Так! Пад ценем вясла —
праз дзень неадчэпны вяслую.
Бераг далёка.
Не менее ў сэрцы адвагі.

* * *

Паяднай пачатак і канец —
Азарацца памяці скляпенні,
Каб пад імі сталі палымнець,
Ясніцца мінулыя імгненні.

То не проста зноў пачаты бег,
То жыццё, адчутае прыкметай,
Як праз снежань адчуваеш снег,
Як праз промень адчуваеш лета.

Але ж то і сіратлівы дом,
Нота, што адлучана ад спеву,
Плынь ракі, што сталася ільдом,
Контур голля на бязлістым дрэве.

Мы адчуць іх можам — не вярнуць,
З іх быццём даступна-недаступным,—
Іх, што ў дні аднолькава жывуць —
У мінулым, сённяшнім, наступным.

* * *

Гэтым дрэвам вясёла шумець!
Ліхтары раздзімае вецер.
Мне б такую вясёласць займець,
Як у гэтага цёмнага веццях.

Закіпаюць макушы. Вярцень.
Лісця прывіднае свячэнне.
У нізах цяжка глухне цень,
Па-над ценем снуюцца цені.

Гэтаксама і ўдзень было,
Ды не гэтак сnаваліся цені.
Перайначвала дня святло
Ўсё на бляск, на смугу, на зіхценне.

Ускіпала тады святло,
Вецер лісце гартаў, як пялёсткі.
Але гэтак жа добра было
Слухаць бег яго лёгкі і порсткі.

АДГАЛОСКІ

Рыгору Барадуліну

I

Вось дзень, для вока несуцешны.
Імжа. Крык галак над гарой.
Ды ад надвор'я незалежны
Хвіліны гэтае настрой.

Сярод пахмурнае прыроды,
Падлеглай смутку ці жальбе,
Міг нетутэйшае лагоды
Заявіць раптам аб сабе.

Нібыта сярод гэтых лужын,
Камлыжын мокрых і кустоў
Прышэсцю нейкаму ты служыш,
Якому быць гадоў праз сто,

Якое поклічам дачасным
У зман дачасны не звяло,
Якое і пры сонцы ясным
Табе згадацца не магло.

II

Пачуцці тыя, што злятаюць
Сярод будзённасці на нас,
Нас над будзённасцю ўздымаюць,
Як надыходзіць іхні час.

Тады і ўладна, і прывычна,
У час прызначаных хвілін,
Душу расчульвае і кліча
Аб нейкай страце успамін.

Тады здараецца пабачыць,
Як пасівелыя сябры
Над песняй просценькаю плачуць,
Нібы ў той прыказцы бабры.

Тады журботна ўгнуты плечы
І дарагі боль даўніх ран.
Тады наступнасці агеньчык
Міргне, як быццам праз туман.

* * *

Надыходзіць пара
Падрахункаў, няйначай.
Пасядзім ля кастра,
Памаўчым наастачу.

Усчынайся, агонь,
На грахі, на правіны!
Загарайся, аблонь,—
Дойдзе да сарцавіны!

Не пачнём наракаць
На бязлюддзе, бяздолле,
Хоць не доўга чакаць,
Як патухне вуголле.

Ты дары раздары —
Чым часіна благая?
Ах, як слаўна гарыць,
Як высока шугае!

УЧЫНАК

Надламацца пад ношкай жыцця —
пабурыцца маланкаю ссечаным дрэвам.
Раскашавацца, расці —
гэтак, можа, і лепей.
Толькі варта б і дзякуй сказаць
сцеражліваму грому,
спагадна-лагоднай маланцы.
Так ці не?
Ды за дзякуй
пазбавіцца можна
і ўласных учынкаў, вядома.
Так ці не?
Папытаем давайце ў дрэва,
што такое учынак?

* * *

Стамляецца нават метал.
Падшыпнікі, шарыкі, ролікі,
Сыграўшы часовыя ролейкі,
Растрачваюць гарт і запал.

Ідуць праз якія мілі
Выпрабаванняў якіх
На могільнік — аўтамабілі,
На пераплаў — цягнікі?

З якім застаецца запасам
Трываласці атамны век?
І як сябе чуе тым часам
Наш пры́яцель чалавек?

* * *

Аляксею Пысіну

Усім сказаць: была, была бамбёжка.
Цяпер забылі — лепшая пара.
Не вінавачу, калі хлеба крошка
Не вартая ні здрады, ні дабра.

Тым не забыць, хто ў сорак першым горкім
Пад плач дзяцей, пад стогны і праклён,
Пад невыносны гук чужой гаворкі
Страляў і падаў — і зазнаў палон.

Тым спачываць, хто паў на чэрствым полі —
Нат не паклаў на шапку галавы.
Таго душа крычыць яшчэ ад болю,
Хто помніць іх, маркотны і жывы.

ПАРТЫЗАНСКАЯ ГАРМАТА

Ад даваеннай гаспадаркі,—
Так парашылі кавалі,—
Лафет і колы ад жняяркі
На справу новую пайшлі.

І ў помач баявым парадкам,
Пад сам Кастрычнік акурат,
Разжыўся дзёрзкаю гарматкай
Ляснога воінства атрад.

Яна, у немчуры пад бокам,
Малым укрытая гайком,
Страляла, бахала з падскокам,
З вясёлым творчым аганьком.

І ўжо ў якіх ад той завейнай
Пары мітрэнгах ні была!
І, ацалеўшы, да музейнай
Шаноўнай цішы дажыла.

Рабіла ў полі, ваявала,
Загартавалася агнём...
Яе адну мы на аралы
Ніколі не перакуём.

ЭПІТАФІЯ

Эпоха
шчодрай была:
20 мільёнаў ураз пахавала.
Эпоха
скупою была:
Слязамі за кроў плаціла.

* * *

На міг здалося: век пячорны
Прыйшоў пад гарадскі парог.
Цень ад кастра пудліва-чорны
У вузкай яміне залёг.
Сягоння зранку экскаватар,
Зямлі пакінуўшы груды,
Капаў прызначаны фарватар
Для сцятай трубамі вады.

І вось цяпер зусім не лішнім
Пячорны гэты здаўся міг
Людзям, што ў позні вечар выйшлі
Ад тэлевізараў і кніг,—
Хоць і было зусім не звычным,
Як у праваліне двара
З святлом у вокнах электрычным
Святло змагалася кастра.
Угору полымя шугала.
Здалося, чулася здаля,
Як пад асфальтам уздыхала
Ушчэнт прамерзлая зямля.
І з бліскам полымя на твары,
Пячорны не прарочыў век
І быў не страшнаю пачварай
Камбінезонны чалавек,
Што прад сабой расставіў рукі,
Агню аддаўшыся ў палон,
І слухаў ціха, без прынукі
Трамвая дальні перазвон.

ЦЫКЛОПЫ

Кладуць у лазні печ цыклопы
І клепяць поначы катлы.
Нішто сабе прыдбалі клопат,
Няйнакш Люцыпара паслы.

І там, у лазневай цямнечы,
Рашылі ўжо, каму быцьмець
У іх катлах, на іхняй печы
Ці то гарэць, ці то смылець.

Няхай пяклуюцца цыклопы —
Такой нам шкоды, далібог!
Упадабаем іхні клопат,
Як толькі ступім на парог

Тае цыклопаўскае лазні,
Дзе згонім венічкам паты,
Дзе будзем мы, такія блазны,
З самім нячысцікам на «ты».

З ДАРОГІ

Святло запаліў, распрануўся,
на люстэрка павёў краем вока.
Ад святла па кутах пахаваўшыся,
няўцямна пенаты маўчалі.

Стоячы перад люстэркам,
ён доўга сябе пазнаваў.

Пасля ўжо яго абступілі пенаты.

«Стаміўся»,— хацеў ён сказаць.
«Вярнуўся»,— сказаў ён пенатам.

ПОЗНІЦЦА ВЯСНА

Лянівай сцяты прахалодай,
Нясмела абудзіўся клён.
Вясна з відочнай неахвотай
Ідзе у сонечны палон.

Дажджы за морамі паснулі,
На ветры петрае лаза.
Зіма у снегавай кашулі,
Глядзі, шчэ вернецца назад,

Каб раўчуковыя маршчыны
Зраўняць, каб сцішанай бядой
Пазначыць заўтра свіст шпачыны
І голас пліскі над вадой.

Незразумелае трыванне
Ва ўсёй прыродзе. Час нуды,
Развагі і супрацьстаянне
Нішчымнай хмары і вады.

* * *

Напярэймы нягодзе
Узніму галаву.
Загукаю прыгодзе:
«Гэй, дзень добры! Жыву!»

Ах, як трушчана, біта —
Лістабой у лясах.
Ах, не шыта, не крыта —
Сівізна ў валасах.

Ды вясна ці то восень
Не на злом галавы.
Няхай крыўды адносяць
У край-свет журавы.

Хай вяртаюцца з весняй,
Добрай весткаю ў дом,
З жаўруковаю песняй,
З капяжовым цурком.

ЖАНЧЫНА Ў АКНЕ

З акна жанчына птушкаю з гнязда
На двор глядзіць. Бы крылы, ўзняты плечы
На падваконні, рукі пад грудзьмі.
Птушыны нораў, воблік чалавечы
У насцярожным руху галавы,
У прыхаваным пад надброўем воку,
Ва ўсёй цікаўнай чуйнасці яе,—
Я гэта бачу, хоць гляджу здалёку.
А на двары зацішак. Цёплы дождж,
Дождж красавіцкі адышоў краплісты.
Святло і цені ў лужынах,— яны
Глушэюць, але ззяюць густа й чыста,
І верабейкаў голас чуць. Яна
Глядзіць туды, дзе на малой алейцы
Гуляюць дзеці ў «ножыка». Адзін
Вунь курыць нават. Ах, узяць бы лейцы!

Вісіць бялізна ў кухні на шнурку.
Глядзіць на двор ізноў. А час паволі
Ідзе... «Ах, лейцы трэба!» Пра сваё:
«Муж на рабоце, а малы — у школе».

* * *

Мне звышнадзённай тэмы не падняць,
Як не пазбыцца і лірычных трантаў.
Як барытону можна заспяваць
Напружана-задзірыстым дыскантам?

Каб так зрабіў, каб гэтакі наіў
Мяне завабіў на сцяжынку моды,
Дальбог, павыміралі б салаўі
На ўчастку мне адведзенай прыроды.

Мне б так сказаць: «Я здолеў заручыць
Сябе з ўласнай думкай і свой голас
Птушынай песняй здолеў надтачыць,—
Сабраў расу, якою ўмыўся колас».

ПЕРШЫ СНЕГ

Калі там хмара набрыняла,
І хто там вецер зацугляў,
Ды толькі з ночы ўранку ўстала
У новай вопратцы зямля.

Паспакайнелы, вунь імгліцца
Празрыстай беллю чорны клён.
Вунь пасмялелая сініца
Ужо наведала балкон.

У белы свет адкрыты дзверы
Для азмрачнелае душы.
І дзень, як чысты ліст паперы:
Устрапяніся і
пішы.

* * *

Ты пачакай.
Навошта гэта?
За ўцёкі ў вершы не карай.
Не рай чакае там паэта,
А калі рай — пакутны рай.

Ідуць там за спякотай сцюжы,
За промнем следам змрок ідзе.
Павер мне, без калючак ружы
Не адшукаў там анідзе.

І ўсё ж чакаю, бы калісьці,
Што, перарваўшы змроку ніць,
Усход такою сілай блісне,—
Струна ў тумане зазвініць!

* * *

Бывае ўсё-такі зайздросна:
Вось ты высільваўся, пацеў,
А твой радок надзіва проста
У вершы сябра заляцеў.

І там шчабеча і свіргоча.
І на галінцы на чужой
Ужо ніяк прызнаць не хоча
Тваю уладу над сабой.

І паспрабуй за гэту здраду
Ты пакараць яго, аднак!
І каб жа адбываў там рату
Па дружбе нейкай або як —

Дык не! Яшчэ кіёк і кайстру
Табе без жалю падае,
І не табе ўжо ён, а майстру
Хвалу і трубіць і пяе.

УСКРАІНА. МЯСАКАМБІНАТ

Тут размова такая
Ля піўное ракі:
Атрымаеш — трымаеш:
Не ўпусціць бы з рукі!

Жоўтым бокам ільсніцца
Піва добранькі гляк.
Як напіцца — пабіцца:
Не пабіцца бы як?

Тут мясцовая Лора —
Паспрабуй наракаць! —
Завіхаецца скора,
Ходзіць спрытна рука.

Пра заробкі, адробкі
Тут згадаюць не раз.
Жарабкі і жаробкі,
Прытрызніўшы папас,

Каля блізкага плота,
Дзе машын доўгі рад,
Не сваёю ахвотай
Мысляць пра сервелат.

А падсвінак і волік
У прымусе адным
Ужо далей ад волі,
Чым ад крамнай цаны...

Вунь на ліпах і клёнах
Сонца нізкага куль.
Вунь і татку дзіцёнак
Таргануў за руку.

І ТАДЫ...

...І тады
дзень учарашні
шукаў сябе сённяшняга
у тралейбусах
з парнаю лічбай
(былі ўсе няпарныя лічбы),
быў сандзень у кожным кафэ,
і ў горадзе дзевяць адразу
адкрылася новых базараў.
Тады паявілася мода
на выйгрышы па латарэі.
І аб'явілі па радыё
(падалі ідэю пажарнікі),
што неспадзеў паявіўся
у раёне Праспекта
мядзведзь...
...бо тады
дзень учарашні спраўляў
у сённяшнім дні пахмелле...

* * *

Вось тут, далёка ад сталіцы,
Паблізу ісцінаў старых,
Жыву, як выгнаны патрыцый,
Грыбы збіраю у бары.

Шукаю вернай панацэі
Ад розных там душэўных ран
Тут, у бярозавым ліцэі,
І на рысталішчах палян,

Дзе конікі прымаюць старты,
Дзе збоч, як быццам бы арлы,
Падлёткі сочаць дол упарта
З сасны — тарпейскае скалы.

Паганец, я малюся богу
Румянай поўні і схадка
І, захінуты ў ночы тогу,
Сню лусту-скрыль маладзіка.

* * *

Як палягчэлі ў дрэваў кроны!
Свіціцца будуць і расці
Аж навылёт у сінь прахоны
У парадзелым іх лісці.

Што верасам на сонцы сніцца?
Як трапятацца перастаць
Асінніку на звон сініцы
Ад панізовага куста?

Пайду без думак адмысловых
Туды палянай нацянькі,
Дзе ў верасовых сцішных сховах
Яшчэ растуць баравікі,—

У свет знаёмы і радзінны,—
Не на журбу, не на бяду,
І ніць празрыстай павуціны
Не абыду, не абыду.

* * *

Валянціну Аскоцкаму

У самых дальніх, дальніх гарадах
Жыццё такое, мусіць, як і ўсюды.
Наўрад яго ці здолеў бы дзяржстрах
Застрахаваць ад здрады ці прастуды.

Наўрад яму там служаць лепш, як мы,—
Заложнікі мясцовага трамвая,—
Наўрад ці больш чакаюць ад зімы,
Ад лістапада, чэрвеня ці мая...

Далёкі друг, я голас твой лаўлю
У пространі, паўнюткай галасамі.
Далёкі друг, я даль тваю люблю,
Далёкі друг, любі маю таксама.

БАЛАДА ВУЛІЦЫ

Я — вуліца,
я — рака.
Праз водарасці рэклам
плыву ў затокі плошчаў,
у рукавы завулкаў —
паўз астравы кварталаў
і мікрараёнаў
мацерыкі.
У маіх затоках
нерасцяцца машыны,
слізка мігцяць бакамі
тралейбусы,
аўтобусы,
трамваі,
туга набітыя даволі абрыдлымі мне
стварэннямі,
адно на адно падобнымі, бы ў мікрараёне
дамы.
Праўда, я да ўсяго прывыкла,
я стала цярплівая,
бо я — вуліца, я — рака.
Але калі-нікалі мне хочацца,
каб ноч хутчэй наставала,
каб хутчэй засыналі машыны —
гэтыя юрліва-халодныя рыбіны
з падманным
маторным цяплом.
Мне хочацца,
каб гарэў толькі бакен,
каб гарэла адна тэлевышка,
там, у небе,
дзе зоры гараць.
Толькі і гэта дарэмна!
Ноччу
я часта чую,
як пад бетонным мостам
смуткуе мая сястра.
Яна шэпча:
«О гора мне, гора!
Я дзяцей сваіх загубіла,
вясёлкавыя ад нафты,
усплылі на паверхню яны.

Бляшанкамі ад кансерваў
дно маё ўсцяж укрыта,
на могільніках бляшанак
памяць аб дзецях спіць.
З моста на мяне з пагардай
плююць цыркачы, паэты,
грузныя праўдомы,
бухгалтары-планавікі.
Бетонныя парапеты
мяне абдымкамі душаць,
каналізацыйныя трубы
пагібель маю пяюць».
Так яна шэпча.
І ноччу я гэта чую,
а днём у затокі плошчаў,
у рукавы завулкаў —
сваю й сястрыну сумоту
нясу,
нясу...

ВЯРТАННЕ З РАБОТЫ

І чым жа блага пешаходу,
Якому дружна, бы «ура»,
З-за павароту, у ахвоту,
Агні вячэрнія гараць;

Якому не здаецца лішнім
Замахам на уласны быт
Намёк рэклам на ашчадкніжку
І на размовы у крэдыт.

І ён прымроіць тэлевізар,
І шматсерыйнае кіно,
І халадзільніку рэвізію,
А з ім і жонцы заадно.

А там згадае і пантофлі,
Зусім не лішнія ў жыцці,
Ну і апошнія ўсе хохмы,
Якімі рамс узбагаціў...

Бо як разважыш не абстрактна,—
То — прабачаюся, пардон! —
Той варты жалю небарака,
Хто забываецца пра дом.

РАЗМОВЫ

Дух непакоры, кажуць, кліча
Людзей фантазію напяць,
Прад НТР сваё аблічча,
Сваю духоўнасць адстаяць.

Маўляў, мы людзі, не статысты,
І не прыдаткі да аўто,
Мы футбалісты, экстрэмісты,
Эквілібрысты, калі што!

З любой праблемаю сам-насам
З нас кожны стрэціцца прывык.
А век абернецца грымасай,
Дык пакажы яму язык.

Сусед мой мне пра Сутру шпарыў,
Пра дух, каторы пад замком.
Маўляў, ён завядзе акварыум,
А тэлевізар — малатком.

Прагрэс? Пачуеш аб зярнятках.
Душы той стала — ні шыша!
А чуў тэорыю, што ў пятках
Якраз знаходзіцца душа?

Кажу: адсталі вы — куды там!
От дзе б душой ты адпачнуў,
Калі б у «Клубе трагладзітаў»
Размовы нашыя пачуў!

ДУМАЎ ЯШЧЭ НЯДАЎНА

Туга мая гэтай ноччу
чамусьці не выплыла ў мора:
рыбінаю прыціхлай
ходзіць каля плацін.
Месяц чамусьці ноччу
сюды не зайшоў у горад,—
ляцяць на ліхтар сняжынкі,
сон ад павек ляціць.
І цішыня якая!
Пульс горада чутны ледзьве:
няйначай, часінай гэтай
вечнасць сам Хронас сніць.
На поўначы ноччу гэтай
белыя ходзяць мядзведзі,
над імі палярнае ззянне
барвовай тугой шамаціць.
А думаў яшчэ нядаўна,
а думаў яшчэ і ўчора:
на пяцігодку наперад
свой доўг прад тугою сплаціў.
Туга ж мая гэтай ноччу
чамусьці не выплыла ў мора,
рыбінаю прыціхлай
ходзіць каля плацін.

* * *

А ў сне было, а ў сне было:
Высока сонейка стаяла,
І слонкі быстрае крыло
У зыркіх промнях трапятала.
    І шэпт арэшын і травы
    У сне мне чуўся імем-словам.
    Гладышкі голас гарлавы
    У ручая быў тымчасова.
І гэты гук выразна мне
Душу сцінаў салодкім болем.
Я думаў: многа год міне,
І гук не скончыцца ніколі.

I пахла сонцам і вадой.
Бясконца так, навечна будзе!
Паветра парны сырадой
Струменем цёплым ліўся ў грудзі.
I гэты блаславіў я дзень,
I над крыніцай я нагнуўся,
Калі ў асмужанай вадзе
Твой светлы вобраз калыхнуўся.
Струмень я піў, я слодыч піў,
Нібы чыё наканаванне.
Я так тады цябе любіў,—
Бы прадчуваючы расстанне!
Нібы скараўся я журбе,
Нібы скараўся ўжо расплаце...
Хоць і не ведаў, што цябе
Ужо даўно наяве страціў.

ВЕЧАРОВАЕ

Брыду сцяжынай каламутнай,
Зацішкам лазняў і стадол,
Бо захад дымным перламутрам
Асыпаўся на снежны дол.

Аблёгся і заціх вятрыска
У кажуховым каўняры.
Тапчу нагой імглісты прысак
Вунь той малінавай зары.

Як мары, белыя бярозы...
Такая ціш! Чуваць здаля
Звон ад вядра і рып марозны
Бацькоўскай студні жураўля.

ВЯРТАННЕ

Анічога! Гэта можна,
Гэта можна зразумець!
Кот крадзецца асцярожна,
Каб абед сабе прымець.

Жвавы газік на дарозе
Прафырчэў і недзе знік —
Дзед стары на стрэчным возе
Пракаветнае сасніў.

Брыгадзір ідзе ад фермы,
А даяркі не дый не
Паразважаць: як паверне?
Крамы ж мо не абміне?

Хлапчукі «вядуць» галёшу —
Трэніруюцца ў футбол...
Свет не кепскі, а харошы —
Ліст цярушыцца на дол.

ДВА ВЕРШЫ

В начале жизни школу помню я...
А. Пушкін

I

Святло ад сцішнай лямпы над сталом
У хаце цёткі Ганны ці Сахвеі.
Паслухаеш: у садзе ветралом —
І скон, і наступ лютаўскай завеі.

А газа ў лямпе ўсё сіпіць, сіпіць.
Ад кніжкі зірк сцярожлівы сяброўкі.
На печы цётка грэецца ды сніць
Ці не параграфы ды загалоўкі?

Вазьмі ты кніжку адкладзі убок,
Будзь да мяне ўважлівей хоць трошкі!
Ну што, калі не вывучым урок?
Мо заўтра і не выклічуць да дошкі.

Ну што, калі завея ці буран?
Няхай гудуць сабе хоць і да ранку.
Я гаспадар сабе, бо кватарант,
Бо вось і ты ж таксама кватарантка.

Бо калі-небудзь за другім сталом —
Ужо не ў цёткі Ганны ці Сахвеі —
Успомнім гэты ў садзе ветралом,
І скон, і наступ лютаўскай завеі.

II

Успомніцца са школьнае пары,
Тае́, што недзе на жыцця пачатку:
«Айчызны дым» і слова «пілігрым»
Упадабаў — і кудзер, і крылатку.

Далёкая, наіўная пара!
Рука для ўдачы поўнае шукала
Надзейнага гусінага пяра,
А не таго са школьнага пенала.

І тое «дым», і тое «пілігрым»,
Прыдаўшыся абмарачэннем-словам,
Няўжо натхненнем дыхала старым,
А не сваім і непадкупна новым?

О, адчапіцеся!.. Над полем дым...
Нізрынуты з вышынь Парнаса,
Чаго, чаго я прыблукаў сюды
З настаўнікам сваім і класам?

О, не! Мне б лепей музе памагчы,
Мне б лепей вершык напісаць, пакуль вы
Вось тут павыбіраеце карчы
Свае зусім не паэтычнай бульбы!

А мо не так. А можа, той парой,
Тады (я так падумаю сягоння)
І ўпала тое белае пяро
На родныя, на восеньскія гоні?

І, можа, зрыфмаваліся тады
І сёння вабяць да сябе штосілы
Над полем дым, айчызны сіні дым,
Мой родны кут і кут мой мілы.

ВЕЧАРОВЫ ЎСПАМІН ПРА СОЖ

— Я пакараю, так і быць,
Цябе на бераг той вяртаннем.
Дык выбірай ці дзень, ці ранне,
Ды бойся смутку і жальбы...
Я пакараю, так і быць.

«Ты пакарай мяне не днём
На ціхай лапіне мурожнай:
Няхай крадзецца асцярожна
Слухмяны вечар,— як паром.
Ты пакарай мяне не днём.

Хай ашчаджае далавах
Святла прынебнага астатак
Рака, і ціха дрэмле статак
На ўзлобіне пры паплавах.
Ахапак сена ўгалавах.

Кране чмяліныя басы
Апошні раз прамень нязвонкі.
Даяркі вымыюць даёнкі —
Чуваць здалёк іх галасы.
Ад стога цень лёг наўскасы.

Ты пакарай мяне не днём
На зарачанскім тым улонні.
Вунь Сож, а там вунь далей Проня,
А там ля берага паром...
Ты пакарай мяне не днём».

* * *

А была, толькі хмарка была,
Толькі хмарка на ранішняй сіні,
Калі шкода было мне сяла,
Калі ка́ні застацца прасілі.

Разбурыўся над рэчкаю мост —
Ацалела чамусь парэнча.

Перайшоў тую рэчку наўпрост,
Азірнуўся, траха не ўкленчыў.

Што хацеў я і што я мог?
Вунь і ка́ні на гнёзды палі.
Завіваўся над вёскай дымок,
Недзе косы кляпалі.

НАКЦЮРН

Над краем гэтак міла-міла
Увесну сонейка свяціла —
Свіціўся ліст, свіціўся свет.
І быў для сэрца не замкнёны,
І быў душою бласлаўлёны
Птушыны свіст і траўны цвет.

Уранку гэтак ветла-ветла,
Ура́нку гэтак светла-светла
Зырчэў туман, трымцеў прамень.
І з промнем гэтым заручоны,
Надзеяй ціхай пазлачоны,
Прыходзіў дзень, праходзіў дзень...

Дык не маніце, дык скажыце,
Што перапёлка змоўкла ў жыце,
Што восень лісця намяла,
Што нешта ў свеце адбылося,
Што нешта ў свеце не збылося
І што чаромха адцвіла.

БЫВАЙ!

І ляскат, і дым гаркавы,
І месяц ляціць з-за хмар.
Запозненыя саставы,
Пагойдваецца ліхтар.

А рэпрадуктар вакзальны,
Як рэха: «Ав-в-ай-ай-ай!» —
Як водгалас развітальны:
Бывай, ці то — не забывай!

І ападае дымам
На сквер, на ачахлы язмін —
А лепей бы міма, міма —
Задаўнены ўспамін.

Ах, некуды нехта ехаў,
А хто і калі, не пытай.
З-пад колаў каціліся рэха:
Не забывай, бывай!

І ў гуле людской гамонкі,
І праз рэпрадуктарны грай
Каціліся наўздагонкі
Ўсё тое ж: не забывай!

У далечы дальняй далі,
Па-за жыццём не траха,
Каго тады мы кахалі,
І хто тады нас кахаў?

Далёкія летуценні!
То праўда або падман?
Мільгнулі вагонным ценем
Па разнатраўю палян.

Прайшлі над вясновым полем,
Апалі каля крыніц,
Каб адгукнуцца болем
Няспраўджаных навальніц...

І ляскат, і дым гаркавы,
І месяц ляціць з-за хмар.
Запозненыя саставы,
Пагойдваецца ліхтар.

І ў водгуллі невясёлым
Над горадам з краю ў край
Чуваць, як грукочуць колы:
Бывай, не чакай, бывай!

* * *

Вунь і яно, успамінаў лісцё,
На дрэвах, на тумбах, на дугах трамваяў.
Скажыце ж цяпер, а ці многа дасцё
За квецень апалую маяў?

Ды толькі і ў вас гэтаксама было,
Паводле адвечнае звычкі:
Бяссонныя ночы, кахання сіло,
Перон і вясновы палон электрычкі.

Абсыпалася
каляіна вясны,
Прыбіта трава прыдарожная пылам.
Цяпло тваіх вуснаў прыходзіць у сны,
Мне вусны казыча тугой неастылай.

Трывожлівы сон, трывожны палон,
Трывожныя ў сне успаміны...
Цягнік успамінаў ідзе пад адхон,
Ляціць на ажыны,
крушыны.

* * *

Пахмурным гэтым днём успомні,
Убач у прывіднай вадзе,
Што недзе стомлены паломнік
У дзень твой сонечны брыдзе,

Што стрэчны вецер засціць вочы
Яму слязою ці смугой,
Што стан твой сённяшні дзявочы
Спавіт дарожнаю тугой.

* * *

Ну, а нам — сумненні вечарам,
Ну, а нам — надзеі ўранцы.
Паяздам — пагарда вечная
Да прыпынкаў і да станцый.

А вятрам зімой сінічнаю
Перагуквацца у коміне.
А дзятве парой сунічнаю —
Здавальненне да аскоміны.

Каму — вёрсты разнасцежаны,
Каму — дома заставацца.
А таму, табой хто ўсцешаны,
На другіх не заглядацца.

ЛЕСАВІК

Прарэзаўся месяц з-за гары,
Пазаснулі птушкі
у бары.

З-пад галля і моху, з-пад куста
З ціхай асцярогай Лесавік устаў.

Потым стаў пад елку: чуе ўсё як след,
Дзе накат машынны, а дзе конскі след,

Дзе грыбам прабіцца, а дзе не,
Дзе вісеў транзістар на сасне,

Дзе ў траве стаіўся мухамор,
Дзе ўчарашні дождж патушыў касцёр.

Потым без паперы
Лесавік
Зрабіў птушкам, зверу
Пералік.

Зялёнабароды,
Уначы
Заадно і годы
Сабе падлічыў —

І брывом шчыкотна
Варухнуў,
Месяцу маркотна
Падміргнуў.

МАЎЧАННЕ

Гэта — навыварат звон,
гэта — «цік-так» дагары
ці тэлевізар сапсуты.

Падумаем пра рамонт
адны ў пустой кватэры.

Гэта — палосы дажджу
за гарадскою рысай
(дождж не дайшоў да мяне
і да майго балкона).

Гэта — здагадка:
вось дзень,
дзень, у які пра цябе
аніхто не ўспомніў ні разу.

Што тут зробіш?
Маўчым.

ПЕЙЗАЖ СА СТАРАДВОРЫШЧАМ

У гэтым плынна-мнагаплынным,
У разнастайна-мнагастайным,
У накannованым жыцці —

Мільгнуць то водгаласам-крыкам,
То шэптам здушаным, то зыкам
І патануць у небыцці.

І будуць стынуць азяроды
Ад году ў год, з гадоў у годы,—
Паляжа лён, як і ячмень.

І будзе бзымкаць у самоце,
Пашкадаваўшы аб прылёце,
На кветцы чмель.

РАНАК

Гэта поле, гэты гай,
Гэтая дарожка,
У куце зялёны май,
На стале валошка,
Гэта ядрань, гэты смех,
Ластаўчына пража,
Гэта засень мілых стрэх —
Гэта ўсё падкажа
Тое слова — неспадзеў,
Спеў — неспадзяванак,
Што нікому анідзе
Не даверыў ранак.

* * *

А ты сэрца мне
Тым параніла,
Што другога ты
Панаравіла.

Мо за тое люб,
З ночы, з раніцы,
Што ягоны чуб
Кучаравіцца?

А мо свацейкі
Вінаватыя,
Што так лацвенька
Вас сасваталі?

Што ж, не выпала:
Сонца выпіла
Медзвяну́ расу,
Засушыла цвет.

Ты іначыла —
Не заплачу я,—
Што ж, бывай, красуй,
Хоць на цэлы свет!

Будзеш губы мецъ —
Не на згубу мне,
Малады пагляд —
Не на мой нагляд!

* * *

Як пáлі белыя снягі
За цёмнай рэчкай на палі,
Укрылі рэчкі берагі
І чорнай рысай абвялі.

Снягі белыя, пушысты
Панакрылі ўсе палі,
Адно поле не накрылі —
Поле бацюхны майго.

Як пáлі белыя снягі
Пад першы восеньскі мароз,
Укрылі летнія стагі,
Пагнулі вецце у бяроз.

Снягі белыя, пушысты
Панакрылі ўсе палі.
Адно поле не накрылі —
Поле лёсу ды майго.

КАЛІ НАДЗЕЮ ХАВАЎ...

Калі надзею хаваў,
ноч была, як прымха, глухая.
Рагатала ў нетрах сава,
ды Каінам месяц з-за хмар
выглядваў — маўчун віжаваты,
ды сыкала гадаўё,
і шмякалі ў яміну жабы.
Шапталі трывожліва шаты.
Шыпшынавы куст

і крушынавы куст
сплялалі ў той яме карэнне...
А ўжо камень я сам палажыў
тою ноччу на сэрца.

АСАЦЫЯЦЫЯ

Няёмка,
як быццам бы ў ліфце
з чалавекам напаўзнаёмым;
непрыемна —
так нас раздражняе
вялы пoціск рукі;
прыкра — як той апахмелак
на баляванні чужым...
Можна працягваць далей.
Тое зробіце вы.

* * *

У зелянковых фарбах неба
Па-над барвовым бліскам хмар.
А тут нішчымна пахне глеба,
Гібее восеньскі абшар.

Пацешся забаўкай маленькай:
Узбоч настылае раллі
Сваёй арэхавай кавенькай
Брынчэць па шэрым бадыллі,—

Калі прасцяг халодзіць вочы,
Калі такі падшэрхлы дол,
Калі такая ўжо сірочасць,
Такая жальба навакол,

Калі, як лісце, абтрасаеш
Гады на золкім рубяжы,
Калі да болю адчуваеш,
Як многа лішняга ў душы.

О надвячорак азалелы,
О спусташэння шары час!
Што пераспела, адбалела,
Хай абыходзіцца без нас —

У час трывання і надзеі,
У час цярплівасці адной,
Калі зімовае завеі
Крадзецца подых за спіной.

* * *

А мо чакаў я гэтага званка,
Мо непазбежнасць нада мной лунала,
Калі твая шчаслівая рука
Шэсць гэтых лічбаў недзе набірала.

Ало, ало! Успомніцца пасля:
«Мой дарагі! Віншую з першым
снегам!» —
І голас заміраў далёкім рэхам,
Званочкам, што дражніўся мне здаля.

Як скалануў мяне ён, як жа ён
Мяне ў абдымкі праз адлегласць кінуў!
Я ўваскрос, я рос, я жыў, я гінуў,—
Зноў уваскрос! Я пасылаў праклён

Мінуламу, што стала паміж мной
І між табой нядобраю няслаўай,
Панылацю над недапітай кавай,
Віной віна і простаю віной...

Хай будуць блаславёны: гэты дзень,
І першы снег, і першыя завеі,
Сняжынка тая, што табе на веі,
Нібы дарунак неба, упадзе!

* * *

Мой дзень брыдзе дрымотнай каляінай,
А твой ваверкай скача па сасне,
Цвіце пры лузе белаю калінай,
Затым, каб ноччу доўжыцца у сне.

Свяцілы дня і ночы над табой
Усходзяць шчыра ўвечары і ўранку:
За днём зара ідзе, а ноч вядзе заранку
Свяціць табе спагадай, мне — журбой.

Ды наракаць не стану я на лёс.
Я на цябе дзіўлюся ў захапленні,
Адно хачу, каб сінь тваіх нябёс

Не засмуцілі раптам хмарак цені,
Каб ты была, каб новы дзень прынёс
Табе свае на ўдачу блаславенні.

СНЕГ ПРЫ СОНЦЫ

А снег пайшоў, а снег пайшоў,
І гэтак нечакана,
З двух лёгкіх хмарак-спарышоў —
Зусім неабяцана.

Перасмыкнуўся ценем дзень,
Ураз аблёгся вецер,
І косы сонечны прамень
Згадаў аб цёплым леце:

Паўнеба сонца заняло,
Яшчэ паўнеба — хмараў
Імглой падбітае крыло —
І вось пярун ударыў!

Ну, а сягоння сярод дня,
Сярод яго яснотаў,
Снег паваліў, і цішыня
Грамчэй ад гром-грымотаў.

* * *

Бяда знянацку налучыла,
Знянацку шчасце абышло...
Жыццё мо кпіла, мо вучыла,
Мо раўнадушнае было.

Патроху болькі адбалелі,
І духам быццам не ачах,
Хоць доўга будні і нядзелі
Адною фарбай пазначаў.

Не пакарыўся скрусе ніцай,
Ды не забыўся з тых часоў
Абрыў адразу столькіх ніцяў,
Званкоў, размоў і галасоў.

Ды аблачынкі, ды хмурынкі
З чала ўжо болей не сплылі...
Ды на аўтобусным прыпынку
Даўжэй ён курыць, чым калі.

* * *

Жыццё, жыццё... Не першы, не апошні...
Вось і разваж, дзе блазен, дзе герой,
Калі з гары ўпрагаўся ў воз парожні
І пеклаваўся з грузам пад гарой.

Вось і разваж, дзе лёсу адпаведнасць,
Дзе збег прычын, а дзе бяссілле сіл...
Ды толькі ты, з людзьмі святая еднасць,
Мяне і далей па жыцці насі.

Адно тваё мне дарагое слова.
Гаворыш мне у радасці й журбе:
Як не збаішся пачынаць нанова,
Дык блісне дзень нанова і табе.

Не патрабуй ні мала, ні замнога,
Не пагарджай вянкамі з дзеразы,
Умей сябе убачыць праз другога,
Смяяцца шчыра, плакаць без слязы.

ГЭТАЕ ДРЭВА

Як разлагодзіла душу
Мне гэта дрэва!
На гэтым вецці калышу
Сны-неспадзевы.
    Упаў на яркую траву,
    Раскінуў рукі.
    О, не кружыце галаву
    Мне, пахі й гукі!
Мо я не зведаў у жыцці
Уцехаў велькіх.
Пакора, мятлушкай зляці
Мне на павекі.
    Хай утаймоўвае душу
    Маю, о дрэва,
    Твой ціхі шэлест, ціхі шум,
    Святла залева.
Я не шукаю ані-ні
У ліставерці
Тваіх гадоў, тваіх планід
Сваё бяссмерце.
    Сачу я ценяў лёгкі лёт,
    Аблокаў пёркі.
    Мой лёс зусім наадварот,
    Зусім не горкі.
Яшчэ не позна па жыцці,
Па свеце белым
Зялёным ветразем плысці —
У цвеце спелым.

З КНІГІ

«МОЙ СВЕЦЕ ЯСНЫ»

1986



ПЕРАД НОВАЙ СТАРОНКАЙ

Навошта вінаваціць прозу,
Калі рамантыцы наўздзіў
Хацеў ты пасадзіць бярозу,
А нехта дуб свой пасадзіў.

Мой друг,
пры спадчынным парозе
Чаму б дасвеццем не быцьмець,
У згодзе дубу і бярозе
Прад новым днём не прашумець?

Саюз паэзіі і прозы —
Пад неба ўзносяць журавы
І пошум трапяткі бярозы,
І дуба роздум векавы.

ПАЧАТАК

Вядома, для таго і ніва
І для таго імпэт і пот,
Каб потым абшчадрыла жніва
І адпаведна — умалот.

Я сам як быццам хлопец наскі,
І моц адчуўшы у плячах,
Я не адны на полі краскі
Жнівом гарачым прыкмячаў.

І на траве расісты россып
Не для акрасы быў тады,
Як пасяпваў ступою ў поступ
Мужчынскай дружнай грамады.

І той парою сенакоснай
У перакур у халадку
Наўрад ці надаваў сур'ёзна
Значэнне нейкаму радку.

Я шанаваў з касой сваяцтва,
І пеклаванне, і прыпар.
Было мне другасным мастацтва,
А першым — сотка і гектар.

Але паглядваў хітравата
Знячэўку Хведар ці Панас:
Маўляў, вылазь з мужыцкіх спратаў,
Такі, як ёсць, ідзі да нас.

Намёк балючы, хоць трактоўны:
Маўляў, праз сем сваіх патоў
Усё ж для еднасці працоўнай
Ты не гатоў і не гатоў.

Маўляў, касьба — яна не штука.
Загасцяваўся ты ў гасцях.
Маўляў, інакшая навука
У цябе і ў думках, і ў касцях.

Зямлі — зямное, неба — небу,
Што маеш, тым і даражы.
Ты нам пра Пушкіна што-небудзь,
Ты нам пра Коласа скажы!..

О гэты лад і склад гаворкі —
У іх і мудрасць і наіў!
Але ж і як было мне горка,
Як я няўмела бараніў

Сваё не тое каб і права —
Жаданне хоць, памкненне хоць! —
Сказаць: вось тут мая ўся слава,
Другая — хочаш, не прыходзь!

І што мне, бацюхны вы светы,
Калі на радасць ці бяду
Я, можа, не радкі — куплеты,
Як вы сказалі тут, складу...

Так думаў я. Дзядзькі маўчалі.
Над пожняй бусел веславаў.
А я ў сумненнях і адчаі
Насустрач лёсу адплываў.

* * *

Хто гадаваўся ў цішы дрэў,
Той ашчаджае і ўспаміны
Аб тым, як любасцю шчырэў
Да кожнай зёлкі і націны;
Хто паспытаў жывой вады
З тае зацішнае крыніцы,
Якой прызначана заўжды
З ліпнёвай спёкаю радніцца;
Хто выпраўляўся ў свет парой,
Калі смугой зырчэлі далі
І развітальнае пяро
На лузе птушкі пакідалі,—
Таму і ў людскай гамане,
Бывае, мроіцца, бы сніцца,
То нехта сцішны на чаўне,
Прапахлым вялаю травіцай,
То надвячорак над ракой,
Цяпельца, белыя ачоскі
Туману — ціша, і спакой,
І дальняй песні адгалоскі —
Той свет, выразны кагадзе,
Яго працягненасць жывая,
Што хвілю доўжыць на вадзе
І глухне — а вада сплывае.

БАЦЬКАЎШЧЫНА

З двара прыйду і сяду ля агню.
Палаюць дровы. Ссечана капуста
На градах — благаславенне дню.
Змрок у палях — там сіберна і пуста.

Узыдзе месяц позна. На парог
Я ноччу выйду. У нямым здранцвенні
Паветра, далеч. Серабрыцца лог
За сажалкай — на ім снуюцца цені.

О роднае маё! Як доўга да цябе
Ішоў я, кволы падарожнік.
О весялосць у восеньскай журбе!
Агонь.
Саган.
Вуголле і трыножнік.

КУПАЛА

У Анны у Андрэеўны Ахматавай
Ёсць невялікі вершык — ён пра тое,
Як Муза ёй з'явілася аднойчы
У пастушковых строях і з жалейкай.
— Скажы, ці ты калісьці дыктавала
Старонкі «Пекла» Дантэ? Адкажы! —
Так запытала Музу паэтэса.
І сціпла адказала Муза: «Я».

А сына Дамініка Янука,
Якога сёння мы завём Купалам,
Натоўп аднойчы пераняў дарогай —
Галодны, босы, у падраных світках.
Сын Дамінікаў запытацца мусіў,
Хто вы, маўляў,
адкуль і хочаце чаго вы?
І быў адказ, як выдых:
— Беларусы!..
Ён благаславіў іх, а натоўп яму
Аддаў у рукі верную жалейку.

КРЫНІЧКА

Быў нечы двор.
Урочышча, Сычы.
Ішлі гады.
Плот асядаў у багну.
Жылі дзесь крывічы,
жылі дзесь дрыгвічы,
А тут радзімічы...
Спазнаць я прагну,
Ці захаваліся і памяць і той плён,
Які дзяды чакалі, кідаючы семя
На бацькаўскі і мой цяпер загон,—
Вось-вось спытае маладое племя.
Пад вольхамі крынічка б'е.
Туды
Іду, здарожаны, з каценькай,
Каб зачарпнуць гаючае вады
Забытай там
бяроставай кузенькай.

НА СТОЗЕ БУСЕЛ

Крамяныя грудастыя аблокі
Над пожняю, над лесам коціць дзень.
Жывое джгае порсткі авадзень,
А даль мігціць наміткай-навалокай.

На стозе — бусел макаўкаю лета:
Не патрывожу, брат, вазьму правей!
Аднекуль затрашчыць матацыклетка —
І не чутно ўжо коніка ў траве.

Ды ціха зноў. І на душы прыветна.
Я зноўку тут. Благое ўсё міне.
Насустрач ты — гарачае паветра
Густой, дрыготкай хваляй — на мяне.

МІЦКЕВІЧ НА БЕЛАРУСІ

Краем гэтым хадзіў,
Любіў тут і плакаў калісьці.
Бачыш — след па расе?
Бачыш — як слёзы, раса?

След яго зберажы —
То сам ён з Радзімаю тут.

ЛЯВОНІХА

Павяла мяне, павяла
Зноўку думачка да сяла.
Да сяла, сяла, дзе вішнёвы сад,
Ліпы дзедаўскіх яшчэ прысад.
У акне, акне дзе гарыць агонь,
На камiначку дзе трашчыць аблонь.
У хаце дзеванькі там кудзель прадуць,
У хаце дзеванькі карагод вядуць.

Павяла мяне, прывяла
Мая думачка да сяла.

У акне, акне ды гарыць агонь —
На камiначку не трашчыць аблонь.
У хаце дзеванькі не кудзель прадуць —
У хаце дзеванькі карагод вядуць.
Бо ў той хаце шум,
Шум вялізарны,
Шум вялізарны —
Тэлевізарны.
Гаспадар Лявон за сталом сядзіць,
Гаспадар Лявон на экран глядзіць.
Гаспадар глядзіць — гаспадар
не сніць:
Там Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі ды паляскавае.
А вакол яе хлопцы круцяцца,
Спадабацца ёй дужа рупяцца.

Ходзяць гогалем,
Няма змогі ім.
Ой, глядзіць Лявон,
Бровы хмурыць ён,
Што Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі ды паляскавае.
Ой, такі Лявон ды раўнівы муж:
Каб жа ты, Лявон, ды аб'еўся груш!

Так вяла мяне, прывяла
Мая думачка да сяла.

* * *

І рытмы тыя, ды ўжо лад
Другі. І ў сэрцы холад цупкі.
І да халупы ад палат
Не ўгору, а на ніз прыступкі.

І непрыкметна, спакваля
Расце і шырыцца трывога,
Як быццам ты стаіш каля
Апошняй рысы ці парога.

Гаворыць сэрца: паспяшай!
Не, не спяшай,— гаворыць розум.—
Хоць і збалелася душа,
Ды застаюцца сум і роздум.

О не, не той юначы сум,
Чулліва-светлы, непаўторны,
О не, не тых юначых дум
Палон,— а скрухі прывід чорны.

. . . .

Ды скруха скорыцца журбе,
Душа ізноў рахманай стане.
І твой зласлівец на цябе
У неспакоі раптам гляне!

* * *

Шчэ не пачаліся вятры,
Але шклянее неба ранкам
І клён барвеніць угары
Над прахалодна-чэрствым ганкам.

І ранняй восені пара
З яе бадзёрай адзінотай
З прысадаў, саду і двара
Ужо глядзіць зусім не ўпотай —

І нам нагадвае тады
Сваёй задумнасцю глыбокай
Спакой крыштальнае вады
У шклянцы поўнай, быццам вока.

Не зварухні, не закрані!
Няхай халодна грані граюць,
Пакуль кляновыя агні
Красой апошняю палаюць!

* * *

Анатолю Вялюгіну

Адвячоркам круціцца пласцінка,
Хрыплаватым голасам пяе.
Ты — галінка, я — твая расінка,—
Мне чуваць у голасе яе.

Я міну лінейкі і газоны,
Гэткія, як некалі раней,
І ўспамінак даўні, гарнізонны,
Ціхім смуткам сэрца мне кране.

Твой канверт, што ў палявым блакноце,
Ускрываць не стану на хаду.
Лепей у знарочытай сумоце
У цырульню блізкую зайду.

У мяне там аніякай справы,
І не часты я туды хадок,
У цырульні гаваркая Клава
Нагадае мне чужы радок:

Не сумуйце, Клавы
З белай Балаклавы!

Ды навошта засмучацца Клаве
У свае дзявочыя гады,
Калі ў Клаву з белай Балаклавы
Закаханы прапар малады?

І навошта смутак або гора,
Калі скора — хай мінецца год —
Мару іх, блакітную, як мора,
Прывітае белы параход?

Можа, трошкі я зайздрошчу Клаве,
Толькі рады буду я, калі
На вяселлі ў белай Балаклаве
Маладым падораць «Жыгулі».

І таму ў знарочытай сумоце
У цырульню блізкую зайду,
Трэці раз на трэцім павароце
Ліст перачытаўшы на хаду.

* * *

Я не скажу, нібыта
Свой лёс хачу іначыць,
Пражыта — не забыта,
І нешта ўсё-ткі значыць.

Хоць час — ён справу робіць,
Не ведаючы жалю.
Ён карануе дробязь,
Падзею — прыніжае.

Хоць час па-свойму плоціць:
Як набягуць згрызоты,

Цвічок ва ўласным боце
Страшней, чым «Фаўст» Гётэ.

А ў часе небяспекі —
З прычыны, без прычыны
Падасца чалавеку
Сам белы свет з аўчыну.

І вось такія справы
Такімі вось часамі:
Свет белы — ён направа,
Налева — ён таксама.

Вось так і не іначай!
Спытай — адкажа рэха:
— Налева — будзеш з плачам,
Направа — з горкім смехам!

— А напрасткі што свеціць?
— Надзея... Тыя ж болькі...
— Ну, што ж, я згодны, свеце,
Падай надзею толькі!

ДВА ПОДСТУПЫ ДА ВЕРША

1

Шматок паперы, карандаш,
Яшчэ — цыгарка.
Вось гэты дзень — ён будзе наш,
Навошта сварка?

Са светам згода. Пабрацім
Яму ты, свету.
Паклічу мару. Абляцім
Сваю планету.

Глядзі, цудоўная яна,
Мая планета.
Але вось там ідзе вайна —
Ты бачыш гэта.

У джунглях стогне барабан —
І сэрца скрушыць.
А тут, няўмерлыя ад ран,
Лунаюць душы.

Абмалаціла сталь і медзь —
І адляцелі.
А ў тых, жывых,
яна ледзь-ледзь,
Душа, у целе.

То голад косіць, то падман —
І так старанна.
І ад усіх магчымых ран —
Марыхуана...

Шматок паперы, карандаш.
Яшчэ — цыгарка...
Вось гэты дзень, ён наш — не наш,
Са святам — сварка.

2

А знаеш што, а знаеш што,
Мой дружа мілы,
Ты ля маёй душы пастой
У час панылы.

Учора думаў: на шыша
Мне гэта дробязь?
Ну, стане меншаю душа,
Ну, меншай зробяць!

Ты ўсё ж пастой, ты ўсё ж пастой —
Ну, без дакораў.
Ну, дык пра што, ну, дык пра што
Мы пагаворым?

Жыццё — яно адзіны раз,—
То знае вучань.
Яно, брат,— раз, яно, брат,— квас —
І ты ўжо змучан.

Сагнуць — гаворку завядуць
Аб нейкай позе.

І ўжо, глядзіш, ужо ваду
На гордых возяць.

Вядома, трэба і вада —
На то мы й людзі.
Яе мне нават не шкада
Якой занудзе.

Яе ты пі, яе ты пі —
Да скону века.
Ды толькі ў ёй ты не тапі
Сучалавека.

Дык дай яму і пірагі
Яшчэ ў дадатак...
Скажу другое ў час другі,
А то — пачатак.

* * *

Я на каханне і любоў
На падзяляў адной любові.
Што набалела, зноў і зноў
Я на адной выказваў мове.

Ды вось — пачуццейкам чужым
Каля сябе даваў пагрэцца.
Не значыў дабрыні мяжы,
Пускаў паблажлівасць у сэрца.

О, гэты свет! Лагодны ён,
Ды толькі мо не для лагодных.
Што ж, пачуццёвы рваць палон
Дзеля часін, хвілін няўродных?

А што, як выпетраць душу
Спакой або наўмыснасць злая?
На чый рахунак запішу?
Усё-ткі страта немалая!

14 Зак. 3083

Усё-ткі страта, браце мой!
Не, не хачу,
і прэч, сумненні!
Навошта мне, каб нада мной
Стаялі здрадніцкія цені?

Вось і разваж усё як след,
Каб звыкнуць днямі і начамі
На белы свет, на вечны свет
Глядзець удумнымі вачамі.

САМАЛЁЦІК-ВЕРТАЛЁЦІК

Самалёцік-верталёцік,
Страказа,
Апусціся ты на плоцік
Расказаць,

Ці баіцца цябе бусел,
А ці не?
Як у небнай жыць ты мусіш
Старане?

Надрываешся штосілы —
Што за шум?
Дзе свае згубіў ты крылы
Ці душу?

Тут мы ўнізе — чалавечкі,
Ты там — зух!
Цень спалохаў твой над рэчкай
Страказу!

БАЛЬНІЦА Ў ПОЛІ

Апошні прыпынак у полі.
Бальніца.
Бель снягоў перапынена
чорнага лесу закрайкам.

Прывозяць сюды тугу,
вывозяць надзеі адсюль,
прывозяць надзеі сюды,
нагружацца каб тут тугою.

Што ж, не марудзь, рулявы
безветразёвае лодкі!
Што ж, не марудзь, шафёр!

Ён памарудзіў, пайшоў
да раструба мікрафона
на тым адзінокім слупе,
стаяў што наводдаль ад нас
і значна бліжэй —
                да поля.

Можа, дазвол там прасіў
на адпраўленне ў самога бога.

ЭКСПРОМТ

Святлом ад коцікаў вярбы
Мой роздум над радком атулен.
Пісаў калісьці Барадулін
Пра іх — ды мне такой журбы!

Я з камунальнага двара
Сюды прынёс іх неўпрыкметку,
Каб заключыць у верша клетку
У надзеі славы і дабра.

І вось надзеяю гарым
Над нашым столікам прытульным,
Што не падасца барадульным
Наш верш, а значыць — і старым.

* * *

Не сумую сягоння: навошта?
Мо цягнік пастараўся, а мо
Галубіная лёгкая пошта
Мне прынесла тваё пісьмо.

А чаму не паслаць было чаіц
Ад шумлівых тваіх берагоў,
Каб вясёласць маю прывячалі
Над маркотай асенніх лугоў?

Іх маркота хаця б з нагоды,
Што, зняверыўшыся ў журбе,
Лістападаўскае прыроды
Свет зняверыўся і ў сабе,

Што ўжо рэкі, палі і сёлы,
І прадзьмуты вятрамі лес
У задумнасці невясёлай
Пакарыліся восені спрэс,—

Хоць ад замеці ліставея
Скразнякамі святло ў барах,
Хоць яшчэ і трымціць надзея,
Як лісток на тугіх вятрах.

Гэта ўсё так табе вядома!
Не падумаю я з тугой,
Што бліжэй ты цяпер да дому,
Чым я дома да дому свайго.

Проста гэту красу арабінак,
Гэты лес у асеннім агні
Пасылаю табе на ўспамінак —
Ты вясною мне іх вярні!

* * *

Развагай сталае пары
Прыходзіць думка неаднойчы,
Што, як ты там ні гавары,
Жыццё — адна або дзве ночы,

Што не прыдумаў гэта сам,
А ўслед падумаў за паэтам,
Што гэтак Пушкін напісаў,—
А ён жа ведаў толк у гэтым!

Маўляў, ці шмат іх на вяку,
Непадуладных паняверцы,
Хвілін, зязюльчыным «ку-ку»
Пазначаных у нашым сэрцы?

І, мусіць, важкая патрэба
Была ў той думцы, калі сам
Абраннік сонечнага Феба
Пра тое думаў і пісаў.

* * *

Чаму так згадваем былое,
Свае ранейшыя часы
На той, што на схадку, палове
Жыццёвай нашай паласы?

Да золкіх росаў дотык босы
Або, калі ўжо дзень патух,—
То гуд чмяля сумнагалосы,
Ці прыгуменны рай бярозы,
Ці бессмяротны хлебны дух.

Нібыта толькі й разгарнення,
Нібыта толькі й захаплення,
Што ў несур'ёзнай той журбе...
Але ж і болей чым імгненне
Не прыме вечнасць ад цябе.

* * *

Хоць ад пары, калі мяне
З табою вёрсты разлучылі,
Тваім паглядам не дый не
За мною тыя дні сачылі,—

Не, не прысніў табе такой
Я долі — сведка бог ці сам я!
Што ж, дні нядружнай талакой
Ішлі і для мяне таксама,
Ды мне не рупіла, бадай,
І незнарок не падалося,
Што ўсё, што мог, я не аддаў
Твайму няспраўджанаму лёсу.
Я думаў проста: мы — сябры,
І што адна ты права маеш
На ўсе інакшыя дары,
І што мяне ты ўспамінаеш
З пачуццем лёгкім, як уздых
Зімой па восені ці леце,
І што пачуццяў маладых
Нам не трымаць ужо на ўмеце,
Што разнасцежана акно
Табе адно, а мне — другое
І што табе з твайго відно
Хіба суцешнае адно —
І не відно нішто благое.
Я памыляўся! Не спяшаў
У лістапад і ў месяц квецень.
Так размінаецца душа
З другой душой — і плача вецер.
Як цяжка вымавіць «Люблю!».
Даруй мне ўвечары ці ўранні:
Цябе аб гэтым пакаранні,
Нібы аб ласцы, я малю.

* * *

А фотаздымак на стале,
Мяне страчаючы з дарогі,
Убачыць, што я пасталеў
І пасумнеў вачамі трохі.

Што новых звычак прастата
У быт, калісьці адмысловы,
Наўрад ці ўвойдзе проста так,
Як у люстэрка воблік новы.

Я наўздагад так гавару.
А мо я ў першы міг той горкі
Прысяду моўчкі — закуру
Цыгарку моцнае махоркі.

І трохі ўгнецца галава,
І, можа, трохі ўгнуцца плечы,
Як рэчы стануць ажываць
У высілку нечалавечым.

І страх: пазнаюць або не?
І жах — а ў думцы падсвядома,
Што не іначай на вайне
Ты быў —
                    і вось прыйшоў дадому.

Жывы. Ды радасці такой
Як быццам бы і сам не рады.
І гэты вузенькі пакой
Твае не памяшчае страты.

І зразумею я ў той міг,
У тую горкую хвіліну,
Што іх замнога на дваіх,—
То лепей іх сабе пакіну.

Я на цябе тады зірну
І ўбачу, як ты ціха плачаш,
Нібыта нейчую віну
Самой маўклівасці тлумачыш.

* * *

Пабудзі мяне рана-раненька,
Прыбяры мяне ты старанненька.
З дому выйду я — паўзіраюся,
З наваколлейкам развітаюся.
Не туды пайду, дзе хвашчак расце,
А туды пайду, дзе чабор цвіце.
Шумам-яварам, цвет калінаю
Мне даражанька сакаліная.

Стрэчу шчасцейка — не кляні мяне.
Стрэчу горайка — не заві мяне.
Бо жылі з табой мы ў кляцьбе-журбе.
Мне дарожанька — адпачын табе.

* * *

Напэўна, гусі на бяду
Крычалі — журавы маўчалі,
Калі ў дарозе чараду
І зім, і лет маіх страчалі.

Буслы, як нейкія паслы,
Паважную хавалі тайну.
Ды поўніўся мой змрок і слых
Сваёю тайнай жыццядайнай.

Ужо і сэрца абняла
І пранізала тайны сіла,
Ужо на ветразі крыла
Мяне узнесла і насіла.

Тады я глянуў на зямлю,
Дзе засталіся чалавекі,
І зразумеў, як я люблю
Ўсё тыя ж паплавы і рэкі.

Што толькі міг —
                і ўжо табе
Ні спадзявання, ні вяртання,
Што будзеш плакаць у журбе —
Без даравання, без адхлання...

Што я хацеў, што я хацеў,
Што за праява адбылася?..
Я сніў, што сам я адляцеў —
Душа ўзяла і засталася.

* * *

Імгненні ёсць пакутлівага шчасця —
Ірвуцца ўвысь і думка, і душа.
Ды толькі тое ўсё ў радок не ўкласці,
Як ты яго, радок, не падвышай.

Бо адмыслова, самадастаткова
Само сабой гаворыць пачуццё.
Тады абразай можа здацца слова,
Тады адно — цудоўнасць і жыццё!

* * *

Кіну, рыну — пакіну
Гэты дом на гары.
Горкі дым успаміну
Хай развеюць вятры.

Хіба гэтак няможна?
Дзе пасцелецца цень
Ад капы прыдарожнай,
Там і будзе пасцель.

Мо на Шчару, на Піну
Ці на Пціч, Вілію,
А мо на лугавіну
Я слязу пралію,—

Каб зрабілася парай
Над ракой, над ракой,
Каб здружылася з хмарай
Талакой, талакой,—

І каб чайкі крычалі,
Прадчуваючы гром,
Каб на дальнім прычале
Здрыгануўся паром!

СОН

О дружа-браце! Вось бы мне
Наяве хваля залатая!
Я спаў, і бачылася ў сне,
Што нехта вершык мой чытае.

Перагарнуў старонку-дзве
І вокам кінуў на пачатак.
А думна, бач, у галаве!
Які ў пачуццях непарадак!

Той сон слязу аж выкрасаў:
Упадабаў жа, бачыш, слова!
Нібыта сам ён напісаў
І перажыў трыумф Пруткова!

Ды абрыняюся ў прадонне
І чую голас зноў і зноў:
— Калі ж пачнешся ты? Сягоння
Дзень выбівання дываноў!

* * *

Пра што пісаць, і як пісаць, і дзе?
Пра тое толькі ведае выпадак.
Ён свой вядзе парадак-распарадак,
Варожачы на гушчы ці вадзе.

Той міг пасля шчаслівым назаві,
Што свой звядзе пачатак і канчатак,
Слязу ў вачах і смех у вачанятах,—
Дык не чакай, а дзейнічай, жыві!

* * *

— Пара асвойтаць і прагрэс
І славіць космас — не калёсы,
І рыфмаваць «прагрэс» і «стрэс»,
А не адно «бярозы — слёзы».

Паэт! За воблакі лятай!
Празаік! Кінь старую звычку!
Ты — верталёцік абрытай,
А ты — сядай у электрычку.

Бо конь здарожыўся і стаў,
Панурыў голаў і не пнецца.
А недзе праімчаў састаў —
І рэха здзекліва смяецца

З таго, што гэтыя вазкі,
З таго, што дзедаўскія клункі.
Паабіваюць вам бакі,
Парастрасуць дарэшты шлункі,—

Гаворыць крытык малады
І на мяне кідае вокам,
Мае дарослыя гады
Нібы падлічвае з папрокам.

Я прысаромлены! Завал!
Мо паратунак ад дарадцы —
Спыніць парожні самазвал
Ды па грыбы у лес падацца?

ШМАТСЕРЫЙНАЕ КІНО

І зноўку фільм многасерыйны
На вечаровае жытло,
На вечаровы быт абрынуў
Сваё блакітнае святло.

І намагаецца мастацтва
Кагосьці ўзрушыць і працяць,
Каб у свядомасці застацца
Радком экраннага быцця.

Канечне, добрыя намеры:
Хто хоча, хай глядзіць працяг.
Ды толькі большыя памеры
У неэкраннага жыцця.

З яго акцёрам знакамітым,
З яго героем без заган,
Бывае надта ён блакітным,
Тэлевізійны той экран,—

Або грымотным адмыслова,
Або ціхмяным, што не ўчуць,
Або узорна-каляровым,
Ажно да рэзі уваччу.

Або па тэме аварыйнай
Так распрацуюць матэрыял,
Што там куды ўжо шматсерыйны —
Выходзіць нават «серыял»!

Маўляў, паважныя памеры
Пад рост сягонняшняму дню.
Ну а калі трынаццаць серый
Зліюцца ў шэрую — адну?..

Вядома, добрыя намеры.
Хто хоча, хай глядзіць працяг.
Ды толькі большыя памеры
У неэкраннага жыцця.

ФАЭТОН

Калі сын Феба — Фаэтон
Памчаў адзін на калясніцы,
Калі затым не здолеў ён
Ад небяспекі адрабіцца,—

Зеўс добра бацьку правучыў
За недагляд, як быў пад чаркай,
І разабрацца даручыў
Каперніку з той гаспадаркай.

ПРЫЕХАЎ СЯБРА

Прыехаў сябра. Жонка на рабоце.
У мітуслівай нейкай адзіноце
Мы бавім час. Няёмка сябрукам.
Няёмка словам гэтак, як рукам.
— Ну так! А помніш? — Помню.— Колькі
часу!
І зноў адказы, быццам без адказу.
— Дык мо?.. Бярэш? — Здароўе не вялела.
— А мне дык жонка шлункі пераела
За кроплю.— І няпэўны тон гаворкі.
І вобраз дружбы — даўні і нягоркі.
Бо мы ж яшчэ, напэўна, не забылі,
Як некалі яе адну любілі —
Ну, дружбу нашу. Помняцца спатканні
Дзвюх нашых душ. Любоўныя расстанні
Адна з адной. Да заўтра. Ненадоўга.
Пасля адну запаланіла Волга —
Рака, вядома,— і тады ж другую
Забрала ў хвілю, можа, неблагую,
Кастальскай смагі слодыч альбо горыч.
— Дык, значыць, так: жывём, як ты
гаворыш?
І зноў маўчым. І нешта ўспамінаем.
Пасля апраткі нашы апранаем,
Ідзём у свет, на вуліцу, і там
Мы спазнаём, кім кожны быў і стаў,
Як шмат вятроў над намі прашумела.
І што пад імі дружба ацалела...

* * *

Без парывання, без жадання
Пераступіць адчаю край
Гадамі доўжылі расстанне
І не прыспешвалі «бывай».

І быт знялюбеў і знябыцеў,
І так ішло, і так было,
Пакуль сам лёс не ўзненавідзеў
Кахання гэтага сіло.

Тады анёл мой недзе плакаў,
І плакала душа мая,
Ды лёсу лепшага адзнакай
Была даверлівасць твая.

Прабач, не веру я ва ўдачу,
А веру ў светлы воблік твой.
Як засумую, як заплачу
Пад спеў віхур над галавой,—

Сыдзі ў мае глухія лёхі,
Падай спатольнае вады,—
І хопіць мне тае падмогі,
Каб адкаснуцца ад бяды.

* * *

Яшчэ не верачы зусім
У тое наша адвітанне,
На змену вёснаў або зім,
Зачараваныя, глядзім
Ці не прымхлівасцю патайнай.
Вось год мінуў.
                    Яшчэ міне?
Былое здоўжылася ў сне:
То дождж ідзе,
                    то золь,
                              то снег,
То сонца ўстане над вадою.
Прад абуджэннем, як цянёт,
Узненавідзеўшы прыгнёт,
Душа ляціць — куды, кудою?
На тое дзённае святло,
Што паратункам ёй здаецца,—
Не баючыся, што аб шкло
Віднечы гэтай разаб'ецца?

* * *

Вада асенняе крыніцы,
Яе злавесныя агні,
Калі пад вечар неба ніца
Глядзіць з панурай глыбіні,—

Мне нагадалі даўні лёс,
Якога памяць ці жывая...
Я схамянуўся і абтрос
Жуду, як дрыжыкі, бывае.

Я павярнуўся і далей
Пайшоў, ды хмары навісалі
І не празрысцей, не святлей
Той на нябёсах лёс пісалі.

І дальні лес, і блізкі луг,
І ў вечаровых барвах поле,
І ўсё наўкола і наўкруг
Жыло там лёсам мімаволі.

Маўчала ўдалечы сяло.
Але чамусьці не здалося,
Што ўсё тут памяццю жыло
Не аднаго, а многіх лёсаў.

А падалося: гэты дзень,
Святло якога дагарае,—
Не пакідаючы надзей,
Са мною разам памірае.

* * *

Пад шоргат кропель дажджавых
Ён з тэлефоннай будкі бачыў,
Як па галінах верхавых
Зялёны вецер пругка скача.

Ён наглядаў. Ён не спяшаў.
Нішто пагляд не абражала.
Як бы лячылася душа,
Яе як быццам суцяшала,

Што вецер згоды не пытаў —
Шалеў над горадам — і, ніцы,
Ужо на вулках шкуматаў
Плашчы, кашулі і спадніцы.

І ў гэтай будцы пад дажджом,
У нейкай роспачы вялікай,
Сябе за даўнім рубяжом
Убачыў ён — і не паклікаў.

Не мог. А мо не захацеў.
Не абазваўся нейкім знакам.
А той у дзіўнай віднаце
Ці то ўсміхаўся, ці то плакаў...

І ў гэтым горадзе чужым,
Які ягоным быў калісьці,
Ішлі інакшыя дажджы,
Іначай трапятала лісце.

* * *

За вёскаю, на адзіноце,
Асеннім днём пачуеш ты,
Як вецер на запалай ноце
Скуголіць аж да нематы.

І што ні болю, ні шкадобы
Не накавана яму,
Калі бывае даспадобы
Няславіць волю, як турму,—

Ні развітання, ні спаткання,
А толькі вусцішнасць быцця:
Нібы пра згубнае каханне
Пяе няўцямнае дзіця.

Аж скаланецца раптам сэрца,
Ліхой збаяўшыся мяжы,
І так захочацца пагрэцца
Ля ўласнай цёплае душы.

* * *

Вось гэта музы́ка сама
Сабе гучыць. Ёй справы мала,
Што дзесьці водгуку няма,
Што недзе музыкі не стала.

Як бы не ведае мяжы,
Як бы сама сябе люляе
І ўжо на нейкім рубяжы
Сябе самую адмаўляе.

І ўжо не музыка чутна,
Калі нясвойскаю ахвотай
Грыміць раскатам перуна,
Трапеча гулам самалёта,

Калі ў правалах гукаў тых,
У страшнай роспачы канання
Трымценне струнаў залатых —
Як лёс або наканаванне!

СНЕЖАНЬ

Цішыня вось якая
сягоння ў горадзе.
У прадуктовую краму
нешта прывезлі:
шум матора,
і лязгат,
і галасы.

(Адбіўныя гатуюць
на пятым паверсе
кожны дзень
а палове трэцяй.
Стук малатка́ —
гэта сямейны брэгет,
стук малатка —
як метраном удачы.)

Сёння пахмурны дзень.
Вецер. Адліга. І галкі
гуляюць сваю гульню
па-над дзевятым паверхам
дома насупраць.

Гэта яшчэ не вясна.
Гэта адліга.
Машыны
сігналяць штораз,
самалёт
бурыць горад
раптоўна,
і ўсё ж
сігналы аўто чуваць
і крык непалоханы галак.

(Снежань,
снежань толькі яшчэ.

За горадам
снег асеў.
Пасля адлігі мароз —
пагрозна
для яблыняў
і для пасеваў.)

Якое будзе на поўдні
сёлета
        лета?

Снежань,
снежань толькі яшчэ.
Пра Дзеда Мароза
ці думаюць дзеці?

* * *

Цень-цень сініца! Добры дзень!
Жывеш? Сваім званочкам чыстым
Зімовым ранкам прамяністым
І абудзі і абнадзей!

Цень-цень... А ўсё-такі прамень!
Цень-цень... А на паляне снежна!
Дзень добры, дзень! Святло прамень
Са схаладнелага бязмежжа,—

Хоць і не блізка да вясны,
Хоць і мароз — сляза на вочы,
Хоць у калматых елак сны
Адны што ўдзень, адны што ўночы,

Хоць гэтых елак чарната
Яшчэ змрачней ад непакоры
Таго дубовага ліста,
Што ад вятроў не знае зморы.

О, адарвіся, ападзі!
Скарыся — прошласці не вернеш!
Нашто чакаць, каб абудзіў
Вясковы сок пупышку-зерне?

Цень-цень, сініца! Добры дзень!
Паслухаю і збоку стану —
Пабачыць, як свой кіне цень
Лясная елка на паляну.

АКВАРЭЛІ

То не хмары на захадзе ўсталі —
На ружовым конь вараны
З нетутэйшае нейкае стайні
Нетутэйшае стараны,
Дзе ў сляпой адзіноце бліскі
Выкрасае пануры агонь,
Прадракаючы дню палон
За ахвярнай начы калыскай.
То не ўсталі на захадзе хмары
(Снег ружовы, а сад вараны,
Хочаш — рыфмаю закрані) —
То клапотнага дня мажары
Дагаралі ў агні.

ПРАДВЕСНЕ

Вол бушуе,
Вясну чуе —
Прэч, халады!
Апоўдні певень
Нап'ецца, пэўна,
Пад стрэшкай вады.

Мароз уранку рэжа,
Бы ў спёку авадзень.
Ды санны след, як рэшата,—
Віной прамень.

Купчасцяцца аблокі,
Яскравей неба сінь.
Плыве аж з Налібокі
Гаркавы пах асін,

Пах сена з-пад паветкі —
Сляды наўкол і скрозь:
І пэўна, што ў адведкі
Туды сабраўся лось.

* * *

Халодны дождж — не даспадобы вільгаць
Зямлі. Хварэе сад на немату.
Відаць, не скора дрэвам лісце выгнаць
У цёплы свет, у ядрань, яснату.

Калі той час, як зерню легчы ў глебу,
У парную і пульхную раллю?
Нібы зямля не дагадзіла небу
І неба зазлавала на зямлю.

* * *

Снег асядае. І заспаны лес,
Пахмурны з раніцы, здаецца, пазяхае.
Туман да самых макавак далез.
Унізе — мох, ламачча — неахайна!

Унізе сыра — склеп або падвал.
Цень-цень! — І ўсё: маркоціцца сініца.
Зіма — падман. Ды і вясна — падман.
Вось-вось павінна нешта праясніцца.

* * *

Ускраіна абвалаклася дымам.
Гараць, гараць бадылле і лісцё.
Пад гэтым небам, сінім і любімым,
Не верыцца чамусьці ў небыццё.

Нібы сябе ты збоку аглядаеш,
Нібы сябе ты слухаеш знутры.
Каб расцвітаць, дык не, не расцвітаеш,
Але пра тое ўжо не гавары.

Хай расцвіцеш пазней — бяда такая!
Хай будзе дзень спякотней і гарчэй.
Ды нехта вунь і кліча, і гукае,
І хусткаю махае з-за плячэй.

Іду, іду! У далечы вясёлай
Грымяць масты, імчацца цягнікі.
Іду, іду! Ах, як грукочуць колы,
Як ты глядзіш уважна з-пад рукі!

СУПАКАЕННЕ

Хоць і не зведаўшы акрас
Даўно жаданай перамогі,
Я спакайнейшы гэты раз —
Ці не былое вучыць трохі?

Так ціхамірна навакол!
З вячорнай хмаркі залацістай
Святло струменіцца на дол
У праваце сваёй вячыстай.

І пагаджае «тут» і «там»
У нашай думцы набалелай,
І нейчы голас шэпча нам
На мове, сэрцу зразумелай:

Былых пазбыўшыся пакут,
Насустрач новым не спяшайся.
Жывым аблiччам там і тут
Зямнога свету суцяшайся.

За ўсё, за ўсё адкажаш сам,
Усё маёй пазначыш рыскай,
Аддалы служка тым часам,
Што разгайдаліся калыскай.

* * *

А будзе час, калі і без нагоды,
А проста так, ад шчодрасці быцця,
Успомняцца ранейшыя нягоды
Раней нязнанай мерай пачуцця.

І тое ўсё, што некалі балела
І што гняло варожай варажбой,
Падасца смуткам — скрухай пераспелай,
А ўвогуле — харошаю журбой

Па тым усім, што гэтым Шляхам Млечным
Сплыве ракой — шумліваю слязой —
Не ў залаты век, не ў сярэднявечча,
Не ў мезазой або палеазой,—

Туды, дзе, па праверанных прыкметах,
Для ўсіх з другога свету прыбышоў
Цвітуць сады і неба ў дыяментах,
А ля вады — эфірны скавышок.

РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

Я не скажу, што бачыў свет.
Але на моры і на сушы
Жывых людзей жывыя душы
Ў маёй пакінулі свой след —

То след гаючы, то балючы.
Ды чалавечае бяды
У час балючых з ёй заручын —
Куды найбольшыя сляды.

У час удачы ці няўдачы
Ў самім табе душу бярог,
Так ці накш цябе іначыў
Так званы болевы парог.

З табой лучыў і свет няблізкі,
Каб голас сэрца не глушэў:
Для болю іншых быў ён нізкі,
А для твайго — усё вышэў.

* * *

Рыгору Барадуліну

Калі стаяў на гэтай кручы:
Бы звон, быў дзень — каціўся Сож
Туды, дзе гэты бераг злучан
З маленствам,— тым, што басанож,
З парою той, якою далі
Сваю сінечу і смугу
На развітанне мне аддалі —
Аддаць назад ім ці змагу?
Ды як аддаць, мой свеце любы,
Аднойчы ўзяўшы падарож,
Святло той рэчанькі Галубы,
Якую прыгалубіў Сож?
Ці тыя засень або ясень,
Той лог, аблогу, мурагі,
На сенакосе Касю з Ясем,
За імі — копы і стагі;
Каня над рэчкаю іржанне
І нават голасу дрыжанне

У словах — родны, дарагі?
Яны са мной — і мною сталі,
Праз вёскі і праз гарады
Мяне раптоўна даставалі,
І паўставалі, і ўрасталі
Ў мае трывогі і гады.
І ўсё вяла, вяла дарога —
То хмель пры ёй, то дзераза.
І так хацеў спазнаць я многа,
І так хацеў сказаць, нябога,—
І шмат чаго я не сказаў!
Я вінават, што скрухай змучан,
Што даль юначую заву...
А ты даруй — я з гэтай кручы
Хілю павінна галаву.

ЗАЎВАЖ САБЕ


Матыў лірычны, адмысловы
У важкай думе ці журбе —
Ён неабходны, каб на слове,
Паэце, верылі табе.

Не паспяшай прысвоіць права
Казаць за гэтых ці за тых.
Не прывучайся лашчыць справа,
А злева — біць пад самы дых.

Хай слова будзе, як патрэба,
Як у прыпар вады глыток...
Яшчэ запомні: слова — срэбра.
Дык памаўчаць умей, браток!

Яно, канечне, слова — лекі:
Дык што ж — узяў і прапісаў?
А што, як скажуць чалавекі:
Мой лекар, вылечыся сам?

Лепш як прадмову-прадумову
Душу ў сабе раскалышы.
Хай на жыццёвым рубяжы
Само цябе шукае слова —
А ты сустрэчы памажы!



З

..так і наша пісьменніцкая стыхія:
берагі ў яе адны —
жыццё, родная мясціна,
чалавечы лёс, што тчэ намітку
нашых дум і парыванняў.

ЭСЭ

ДУДАР БЕЛАРУСКІ

Лёс быў не асабліва каб спагадлівы да яго. Жыццёвы шлях Францішка Багушэвіча не ўсцелены ружамі, на творчым шляху Мацея Бурачка мы ведаем толькі асобныя вехі, магчыма, самыя значныя, якіх дастаткова для таго, каб зразумець, убачыць, куды вёў гэты шлях, але ж як не шкадаваць пра тое, што губляецца пакуль пад наміткаю часу:

Сквозь туман кремнистый путь блестит...

Два зборнікі вершаў, выдадзеныя за межамі радзімы, некалькі эпіграм, некалькі ўрыўкаў з вершаў, якія захаваліся ў лістах да сяброў, ды і таму толькі, што літаратурны лёс адрасатаў быў на той час шчаслівейшы, чым лёс Мацея Бурачка. Лісты данеслі да нас боль Багушэвічавай душы, сумнае падвядзенне жыццёвых рахункаў у такіх вось шчымлівых, як сама скруха, радках:

Вецер дзьме і вые,
Што аж мыслі рвуцца.
Змоўклі песні тыя,
Што іграў на дудцы.
Раз яшчэ зайграю
У астатняй хвілі
Для тых, што жаль маю,
Што мяне забылі...

І пра гэта зноў у вершы, напісаным па-польску (пераклад М. Танка):

Хутка дагарае вецце
У пячурцы ў хаце.
І гаворыць нешта ў сэрцы:
Так і з табой, браце.

Можна, вядома, са зразумелай упэўненасцю сказаць сёння: не «змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы», не забылі паэта — шмат яшчэ чаго справядлівага і пафаснага можна сёння сказаць, але ж так усё роўна не паможаш паэту, якому, калі пісаў прыведзеныя радкі, было, мусіць, вельмі балюча. Балюча, акрамя ўсяго, хаця б і таму, што ўбачыў пры жыцці ў друку адно толькі сваё апавяданне, што не ведаў, які лёс чакае праз гады гатовыя зборнікі апавяданняў і вершаў, не прапушчаныя цэнзурай, што будзе праз гады з матэрыяламі да слоўніка, у якім меў намер пераўзысці самога Насовіча,— ён мог спадзявацца на горшае ці суцяшаць сябе, як суцяшаем сёння мы сябе, спадзеючыся, што зборнікі гэтыя, як і паэтаў слоўнік, магчыма, яшчэ калі-небудзь знойдуцца. І як хочацца думаць, што паэт тады, у хвіліну падвядзення творчых рахункаў, меў усё ж суцяшэнне, надзею быць карысным у будучым свайму народу і сваёй літаратуры. І, можа, тады, падчас разваг пра сваю творчасць, выйшлі з-пад ягонага пяра і такія радкі:

Каму дудка паслушна
Ды іграе спеўна,
Той душа дабрадушна
І шчырая, пэўне.

Праз сціпласць, можа, праз свой нялёгкі лёс, праз тое, што слову ягонаму яшчэ так доўга было ісці да чытанак роднай літаратуры, да тысяч экземпляраў надрукаваных на роднай мове і ў родным краі кніг,— праз гэта, можа, не сказаў ён пра сябе, пра сваё значэнне для нас упэўнена і горда, як мог бы, па справядлівасці, сказаць, а выказаўся так нясмела, не сумняваючыся хіба толькі ў шчырасці сваёй душы. Ды і не пра славу думаў ён, не слава вымушала яго падпісвацца псеўданімамі — нейкім Мацеем Бурачком ці Сымонам Рэўкам з-пад Барысава. Можа, нават таму і не супадаюць, дарэчы, псеўданімы аднаго і таго ж аўтара, што, акрамя іншых прычын на тое, якіх, вядома, магло быць многа, была яшчэ і такая: намер стварыць уражанне ў чытача, што не загінула зерне, кінутае ў родную глебу Мацеем Бурачком, што пасля ягоных спроб вось і яшчэ нехта «задумаў паспрабаваць што-кольвек напісаць». І не тое тут галоўнае, што «спадабаліся тыя вершы», а тое, што справа, пачатая Бурачком, не павінна загінуць. «Граю трошкі на скры-

пачцы, ну, дык няхай і мая кніжачка завецца струментам якім, вось і я назваў яе «Смык». Смык ёсць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была «Дудка» — вось і мы зробім музыку...» На шчасце, не памыліўся Багушэвіч: «Скрыпачку» неўзабаве дарабіла Цётка, а вялікі Купала ўзбагаціў родную музыку «Гусляром» і «Жалейкай».

Заўсёдны, неадступны клопат пра роднае слова вадзіў пяром паэта, калі ён пісаў да сваіх зборнікаў прадмовы, у скупых радках якіх цэлая праграма літаратуры на цэлую эпоху развіцця яе. Перш за ўсё трэба, каб ажыло, каб зайграла ўсімі сваімі фарбамі пад пяром мастакоў беларускае слова, мова родная, «што ўсе мы завём... «мужыцкай», і так — нічагусенька, як бы так і трэба». Не, так не трэба,— гаворыць Багушэвіч,— несправядліва гэта, вялікая бяда будзе таму народу, тым пісьменнікам, што цураюцца мовы сваёй. «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!»

Як усё гэта павінна было хваляваць Багушэвіча, якім болем душэўным павінна было абзывацца ў той час, калі нават людзі, што шчыра захапляліся беларускім фальклорам, народным словам, скептычна ставіліся да магчымасці развіцця літаратуры на нашай мове. Нават П. Бяссонаў, якому наша культура назаўсёды астанецца ўдзячнай за багата падабраныя і любоўна вытлумачаныя «Белорусские песни» — нават такі чалавек, не пакідаючы месца сумненням, пісаў: «Трэба, каб руская літаратура ўзнікла тут жа, на мясцовых пачатках, мясцовымі стараннямі, інтарэсамі, вобразамі, сіламі мясцовых тубыльцаў і дзеячаў... Тады з'явіцца мясцовы паэт, пісьменнік, вучоны, мастак для краю і для ўсёй Расіі, як Гогаль — маларус-рускі, Міцкевіч — Залескі — Сыракомля, літвін-маларус-беларус польскі». П. Бяссонаў памыляўся: «мясцовы паэт» з'явіўся і даў штуршок да абуджэння мастацкай творчасці цэлага народа.

Выказаўшы праграму нацыянальна-грамадскую, Багушэвіч вызначае праграму і ўласна літаратурную, сваёй творчасцю выдатна здзяйсняючы яе. Выдаючы свой першы зборнік, ён не мог не ўспомніць: «Здаралася і мне чытаць ксёнжачкі, хоць не надта старыя, друкаваныя нават, якогасць пана Марцінкевіча, але ўсе як бы смеючыся з нашага брата напісаны». Пану

Марцінкевічу супрацьпастаўлены Мацей Бурачок; чуллівасці з выпадку гаротнага жыцця сялянства, спагадзе мужыку, ідылічнасці погляду на народнае жыццё проста як на літаратурны матэрыял супрацьпастаўлены самы бязлітасны рэалізм, дух няскоранасці і пратэсту, нечуванае па сацыяльнай і мастацкай смеласці зліццё аўтарскага «я» з народным поглядам на рэчы, на свет, на становішча і месца працаўніка ў ім — тое месца, якое належыць цяпер, і тое, якое па-сапраўднаму павінна належыць. Не для забавы змайстравана Багушэвічава «Дудка»:

Грай, вясёла ж грай,
Або долю дай!

Сацыяльны пафас Багушэвіча бязлітасны, ён уражвае, як крык душы, як споведзь чалавека, даведзенага да такой мяжы роспачы, за якой або смерць, пагібель, або дзеянне. Іншага выйсця няма. О як здзеклівa, непакорна, пранізліва-балюча гаворыць мужык Багушэвіча, палымнеючы нянавісцю да паноў,ураднікаў, соцкіх, следчых, пісарчукоў,— усёй той брыды, што сядзіць на ягоным карку і абірае яго, і б'е бізуном, і падганяе. Як нагадваюць тыя пачуцці, якімі жыве багушэвічаўскі мужык, пачуцці мужыка купалаўскага:

Адных выракся б навекі,
Кляцьбой плюнуў бы другім.
За дазнаныя ўсе крыўды
Эх, і мсціў бы, мсціў усім!

Багушэвічаў мужык менавіта помслівы, здзеклівы. Ён адчувае сваю моц, да пары да часу скаваную варожым яму, ненавісным ярмом, ён адчувае сябе творцам усяго, адчувае сваё права на ўсё і востра ўсведамляе сваю чалавечую годнасць:

У законе ж усе роўны — і пан, і мужык,
А што ж то ўраднік за велькі індык?

І вось чаму:

Прыблуда! схавайся, адкуль ты прыйшоў,
У нас ужо досыць-такі прыбышоў.
І кожны згніе, бо як кол тут убіўся,
А зрублены пень там згніе, гдзе радзіўся!..

Гэты мужык са сцятымі вуснамі, цёмна гневаючыся сэрцам, узіраецца ў мітусліва-хцівы кірмаш «уладароў і суддзяў», адчуваючы сябе, а не іх, уладаром і

суддзёй. Ён усё ведае: і тое, што «у банках усе аж па вушы сядзяць; кідаюць двары, на Парыжу глядзяць...», што бог наогул «не роўна дзеле»; разумее ўсё, што хаваецца за «вучонымі» слоўцамі нейкага судовага плюгаўца, мерае адну несправядлівасць другой:

Налічаў, налічаў,— і двайну, і трайну,
Як шынкар у карчме тваю чарку адну.

Сялянскае жыццё, намаляванае паэтам, падгледжана ў самы напружаны момант. Гэта жыццё напярэдадні выбуху, сацыяльнага бунту.

Багушэвіч зрабіў сваю справу. Каб ён дажыў да рэвалюцыі 1905 года, дык загаварыў бы, як Купала. Абавязкова! Адмаўляючы Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіч прадвызначыў Купалу. І ў сацыяльным сэнсе, і ў сэнсе мастацкім. Адкрыцці сацыяльныя ішлі побач з адкрыццямі мастацкімі, дакладней, яны ўтваралі ў Багушэвіча непарыўнае адзінства. Для Дуніна-Марцінкевіча сялянскае жыццё, скажам зноў, было матэрыялам, адным з магчымых сюжэтаў, які трэба было зрабіць творам па пэўных законах мастацтва. Багушэвіч самое жыццё, у вышэйшай ступені празаічнае, грубае, неэстэтычнае, робіць мастацтвам. Як бы забываючыся пра форму, як бы абмінаючы яе.

А той хлеб жуе з мякінкай,
Хлёбча квас ды лебяду,
Разам жывець і есць з свінкай,
З канём разам п'ець ваду!

Што можа быць больш мастацкім, праўдзівым і простым! Багушэвіч-паэт загаварыў адразу — і як загаварыў!

Багушэвіч здолеў прымусіць па-новаму загучаць беларускую мову — натуральна, гнутка, афарыстычна і прыгожа. Гэта, трэба думаць, каштавала яму найвялікшых намаганняў, але і таленту, і намаганняў было б недастаткова, каб паэт не ведаў, як гавораць беларускія людзі не толькі на Ашмяншчыне, але і дзенебудзь пад Барысавам, адкуль узяў ён свайго Сымона Рэўку. У мемуарных запісах А. Абуховіча, сучасніка паэта, чытаем: «Праглядаючы мае вершы, Францішак Багушэвіч зрабіў увагу, што ў мяне не ўсюды бываюць уласцівыя беларускай мове акцэнты». Значыцца, і пра чысціню мовы турбаваўся ён, пра яе агульнанароднасць. І слоўнік свой ён складаў, мусіць, дзеля таго, каб

паказаць у ім не мову пэўнай мясцовасці, а мову ўсяго народа. Каб адшукаўся рукапіс слоўніка, які б гэта быў неацэнны скарб!

Пры жыцці Багушэвіча на ягоныя зборнікі была надрукавана адна-адзіная рэцэнзія. І часта тыя, хто нават чытаў паэтавы вершы, не ведалі сапраўднага імя творцы. Бязлітасны час захаваў нам вельмі мала звестак пра Францішка Багушэвіча, але ён, гэты час, і ўзнавіў, вымераў сапраўднае значэнне для нашай культуры сціплага судовага следчага, які быў першым у шэрагу вялікіх нацыянальных паэтаў.

1962

НА ПАЧАТКУ ЎСІХ ПАЧАТКАЎ

У кожнай літаратуры ёсць свой «зорны гадзіннік». Гадзіннік нашай новай літаратуры сёлета паказвае шэсцьдзесят год, лічачы час ад таго дня, калі ўпершыню абазваўся на роднай мове нікому яшчэ не вядомы Янка Купала. На літаратурным небасхіле ўзышла, во-стра кальнуўшы промнем глухое цемрыва ночы, першая наша зорка. Тады ніхто яшчэ не ведаў яе арбіты: астраномы літаратурнага неба — крытыкі не адзначылі паспешліва яе на сваіх картах — і крытыкаў, на жаль, нават аматараў, на той час у нас амаль не было. Але ўсё чынілася сваім парадкам: за гэтай, на шчасце, першай велічыні зоркай, узышла другая, трэцяя — то былі зоркі Коласа і Багдановіча. Не разышліся далёка іх арбіты: хутка ўсе ўбачылі, што гэта было сузор'е. Зорны гадзіннік пачаў паказваць час. Дзесяць, дванаццаць, нарэшце шэсцьдзесят год.

Здаецца, як даўно гэта пачалося, але ж і Купала, і Колас, і Багдановіч, гэтак жа як і Чорны, маглі б, на добры лад, быць яшчэ нашымі сучаснікамі, маглі б жыць сярод нас. Сёння нельга не шкадаваць аб тым, на колькі тых патрэбных нам год яшчэ пасталела б, дзякуючы гэтым майстрам, наша літаратура: на тое, што маглі б зрабіць яны разам ці ў паасобку, сёння трэба намаганні многіх людзей. Як прыкра, як балюча, што чалавек смяротны і ў гэтым сэнсе не ўладны над часам. Смерць не пашкадавала іх, як не пашкадавала ні Пушкіна, ні Лермантава, ні Дабралюбава, ні Пісарава. Ёсць адно толькі суцяшэнне, радасць ад таго, што яны ўсё ж былі — людзі, чый талент гэтак магутны, гэтак падначалены запатрабаванням літаратуры і часу, што пакінуў па сабе такі глыбокі і непазбежны след, ■ якога не маглі ўжо сысці тыя, хто прыйшоў у літаратуру пасля. В. Брусаў пісаў неяк пра Пушкіна, што ён «быццам усведамляў, што яму суджана жыццё нядоўгае, быццам спяшаўся даследаваць усе шляхі, па якіх магла пайсці літаратура пасля яго... І да гэтай пары наша літаратура яшчэ не пераадолела Пушкіна; да гэтай пары на ўсіх напрамках, куды яна імкнецца, ёй трапляюцца вехі, пастаўленыя Пушкіным у знак таго, што ён ведаў і бачыў гэту сцяжыну». Выдатныя словы!

Мы можам цалкам аднесці іх да Купалы, Коласа і Багдановіча, якія для нас, як Пушкін для рускіх, карыстаючыся азначэннем другога пісьменніка, «пачатак усіх пачаткаў». Нам таксама да гэтай пары трапляюцца вехі, пастаўленыя працаўнікамі роднай літаратурнай нівы. Яны многа ведалі, гэтыя працаўнікі, многа маглі і, можа, яшчэ болей бачылі наперадзе. Ні адзін з іх не быў толькі паэтам. Купала паказаў дарогу нашай драме, Колас падняў на сваіх плячах эпас, стварыўшы «Новую зямлю» і даўшы на доўгі час накірунак нашай прозе. Багдановіч, раннюю літаратурную сталасць якога можна параўнаць хіба толькі са сталасцю Лермантава, як ніхто, уважліва, старанна выходжваў кожны новы парастак роднай літаратуры, узяў на сябе задачу нашага асветніка і крытыка.

Цяжка зноў утрымацца ад паралелі з рускай літаратурай. На небасхіле паэзіі свайго часу геній Пушкіна ззяе зоркай першай велічыні. Святло гэтай зоркі забівае святло ўсіх астатніх. І Баратынскаму, і Языкаву, і нават Бацюшкаву, які шмат у чым папярэднічаў вялікаму паэту, суджана называцца, не кажучы ўжо аб Дэльвігу, Вяземскім ці Кюхельбекеру, толькі «паэтамі пушкінскай плеяды». Зоркі Купалы, Коласа і Багдановіча аднолькава першай велічыні. Гісторыя гэты раз размеркавала мудра: толькі так, толькі маючы паплечнікамі такія таленты, можна было адважыцца прайсці як найхутчэй той шлях, на які іншым літаратурам спатрэбіліся стагоддзі. Але і нават пасля Купалы, Коласа і Багдановіча хапіла б яшчэ працы не аднаму таленту, роўнаму іхнім: на наша шчасце, мы мелі яшчэ і Чорнага.

Багдановіч, якога толькі час, толькі спецыфічныя задачы нашай літаратуры зрабілі паэтам, вярнуўшы яго радзіме, адчуваў, мабыць, адказнасць беларускага пісьменніка перад літаратурай асабліва востра. Нездарма яму выпала на долю, хоць і на кароткі час, быць «разумовым цэнтрам» той барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне беларуса, за яго права «чалавекам звацца», якой надала такі дзейны штуршок рэвалюцыя 1905 года. Вядома, у гэтай жа ступені залежаць ад часу і Купала, і Колас. Строга кажучы, гэта менавіта час нашу паэзію «из ничтожества воззвал». Прыгадаем хаця б, што першыя вершы Купалы напісаны па-польску, што Багдановіч пражыў доўгі час за

межамі радзімы, не так і добра нават гаварыў па-беларуску, што Колас першапачаткова спрабаваў свае сілы ў літаратуры на рускай мове. Нам няма чаго саромецца сказаць пра гэта. Наадварот, у тым большым арэоле павінен паўстаць для нас подзвіг трох выдатных паэтаў і тых, хто ішоў з імі, каб сцвердзіць, што Беларусь можа і павінна заняць «свой пачэсны пасад між народамі». Усё гэта праўда і — высакародная.

Час паклікаў нашых паэтаў на адну агульную справу, і яны рабілі яе, не замінаючы адзін аднаму, ідучы кожны сваёй дарогай і співаючы кожны сваю, адметную ад усіх песню. Калі на адной рабоце сыходзяцца тры майстры, ніводзін з іх не стане хадзіць падручным у другога: кожны стане рабіць тое, што яму бліжэй да душы. Неяк так натуральна ўзнік у дадзеным выпадку і літаратурны «падзел працы», што вынікала, зноў жа, з усведамлення агульнасці задачы. І вось чаму Багдановіч без Купалы не здолеў бы стаць тым, кім мы сёння ведаем яго, вось чаму палымянасць, імпульсіўнасць Купалы «ўраўнаважвае» глыбакадумна-разважлівая, спакойная плынь коласаўскай паэзіі. Ідэал літаратуры ў паўнаце мастацкага адлюстравання жыцця. Нацыянальнае жыццё, маючы сваімі выказнікамі не аднаго, а трох выдатных паэтаў, дасягнула мастацкай паўнаты праз іх. У сэнсе ўласна літаратурным гэта быў найвялікшы выйгрыш.

І Купала, і Колас, і Багдановіч хацелі бачыць свой народ разняволеным, а сваю літаратуру раўнапраўнай у сям'і іншых славянскіх і сусветнай літаратур. Толькі Купала быў першы, а ўжо за ім павінны былі прыйсці другія. Вось чаму, зноў жа, ён не мог сказаць пра свой прыход у літаратуру іншымі словамі, чым тыя з яго славутага «Мужыка»:

І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык,
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць — бо я мужык!

І вось чаму менавіта Купалу выпала напісаць і «А хто там ідзе?» і «Ворагам Беларушчыны». Напісаць так:

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб тэй мове,
Якой азваўся беларус?

Мы ведаем, што не напісаць так ён не мог. Больш чым хто іншы ён мог бы сказаць пра сябе: «Не я пяю — народ божы...» Бо праз Купалу наш народ вучыўся і гаварыць, і спяваць. Купала быў ягоным голасам, сумленнем, ягонымі вачамі і розумам. І яшчэ ён быў настаўнікам. Не тым самаўпэўнена-строгім настаўнікам у сурдуце, зашпіленым на ўсе гузікі, не тым дабрадзеем, што даўно здаволіўся сваім багаццем і таму паблажліва раздае яго. Купала сам вучыўся ў народа і вучыў яго, а багацці свае так шчодра раздаваў таму, што некалі сам пазычыў іх у бедняка. Як паэт ён менш за ўсё быў жыхаром нейкага паднябеснага Парнаса; ягоным Парнасам, ягоным Алімпам была курная беларуская хата, а Пегасам ён не ўзяў бядняцкага канягу толькі таму, што яму спадручней было проста хадзіць па зямлі. Ды і што той Пегас? На ім можна было хіба толькі імчаць, а ён жа хацеў лунаць у песні сокалам!

Купала як паэт і асоба вырастаў разам з народам. Гэты рост непазбежна быў пакутлівы, бо не так і лёгка было пазбыцца прыніжанасці і забітасці, што вякамі нёс народ на сабе: паэзія вялікага песняра мае адзнаку ў самым сапраўдным значэнні слова трагічную. Яна не належала б так свайму часу, а значыць, і літаратуры, каб была іншай, а Купала не быў бы вялікім нацыянальным паэтам, каб не разумеў, не ўсведамляў гэтага. А ўсведамляў ён многа. І не толькі ўсведамляў, але і шчодра выказваў сябе ў творчасці.

Хочацца сказаць, як мы іншы раз «прыхарошваем» Купалу, не заўважаючы, што збядняем яго, абавязкова вышукваючы ў ягонай паэзіі адны лозунгі і «заклікі да бітваў». Купала — найвялікшы рэвалюцыйны паэт, але ж рэвалюцыйнасць у паэзіі не ў тым, каб адно фармуляваць больш ці менш удала надзённыя задачы дня — на гэта стае і самай звычайнай, вядома, таленавітай, публіцыстыкі. Купала не быў стопрацэнтным аптымістам у тым сэнсе, як гэта разумеюць павярхоўныя людзі, сярод якіх, на жаль, трапляюцца і крытыкі. «Мужык», «Ворагам Беларушчыны», «Там», «А хто там ідзе?» і шмат яшчэ якія вершы — полюсы купалаўскай лірыкі, паміж якімі трапяталася, плакала, скардзілася, радавалася, сумнявалася, знала роспач незвычайна багатая на эмоцыі паэтава душа. Паміж полюсамі гэтымі не вакуум, а інтэнсіўнае магнітнае поле паэзіі.

Першая паэтава песня пайшла ў свет — які чакае яе лёс?

Дык жа знайце, чаго б я хацеў,
Аб чым думачкі толькі мае:
Каб мой люд маю песню запеў
І пазнаў, аб чым песня пяе.

І ў другім вершы зноў пра гэта:

Першыя песні — першыя чуткі
Шчасце зазнаці хаценкі нясмелай,
Першыя думкі вольнай мінуткі
Птушкамі вымкнуць на свет гэты белы.
Што іх чакае, што іх спаткае,
Чым блаславяць маладога музыку?

Ці падрыхтаваны народ да таго, каб пачуць, зразумець гэтую песню, каб мець мужнасць пазнаць «эту бледную, в крови, кнутом иссеченную музу»? Думка паэта ідзе далей ці, наадварот, вяртаецца назад. У вершы «Над сваёй айчызнай» ён пытаецца:

Дзе той час, у яком
Тут кіпела жыццё?
Свой народ быў кругом
І любіў сваё ўсё.

Сваю песню ў лад свой
Не стыдаўся запець,
І сярмягі сівой
Не стыдаўся надзець.

Як балюча паэту за свой народ, за яго лёс! І папрок, і скарга, і прынука чуюцца ў ягоных словах, калі ён піша:

Усе людзі значэнне пазналі вучэння,
Адзін толькі ты ані дбаеш!
Цямней, беларусе, ад ночкі асенняй,
І шчасце ж такое ты маеш...

Вось якой пуцявінай ідзе Купалава думка, вось якія турботы ведае яна. Яна трымціць мужнасцю, калі спараджае гардаліва-пякучыя, поўныя вялікага ўзрушэння словы:

Не! досыць, досыць! трудна далей
Цярпець, ціхія слёзы ліць!
Нічога мне, ой не, не далі,
А ўзялі ўсё, чым мог бы жыць.

Або:

Нам трэба жыць і долю папраўляць,
Каб нас патомкі з часам не клялі.

І яна, паэтава думка, мае хвіліну сузіральнай, нейкай незямной развагі перад гэтай мужнасцю, як бы зачараваная, яна вагаецца: і парываецца наперад, і азіраецца назад, і мякка пасміхаецца з сябе. Памятаеце выдатны верш «З песень а бітвах»? Спачатку ідзе знаёмае паэту, перадуманае не раз:

І відзець страшна ў путах сілу,
Людскі ўвесь з жалю енк і плач,
Аж хоць кладзіся у магілу
І свету гэтага не бач.

А потым гэтыя радкі, што ідуць рэфрэнам, незвычайныя па кантрасту настрою, па дзіўнай узаемасувязі з папярэднім:

А сурмы граюць баявыя,
Віхор разносе іхні звон,—
І песні дзіўныя такія
Ад іх лятуць да ўсіх старон.

Такі ён, невыказна, невымерна багаты Купала, які заўсёды адчуваў сябе як цэлы народ ці, у іншым выпадку, як часцінка яго. Народу ён быў свой, і таму яму не трэба было падладжвацца пад яго або яму ліслівіць; калі трэба, ён мог звярнуцца да беларуса і са словам гнеўнага папроку:

Там кроў ліецца, там за волю
Барцы на віселыні ідуць!
А вы, вы мучаны найболей,
Спіцё, хоць вас даўно там ждуць.

Купала — гэта нястрымны паток, які шукае сабе рэчышча і знаходзіць яго там, дзе дагэтуль не было ніводнага жыватворнага струменю. Гэта аратай, які нястомна арэ, час ад часу паднімаючы галаў, каб выцерці на твары пот і паглядзець на неба. Гэта чалавек, які толькі што навучыўся спяваць і, уражаны сваёй песняй і ўзрадаваны ёю, выцінае і выцінае ўсё новыя рулады — і маладосцю, сілаю, непасрэднасцю вее ад ягонай песні, што хавае ў сабе ўсе адценні пачуцця. Гэта, урэшце, чорнарабочы паэзіі, якому да ўсяго трэба дайсці самому, і калі ў яго не ўсё часам ладзіцца, дык за яго ніхто пакуль гэтага не паправіць,— усё трэба рабіць самому. Ён нястомны працаўнік, нават на сузіранне зробленага яму не стае часу. Працаваць, працаваць, працаваць. Можа, іншыя пасля зробяць лепш за яго, але сваё ён павінен зрабіць як найболей і як найлепш. Купала падняў нацыянальную рэчаіснасць да ўзроўню

мастацтва: тыя, што былі побач з ім ці ішлі за ім, ужо добра, упэўнена адчувалі сябе мастакамі слова.

Так адчуваў сябе Колас. Пра яго можна сказаць, што ён ішоў і поплеч з Купалам і ў той жа час як бы ўслед за ім. Не думаю, каб такое вызначэнне магло насцярожыць каго-небудзь у благім сэнсе. Сказанае трэба разумець так, што Колас, улічваючы зробленае сваім вялікім сабратам па пяру, стараўся ўжо надаваць жыццёваму матэрыялу большую мастацкую закончанасць і самастойнасць у межах самой літаратуры. У Купалы надзвычайны інстынкт мастака; Колас не адмаўляецца, каб выверыць гармонію алгебрай. Гэтым, дарэчы, ён нагадвае Багдановіча.

Купала ўвесь у пошуках, у парыванні, у руху; Колас больш спаважны і спакойны, ён упэўнена валодае сваім матэрыялам, паступіўшыся пры гэтым, магчыма, знарок, багаццем і разнастайнасцю купалаўскіх тэм. Матывамі ж сваёй творчасці ён гэтак блізкі Купалу, як той яму. Нездарма нават назвы іх першых зборнікаў пераклікаюцца паміж сабой: на купалаўскай «Жалейцы» Колас грае «Песні жальбы». Купала піша:

Песні ўздумаеш пець,—
Адазвешся выццём.

У Купалы гэта вырываецца як бы міжволі; Колас нават самой пабудовай верша падкрэслівае, што ён ужо мае суразмоўніка, чытача:

Не пытайце, не прасеце
Светлых песень у мяне.
Бо, як песню заспяваю,
Жаль вам душу скалыхне.

З маланкавай напружанасцю і вастрынёй думкі Купала ўсклікае:

Не пагасіць вам праўды яснай,
Жыў беларус і будзе жыць.

З гэтай жа ўпэўненасцю, але не забываючыся пры гэтым на мастацкія покрывы думкі, Колас і абнадзейвае і суцяшае:

Не бядуй, што снег халодны
Скрые землю ад вачэй:
Не загіне край твой родны
У тэй цемені начэй.

Такія гэтыя два вялікія паэты. Не маючы намеру кінуць цень на Коласа, трэба ўсё ж сказаць, што ў лі-

рыцы вялікія мастацкія адкрыцці ён ведае радзей, чым Купала. Колас моцны іншым. «Новая зямля» — вось сапраўднае дзецішча паэта, твор, які нанова як бы стварыў нацыянальную рэчаіснасць і нацыянальную свядомасць; прытым, калі Купала, як было ўжо сказана, узняў гэтую рэчаіснасць да ўзроўню мастацтва, Колас нанова стварыў яе па законах мастацтва. Два вялікія паэты непарыўна звязаны, такім чынам, паміж сабой адзінствам творчай задачы.

Колас-эпік, Колас-лірык і адначасова сацыяльны паэт раскрыўся ў «Новай зямлі» з небывалай сілай гарманічнага спалучэння разнародных паэтычных якасцей.

Мой родны кут, як ты мне мілы:
Забыць цябе не маю сілы...

Гэта, мабыць, напісана ў турме. Як пераможна заўсёды смяецца паэзія над тупой паліцэйскай сілай! Цар, высылаючы на поўдзень Пушкіна, думаў, што ў дзікай глушы змоўкне ягоная муза. Дарэмна! Новымі сваімі творамі Пушкін толькі яшчэ больш узвысіўся ў вачах культурнай Расіі, не кажучы ўжо аб тым, што там, на поўдні, задумаў ён свайго «Яўгенія Анегіна». І вось цяпер — «Новая зямля». Як і «Яўгеній Анегін» — энцыклапедыя народнага жыцця.

Якія б здабыткі ні займела ў будучым наша літаратура, яна ніколі не абыдзе самай пільнай увагай «Новай зямлі», у якой заўсёды будзе ў самым дэмакратычным сэнсе народны чытач. І не дзіўна гэта: «Новая зямля» даўно ўжо стала настольнай кнігай беларусаў.

Кажуць, Кузьма Чорны меў намер напісаць вялікую працу аб гэтай кнізе. Як шкада, што ён не паспеў здзейсніць сваёй задумы! Лепшага крытыка і вытлумачальніка Коласу цяжка было б адшукаць. Хаця не — пра «Новую зямлю», мог бы, каб заўчасна не абарвалася ягонае жыццё, напісаць і Максім Багдановіч. Чалавек надзвычай чуйнага мастацкага слыху, бездакорнага густу, вялікай адукаванасці, ён стаў тым апошнім дыяментам, якога толькі не ставала, каб належным чынам упрыгожыць нашу паэтычную карону. Літаратуры трэба быў такі чалавек, і ён прыйшоў. То быў час, калі радзіма склікала сваіх сыноў: гэты кліч дакаціўся да берагоў Волгі, да Ніжняга Ноўгарада, дзе бегаў на заняткі ў мясцовую гімназію самапаглыблены юнак, пра-

званы «Максімам-кніжнікам». Скора, вельмі скора ён дашле ў «Нашу ніву» рукапісы сваіх вершаў.

Багдановіч быў вельмі патрэбны нам, але гэта нават тады зразумелі не ўсе і не адразу. Сучаснікі, што, як гэта часта бывае, набіраюцца запозненай мудрасці толькі падчас напісання мемуараў, шкадуючы, сведчаць, што той-сёй у «Нашай ніве» пагардліва называў паэта «дэкадэнтам» і не знаходзіў магчымасці ягоныя творы друкаваць. Толькі настойлівасць Купалы дала вершам Багдановіча ход — паслуга Багдановічу і роднай літаратуры, якая адначасна робіць гонар Купалу — чалавеку і паэту.

Крыўдна, што нават і сёння той-сёй возьме ды выцягне на свет божы фразачку аб «дэкадэнцтве» Багдановіча. Напіша неяк так (цытую з аднаго крытыка дакладна): «Аддаючы даніну захапленню эстэтыкай сімвалізму, паэт стварыў пад яе ўплывам рад упадніцкіх твораў». Сказана, вядома, гучна, але не вельмі каб даказна. Прадэманстраваўшы такім чынам сваю праніклівасць, аўтары, падобныя да нашага, кідаюцца зноў у абдымкі да Багдановіча, паспешліва прамаўляючы, што, аднак, «не гэтыя «дэкадэнцкія» вершы (дарэчы, якія? — *М. С.*) вызначаюць творчае аблічча і месца Максіма Багдановіча ў літаратуры». «Свят, свят!» — кажа такі аўтар нейкаму заядламу праціўніку Багдановіча. «Свят, свят!» — кажа ён, павярнуўшыся, прыхільніку паэта.

А пытанне пра «дэкадэнцтва» Багдановіча трэба ж неяк вырашаць. Так, дапусцім, што на паэта ўплываў сімвалізм, але як? Вось у чым, здаецца, галоўнае. Багдановіч, як працавітая пчала, збіраў мёд шмат з якіх кветак. Мы наракалі б на яго, каб ён прапанаваў нам горкі пачастунак, але ж мы з асалодай п'ём мёд ягонай паэзіі, з нязменным захапленнем перачытваем ягоныя вершы пра лесуноў, пра Падвея, пра Вадзяніка, пра Змяінага Цара, пра русалак; узорамі паэзіі не перастаюць быць для нас і «Максім і Магдалена», і «Страцім-лебедзь». А высакародная паэтава задума даць на роднай мове ўзоры і пентаметраў, і санета, і ронда, і трыялета, і тэрцынаў, і актавы, а шматлікія пераклады з антычных аўтараў, з нямецкіх, французскіх, славянскіх і нават фінскіх, а «Мадонны», на якіх, так цудоўна спалучаны з беларускім каларытам, ляжыць водбліск светлага агню заходняга Адраджэння!

Чаму мы тут гаворым пра ўсё гэта? Ды проста таму, што калі ўспамінаць, дык трэба пачынаць з гэтых вершаў, з гэтай паэтавай працы, якую, між іншым, ніяк ужо нельга назваць ні «ўпадніцкай», ні «дэкадэнцкай». Пачынаць трэба з гэтага, бо менавіта сімвалізм найчасцей за ўсё звяртаўся і да антычных міфаў, і наогул да народных паданняў і легендаў, бо менавіта сімвалісты часта і ахвотна звярталіся да гісторыі і гэтак жа ахвотна ўваскрашалі старадаўнія формы, уключаючы і санеты, і тэрцыны, і канцоны, і рандэлі. Але ж справа ў тым, што «сімвалізм» Багдановіча, судакрануўшыся з жывой, рэальнай глебай нашай рэчаіснасці, а таксама літаратуры,— маладой і поўнай жыцця, росту, не мог вырадзіцца, як сапраўды гэта было ў сімвалізме, ні ва ўпадніцтва, ні ў рацыяналізм, ні ў грубы алегарызм, ні ў пустое жанглёрства формай. Справа ў тым, што для нашай літаратуры, літаратуры маладой, натуральная і заканамерная была ўвага і да гісторыі свайго народа, і да фальклору, з якога ўсе нашы паэты так многа бралі, а пытанне формы было адным з самых надзённых і жыццёвых пытанняў. Гэта было пытанне будучыні літаратуры, яе жыццёвасці і далейшага развіцця.

Дык вось, выяўляецца, які «сімваліст» быў Багдановіч, вось за што цярпіць ён ад «прaніклівых» крытыкаў!

Урэшце паэзія Багдановіча не мае патрэбы ў абароне: яна вось ужо колькі дзесяцігоддзяў гаворыць сама за сябе. Высокая па думцы, гранічна выразная ў выказванні пачуцця, яна не страчвае пры гэтым ні эмацыянальнай свежасці, ні жывой чалавечай трапятлівасці. Яна сама яскравы ўзор гарманічнага спалучэння формы і зместу, таго спалучэння, якое робіць літаральна ледзь не ўсе паэтавы вершы хрэстаматыйнымі. Алгебра і гармонія, якія мы прыгадвалі ў дачыненні да Коласа, у Багдановіча настолькі з'яднаны, настолькі зрабіліся ягонай паэтычнай сутнасцю, што здаецца натуральным дапусціць, нібы не алгебрай павяралася ў яго гармонія, а гармонія павярала алгебру. Здаецца, каб можна было перакласці на мову алгебры гармонію, дык вершы Багдановіча разгарнуліся б у лагічную паслядоўнасць матэматычнай формулы. Здаецца, з кожнага верша Багдановіча можна вывесці закон «залатога сячэння» паэзіі.

Можна толькі здагадвацца, якіх намаганняў каштавала паэту ягонае выключнае майстэрства, тых намаганняў, якіх, чытаючы вершы Багдановіча, мы не адчуваем.

Майстра павінен маўчаць, калі гавораць вершы. Мастацкае ўмельства — адзін з запаветаў Багдановіча сённяшняй нашай літаратуры.

Купала, Колас і Багдановіч — гэта паэтычны трохкутнік, кожная з вяршынь якога паказвае ў будучыню і кідае праекцыю на яе. Гэта тры вымярэнні, на якіх пабудаваны свет нашай літаратуры. Гэта аснова асноў і пачатак усіх пачаткаў. Вось чаму мы заўсёды будзем вяртацца да іх, трох выдатных песняроў,— вяртацца, каб ісці наперад. Ісці наперад — гэта таксама іхні запавет новым аратаям і сейбітам роднай літаратурнай нівы.

1964

ШЫРОКАСЦЬ

1

Што такое пейзаж?

Кожны мастак адказвае на гэта па-свойму. Па-свойму адказвае на яго і Чорны, які карыстаецца пейзажам да надзвычайнасці шчодра, захоплена, нібы спаборнічае з самой прыродай.

Як бы ні вызначалі мы ролю пейзажу, несумненна давядзецца прызнаць адно: роля гэтая найчасцей дваістая. Пейзаж нясе ў сабе як канструктыўны, так і «ідэалагічны» пачатак. У першым выпадку ён выступае як мастацкі кампанент твора, у другім — як каардыната жыццёвай, філасофскай канцэпцыі аўтара.

2

Апошнім часам слушна гавораць пра блізкасць Чорнага да Дастаеўскага.

Яшчэ раней шмат гаварылі, што ў Чорнага свой, злакалізаваны ледзь не да межаў Цімкавіч і разгорнуты тым часам да універсальных адзнак усялюдскасці свет.

Усё гэта праўда, усё гэта так.

У Дастаеўскага таксама свой свет. У чым жа розніца і ў чым падабенства іх светаў?

Падабенства ў «ідэалагічнай» замкнутасці вобраза чалавека, у дапушчальнай раўназначнасці ідэі, якой надзелены кожны персанаж. Ідэі сутыкаюцца і тым часам як бы суіснуюць. Наяўнасць спрэчкі, дыялогу, дэкларацыя права кожнага персанажа на сваю праўду — характэрныя для Дастаеўскага і Чорнага.

Разыходжанні пачынаюцца там, дзе справа тычыцца выхаду ў матэрыяльны і сацыяльны свет.

Дастаеўскі ў нейкім эстэтычным парыве свядома ці несвядома пазбаўляе чалавека радасці ад сузірання з'яў «жывога жыцця»: чалавек у пэўным сэнсе апыняецца як па-за побытам, так і па-за прыродай. Паспрабуйце ўявіць, чым займаюцца героі Дастаеўскага ўвесь той час, калі не «заяўляюць сваё свавольства» і не вырашаюць сваю пакутлівую «ідэю». Зрабіць гэта будзе цяжка.

А ягоны пейзаж?

Нагрэтыя камяніцы пецярбургскіх кварталаў, ад гарачыні паветра аж трымціць, цяжка стукае чалавеку ў скроні: чалавек, здаецца, вось-вось страціць прытомнасць. Брудныя, пракураныя тракціры з абскубанай канарэйкай. Змардаваны душэўнымі пакутамі, утрапёны, глядзіць адсюль чалавек на брудную вуліцу, дзе перадвечаровы вецер мяце па бруку шорсткі пясок. Жоўтае, бяссільнае, як скон, лье на захадзе святло нізкае сонца. Чалавек выходзіць на вуліцу. Душэўная ўзрушанасць гоніць яго ў невядомасць, а на захадзе шчымліва гарыць, плавіцца, памірае барвовая палоска вечаровай зары: гэта аднекуль здалёк, з невядомасці падаюць чалавеку знак другія светы. Пра што яны кажуць? Пра недасяжнасць гармоніі на гэтай зямлі, пра недасяжнасць гармоніі наогул?..

3

«Пяць дзён свяціла сонца, дарогі ўсё пахлі вільгаццю пасля дажджоў — чорныя з жоўтымі адценнямі гліны. Іржышча было такое пустое і такое ціхае. І ад сонца здавалася шырокім усё: і глыбокае неба, і спустошаная на зіму ўраджаем зямля, і нават дробны камень пасярод палявой травы і зрэзанай саломы,— усё да туманнай сіні блізкіх лясоў, да рэчак і азёр, да дзеравяных хат і мураваных будынкаў, да ўсяго маладога і вялікага, сярод чаго так пазнаны былі вялікія бунты радасці і смутку».

Або:

«Зямля — як размах чалавечай радасці — шырокая, бяскрайняя, здольная будзіць вялікія імкненні пачуцця і думак».

Гэта, вядома, Чорны. Калі хочаце, назавіце гэта ўхвалай гармоніі.

4

Асноўная адзнака ягонай творчасці — менавіта «шырокасць», Чорны любіць выводзіць чалавека на прасторы жыцця. Мадэль чалавек — свет для яго — устойлівая ў сваёй пастаяннай рухомасці. Канкрэтызацыя гэтай мадэлі (асоба — грамадства) падрыхтавана пазнаннем сацыяльнага зместу рэчаіснасці. Інакш не магло быць: Чорнага нарадзіла рэвалюцыя.

Вось чаму і пейзаж у Чорнага па-свойму сацыяльны, канцэпцыйны. Вялікія буры «радасці і смутку» паўсюль прасякаюць яго.

Пейзаж у Чорнага, нягледзячы на яго надзвычайную выяўленчую канкрэтнасць, часта выступае як адухоўленае, валявое ўвасабленне стыхіі прыроды, і яна ўжо, гэтая стыхія, часта зноў жа як бы імітуе, адбівае стыхію сацыяльную.

«У ціхіх скаргах непрыбранага жыта чуў я вялікія буры».

Гэта сказана ў адным з ранніх апавяданняў. Але прынцып, выказаны там, застаўся вызначальным для творчай практыкі Чорнага і, у прыватнасці, для яго пейзажу.

5

У пашаноўных спісах нашай літаратуры ў Кузьмы Чорнага сваё, асаблівае месца.

Адметнасць ягоная, цяжкая для вытлумачэння, а таму і недастаткова яшчэ вытлумачаная, вабіць да сябе і падахвочвае да новых спроб вытлумачэння даследчыцкую думку, якая бачыць у той творчасці моманты бадай што прарочыя для ўсёй нашай прозы.

Эпічны свет Чорнага інакш арганізаваны, арыентаваны і інакш населены, чым, скажам, свет Коласа.

Агромністымі здаюцца выпрабаванні, на якія пасылае сваіх герояў Чорны, напружаная дарэшты ягоная аўтарская мова, водгулле і вобліскі нейкіх вялікіх, не адно сацыяльных, падзей чуюцца нам на старонках і за старонкамі ягонай прозы. Ён па-свойму касмічны, свет Чорнага. Правобраз гэтага свету — родныя яму Цімкавічы, пра якія ён казаў, што іх яму хопіць на мноства раманаў, сённяшняга чытача міжволі наводзяць на думку пра славутую фолкнераўскую Йокнапатофу — і не так важна, што Чорны сваю «вёсачку» (так называўся і адзін з фолкнераўскіх раманаў) быццам бы рассяліў, разгарнуў у раманным космасе, а Фолкнер, наадварот, сканцэнтраваў у ёй свой «космас»...

«Бач ты, куды шыбануў!» — чуецца мне нечы іранічны голас.

Але не трэба баяцца падобных супастаўленняў. Духоўны свет інтэграваны не менш, калі не больш, чым

свет сацыяльны, і ў ягоным глыбінным «космасе» сапраўды «зорка зорцы голас падае».

Вось зноў жа — успомніў пра асаблівую і нейкую асабіста прачулую любоў абодвух пісьменнікаў да вялікага Дастаеўскага.

Мабыць, памыляюцца тыя, што гавораць пра нейкую «перыферыйнасць» творчасці Чорнага.

Амаль у касмічных духоўных межах бачыць сваю тэхаскую Йокнапатофу Фолкнер.

І ў Цімкавічаў духоўнага свету Чорнага зусім іншая «геаграфія», чым у рэальна існуючай вёсцы на Случчыне.

Зварот да творчага вопыту Чорнага амаль непазбежна спараджае пытанне пра лёс і сённяшнія магчымасці самаго эпасу. Гэта няпростая тэма.

Эпас Чорнага здзейснены. І калі гэта так, дык, трэба думаць, нечаму вучыць.

У самага выяўленага з сучасных нашых эпікаў — Мележа — былі па-асабліваму любоўныя адносіны да Чорнага. І, мусіць, не толькі таму, што той некалі пабацькоўску бласлаўляў яго на пісьменніцкую сцяжыну, што пасля вывела яго на шырокую дарогу арыгінальнай творчасці.

Вопыт празаіка Чорнага, мусіць, і без таго быў дарагі і патрэбны Мележу.

Спроба самаго Мележа ў эпічным жанры здавалася рызыкоўнай і запозненай якраз ці не з прычыны ўсё той жа «перыферыйнасці», лакальнасці самаго матэрыялу («Людзі на балоце»), але ці не гэтая перыферыйнасць і выратавала справу, апраўдала ягоную спробу? Але як надоўга? На жаль, мы не ведаем адказу. Хоць бы і таму, што эпас Мележа не завершаны, хоць бы і таму, што маятнік ягонай творчай увагі схіляўся то ў бок Чорнага, то ў бок другога эпіка — Коласа. Гэты «маятнік» яшчэ не зрабіў канчатковага выбару ў нашай прозе і сёння, тым больш што пачало ўсё больш заяўляць аб сабе і новае «магнітнае поле» — эпас Максіма Гарэцкага.

Далёка не простыя пытанні спараджае спроба асэнсаваць мастацкі свет і мастацкі вопыт Чорнага.

І, значыцца, не так і мала гаворыць нам сёння гэты выдатны пісьменнік.

1970—1980

АД РОДНАЕ ЗЯМЛІ

Характар творчасці Якуба Коласа даўно і трывала вызначаны як эпічны. Толькі пісьменнік надзвычайна шырокага, дыялектычнага па сваёй сутнасці погляду на жыццё, якое бралася ў самых азначальных, галоўнейшых сваіх абрысах, мог стаць творцам «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі», эпапеі «На ростанях», што выспявала і складвалася разам з новымі формамі нацыянальнай рэчаіснасці, і алегарычных «Казак жыцця», у якіх зроблена арыгінальная і, магчыма, ужо непаўторная спроба ўзнавіць глыбінныя вытокі нацыянальнага светаўспрымання сродкамі і прыёмамі, уласцівымі інтуітыўна-народнай творчасці.

Несумненна, што выразна эпічны характар мастацкага мыслення Коласа паклаў адбітак і на ягоную лірыку, якая шмат у чым адрозніваецца, напрыклад, ад лірыкі вялікага Купалы, а часам нават супрацьстаіць ёй сваім заўсёдным падкрэсліваннем класічных, гарманічных, ураўнаважаных і суладных сувязей паміж чалавекам і светам (не ў сэнсе апраўдання той ці іншай канкрэтнай рэчаіснасці, а ў сэнсе эстэтычнага і этычнага ідэалу). І ў Купалы пастаянна стаіць перад духоўным зрокам гэты ідэал, як наогул стаіць ён перад духоўным зрокам кожнага буйнога мастака слова, але сродкі выяўлення яго, узнаўлення характару сувязей паміж чалавекам і светам, чалавекам і грамадствам, урэшце, погляд на чалавека як асобу — больш ці менш замкнуты, адасоблены духоўны свет, могуць быць да бясконцасці разнастайнымі, і чалавек тады (асоба) можа ці арганічна ўпісвацца ў агульнае цэлае, ці, наадварот, выдзяляцца з яго і супрацьстаяць яму. Тут пралягае мяжа паміж класічнай (эпічнай) і ўласна лірычнай канцэпцыяй у падыходзе да з'яў жыцця, тут азначаюцца два найбольш выразныя, найгалоўнейшыя тыпы творцы, прадстаўнікамі якіх з тымі ці іншымі абмежаваннямі можна назваць Коласа і Купалу. Узяць на сябе задачу разважыць, хто з іх лепшы,— марная і непатрэбная справа, тым больш што жыццё ніколі не можа ўкласціся цалкам у тую ці іншую сістэму яго адлюстравання.

Цяпер мы, бадай, пакінем Купалу: нас будзе ціка-

віць Колас. Заўважым яшчэ хіба, што абодва паэты, выступіўшы ў літаратуры амаль адначасова, выявілі, незалежна адзін ад аднаго, многа агульнага як у разуменні сацыяльна-грамадскіх з'яў часу, так і ў адносінах да літаратуры, у якой хацелі бачыць і бачылі перш за ўсё найлепшы сродак грамадзянскага служэння роднаму народу.

Найвялікшае наватарства Коласа не ў тым, што ў яго творах загаварыў мужык (гэта было ўжо і ў Багушэвіча, і ў іншых аўтараў), а ў тым, што мужык усвядоміў сябе сілаю, якая здольна кінуць выклік прыгнятальнікам.

Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі,—

вельмі выразна і энергічна фармулюе Колас і тут жа, у другім вершы, дапаўняе гэтую формулу праграмайзаклікам «Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!».

Паэзія Коласа-грамадзяніна надзвычай акрэсленая і не патрабуе ні асаблівых каментарыяў, ні асаблівай ухвалы. Яна гаворыць сама за сябе. Але разглядаць дарэвалюцыйную Коласаву лірыку толькі ў гэтым плане, толькі ў плане выяўлення адносін беларускага мужыка да паноў і самаўладства, будзе яўна недастатковым і не надта растлумачыць нам, чаму ўсё-такі Колас быў вялікі нацыянальны паэт, які перш за ўсё служыў свайму народу мастацкім словам. Справа ў тым, што праблема дэмакратызму, народнасці літаратуры, акрамя свайго ідэйнага, сацыяльнага зместу, мае яшчэ і эстэтычны змест, без высвятлення і выяўлення якога цалкам страчвае ўсё сваё значэнне, сваю дзейнасць і сам накірунак мастацкай творчасці. Што значыць быць народным? У час Коласа прайшла, мінулася тая пара, калі за адзнаку народнасці лічылася ўвядзенне ў твор рэалій народнага побыту, калі алеаграфічныя абразкі з народнага жыцця выдаваліся за выяўленне нацыянальнай адметнасці і нацыянальнага зместу. Этнаграфізм Дуніна-Марцінкевіча быў адкінуты ўжо Багушэвічам.

Наватарства грамадскай пазіцыі Коласа бясспрэчнае, пра яго мы гаварылі ўжо. Чарга цяпер была за канкрэтна-мастацкім выяўленнем гэтай пазіцыі, за выяўленнем эстэтычнага зместу народнасці. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што тут і для Коласа і для тага-

часнай літаратуры наогул не ўсё і не адразу было зразумела, як можа здацца на першы погляд. Узнімалася пытанне аб магчымасці ці немагчымасці існавання нацыянальнай літаратуры — на роднай мове і на матэрыяле мясцовага жыцця,— і па тым, якой будзе гэтая літаратура ў шэрагу іншых літаратур, якія духоўныя багацці яна адкрые, мелася меркаваць пра сам народ, пра здатнасць яго да духоўнай і грамадскай дзейнасці.

Узнікла праблема выяўлення ў літаратуры нацыянальнага характару. Узнікала пытанне: які ён, гэты характар? З якіх элементаў складваецца духоўнае жыццё беларуса? Якія элементы той жыццёвай стыхіі, што стварае нацыянальную адметнасць адчуванняў і думак, у якой ступені побыт, гістарычныя ўмовы, нарэшце прырода ўплывалі і ўплываюць на духоўную фізіяномію, як гаварылі тады, беларуса?

І вось што цікава: Колас не абышоў у сваім першым вершы, не мог абысці ні знешніх рэалій побыту беларуса («На дварэ — паленне, цёскі, куча сметніку ляжыць» і г. д.), ні характару роднага краявіду («Край наш бедны, край наш родны! Лес, балоты і пясок...»), ні таго, як усё гэта адбіваецца на духоўным жыцці народа, у прыватнасці, на характары ягонай песні.

А як песня панясецца —
Колькі ў песні той нуды!
Уцякаў бы, бег, здаецца,
Сам не ведаеш куды.
(«Наш родны край»)

Карціны, як бачым, надзвычай маляўнічыя, ды не сказаць, каб надта прыемныя для душы і зроку. Але не Колас вінаваты ў гэтым. Першае слова, што вырвалася з ягонай душы, было стогнам, здушаным крыкам. Сама векавая нядоля, забітасць і загнанасць выказаліся тут. І, разам з тым, ці ўсю... праўду выказаў Колас? Ці стаў бы ён нацыянальным паэтам, каб пісаў толькі так, каб выказваў адно скруху, адно боль за бязрадаснае становішча брата-беларуса, каб не бачыў, каб не ўмеў убачыць у ягоным жыцці і другое — тое, што пакідала надзею на лепшае будучае, на магчымасць іншага, больш чалавечага і больш асэнсаванага жыцця? І ці мог, нарэшце, народ, які ўмее толькі плакаць і клясці сваю долю,— ці мог такі народ спадзявацца на лепшую будучыню? А можа, не толькі панылась, скруха, роспач

жывуць у гэтым народзе? Але такая ўчэпістая, моцная ўлада бяздольнасці, панылаcці і тугі, што Колас, нібы зачараваны, зноў і зноў вяртаецца да сумных малюнкаў, якія ідуць адзін за адным: па нізкім небе плывуць хмары, вые вецер у коміне, сячэ дождж, скуголіць у хляве парсюк і г. д. і г. д. Прырода нібы ў змове супраць чалавека, жыццё яе бязрадаснае, як і жыццё чалавека.

Ой, дарога-сцежка,
Вузкая, крывая!
І ты, жыццё наша,
Ты, доля такая!

Так, гэта была праўда пра народнае жыццё, але праўда не ўся. Мастацкае чуццё, мусіць, падказвала Коласу, што сапраўдная літаратура не можа задаволіцца адлюстраваннем адных змрочных ці светлых з'яў шчаў жыцця,— сіла літаратуры ў паўнаце адлюстравання рэчаіснасці, ва ўмелым карыстанні святлом і ценем. І таму нельга абысціся ні адным стогнам ці плачам, ні аднымі аптымістычнымі лозунгамі.

Была рэвалюцыя. У сваім парыве яна высока ўзняла Коласа і паставіла ўпоравень з нацыянальнай рэчаіснасцю. Колас надзвычай інтэнсіўна рос разам з рэвалюцыяй, і нават яе паражэнне не змагло нізрынуць яго з той вышыні, на якую ён падняўся. Вядома, паэт балюча перажываў паражэнне рэвалюцыі, але ён разумеў, што нацыянальныя сілы, якімі рухала ў першую чаргу прага сацыяльнай справядлівасці, цяпер ужо нічым не стрымаць, як не стрымаць і развіццё літаратуры, яна будзе замацоўваць і ўзбагачаць той духоўны капітал, які набыў народ у часы сацыяльных бітваў. Апынуўшыся ў турме, Колас не разгубіўся; думкі ягоныя былі звернуты да народа, зрок яго стаў яшчэ больш відушчы, і душа ягоная стала ўмяшчаць яшчэ больш.

Гэй, выгнаннікі,
Сябры любыя,
Да канца, браты,
Будзем цвёрдыя,—

яшчэ нядаўна звяртаўся паэт да сяброў-аднадумцаў («Сябрам-выгнаннікам»), упэўнены ў непарушнасці саюза паміж тымі, хто так ці інакш звязаў сябе з рэвалюцыяй. Ці ведаў ён, што пройдзе колькі часу і яму давядзецца звярнуцца да многіх з тых жа сяброў з горкімі словамі папроку і ганьбавання за тое, што «ад

думак даўнейшых сваіх адракліся» («Покліч»). Як гэта, мусіць, хвалявала, кроіла болем Коласава сэрца, калі ён зноў і зноў звяртаецца думкай да нядаўніх падзей, гаворыць пра бязлітасны віхор, што затым «усё растрос, разнёс, як мятлою змёў».

Распаўзліся вы,
Пахаваліся
І ад дум сваіх
Адцураліся.
(«Дзе вы?»)

Вершы «Сябрам-выгнаннікам» і «Дзе вы?» напісаны адным памерам, але якія розныя яны, якая іронія, выспеленая часам, гучыць у гэтым, мусіць, знарочытым супадзенні!

Перад духоўным зрокам Коласа паўсталі, выкліканыя сілай фантазіі, «мілыя вобразы роднага краю». Можна толькі падзівіцца, з якой маляўнічасцю, страснасцю ўзнаўляе іх мастацкім словам паэт, можна толькі падзівіцца той шырыні погляду на з'явы нацыянальнай рэчаіснасці, якую набывае цяпер Колас. Прырода ў яго не выступае ўжо ў адным толькі сумным, адвечна панылым абліччы, яна вее на душу ўжо і супакаеннем, і ласкай, і радасцю: яна трымціць ручаём, што адбівае ў сабе і колер неба, і пышныя вярхі кустоў, і начную зорку.

То заскочыць у гай,
То курган абаўе,
Дзе сярдзіта бубніць,
Дзе лагодна пяе.
(«Ручэй»)

Сумныя малюнкі турэмнага побыту ідуць побач з ідылічнай карцінкай «Вясковыя дзеці», у якой кантрастам да цяжкай працы дарослых намаляваны бесклапотныя ўцехі дзяцінства, ужо не адны асеннія матывы пераважаюць у лірыцы паэта: восень і зіма, вясна і лета. Наднёманне і Палессе ва ўсёй разнастайнасці прыроды і побыту жывуць, гамоняць, сумуюць і смяюцца, падуладныя вышэйшай праўдзе паэтычнага бачання, вышэйшай праўдзе жыцця, якую з такой сілай можа выявіць хіба мастацтва. І над усім лунае глыбокая, поўная веры ў заўтрашні дзень паэтава думка:

Вясна, вясна
Жаданая!
Ты прыйдзеш зноў,
Ты вернешся!
(«Вясна»)

У вершах, напісаных у гэты час, Колас-мастак дасягае абсалютнай улады над словам, той улады, якая, здаецца, не патрабуе ніякага высільвання. «Гожства, сугалоссе» дасягаюцца з найменшай затратай паэтычных сродкаў — гэта тое, што Чэхаў у мастацтве называў грацыяй. Тонкая інструментоўка без ценю знарачытасці, безліч нюансаў пры зграбна акрэсленай галоўнай рысе, гранічная мера пры суадпаведнасці галоўнага і другараднага — тая мера, якою, як ніхто, валодаў Колас, бо заўсёды імкнуўся да «гожства, сугалосся», але бачыў яго не па-за жыццём, не ў наджыццёвым супакаенні ў бясконцасці, а ў гарманічным зліцці агульнага і прыватнага, матэрыяльнага і духоўнага. Адсюль надзвычайнае значэнне набывае ў Коласа перспектыва. Гэта можна паказаць на прыкладзе самых розных вершаў, як прыродаапісальных, так і выразна бытавых, як публіцыстычных, так і сатырычных. Сродкі выяўлення гэтай перспектывы будуць мяняцца, але агульнае ніколі не будзе засланяць у Коласа прыватнае, і наадварот. Прачытайце такія розныя па настрою Коласавы вершы, як «Усход сонца», «Зіма», «Першы гром», «Краска», «Дуб», «Адлёт жураўлёў», «Ручэй», «Сохну марна я ў астрозе» і інш., і вы ўбачыце, як заўсёды даражыць паэт закончанасцю і выразнасцю, як пастаянна думка ягоная снуе ўверх-уніз, акрэсліваючы цэлае.

Над палямі мрок прарваўся,
Па нізах расплыўся,
Лес туманам заснаваўся,
Луг расой абмыўся.

(«Усход сонца»)

Заўважаеце гэтыя «рэгістры», гэты тонка праведзены паралелізм, мэта якога пастаянна суадносіць дэталь і агульнае, верх і ніз, аб'ём і прастору?

А вось у вершы «Адлёт жураўлёў»:

Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.

Як бы аддаляецца гук, заміраючы ў прасторы і адначасова выяўляючы, матэрыялізуючы яе. І пры ўсім гэтым далі (шырыня) суаднесены з рэчкай, у якой мы бачым нават хвалі. І потым:

Жаласна-прыгожа
Льюцца ў небе гукі,
Слухаюць лясы іх,
Луг, балота, лукі.

Паэт як бы ўзнімае наш позірк, скіроўвае яго ў неба, і адтуль ужо, з неба, з вышыні, мы пачынаем глядзець на «луг, балота, лукі».

Некалькі скупых, выразных, але пазбаўленых усялякай эфектнасці, знарочытай маляўнічасці штрыхоў дастаткова паэту, каб стварыць запамінальны і цэльны вобраз восені. Апісанне нідзе не існуе дзеля самаго сябе, яно развіваецца, рухаецца разам з паэтавай думкай, якая неаддзельная ад прадметнай і настраёвай сутнасці з'явы. І ва ўсім гэтым, пры ўсім гэтым — закончанасць — адметныя рысы Коласавага стылю, яго эстэтычны і канструктыўны прынцып, што вынікаў з самой прыроды паэтавага светаўспрымання. Колас-мастак, трэба думаць, з асаблівай сілай таленту разгарнуўся ў гэты час, менавіта цяпер так бліскуча і пераканаўча прадэманстраваў ён асноўныя рысы свайго таленту. Нездарма на гэты час прыпадаюць задума і першыя канкрэтныя подступы да «Новай зямлі» — твора, дзе паэт з надзвычайнай наглядасцю ажыццявіў адзінства лірычнага і эпічнага прынцыпу ў адлюстраванні жыцця. Нездарма блізка ля гэтага часу з'явілася ў паэта і задума «Сымона-музыкі», твора, які разам з «Новай зямлёй» спадарожнічаў Коласу на крыжавых дарогах гісторыі роднага народа і закончаны быў, як і «Новая зямля», ужо ў савецкі час, надыход якога выдатны пясняр вітаў пранікнёнымі і прачулымі словамі:

Браты! Вялікая дарога
Чакае нас і родны край —
Жніво настала, працы многа,—
Навукі семя засявай!
(«Да працы!»)

Паводле самой прыроды свайго таленту, заўсёды маючы нахіл да выпрашэння задум, якія патрабуюць шырокага ахопу падзей, выразнай канцэпцыйнасці ў іх вытлумачэнні, нарэшце разлічанай на даволі працяглы час працы, Колас разам з тым ніколі не здраджваў вершу як самастойнай, мастацкі закончанай і ёмістай форме. Наадварот, можна нават заўважыць, што да вершаў пісьменнік з асаблівай ахвотай звяр-

таўся ў найбольш самапаглыбленыя перыяды свайго жыцця: так было падчас знаходжання ў турме, так было ў першыя паслякастрычніцкія гады, так было ў гады першай і другой сусветных войнаў. І таму натуральна, што менавіта ў вершах часта выказана самае істотнае з эстэтычнага і грамадскага крэда пісьменніка, як гэта мы бачылі ў дарэвалюцыйных творах пісьменніка, як гэта яскрава відаць з толькі што цытаванага верша «Да працы!», як гэта можна дастасаваць да верша «Водгулле», што даў назву пердшаму зборніку твораў паэта, якія выйшаў у савецкі час. На першы погляд можа здацца, што мы маем тут проста таленавітую варыяцыю на тэму пушкінскага «Рэха»: тут і там сцвярджаецца залежнасць творчасці ад уражанняў непасрэднага жывога жыцця. Як быццам нічога новага тут няма для Коласа, які тым больш ніколі, здаецца, не сумняваўся ў наяўнасці сувязей паміж мастацтвам і жыццём, але, узяўшы пад увагу час, у які быў напісаны гэты верш, тое, што Колас упершыню паўставаў тут перад новым, савецкім чытачом, пачынаеш разумець, што справа тут не проста ў больш ці менш свядомай пераклічцы з выдатным рускім паэтам,— гаворка, па сутнасці, ідзе надзвычай прынцыповая, важная для паэта,— гаворка аб эстэтычнай змястоўнасці новай савецкай рэчаіснасці.

Вершы, напісаныя Коласам у савецкі час, вылучае як разнастайнасць тэматыкі, так і разнастайнасць прыёмаў і інтанацый: побач з палымянымі вершамі-заклікамі стаіць верш-памфлет, накіраваны супраць ворагаў сацыялістычнай дзяржавы, выдатныя вершы аб хараcтве роднага краю суседнічаюць з прачулымі радкамі, што славяць «пачуццё сям'і адзінай» — дружбу народаў СССР. І ўжо зусім нельга абысці вершаў, напісаных у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мужны і шчыры паэтаў голас клікаў да помсты, падбадзёрваў і суцяшаў: усю сілу свайго таленту ўклаў паэт у гэтыя творы, і талент не здрадзіў яму. Нельга без глыбокага хвалявання чытаць сёння вершы «Голас зямлі», «Лес», «На захадзе сонца», «Жураўліны вырай».

«Жураўліны вырай»... Пішучы яго, як бы даўні, дарэвалюцыйны свой верш, прыгадваў паэт той настрой сцішанасці і лагоднай журбы, які навеяў яму адлёт жураўлёў. І вось зноў журавы. І зноў як бы з

неба, з вышыні глядзіць паэт разам з птахамі на зямлю. Але які жудасны малюнак бачыць цяпер ён!

Звісае над імі бяздонны абшар,
Дзе свецяцца вечныя зоры,
Пад імі гуляе, бушуе пажар
І цемра свідруе прасторы.

. . . .

І далей на поўдзень ляцяць жураўлі,
Над імі калышуцца зоры,
Пад імі — пажары, пакуты зямлі
І гора, вялікае гора.

Народнае гора... Яго заўжды балюча і блізка да сэрца прымаў Колас: і таму, што ён быў шчыры сын свайго народа, і таму, што ён быў яшчэ і паэт.

...Тыя, хто меў гонар і шчасце ведаць яго ў апошнія гады жыцця — спрацаванага старога чалавека, па-сялянску каржакаватага і спаважнага, з ценем задуменнасці на твары ў хвіліну развагі і з хітравата стоенай усмешкай падчас нешматслоўнай гутаркі, расказваюць, што пры доме, у якім ён жыў, у гародчыку пасеяны быў у яго лапік жыта. Ён любіў зямлю дбайнай любоўю селяніна, той любоўю, у якой разумнага разліку столькі ж, колькі і паэзіі. Калі доўга не выдараўся дождж, ён пахмурнеў, рабіўся маўклівы і, раз-пораз выходзячы на балкон, пазіраў на неба. Сэрца ягонае тачыў клопат, ён адчуваў сябе як бы даверaным сасмяглых ад гарачыні ніў, даверaным будучага ўраджаю. І як яму хацелася,

Каб дожджык застукаў сялянству на ўцеху,
Каб вырасла жыта, гарох, ярына;
Каб гумны заклалі пад самую стрэху
І каб распірала сусек ад зярна.

Мудрым, са спагадным і шчодрым сэрцам, вялікім грамадзянінам і выдатным паэтам, што ўзяў свае песні «ад роднае зямлі, ад гоману бароў», — такім мы бачым яго. Такім ён жыве ў сваіх неўміручых творах. Такім ён жыве ў нашых сэрцах.

1966

ЧАЛАВЕК З МАЛОЙ БАГАЦЬКАЎКІ

Хацеў напісаць: «Люблю Максіма Гарэцкага» — і тут жа амаль неўсвядомлена адчуў, што нешта руліць мне ў такой, урэшце, звычайнай фармуліроўцы. У чым жа справа? Пасля, падумаўшы, разважылася, што віною тут няйначай як чытацкая нязвыкласць гэтага імя, няхай нават не для мяне ў дадзеным выпадку, але ўсё ж нязвыкласць. Сказаць, што любіш Купалу, Багдановіча, Чорнага,— гэта і зразумела і звыкла нават да таго, што падалося б дзіўным, каб хто раптам запытаў: «А за што?» Ха!.. А за што любім мы ўзыход сонца, вясновы цёплы дождж, даўнягa сябра ці думку, што некалі прыйшла да нас, выспела ў хвіліну шчаслівай развагі.

З Максімам Гарэцкім не так.

Бо вось жа бывае: прачнешся, душа поўніцца нечым радасным і святочным, і толькі потым прыйдзе здагадка пра сон, і толькі потым зацікаўлена, заміраючы ад хвалявання, пазнаеш і разгадваеш яго. І святло, і водар непаўторнай прозы Гарэцкага мроіліся нам паміж старонак Коласа і Чорнага. У вершы Купалы і Багдановіча яна павінна была быць, як была, жыла, неўсвядомлена і наперад разлічаная, наша любоў да яе,— і вось сёння яна ёсць, проза Максіма Гарэцкага, і разам з яе бытаваннем цяпер ужо ўсвядомлена, увачавідкі пачынаюць жыць і чытацкая любоў, і цікавасць да яе, і імя Гарэцкага спакваля, але пэўна становіцца побач з імёнамі яго выдатных старэйшых і маладзейшых сучаснікаў і заяўляе свае права на класічную рубрыку.

Люблю ў Гарэцкага «Сібірскія абразкі».

Каб сказаць, што за нязвычнасць матэрыялу, дык не, не толькі. За арыгінальнасць формы? І за гэта, вядома, але зноў жа — не толькі. Форма тая стала ўжо звыклай і траха́ не моднай сёння, калі шырока ва ўжытак увайшло эсэ і ўсё, што звязана з ім. За майстэрства мовы і непрыдуманасць інтанацыі, за пульсаванне фразы, непадобнае і натуральнае, як дыханне? Але. І ўсё ж больш проста і зразумела будзе сказаць: за яго самога. За асобу аўтара з усёю яе душэўнаю шчодрасцю, за ясны розум і нехапатлівую,

цвярозую любоў да чалавека і па-харошаму эмпірычную, дзейсную змястоўнасць духоўнага вопыту. Карацей кажучы, надзвычай прывабнае ўсюды ў гэтых абразках аўтарскае «я» — не ўмоўна-літаратурнае, хадульнае, як гэта часам бывае, калі так і відно, як нейкае несамавітае стварэнне імкнецца напяцца да памераў вала, а жывое, уроўненае ўсім чалавечым з людзьмі «я», хіба толькі вось узяло яно трохі болей, чым іншыя, ад яго вялікасці жыцця ды вынайшла ў сабе пры гэтым умельства чутае ды ўбачанае, перажытае з людзьмі ды за людзей, зразумець і, дарэмна не мудруючы, пераказаць.

Па першапачатковай сваёй прафесіі Гарэцкі быў каморнікам.

Паспрабуйце, напрыклад, уявіць сабе Прышвіна без яго агранамічнай і паляўнічай біяграфіі, і адразу ўбачыце, што такое немагчыма, адразу стане зразумелым, што гэтак мы пазбавімся і ягонай творчасці. Формула «Мастацтва як паводзіны» арганічная для Прышвіна. Так вызначыць свае адносіны да жыцця і мастацтва мог бы і Гарэцкі: і ў яго ўсюды праз аўтарскае «я» выразна бачыцца даведзеная да высокай ступені дасканаласці культура ўзаемаадносін з людзьмі, уменне слухаць і пытаць, браць удзел у чалавечай радасці і бядзе — і ўсё гэта з нейкай педагагічнай прыкідкай да субяседніка і да сябе.

У Сібір Гарэцкі ехаў, здаецца, у дваццаць шостым годзе: яго, як і грамадскасць рэспублікі тады наогул, цікавіў тымчасовы лёс беларусаў-перасяленцаў. Дарога была знаёмая: пасля ранення ў першую сусветную вайну нейкі час давялося служыць у Іркуцку. Сібір — мясціны, так сказаць, дастаткова аддаленыя, пасяленцы і перасяленцы, тубыльцы і ўсялякі рознапляменны люд, закінуты сюды самахоць ці воляй віратлівага лёсу. Жылі на заімках ці валацужнічалі, аралі, карчавалі тайгу, угрызаліся ў зямныя нетры. Ехалі цягніком, плылі на параходах ці дашчаніках, душыліся з калёсамі і коньмі на паромах. Людское мора, раскалыханае, раз'ятранае нядаўняй вайной і галадухай, паволі ўваходзіла ў берагі, пачынала дыхаць новаю хваляй — прагай мірнага пераўтварэння. І сведкай усяго гэтага быў Максім Гарэцкі. І сведкай усяго гэтага ў тым жа годзе быў яшчэ адзін чалавек.

Блізка каля таго часу, калі абдумваў я гэтыя на-

таткі, трапілася мне ў рукі (такая харошая выпадковасць!) кніжка з публікацыяй дзённікавых нарысаў легендарнага Мікалая Рэрыха, і вось што там, раптоўна ўзрадаваўшыся, нібы нечаканай знаходцы, у запісе пад назвай «Народ» прачытаў: «З мнагалюбствам народным давялося мне сустракацца праз усё сваё жыццё... Апошні раз судакрануліся мы з рускім народам у час экспедыцыі 1926 года, калі ехалі праз Козевунь, праз Пакроўскае да Тапалёвага Мысу, а адтуль плылі па Іртышы і далей да Омска. І ў Пакроўскім, а затым на параходзе да нас прыходзілі розныя спадарожнікі. Вялікай была іх прага ведаў. Іншым разам ледзь не да самага світання моладзь, матросы, народныя настаўнікі сядзелі ў нашых каютах і гутарылі і хацелі ведаць пра ўсё, што ў свеце дзеецца. Такая прага ведаў заўсёды бывае лепшай прыкметай жывых задаткаў народа... У сталовую парахода ўваходзіць хлопчык год дзесяці. «А не насварацца, калі я ўвайшоўшы?» — «Навошта насварацца, сядай, чайку вып'ем». Выяўляецца, едуць на новыя мясціны, і гарыць сэрца па новаму жыццю, па лепшай будучыні. Ведаць, ведаць, ведаць!»

І вось так мастак і падарожнік Мікалай Рэрых памог мне сфармуляваць і чалавеказнаўчы змест і пафас «Сібірскіх абразкоў» Гарэцкага.

А хлопчык... А хлопчык ці не таго ж узросту і лёсу ёсць і ў адным з абразкоў Гарэцкага — пад назвай «Маленькі рызыкант». Убачыў яго пісьменнік недзе на прыстані, у натоўпе «мяшчанскае і сялянскае людскасці». «Ён пяяў, што быў змалку свавольны, што бацька яго, прыйшоўшы з нямецкай вайны, памёр, што маці хацела зрабіць сына чалавекам і аддала яго ў батракі роднаму дзядзьку, але ён нічога не слухаў і ішоў па сваёй волі, збег у горад і зрабіўся беспрытульным...»

І тут жа, як і ў Рэрыха, думка пра невычэрпную таленавітасць народа, пра неўтаймоўную, нягледзячы ні на што, прагу творчасці: «Я прыгледзеўся бліжэй, і мяне яшчэ болей здзівілі яго вочы на худым і бледным, моцна папсаваным воспаю твары. У вачах у яго было праўдзівае творчае захапленне і думка — далёкая ад гэтага месца, засмучоная цяпер, думка прыроднага мысленніка».

І яшчэ ў тым абразку можна знайсці фразу, якую

мог напісаць толькі чалавек, у душы якога жыла цнатліва-стрыманая, высокага гарту любоў да «людскасці». Гарэцкі напісаў так: «Пасля вайны і рэвалюцыі ў мяне вельмі лёгка накручваюцца слёзы і падпірае комам дыханне». Паспрабуйце сказаць прасцей і лепш!

Там жа, у тых «Сібірскіх абразках» — «Максімава зязюля».

«Вось выходжу я на большы прагал, зелянейшы ад бяроз на яго ўскрайках,— дзесьці далёка і нейк асабліва сумна закукавала сібірская зязюля.

— Ку-ку! Ку-ку!

І мне ўспомніліся яго сумныя вершы:

— Не кувай ты, шэрая зязюля!..

Ці прылятае яна, шэрая, там, у Крыме, пакукаваць яму?

І дзе будзе маё апошняе прытулішча?

Можа, тут, у Сібіры,— як і яму, на далёкай чужыне?

І колькі, колькі нас, хадакоў і перасяленцаў, слухалі тут гэтае сумнае кукаванне, прыгадваючы сабе бары мілае далёкае бацькаўшчыны?»

Які здаровы, чысты голас смутку — ад рахманапростай, як «ку-ку», расчуленасці да высокай, дарослай журбы. «І дзе будзе маё апошняе прытулішча?» О, гэты лёс «хадакоў і перасяленцаў», міжвольных шукальнікаў свайго праз чужое, пахаваных далёка ад бароў мілае бацькаўшчыны, пра што гаворыць ён нам, як не пра тое, што «беларусу і ў Парыжы сняцца белізна бяроз і сосен медзь» (П. Панчанка). І, вядома, не абмежаванасць гэта, не правінцыяльная беднасць пачуцця, а нешта большае, што дае права і хадзіць у госці, і запрашаць у адведкі да сябе, бо даўно ж і далёка чутна адметная наша рыса з разуменнем ды павагай ставіцца да завядзёнкі ў суседскім двары.

Вось чаму, акрамя ўсяго, і кукуе сёння яна, Багдановічава зязюля, даўгалецце ім, абодвум Максімам.

І яшчэ з «Сібірскіх абразкоў» — «Пад'езд (Раман у дарозе)».

Што такое сюжэт, фабула, інтрыга? Літаратуразнаўцы пэўным чынам адрозніваюць іх, параўноўваюць і размяжоўваюць, лакалізуюць і пашыраюць паняцці, даводзячы так званы навуковы грунт, хоць,

папраўдзе, справа ад гэтага найчасцей заблытваецца, і нам у чытацкім ужытку куды прасцей адрозніваць непроста сюжэт цікавы ад нецікавага, займальны ад незаймальнага. Але зноў жа: што такое цікавы і нецікавы сюжэт? У чалавека гора, ён загаворвае пра яго з людзьмі, якіх столькі даводзіцца перабачыць за дзень (ён рамізнік), але ніхто не слухае яго, і ноччу ўжо, астаўшыся адзін з канём, ён перад гэтым маўклівым слухачом аблягчае душу. Што тут займальнага, што цікавага? А гэта ж чэхаўская «Туга». За лесам у полі гудзе і ракоча трактар, гэты рокат чуе жанчына, у душы якой абуджаюцца з гэтае нагоды ўспаміны і расце надзея на шчасце, на блізкасць з даўно любімым чалавекам. Гэта — брылёўская «Галя».

Вядома, ёсць сюжэты, якія не перакажаш вось так, літаральна адной фразай, іх развязкі чакаеш, як латарэйнага выйгрышу, і чытацкая ўвага заведзена імі, як гадзіннік, што адбівае дванаццаць удараў роўна апоўначы. Яму здзіўляешся, такому сюжэту,— гэтаму дакладнаму хранаметражу пісьменніцкай выдумкі і нашага чытацкага самападману разам з тым, але найчасцей здзіўляешся — і толькі. І вынік падобны на стрэл з дзіцячага пісталета — і гучна, і трохі страхавіта, і, галоўнае, без крыві.

Толькі вось што можна лічыць бадай што бясспрэчным: просты, «нецікавы» сюжэт, як правіла, не па сіле літаратару пасрэднаму, такі сюжэт як лакмусавая паперка, з дапамогай якой непазбежна выяўляцца і ўнутраны фальш, і заганы густу, і неарыгінальнасць мастацкай думкі. Гэта амаль непазбежна.

Дык вось: «Пад'езд», з усмешлівай падназвай «Раман у дарозе», Гарэцкага хочацца цытаваць: так зграбна, ненаўмысна і ашчадна проста вядзе ён апавяданне. Мы, цяперашнія літаратары, ці не праз нашы універсітэцкія ды інстытуцкія дыпломы, памалу развучваемся гаварыць ладам і складам роднай мовы і ўсё мерымся абкругляць ды абгаблёўваць яе і ў самым галоўным, пераважна ў сінтаксісе,— і выходзіць часам і кругла, і даволі складна, і гладка, але не дыхае фраза тымі ўтульнасцю і цяплом, як дыхае акрайчык хлеба, узяты на полудзень з сабою ў лес і прыхаваны ад марозу запазухі. І слоўца каларытнае, мясцовае ёсць, і пісьменна быццам, а жывога духу мовы няма і няма тым часам. А вось фраза, якая пры ўсёй сваёй

вонкавай шурпатасці выдае і непрымушанай, і дакладнай, і жывой: «Я нават не пачуў, калі так блізка наехала адразу фурманка». Не дагнала, не нагнала, не пад'ехала, а менавіта «наехала», бо перад гэтым чалавек доўга ішоў на адзіноце з «яланямі — гладкім роўным полем з высокаю густою травою, паміж якой тамсям відаць былі засевы жыта, ярушкі і аўса». Бо ўслед за першай фразай, адзіна неабходная, ідзе другая: «Азірнуўся, неспадзявана ўбачыў, што яна пад'язджае, і ўсцешыўся, што пад'еду». Так проста пачынаецца гэтае невялічкае апавяданне, гэтак жа проста яно і канчаецца. За фурмана на той падводзе была жанчына, герой наш колькі вёрст пад'язджае з ёю, пасля яны развітваюцца — вось, бадай, і ўсё. І, аднак жа, не ўсё. Цягам тых колькі вёрст і колькі хвілін за выпадковай, дарожнай гаворкай адкрываецца нам такая шчымлівая праўда чалавечага сэрца, такая па-харошаму мужная навука жыцця, веры і трывання, што старонкі, на якіх дзіўным чынам памесцілася ўсё гэта, пачынаюць як бы расплывацца на нашых вачах, і стыхія жыцця цалкам паглынае стыхію слова.

А між тым нешта не надта гжэчнае, не надта прыстойнае, на першы погляд, адбываецца на дзвюх-трох старонках гэтага мікраапавядання: жанчына першаму стрэчнаму прапануе сябе замуж! Які жах! Якое поле дзейнасці для маралістa!

Але ж чакайце... «Была яна яшчэ маладая і вельмі здаровая, і, відаць, смелая, і простага характару. Зараз, гэтаксама проста і вясёла, пачала са мною гаманіць». Ён пахваліў яе каня, і яна, нейкім спосабам пазнаўшы, што спадарожнік нетутэйшы, пачала казаць пра сваіх сібірскіх коней, што «бягуць 40—60—100 вёрст не еўшы, толькі пастаяўшы». «І ядуць мала. І дужа ласкавыя — як цяляты. Морду ў акно — і просяць у дзяцей хлеба». Хораша, канечне, усё гэта, гэты практыцызм і сама паэзія, што так добра суіснуюць у расказе жанчыны. І калі спадарожнік задумваецца над чутым, «яна раптам тарганула мяне рукою за плячо, павярнула да мяне твар і блізка-блізка паглядзела мне ў вочы сваімі вялікімі і плоцкімі здаровымі вачыма і крыкнула:

— Чо, паря, невясёла думаеш? І не слухаеш, што цібе баю... Ха-ха! — і засмяялася звонка ў грукаценні колаў і тупанні конскіх ног».

А дзеці ў яе, выяўляецца, ёсць, і муж быў, ды прапаў недзе падчас вайны, а едзе яна «з розглядаў, з пасёлка вёрст за сорак, дзе ёй параілі добрага прымака». Прымак ёй не спадабаўся. Чаму?

«— ...А таму, што ад блізкіх, з свайго пасёлка, цяжэй, калі што, адчапіцца... Не ведаеш? — і зноў засмяялася, грубавата, але проста і вясёла».

І зноў жа адзначце сабе гэты разумны практыцызм, што не дазваляе проста так пакрыўдзіць чалавека. Адзначце этычны бок практыцызму.

Цяпер мы падыходзім да самога «сватання». Без цытаты тут тым болей не абысціся.

«— Слухай-кось... кідай ты свае настаўніцтва і йдзі да мяне ў прымы.

— Што?!

— Анічога... Ідзі, і будзем жыць! — і цяпер паглядзела блізка і ясна. У яе вялікіх шэрых вачах, шырокіх ад гэтай блізкасці і яснаты, было поўна жаночага жадання, але асцярожнага і прыхаванага, з дапытлівым чаканнем на адказ. З-пад хусткі ў яе цяпер па-дзявочы выбілася жменя русявых валасоў.

І нясмела, трошачку лішнюю хвілінку пачакаўшы, з трошачку лішняю наўмыснаю развязанасцю, яна жартаўліва падштурхнула мяне плячом у плячо і яшчэ раз спыталася, ціха, цішэйшым жартам: — Ну?»

Вось што такое дакладнасць псіхалагічнага тону, бездакорнасць маральнага чуцця, выказанага словам лёгкім, як штрых карандашом,— усе гэтыя як бы мімаходзь пастаўленыя «плячом у плячо», «ціха, цішэйшым жартам» і г. д. Аж не верыцца, што гэта было напісана ледзь не паўстагоддзя назад, у самы росквіт «маладнякоўшчыны» чалавекам, які друкаваўся ўжо тады, калі выпусціў свой першы зборнік Максім Багдановіч,— настолькі лёгка сягае праз літаратурна-гістарычную дыстанцыю яна, гэтая проза, і пацвярджаючы сённяшнія нашы пошукі і задзірыста падбіваючы на новыя. Вось чаму я трошкі раней сказаў, што яшчэ неадкрытая, проза Гарэцкага жыла з намі і ў нас...

«— Ах, дурная ж я! — засмяялася яна, адвярнуўшыся.— Я ж нават і не спыталася, можа, ты жанаты?»

Ад аўтара далей ідзе: «У мяне шавяльнулася думка зманіць ёй, ды нешта паважнае ў маім пачуцці да

яе спыніла мой язык ад няпраўды. І я сказаў ёй усё, як было ў мяне». І вось як па-чалавечы хораша, не тоячыся, але і не паступаючыся годнасцю, рэагавала на гэта яна:

«— Значыць, ашукалася я! А то еду, бачу — ідзеш ты, і думаю сабе: во, можа, мой суджаны ідзе... Ашукалася!

Я маўчаў, разглядаючы яе збоку. Ёй ад майго погляду зрабілася нязручна. І яна зноў сказала:

— Дурны ж і ты! Хоць бы зманіў мне, пажартаваў са мною...» Яны развіталіся, і «яна пагнала каня дарогаю да свайго пасёлка». А мы ідзём разам з аўтарам далей, тымі самымі яланямі, але ўзбагачаныя ўжо новым слыхам і зрокам, якія дае нам мастацтва, і перакладаем ужо на мову сэрца тое, як «высока-высока ў небе крычала каня: «Піць! пі-і-іц-ь!»

Што ні кажыце, харошы празаік Максім Гарэцкі!

Калі з такою зайздроснаю творчай аддачай, як у «Сібірскіх абразках», выяўляе сябе Гарэцкі на адносна новым для яго, далёкім ад беларускай рэчаіснасці матэрыяле, дык заканамерна думаць, што на роднай яму глебе ён дамагаўся поспехаў і яшчэ больш значных, і перакакальных. Шчыра кажучы, гэта і так, і трохі не так. Своеасаблівасць не столькі пазіцыі, колькі становішча Гарэцкага ў нашай літаратуры (істотнае значэнне меў тут і асабісты лёс) абумовіла як кірунак ягоных пошукаў, які часта быў у свядомым паглыбленні, развіцці, дыферэнцыяцыі адкрытага ўжо да яго, напрыклад, Коласам, так і заўсёднае імкненне разам з тым да глабальнага даследавання рэчаіснасці, вызначэння яе сацыяльна-гістарычных тэндэнцый, зразуметых праз культуру, праз комплекс нацыянальных адчуванняў — і ўсё гэта праз самае шырокае выкарыстанне дакумента, які павінен быў падключацца да мастацтва, рабіцца мастацтвам, не трацячы тым часам і сваёй канкрэтна-гістарычнай рэальнасці. Сказанае лёгка зразумець, калі хаця б прыгадаць Гарэцкага як аўтара запісак «На імперыялістычнай вайне» і рамана-хронікі «Віленскія камунары». Але прынцып гэты несумненна прачуты Гарэцкім скрозь — і ў аповесцях, і ў апавяданнях, якія ўсюды выразна арганізаваны як цыклы, як дакументальна-мастацкае дасле-

даванне тых ці іншых пластоў жыцця, якое непазбежна выступае ў аўтара з адзнакай гістарызму.

Несумненна, што гонар аднаго з пачынальнікаў новай беларускай прозы Гарэцкі па праву павінен падзяляць разам з Коласам. Маладзейшы яго сучаснік, ён, падкрэслім зноў, не мог не ўлічваць творчага вопыту свайго ўжо славутага тады папярэдніка, не мог, адштурхоўваючыся ад гэтага вопыту, не памкнуцца вызначыць і меру сваіх творчых магчымасцей, і магчымыя, калі можна так сказаць, цэнтры выяўлення і рэалізацыі іх. Пачаўшы з экспрэсіўных замалёвак, блізкіх да абразкоў пачаткоўца Бядулі, ён, не паступіўшыся экспрэсіўнасцю, якая ўсё больш набывала адзнакі старога лірызму, узбагачаючы мастацкую думку філасофскім спасціжэннем жыцця, трывала замацоўваецца на тым, што мы ўмоўна назвалі дакументам.

Гарэцкі прыроджаны апавядальнік. Кажучы так, я маю на ўвазе не само апавяданне як жанр, а менавіта манеру расказваць, весці апавяданне. Гэта нават рэдкае і труднае ўмельства. Дастаткова прыгадаць, што ў рускай літаратуры багатай на апавядальную традыцыю, мы назавём з такой нагоды не так і багата імёнаў, але затое творчасць Аксакава, Ляскова і Пршвіна найлепшым чынам пацвердзіць тое, што мы маем на ўвазе, кажучы пра ўмельства апавядання. Па-першае, апавядальнік павінен быць несумненна значнай чалавечай асобай, па-другое, нават талент лёгка можа тут абясцэніцца адсутнасцю рознабаковага жыццёвага вопыту, прыроджанай любві да бывальшчыны, да здарэння, якое выступае акумулятарам камічных і трагічных рысаў жыцця, урэшце, без паэтычнага адчування побыту, чалавечай прафесіі, моўнага жаргону і г. д. Усімі гэтымі якасцямі ў значнай ступені і валодаў Гарэцкі. Было б цікава скласці нешта накшталт гістарычнай, сацыяльнай, геаграфічнай, прафесійнай карты ягоных твораў, яна была б не толькі статыстычна пачувальнай, але дазволіла б нам зазірнуць і ў прыроду прозы пісьменніка, вызначыць тып яго мастацкіх абагульненняў, паказала б на адметнасць рэалізму Гарэцкага побач з рэалізмам хаця б таго ж Коласа. Мы ўбачылі б, як па-рознаму разумеецца так званая мастацкая тыповасць гэтымі пісьменнікамі, як, скажам, этнаграфізм у Коласа ін-

шы раз застаецца толькі этнаграфізмам, у той час калі ў Гарэцкага ён часта выступае як заходны пункт, як усвядомлены прыём, як сродак выяўлення мастацкай думкі і стварэння мастацкай атмасферы.

Наогул «этнаграфізм», дакументалізм саслужыў добрую службу Гарэцкаму не толькі як уласна мастаку, яго вопыт трэба пашырыць у дадзеным выпадку да значэння для ўсёй нашай культуры, памятаючы пра час, пра ўмовы, калі тварылі і Купала і Колас, і Гарэцкі. Бо з дапамогаю слова ўпершыню важка заявіў пра сваю адметнасць наш народ, бо з пашырэннем сферы мастацкага даследавання жыцця, што заўсёды было важна, і асабліва ў першапачатковы перыяд станаўлення літаратуры, выпрабоўваліся і пашыраліся магчымасці і такога найгалоўнейшага інструмента гэтага даследавання, як мова, бо ішло ўсталяванне яе літаратурных нормаў,— і тут таксама Гарэцкаму належыць далёка не апошняя роля, не цалкам яшчэ зразуметая намі нават сёння.

Агульнавядома, што літаратурная наша мова ў асноўным складвалася на базе цэнтральных гаворак; былі на тое свае прычыны, як і на тое, што ўсходнія гаворкі пэўным чынам былі абмінуты літаратурнай практыкай, калі не лічыць таго даволі яскравага факта, што Багдановіч у значнай ступені абапіраўся на лексіку, улічаную слоўнікам Насовіча, складзеным на базе менавіта ўсходнебеларускага моўнага запасу. Праз творчасць Гарэцкага шырока, у творчым пераўтварэнні сталі даступнымі літаратуры багацці народнай мовы Магілёўшчыны, і каб Гарэцкі зрабіў толькі гэта, то заслужыў бы права на нашу ўдзячнасць яму. Але зрабіў ён болей. Ён ведаў Беларусь не толькі ўсходнюю, але і цэнтральную і заходнюю; талент мастака, падмацаваны заўсёднай лінгвістычнай захопленасцю, памаглі яму стварыць той моўны сінтэз, выпрацаваць той адметны сінтаксічны малюнак, што так добра перадае як індывідуальную манеру аўтара, так і лад, і дух нашай мовы наогул. Не кажучы тым часам пра слоўнік Гарэцкага, [redacted] якім наўрад ці можа хто [redacted] пісьменнікаў спаборнічаць амаль па сённяшні дзень.

Не думаю, каб я сказаў тут пра Гарэцкага занадта гучна.

Кожнаму пісьменніку натуральна і звыкла думаць,

што галоўная кніга ягоная яшчэ наперадзе: як бы шчодра ні выяўляў ён сябе ў творчасці, падсвядома зберагаюцца, запасяцца на потым, на тую галоўную кнігу, самыя задушэўныя адчуванні і думкі. Канечне, залішняя ашчаднасць, залішні разлік тут могуць быць і згубнымі, і можна ўсё жыццё пражыць, трасучыся над схаваным ад людскіх вачэй скарбам, але ўсё ж цнатліва-засяроджаная думка пра галоўную кнігу і падтрымлівае, і жывіць нашага брата-літаратара.

Можна здагадвацца, што самай важнай кнігай для Гарэцкага павінна была быць «Камароўская хроніка», завяршыць якую, на жаль, ён не паспеў. Там быў матэрыял, назапашаны з дзіцячых і юнацкіх гадоў, прасветлены сталым роздумам, зразуметы ў гістарычнай перспектыве і рэтраспекцыі, ва ўсеўзбраенні немалога пісьменніцкага вопыту. Хроніка, летапіс? А можа, нават сага, адзначаная скрупулёзнасцю хронікі і мудрым, урачыста-наіўным ладам высокага летапісу. Вось літаратуразнаўца Д. Бугаёў, адзін з першых даследчыкаў творчасці Гарэцкага, звязвае апавядальны лад «Хронікі» менавіта са славутым «Баркалабаўскім летапісам» — і гэта, мусіць, справядліва. Прыдаўся б аўтару, вядома, і вопыт папярэдняй хронікі «Віленскіх камунараў», дзе ўдала здзейснена спроба прасачыць лёс сучасніка беларуса на самым складаным адрэзку нацыянальнага жыцця, разварушанага сусветнага значэння трагедыямі і рухамі, дзе ўладна гучыць тэма пошукаў радзімы, нацыянальнага самапазнання праз далучэнне да сацыяльна-класавага вопыту часу. Гарэцкі быў першы, хто надаў гэтай тэме спецыфічна нацыянальнае гучанне, што сведчыць пра вастрыню і канкрэтнасць ягонага гістарычнага мастацкага мыслення. Традыцыя Гарэцкага не можа не быць плённай і на сённяшні дзень, і, скажам, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля — яскравае сведчанне гэтаму.

Каб была завершана «Камароўская хроніка», несумненна, мы мелі б твор, які прымусіў бы нас па-новаму паглядзець на шмат якія з'явы сучаснай Гарэцкаму і сённяшняй прозы. Усё гэта, вядома, толькі прадвызначэнні, адштурхоўвацца мы павінны ўсё ж ад «Віленскіх камунараў».

Вось жа жыве, доўжыцца ў нацыянальнай свядомасці і часе гэтая немудрагелістая, нават праставатая хроніка, гаротная адысея непаўторнага Мацея Мышкі,

такога жывога да асязальнасці беларуса, жыве манускрыпт, напісаны то пяром, то алоўкам у выключна цяжкіх для творчасці ўмовах, калі пісьменніку-гісторыку архівы ды бібліятэкі навуковых ці навукападобных кніг замяняла адно каласальная мастакоўская памяць ды незвычайна абвостранае пачуццё гістарызму. І невядома, ці прайграў, ці выйграў тут Гарэцкі. Адно зразумела: нам, чытачам, архіўна-гістарычны антыкварыят наўрад ці скажа столькі, колькі гавораць сёння «Віленскія камунары». Вось прыклад кнігі пасапраўднаму сацыяльна дакладнай, рэвалюцыйна-пафаснай, да здзіўлення проста зробленай на матэрыяле то бытавым, то любоўным, на дакуменце то адозвы, то газеты, на фактах сямейнага летапісу, на ледзь не анекдатычнай прыгодзе, а наогул на калабруньёнаўскім адчуванні будзённага дня як дня гістарычна непаўторнага, сацыяльна і грамадска дзейснага, гістарычна аптымістычнага. Вось прыклад смелага, невучнёўскага абыходжання з жанрам, які жыве не толькі на ўзроўні падзеі ці героя, але і як бы з аглядкай, з пасміханнем на літаратурную традыцыю, на сюжэт то авантурны, то куртуазны (памятаеце душачку Юзю?), на ідылічную сямейную хроніку з добрымі «бацюшкамі» і «матушкамі», а наогул жа вы адчуваеце, што аўтару ў мастацкай свабодзе ягонай карціць пагарэзіць дзе-нідзе то з маскай якога-небудзь Тома Джонса-знайдыша, то беднага Бапрэ, які, як вядома, у айчызне сваёй быў цырульнікам, пасля ў Прусіі салдатам і г. д. А эпіграфы да літаральна ледзь не кожнага малога раздзельчыка! Чаго тут толькі няма! Ад Гарацыя да партыйнага дакумента, ад Купалы, Коласа ці Багдановіча да нейкага аднаму богу вядомага доктара Рубінштэйна з ягоным (такі непадробны дарэвалюцыйны местачкоўска-беларускі каларыт!): «Ат, шышкі выразаць, чапурышкі выразаць... Патрымайце задніцу ў гарачай вадзе, і нічога не трэба выразаць...»

І жыве, і трапечацца, і сумуе, і смяецца, і задумваецца, і пратэстуе, і цягнецца да зброі разам з героем Мышкам жыццёва паўнакроўная народная стыхія, і мы ахвотна пасля гэтага даруем аўтару і эскізнасць некаторых старонак, і несуразмернасць там-сям прыватнага і галоўнага, і замаруджанасць у некаторых выпадках самога апавядання. Кніга, як кажуць, адбылася, дарэвалюцыйная ява падала руку яве сённяшняй,

дарэвалюцыйны пісьменнік, які пачынаў пісаць пад псеўданімам «Максім Беларус», маладзейшы паплечнік выдатных нашых паэтаў, заканамерна падаў руку савецкаму беларускаму празаіку Максіму Гарэцкаму.

Разгаварыліся неяк з сябрам аб прозе Гарэцкага, доўга шукалі яму сціслае, пачуццёва-канкрэтнае азначэнне, пакуль, перабраўшы і тое, і гэтае, не спыніліся на адным: празаік строгі. Мне ён і сапраўды ўяўляецца такім.

Пачнём з фразы. Проза Гарэцкага не ведае шырокай, разгалінаванай фразы са складанай сістэмай кіравання, падпарадкавання, сузалежнасці. Само па сабе гэта не можа быць ні недахопам, ні вартасцю. Эканомнасць фразы — вось найпершы паказчык яе эстэтычнай прыдатнасці, і тут заключана ўсё: ступень змястоўнай і эмацыянальнай інфармацыі, насычанасць музычнай аркестроўкі і г. д.

Фраза Гарэцкага эканомная, бо перадае найперш рух, яна дзеяслоўная, калі можна так сказаць. Нават знешнія прыкметы, часта ўстойлівыя, умоўна кажучы, прыметнікавыя, яна трансфармуе ўскосна, праз той жа рух ці жэст. «У старога чалавека была ў руках скрыпка, а малады размашысты хлапец уздзеў на плячо на рамені вялікі венскі гармонік». Цікавы тут яшчэ, акрамя ўсяго, кантраст паміж першай, статычнай, і другой, знарачыта фарсіраванай пад дзеянне, рух, паловай фразы: даўно мінулы час («уздзеў на плячо») успрымаецца як цяперашні, разгорнуты вось зараз, увачавідкі!

Строгасць, дынамізм, падкрэсленая функцыянальнасць сінтаксісу — характэрныя адзнакі фразы Гарэцкага. У ёй няма сарамяціцы, не месца тут ні пустазвонству, ні сюсюканню.

Вядома, такая фраза немагчымай была б без падкрэслена рэалістычнага, «вещного», кажучы па-руску, аўтарскага ўспрыняцця. Гарэцкі, умоўна кажучы, бытавік. Але быт, так любы пісьменніку, у яго ўсюды пластычны і, урэшце, адухоўлены. Той, хто так лёгка аддзяляе прозу лірычную ад эпічнай, прайшоў бы міма Гарэцкага-лірыка. А ён жа часта бывае па-сапраўднаму лірычны. Гэта таму, што зрокавае і духоўнае бачанне ў яго надзвычай цесна знітавана.

Гарэцкі — пісьменнік гарманічны. Вось яшчэ чаму яго мастацкая манера ўяўляецца нам строгай.

Даўно хочацца пабываць на ягонай радзіме, і ўсё неяк не выпадае, а можа, нават і адкладваецца паводле той трошкі забабоннай логікі, што душэўна блізкае і патрэбнае табе ў нейкі шчаслівы момант і само дасца без натугі ў рукі, само набяжыць. Усё харошае мы адкладваем на пасля.

А можа, так гаворыць боязь расчаравання. Боязь парушыць канкрэтнай прывязкай той свет, што даўно жыве ў табе, дзякуючы пісьменніку, свет, ужо безадносны да таго, што некалі абудзіла пэўна ж не тваю мастацкую фантазію. Яно гаварыла некалі яму, а ці скажа табе?

Так, расчараванне бывае і будзе, але несумненна і тое, што высокі цуд — магія мастацтва — зноў зрабіць так, каб бедная Папялушка — рэчаіснасць абярнулася чароўнай прынцэсай.

Нешта падобнае перажылося ў Завоссі, на колішнім котлішчы Адама Міцкевіча.

Уявіце сабе звычайны летні дзень, пыльную селавую дарогу, перад тым, у час дажджоў, грунтоўна такі раскоўзаную коламі машын, прыдарожныя лапікі хмызоў, несамавітыя грэблі, сажалкі, палі з рэдкімі астраўкамі прысад пры чыімсьці дворышчы — машына, стрэльнуўшы дымам, мінае вёсачку з хатамі па адзін бок вуліцы, і вось... Ну вось. Здыміце шапку, калі яна ў вас ёсць, перадыхніце і агледзьцеся. Дзялянка звычайнай бульбы пры шнуры звычайнага вішанніку. Ідзіце паўз яго, туды, у разнатраўе лугавіны, дзе гудуць чмялі і пырхаюць мятлушкі, ідзіце пад ліпу, быццё якой, мусіць, трохі даўнейшае, чым гэтага вішанніку, але не варта спакушацца думкай, што яна помніць яго. Проста шэрая, потырч пастаўленая бетонная стэла сведчыць, што тут некалі нарадзіўся ён. Ён — пясняр Гражыны і пана Тадэвуша, няшчасны закаханы на гэтых гонях, дураслівы віленскі студэнт, пецярбургскі выгнаннік, што праклінаў бледную немач белых начэй і «каскады тыранова», парыжскі схімнік і прарок, хрыстоў ваяка, што сканаў у чумнай палатцы пад Канстанцінопалем? Ён? Тут?

Так бывае цяжка паверыць у прарока ў айчыне сваёй!

І цяжка паверыць, што вось на гэтай, вось на такой звычайнай глебе, вось пад такім звычайным небам можа нарадзіцца вялікае мастацтва, можа быць ускормлены вялікі розум. Чакайце, але ж гэта так! Чакайце, можа, вось зараз, на гэтай вось зямлі, нарадзіўся новы геній?

Пакінем уздыхаць ды ахаць турыстам, давайце пастаім падумаем. Давайце падслухаем той міг, калі вось гэта звычайнае, будзённае, што наўкол нас, пачынае жыць як бы новым, поўным глыбокага сэнсу жыццём, сіпаклікaным на нашы вочы і ў нашу душу вялікаю сілаю мастацтва.

Гэта і будзе незабыўнай хвілінай.

І вось чаму прыемна бывае ад думкі, што наперадзе ў цябе яшчэ адзін харошы дзень — у Малой Багацькаўцы, на Мсціслаўшчыне, на радзіме Максіма Гарэцкага.

1975

СЛОВА ЎДЗЯЧНАСЦІ

У ім таленавіта, шчасліва, зайздросна спалучаюцца актыўная, яркая чалавечая асоба і выдатны пісьменнік.

Мне прыемна падкрэсліць гэта, хоць і не дзеля тых, каго так хваравіта, аж да зласлівай утрапёнасці бянтэжаць часта відавочныя несупадзенні, што бываюць паміж чалавечай асобай пісьменніка і ягонай творчасцю. Кругла і прадумана арганізаваная пасрэднасць наогул употай радуецца, заўважыўшы гэтую неадпаведнасць («Ага, ты ж такі, як я, а то і горшы!»), толькі не можа дараваць таго, што ўзносіць як бы звычайнага чалавека на вышыні, дзе ўжо няма чаго рабіць з «маральна непадкупнай», выверанай абывацельскай меркай.

Абывацелю, апроч многага іншага, мусіць, асабліва не хапае аднаго — па-чалавечы звычайнага здзіўлення. Падобнага хаця б на тое, з якім вялікі Талстой гаварыў пра Фета: маўляў, адкуль у гэтага дабрадушнага тоўстага афіцэра бярэцца такая лірычная дзёрзкасць — якасць, уласцівая вялікім паэтам?

Толькі ліха з ім, абывацелем,— кожнаму сваё.

Я люблю Янку Брыля — чалавека, яго высакародства і дасціпны, не папсаваны таннай парадаксальнасцю розум. І яшчэ — пачуццё годнасці, развітае роўна на столькі, колькі трэба моцнаму, упэўненаму ў сабе чалавеку. Роўна на столькі, колькі трэба для самаабароны і для сцвярджэння дабраты.

Але для мяне, як і для многіх іншых, Янка Брыль — перш за ўсё пісьменнік. Дзіўная рэч, здзіўляюся я не першы: такія скупыя бываем мы на ўдзячнасць! Чамусьці трэба чакаць юбілею ці ўвянчання лаўрамі, каб сказаць таварышу па пяру, старэйшаму ці па гадах роўні табе, як многа ён значыў, прыйшоўшы аднойчы да цябе з сумленна зробленай кнігай, дзе ўсё, да апошняй коскі, такое не падобнае да цябе і ўсёткі тваё. І, можа, не абавязкова толькі так — кнігай, можа, і аднаго добрага, у час сказанага слова бывае дастаткова, каб не збаяцца той, здаецца, невыносна дзёрзкай веры ў сябе, якую каторы ўжо раз ■ баязлівай бязлітаснасцю заганяў на самае дно душы, і вось цяпер, не табой адным дазволенае, дадзена ёй права ру-

хаць гарамі і ствараць. Ну, якія ўжо там горы, але за дазвол дзякуй, шчырае дзякуй. Вось так!

І ўсё ж добра, калі надараецца выпадак — хай нават юбілей — сказаць вось гэтае «дзякуй».

Ёсць у Янкі Брыля кранальная па шчырасці прызнання нататка аб наведванні ў адзін назапашаны для шчаслівай хвіліны дзень талстоўскай Яснай Паляны. Пра даўнюю, выверaную бескампраміснымі парываннямі юнацтва і разважлівай мудрасцю сталасці, любоў Брыля да Талстога варта было б сказаць асобна, калі б пра гэта, такое, мусіць, кроўнае для яго, не расказаў ён сам — у рамане «Птушкі і гнёзды», у аўтабіяграфічнай нататцы. І ў яшчэ адной, той, што згадалася цяпер мне. Дык вось: Ясная Паляна, музей-сядзіба Талстога. Такія зразумелыя тут «той неспакой захаплення і тая трывога, што нават Чэхава прымусілі павярнуць свае коні ад гэтых варот...», і далей Брыль піша: «Так і здаецца табе, што вось ён, Талстой,— вечна жывы, нястомны ў працы і цікавасці да людзей — сустрэне цябе на гэтай цяністай алеі і іменна ў той час, калі анямеюць твае ногі і рука сама паднімецца да шапкі, скажа:

— Добры дзень, малады чалавек! Што, і вы таксама пісьменнік?

І ты не зможаш вымавіць вельмі кароткае і вельмі адказнае слова «так», табе захочацца перакрэсліць усё, напісанае табой, усё перапісаць нанова, ад пачатку».

Сапраўды, страшная гэта штука, як падумаеш: на свеце ўжо былі Пушкін і Талстой, Купала і Колас, а ты вось (якая самаўпэўненасць!) крамзоліш нешта — і нават не ўпотай, а ўжо, глядзі, як пісьменнік; і гэткі ж недарэчна самаўпэўнены, як і ты, крытык, бывае, возьме ды і пахваліць тваю пісаніну. Так, так, ёсць ад чаго «ўпасці ў паныласць», і як жа мы ўсё-такі перамагаем сябе, як жа пішам?

Дзіўная рэч! Той жа Талстой, калі чытаеш яго, непрымушана і неганарыста дае табе стаць поруч з сабой — інакш які б сэнс мела наогул творчасць, няхай нават і Талстых? Тое, што хвалявала вялікага, хвалюе і цябе. О, дык няўжо ж тваё, хоць і такое звычайнае, агульнае для столькіх звычайных людзей не можа пераплавіцца ў слова, не можа кранаць чалавечую душу і хваляваць? Можа, і сапраўды сэнс «в одном единственном завете», у немагчымасці перадаверыць каму-

небудзь другому тое, што хочаш і можаш сказаць сам і, галоўнае, сказаць так, як хочаш.

Але як патрэбна пісьменніку сціпласць! Няхай твае паражэнні, гузакі і мазалі глыбока схаваны ад усіх, ты пра іх абавязаны памятаць заўсёды.

Сціпласці і патрабавальнасці да сябе трэба нам вучыцца адзін у аднаго — найлепш ёй навучаць найбольш вартыя з нас. За гэту навуку павінны мы быць удзячны ім. За добры прыклад празаікі майго пакалення ўдзячны Янку Брылю.

Сёння без перабольшання можна сказаць, што ў беларускім апавяданні існуе школа яго імя. Школа — гэта не цэх пераймальнікаў. Тым больш што смешна было б пераймаць яго, такога непадобнага нават на сваіх выдатных папярэднікаў у нашай літаратуры. Касрубаватага і пяшчотнага, дасціпнага і непадробна лірычнага, знаўцу народнай мовы і пісьменніка, спакушанага ў высокім майстэрстве шматступенчатай, выведзенай па ўсіх правілах не завучанай стылістыкі, па ўсіх правілах натхнення асацыятыўнай фразы. У вучні запісваюцца найчасцей не з меркаванняў асабістай прыхільнасці, а, калі хочаце, хутчэй па неабходнасці. З усведамлення, што вось тут цябе могуць нечаму навучыць. Сказаць, што ў Брыля можна і трэба вучыцца літаратурнаму майстэрству — сказаць вельмі мала. Майстэрству можна вучыцца дзе хочаш і ў каго хочаш.

Ёсць большае майстэрства — рэалізацыя сродкамі мастацтва таго новага ў параўнанні з папярэднікамі бачання, якое дае кожнаму таленавітаму мастаку ягоны час.

Бадай, адна з самых складаных і балючых праблем, якая заўсёды хвалюе пісьменнікаў,— праблема традыцыі і наватарства. Яшчэ нядаўна мы так горача, так спешна пачапіўшы адзін на аднаго біркі з азначэннямі «наватар» і «традыцыяналіст», спрачаліся аб ёй, спрачаліся не без узаемнай падазронасці, але з даволі прыкметным жаданнем адшукаць ісціну, справядліва мяркуючы, што яна не ў тых, хто такой праблемы наогул не прызнаваў. І што ж атрымалася з усяго гэтага? Пераканаліся «наватары», што праўда за «традыцыяналістамі»? Ці наадварот? Не, каб здарылася так, гэта было б надта лёгкае і несур'ёзнае вырашэнне праблемы, якая, хочам мы таго ці не, існуе, здаецца, і цяпер. Дзякуй богу, што мы адмовіліся ад чыста тэарэтычнага

вырашэння яе: цяпер, бадай, пара паглядзець на яе практычна. Я не хачу сказаць, што гэта зраблю вось зараз я; проста хачу сказаць, што творчасць Брыля мае да гэтай праблемы даволі блізкае дачыненне. Калі хочаце, гэта можна сфармуляваць інакш: чым цікавая творчасць Брыля менавіта сёння, што новае ўносіць ён, аўтар, у літаратуру ў параўнанні са сваімі папярэднікамі? Чаму можна навучыцца ў яго? Ставіць пытанне так — безумоўна трэба, бо Брыль сапраўдны таленавіты мастак слова, дасягненні якога будуць вучыць і ўзнімаць тых, хто прыйдзе пасля яго.

Асноўны жанр, абраны ім,— жанр апавядання. Справа, урэшце, не ў тым, хоць і гэта, строга кажучы, далёка не выпадкова і зноў-такі важна. Дакладней, мусіць, будзе сказаць, што наогул не пісьменнік выбірае жанр, а жанр выбірае яго: у гэтым можа быць свая заканамернасць, абумоўленая як літаратурнай, так і гістарычнай дэфармацыяй традыцыі. У Расіі пасля эпіка і эпікаў Талстога ці нават побач з ім быў «малафарматнік» Чэхаў. Эпас увачавідкі разбураўся і разам з тым ствараўся новымі сродкамі. Але напачатку мала хто здагадваўся, што гэта быў эпас. Яшчэ менш здагадваліся, што гэта было наватарства. Прасцей было думаць, што Чэхаў не «традыцыяналіст», не «наватар», а проста пісьменнік «без бога ў душы».

Эпас наогул разбураецца даволі перыядычна і, натуральна, найчасцей тады, калі дасягае больш-менш значнага росквіту ў «чыста» сваіх, эпасных формах. Эпас Чорнага не падобны на эпас Коласа; у Чорнага, я не баюся сказаць гэта, большая, калі на тое, залежнасць самой формы ад часу. Але гэта ўсё яшчэ «чысты» эпас у традыцыйных, вымераных тыповасцю абставін і з'яў адзнаках. За ім, за вялікімі здзяйсненнямі Коласа і Чорнага,— непаўторны, малады дзень нашай літаратуры, шчырае імкненне двух волатаў нашай літаратуры як найхутчэй адлюстраваць небывалыя перамены ў гісторыі нашага народа і разам з тым спроба ледзь не ўпершыню замацаваць у мастацкім слове характар яго нацыянальнай адметнасці — тое, што іншыя літаратуры зрабілі, далікатна кажучы, трошкі раней. Эпас Коласа і Чорнага вырас з гістарычнай неабходнасці, якая ўладна пастукалася ў літаратуру. Спроба паўтарыць сёння эпічныя канцэпцыі Коласа і Чорнага — бадай што марная справа. Кожны, хто больш-менш сур'-

ёзна задумваўся над праблемамі сённяшняй літаратуры, не толькі тэарэтычна, але і практычна імкнучыся вырашыць іх, непазбежна сутыкаўся, я думаю, з неабходнасцю па-новаму выказаць характар узаемаадносін паміж чалавекам і навакольным светам, што ў сваю чаргу магчыма толькі пры дапамозе новай абумоўленасці формы і зместу.

Янка Брыль — лірык, як ужо неаднойчы паказвалася нашай крытыкай, але гэта, вядома, не азначае, што яго творы назусім пазбаўлены пафасу эпічнасці. Мне здаецца, якраз наадварот. Рэальнасць, з якой мае справу лірык, настолькі ж аб'ектыўная, як і тая, з якой мае справу эпік. Розніца хіба толькі ў тым, што эпік больш «лагічна» выбірае і падключае, груба кажучы, у механізм формы састаўныя элементы рэальнасці, ствараючы, у адпаведнасці з мастацкай жыццёвай абумоўленасцю, яе «макет». Лірык куды больш адвольны ў абыходжанні з гэтымі элементамі, тое адзінства, якое дасягае эпік лагічнай непарыўнасцю сюжэта ў прасторы і часе, лірык кампенсуе адзінствам другога парадку — адзінствам пачуццёвых адносін да таго, што, здавалася б, адвольна выбрана ім з жыццёвай стыхіі. І вось што важна: лірык, прынамсі, у сучаснай сваёй разнавіднасці, не зводзіць жыццё (і нават прынцыпова не можа зводзіць яго) толькі да выбранага адзінства сувязей, якімі мнагастайнымі яны б ні былі. Арганізаваны кавалак рэальнасці, гэтую цяпер ужо мастацкую дадзенасць, лірык імкнецца ўпісаць у шырокую, найшырэйшую, хоць і не аформленую сродкамі мастацтва, раму жыцця; у дыханні гэтага, касмічна ўсеабдымнага, жыцця, у свядомай супастаўленасці з ім — эпічны пафас неэпічнай канцэпцыі лірыкаў.

Мне падабаецца ў Брыля менавіта вось гэтае, на мой погляд, новае разуменне эпічнасці. Я без асаблівай цяжкасці вылучаю яго нават у раннім апавяданні «Праведнікі і зладзеі», на якім бадай што яшчэ адчуваецца ўплыў вялікага Талстога — у рытміцы кантраståў і ў запаволеным, пільным разглядванні драбніц жывога жыцця. І тое, другое, вечнае і непадкупнае жыццё таксама прысутнічае тут — можа, гэта лапічак таго неба, на якое глядзеў паранены Андрэй Балконскі. І ўсё ж які ён, Брыль, і ў гэтым апавяданні падобны да самога сябе!

Ён сапраўды эпічны ў сваёй лірычнай, то замілава-

най, то гнеўнай, то трагічнай, то стрымана мужнай сіле пачуцця. Хто, раз прачытаўшы, не запомніў ягонай маці-сялянкі, яе некрыклівa мужнай дарогі да смерці. «Свае худыя, так мала ў жыцці цалаваныя рукі яна трымала мазалямі да мазалёў. Шаптала свае, зусім новыя словы малітвы. І ў ранішнім святле роднага сонца ясным быў яе родны твар, хоць па маршчынах міжвольна каціліся слёзы. Яна і тут не думала пра сябе». А дзед Вячэра з апавядання «Надпіс на зрубе»?! А па-мужчынску стрыманыя, балючыя словы яшчэ пра адну маці, родную, сваю,— з самага нядаўняга, апошняга ў часе напісання апавядання?! І — ягоны Руневіч з рамана «Птушкі і гнёзды», можа, самы любімы, самы выпакутаваны герой, праведзены праз шматлікія кругі жыцця, на якіх ён быў і астаўся сынам свайго народа — беларусам. Не надта хочацца пісаць тут пра гэта, але ўсё ж, думаю, варта: мне здаецца, што ён, гэты раман, недастаткова ацэнены нашай крытыкай. Недастаткова ацэнена яго задума — вывесці беларуса ў шырокі свет, на перакрыжаванне лёсаў многіх народаў, каб чалавек паглядзеў на чужое і яшчэ лепш усвядоміў і зразумеў сваё. Недастаткова ацэнены яго высокі духоўны лад — якасць, між іншым, больш чым каму з нашых празаікаў, сучасных і папярэдніх, уласцівая Янку Брылю. І недастаткова ацэнены канструктыўны, жанравы прынцып рамана. А над гэтым таксама варта было б паразважаць...

Я пішу гэтыя радкі па праву чытача і яшчэ — як маладзейшы таварыш, якому заўсёды было добра ад таго, што недзе побач ён, Янка Брыль, пісьменнік, чытае творы і заўсёды чытаў з уважлівай радасцю і, чаго таіцца, з зайздрасцю. Спадзяюся, што старэйшы таварыш даруе мне гэта. Як, можа, і вось гэтае слова, у якога ёсць толькі адно апраўданне — шчырасць.

1967

І ЖЫЦЦЁМ І ПЕСНЯЙ

У чалавечым нашым жыцці існуе той непазбежна сумны рубеж, дзе кожнаму дадзена апошні раз быць сам-насам з вечнасцю; за тым рубяжом значыцца ўжо небыццё, для ўсіх аднолькава — фізічнае, для лепшых, ухарошаных пры жыцці правам на ўдзячную памяць нашчадкаў — магчыма, бяссмерце, непадуладны часу працяг існавання зямнога. Смерць амаль заўсёды па-новаму выяўляе чалавечую сутнасць, адкідаючы дробязнае і другараднае, буйным планам высвечваючы тое, што было не навідавоку,— і яно ўжо тады «выразна блісне ў вочы».

Значная чалавечая асоба звычайна не крычыць пра сябе на ўсіх скрыжаваннях. Сціпласць для яе часта неўсвядомлены спосаб абароны сваёй значнасці, боязь раўнадушнай людской цікавасці, помслівай зайздрасці і непавагі.

Пасля смерці Міхаіла Святлова па-новаму адкрылася яго чалавечая і паэтычная значнасць, у тым ліку нават для тых, хто добра ведаў яго.

Святлова пры ягоным жыцці бачыў я адзін раз.

Не думаю, што згадку пра гэта можна зразумець як жаданне навесці на сябе хоць маленькі праменьчык ад бляску славутага імя. Вядома, значнасць таго ўспаміну для мяне асабіста бясспрэчная: не кожнаму ж, урэшце, давялося і бачыць яго, выдатнага паэта! Справа, здаецца, у тым, каб лішні раз згадаць пра высакародны ўрок, які даваў усёй сваёй чалавечай і паэтычнай сутнасцю Міхаіл Святлоў.

Бачыў Святлова я ў Мінску, і было гэта, здаецца, у 1960 годзе, у Дні рускай літаратуры ў Беларусі. І бачыў я Святлова, можна сказаць, праз дзверы. А было так. Маладому, зялёнаму супрацоўніку нашай літаратурнай газеты было загадана ні больш ні менш як узяць інтэрв'ю ў самога Святлова.

Гаворачы цяпер: «у самога Святлова!» — я, магчыма, перабольшваю ці, дакладней, трохі хлушу. Таго піэтэту, які адчуваў бы сёння ў маім тагачасным узросце малады чалавек, здаецца, не было. Канечне, Святлоў,— аўтар славутай «Гранады», ну яшчэ «Італьянца» чытаў. Не забудзем, што Святлоў і друкаваўся ў тыя

гады не часта, ды і крытыка не надта песціла яго сваёй увагай.

Пазваніць у гасцініцу не здагадаўся. У адміністратара дазнаўся пра нумар пакоя, калідорная сказала, што так, здаецца, такі ёсць і, мусіць, у нумары, бо ключа, бачыце, у шуфлядцы няма.

Я пастукаўся ў дзверы. Ніхто не азваўся. Пастукаў яшчэ. Крокаў у пакоі я не чуў. Але дзверы раптам ціха расчыніліся. Не сказаць каб непаразуменна, наадварот, неяк спакойна, сцішана, па-птушынаму маркотна на мяне глядзеў чалавек. Шчуплы, нават, здалося, малы. І выгляд — непадробна, непрыдумана хатні выгляд. Не, той, што стаяў перада мной, не быў ні ў піжаме, ні ў пантофлях. Не надта новы, цёмны, з самавітай тоўстай крамніны ў «баразёнку» пінжак, не аблягаў, а неяк абхінаў хударлявую прыгорбленую постаць. Спакойна ўважлівыя вочы. Тонка замыленыя губы. І, як у птушкі паднятае ветрам пер'е, хібок зляжалых валасоў.

Ён усё маўчаў. Я пачаў гаварыць пра сваю да яго патрэбу. Ён панурыўся і ціха сказаў:

— Я стары чалавек... Я хацеў заснуць... Мне цяпер доўга будзе не заснуць.

І ён зноў маўчаў і не адыходзіў ад дзвярэй. Я быў збянтэжаны і, каб адрабіцца ад той збянтэжанасці, зноў няўцямна пачаў нешта гаварыць, магчыма, нават пра сустрэчу ў іншы час, у іншы дзень. І збянтэжыўся зноў, і змоўк. Ён падняў на мяне вочы, потым панурыўся і зноў, цяпер ужо і сам збянтэжана, сказаў:

— Я стары чалавек... Мне будзе доўга не заснуць.

І як бы просьба была ў тым голасе, у той мяккай грасіроўцы, дзе гук чуўся з нейкім нечакана фарфоравым бляскам.

І я пайшоў.

Ці пакрыўдзіўся я тады? Мусіць, усё-такі пакрыўдзіўся. Але калі зноў і зноў вяртаўся ў думках да той не зусім звычайнай з ім размовы, да той сваёй з ім тайны (я пра тую размову, здаецца, нікому не казаў), усё больш ясніўся і прарастаў для мяне сэнсам той ягоны голас, яго інтанацыя і просьба ў ёй: ды зразумей ты, чалавеча, сапраўды зразумей, што мне вось цяпер блага і што я сапраўды стомлены і стары чалавек...

А пасля пра яго і пісалі больш, і паважалі больш, і перадавалі з вуснаў у вусны яго досціпы, яго «хох-

мы». А пасля была сумная вестка пра яго смерць, і словы пра яго Андрэя Вазнясенскага, якія так запомніліся, адкрыліся і праз маю, уведаную пра паэта праўду. Там было сказана, што таму, хто наглядаў, хто бачыў Міхаіла Святлова, здавалася, што гэта «сама душа сядзела, размаўляла і курыла».

І зноў успомніўся ён яшчэ пасля адной сумнай весткі: памёр Яраслаў Смялякоў. Нябожчыка Смялякова я таксама бачыў і нават меў магчымасць неаднойчы слухаць яго, але, зноў жа, справа не ў тым, а ў нейкім іх агульным падабенстве: яны былі цудоўнымі «савецкімі старымі». Не кажучы пра тое ўжо, што абодва былі цудоўнымі савецкімі паэтамі.

«Старыя», яны заставаліся сапраўды маладымі да канца свайго жыцця, маладымі, як не кожны з маладых. У артыкуле пра Святлова Я. Смялякоў так дакладна і напісаў: «Камсамольскім паэтам па ўсёй сваёй творчай сутнасці, па тэмах, па стылю жыцця, па манеры трымаць сябе ён і застаўся да свайго апошняга дня». У вуснах аўтара «Строгай любові», песняра камсамольскага юнацтва трыццатых гадоў, гэта гучыць па-асабліваму пераканальна.

Між іншым, ужо вядомы «камсамольскі» паэт М. Святлоў благаславіў у друк першы верш будучага камсамольскага паэта Я. Смялякова.

Трохі іранічна, як заўсёды ў Святлова, але тым часам і праўдзіва сказана:

Молодежь! Ты мое начальство —
уважаю тебя и боюсь.

У Смялякова тон па-бацькоўску знарачыта строгі, нават не без нотак той бурклівасці, што адначасна і ад строгасці і ад дабраты, калі гаворыць ён пра «хлапчукоў-паэтаў», што «в аудиториях кричат». Але:

Мне непременно только надо —
точнее не могу сказать —
сквозь их смущенность и браваду
сердца и души увидать.

Строгасць — гэта сапраўды рыса і чалавечага, і паэтычнага таленту Яраслава Смялякова. Яна грунтавалася на непрытворнай патрабавальнасці да сябе, на ўсведамленні сябе нераўнадушным выказнікам шматпакутнага і гераічнага нашага часу, на пагардзе да бяздумнага паэтычнага трубадурства, якое цяжка зразу-

мець інакш, як абразу чалавеку і мастацтву. Смелякоў ведаў сабе цану. Ён мог нават і сам сказаць пра гэта, што часта бянтэжыла і нават злавала людзей, якія ахвотна надарылі б кожнага стрэчнага мерай сваёй нікчэмнасці. Але ж праўда ёсць праўда, і маштаб асобы і творчасці Яраслава Смелякова, як і яго «хроснага бацькі» Святлова, зразумелы сёння кожнаму, хто любіць сапраўдную літаратуру і занепакоены яе па-грамадзянску сумленным быццём. Міхаіл Ісакоўскі, неяк назваўшы імя Смелякова адразу пасля імені Аляксандра Твардоўскага, зазначыў: «Я лічу вельмі моцнай і значнай паэзію Яраслава Смелякова, з якім, як гэта ні дзіўна, мне так і не надарылася ні разу пагаварыць пра яго цудоўныя вершы...»

Я. Смелякоў быў сябрам беларускай літаратуры, дзе сярод пісьменнікаў меў ён шмат шчырых сяброў і прыхільнікаў. Дзе ў яго шмат прыхільнікаў сярод чытачоў.

1973

АДКАЗ НА АНКЕТУ

«Свой голас» — так, мусіць, пазначаюць адметнасць аднаго пісьменніка перад другім, маючы на ўвазе выразна акрэсленае светаўспрыманне, выказанае пры дапамозе арыгінальнай мастацкай манеры.

Наогул жа, здаецца мне, гэты «свой голас» — тая бірка, на якой кожны крытык піша ўсё, што толькі захоча. Апявае паэт салаўіныя гаі, дубы, крыніцы і росы — калі ласка, «свой голас». Націскае, дзе трэба і не трэба, на карнявыя рыфмы, на алітэрацыі і асанансы — «свой голас», бачыце, таксама.

Неяк несур'ёзна, легкаважна ў дачыненні да Пушкіна ці Купалы было б сказаць, што яны мелі свой голас. Адразу адчуваеш, як мала стаіць за такім азначэннем, бачыш, што яно не вельмі вынаходлівы, хоць і даволі распаўсюджаны штапм — і толькі. Шкадую, што і сам неаднойчы карыстаўся ім — праз ленасць думкі, праз легкадумную паспешлівасць: сказаць абы сказаць.

Для паэта паэзія — форма яго грамадзянскага існавання. Гэта яго прызванне і адначасова абавязак як члена грамадства — грамадзянскі абавязак. Але свой абавязак ён выканае толькі тады, калі застанецца паэтам у арганічным сэнсе гэтага слова. Калі ж паэт гвалтуе свой талент, прымушаючы яго, паводле меркаванняў зусім не арганічных, кранацца тых сфер ці тэм, дзе ні жыццёвы, ні мастацкі, ні грамадскі вопыт аўтара не можа знайсці разгарнення, узнікае кан'юнктура як метад мастацкай, ідэйнай і грамадзянскай эквілібрыстыкі. Служыць людзям і грамадству можа толькі тое, грамадская каштоўнасць чаго вырастае з мастацкай неабходнасці, дасканаласці і самастойнасці.

Шмат нараканняў выклікалі ў свой час так званыя «газетныя» вершы. Але вось цяпер так многа пачалі пісаць «негазетных» вершаў пра гэтыя «газетныя» вершы, замест таго каб пісаць вершы сапраўды праўдзівыя і высокамастацкія,— што пачынаеш думаць: ці не кан'юнктура гэта таксама, ці не грамадзянская гэта бравада і гучнае «сотрясение воздухов»?

Мы яшчэ вузка, правінцыяльна часта разумеем грамадзянскасць, цалкам зводзячы яе ад публіцыстыкі — удалай ці няўдалай, разумнай ці па-блазенску ненатуральнай, крыклівай.

У Купалы ёсць верш «Ворагам Беларушчыны» — узор мастацкай публіцыстыкі і выдатная паэма «Яна і я», дзе не ўчуеш ні адкрытага грамадзянскага пафасу, ні воклічаў, ні заклікаў, ні праклёнаў, але я, чытач, не магу і не хачу сказаць, што ў першым выпадку Купала быў грамадзянінам, а ў другім — чуллівым мешчанінам, якому, лежачы на канапе, прыемна было маляваць у сваім уяўленні, як вясною беляць палотны, як выганяюць першы раз на пашу жывёлу, як мілуюцца ён і яна.

Куляшоў і Панчанка для мяне паэты раўназначнай велічыні, нягледзячы на тое, што ў першага шырокая рама філасофска-грамадскіх абагульненняў як бы закрывае больш ці менш дробную надзёншчыну, а ў другога — гэтая надзёншчына ўвачавідкі набывае мастацкую манументальнасць, суаднесеную з маштабамі сапраўднай паэзіі.

Трэба верыць у сваё права быць мастаком, і тады чытачы будуць пазбаўлены таго не вельмі прыемнага і не вельмі маральнага відовішча, калі пісьменнік, паэт ці празаік — усё адно, баючыся, што чытачы-суайчыннікі не паверань у добрыя намеры ягонага пяра, праз радок клянецца ў сваёй вернасці гэтым суайчыннікам-чытачам, кідаючы тым часам адным вокам і на рэдактара.

Літаратурная мода ўзнікае там, дзе пісьменнік напісвае, а чытач пачытвае. Сапраўдны паэт настолькі далёкі ад моды, наколькі эпігон далёкі ад яго. Мода — наканаванне эпігонаў. Сапраўдны паэт скіроўвае сваю думку на берагі пустынных хваль, у шыракашумныя дубровы, эпігон красуецца ў літаратурных прыхожых, дзе вакол яго ўвіхаюцца калялітаратурныя добчынскія і бобчынскія, спрачаючыся паміж сабой, хто першы, гледзячы паэту ў рот, сказаў «Э!».

Усё гэта брыдка, але не так і страшна. Мода — непазбежны спадарожнік усякай сталай, шырока разгалінаванай літаратуры, якая мае шматлікага ў сваёй масе, але living рознага па ўзроўню чытача. Калі б быў рэальна магчымы сярэднеарыфметычны чытач, дык ён і стаў бы самым ідэальным спажыўцом літаратурнай моды. І не

толькі спажыўцом, але і заказчыкам і заканадаўцам. Мода цалкам залежыць ад попыту, у выніку якога пісьменнік (чытай эпігон) робіцца нарыхтоўшчыкам духоўнай жавальнай гумкі — такой формы і ў такой упакоўцы, якіх патрабуюць ад яго.

Чаму я настойліва паўтараю: эпігон? Ды таму, што мода заўсёды карыстаецца знаходкамі і адкрыццямі сапраўдных паэтаў, абсмоктваючы і апашляючы іх. Мода заўсёды робіць выгляд, што апярэджвае літаратуру, аднак яна толькі яе цень. Лёгкасць, гнуткасць, гучнасць верша, выпрацаванага Пушкіным, адразу ж узялі на ўзбраенне эпігоны. Сярод іх у сярэднеарыфметычнага чытача Бенядзіктаў — самы старанны з вершаскладальнікаў, геній, ледзь не пераемнік вялікага паэта: вядома, у тым сэнсе, што пайшоў нібыта далей за яго. Куды там Пушкіну да бенядзіктаўскіх «фосфорных очей» и «извинченных кудрей»!

А чым для чытача-сучасніка быў прывабны Пушкін? «Каўказскім палоннікам» ды «Чорным шалем». Пушкіну «Барыса Гадунова», «Доміка ў Каломне», «Меднага конніка» заставалася ці кпіць з «румянага крытыка», што патрабаваў апісваць «края жемчужны» і «гордой девы идеал», ці з горыччу заклікаць сябе не звяртаць увагі на «суд глупца и смех толпы холодной».

Пушкінскі «Медны коннік» патрэбен быў сярэднеарыфметычнаму чытачу толькі ў перакладзе Бенядзіктава. Бенядзіктаў (о іронія эпігонскага лёсу!) яго зрабіў. Калі ласка, чытайце:

Раз, заметив захолустье,
Лес, болотный уголок,
Глушь кругом, при Невском устье
Заложил он городок.

Зразумела, жаласліва, і сам Пётр такога росту, што не трэба нават станавіцца на дыбачкі, каб паляпаць яго па плячы.

Бенядзіктавым зачытваліся, а ў той час быў ужо не толькі Лермантаў, але і Някрасаў.

А як было з Багдановічам? Заўзятыя прыхільнікі нашаніўскай традыцыі, што так старанна перапявалі Купалу і Коласа, не маглі дараваць паэту, што ён спявае не так, як яны, і нават не так (якое злачынства!), як Купала і Колас. Але тое, што ў вялікіх паэтаў было

паэзіяй, у іхніх эпігонаў рабілася модай, нягледзячы на ўсю асцярожнасць, з якой гэта слова трэба ўжываць у дачыненні да шчырай, самаахвярнай нашай паэзіі таго часу.

Мода, вядома, спрыяе распаўсюджванню сярод чытачоў тых ці іншых пошукаў і ідэй. Але ж, скажаючы іх, адрасуючыся да асяроддзя, дзе гэтыя ідэі наўрад ці будуць правільна і плённа зразуметы, сур'ёзна ўплываць на развіццё літаратуры і грамадства яна не можа. Мода ўзнікае і адыходзіць, сапраўдная паэзія астаецца. Ні ў моды, ні ў эпігонства заслугі тут няма.

1966

ЗАБЫЦЬ — НЕБЯСПЕЧНА

Чытаць гэтую кнігу цяжка. Не лягчэй яе, мабыць, было і пісаць. Праўда, «пісаць» у дадзеным выпадку не тое слова. Пісалася яна не ва ўтульным хатнім кабінеце, не ў Доме творчасці, куды загадзя ўзята пуцёўка, пісалася яна не адным чалавекам і нават не трыма, імёны якіх стаяць на вокладцы. Яе аўтары — найвялікшая народная трагедыя, кожны чацвёрты з беларусаў, каго забрала вайна, яе аўтары — вогненная памяць тых, хто гарэў і не згарэў у падпаленай карнікамі хаце, хто жывы ўстаў з-пад трупаў аднавяскоўцаў — старых, жанчын і дзяцей,— устаў жывы, але ўтрапёны жудасным відовішчам ужо назаўсёды, да належнага яму, адпушчанага, як і ўсім, звычайнага зямнога скону.

Чалавек... Мера ягонага трывання, ягонай велічы духу, мера спасціжэння чалавечнасці і мера нечалавечага, звярынага помараку розуму і сэрца. Людзі і нелюдзі. Жыццё і смерць. Смерць у імя жыцця і заалагічны, жывёльны страх перад жыццём, перад расплатай. Што па-сапраўднаму забівае чалавека? Куля, пятля ці ўласная нікчэмнасць? Сумленне ці адсутнасць яго?

Старыя, жанчыны, дзеці. Тыя, хто ацалеў, найперш расказваюць пра дзяцей: «...Я гляджу ўжо — цёмна, так толькі месячко ўсходзіць, толькі пачынаў усходзіць. Тады, во тут у нас старая была адна (яна памерла, здаецца, запрошлы год), дык яна:

— А мая ж ты,— галосіць,— дочанька, за што ж цябе забілі, хай бы лепей мяне!..

Гэта яна над сваёй дачкой. А я, праўда, тады адзываюся.

А яна мне:

— А мае дзетачкі, ці гэта ты цэлая?

А я не ведаю, бо ног не чуствую сваіх: народу столькі на мне. Знаю толькі, што галава мая цэлая. Ну, праўда, гэта жанчына, спасіба ёй, дапамагла мне вылезці.

А тут з намі ў гэтай хаце быў хлопчык адзін. Бацьку яго забілі ў тым хлеве, дзе былі мужчыны, а яго адзелі за дзяўчынку: бо гаварылі, што хлопчыкаў забіваюць. Дык яны ўзялі яго сюды, адзеўшы дзевач-

кай. А яго, беднага, параніла крэпка: растрапалі тут во, жывоцік, усё, усё... Дык ён, бедны, просіцца:

— Выміце мяне, каб я не гарэў.

А тут ужо ўсё гарыць. А ён просіцца...»

«Хлопчыку майму было восем, а дзяўчынцы шэсць, сёмы год. А меншанькую расстралялі, я вам казала.

Што яна ім спявала, дык гэта чула жанчына, суседка. Яна была, бачыла, як старуха мая і на воз садзілася і пашчалася. А меншанькая, чатыры годзікі было, сказала:

— Дзядзі, не бярыце мяне з бабуляй, я вам спяю тую песеньку, каторая «Пасею гурочкі».

Яна спела ім, стоячы на акне, і яны яе забралі і застрэлілі».

Як магло здарыцца такое? Калі? У якія часы? У палове дваццатага стагоддзя. У імя чаго? У імя «новага парадку». Тысячагадовы рэйх павінен быў запанаваць там, дзе людзі не ведалі іншых парадкаў, акрамя сацыяльнай справядлівасці, не ведалі іншых каштоўнасцей, акрамя тысячагадовых набыткаў гуманістычнай культуры, акрамя свяшчэнных прынцыпаў свабоды, роўнасці і брацтва.

Зноў і зноў не перастаём мы задаваць сабе пытанне: як магло здарыцца так, што ў краіне, дзе ўпершыню быў вынайдзены друкарскі станок, на гарадскіх плошчах палалі кастры з кніг, які злосны дух мог пасяліцца ў душы нацыі, што ганарылася імёнамі Канта і Гегеля, Гётэ і Шылера, каб ад яе імя свядома прышчаплялася нянавісць да самога паняцця культуры (Гебельс: «Калі я чую слова «культура», мая рука міжвольна цягнецца да пісталета»), каб куля і пятля лічыліся адзіным сродкам вырашэння ўсіх і ўсялякіх праблем, адзіным правам і адзіным законам? Бо ці ж не Гітлер абвяшчаў: «Вайна абсалютна натуральная і арганічная. Няма пачатку і няма міру. Усялякая барацьба ёсць Вайна».

На справе гэта ператварылася ў мэтанакіраваную палітыку вынішчэння народаў, у жудасную «селекцыю», адбор: «Каго забіць адразу, спаліць сёння, на месцы, а каго заўтра — цяжкай працай, голадам у Германіі».

«З агульнай колькасці 9200 беларускіх сёл і вёсак, разбураных і спаленых гітлераўцамі за гады Вялікай

Айчыннай вайны, 4885 было знішчана карнікамі. Поўнасцю, з усімі жыхарамі, было знішчана 627».

І вось цяпер мы чуем галасы тых, хто ацалеў, хто вырваўся з жудаснага вогненнага пекла.

І цяпер здаецца трохі дзіўным: чаму тое, што зрабілі Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік, не было ажыццёўлена раней, няхай нават не так увачавідкі пераканаўча, як у дадзеным выпадку, але ўсё ж ажыццёўлена? Няўжо задума такой кнігі, цалкам непрыдуманай, такой да неверагоднасці сціплай у сваёй непрыдуманасці, прыйшла ў галаву першым менавіта ім?

Не, усё, мабыць, не так і проста.

Мне здаецца, што нават аўтары гэтай, цяпер ужо здзейсненай, кнігі не ўяўлялі напачатку, чым стануць для іх, якога нечалавечнага выдаткавання душэўных сіл будуць каштаваць «дзясяткі кіламетраў магнітафонных запісаў — расказы больш як трохсот непасрэдных сведкаў хатынскіх трагедый, ...тысячы кіламетраў дарог — асфальтаваных, палявых, лясных».

Без перабольшання, гэта ператварылася ў хаджэнне па чалавечых пакутах, па вогненных кручах зямнога пекла.

Расказваюць, некалі сучаснікі з забабонным страхам, як на нетутэйшага, паказвалі на Дантэ і, хрысцячыся, вусцішна шапталі: «Ён быў там, у пекле...»

Гэта яшчэ і таму, што ён не толькі, як яны думалі, быў, але што і пра тое расказваў. А перажыць, адчуць, расказаць, ці не значыць тое ж, што бачыць і быць?

«Сваю задачу мы бачылі ў тым, каб зберагчы, утрымаць, як «плазму», невыносную тэмпературу чалавечага болю, недаўмення, гневу, якія не толькі ў словах, але і ў голасе, у вачах, на твары; утрымаць усё тое, што, як паветра, акружае чалавека, які расказваў нам, а цяпер, са старонак кнігі, звяртаецца да чытача — да вас звяртаецца».

Чатыры гады побач са смерцю, з пакутамі, з чужым болем, які стаў і тваім,— чатыры гады, амаль столькі ж, колькі доўжылася мінулая вайна. Тое, што спачатку ўяўлялася, як «мы» (калі не памыляюся, з першымі публікацыямі асобных раздзелаў кнігі мы пазнаёміліся пад крыху інакшай, як цяперашняя, назвай — «Мы з вогненнай вёскі...»), тыя людзі са 147 вёсак, смерць і ўваскрэшанне якіх перажылі аўтары,

сталі «я» — мерай асабістага болю, гневу, асабістай адказнасці. «Я з вогненнай вёскі» — мог бы сказаць кожны з аўтараў кнігі. «Я з вогненнай вёскі» — мог бы сказаць услед за аўтарамі і кожны з нас.

Але ёсць у гэтым трагічным сцвярджэнні і яшчэ адно, не менш значнае прачытанне,— у суаднесенасці ўсё тых жа «я» і «мы». Яно настойліва згадвае нам пра найвялікшую цану кожнага асобнага «я», кожнага асобнага чалавечага жыцця, пра безумоўную, абсалютную ягоную каштоўнасць. Бо ці не сапраўды ж чалавек — мера ўсяго існага на зямлі, ці не сапраўды нам сёння, пасля не параўнальнай ні з чым трагедыі дваццатага стагоддзя, апакалептычнай трагедыі сэрца і розуму, як ніколі раней, хочацца верыць у гуманістычны пафас гісторыі, якая не павінна дараваць і ніколі не даруе тым, хто, ап'янелы ад крывавай сваёй велічы, мусіць замахнуцца не толькі на правы чалавечай асобы, але і на яе фізічнае жыццё — дзеля «выраўноўвання» і паляпшэння нібыта ўсё той жа гісторыі, дзеля зямнога «раю» бяздушных робатаў, бязглуздых мастадонаў, дзеля панавання ўкарочанай да памераў дубца і раз назаўсёды дадзенай апчасліўленаму быдлу ісціны. І якое значэнне можа мець пры гэтым нейкая там цана нават адной-аднюсенькай «дзіцячай слязінкі»!

Як ні дзіўна, але і сёння за мяжой знаходзяцца людзі, якім засцілае вочы нянавісць да гуманістычных каштоўнасцей чалавецтва, якія робяць выгляд, што нікчэмны лёс істэрычных фюрэраў і напышлівых дучэ — усяго толькі недарэчная выпадковасць, здрада зайздрослівага лёсу. І яны таксама не адмовіліся б арганізаваць новы сусветны пажар пад выглядам усеагульнай прачысткі мазгоў і ўсеагульнага, у гігіенічных мэтах, кровапускання. Бо зноў жа, бачыце, ці не натуральны, ці не адвечны ён, гэты інстынкт вайны, ці не крыецца ён у заганнасці самой чалавечай прыроды?

Кнігі-сведкі, кнігі-абвінавачванні, падобныя да «Я з вогненнай вёскі...», не папускаючыся да палемікі з вартымі жалю адэптамі чалавеканенавіснай філасофіі, звернуты не да тых, каго, паводле вядомай прыказкі, выправіць хіба што магіла, яны звернуты да пачуццяў і розуму жывых, і ў першую чаргу тых, дзень чыйго нараджэння не пазначаны смяротным ценем вай-

ны. Каб ведалі. Каб не дапусцілі паўтарэння трагедыі, бо забыць — небяспечна.

З'яўленне такой кнігі — паказчык сталасці, публіцыстычнай і чалавеказнаўчай сталасці нашай літаратуры, а найбольш і найперш — паказчык сталасці і вышыні яе маральнай свядомасці. Гэта адначасова і дакументальна, з псіхалагічным паглыбленнем засведчаны факт і сённяшняй маральнай і ідэалагічнай свядомасці нашага народа. Тут выяўлены не толькі гераічныя грані народнага характару, але і запас ягонай дабраты, ягонага трывання, мера ягонай падключанасці да ўсялюдскага, гуманістычнага пачатку. Тут выяўлены, не пабаюся сказаць, і духоўная адметнасць нацыі, выказаная непасрэдна словам самога народа,— факт, неацэнны як для мастацкай практыкі самой літаратуры, так і для росшукаў гісторыка, этнографа, лінгвіста.

У асабіста ж аўтарскім плане з'яўленне такой кнігі няйначай як грамадскі ўчынак. І за гэта, за прыклад, ім таксама дзякуй.

1975

З ПЛЕЯДЫ ПЕРШЫХ

Памятнае ўражанне з пары першапачатковых школьных год. У класе ўсе ўслых чытаюць «Пяць лыжак заціркі» Змітрака Бядулі. Такое зразумелае і аж да слінак у роце нагляднае для нас, дзятвы, што не выйшла яшчэ са свайго нясытага пасляваеннага дзяцінства, вясёлае і адначасна журботнае апавяданне пра зацірку, на якую пашчасціла згаладалай сялянскай сям'і. І праўда, чым не свята! Але трэба ж — шась у хату суседка.

«— Дзень добры!

— Дзень добры!

— Хлеб ды соль!

— Дзе там хлеб,— зацірку ядзім, просім на снеданне! — кажа Агата.

— Ого! На зацірку і я ахвотніца! — адказала Сцёпчыха, і яе галодныя вочы заблішчэлі. Узяла лыжку і спрытна падсела да міскі».

Якая бура паднялася ў душах Антося, Агаткі і іхніх галодных дзяцей! Хоць толькі пяць лыжак дасталося суседцы, але якіх!

«Тры» — ледзь не ўскрыкнуў Антось, калі Сцёпчыха зачарпнула трэці раз.

— Ратуйце! Ратуйце! — ледзь не плакаў ён, як яна апусціла лыжку ў міску чацвёрты раз. А як з'ела пятую, то ўжо і міска была пустая».

Гэткі смех скрозь слёзы, журботны гумар, што прасякае сабою ўсю, да самага трагічнага споду агаленую сітуацыю. Прытча? Але тады гэта не здавалася прытчай — проста літаратурная аздоба расказанага тут ніякім чынам не адчувалася і не ўсведамлялася так сама. Толькі потым, пасталеўшы, чытаючы гэтую навелу ў Зборы твораў Бядулі, можна было адшукаць і тую «аздобку», ну хаця б у скупых сентэнцыях, што перабівалі тэкст,— скажам, такіх: «Няшчасце не мае агульнай меркі для ўсіх людзей на свеце. Але ў кожнага чалавека ёсць свая ўласная мерка для няшчасця і свой асаблівы погляд на самое няшчасце». І можна было ўбачыць дату, прастаўленую ў канцы навелы,— 1912 год.

Першы свой твор — верш у прозе «Пяюць начлеж-

нікі» Бядуля змяшчае за два гады перад тым на старонках першай масавай беларускай газеты «Наша ніва». Неўзабаве ён увойдзе і ў само кола яе непасрэдных супрацоўнікаў.

Звычайна імя Змітрака Бядулі называюць у адным шэрагу з імёнамі славутых карыфеяў нашай літаратуры — Купалам, Коласам, Багдановічам. Творчыя лёсы першых двух завяршыліся ўжо ў гістарычна новым часе, ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, якую яны не толькі шчыра прынялі, але і сталі натхнёнымі яе прапагандыстамі і песнярамі. Гэты лёс падзяліў з імі і Змітрок Бядуля. Бліскуча таленавіты Максім Багдановіч памёр маладым, у няпоўныя дваццаць сем год, у 1917 годзе, за колькі месяцаў да Кастрычніка, у прадчуванні «залацістага, яснага дня» (ягоныя словы), прызначанага для нашага народа гісторыяй. У малы прамежак свайго апошняга наведвання Беларусі (паэт раней жыў і вучыўся ў Расіі) ён цесна сышоўся не толькі з Купалам, але і са Змітраком Бядулем, чалавекам, што нечым быў блізкі яму «по музам, по судьбам». Будучы выхадцамі з сацыяльна-культурнага асяродку, што розніўся ад таго, у якім адбывалася першапачатковае накапленне жыццёвага вопыту ў Купалы і Коласа (іхняя блізкасць да сялянскай масы),— яны, Багдановіч і Бядуля, далучылі сваю, глыбока непаўторную ноту да агульнага ладу дэмакратычнага, поўнага сацыяльнага пратэсту гучання новай беларускай літаратуры. Абодвух не мінулі, дарэчы, і папрокі ў свой час у «дэкадэнцтве» з боку не надта відушчых і не надта, мяркуючы паводле ўсяго, літаратурна таленавітых прыхільнікаў «сярмягі» і «лапця» як у мастацкім стылі, так і ў сваёй сацыяльна-наіўнай, па-правінцыяльнаму панылай і «местачковай» грамадзянскай пазіцыі. Ці не ім гэта не без іроніі раіў Багдановіч пакінуць «вечны плач свой аб старонцы», ці не ім гэта Бядуля адказваў свядомай арыентацыяй сваёй творчасці на мастацкі артыстызм, незалежна ад таго, наколькі «нізкай» ці «высокай» была жыццёвая стыхія, «прырода», якую ён рабіў прадметам сваёй мастацкай увагі. А да таго часу, калі пачаў пісаць, Бядуля напоўніцу ўзяў гаркоты ад жыцця, зведаў сацыяльна-разнастае асяроддзе, служачы то хатнім настаўнікам у яўрэйскіх сем'ях, то канторшчыкам на лесараспрацоўках і г. д., пакуль гарачлівае жаданне «выказаць сябе» і нейкім чынам асэнсаваць

жыццёвыя назіранні, што прыгняталі сваім багаццем і супярэчлівасцю, прыклад Горкага, якога ён шчыра чытаў (рускай мове ён навучыўся толькі ў шаснаццаць год), даволі шырокая на той час вядомасць Купалы і Коласа ў беларускім асяроддзі, да якога блізка стаяў і малады Плаўнік (будучы Бядуля),— не навялі яго на думку пісаць па-беларуску, а потым і наладзіць сувязь з рэдакцыяй «Нашай нівы», што знаходзілася ў Вільні.

У 1913 годзе выходзіць у свет зборнік імпрэсій Бядулі «Абразкі». Дарэчы, назва падказана Купалам, у Бядулі было «Плач пралесак».

У 1916 годзе адбываецца сустрэча з Багдановічам — ужо ў Мінску, куды, паводле ўмоў ваеннага часу, перамясціўся цэнтр беларускага культурнага жыцця. Сам Бядуля сведчыць: «Я тады жыў на Мала-Георгіеўскай вуліцы і прапанаваў Максіму перабрацца да мяне на кватэру. Каля шасці месяцаў, да самага выезду ў Ялту М. Багдановіч жыў у мяне». Пра тую пару і цудоўная навела Бядулі «Страцім-лебедзь», напісаная ў самым канцы ягонага жыццёвага шляху. Можна сказаць, што вобраз Багдановіча, паэта і сябра, спадарожнічаў Бядулі на ўсіх паваротах яго пісьменніцкага і чалавечага лёсу.

Зборнік «Абразкі» не быў выпадковы ў Бядулі. Няхай па ім цяжка было напрарочыць будучае развіццё аўтара як празаіка (Бядуля пісаў таксама і вершы), але ў ім засведчана было ўжо вострае адчуванне сацыяльных кантрастаў, прыроджанае пачуццё мастацкай меры, як і адчуванне формы і жанра, тая сапраўдная артыстычнасць, пра якую згадвалася ўжо і якая заўсёды будзе ўласцівая лепшым набыткам Бядулі — эпіка і навеліста, які заўсёды імкнуўся да сінтэтычнага, яркага, але і па-мастацку зграбнага стылю.

Здзіўляе і бурны, імпэтны рост ягоны як празаіка. Бадай ці не праз год-два пасля «Абразкоў» ён ужо аўтар такіх па-сапраўднаму класічных навел, як «Пяць лыжак заціркі», «Маленькія дрывасекі», «Гора старога Сымона», «На каляды к сыну», «Летапісцы», «Змарыўся», у якіх зайздросная энергія сацыяльнага абагульнення, лаканізм формы, натуральная і каларытная мова сведчаць пра Бядулю як пра арыгінальнага апавядальніка побач з такімі майстрамі, як Тарас Гушча (Якуб Колас) і трохі пазней — Максім Гарэцкі. Амаль не пакінулі знаку пэўны лірычны надрыў і выяўленчая

фрагментарнасць, што ўласцівыя былі «Абразкам», а на замен з'явілася мастацкая стрыманасць і аб'ектыўнасць, нават «жорсткасць», якая не іначай як ад умення глядзець праўдзе ў вочы, не крывячы душой пісаць пра голад і смерць, пра злачынства і пра суд сумлення так, як пра чалавечы, грамадскі суд. Замярзаюць у лесе «малыя дрывасекі» з аднайменнага апавядання (Бядулеў варыянт апавядання «каляднага»), маці выколвае вочы маленькай дачцэ, каб зрабіць яе прафесійнай пабірахай, жабрачкай («Ашчаслівіла»). Знарачытае згушчэнне фарбаў, меладраматызм? Не, мусіць, не. У В. Стэфаніка, украінскага празаіка, творчасць якога ведаў Бядуля, таксама падзейная «бесчалавечнасць» стасуецца недзе з такой мерай жыццёвай прадвызначанасці і неабходнасці, калі цяжка меркаваць пра ўчынак толькі паводле абстрактнай маральнай меркі, абмінаючы меру сацыяльную («Што запісана ў кнігу жыцця»).

Вопыт, набыты Бядулем-навелістам у гэты перыяд творчасці, усведамляўся, мусіць, пісьменнікам як прынцыпова значны і важны, нездарма ж лепшыя навелы гэтага часу ўвайшлі ў першы паслярэвалюцыйны зборнік «На зачарованых гонях» (1923).

Няпростым было спасціжэнне Бядулем новай савецкай рэчаіснасці, што трывала сцвердзілася ў родным яму краі пасля выгнання белапольскіх акупантаў. Праўда, адразу варта сказаць, што ў жніўні 1920 года Бядуля пачынае працаваць у газеце «Савецкая Беларусь», выступаючы тут як паэт, публіцыст, празаік. Несумненна, што праца ў ёй (1920—1926) сталася для яго сапраўднай палітычнай школай. У артыкуле «Думкі пра беларускі тэатр» ён, напрыклад, пісаў: «Наступіўшая рэвалюцыя ў Расіі вызваліла і нацыянальнасці. Перад імі адкрылася шырокае поле дзейнасці на роднай ніве. Устала на вольны шлях развіцця і беларуская культура».

Бядулю як публіцыста і пісьменніка заўжды вылучала вострае пачуццё гісторыі, якое натуральна жывілася як ужо звыклай для яго цікавасцю да этнаграфіі і фальклору, так і стыхійнай, мастакоўскай схільнасцю да гісторыка-літаратурных рэмінісцэнцый і абагульненняў, калі мелася на ўвазе асабовае і нацыянальнае быццё чалавека ў тым ці іншым гістарычным асяроддзі і гістарычным часе. Да таго ж вопыт гіста-

рычнага процістаяння простага беларускага люду то магнацкаму, то царскаму, то мясцоваму — ад адзінакроўных «паноў» і «падпанкаў», і таму і найбольш абразліваму прыгнёту,— не мог не хваляваць пісьменніка, які на ўласным лёсе і лёсе беларускай і яўрэйскай беднаты пераканаўся ў неабходнасці пастаяннага, не толькі сацыяльнага, але і індывідуальна-псіхалагічнага супраціўлення ўсялякай крыўдзе, ідэалагічнаму дыктату, шавінізму, нецярпімасці. Вось чаму яго, з аднаго боку, прываблiваюць вобразы людзей, моцных духам, бунтароў, чаму яскравае сведчанне Салавей з аднайменнай гістарычнай аповесці (1928), вось чаму, з другога боку, і аповесць гэтая па-рэнесансnаму мажорная, бунтоўная, энергічная, а дзе-нідзе нават і барочная ў сваіх стылістычных перабольшаннях, якія не даходзяць, аднак, да вычварнасці — уся бунт супроць амярцвелага канону, літаратурнага ў тым ліку, а яе гістарычны аптымізм найлепшым чынам сведчыць пра ідэйна-эстэтычную і светапоглядную сталасць Бядулі, які выкарыстоўваў у працы над гістарычным матэрыялам увесь свой вопыт савецкага пісьменніка, узбагачанага практыкай сацыялістычных пераўтварэнняў на сваёй радзіме.

Героі аповесці — прыгонныя сяляне, мсціўца за народнае гора Салавей, а таксама Антон, Каспар, Зоська,— натуры па-жыццёваму актыўныя, сацыяльна сталыя, як нельга лепш адпавядалі духу новага часу. Нездарма аповесць гэтая ў свой час была экранізавана (1937) і карысталася вялікім поспехам у гледача.

Бядуля ўпэўнена ішоў да авалодання буйной эпічнай формай. Яшчэ ў 1920 годзе ён апублікаваў артыкул «Чаму яшчэ няма беларускага рамана?», у якім закранаў як сацыяльна-гістарычныя, так і чыста літаратурныя прычыны таго, чаму ў беларусаў тады яшчэ сапраўды адсутнічаў (не лічачы асобныя спробы, не даведзеныя да канца) раман як жанр, калі не лічыць, зноў жа, паэмы «Новая зямля» Я. Коласа, твора ў пэўным сэнсе раманнага (успомнім прыклад «Яўгенія Анегіна»), які задавальняў менавіта гэтай, раманна-эпічнай патрэбе літаратуры і чытача. Першая частка вялікага рамана Ц. Гартнага «Сокі цаліны» з'явілася ўжо ў 1922 годзе, пазней на два гады пасля публікацыі артыкула Бядулі, а ў тую пару, калі Бядуля пазнаёміў чытача з першай часткай свайго вялі-

кага рамана «Язэп Крушынскі» (1928—1929), маладое пакаленне беларускіх празаікаў (К. Чорны, М. Зарэцкі, С. Баранавых, К. Крапіва) пачало ўжо даволі паспяхова выконваць сацыяльна-літаратурны заказ часу — беларускі раман нарадзіўся. Але «Язэп Крушынскі» нават паводле аб'ёму быў з'явай выключнай на той час — дзве часткі ягоныя маглі скласці сапраўды «эпічных» памераў том.

Вартасці рамана не былі належным чынам ацэнены сучаснай Бядулі крытыкай. Гэта і зразумела. Выкарыстоўваючы ў рамане сацыяльна надзённы матэрыял, ставячы праблему кулацтва, да якой раманіст падыходзіў ва ўсёўзброенасці важкага свайго літаратурнага і жыццёвага вопыту, што належаў не толькі новаму часу, і што, дарэчы, павінна было забяспечыць раману належную меру гістарызму,— выяўляючы выключную здольнасць прыватніка-гаспадара да сацыяльнай мімікрыі, Бядуля, вядома, надзвычай ускладніў сабе мастацкую задачу, як ускладніў, дарэчы, і свае адносіны з тагачаснай крытыкай... Рызыкоўны быў найперш сам выбар галоўнага героя. Крушынскі, гэты пэўным чынам сучасны Чычыкаў, як і Чычыкаў, нажыўшыся некалі на кантрабандзе, стаўшы моцным гаспадаром, трымае ў эканамічным кулаку вясковую беднату, умее ладзіць з мясцовым начальствам і нават навуковымі ўстановамі (усё-ткі «культурны гаспадар»!).

Але пафас рамана паступальны і зразумелы: ідзе барацьба за сялянскую масу паміж Савецкай уладай і кулацтвам, змагаецца новае са старым. Сімпатыі аўтара на баку людзей, што сцвярджаюць новыя, сацыялістычныя адносіны ў вёсцы.

Сённяшняму чытачу, вядома, асабліва прыкметныя, а часта і зразумелыя ў няпростай іх прычыннай сувязі тыя ці іншыя недахопы рамана, часткова выкліканыя і паспешлівасцю, жаданнем не адстаць ад палітычнага моманту, а адсюль у аўтара і трохі спрошчанае ўяўленне пра характар класавых супярэчнасцей, уласцівых таму часу. Гэтая даніна самай гарачай надзённасці, якая скажае іншы раз мастацкую цэльнасць характара, а не жывіць падтэкст, саму псіхалагічную атмасферу твора, вядома, шкодзіць сённяшняму ўспрыняццю рамана. Але затое бясспрэчнае і наватарства Бядулі, выклікае захапленне ягоная мастац-

кая дзёрзкасць. Смела ўзяты ім тып кулака Крушынскага як бы папярэднічае з'яўленню ў савецкай літаратуры такіх вобразаў, як Астраўноў ва «Узнятай цаліне» М. Шолахава і Сторажаў у М. Вірты («Адзінота»). Гэты момант нельга не адзначыць, гэтага патрабуе простая гісторыка-літаратурная справядлівасць.

У рамане «Язэп Крушынскі» былі як бы прыведзены ў рух багатыя, рознабаковыя вартасці таленту Змітрака Бядулі — глыбінны паэтычны лад ягонага мастацкага мыслення, грунтоўная ягоная дасведчанасць па гісторыі краю, цяга да эксперыменту, якая, дарэчы, збліжае яго з Максімам Гарэцкім, аўтарам выдатнага рамана «Віленскія камунары». У рамане Бядулі знайшлі адлюстраванне і эпічны пафас аўтара, і лірызм, і сатыра, і гумар, і майстэрства кампаноўкі разнароднага матэрыялу, і свабода ў выкарыстанні раманнага часу... А пачынаў жа Бядуля, як мы ведаем, з немудрагелістых імпрэсій у прозе!

Першым уласна апавяданнем Бядулі была «Малітва маленькага Габрусіка» (1912), адным з апошніх твораў — аўтабіяграфічная аповесць. «У дрымучых лясах» (1939) — зноў пра дзяцінства. Аповесць-казка «Сярэбраная табакерка», якая напісана ў самы пярэдадзень вайны і нібы сімвалізуе саюз стыхійнай мудрасці маленства з высокім вопытам сталасці, што так добра відно ў любімым пісьменнікам нашым фальклоры,— аповесць гэтая належным чынам завяршае творчы шлях выдатнага мастака слова.

Дыханне карычневай пошасці ўжо атручвала паветра Еўропы. Вайна стаяла ля савецкіх рубяжоў. Жыць пісьменніку заставалася лічаныя месяцы. Бядуля дапісваў «Сярэбраную табакерку» (1940—1941). І на апошняй яе старонцы чытаем: «— Жаўранкі пытаюць,— растлумачыў дзед унучкам,— ці скора скамарохі зноў зловяць смерць у табакерку? Ці скора скончыцца вайна? Ці скора працоўны народ расправіцца з самімі памагатымі Смерці?»

Ці не да нас і ці не да дзяцей і ўнукаў нашых звяртаецца з далечы часу мудры пісьменнік і выдатны патрыёт Змітрок Бядуля?

1985

СПАДЧЫННАСЦЬ

Ва ўспамінах дачкі Гарэцкага Галіны Максімаўны чытаем: «У чэрвені 1936 г. бацька са мною паехаў у М. Багацькаўку. 19 чэрвеня прыехалі ў Смаленск а 7-й раніцы. Пайшлі ў горад. Падняўшыся на гару, ішлі па роўнай вуліцы, злева ўсцяж тратуара зрэдку зялёныя дрэвы. Насустрач групкамі і па адным чырвонаармейцы. Некаторыя мне падміргваюць: «Гэй, курносая!» Глянула сарамліва на бацьку, а ён ідзе справа побач, стройны, дужы, і ўсміхаецца. Крыху вышэй сярэдняга росту, вочы карыя, даволі вялікія, хоць і глыбокія. Усмешка прыгожая, добрая. 42 гады было яму, а мне 15».

Не ўяўляю чытача, у якога не зашчымела б сэрца ад гэтых радкоў: «42 гады было яму, а мне 15». Гэта наша сённяшняе веданне пра Гарэцкага віною таму. Лічы, малады яшчэ чалавек ідзе, амаль дарослая дачка побач, і радуецца звычайнай чалавечай радасцю, хоць і скупа адпушчанай на той час яму, а мы, сённяшнія, ведаем ужо аб той жыццёвай мяжы, якую неўзабаве пакладзе яму лёс. І сэрца ўздрыгвае. І малюнак уздрыгвае і доўжыцца ў часе, нібы стоп-кадр.

А пад канец лета, другога ўжо лета, Гарэцкі прыедзе па дачку ў Багацькаўку. «У канцы жніўня дажджы пачаліся. Паехалі дамоў. На дарогу дзень ясны зрабіўся. На бальшаку, бліз могілак, спыніліся. Бацька пайшоў развітацца з маці. Мы з дзедам на возе сядзелі, чакалі...

А праз два месяцы развіталіся і мы з бацькам, назаўсёды...»

Такое перацінае дых. Пасля ўжо думаеш: многа тут ад самога Гарэцкага, спадчынна-таленавітае і шчодрае. І сціплае ў выказванні. Тактоўнасць душэўная і выяўленчая. І талент выказаць боль.

Максім Гарэцкі быў пісьменнікам «балючым».

Я назнарок паставіў слова «талент» у спалучэнні з болем. Маральнае і эстэтычнае ў мастацтве, прынамсі, у вялікім мастацтве, заўсёды надзвычай цесна знітаванае. Настолькі цесна, што Талстой, бязлітасны рэалізм якога не цураўся ў жыцці і літаратуры «балю-

чага» (смерць, пакуты і г. д.), схільны быў у апошнім перыядзе творчасці адмаўляць правамернасць мастацтва наогул якраз таму, што нібыта яно «боль», дысгармонію чалавечага свету ў канчатковым выніку праз эстэтычнае задавальненне робіць «дазволенымі», а значыць, недзе разыходзіцца з маральным пастулатам і ўпадае ў «грэх». Думка, вядома, крайняя, хоць па-свойму, даведзеная да лагічнай вычарпальнасці, у нечым і апраўданая. І тут ужо адзіны крок да маральнай прапаведзі, да рацыяналістычнага вучыцельства і утылітарызму. Але ж мастацтва, мусіць, нешта трохі іншае, чым проста логіка ці павучанне.

Як сапраўдны мастак слова Гарэцкі таксама «хварэў» на праблемы мастацтва ў адносінах да жыцця. Выявілася гэта ў «Меланхоліі» (1921), у драматызаваным творы «Антон» (1914) і інш. Але ж творы гэтыя менш за ўсё трактаты. Падкрэсліваючы не абы-якую праблематыку прозы ранняга Гарэцкага, менш за ўсё мне хочацца прыцяняць яе сацыяльна-грамадскі змест, а хочацца падкрэсліць толькі заглыбленасць пошукаў пісьменніка, ідэйна-мастацкую і жанравую ўскладнёнасць іх.

У драматычных абразках «Антон» ролю своеасаблівага аўтарскага каментарыя, акцэнтаванага ў адпаведнасці з мастацка-філасофскім рухам думкі, бяруць на сябе Доктар, Маскоўскі дэмакрат, Польскі публіцыст, Тоўстыя, урэшце, Беларускі аўтар, атаясамляць якога наўрад ці можна цалкам з Гарэцкім, бо гэта, урэшце, таксама нейкім чынам персанаж. Драма беларускага селяніна Антона, гэтага своеасаблівага «дэкадэнта» ў мужыцкай світцы, надломленага сваім унутраным жыццём, даведзенага ў стане нейкай духоўнай экзальтацыі да злачынства: ён забівае малога сына, ратуючы нібы яго бязгрэшную душу ад спакус «грэшнага» свету,— гэтая драма перарастае, у рэшце рэшт, у гаворку пра патэнцыяльныя магчымасці селяніна сваімі сіламі перайначыць жыццё, пазбавіцца «ўлады цемры».

Праблемы, якія ўзнімае ў «Антоне» Гарэцкі, сам спосаб мастацкага вырашэння іх, былі новымі для беларускай літаратуры. Твор пісаўся недзе ў адзін час з «Раскіданым гняздом» Янкі Купалы і ўважлівага чытача прымушае задумацца над пэўнай агульнасцю іх генетычных каранёў, па-новаму перажыць драму

купалаўскага Лявона Зябліка і ягонай сям'і. Але гэта ўжо — тэма спецыяльнай гаворкі.

Жыццё бязлітаснае не толькі сацыяльна, яно ставіць перад чалавекам адвечныя праблемы зямнога існавання, дабра і зла, уласнай праўды і праўды агульнажыцця, урэшце, цаны чалавечай праўды наогул — у філасофскім і грамадскім аспекце. Доктар гаворыць: «Я прымаю фізіялогію толькі. Дрэнна мне — значыцца, арганізм мой папсаваўся... гэта адбіваецца на нервах, і ўсё». Або: «Ніякай маркоты сусветнай няма!» Гэта ўжо нешта падобнае сваёй логікай на «натуральны адбор», на той «адбор», што перанесены ва ўмовы сацыяльнай рэчаіснасці і які прапаведаваў заолаг фон Коран у чэхаўскай «Дуэлі», напрыклад. Гэта ўжо нешта падобнае і да ўсёдазволенасці, калі «бога няма», няма маральнай забароны.

Я не хачу праводзіць тут прамыя паралелі з вялікімі творамі рускай і нашай нацыянальнай класікі любой цаной, я хачу паказаць толькі на вышыню і напружанасць аўтарскай думкі Гарэцкага, падкрэсліць яе скіраванасць на найвышэйшыя ўзоры вялікай літаратуры. «Скранулася Беларусь, узварухнуліся яе спрадвечныя імшары, і я з вялікай надзеяй жду беларускіх Дастаеўскіх...» — пісаў Гарэцкі ў артыкуле «Развагі і думкі» ў 1914 годзе. Вось як!

Гарэцкі з высокай думкай і меркай ідзе да народнага жыцця, з гэткім жа ідэалагічным пафасам вядзе ён гаворку і пра беларускую інтэлігенцыю: прыклад — згаданая ўжо «Меланхолія». Можа, тут болей трохі рэфлексіі, свайго, асабістага, можа, інтэлектуалізм Гарэцкага тут болей навідавоку, бо і сама ж тэма «інтэлектуальная». Але душэўная аголенасць Гарэцкага, той нізкі «болевы парог», які вылучаў яго заўсёды, усё той жа. У даследаванні Алеся Адамовіча «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» вельмі хораша сказана пра гэта пры аналізе «Камароўскай хронікі», там, дзе гаворыцца пра смерць Марынкі: «...гэта ўжо як катастрофа, а не прывычнае: «бог даў — бог узяў». Бо з ёю гіне больш, чым жыццё аднаго з камароўцаў. Гіне цэлы свет высокіх імкненняў, спадзяванняў на новае, разумнае і багатае на сэнс і справы жыццё. Вартасць, каштоўнасць жыцця вырасла, расце, а таму і смерць ужо ўспрымаецца, перажываецца інакш: з усімі падрабязнасцямі перажыванняў многіх людзей».

Тут ужо — як бы і пра непасрэдна-мастацкі вопыт Гарэцкага, набыты на шырокім дыханні той жа «Камароўскай хронікі» і «Віленскіх камунараў» — не толькі пра сталае майстэрства, але і пра гуманістычны вопыт, вынесены з сацыяльных бур і пераўтварэнняў. Гэта вопыт новай рэчаіснасці.

Можна па-рознаму ацэньваць два раманы Гарэцкага, можна шкадаваць, што яны доўгі час не былі ў літаратурным ужытку і, значыцца, для ўласна літаратуры не адыгралі ролю своечасовага фермента, не падтрымалі своечасова пошукі хаця б Кузьмы Чорнага ў галіне рамана-хронікі («Бацькаўшчына»). Хто ведае, які накірунак магла б тады прыняць з часам наша эпічная проза, наколькі б далёка і глыбока апанаваў яе грэх шматтомнага апісальніцтва «на пераваде стагоддзяў» — мы, можа, часцей задумваліся б над самой канцэпцыяй сучаснага рамана, можа, нават творчы вопыт ранняга па часе напісання «Антона» падказаў бы нам нешта істотнае. Можа, не стала б такой звыклай пераважная арыентацыя адно на трылогію Якуба Коласа. Праўда, гэта ўсё здагадкі.

Як кажуць, дзякуй богу, што традыцыя Гарэцкага і сёння жыве ў нашай прозе, што творчая практыка нават тых, каго абмінула своечасовае знаёмства з Гарэцкім, пацвярджае плённасць шляху, паказанага вялікім празаікам. У гэтым няма нічога дзіўнага. Літаратура падлеглая заканамернасцям і носіць сама ў сабе іх — выдатны пісьменнік робіць іх навочнымі і гэтым рухае літаратуру, абазначаючы мяжу заваяванага і падбіваючы на далейшы крок. Можа, гэта суб'ектыўна, але, напрыклад, выдатная брылёўская аповесць «Золак, убачаны здалёк» ці не стаіць у рэчышчы традыцый Гарэцкага, напрыклад, «Ціхай плыні» ягонай. Зноў жа, я не кажу пра непасрэдны ўплыў, я кажу пра непазбежнасць прысутнасці Гарэцкага ў вопыце сённяшняй нашай прозы.

А як не стае нам сёння шматфарбнай ягонай палітры! Ягонага высокага ўзроўню «кніжнасці», жывога інтэлекту і ягонай улады над народным словам: тут, у апошнім, ён наш сапраўдны універсітэт, дзе мы так лянотна вучымся, не заўсёды дазваляючы сабе прайсці «моўны семінар» паводле Гарэцкага і ў лепшых нашых празаікаў.

Ва ўспамінах дачкі Гарэцкага чытаем: «У воль-

ныя вечары 1933 года апрацоўваў бацька «Віленскіх камунараў», а мама пасля хатняй працы сядзела да позняга, перакладаючы «Ціля Уленшпігеля» Шарля дэ Кастэра». Цікавае тут збліжэнне! І ці не гэты «шарлькастэраўскі» дух лунае над старонкамі «Віленскіх камунараў», над феерычнай жыццёвай адысеяй беларуса Мацея Мышкі! І ці трохі не па-«гарэцкаўску» смяецца ў «Ніжніх Байдунах» Янка Брыль!

У нас добрая спадчына, паболей бы добрых спадчыннікаў!

1983

ПАКЛОН З ДАРОГІ

Найбольш сталае з напісанага Уладзімірам Хадыкам належыць сярэдзіне трыццатых гадоў, а яго нараджэнне як паэта прыпадае на гады дваццатыя, на перыяд незвычайнага ажыўлення ў нашай літаратуры з выпадку бурнага прыходу ў яе здольнай моладзі ад плуга і варштата. «Бурна» — якраз тое слова, што найбольш стасуецца да тагачаснай грамадскай і літаратурнай сітуацыі. Нездарма ж Купала, звяртаючыся пад тую пару да моладзі, пісаў у вядомым вершы: «Гэй, узвейце сваім крыллем, арляняты, буйна, бурна». «Буйна, бурна» — гэта было якраз з Купалавай лексікі, і пішучы так, гэтак заклікаючы, ён не рабіў над сабой ніякага высілку, тым болей што найперш меўся на ўвазе грамадскі запал самой маладосці, а не тая «слоўная бурапеннасць», эмацыянальная безадноснасць перажывання, што так пашкодзілі, як гэта добра відаць сёння, маладой паэзіі дваццатых гадоў. Але віны самога Купалы тут менш за ўсё. І віны саміх маладых паэтаў тут не так і многа, бо мы ведаем, як не адразу даецца сапраўды н о в а е слова аб н о в ы м, ведаем, як цяжка было маладым, зразумеўшы пагрозу штампу, рыторыкі, слізгання па паверхні з'яў, прабівацца да жыццёвай праўды, да ўласнага голасу. Гэткія ж цяжкасці не абмінулі і У. Хадыку, які напоўніў «бурапенны» і «сонцавейны» слоўнік «маладнякоўцаў» сваімі «буравейнымі далямі» і да т. п.

У. Хадыка пражыў кароткае жыццё, але каб раптам (не слухаецца рука напісаць такое) яму быў наканаваны куды карацейшы век Паўлюка Труса (а яны былі амаль аднагодкі), мы не ведалі б таго выключна самабытнага мастака У. Хадыку, энергічнага ў выказванні, смелага ў вобразным ладзе верша, суровага і адначасна шчодрага ў слове, сагрэтым «пачуццем паэта, думкай грамадзяніна» (ягоны выраз). Вельмі сімпатычна, па-мастакоўску і па-чалавечы прывабна ва У. Хадыкі тое, што кароткі жыццёвы шлях, які ён паспеў прайсці ад «маладнякоўства» да адкрыцця ў сабе ўласна-лірычнай тэмы, ён даверыў сваім вершам, бо быў сапраўдны лірык, чалавек, пад-

леглы «высокой болезни» споведзі і суперажывання, і гэтае Пастарнакава азначэнне паэтычнага стану надзвычай да яго пасуе, паэта, які не прамінуў, дарэчы, вопыту лірычнай шыфроўкі чалавечых перажыванняў у вершах выдатнага рускага савецкага майстра.

Прыгадайце ў Хадыкі хаця б такое:

Не літары, а д'яблы пекла —
Растуць і коцяцца ў радок.
Каб словамі, як шабляй, секла
Старога ходу перадок.

Каб точаным лязом метафар,
Прыняўшы дум маіх прамень,
Перада мной хадзіла шафа,
Як перад сонцам ходзіць дзень.

Гэта ўзровень майстэрства, які не можа не здзіўляць і сёння. Але карані ягоныя, першапачатковыя, спадчынныя, усё ж і глыбей, і бліжэй адначасова. Папершае, гэта, вядома, Купала з ягонай напружанасцю лірычнай гаворкі, з яго смелай, уздымнай, часам нават фантастычнай вобразнасцю. Нездарма і сам вялікі паэт з паэзіі маладых, можа, найбольш упускаў у сваю душу верш Хадыкі — таму ёсць сведчанні. Далей, не абышлося тут, мусіць, і без уплыву У. Дубоўкі ці суперніцтва з ім, што заўважна нават паводле перагуквання на знешне-стылёвым узроўні («крозы», «кармазын» у Дубоўкі, «дэсань», «сузмрок» у Хадыкі і г. д.).

Цікава, што тая паўната лірычнага голасу, тая настойлівая і прынцыповая спавядальнасць, якіх дасягнуў У. Хадыка ў сярэдзіне трыццатых гадоў, загаварыўшы ад імя пакалення на ўзроўні самой духоўнай біяграфіі яго, праз дзесяткі год прыдалася нашай паэзіі пачатку шасцідзесятых, у пару абнаўлення ёю лірычных і вобразных сродкаў, і пераклічкі, хутчэй за ўсё, несвядомыя, тут іншы раз проста ўражваюць. Успомнім такія вось радкі з верша-маналогу У. Хадыкі «За строем дат і рубрык» (1934):

І хай было, што сэрцу не далося,
Што згінула ў гадах, як гук пусты.
Я не засмучаны, што прыйдзе восень
І ацярэбіць дрэвы і кусты.
Душа такой штогодняй змене рада
(Хай ў ёй свой лёс варожы зброд кляне!),
І пад суровы вецер лістапада
Мне добра жыць у роднай старане,—

і ці не здадуцца яны вам эпіграфам да «Штодзённага лістапада» (1961) С. Гаўрусёва, настолькі ў гэтых радках знойдзена ўжо як і сама задума сучаснага паэта, так і вобразны ход паэтычнай думкі, і нават рытмічны лад верша. І гэта тым больш дзіўна, што пра нейкае простае запазычанне тут наўрад ці можа ўзнікаць гаворка. Проста другі паэт, заўважым, таленавіты паэт, у пару, калі справядлівасць стала надзённай патрэбай, унутрана спасціг яе, як бы надтачыў ланцужок, забыты ў трыццатых гадах, звёнамі песні новага дня. Скажыце пасля гэтага, што ў паэзіі не існуе пераемнасці нават у тым выпадку, калі яна наяўна і адразу нават не ўсведамляецца!

Той «з краінай кроўны дагавор», тая «частка ўлады», грамадзянскай і паэтычнай, пра якую пісаў У. Хадыка ў вершы «Сякуць падкованыя коні» (1932), дазвалялі яму быць гранічна шчырым як з уласным сумленнем, так і з уласным вершам, пра што б ні пісаў ён: пра родную вёску, пакінутую дзеля горада («І шкода мне было сяла і музыкі жытнёвай вобак»), пра абвастрэнне класавай барацьбы ў родных яму мясцінах, дзе старое агрызалася «куляю з абрэза, злосцю падкалоднаю». У. Хадыка менш за ўсё спакушаўся воклічным публіцыстычным вырашэннем балючай для яго тэмы. З яго вершаў пачатку трыццатых гадоў паўстае складаная гама пачуццяў чалавека, які не бяздумна перажывае «вялікі пералом» у вясковым жыцці, усё яшчэ блізкім яму, ужо гараджаніну,— тут і спроба задушыць у сабе ўспамін пра вёску («Скрухі старая плойма згіне, спадзе, забудзецца»), і знарачытая гаворка пра вёску як пра нешта пераадоленае, пазбытае: «Мой смутак навекі сатлеў» і г. д. Драматызм жывога чалавечага перажывання павяраецца потым цвярозай развагай пра мінулае вёскі, пра свае спадчынныя карані:

Ускапаю дзедаўскі дрывотнік,
Па каліву перабяру...

Там, у старой вёсцы, заставаліся бядота, асуджанасць на цяжкую, беспрасветную працу, на хцівасць і сквапнасць («Кіямі баранілі людзі мяжу натрапленай зямлі»), але ж там былі і ўцехі, першапачатковае адкрыццё прыгажосці свету, прыроды, паэзіі чалавечых адносін, як гэта цудоўна пасведчана ў ра-

нейшым, бадай, хрэстаматыйным цяпер вершы «Снапок аўса»:

Мне сказала маці: выжні
Ты цялятам асакі...
Калыхаўся ціха здрыжнік
Ля блакітнае ракі.
. . . .
Па дарозе невядомай
Беглі кветкі і раса...
І да матчынага дому
Я прынёс снапок аўса.

Вядома, У. Хадыка па спосабу рэалізацыі сваіх паэтычных уяўленняў і адчуванняў быў найперш лірыкам, менш за ўсё схільным да адкрытых публіцыстычных трансфармацый сваіх развагаў пра час у нейкую ўскладнёна-жанравую, сюжэтную сістэму, як гэта рабіў блізка таго часу, напрыклад, У. Дубоўка, вынайшаўшы нават нейкі сінтэтычны жанр «камбайна». Хадыку быў звычней верш-маналог або цыкл вершаў, як згаданыя раней «За строем дат і рубрык», або прываблівалі вершы, якія можна было проста пазначыць цыклам («Пяць вершаў», 1936). Гэты цыкл належыць да нейкай новай паласы ў творчасці паэта. Пасля лірычных бураў пачатку трыццатых, пасля добра відочнай спрэчкі ■ самім сабой і са сваімі настроямі і пачуццямі, якія ён хацеў бачыць ■ «думкамі на ўзровень» («Ручаі ў адталай глебе», 1934), ён прыходзіць да ўсведамлення гістарычнай урачыстасці здзейсненага народам у сучасным паэту дні:

Мы ведаем усё, што робім,
На гранях дзей праводзім век.
У гэтым сэнс вялікай спробы
Знаходзіць новы чалавек.

Таму і нашым сніцца зорам
Блакіт нябачаных паэм,
У каторых проста мы гаворым
Аб тым, што маем, чым жывем.

Або:

Усё больш агніста сонца свеціць,
Усё больш радней удаль дарога.
Усё больш і больш у нашым свеце
Здаровага і маладога.

Так Хадыка пісаў у 1936 годзе. Характэрна, што гэты настрой лагоды, усцешанасці зробленым прабі-

ваецца ў вершах таго часу як бы здалёк пачутай мелодыяй трывогі, можа, нават небяспекі, што выспявала ў хмарах, якія пачыналі наплываць з захаду.

Помнім толькі адно, што зацішак
Перад громам бывае часцей.

У тым жа 1936 годзе Хадыка піша верш «Рэвалюцыі салдат», падрахункавы для яго, для яго пакалення, і ў ім зноў жа прадчуванне будучых выпрабаванняў для сябе і для краіны: «Пройдзем мы гатовым строем, скінем шапкі перад боем». Так, ці то былінна, ці то святочна-ўрачыста, малявалася яму будучая вайна, паўставалі будучыя выпрабаванні. Яны прыйшлі — непараўнана трагічныя для самога паэта, суровыя, неверагодна цяжкія для ўсёй краіны, калі ў полымі ваенных пажараў, здавалася, не відно было золаку новага дня... Але новы, мірны дзень заняўся ўсё ж для краіны, чорныя хмары адплылі на захад, каб праліцца там апошнім свінцом пераможнай для нашага народа вайны. Гэтага У. Хадыка не ведаў, гэта ён прадчуваў:

Чужога свету ляжа прах,
Свой чорны марш дасніць ў магіле.
Ёсць час, катораму ў вяках
Не зналі роўнага па сіле!

А мы, чытаючы сёння гэта, перабіраючы ў думках кароткі жыццёвы і паэтычны шлях У. Хадыкі, задумваючыся над пасмяротным лёсам ягонага радка, міжволі ўспамінаем трохі зажураны, але такі вабны, такі светлы голас яшчэ дваццацігадовага тады лірыка:

Паклон з дарогі, паклон з далёкай
Чужым і блізкім — паклон, паклон...
Да зараніцы залатавокай
Іду ў прывабны, іду ў палон.

Гэты палон быў ягоным вызваленнем. Паэт зведаў яго, каб вярнуцца, каб жыць з намі і для нас, ягоных чытачоў, у новым пакаленні. Не цяжкі і для нас гэты палон.

1985

МУЖНАСЦЬ ДА КАНЦА

Не бяруся сказаць, хто з іх — Пушкін з трывожлівай слодыччу верша ці Талстой з нечуванай нават для дзіцяці прастатой сваёй апавядальнай інтанацыі — прыходзіць раней, але здаецца сёння, што для цябе і аднаго дня не было, не пазначанага безумоўнай, прадвызначанай уладай слова і думкі яснапалянскага празарліўцы. Гэтая ўлада, вядома, ад той пары, калі ты, як ягоны Пілінка са школьнай чытанкі, вусцішна і забабонна даверыўся ўпершыню таямнічай уладзе навукі, што ўся для цябе засяродзілася ў таямніцы друкаванага слова.

«Нечуваная прастата», нейкая звышінфантыльнасць нават мастацкага мыслення Талстога, ягонага слоўнага ладу захапляе нас ужо і дарослых у так званых дзіцячых апавяданнях пісьменніка. І не толькі. Такое ўражанне бывае і ад старонак «Вайны і міру». Ты са здзіўленнем заўважаеш, што сівабароды вядун Талстой як бы і наогул не давярае «дарослацці». Часам ён як мастак і наогул выключае «дарослае» ўспрыняцце. Навошта ён робіць гэтак? Ці не таму, што бачыць, як «дарослацць» дарослых увачавідкі робіцца маной, крывадушнасцю, фальшам?

На ўменні пазнаваць з'яву, падзею, прадмет, як бы даверыўшыся першаму позірку і ўражанню, абмінаючы інерцыю звыклага ўспрымання, вызваленне думкі, пачуцця і зроку ад тых аберацый, што спараджаюць традыцыя ці мода,— вялікая сіла маральна здаровага, паўнакроўнага мастацтва Талстога. Гэтую асаблівасць бачання геніяльнага мастака слова літаратуразнаўца В. Шклоўскі назваў «остранением» (спецыяльна вынайдзены тэрмін), а ў больш шырокім сэнсе ў свой час У. І. Ленін пазначыў як «срывание всех и всяческих масок».

Менавіта «дзіцячыя» першапачатковыя пытанні ўвесь час задае нам Талстой. Спадзеючыся, што, адказваючы на іх, цяжэй нам будзе зманіць перад праўдай і перад сабой. Талстому і трэба гэтага. Як бы паддаючыся наіву, ён дасягае надзіва вялікай выкрывальнай сілы.

Талстой жорстка спрачаўся з сучаснай яму цыві-

лізацыяй. Вялікаму старому яна здавалася то пачварна разбэшчанай, то невылечна хворай. Ён абвінавачваў яе ў невыносным прыгнёце чалавечага духу, у тым, што сучаснае яму жыццё аддалілася ад гуманістычнага ідэала. Талстой не прымаў ваяўнічую буржуазнасць свайго веку гэтак жа, як і буржуазнасць створанага ім мастацтва. У роспачы Талстой абвяргаў нават права самога мастацтва наогул на існаванне ў чалавечым грамадстве. Гэта было занадта, бо і сам ён не мог «без мастацкага» (ягоныя словы). Вось чаму ад мастацтва ён хацеў тымчасовага, непасрэднага ўздзеяння, ён клікаў яго на подзвіг дабра і звяртаўся да казані, пропаведзі. Ён быў нецярплівы. Ён баяўся быць наіўным, калі марыў пра змову сумленных і добрых людзей супроць процьмы людзей зла і тых жахаў, віною якіх яны былі, ён здзіўляўся, чаму людзі добрай волі часта бываюць бездапаможныя.

Думка пра чалавецтва, якое вырашала б свае праблемы словам, а не зброяй, была ягонай пастаяннай і самай задушэўнай думкай.

Захоўваючы духоўную, маральную мужнасць да канца, чалавек пераможа. Вырасце ў цане ягоная годнасць. Чалавек пасмяецца з забойцаў і крыўдзіцеляў. Якое ўжо там «непраціўленства»! Талстой, можа, не заўважаў, што пярэчыць самому сабе, ці, можа, не здолеў, на наша шчасце, забіць у сабе «мастацкае». Дух Хаджы-Мурата, нягледзячы на ўсё, моцна жыў у ім, жыла ўпартая сіла дзядоўніка, вобраз якога натхніў яго на думку напісаць, ужо старым чалавекам, адну з самых выдатных сваіх мастацкіх рэчаў.

«Ён сабраў апошнія сілы, падняўся над завалам і стрэліў з пісталета ў чалавека, што бег на яго, і пацэліў. Чалавек упаў. Потым ён зусім вылез з ямы і з кінжалам пайшоў наўпрост, цяжка кульгаючы, насустрач ворагам. Пачулася колькі стрэлаў, ён захістаўся і ўпаў. Колькі чалавек... з урачыстым віскам кінуліся да абрынутага цела. Але тое, што здавалася ім мёртвым целам, раптам заварушылася. Спачатку ўзнялася акрываўленая, без папахі, голеная галава, потым узнялося тулава, і, ухапіўшыся за дрэва, ён узняўся ўвесь. Ён такім здаўся страшным, што тыя, што падбягалі, спыніліся».

Здаецца, яшчэ Пушкін казаў, што слова пісьменніка ёсць ужо ўчынак яго. Ён меў на ўвазе слова «ма-

стацкае» ў першую чаргу, тое слова, якога часам нібы саромеўся Талстой. Як нам пашанцавала ўсім, што прапаведнік не перамог у Талстым уласна мастака! Што ён не зведаў трагедыі Гогаля... не, не сказаць каб зусім, але не ў такой ступені.

П. А. Сяргеенка пакінуў нам запіс размовы з Талстым (1902) — «Расказвае, што скончыў сёння «Хаджы-Мурата». Я кажу — «Вы, вядома, гаворыце ім што-небудзь?» — «Не, уявіце, мяне захапіў выключна мастацкі бок». О, гэтая шчаслівая талстоўская непаслядоўнасць!

Ён верыў усё ж Пушкіну — найперш мастацкае слова ёсць учынак пісьменніка!

1978

НЕ ІНАЧАЙ ЯК ПОДЗВІГ ДУШЫ

Блок быў чалавекам наканаванага лёсу. Выпакутаванага гістарычнага лёсу. Яго славутыя «Дванаццаць» — не выпадковасць, гэта натуральны вынік пакутліва-плённа пражытага і пакутліва, але сумленна і хораша, узнёсла-трагедыйна асэнсаванага жыцця. Ён жыў і тварыў на рубяжы стагоддзя. Гэта сёння нам шмат што відно на адлегласці — Блоку трэ было быць праразарліўцам. Здзяйсняць подзвіг жыццёвы і літаратурны. Магчыма, ён не думаў пра сябе так, яму зручней было гаварыць пра «лёс» — таму што заўжды, і заўжды пакутліва, адчуваў сябе заложнікам нейкіх непазбежных, надзвычайна важных, прароцкіх змен у акаляючым жыцці. І не толькі заложнікам, але і прарокам, і ахвярай выкупляльнай, і «дзіцём», што з'явілася на гэты свет пры світальных водбліскаx яшчэ нікім не знанай зоркі.

Гэта толькі на першы погляд такое можа здацца вычварным і недарэчным, але гэта, акрамя ўсяго, яшчэ найлепшым чынам і ў стылі «блокаўскага» часу, які хацеў здагадацца пра будучыню бадай што любой цаной, нават містычнай. У тым часе ўрубелеўскі «Дэман нізрынуты» завяршае свой лёс — у трывожлівых водбліскаx вечаровых барваў, у роспачных мод лах апошняй сінечы, што ніяк не хоча паміраць і нішчыцца. Яна крычыць, моліць некага, гэтая сінеча, бо яна няйначай як заложніца, а мо і выкупленне апакаліптычна непазбежных катастроф, што здзяйсняюцца на зямлі, у тым будзённым свеце, дзе «по вечерам — по вечерам скрипят задумчивые болты, подходят люди к воротам», у свеце з ягонай «пылью переулочной», з «лошадкой бурою», што шчымліва-пакорліва ў непагадзь «гуляет на дворе», з азызлым, страхавітым трупам тапельца на беразе Нявы, з бальзамінкамі за паркалёвымі фіранкамі, дзе «человеци мнози» пакутуюць лёсамі мармеладавых. Ён надта разумеў усё гэта, Блок, усёй здольнасцю сваёй балючай душы — і не без дапамогі, вядома, вопыту папярэдняй літаратуры, якая для яго заўсёды была больш чым проста літаратура. Ён мысліў паняццямі культуры і разумеў, што старая «культура» гістарычна асуджа-

на. Ён літаральна выпакутаваў сваю сучаснасць, але вымушаны быў гаварыць пра яе мовай «темной». Вуліца яшчэ «корчилась, безъязыкая», як хараша сказаў пра той час Маякоўскі. Блоку нават пасля «Дванаццаці» трэба было напісаць «Катыліну», каб яшчэ раз пацвердзіць зваротам да гэтай адыёзнай асобы часоў «римского упадка» непазбежнасць пагібелі старога свету.

Будет день — и свершится великое,
Чую в будущем подвиг души.

Ён сказаў гэта яшчэ маладым паэтам.

Ён здзяйсняў свой подзвіг паслядоўна.

Вось я ўспомніў: Б. Салаўёў, які шмат зрабіў для разумення сучасным чытачом Блока, назваў сваю кнігу пра вялікага паэта — «Подзвіг паэта».

І мы сапраўды зноўку і зноў, спасцігаючы паэта праз час, праз высакародства яго пазіцыі, якая вырастала з разумення часу па-мастацку, а значыць, і грамадску зацікаўлена і *публічна*, разумеем ягоны высакародны вокліч —

Слухайце Рэвалюцыю!

Так, кажучы ягонымі словамі, «с миром утвердилась связь».

1980

ЧАСОЎ БЫЛЫХ І НОВЫХ СУВЯЗЬ

Ці так неабходна задумвацца, наколькі паэт бывае падобны на створанае ім? Даволі часта неадпаведнасці бываюць ашаламляльныя, спачатку яны спараджаюць наша недаўменне, разгубленасць, але, бывае, міраць з сабой пасля разважлівай здагадкі пра магчымасць парадоксу, нечага накшталт «пока не требует поэта» і г. д.— і тады нас робіць памяркоўнымі ўласны наш вопыт, нашы ўласныя кампрамісы з жыццёвай прозай, і мы шчыра і велікадушна даруем паэту гэтую «ману» дзеля вышэйшай праўды, якую нясе ў сабе ягоная творчасць. Але бываюць выпадкі надзіва блізкага супадзення слова з самім чалавечым, аж да знешняга аблічча, вобразам творцы, і тады нам адкрываецца вялікая сіла ўнутранай, духоўнай цэльнасці, сутнаснай каштоўнасці чалавека, што жыве ў ім і ў аднолькавай ступені ўладарыць над учынкам паэта і ягоным вершам.

Ужо колькі гадоў, як у чалавечым нашым асяродку няма Аляксея Пысіна, і хоць шмат каму, хто ведаў яго, ён яшчэ ўяўляецца жывым, усё ж бачыцца ён неяк інакш, нібыта ў ценю ці водбліску сваіх вершаў,— і такім ён застанецца, мусіць, і для новых сваіх чытачоў, якія будуць спасцігаць праз ягоную творчасць суровую праўду часу, што ўзрасціў паэта, чалавека і воіна. Нездарма ён сказаў некалі пра сябе:

З той мяжы няблізкай я належу
Ў пэўнай меры — не адным жывым.

Не, цяпер толькі жывым, бо нават тыя, іншыя, якіх ужо няма, жывыя цяпер толькі ў нашай, сённяшняй, непагаснай дзякуючы паэту памяці. Як жывы і сам паэт, адзіны ў сваёй непадзельнай сутнасці чалавека і воіна, у непарыўнасці свайго біяграфічнага і паэтычнага вопыту.

У нататцы «Пра сябе» Аляксей Пысін пісаў: «Семнаццацігадовым пакінуў я дарагія сэрцу родныя мясціны. Пясчаная дарога са слупамі і правадамі перадала мяне вялікай жыццёвай дарозе. Прабач, дарога, што не так ужо часта сустракаўся з табой. У гэтым мая і не мая віна. Давялося зведаць многа іншых дарог...»

Галоўнай дарогай была вайна. Як паэт Пысін не ўяўляецца без гэтага вопыту. Як не ўяўляюцца па-за гэтым вопытам і іншыя ягоныя паэтычныя і франтавыя аднагодкі... Вайна доўга не адпускала іх і непазбежна вяртала да сябе, нечакана заспяваючы ўсё на новых і новых жыццёвых рубяжах. І такой уладнай была яе памяць, так настойліва і не ў час яна клікала да сябе, прымушаючы зведаць то сумненне, то роспач, што абыходзілася не без немалой унутранай барацьбы перад тым, як даверыцца ёй, спасцігнуць правату гэтага настойлівага яе поклічу. «І з нейкага часу я перастаў баяцца папрокаў: «Ці не даволі пісаць пра вайну?» Мінулае наша гэтак жа неаддзельнае ад нас, як і будучае. Тое, чаго не пісаў я раней, павінен напісаць цяпер, у новым асвятленні і асэнсаванні, ведаючы, што ніхто гэтага за мяне не зробіць...»

Але да гэтага «цяпер» быў доўгі час спроб, сумненняў, а то і простага паўтарэння звычных канонаў «мірнай» пасляваеннай тэматыкі. Пысін разам з тагачаснай паэзіяй не засцярогся ні кволасці верша, ні эклектычнасці і непераборлівасці пры асэнсаванні жыццёвага матэрыялу. Але... Згадваецца, тады моднымі былі паэтычныя мініяцюры, і вось у Пысіна паяўляецца «дуб стары ў даліне, дзе акопы зараслі травой», і дубу гэтаму аднойчы стала балюча, бо

...незнарок ў асколак міны
Грукнуў дзяцел дзюбаю сваёй.

Просценькі вершык, пазначаны 1953 годам, падобны на шмат якія, што з'яўляліся ў той час, але разам з тым яго не назавеш выпадковым. Не, ён застаўся гэтак, як і славуты «Вузел», напісаны нават раней, з яго вобразам мяча, які не здолее рассеч вузел кроўнай еднасці з роднай зямлёй інакш, як закрануўшы самае сэрца. Меч тут, вядома, умоўны, як і «даліна» ў згаданым «Дубе», але пачуццё паэтава выпакутаванае і глыбокае. Пра цану, заплочаную за гэтае пачуццё, паэт на поўны голас скажа пазней, у вершах шасцідзесятых гадоў, дзе салдаты-пехацінцы зусім натуральна названы «маршаламі атак» — новая, здабытая часам мера як дэмакратызму, так і патэтыкі самога подзвігу.

І дуб з даўняга верша Пысін успомніць пазней, у 1966 годзе, зрабіўшы ўжо ўражлівы прарыў да «радавой» праўды вайны,— успомніць у маленькім, як

і той «Дуб», вершы «Жолуд», зробленым не паводле канонаў аб'ектыўна-стрыманай мініяцюры, а лірычнай споведзі. Скажа гэтым лірычным вершам пра набытае права гаварыць пра сябе, як пра другіх — ад імя другіх і за другіх, хто не дажыў ці да самой перамогі, ці да сённяшняга дня. Жолуд там у яго не проста прарасце, а ўзарвецца — успамінам, што абпальвае, як асколак ці куля.

У вершы «На лугах зіма туманы сушыць...» (1965) — зноў зварот да быліннага абагуленага асэнсавання вайны:

Над пагостам чорны воран кружыць,
Той, што помніць трох багатыроў.

Здаецца, і славуты верш Міколы Сурначова «Ляжыць ён, як віцязь, у стаптаным жыце...», напісаны ў горкія дні адступлення, не забыты тут.

Але канцоўка пысінскага верша нечакана звернута да самога паэта, да таго, што адбываецца ў ягонай душы, і як псіхалагічна дакладна для салдата, які столькі разоў бачыў смерць, праявіць раптам гэткую вось «слабасць»:

Кружыць воран — папрашу суседа,
Каб з бярданкі ворана забіў.

А чаго вартая гэтая «цывільная» паляўнічая бярданка!

У тым жа 1965:

На жалезным кастры самалёта
Ў сорак першым таварыш згарэў.
Дзень памінкаў — такая спякота:
Салаўі асыпаюцца з дрэў.

Гэта ўжо сказана стрымана-эпічна, баладна, бясстрасна быццам, але наўрад ці станем мы вінаваціць паэта за гэты «жалезны», але ўсё ж такі цудоўны (о спакуса мастацтва!) касцёр і сіняву, бясстрасную сіняву, што «парашутам раскрытым» над «полем і жытам», а сам помнік, «бы той парашут», няйначай як «на стропах бяроз». Смеласць мастацтва. Загадка меры ягонай суаднесенасці з жыццём. Чым аб'ектыўней, тым большае ўражанне. Неяк так гаварыў празаік Чэхаў.

І тут жа, побач, у другім вершы, напісаным у тым жа годзе, лірычная натуральнасць расчуленасці і ла-

годы, здольнасць на душэўную сціпласць і самаабмежаванне:

Верталёт — анёл жалезны
Душы нечыя
                    узнёс.
Я душою незалежны
Ад бязвоблачных нябёс.

Бачыў сосны, бачыў пальмы,
Бачыў чорныя палі.
На зямлю дзяды упалі,
Каб унукі прараслі.

Не сузіральнасць, не, а мудрая прасветленасць пачуцця, за якім веданне і трагічны вопыт, пераадолены высокім напружаннем душы, яе парывам да суладнасці і дабра. Паэтава элегічнасць зразумелая нам, бо ў ёй вышыня жыццесцвярджэння, што бачыцца нам праз намітку светлай журбы пра хуткаплыннасць чалавечага на зямлі, немітуслівая думка пра чалавечы свой падрахунак на схоне дня. Паміж гэтымі полюсамі настрояў, што знаходзяць то абагулена-баладнае выяўленне, то гучаць, разам [illegible] тым, як прасветлена-лірычны зварот да явы заўтрашняга дня, дзе не будзе месца вайне, а будзе прастор для мірных здзяйсненняў «унукаў»,— цэлы пласт застарэлага, зляжалага салдацкага болю, тая сапраўды пысінская лірыка «акопнай» праўды, сціплага салдацкага подзвігу, што зрабіла ягоныя імя і слова непаўторнымі ў паэтычным сведчанні ягонага пакалення аб вайне.

Памятныя нам шасцідзесятыя гады... Прыкладна ў той жа час і Пімен Панчанка, які сказаў ужо сваё слова пра вайну ў час самой жа вайны, зробіць нібы другі «віток» вакол балючай яму тэмы, напіша свае «Апельсіны» (1965), дзе жорсткае поле вайны паўстане ў яркіх экзатычных колерах, у лушпінні ад трафейных апельсінаў, сярод якога мёртвыя аднапалчане спалі на снезе «ў аранжавых садах». Гэты пшчымлівы і адначасна прасветлены смутак — непазбежны вынік успамінаў пра падзеі, аддаленыя ў часе. Смутак робіць і самую трагедыю больш асэнсаванай і больш чалавечнай, па-паэтычнаму мірыць нас з ёй, складаючы ёй развітальную песню. Ці не так і ў Пысіна ў вершах пра канкрэтнага сяржанта Ігнацьева, які матыў «Сямёнаўны» — «вёў ад смаленскіх бальшакоў»?

Чарнеюць спаленыя дзюны,
Чарнее глыба валуна.
Парваныя сцякаюць струны:
Сямёнаўна,
Іванаўна...

Нават каб Пысін не напісаў нічога іншага, акрамя гэтых радкоў, ён застаўся б у нашай паэзіі, бо гэта сапраўдны шэдэўр, бо гэтым «парваным» струнам няма цаны, як і гэтай «Сямёнаўне», за якой стаіць зусім не песенная Іванаўна.

Які вопыт, чалавечы і паэтычны, спатрэбіўся Пысіну, каб выдыхнуць гэта?

А мы ж ведаем у Пысіна і іншыя шэдэўры, аб якіх ішла ўжо гаворка, ведаем і «Іван-чай» — верш пра кветку, што прарасла на чырвоным ад крыві полі бою:

Не, Іване, з чаем пачакаем,
Закурыць не лішне нам было б.

І верш пра тую ж зацяжку маршанскай махоркай перад боем, верш з неверагодна пранізлівай канцоўкай:

Ведайце, калі мяне не стане:
Я ў сваю дывізію пайшоў.

Ведаем, помнім, будуць ведаць і помніць і пасля нас, чытаючы цудоўнага, строгага паэта Аляксея Пысіна.

Даўно, калі вучыўся яшчэ ў Новаельнінскай школе, што недзе ў дзесяці кіламетрах ад маёй вёскі, але ўжо ў другім, не маім Слаўгарадскім, а Краснапольскім раёне, я, здаецца, і не здагадваўся, што амаль побач са мной, у раённай газеце, працаваў Аляксей Пысін. Але Пысіна-паэта я ведаў па альманаху «Літаратурная Магілёўшчына», дзе быў змешчаны ягоны «Вузел» — яго дык я ведаў на памяць. Вядома, значна пазней, праз гады, па-сапраўднаму пачаў мне адкрывацца паэт Пысін, у нечаканасцях і супярэчнасцях свайго далёка не простага росту. Спачатку ў «Сінім ранку» (1959), зборніку, які чытаў з зямляцкай зацікаўленасцю, яшчэ, здаецца, не ведаючы аўтара асабіста, і асабліва ў «Маіх мерыдыянах» (1962), дзе, акрамя ўсяго, як любога чалавека, неабыякавага да сваёй «малой» радзімы, мяне кранулі «Баркалабаўскія салаўі». Пра гэта я не запазніўся і напісаць недзе, ведаючы ўжо і аўтара, і некаторыя абставіны ягонага

літаратурнага і жыццёвага лёсу. Сустракаліся, вялі гаворкі. У яго былі тыповыя «ўсходнебеларускія» характар і аблічча; на першы погляд, нібыта і «праставатыя», па-жыцейску безабаронныя нейкія, кідаліся ў вочы ціхмянасць і сціпласць, але пасля ты пачынаў разумець, што ўсё гэта грунтавалася на ўнутранай значнасці, змястоўнасці і сваёй праўдзе, а не на чым-небудзь іншым, што аднойчы назаўсёды падалося яму непатрэбным і не вартым чалавека. Побач з памяркоўнасцю і дабрынёй упартасць моцна сядзела ў ім, але толькі не ўпірлівасць, тая, што ад самаўпэўненасці, марнаслаўства, нецярпімасці,— менавіта ўпартасць, тая, што ад перакананасці і прысутнасці сапраўднай сумленнасці. Іначай гэта можна назваць духоўным і душэўным высакародствам. І сваю прыналежнасць да «малой» радзімы ён адчуваў пранікнёна, немітуслівa і глыбока.

Лугоў зялёнае міжброўе,
Вада — славянскай сінявы.
Мне кожны колас Прыдняпроўя
Жадае добрага здароўя
Паклонам русай галавы.

Трапятлівым было ў Пысіна вяртанне да вытокаў сваёй свядомай памяці. Пачуцце «кораня», «вузла» заўсёды было ў яго нейкім па-асабліваму шчымлівым і не без журблівага прадчування азвалася і ў апошняй ягонай кнізе — «Ёсць на свеце мой алень» (1978). Крытык Р. Бярозкін у прадмове да двухтомніка выбраных твораў паэта, маючы на ўвазе накірунак творчага пошуку апошняй пары, адзначаў абвостраную цікавасць паэта да «аб'ектыўнай, прадметнай» тэмы, у прыватнасці, да верша-партрэта і псіхалагічнай характарыстыкі. І называў вершы і пра дзядзьку паэта Дзям'яна Пятровіча, і аб Петрусю Бядуліну — «першым вядомым паэце ў сваім Краснапольскім раёне». Вельмі трапна гэта заўважана крытыкам. А я ў гэтай сувязі сказаў бы, што дума пра сваё, роднае, пракаветнае ніколі не пакідала Пысіна, ён думаў пра гэта і тады, яшчэ ў пяцідзесятыя гады, калі пісаў свой «Вузел», і ў 1963 годзе, калі на адным дыханні вымавіў свой просценькі, але такі праўдзівы нават у драбніцах, па-сапраўднаму сыноўні верш «Магілёўская гаворка»:

Не пазнаю вас у маўчанні,
Сябры мае — магіляўчане.

Ды усюды з вамі ў звонкім ззянні
Ёсць слова дарагое — сянні.
— Куды, сусед, хадзіў ты сянні?
— Мядзведзя пасвіў па аўсянні.
Не раз былі з табой спатканні,
Як полаз, выгнутае — сянні.

У вершы, прысвечаным земляку-паэту С. Гаўрусёву, ён скажа:

Мне ў жыта хочацца ўвайсці,
Мне вечнасцю здаецца жыта.

І там жа — пра «чуйны провад саломы» (словы, такія натуральныя для франтавіка), пра тое, што «гудзе жытнёвы провад мой — часоў былых і новых сувязь».

Паэт надзвычай сціплы, па-сапраўднаму дэмакратычны, Аляксей Пысін з усім на тое правам сказаў гэтак пра сябе, пра слова сваё і пра чытачоў сваіх, сённяшніх і будучых.

Няхай доўжыцца сувязь часоў былых і новых!

1984

СЛУЖЭННЕ

Хоць і можна зразумець пісьменніка, калі ён кажа, што ягоная біяграфія цалкам памяшчаецца ў кнігах, чытач неахвотна верыць гэтаму, дамагаючыся ўсёй даступнай яму праўды пісьменніцкага быцця. Любімы пісьменнік дарагі яму літаральна кожным радком, ці то накрэсленым у не прызначаным для друку сяброўскім лісце, ці то тым, што стаўся дзённікавым запісам, таропкай дзелавой запіскай або выпадкова мімалётным аўтографам. Грэшна было б бачыць ва ўсім гэтым тольκі нейкую непераборлівасць або ўсяяднасць. Такая цікавасць няйначай як сведчанне высокага прафесійнага ўзроўню самой літаратуры, здабытай ёю публічнасці, якая, выключаючы ўсялякую ананімнасць, натуральна акцэнтуе чытацкую ўвагу на яркіх творчых індывідуальнасцях. Не апошнюю ролю адыгрывае тут, вядома, і пэўная таямнічасць творчага акта наогул, разгадку якога заканамерна шукаць найперш у самой асобе творцы. Вось чаму па-асабліваму прываблівыя тыя публікацыі, дзе аўтар свядома ідзе на непасрэдны кантакт з чытачом, дзеліцца сваімі думкамі аб сучасным яму жыцці, выказваецца аб сваёй працы і працы таварышаў.

Выходзячы да чытача з новай кнігай літаратурна-крытычных артыкулаў, нататкаў, эсэ «Трохі пра вечнае», Янка Брыль палічыў патрэбным падкрэсліць: «У прадмове да зборніка «Роздум і слова» (1963), апраўдваючы свой кніжны дэбют у жанры крытыкі, я гаварыў, што работу такую ніколі не рабіў між іншым, мімаходзь, і таму «прапаную яе чытачу як сваё». Цяпер, аддаючы на суд грамадскасці другую кнігу выказванняў па справах найдаражэйшых і для мяне, магу толькі паўтарыць сказанае раней».

Гэты тон апраўдальнасці і адначасова настойлівага падкрэслівання можна зразумець, калі прыгадаць насцярожанасць, з якой сустракаліся калісьці спробы пісьменніка распачаць непасрэдную гутарку з чытачом. Не абыходзілася без папрокаў у суб'ектыўнасці, у другараднасці акцэнтаў, у прафесійнай гардыні навват. Маўляў, на інтэрв'ю, на газетную натку, на анкету пісьменнік прэтэндаваць можа, але каб збіраць усё

гэта ў кнігу?.. Ці не лепш пачакаць тут суда і рашэння нашчадкаў?

Але ж для пісьменніка жыццё ва ўзаемадзеянні з мастацтвам — гэта сапраўды с в а ё. Гэта паветра, якім ён дыхае, гэта атмасфера, што спеліць і жывіць задумы. Гэта спосаб існавання, лінія чалавечых і грамадскіх паводзін. А для чытача яшчэ — нагляднае, жывое ўвасабленне пульсацыі самой матэрыі культуры. Вось што такое тое, пра што Янка Брыль падкрэслена гаворыць, як пра с в а ё. Не сумняваючыся, што толькі так яно можа стаць с в а і м і для другіх.

Мы неяк забываем, што літаратура — гэта не адны толькі паасобна ўзятыя ці выстраеныя паводле пэўнага ранжыру імёны і кнігі. За імі заўсёды непаўторны водар часу, знікненне адных і нараджэнне другіх традыцый, складанае ўзаемадзеянне творчых і чалавечых лёсаў, памкненняў, згод і нязгод, гэта перамогі і паражэнні, над якімі чуецца і суцяшальна-прымірэнчае багдановічаўскае: «Я не самотны, я кнігу маю...», і збалелае, трагічнае чорнаўскае: «Божа, дай мне напісаць мае раманы!..» Не, не адны толькі кнігі, хоць шмат чаго памясцілася і ў іх.

Колькі дадатковых магчымасцей уздзеяння на чытача набыла б, напрыклад, паэзія Купалы, наколькі б наблізіўся да яго паэтаў голас, каб мы мелі большую, чым сёння, ягоную літаратурна-крытычную і публіцыстычную спадчыну, каб не панесла такія вялікія страты ягоная перапіска, каб, нарэшце, сучаснікі глыбей зазірнулі не ў абы-які, трэба думаць, свет ягонага літаратурнага і чалавечага існавання. Але ж мы лянотныя і нецікаўлівыя, нам звычна адгаворвацца, што, маўляў, вялікае распазнаецца на адлегласці і што час, маўляў, усё адпаведным чынам разважыць і паставіць на сваё месца. І ўсё ж, не сумняваючыся ў справядлівасці і непазбежнасці прысуду, які так ці інакш выносіць час, ці варта забывацца і пра здольнасць часу не толькі ўзбуйняць чалавечую памяць, але і браць з яе сваю сумную і жорсткую даніну забыцця. Чым больш прасякнемся мы адчуваннем дакументальнай, а значыць, і гістарычнай значнасці сённяшняга літаратурнага быцця, тым глыбейшай і больш плённай будзе праца будучага гісторыка культуры, крытыка, біёграфа. Нельга не пагадзіцца з Янкам Брылём, які яшчэ ў 1968 годзе пісаў: «Тое, напрыклад, што мы за трыццаць пяць год існавання

выдатнай серыі «Жизнь замечательных людей» не далі для яе ніводнай кнігі пра тых, кім ганарыцца наша нацыя, нельга лічыць толькі недахопам — па-мойму, гэта наша калектыўная ганьба». Сказана жарсткавата, але ж і справядліва. І сапраўды: папрок тут не адрасуеш аднаму пэўнаму аўтару, які, маўляў, мог бы, ды, бачыце, не хоча. Віною яшчэ і недастатковасць дакументальных матэрыялаў, няўвага да архіўных росшукаў, адсутнасць канцэптуальных распрацовак па гісторыі эстэтычнай і грамадскай думкі той ці іншай эпохі.

Чытаючы новую кнігу Янкі Брыля, уваходзячы ў свет ягоных літаратурных і грамадскіх інтарэсаў, міжвольна думаеш пра цану пісьменніцкага слова, пра тое, як многа значыць яно, слова сапраўднага пісьменніка, для чытача, для крытыка, для таварыша па працы. Слова Брыля — уплывовае слова. Сказаць так дае нам права выдатны творчы вопыт пісьменніка, бескарыслівая праўдзівасць мастака, бескампраміснасць ягонай грамадзянскай пазіцыі — нарэшце, амаль фізічнае адчуванне незаменнай брылёўскай прысутнасці ў літаратуры, у адной з тых нямногіх сфер чалавечай дзейнасці, дзе па-сапраўднаму толькі і можна гаварыць пра незаменнасць. Законы Ньютана мог бы адкрыць і хто-небудзь іншы, і сэнс іх ад гэтага не змяніўся б, а вось «Братоў Карамазавых», апрача Дастаеўскага, напісаць ніхто б не здолеў.

Аўтары кніг, падобных да брылёўскай, непазбежна павінны будуць рызыкаваць. Споведзь, самараскрыццё, вядома, не застрахаваныя ад няшчырасці ці нават самападману шчырасцю. І ўсё ж устаноўка на чытацкі давер не можа мець інакшай пасылкі, акрамя як шчырасць. «Пішучы пра другога, не бойся быць самім сабою»,— пазначае Брыль. І — пра шчырасць: «Чытача не ашукаеш. Калі ты любіш, што любіш, па-сапраўднаму, а ненавідзіш таксама на ўсю душу, калі ты ўкладваеш у тое, што пішаш, усё, што маеш найлепшага, калі робіш гэта натуральна, шчыра, без усялякай задняй, ніякай думкі,— чытач гэта бачыць, ён прымае тваю руку, працягнутую на дружбу.

Наколькі што будзе ў тэксце, наколькі ў падтэксце — гэта ўжо, здаецца, не заўсёды ў нашай уладзе. Але гэта п а в і н н а б ы ц ь, гэтым павінен дыхаць твор, і гэтага не падробіш. Шчырасць — толькі яна будзе відаць, і толькі яна — галоўнае».

Мне не здаецца рызыкоўным вызначэнне сілы і значнасці таленту адной якой-небудзь вартасцю, уся справа, здаецца, у тым, каб гэтая вартасць была па-сапраўднаму вызначальнай. Брыль, відаць, не так далёка ўхіляецца ад ісціны, калі пераносіць цэнтр цяжару на маральную змястоўнасць таленту, пераклікаючыся ў гэтым з вядомай думкай Талстога аб трох умовах творчасці, што ўключаюць маральныя адносіны да прадмета адлюстравання, прыгажосць формы і шчырасць. Тое, што шчырасць названа апошняй, не павінна бянтэжыць, бо, зразумеўшы талстоўскую, а ў дадзеным выпадку і брылёўскую думку, лёгка пагадзіцца з першаступенным значэннем менавіта шчырасці, якая ў канчатковым выніку выступае не толькі імпульсам да творчасці (катэгорыяй эмацыянальнай), але і робіцца непазбежна якасцю яе (маральныя адносіны). Гэтак жа і прыгажосць формы мае адначасова і эстэтычны і этычны аспекты (прыгажосць — дабро), гэтак жа шчырасць задумы і яе ўвасаблення павінны знайсці і адпаведна шчырую, прыгожую форму.

Не прэтэндуючы на тэорыю, Талстой аднойчы выказаўся вельмі выразна і проста: «Як ні пошла гэта казаць, але ва ўсім у жыцці, і асабліва ў мастацтве, патрэбна толькі адна... якасць — не лгаць».

Здавалася б, як усё проста: будзь шчыры ў памкненнях, шчыра выказвай сябе, шчыра вынось, калі трэба, прысуд. Але ж мы ведаем, што ў мастацтве можна лгаць. Перабольшваючы магчымасці свайго таленту, занадта паверыўшы ў «исправительную», кажучы па-руску, сілу слова, падладжваючыся пад модную тэорыю і думку, атаясамліваючы героя з сабой і сябе з героем. Шмат магчымасцей!

«І графаманы плачуць над уласнымі старонкамі. Яшчэ як шчыра ды краплiста!

Варта пра гэта памятаць, калі ўжо слязінка падкочвае, просіцца...»

А вось у Брыля пра пісьменніка многапісальнага, самаўпэўненага — бач, таксама лічыць сябе шчырым у сваім паспешлівым самавыражэнні:

«Рэдагуйце яго, рабіце больш-менш прыстойна пісьменным, спяшайцеся, пакуль ён цёплы, пакуль яшчэ не застыў у бронзе класіка. Жывога».

Прачытаеш гэткае і міжвольна рассмяешся. Такая ўжо сама па сабе прырода ўсялякага здаровага гума-

ру, што тое, што яшчэ нядаўна здавалася такім грозліва-несакрушальным, вартым самых ядавітых філіпік, раптам паўстане бездапаможна-нікчэмным і нават вартым жалю. А між тым, злосна гэта сказа ці не? Вядома, як таго і патрабуе сам прадмет, але ж і смешна, з упэўненасцю сілы, і гэта, можа, самае галоўнае.

Другім разам, цэлячыся ў падобную з'яву, Брыль скажа інакш, пакарыстаўшыся і філіпікай: «Гігантаманія ці, лепш сказаць, усё яшчэ модная схільнасць некаторых нашых празаікаў да так званых «вялікіх палотнаў», нават да цыклаў гэтых палотнаў набывае ў паасобных выпадках проста нездаровы характар. Паасобныя таварышы як быццам не разумеюць або не хочуць разумець, што многа напісанага — гэта яшчэ не аповесць і не раман, гэта можа быць і часта, на жаль, бывае бясформеннай масай слоў, якія ў суме сваёй нічога нікому не скажуць».

Напісана гэта амаль дзесяць год назад, але, на жаль, час не прыглушыў горкі пафас брылёўскіх слоў, а, наадварот, яшчэ больш пераканаў у своечасовасці трывогі з выпадку сапраўды не зусім здаровага «эпічнага» свербу ў некаторых нашых празаікаў. Мусіць, пара ўжо глыбей капянуць ды вывернуць на крытычнае сонейка і святло тую «бясформенную масу слоў», каб трохі збіць цвярозай развагай неафіцкі запал некаторых эпікаў-пачаткоўцаў, каб чытачу чутней стала цяжкое кректанне запіснога раманіста над пухлай тамінай чарговага твора. Варта выразна сказаць, што сёння смешна ўжо радавацца аднаму колькаснаму накапленню твораў з аўтарскай адзнакаю «эпапея» ці «раман», што даўно ўжо мінуліся тыя часы, калі мы марылі, паводле слоў М. Гарэцкага, «каб на стале ў нас каля тоўстай кніжкі вершаў... ляжала б н е т а н ч э й ш а я кніжка прыгожай прозы...» (выдзелена мною.— *М. С.*).

Крытыцы трэба час ад часу правяраць на плённасць, суадносячы свае высновы з дынамікай сённяшняга літаратурнага развіцця, як традыцыю коласаўскай трылогіі (наколькі яна пэўным чынам вычарпалася выдатнай «Палескай хронікай» Мележа?), так і традыцыі такіх розных па канцэптуальнасці пісьменнікаў-раманістаў, як М. Гарэцкі, К. Чорны, як нашы сучаснікі І. Шамякін і Я. Брыль. Бяда многіх нашых раманаў у іх яўнай нераманнасці, у адсутнасці арыгі-

нальнай канцэпцыі, у шкалярскім разуменні тыповасці абставін, лёсаў і характараў, наогул, у прасталінейнай, прымітыўнай дэтэрмінаванасці формы жыццёвым матэрыялам, у каляндарна-геаграфічным, а не ў спецыфічна раманным абыходжанні з катэгорыямі прасторы і часу. Карыкатурна ўзбуйніўшы адну з якасцей рамана, найчасцей эпічную, зразумеўшы яе толькі як сюжэт, што развіваецца нязрушана храналагічна, маючы адназначную каардынату, зводзячы разуменне характараў і самога дзеяння да ілюстрацыі пэўнага тэзіса, мы зрабілі магчымым практычна бясконцае доўжанне рамана, не абмежаванага мастацкай канцэпцыяй, у сюжэтных рамках канструкцыі і схемы. Вось чаму, згадваючы некаторыя раманы, хутчэй хочацца гаварыць пра дабраякасную цярплівасць і ўпартасць аўтара, чым пра раман як твор мастацтва, як пра паказчык узроўню мастацкай і філасофскай думкі сённяшняга дня.

Ігнараванне шкоднасці «гігантаманіі», а тым больш патуранне ёй, небяспечнае стварэннем іерархічнага прэцэдэнта, калі так ці інакш аддаецца перавага, скажам, буйной празаічнай форме перад формай малой, эпічнай прозе перад прозай так званай лірычнай. А гэта ўжо недапушчальна, ненавукова і прынцыпова няправільна, бо калі і можна чаму аддаваць перавагу, дык толькі твору таленавітаму перад слабым — незалежна ад жанру і стылёвай прыналежнасці.

Мяне заўсёды бянтэжыла, напрыклад, выклікаючы актыўнае непрыманне, тая крытычная аперацыя над брылёўскай прозай, калі яе цалкам і без агаворак уціскалі ў лірычнае «ложа», забываючыся пра яе шматкампанентнасць: характарнасць, добрую заземленасць, арыентаванасць на народную бытавую мову, маштабнасць мантажных зближэнняў пры ўзбуйненасці дэталі, сатырычную і гумарыстычную афарбоўку. Лірызм сапраўды надае своеасаблівы «шарм» брылёўскай прозе, і ў сувязі з гэтым варта гаварыць пра яе эстэтычныя і эмацыянальныя якасці, ніякім чынам не абмяжоўваючы «лірычнасцю» яе змястоўныя магчымасці. Мусіць, варта памятаць, што ў мастацтва, пры ўсіх ягоных метадалагічных і стылёвых абліччах, адзіны выток, адзіная мэта — самым аптымальным і ўражлівым чынам закрануць пачуцці і думкі чытача. Адказваючы па-свойму, па-пісьменніцку аматарам

тэрміна «лірычная проза», Брыль згадвае недзе чужое ці вычытанае запытанне, якое «апошнімі днямі — вельмі маё...»: «Вас когда-нибудь били по обнаженному сердцу?» I дадае: «Вось што такое лірычная проза».

Лірычнасць яму бачыцца якасцю маральнай.

Брыль наогул пісьменнік, надзелены вялікай здольнасцю пастаяннай апрабацыі вышэйшых маральных каштоўнасцей і ўдакладнення іх для сябе і сваіх герояў. Гэтая якасць, пры яшчэ надзвычайнай духоўнасці брылёўскага мастацкага свету, выгадна вылучае яго сярод сучасных нашых празаікаў — гэтым ён прыналежны да непарушных традыцый вялікай літаратуры.

Кніга Брыля настройвае свайго чытача на высокі лад думкі і пачуцця, непрымушана вучыць культуры эмоцый і дачыненняў з людзьмі, яна заражае мастакоўскім азартам спасціжэння жыцця і даводзіць, што для чалавека з эстэтычнай жылкай, з жывой цікаўлівасцю да акаляючага ніколі не канчаецца свята сустрэчы з прыгажосцю і саўдзелу ў ёй. Брыль пастаянна нагадвае пра месца і пра ролю мастацтва ў чалавечым жыцці, раскрываючы адначасна самую натуру мастака з усім уласцівым ёй артыстызмам эстэтычнага пераўтварэння ўражанняў жывога жыцця. Жыццё ў мастацтве, мастацтва ў жыцці. Мастацтва іначыць чалавека, надзяляючы яго як бы ўдасканаленым зрокам і слыхам, адпаведным чынам настройваючы ягоную душу, так ці інакш вызначаючы ў канчатковым выніку характар жыццёвых паводзін. Пра што б ні пісаў Брыль, ён пастаянна мае на ўвазе гэтае ўзаемадзеянне жыцця і мастацтва — вось і гаворку пра таго ці іншага пісьменніка ён абавязкова пачынае са згадкі, калі і пры якіх умовах адбылося першае знаёмства з ягонай творчасцю, і ўжо ўражанне ад мастацтва як бы ўзбуйняе, прымушае запомніць надоўга нейкі дзень ці гадзіну, настрой і пейзаж. Пра Пімена Панчанку: «Праз адчыненыя дзверы з рэдакцыі чулася радыё. Я не змог слухаць пры людзях, выйшаў і адышоўся, нават лёг — вачыма ў верас... Радыё я ўжо не чуў. Там была нейкая песня, ці што. А сюды, пад сосны, я вынес глыбока сардэчную музыку слоў, вялізны свет пачуццяў — маіх да шчаслівага болю, да радасных, нястрымных слёз...»

Гэта быў верш «Зварот» («Сосны і сонца...»).

Пра Фёдара Янкоўскага:

«Тыя гадзіны — дарэчы, таксама са снегам і соснамі за акном,— бачацца ўжо не далёкім, светлым пачаткам нашага сяброўства, а проста як час сапраўднай чытацкай асалоды і плённага творчага роздуму» («Добра так»).

Па-майму, тэма — Брыль-чытач — магла б стаць прадметам асобнай і павучальнай гаворкі: настолькі markрознабакова і цікава паўстае са старонак брылёўскай дакументальнай прозы гісторыя ягоных дачыненняў з друкаваным словам, фарміравання яго як мастака і чытача-прафесіянала — так-так, бо чытанне, як і ўсялякі іншы занятак, ведае свае сакрэты і прыёмы, сваю, калі хочаце, навуку і сваім геніем надарае далёка не кожнага.

Літаратар, як кажуць, да мозга касцей, Брыль валодае добрым і спагадлівым талентам распазнання ўсяго новага і па-мастацку значнага, што з'яўляецца не толькі ў роднай яму, але і ва ўсёй нашай шматнацыянальнай літаратуры — у яго асобе гэтае новае і значнае набывае шчырага прыхільніка і прапагандыста. Асабліва ўважліва сочыць ён за творчасцю маладых і ўмее па-маладому захоплена радавацца чужому поспеху і ўдачы. Шчаслівай дарогі да чытача жадаў ён першым кнігам А. Кудраўца і А. Жука, упершыню прадставіў на старонках «Дружбы народов» усесаюзнаму чытачу цікавага маладога празаіка з Украіны Г. Цюцюнніка.

Не лішнім будзе тут прыгадаць, што Брыль стаўся і аўтарам першага друкаванага водгуку на раман Івана Мележа «Людзі на балоце». Сённяшняму маладому чытачу, у тым ліку і чытачу-літаратару, цяжка ўявіць тое ўражанне, якое зрабіў сваім з'яўленнем гэты раман, у значнай ступені нечаканы як для літаратурнай грамадскасці, так, магчыма, і для самога аўтара. Тагачасная проза жыла прагай навацый, вяла пошук пад выразны шумок аб адміранні буйных эпічных форм; сучаснасць матэрыялу і стылю была яе сцягам. І раптам — Палессе, хаты на востраве, кансерватыўны побыт убогай вёскі... Для Брыля, як і для іншых удумлівых пісьменнікаў, новы твор Мележа стаў самым важкім пацверджаннем сур'ёзнага і не часовага, мяркуючы па ўсім, ажыўлення ў галіне прозы, што рыхтавалася да шырокага наступу на жыццёвы матэрыял,

заглядваючы наперад і адначасова азіраючыся назад. Патрэбнымі былі навацыі, але выявіла сваю плённасць і думка аб нявычарпанасці традыцый ранейшай эпікі. З той пары мележаўская праца над «Палескай хронікай» нязменна выклікала больш чым простую чытацкую цікаўнасць: а што будзе з любімымі героямі далей? З мележаўскай задумай як бы звязвалася і вырашэнне нейкай даўняй і прынцыповай спрэчкі аб рамане наогул... «Хроніка», на жаль, засталася незавершанай. Мележ нібы пакінуў нам загадку, якую мы ўсе павінны разгадваць... Ісці мележаўскім шляхам ці шукаць іншыя?

Не супакойвацца і шукаць...

У творчым партрэце Брыля маскоўскі крытык В. Аскоцкі згадвае, як той на пытанне, ці лічыць ён сябе пісьменнікам лірычнай тэмы, не задумваючыся, адказаў:

— Я лічу сябе пачынаючым пісьменнікам!

Сціпласць? Вядома. Непрыманне крытычных шаблонаў? Так. Але найбольш, здаецца, усведамленне складанасці і важнасці пісьменніцкай справы, прызнанне гатоўнасці да новага пошуку, да штодзённай вучобы ў жыцця і літаратуры. Непрыманне самазадаволенасці.

Мы, чытачы, любім менавіта такога Брыля.

1979

РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

Хлапчукі майго пакалення пяшчоту мужчынскай ласкі ўпершыню спазнавалі мо пасля вайны — канечне, тыя, каму пашчасціла выжыць у вогненным пекле і дачакацца жывымі дамоў сваіх бацькоў. Пра тугу пасляваенных бязбацькавічаў шчымліва напіша пасля Рыгор Барадулін. Але яшчэ ў трагічным сорак другім годзе Пімен Панчанка, гадамі бацька нам, прагаворыцца прарочымі радкамі пра першы наш пасляваенны вопыт:

Ім здасца самалётам першы бусел,
Пажарам здасца першая зара.

У лістоўках, што скідалі нашыя самалёты ў акупацыйны тыл (нішто сабе тыл, дзе не моўклі партызанскія стрэлы!), маткі нашыя маглі прачытаць:

Не знаю, хто ты — баявы уралец
Ці дужы, каранасты сібірак.
Падправіўшы спраўней паходны ранец,
Прайшоў ты першым па маіх барах.

І гэта ж мы вучылі потым на памяць у школе, нанова перажываючы радасць стрэчы з «нашымі», аж да слінак у роце і да нудлівага ныцця ў жываце прыгадваючы смак баршчу з паходнай кухні, якім частавалі нас вясёлыя байцы. З памяццю пра гэты час ехалі мы пасля вучыцца ў гарады — і вучыліся, і марылі, і бесклапотнічалі ўвелькі з узростам, спадзеючыся адно на стыпендыю ды хіба на брус вясковага сала. Вясновы вецер перамен урываўся ў студэнцкія аўдыторыі, за Бабруйскай вуліцай перагукваліся цягнікі, над Свіслаччу вырастала тэлевышка, гайдаючы на сабе верхалазаў, і ў Пімена Панчанкі мы чыталі:

Не магу цярпець я верхаглядаў,
Верхалазам — тысяча пашан.

Гэта было па-маладому задзірыста, няўрымсліва, як, напрыклад, пра «вучоных сычоў», што «адбіваюць дзевак у студэнтаў»,— і славуты, які так прыйшоўся да часу, верш «Прыстасаванцы». І ці думалася мне тады, што мінецца якіх пяць-шэсць гадоў і буду я сядзець супрацоўнікам у «Маладосці», дзе рэдактарам сам Пімен Панчанка, што ў любы час дня можа зайсці ён у

рэдакцыйны пакойчык,— найчасцей туды, дзе сакратарыят, дзе стаялі столікі прыязна-гаваркой Веры Палтаран і сур'ёзна-іранічнага Уладзіміра Юрэвіча,— сесці на старую канапку і парывіста, а таму збіваючыся на слове, з непаўторна расчуленай усмешкай пачаць гаворку пра апошнюю сваю паездку, пра кнігу ці рукапіс, якія толькі што прачытаў.

Розных бачыў я пасля рэдактараў, а такога зацікаўленага, па-сапраўднаму дэмакратычнага ■ супрацоўнікамі і аўтарамі, паводле вялікага рахунку прынцыповага — бадай, не сустракаў. Сустракаў хіба «панчанкаўскае» ў іншых, і не адзін я меў на ўвазе пры ацэнцы тых ці іншых жыццёвых абставін, літаратурных з'яў эталон ягонай чалавечай, рэдактарскай і паэтычнай асобы.

І вось перада мной новае выданне Збору твораў паэта ў чатырох тамах, дзе плён амаль пяцідзесяцігадовага шчыравання над радком, над душой сваёй і чытацкай,— а за ўсім гэтым лёс народны, ад якога неадлучны быў на працягу ўсяго свайго жыцця паэт — сціплы вясковы настаўнік на пачатку жыццёвай дарогі, а пасля — воін, які закончыў службу ў Іране, адкуль прывёз славуты паэтычны «Дзённік», дзе ўпершыню мо ў беларускай паэзіі так навочна ўвасобілася тэма сацыяльных кантрастаў чужога нам свету. Я напісаў — «упершыню» і задумаўся: а ці дакладна гэта? Бо, скажам, заходнебеларуская тэма як матыў сацыяльнага пратэсту гучала ўжо не толькі ў вершах Купалы, Коласа, але і маладзейшых творцаў, не кажучы ўжо аб пафасна-рэвалюцыйным слове Танка там, за кардонам. Так яно так, але тут ёсць нейкі свой нюанс, хаця б тое, што свет, апісаны Панчанкам, быў сапраўды чужы — хаця б нават у тым сэнсе, што не «адзінакроўны» для паэта-беларуса, што тут інтэрнацыянальны і сацыяльны пафас, якім поўняцца вершы, быў паэтам выяўлены, так сказаць, у «чыстым» выглядзе — яскравае і пераканаўчае сведчанне дзейснасці новай маралі, якая не мірылася з сацыяльнай несправядлівасцю дзе б там ні было. І ў гэтым выпадку Панчанка сапраўды наватар. І гэта не першы нават на той час выпадак, калі паэт ішоў у самых першых шэрагах адкрывальнікаў новых паэтычных гарызонтаў. Яшчэ да «Іранскага дзённіка» ён аўтар такіх сапраўдных шэдэўраў роднага слова, як «Сінія касачы», «Вока снайпе-

ра», «Герой», «Коні». Такія вершы з часам не старэюць, не блякнуць, а набываюць нейкія новыя магчымасці «счаплення» ■ сучаснасцю, з яе жывым і непрадбачаным клопатам. Хіба не па-сённяшняму, хіба не ў лад нашай «экалагічнай» тузе гучаць радкі пра трох амаль былінных коней, што трапілі спачатку пад абстрэл, а пасля на міннае поле... Мне ўжо даводзілася неяк пісаць пра гэты верш-баладу, пісаў я і пра тое, што па-свойму славутыя пазнейшыя «Коні ў акіяне» Б. Слуцкага ці не напісаны былі пад уплывам гэтага панчанкаўскага адкрыцця, бо рускі паэт паэзію Панчанкі ведаў і нават яе перакладаў. Толькі справа, можа, не ў гэтым, а хутчэй у адзінстве франтавога вопыту і ў выключнай, у дадзеным выпадку, арыентаванасці на яго. Бо тыя ж коні ці конь, ужо свядома суаднесеныя франтавіком А. Пысіным з вопытам сённяшняга дня, народзяць іншую асацыяцыю, і ён напіша пра каня, як пра нейкага «маманта жывога», а блізкі і, галоўнае, сённяшні, зноў жа, лад асацыяцый дазволіць яшчэ аднаму паэту — С. Гаўрусёву напісаць свае «Цыркавыя коні»:

Эх, каб адчыніў вам хто вароты,
Як бы сіганулі вы на волю!

Чытаючы і перачытваючы Панчанку, нельга не здзіўляцца вось гэтаму таленту першаадкрывальніка, незвычайнай засяроджанасці на матэрыяле сучаснай яму рэчаіснасці; адсюль як выдатная паэтычная публіцыстыка, падораная ў прыклад і добрае навучанне нашым паэтам маладога і сталага ўзросту, так і праніклівая, без ахоўнай засені так званага «лірычнага героя», споведзь не чужога ўсяму чалавечаму мудрага майстра, які не страхуецца ад бяды і памылак, а пасалдацку, па-сялянску разумее жыццё як абавязак, як пошук ісціны, як шлях да другога чалавека-аднадумца.

І раны ў кожнага свае, і ўсе баляць,
Адным гарэць, а іншым дагараць,
Адным рабіць, астатнім — зарабляць...
І дзе мяжа паміж «было» і «ёсць»,
І дзе ты — гаспадар, а дзе ты — госць?

Вораг легкадумнасці, грамадзянскай безаблічнасці і абыякавасці, ён не без горычы, аглядваючыся назад, аднойчы скажа:

Не вартых праслаўлення праслаўляў...
Вось толькі сам сябе не выдумляў.

Так, не выдумляць сябе, не прыхарошваць жыццё дзеля нейкай няхай і прывабнай, але ўсё ж схемы, а разумець яго як сапраўды дыялектычны, сатканы з супярэчнасцей, працэс, які, дарэчы, не абмінае і самое слова, і паняцце, выказанае ім, тое, што

Нехта і подлы, і хіжы
Клятву паўторыць тваю:
З ворагам біцца — і выжыць,
Нібы салдат у баю.

Так, гэта таксама праўда — магчымасць спекуляцыі на слове, не падмацаваным дзеяннем і ўчынкам, усёй высакароднай сутнасцю душэўнага парывання,— тая прафанацыя слова спажыўцом, за якую, строга кажучы, хоць і непадсудны паэт, але не думаць пра якую не можа, бо «мала сказаць: ненавіджу, мала сказаць: прызнаю». Заўважце пры гэтым, што сама шчырасць паэтычнага выказвання тут зразумета ўжо як дадзенасць, паэт жа ў сваіх развsituаннях, дарэшты праўдзівых і вострых, ідзе далей, звяртаецца да сумлення нашага чытацкага, да нашай здольнасці быць асобай, разважаць і аналізаваць, бо «зло і хлусня... маскіравацца вучацца спрытна штодня». Асоба расце ў супраціўленні абставінам, жыццёвай няпраўдзе — вось чаму іншы раз варта аддаць «усе перамогі свае за адно паражэнне».

Але ці дастаткова толькі індывідуальнага, асабовага вопыту для арыентацыі чалавека ў складаных абставінах сучаснага жыцця, для выпрацоўкі лініі паводзін — без суадноснасці іх з пэўнай шкалой грамадскіх і маральна-этычных каштоўнасцей? Вопыт індывідуальны, мусіць, патрабуе менавіта такой суаднесенасці — і не толькі сацыяльна-грамадскай, але і гістарычнай.

Панчанкаўскае пакаленне выпрабавана на грамадзянскую сталасць найперш вайной, яно зведала горыч адступлення («у сорак першым, далёкім і горкім, на пераправах ішлі мы ка дну»), але і яно, гэтае пакаленне, узнеслася потым на крылах перамогі вунь у якія вышыні гістарычнага трыумфу — таму яму пад сілу сталася новая здатнасць да подзвігу, гэты раз мірнага, нават пры адчуванні таго, што мера трагедыйна-

га мала як зменшылася ў тым пасляваенным бытаванні. Пра гэта якраз пісалася, на сённяшні погляд, да крыўднага мала, можа, нават і таму, што неверагодна вялікі разгон дала чалавечаму духу і чалавечай мары нядаўняя вайна. Да залатога веку дабрабыту і ўсеагульнай справядлівасці, здавалася, рукой было дастаць... Толькі немагчыма вечна жыць адным парываннем, на адным высілку,— павінна надысці і пара «перадыху» — пара развагі, падвядзення рахункаў, разумнай аглядкі назад і аб'ектыўнай ацэнкі ходу car гістарычнага працэсу і свайго месца і ролі ў ім, і сваёй адказнасці за гэтую роль — усё роўна хто ты,— «славуты наватар, цаліны пакарыцель ці майстра футбола», як скажа паэт, праўда, зусім з другога выпадку, у цудоўным лірычным вершы «У акенца тваё...». Паэт і больш таго не можа быць безасабовым — інакш яму варта пашукаць сабе нейкі другі занятак. Адказваць яму даводзіцца, калі ён не халодны рамеснік, перад сабой гэтак жа, як перад людзьмі.

Былі не тыя словы дзесьці сказаны
І зроблена сто спраў было не так.

Але:

Я ні ў жыцці, ні ў людзях не зняверыўся,
Людскую ласку дбайна берагу.
Вісіць над сэрцам і над сінім верасам
Мядовы пах жыцця і пчолаў гуд.

Лашчыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе, але найлепшая згода для чалавека — згода з самім сабой, са сваім сумленнем, з праўдай нейкага другога, хто ідзе па жыцці поплеч з табой,— і няхай нялёгкай цаной табой і тваім аднадумцам здабыта гэтая праўда, яна — тое, што жывіць і суцяшае, падае надзею на лепшае, не дазваляючы, разам з тым, забывацца на ўрокі жыццёвага вопыту, няхай і самыя горкія:

Было шчасця не многа.
Больш агонь ды бяда...
Не шкада мне нічога?
Усяго мне шкада.

Вельмі чалавечная, па-харошаму сціплая ў сваёй высакароднасці пазіцыя — прывілея і права нялёгка здабытай сталасці: па-асабліваму шчымліва любіць гэты адзін раз нам дадзены свет, «да дажджынкі кожнай не глухі». Гэта і мудрасць, для якой шчасце не ў

тым, каб задавальняцца малым, а ў тым, каб у малым бачыць вялікае. Гэта душэўны і аналітычны зрок, абвостраны вопытам, гэта часам вусцішнае, раптоўнае адчуванне сябе нетрывалай часцінкай усяго сутнаснага («усяго мне шкада»), як і адчуванне сваёй асабовасці, непаўторнасці, якое, зноў жа, асэнсоўваецца толькі побач і ў сувязі з непаўторнасцю другой асобы, з асобнасцю і непаўторнасцю ягонай праўды. Гэта вельмі дэмакратычная і сімпатычная ўвогуле пазіцыя, і калі паэт скажа:

Я не магу судзіць нікога,
Дарую многае братам,
Бо сам не быў любімцам бога,
Я — пасівелы сірата,—

дык ніхто не зразумее гэта ні як тую знарочыстую прыбедненасць, што горш за пыху, ні як адмаўленне ад актыўнасці жыццёвай пазіцыі. Занадта добра ведаем мы наступальны ягоны паэтычны характар, забяспечаны і поўнай мерай дзейснай жыццёвай пазіцыі. Паэтава шчырасць не ад збяднення,— ад узбагачэння жыццёвага і мастацкага крытэрыя, ад жадання гранічна наблізіць як паэзію, так і асобу самога творцы да жыцця — насуперак пазіцыі рацыяналістычнага ці пачуццёвага місіянерства, усялякага «павадырства» і «правадырства». Панчанка дасягнуў у сваім паэтычным слове той меры і вышыні паэтычнай нязмушанасці і шчырасці, якая вынік усё той жа грамадзянскасці, але не разменена на проста фразу. Вось чаму ён балючыя праблемы часу і чалавека ў часе прымае як свае, амаль што «хатнія», вось чаму яго трывожыць лёс ураджаю і лёс кнігаўкі на асушаным балоце, вось чаму ён піша пра жаўранка, што ў сэрцы «начуе», вось чаму ён скажа:

Якою прысніцца маці,
Такою і песня будзе.

Матчына песня, матчына мова... Каму не запомніліся так шчасліва народжаныя аднойчы пранізлівыя і прачулыя, бы славутыя Коласавы «Мой родны кут, як ты мне мілы...», панчанкаўскія радкі пра родную мову:

Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

Міжволі прыгадваецца, што ім жа яшчэ ў сярэдзіне саракавых гадоў у вершы «Пад'язджаючы да Мінска...» зроблены як бы першы падступ да тэмы, якая будзе хваляваць яго на працягу ўсёй далейшай творчасці: слова народнае і слова самога мастака, узрошчанага народам. Шмат пісалася і пішацца ў нас вершаў пра родную мову — і, як ні дзіўна, часта «дзяжурных», нягледзячы на відочную «лірычнасць» самога прадмета гаворкі, але мала каму прыйшло ў галаву найперш даверыцца сэрцам самому гуку роднай мовы, яе слоўнаму «жэсту». А Панчанка проста, выдатна проста, без усялякага мудрагельства сказаў:

Якія знаёмыя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!
І ўсё мілагучна для слыху майго:
І звонкае «дзе», і густое «чаго».

Не толькі звычайны чытач, прадстаўніком якой бы мовы ён ні быў, але і спецыяліст-філолаг не абыдзе гэтую надзіва дакладную, малымі сродкамі і на малой плошчы зробленую моўную «характарыстыку».

А што казаць пра ягоную «Бульбу», пра «Край паэтаў», у якім і замілаванне, і гумар, і этнаграфічны нарыс, і гістарычная даведка, і балючая надзённасць, пададзеная знарок ідылічна ды іранічна, мо таму яна і прысарамаціць, каго трэба, больш, чым філіпіка:

Там машыны з канюшынай не ў спрэчцы;
І з барамі ўсе заводы добра дружаць;
І салдат на службе служыць, а не тужыць,
Бо красуня перад ім не задаецца...
. . . .
А частуюць там гасцей баравікамі.
. . . .
Там чарнічныя ўсе ночы,
Сунічныя ранкі,
Там народ найболей любіць вершы Янкі.

Шкада перапыняць цытату: так усё гэта зграбна, дакладна, дасціпна, на такой харошай ноце сталай усмешкі і сталай журбы. Шкада перапыняць і гэтае не такое ўжо і зграбнае слова пра Пімена Панчанку — паэта, грамадзяніна і чалавека, адзіную ў сваіх трох аблічах непаўторную асобу: яе ўзрасціў, сфарміраваў і паставіў на службу людзям наш таксама непаўторны час, якому равеснікам, нават каляндарным, і сам паэт.

1984

АД МАЛАДЗІКА ДА ПОЎНІ

Калі-небудзь хто-небудзь напіша пра пару, калі ў нашым сталічным універсітэце на адным курсе ці на паралельным (філолагі — журналісты) вучыліся Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Юрась Свірка, Сымон Блатун, Таццяна Арлова, Мікола Гіль, Алесь Станюта.

Акрамя Барадуліна, астатнія тут — мае аднакурснікі-журналісты.

З Рыгорам Барадуліным нашы журналісты сябравалі, ды і сам ён, здаецца, хінуўся да нас, бо тут «пісьменнікаў» было непараўнальна гусцей, чым на ягоным уласна, спецыяльна філалагічным аддзяленні.

Раз ці два, памятаю, зацягнуў мяне Барадулін на літаб'яднанне ў «Чырвонку». Там Іван Калеснік уражваў тым, што быў ужо не толькі пры музе, але і пры пасадзе, што мудрагелістыя паэтычныя ісціны адрасаваў адно нам, жаўтароцікам, таямніча аддалены ад нас дужкамі акуляраў. Раскрыць тыя «дужкі» мы, бадай, не адважваліся. Гарачыўся хіба як заўсёды Сымон Блатун: спрачаўся з «мэтрам», з намі і гнуў нешта сваё. Мне нешта тая навука не далася: перастаў хадзіць. Затое Барадулін пачаў запрашаць у свой студэнцкі пакойчык — чытаў новыя вершы з блакноціка, як, бывае, і сёння, сустрэўшыся дзе ў выдавецкім калідоры. А мне і сёння здаецца, што блакноцік усё той жа, студэнцкі, а самі мы яшчэ ў той далёкаблізкай пары, прапісанай у інтэрнаце на Бабруйскай вуліцы. Хвала ёй — і пары, і вуліцы!

Барадулін тады друкаваўся мала. Часцей — Бураўкін, Зуёнак, Блатун. Апошні, праўда, больш як журналіст. Ён не хадзіў, здаецца, ужо ў «Чырвонку»: яго прыгарнула самавітая, куды як дарослая «Звязда». Блатун нязлосна, але паслядоўна кпіў з сваіх сяброўпаэтаў — «заводзіўся» сам і «заводзіў» іншых трапнымі, нібы на хаду прыдуманымі пародыямі ды эпіграмамі. Тое-сёе з таго Блатуновага фальклору ўзнавіў пасля Барадулін. Але колькі прапала!

Барадулін смакаваў слова. Вычытваў то тое, то другое са свайго запаветнага блакноціка, выпытваў, ці ёсць такое ў маёй магілёўскай гаворцы. Ён хацеў

бачыць яго ў мове літаратурнай. Так ён сам не гаварыў, так я здагадваўся.

Калі я ўспомніў аднойчы магілёўскае «пражмо», уведзенае ў літаратурны слоўнік Аркадзем Куляшовым, ён цікава загаварыў пра слоўнік свайго земляка Петруся Броўкі.

А потым:

— У вас кажуць так: «снег па забарсні»?

— Можа, і кажуць, бо слова «забарсаць» ёсць.

— А слова «аблет»?

— Ёсць! Аблетаваныя дровы, так?

Трохі мітуслівы звычайна, ён увачавідкі спружынеў, націнаўся — увесь адна ўвага. Не раўнуючы дырыжор перад тым, як узмахнуць сваёй таямнічай палачкай.

— Дык выдатна ж, выдатна, стары!

Ягонае круглае вока проста-такі «буксавала» пад узнятым брывом.

— Зараз мы будзем гарбату піць. З «белымі ружамі», га? А то і весялейшае што, калі «звяздзюк», Ціханаў сын, пусціць у свет сваю мысль.

Ціханаў сын — гэта Сымон Блатун.

А што, можа, і праўда пашукаць дзе таго Ціханавага сына?

Прыблізна так гэта бывала. І недзе наперадзе было тое цаліннае лета, той стэп і маладзік над ім — няйначай ушацкі ягоны маладзік, і тое бурштынавае зерне, што ўгору ляціць ад студэнцкай лапаты,—

> А так шпакі
> На луг садзяцца там, за хатай...

За ўшацкай, матчынай хатай, вядома.

Нехта сказаў: час супроцьстаяння з талентам.

Хто з пачаткоўцаў не перажыў, не зведаў гэтага? І як гэта важна, каб у той трывожлівы і адказны час не разгубіцца, не замітусіцца, не збаяцца паверыць у сябе і свой высокі выбар, не збаяцца, што паэтычная ўдача, абражаная ці то залішняй прэтэнзіяй, ці то залішнім піетэтам перад ёй, адвернецца раптам ад цябе. Як цяжка не памыліцца! Музы карануюць адзінкі. А зваблiваюць легіёны. Муза паэзіі шчодрая на абяцанкі. Але і сама патрабуе невымернай цаны — адной і той жа ад «жалких писак и педантов» і ад найярчэйшага таленту. Паэзія — лёс, а лёс бывае розны, і паэт па-рознаму прымае і нясе гэты лёс. Ёсць таленты

светлыя, жыццядайныя — яны і змрок пераплаўляюць у святло, але ёсць і другія, тыя, што самі нібы ўвасабленне пакутнага духу, адрынутага паводле нейкай незразумелай прычыны ад самога жыцця і асуджаныя трапятацца ў вечнай празе зліцця з ім. І як дабратворны цуд, як недарэмны абяцанак злагады і суцяшэння — даспадобы нам талент ураўнаважаны і светлы, талент вынаходлівы і дзейсны, што адкрывае нам нанова кожны раз найвышэйшую каштоўнасць жыцця самога па сабе. Інакш кажучы, талент аптымістычны.

Не пытайцеся, чаму аптыміст такі, а не гэтакі. Ён такі паводле сваёй прыроды, ён не тое каб прымае жыццё такім, як яно ёсць, ён проста лічыць сябе дастатковым для жыцця, а жыццё для сябе. І лічыць магчымым, калі трэба, перамяніць жыццё, як і сябе. Спытайце ў сур'ёзнага, неспекулятыўнага філосафа, што такое жыццё, і ён адкажа, што жыццё ёсць жыццё, што гэта той не часты выпадак, калі з'ява вызначаецца таўталагічна і самадастаткова. Ах, філасофія! Паэт таксама філосаф, і, можа, філосаф найлепшы, ён мае справу з жывым духам і жывой матэрыяй жыцця, ён гаворыць, што ўсе тэорыі шэрыя, а зялёная крона жыцця зелянее раскошна і вечна.

Але навошта я гэта, ці не занадта высока ды далёка сігануў я думкай? Не, не настолькі далёка і высока, каб забыцца на грэшную нашу прафесію і на сам прадмет нашай гаворкі. І думка мая круціцца зусім не так і далёка, у тым часе, калі першы паэтычны зборнік паэта Рыгора Барадуліна «Маладзік над стэпам» (1959) стаўся для шмат каго нібы адкрыццём самой паэзіі ў звычайным жыцці, ад якога якраз далёкія, надта далёкія былі шмат якія нашы паэты, і не толькі маладыя. Тыя паэты апявалі то дубы, то росы, то параўноўвалі жолуд з патронам, а кляновы ліст з медалём, то добрасумленна (хіба добрасумленна?) супрышпілялі па вершыку да кожнай больш-менш сучаснай прафесіі — і не маглі супакоіцца, пакуль не завяршалі свой вершык бліскучай канцоўкай-бразготкай... Колькі было гэтых канцовак!

Першы зборнік Барадуліна з'явіўся ў пераломную і шматабяцальную пару нашай паэзіі, ён сам быў і абяцаннем і здзяйсненнем адначасова.

> А вецер, дым над дахам сцелячы,
> Праводзіць у далёкі шлях.

Ды нам на шчасце, [redacted] поўным
Велічна
Дарогу Волга перайшла.
(«Вагон таварны дрогка тузае»)

У Барадуліна натуральна загаварыла само жыццё, само пачуццё — без прыцягнутай за вушы эмоцыі ці думкі, без знарачытага падзелу на прозу і паэзію — усё было проза, і ўсё было паэзія.

Сённяшняму чытачу цяжка ўявіць тое ўражанне, якое зрабілі ў літаратурным і чытацкім асяроддзі раннія вершы Барадуліна. Непараўнальна смялейшай, куды больш натуральнай і багацейшай выглядае сённяшняя паэзія ў параўнанні з паэтычнай практыкай 50-х гадоў. Яна, наша сённяшняя, можа, трохі ўжо і стамілася ад прагі навацый і, як ні дзіўна, глыбакадумных самапаўтораў, і ці не з зайздрасцю магла б азірнуцца на сябе самую, туды, на той час, калі з'явіўся першы зборнік Барадуліна, калі выступалі з першымі кніжкамі Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, Ю. Свірка, Я. Сіпакоў, калі новае дыханне набірала творчасць П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, А. Вялюгіна.

Больш за дваццаць год прайшло ад часу з'яўлення той барадулінскай кніжкі, але як хораша, ненатужна чытаецца яна сёння, прывабліваючы маладою сілаю не абы-якога таленту, натуральнасцю паэтычнага слоўніка, біяграфічнай праўдай,— нарэшце, высокім майстэрствам.

Майстэрства... А што гэта азначае ў дачыненні да маладога паэта? Спружыністую сілу радка? Гэта, вядома, нейкім чынам важна, і гэта ёсць поўнай мерай у Барадуліна. Вынаходлівасць рыфмы? Трапнасць метафары? Ёсць, ёсць. Умельства на патрэбнай ноце, на выразнай канцоўцы абарваць верш? Яшчэ якое!

Аеру корань у віры,
Як вуж бліскучы, паласаты.
(«Чарот у кольцах ледзяных»)

Вясёлка сяміцветная гарыць
Над крэпасцю, як ордэнская стужка.
(«Вясна ў Брэсцкай крэпасці»)

Як кураняты, кволыя, пушыстыя,
Праклюнуліся коцікі вярбы...
(«І зноў вясна гасцюе на Ушаччыне»)

Чым гэта блага? Вельмі нават не блага. Дык значыць — майстэрства? Але ж майстэрства — гэта не

толькі фармальная адзнака радка, яно найперш з'ява, так сказаць, светапогляднага, мастацка-тыпалагічнага парадку, што ў канкрэтна-мастацкім кантэксце служыць выяўленню асобы паэта ва ўсёй разнастайнасці яе сувязей са светам. Майстэрства — прыналежнасць стылю. Узятае само па сабе, у межах радка ці страфы, яно — толькі ўмельства, не болей.

Што дае падставы ў першай кнізе Барадуліна гаварыць пра адзнакі менавіта ягонага стылю? Па-першае, вядома, мастацкая трасфармацыя пэўнага жыццёвага вопыту пры значным даверы да яго. Гэта не толькі цалінны вопыт, дарэчы, не такі ўжо і багаты, хоць ён і даў цудоўную «Насціну кухню» і шэраг іншых вершаў, прыцягальных тэматычнай навізной. Гэта найперш, можа, спроба заяўкі на паэтычную біяграфію таго пакалення, дзяцінства якога, паводле слоў іншага паэта, прайшло «пад гарматнымі ствапамі». У гэтым сэнсе праграмным быў якраз верш «Бацьку», які адразу заўважыла і адзначыла крытыка.

Не плакаў я — усім на злосць,
Бо ў хаце быў адзін — мужчына.
Не йшоў ты...
Маці маладосць
Глыбей заворвалі маршчыны.

У свой час Я. Брыль, пісьменнік добрага паэтычнага слыху, заўважыў у той кніжцы і нешта іншае — верш «Калаўроты», трохі як бы чужы тут сваёй аб'ектывізавана-мастацкай замалёвачна-наглядняй манерай, сваёй этнаграфічнасцю, урэшце. Крытыка як бы прадбачыла адну з ліній далейшага развіцця паэта — лінію на паэтызацыю рэчы, быту, узятых то ў абагулена-фальклорнай, то ў падкрэслена празаічнай, бытавой аздобцы. А то і аб'яднаных гэтым сінтэтычным бачаннем у межах адной задумы. Рыгор Бярозкін у «Вясновай замалёўцы на беразе Ваўчэнскага возера» (зб. «Нагбом», 1963) так радаваўся менавіта гэтаму сплаву фальклору, быту, усмешкі і характару, вось чаму ў другім паэтавым зборніку «Рунець, красавадь, налівацца» (1961) вылучаў ён «Палату мінёраў», нібы прадракаючы з'яўленне пазнейшай барадулінскай «Блакады». Вось што значыць чуццё сапраўднага крытыка!

Гэта сёння яскрава бачыш, што ўжо і «Маладзік над стэпам» няхай сабе яшчэ і нясмела, але значыць

сабой магчымасці далейшага паэтавага развіцця: побач з добрай увагай да кутка роднай яму Ушаччыны — цяга да нетутэйшага, геаграфічна новага; вострая цікавасць да размаітасцей жыцця, да бытавых ягоных адзнак суседнічае са спробай зазірнуць у сам характар свайго і чужога народа, у адметнасць ягонага лёсу, побыту. Яшчэ нясмела, вобмацкам, пра гэта як у цаліннай нізцы, так і ў раздзеле «Мае браты, мае суседзі» — пра паездку ў народную Польшчу. Пасля гэтага бадай ніводная новая кніжка Барадуліна не будзе абыходзіцца без падобных раздзелаў — незалежна ад таго, будуць яны знарок выдзеленыя ці прыхаваныя ў агульным корпусе вершаў.

Даволі частая заканамернасць: другая кніжка паэта рэдка калі бывае, не скажу, слабей — арганічней за кніжку першую. Здавалася б, набыты нейкі вопыт, неабыякава паставілася крытыка, а нейкае ўражанне ці то замінкі, ці то разгубленасці амаль заўсёды ёсць. Шмат на тое бывае прычын. Нежаданне паўтараць сябе, і ў выніку — паспешлівы пошук новага, аж да імкнення пераманіць і так яшчэ не надта ўстойлівую манеру. Бянтэжыць і той высокі аванс, што выдадзены ўжо крытыкай і чытачом,— бянтэжыць і часта збівае з тропу. Да таго ж адчувальнае і жаданне канкрэтызаваць знойдзенае, паглыбіць эмоцыю развагай, а ўсё гэта патрабуе, што ні кажыце, пэўнай унутранай перабудовы, якая і не заўсёды можа адразу ці адбыцца, ці трансфармавацца ў вершы. А чытач ці не чакае, а крытык ці не прыглядаецца прыдзірліва... Трэба спяшацца. Вось і небяспека сарваць голас.

Барадулін у другой кніжцы голас не сарваў, хоць дзе-нідзе яго, можа, і перанапружыў.

Тая ўнутраная перабудова, пра якую згадвалася, тут сапраўды навідавоку. Ідзе яна па двух асноўных напрамках: далейшае асваенне сучаснага матэрыялу, як правіла, самага надзённага (пасля цаліны — Нафтабуд), побач з дападзеннем да вытокаў свядомай сваёй біяграфіі — да ваеннага і пасляваеннага дзяцінства. Гэты другі пласт аказаўся найбольш душэўна і паэтычна перажытым, а значыць, і найбольш дакладна ўвасобленым. Як, напрыклад, у той жа «Палаце мінёраў», як у «Трубе», «Стэарынавай свечцы», «Хлебніч-

ку», дзе вайна ўзноўлена праз дзіцячае перажыванне, праз яе адбітак у псіхалогіі, побыце.

Заўзята мы лапацім агароды,
Каб леташнюю бульбіну знайсці.
(«Стэарынавая свечка»)

Або такая згадка:

Руку аднагодак працягвае мне,
Пацісну я куксу ў шрамах, бы ў разорах.
(«Палата мінёраў»)

Сёння, з адлегласці часу, відаць, што вершы іншага плана, нафтабудаўскія, напрыклад, не ўсюды ўдаліся аўтару, што нейкі камандзіровачны адбітак усё ж ляжыць на іх. Але адчуваецца і вострая аўтарава прыкметлівасць на дэталь, уменне «выцягнуць» яе на метафару, на сімвал, а таксама густое жывапісанне словам. Малюнак рабочай раніцы:

Цяжкімі кірзавымі ботамі
Ступае па жвіры падмоклым,
Густую фарбу, вапну боўтае,
Спрабуе пэндзаль, косіць вокам.
(«Раніца»)

Здаюцца штучнымі па вырашэнню задумы «Інтэгралы на цэгле», але затое натуральнасцю, усмешлівасцю сваёй кранае, здавалася б, «несур'ёзны» верш «Глушцы і шматтыражка». Тыя «інтэгралы», знакі будучага, што не ажывілі ў вершы цэглу ці не ажылі ў ёй, застаўшыся толькі знакам задумы, тут, у «Глушцах...», канкрэтызаваліся, набылі праз усмешлівы расказ пра мясцовага паэта і вясновых птушак, «павязаных рыфмай», пераканаўчае мастацкае быццё і сказалі пра цуд нараджэння новага горада, новых прафесій і новых адносін паміж людзьмі непараўнальна больш, чым змушаная сімволіка «Інтэгралаў...».

Але ёсць яшчэ і нешта іншае ў зборніку, гаворку аб чым пакінулі мы на астачу. Ёсць адзнакі і прыкметы адчувальна новага Барадуліна-паэта, таго, якога мы ведаем сёння — з яго энергічнай, але грунтоўнай апавядальнасцю, з яго выразна акцэнтаваным вершам, з яго своеасаблівай рыфмоўкай, з любоўю да выразна аўтарскага, індывідуальнага слоўніка.

У горле перасядзе ветру ком,—
Заперхае уранні восень суха.
Ляжыць узмежак кормным вепруком,
На хібе шчэцце шэжыцца свінуха.
(«Свінуха»)

Якая выразная, быццам напісаная сённяшнім Барадуліным, страфа!

Наўрад ці можна памыліцца, сказаўшы, што такія вершы, як «Свінуха», «Палата мінёраў», «Снапавоз», «Цялушка», стаяць трохі адасоблена ў зборніку. Больш таго, гэта, можа, найбольш удалыя вершы самі па сабе, не кажучы нават пра тое, што гэта самыя «перспектыўныя» вершы, у тым сэнсе, што паэтычная лінія, азначаная імі, будзе мець у творчасці Барадуліна самы плённы і здоўжаны ў часе працяг. Будзе мець працяг гэтае выразнае рытмічнае чляненне радка, разлік на яго вымаўленне, і гэтае панаванне зычных, што дае багатыя магчымасці для алітэрацый, і гранічная бытавая канкрэтнасць вобраза, і ўвачавідкі мясцовыя гэтыя, але зразумелыя ў кантэксце «заперхае», «шэжыцца» і г. д.

На чарзе былі самыя вызначальныя для Барадуліна-паэта кніжкі: «Нагбом» (1963) і «Неруш» (1966).

Ледзь возьмецца на дзень —
цягну
са свежым словам невад.

Гэтыя паэтавы словы самі нібы просяцца стаць эпіграфам, бо надта ж стасуюцца да барадулінскай манеры жыць радком, да яго рытмадня са згадкай пра ранішняе «свята пчалы», ранішнюю малітву са словам і над словам. Барадулін — паэт, наогул не надта шчодры на аўтарскае «я», усё-ткі зрэдзь абзавецца то радком-самахарактарыстыкай, то намёкам, то ўскосным сведчаннем пра сваю творчую таямніцу, як, напрыклад, у пазнейшым вершы «Андрэю Вазнясенскаму», дзе той падкрэслена і свядома названы «рускай мовы вялікім прыгоннікам». А мне помніцца, што ў першай публікацыі (ці ў аўтарскім чытанні?) гучаў радок трошкі інакш: «рускай мовы чаляднік бяссонны», што, можа, нават і лепш, больш па-беларуску і ў большай ступені прыкладаецца намі да практыкі і самога Барадуліна.

У зборніку «Нагбом» паэт прызнаецца:

Сосны спрадвечныя мне зазвіняць
Купалаўскімі радкамі.

Пра Купалу ён наогул згадвае часта, варта прыгадаць такія вершы, як «Янку Купалу», «Купалянятам», «Каб усе вятры Беларусі...». Згадвае на мяжы

нейкай вельмі асабістай крэўнасці: «Іван Дамінікавіч, дзядзька Янка, Купала...» І сапраўды, дзе, як не ў Купалы, не ў нашай фальклорнай стыхіі шукаць карані барадулінскага, такога шчодрага і ранішняга нейкага, слова, ягонай «паганскай» (так, так!) здольнасці паспытаць рэч навобмацак, на слых, на пах і на смак, з яго здольнасцю самому стаць адначасна як бы суб'ектам і аб'ектам творчасці. Ці ж не «па-паганску» і як бы мімаходзь ён аднойчы напіша:

Яліны
хіляць галіны —
моляцца богу агню.
(«Касцёр, што грэе азяблы вечар»)

Барадулінскае «вогнепаклонства» — ад часоў паганскага светаадчування, што надзяляла рэчы і з'явы душой і помыслам, не адлучаючы разам з тым дух ад фізічнай абалонкі і наадварот — натуральны стан чалавека ў тую пару, калі ён «естества не пытал горнилом, весами и мерой» (Баратынскі). Прачытайце ў «Нерушы» цудоўную «Шапку», дзе так арганічна сама рэч, шапка, упісана ў цыкл гаспадаровага працоўнага быцця, у сам гадавы працоўны цыкл.

У кішэню
Яе паклаў таропка гаспадар
І прывітаў з пашанаю Ярылу
Ды папрасіў, каб ярыне спрыяў ён.

Вось і паганскі Ярыла якраз патрапіўся тут — натуральна і адзіна неабходна, паводле таго ж натуральнага закону, што дыктуе паэту зблізіць у радку ярыну п імем самога паганскага бога.

А барадулінскі «Паром» вазьміце. Якая раскоша фарбаў, гукаў, цяпла, суладнасці чалавечага жыцця з самім прыродным цыклам, дзе сам Чэрвень, сінонім Сенакоса, «за паромшчыка стаіць». Летні месяц, сенакосная пара — гэта не проста адзнака часу, але з'ява са сваім уласным імем, з'ява персаніфікаваная без усялякай нацяжкі, толькі паводле сваёй жыццядайнай сутнасці. А чаму не ўспомніць «Год», прысвечаны А. Вялюгіну,— верш з вольным дыханнем радка, нягледзячы на выключны лаканізм сродкаў пры густой насычанасці вобразам, гукам.

У Белавежы — лосьна, язьна ў Шчары,
З лясной крыніцы агнявы глыток.
Узважлівая яснасць дзёрзкай мары
І стрыманасці першы халадок.

Тры апошнія радкі гэта і сапраўды ад вялюгінскай паэтыкі, ад яго звычкі адцягненае канкрэтызаваць праз пачуццёвае і зрокавае,— і з якім майстэрствам, мімаходзь, узнаўляе гэтую чужую стылістычную адзнаку Барадулін-паэт. Што за раскаваны, падатлівы, пры ўсёй сваёй жорсткай дысцыпліне, што за чуйны талент! Ягоныя «Лодкі» прыгадайце, што з возера пад паветку плывуць на калёсах, «як даўна іх сёстры далёкія «з варагаў у грэкі». Тут ужо і недвухсэнсоўная спасылка вунь на якую даўніну, вунь на якую нашу перадгісторыю. «Дзядзька Янка, Купала» блізкі Барадуліну найперш глыбіннай сваёй, «светаадчувальнай» сутнасцю, сваімі глыбінна-нацыянальнымі вытокамі, можа, не столькі «Курганам», які чамусьці найчасцей звязваецца з імем Купалы, колькі «Адвечнай песняй» і унікальнай у славянскай паэзіі наогул паэмай «Яна і я» або нейкай нядзельнай урачыстасцю вершаў ляўкоўскага цыкла. Нават чыста фанетычная насычанасць Купалавага радка, часам да абцяжаранасці, адчуваецца ў Барадуліна, як і цяга да «празрыстасці» — эмацыянальнай і гукавой, той празрыстасці, што пануе ў «Безназоўным» і ў такім «ляўкоўскім» шэдэўры, як «Лён». Тое, што Барадулін можа «прарвацца» да навочнай прастаты, аж у Багдановічавым разуменні, чаму сведчаннем можа быць такі верш, як «Матылёк» («Лілею млявы плёс люляе...»), вытокі якога, дарэчы, падкрэслівае сам Барадулін эпіграфам з паэта,— гаворыць не толькі аб выключных ягоных мастакоўскіх магчымасцях, у прыватнасці, стылёвых, але і аб сталым разуменні дачыненняў формы і зместу, аб разуменні той шкоды, што вынікае з жорсткай прыналежнасці кампанентам і адзнакам раз абранай вузкай манеры. І пры ўсім тым вы не скажаце, што Барадуліну ўласцівы нейкі эклектызм. Ягоны надзейны ратунак, ягоная заўсёдная апора — па-харошаму натуральная заземленасць ягонага таленту як у фальклорнай стыхіі з яе ўменнем абагульняць, так і ў добрай эмацыянальнай і бытавой відушчасці на адзнакі самай непасрэднай, навочнай сучаснасці ў акаляючым жыцці:

Дажджы ў нейлонавым плашчы
Ідуць узбоч дарогі.

(«Парк»)

Паразважаўшы, можна нават прыблізна вылічыць год, у якім быў напісаны гэты, ці такога ж плана, верш. Хто не памятае моды на тыя плашчы!

«Нагбом» і «Неруш» шмат значылі ў творчым станаўленні сталага Барадуліна. Яны цікавыя як напружанасцю далейшага аўтаравага пошуку, так і навочным, натуральным і ўдалым зліццём разнародных, на першы погляд, тэндэнцый індывідуальнага стылю. Сапраўды, як бы набірае сілу і замацоўваецца традыцыйна-рытмічная схема верша ў такіх рэчах, як «Год», «Лодкі», стыхія класічнага белага верша пануе ў «Шапцы», выключнай рытмічнай і стылістычнай грабнасцю пазначаны «Матылёк», а дзе ж увага да своеасаблівага, па-барадулінску зразуметага верлібра, да якога былі подступы ў ранейшых кніжках паэта?

Верлібр ёсць, і, трэба сказаць, удалы. Толькі Барадулін не прызнаé, і добра, што не прызнае, раскалыванага, расхлістанага вялага верлібра.

Яшчэ нямая
хвіліна адна...
Трал падымаюць
са дна марскога.
Лябёдкі жаласны скогат...
Кухталі —
костачкі прыгаршчаў трала,
шкляныя,
балюча занылі:
рабрыну лічыць пачалі.

Верлібр? Акцэнтавік? Барадулін як бы спрачаецца з тымі, што не бачаць у верлібры высокай, вышэйшай нават, арганізацыі калі не радка (радок — не тое вымярэнне), то самой масы верша, законы чляне́ння якой зусім іншыя, чым у верша рэгулярнага. І заўважце, што Барадулін ніякім чынам не адмаўляецца ад рыфмы, вось толькі разумеецца яна інакш, як знак рытмічнай апоры, акцэнту, як пік своеасаблівай кардыяграмы самога верша, дыханне якога ніякім чынам не зададзена наперад вылічанай рытмічнай структурай. Вось ланцужок: нямая — адна — падымаюць — са дна — марскога — скогат. Як багата для малой паэтычнай плошчы!

Такі ж наглядны прыклад — «Маралу зразаюць панты...»:

Дрыжыкі
Па целе,

Марал пацее
У тры паты.
Панты
Зразаюць
Нажоўкай.
Капыты
Б'юцца па жоўклай
Траве...
Трывае...

Проста-такі нейкі трыумф гукавой, рытмічнай, графічнай, нарэшце, вынаходлівасці, калі ўжо і рыфма, унутраная, асацыятыўная, састаўная, дэманстратыўна заняўшы як бы не сваё традыцыйнае месца, прыхаваная быццам, не можа ўсё ж схаваць сябе. І калі ў першым выпадку верш пры жаданні можна ўсё ж разгарнуць у такі-сякі дольнік, то паспрабуйце зрабіць «рэгулярную» схему з другога верша, «традыцыйна» аздобленага рыфмай,— наўрад ці ўдасца.

І гэтак часта будзе пазней у Барадуліна.

Жаданне пазначыць шлях паэта як адно непарыўнае, без прывалаў, узыходжанне да нейкіх вяршынь заўсёды спакуслівае, але не заўсёды адпавядае праўдзе паэтычнага росту. Прывалы бываюць, яны, можа, неабходныя нават, каб агледзецца і набрацца новых сіл. Паэт — падарожнік, а хто асудзіць падарожніка за хвіліну адчутай стомы, за вымушаны «перакур».

У кнізе выбранага «Свята пчалы» (1975) зборнікі «Адам і Ева» (1968) і «Лінія перамены дат» (1969), «Вяртанне ў першы снег» (1972) прадстаўлены значна бядней, чым папярэднія. Такая, мусіць, воля аўтара і такая мера ягонай патрабавальнасці да сябе ранейшага. Харошая і разумная мера.

Для Барадуліна наставала пара развагі, незадаволенасці раней знойдзеным, неадпаведнасці сябе сённяшняга сабе ўчарашняму. На дапамогу прыходзяць выратавальная журба, нейкае трохі стомленае пасміханне зноў жа з сябе. Нейкая перанасычанасць уражаннямі, падарожнай экзотыкай, мільгаценнем дзён і мясцін, чалавечых аблiччаў і краявідаў. Недзе ў Сярэдняй Азіі можа раптам здацца, што «да дрыжыкаў картава рыпяць карагачы: «Завея і атава... Цяпер па-рра-га-чы!» У Латвіі гояць душу сутойлівыя цені і мяккія фарбы вечара («Старая Латвія»), недзе на поўдні субтрапічным ранкам трохі стомленая, але і пасталелая думка адзначае:

Ластаўка ля самае вады.
Б'ецца рыба слізкая, цяжкая
(Тол глухі, з капрону невады —
Гэта ўсё яшчэ яе чакае).

(«Субтрапічная раніца»)

Бачанне як бы запавольваецца, думка марудзіць нарадзіцца. Гнятлівы, але жыватворны зацішак. Напрыклад, у «Палескіх уражаннях» (во ўжо і Беларусь!) гэты стан, гэты настрой не схаваны ад чытача, што, урэшце, не можа не імпанаваць яму як знак добрага даверу аўтара, як выява ягонай сумленнасці і шчырасці. Сапраўды, ці не бывае, калі чалавеку хочацца ўбачыць сябе

На ранніх лугах без аброці,
Аб ворыве, аб сяўбе
Забыцца ў начной адзіноце.

Гэты нечакана сцішны, раздумлівы Барадулін з вялікай сілай уражвае нас, прымушае задумацца аб нерэалізаваных нашых душэўных багаццях, што, прыхаваныя да часу, адно чакаюць сваёй такой вось зусім не экзатычнай начы на расяным беларускім поплаве. Кругамі сваіх вандровак, усё больш звужаючы гэтыя кругі, Барадулін вяртаецца зноў, можа, упершыню так навочна пасля першай сваёй кніжкі, так душэўна неабходна, і на «малую» сваю радзіму, на Ушаччыну, на парог н е к а л і бацькавай, а цяпер ужо і н е к а л і матчынай хаты. Але...

Дзень добры, мама!
Паклон,
Ушаччына...

«Трэба дома бываць часцей». Гэтыя даўнія барадулінскія радкі, душэўна сумеўшыся, міжволі згадваеш тут, і поўняцца яны нейкім дадатковым, хоць і не без горычы, сэнсам, у якім як цана любасці, так і страты, і яна, страта, робіць гэтую цану, можа, яшчэ даражэйшай, вучачы мужнасці перад жыццём і вернасці матчынаму, а значыць, і народнаму запавету, пакінутаму ў спадчыну нам.

«Рум» (1974) — назва новага паэтавага зборніка, і ў ёй, як сама стракатасць жыцця, адвечная незавершанасць яго, як сустрэча-развітанне з мінулым, так і надзея на будучыню. Поўная мера жыцця. Сталасць. «Мы зноў з табой удвух. Цяпер мы болей бачым»,— кажа паэт знаёмаму бору. «...Дакорам не крану, падзя-

кай не зазначу, што дошак на труну для маці даў, зямляча».

— Нябось, бяроза,
Нябось, белая,
Я к табе вясной буду,
З табою шумець буду,
Цябе зеляніць буду...

«Бяроза з лістам гаманіла». Ліст ёй так адказваў. Як талент сапраўдны, Барадулін не прыхарошвае ні болю жыцця, ні яго радасцей, як не зрываецца ў бяздумнасць, у танны аптымізм, не гаварыць «ад імя і па даручэнню», калі страчваецца мера асабістасці, а тым часам і мера маральная. Калі парушаецца праўда ўзаемаадносін асобы з самім жыццём, нішчыцца давер да ўласнага вопыту як да паўнапраўнай часцінкі вопыту ўсеагульнага. Як ні кажыце, паэзія без выяўлення ў ёй асабістага, шчырага і некрывадушнага, выяўлення, усё ж марнасць, прывід, фантом. Не бойцеся асабістасці, нібы гаворыць нам паэт, можа, найбольш аб'ектыўны паводле сваёй манеры сярод іншых нашых паэтаў. І такое сведчанне тым больш яскравае і пераканаўчае. ...І вось пра што яшчэ думаеш: ці быў бы ў нашым уяўленні, у нашай чытацкай свядомасці Барадулін тым паэтам, якога мы ведаем і любім, без гэтага вобраза роднага кута, любай яму Ушаччыны і яе людзей, без глыбока прачутай матчынай тэмы,— без усяго таго, што надае непаўторна-лірычны, асабісты пачатак і каларыт ягонай у аснове сваёй аналітычнай творчасці? Думаецца, што не. Вось, напрыклад, у нашай сучаснай паэзіі мне, чытачу, цяжка знайсці што-небудзь роўнае па глыбіні пранікнення ў фальклор, па творчай інтэрпрэтацыі яго барадулінскім «матчыным песням». Гэта не творчасць «у стылі» і «паводле», гэта і не перайманне і не тое, што мы падводзім пад паняцце ўплыву, дабратворнага ці яшчэ якога. Гэта суперніцтва, гэта парыў творцы, якому дзякуючы ўласцівасцям свайго таленту пашчасціла стаць упоравень з мастацкай думкай народнай, не перастаючы быць сучасным паэтам са сваім імем і прозвішчам. Гэты вопыт Барадуліна ці не сведчыць, якія марныя бываюць усе нашыя размовы пра народнасць і даступнасць творчасці, калі яны не ідуць далей агульных тэарэтычных разваг, спасылак на класіку, не заўсёды пераканаўчых, бо ігнаруецца гісторыка-літаратурны

падыход, бо не ўлічваецца ступень самавызначэння, прафесіяналізацыі ў самой літаратуры, як не ўлічваецца і ступень таленавітасці саміх аўтараў. Ці не праўда, што вучобай у фальклору, «народнасцю» прыкрываюцца часам сама непераборлівасць і мастацкая бездапаможнасць? Важна, канечне, і тое, што «матчыны песні» ніякая не выпадковасць у паэтавай творчасці, не эксперымент, а толькі звяно ў матчынай тэме, якая так паслядоўна і арыгінальна распрацоўваецца паэтам на працягу ўсёй ягонай творчасці, урэшце, гэта тэма маці-Радзімы, якая не задавальняецца ні прахадной паэтычнай публіцыстыкай, ні чуллівай, але не прачулай лірыкай, што, бывае, гучыць па радыё ці з эстрады. Важна, што да народнай творчасці паэт звяртаецца не для таго, каб пацвердзіць нейкую раз назаўсёды ўсталяваную пэўнасць формы і зместу (яму гэтага якраз не трэба), а наадварот, пацвярджае «ўзрыўчатасць» фальклору, да якога адчуваецца ўсё ж пэўны недавер у сучасных паэтаў, выяўленнем у ім таго, што сугучна пошукам самай смелай сучаснай мастацкай думкі. Хоць і не задзірыста, але ўсё ж палемічна згадвае ён, напрыклад, у верлібры «Не ведаючы тэорыі вольных вершаў...» («Амплітуда смеласці», 1983) пра тое, як маці пісала яму лісты «верлібрам без знакаў прыпынку, без абавязковых вялікіх літар», лісты, у якіх «прарываліся самі рыфмы» і «не вытыркаліся вельмі, яны перагукваліся па сутнасці: мой сынок, каласок, васілёк, барвовое зеллейка, мой каласутанька...». Які, дарэчы, удалы прыклад верлібра, прысвечанага «тэарэтычнаму» высвятленню генезіса і самой гэтай формы. Як гэта зроблена па-барадулінску дасціпна і разумна, ашчадна і пераканальна.

А пра самую матчыну песню ў «Вечаллі» (1980) Барадулін скажа так:

Рук ты не чула,
Але спачувала,
Што ў перапёлкі ножкі баляць.

Проста і мудра сказана, як можа толькі сказаць паэт, які думку, пачуццё, боль народны і погляд народны пераняў ад народнага самога жыцця і ўсё той жа матчынай песні, каб шукаць у новым дні новыя словы і новыя гукі для ўзвелічэння і праслаўлення багаццяў народнай душы. Глыбока нацыянальная аснова

барадулінскай паэзіі пасведчана ўсёй ягонай паэтычнай практыкай, ён паэт з глыбокімі каранямі — як літаратурнымі, так і жыццёвымі, і якога жалю варты той, хто іншы раз крывіцца на высокі, занадта высокі для сябе, узровень барадулінскага прафесіяналізму, не бачачы ці не хочучы бачыць, што ён падмацоўваецца дакладным, зацікаўленым веданнем жыцця, вялікай паэтычнай уражлівасцю, сталасцю думкі. Гэтая сталасць думкі, яе заглыбленасць у стыхіі народнага жыцця дае магчымасць выявіцца эпічным асаблівасцям таленту паэта, найперш, вядома, у жанры паэмы.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што ў першай сваёй паэме Барадулін звярнуўся да гадоў ваеннага і пасляваеннага дзяцінства, да лёсу бязбацькавічаў, тыповага для пасляваеннай сям'і.

Два-тры гады аддзяляюць «Трыпціх» у канчатковым складзе ад вершаў зборніка «Рунець, красавацць, налівацца» (1961), а як заўважна па ім пасталенне паэтычнага майстэрства, ускладненне задачы, узятай на сябе аўтарам. Бо тыя дэталі мястэчковага побыту, якія раней проста абыгрываліся ці наіўна-сімвалічна ўзбуйняліся («Труба»), тут, разгорнутыя ў плыні часу, у межаванні чалавечых лёсаў, набываюць новае, сапраўды эпічнае гучанне. Здаецца, варта было толькі рашыцца на буйнейшы жанр, на поўны давер да мастацкай каштоўнасці пеpажытага, а ўжо сама задача паэта заключалася хіба ў тым, каб успомніць, не забыцца, не абмінуць, настолькі і побыт, і самі чалавечыя лёсы былі абагулена-сімвалічныя самі па сабе, вызваленыя ад усяго знешняга, выпадковага. Само жыццё, спрашчаючы, узбуйняла дэталі, яно як бы выступала творцам-эпікам. Гэта праўда, што для эпасу патрэбен і эпічны стан самога жыцця. Думка даўняя, яшчэ гегелеўская. Ну вось хаця б такая, закончаная ў сваёй прастаце і паўторнасці «формула» руху, за якой — увесь жах, уся скруха існавання ўдавы і яе сына.

Мы з маці —
усёй сям'ёй
Рэзалі дровы зімою.
Два крокі
я йшоў за пілой,
Тры крокі —
назад
з пілою.

«Быў нейкі зусім незвычайны дзень» — гаворыць паэт пра тое, як пачалі складваць новую хату, пра настрой як бы першага дня стварэння свету. І мы так разумеем аўтара!

Ціха зрабілася ў наваколлі.
Хату імшылі.
Дажджы-грыбасеі
з прычыны такой не імжылі.

І як роўна вытрымлівае аўтар эпічны свой сказ, якія сапраўды эпічныя прыёмы падказвае яму як традыцыйны парадак будаўніцтва хаты, так і парадак бядотнага жыцця:

Узыходзіла сонца — глядзела ў акно,
вышэй падымалася — другое лашчыла.
. . . .
Нарэшце,
сонца ў нас пачало паўднявацць —
акно прарэзалі трэцяе.

Вунь у якую пару засвойваў паэт гэтае «фальклорнае» бачанне, вось чаму так прыдалося яно яму ў пару першых ягоных кніжак, каб, пасталеўшы разам з ім, жывіць і сённяшнюю паэтаву творчасць думкай пра выключную каштоўнасць гэтага вопыту, пра тое, што «кожны мае свае Ушачы, хату і двор, пазарастаны маркоўнікам...».

«Блакада» (1968) сталася новым кругам у асваенні балючай для Барадуліна і яго пакалення тэмы вайны. Перачытаная сёння, паэма гэтая ўражвае мо болей, ні чым тады, калі яна была літаратурнай навінкай. Ці не дзіўна такое? Уласцівасць сапраўды таленавітага твора не старэць, не мізарнець і не бляknуць, а як бы набіраць дадатковую сілу разам з плынню ўсё новага часу — гэтую ўласцівасць барадулінская «Блакада» дэманструе надзвычай яскрава. Без перабольшвання можна сказаць, што сёння ўжо гэта наша класіка, бо належыць да таго несумненна лепшага, што створана нашай паэзіяй пра вайну. Калі мы чытаем у «Блакадзе» пра тое, як «памалу хлопчык ідзе па бядзе», па замініраваным полі, гнаны туды з бараною і буланым нямецкім вылюдкам з аўтаматам, ці не ўспамінаецца нам сын Алеся Рыбкі з Куляшовага «Сцяга брыгады», што ўтрапёны бег па лесе і па бацькавым «сэрцы такшто сама». Тое, што ў Куляшова празвінела адной балючай струной, у паэта іншага пакалення стала зыходным у распрацоўцы тэмы ваеннага ліхалецця, біяграфічнай

дадзенасцю і адначасова правам сказаць пра гэта з той мерай адказнасці, за якою цана самога жыцця: «сказать хочу — и так, как я хочу» (Твардоўскі). Але гэта і цана мастацтва — прынамсі, ягонай праўды, а праўда ў сумленнай, сапраўднай літаратуры — катэгорыя не толькі сацыяльная, але і эстэтычна-этычная. Праўда вырастае з памяці, і вось чаму такое распаўсюджанне атрымалі крылатыя словы з жалобнага мемарыялу: «ніхто не забыты, нішто не забыта».

Салдаты бетонныя
здымуць бетонныя каскі
Над курганамі,
слязьмі абмытымі.

Але пакуль памяць жывая, ёй не трэба ставіць помнікі, яна сама — помнік, а што ўжо казаць пра тую памяць, якую дае чалавеку сапраўднае і, зноў жа, сумленнае мастацтва? Гэта — надоўга. Бо гэта — кожны раз перажыванне, суперажыванне, узнаўленне праўды, трапяткой і жывой, усё той жа сілаю мастацкага слова. Хіба раскажа помнік таму, хто не зведаў вайны, як

У складчыну горкую п'юць удовы.
Пеўні галовы
Кладуць на калодкі.
Вясну забралі
блакада,
балоты.

Хіба ён раскажа пра тое, як усё доўжыцца вайна ў мірным чалавечым лёсе, як «у бальніцы раённай партызан памірае» — і, можа, не ад адных толькі ран — ад пакутнай памяці вайны, ад неўладкаванага побыту, ад няздольнасці пераключыцца на новыя ўражанні, перайсці на «мірныя рэйкі».

Быў крыху на вышынях
У раённых маштабах —
Пахадзіў у старшынях,
Брыгадзірах, прарабах.

Не толькі праўдзіва і дакладна ўзноўленай у ваенным часе атрымалася ў Барадуліна блакада, пакуты партызан і мірных жыхароў, але і сённяшні яе працяг у нашай памяці, у нашым лёсе, у псіхалагічным тонусе нашага жыцця (назвы раздзелаў: «Бяссонніца», «Блакада сэрца» і інш.).

Тая зайздросная ўпэўненасць майстра, што была прадэманстравана Барадуліным ужо ў «Трыпціху», у

«Блакадзе» выявілася з асаблівай, скандэнсаванай сілай. Здаецца, чытачу іншы раз нават схочацца перадыху: так бязлітасна-праўдзіва, так густа, але скупа-дакладна перададзена пакутнае трыванне асуджаных на смерць ці на ганьбу людзей. Але Барадулін не быў бы мастаком, каб не адчуваў, дзе іменна трэба зрабіць гэты «перадых», уводзячы ў мастацкую тканіну паэмы то замову-малітву — сапраўдны цуд слоўнага вынаходніцтва і пракаветнай нейкай, вусцішнай паэзіі, то галашэнне, то фальклорны зварот. Барадулін тут у вольнай і папраўдзе сваёй стыхіі, бо ён сапраўды выдатны тлумачальнік фальклорнага мыслення.

На лузе стажар'е выбухаў стыне.
Чарнеюць пад небам стагі густыя.
Іржуць ашалела здзічэлыя коні —
Не скублі гэткіх стагоў ніколі.

А вось ужо нешта другое, такое, напрыклад:

Я — Купалінька,
Я — самотная.
Крывянее чорны туман.
Мне нядзеляй не быць,
Быць суботаю.
Я — Купалінька,
Дзе ты,
Іван?

Фальклорная аснова тут, канечне, відавочная, але «прататып» яе ўсё ж хутчэй літаратурны: відавочная бсуаднесенасць у двух гэтых урыўках як самога вобразнага і стылістычнага ладу, так і самой паралелі Купалінькі з выдатным помнікам старажытнарускай літаратуры — «Словам аб палку Ігаравым». І зроблена гэта зграбна і непрымушана. Мімаходзь вось яшчэ што. Не ведаю, ці прыходзіла такое на думку Барадуліну, а мне ўявіць яго, напрыклад, перакладчыкам «Слова...» на сучасную беларускую мову чамусьці натуральна і радасна. Бо, здаецца, пара такога перакладу, на ўзроўні мажлівасцей як сучаснай нашай мовы, так і сённяшняга прачытання выдатнага помніка, ужо настала.

А што датычыць паэмнай творчасці паэта, то слова аб ёй было б няпоўным, калі не згадаць ягонай «Смаргонскай акадэміі» — гэтай, бадай, адзінай у цяперашняй нашай паэзіі спробы сатырычнай паэмы на фальклорна-гістарычнай аснове. У тым, што Барадулін

прыйшоў да такой паэмы, няма нічога дзіўнага: яго-ны гумар (ён аўтар больш за паўдзесятка гумарыстычных кніжак), вострая характарнасць (у тэатральным значэнні) ягонага слоўнага жэста, разнастайнасць рытмічнай структуры верша, уменне імітаваць, калі трэба, і стылізаваць — вось тая ўзброенасць, з якой паэт «выйшаў на мядзведзя» абранага жанру. Бо і сапраўды ў паэме тое-сёе тычыцца мядзведзяў — між іншым, як і людзей. Пададзім разам з аўтарам энцыклапедычную даведку: «Смаргонская акадэмія», жартоўная народная назва промыслу лавіць і дрэсіраваць мядзведзяў, заснавана кн. Радзівіламі ў 17-м ст. у Смаргоні (Гродзенская вобл.); адна з школ бел. скамарохаў». А пачалося нібыта з таго, што мядзведзям «быць дрымучымі, быццам бы дрымучы бор,— знадакучыла». Як на тое, і «акадэмія» адкрылася якраз.

Мядзведзям у людзей
Ёсць чаму вучыцца!

І бедным мядзведзям даводзіцца праходзіць школу чалавечай вывучкі, пераймаць чалавечыя звычкі ды нораў,— вядома, горшае ў іх, бо горшаму навучыцца часам і выгадней і прасцей.

Шчэр усмешкай ляпу —
І тае навукі!
Лапы ўжо
Не лапы,
Нейкім чынам —
Рукі.
Імі капялюш трымай,
Як мацней пляскай,
Што даюць —
Прымай,
Пазірай з ласкай!

Тут, канечне, шмат прастору для сатыры і гумару, і паэт напоўніцу і бліскуча карыстаецца сваімі, створанымі ім жа самім магчымасцямі. Пісаць пра гэтую барадулінскую рэч цяжка, яе трэба чытаць, ап'яняючыся рытмамі, досціпам, гукапісам, рызыкоўным часам жартам, намёкам, злой філіпікай у блазенскім уборы, чытаць, здзіўляючыся невычэрпнай фантазіі аўтара, ягонаму валоданню ладам ды складам скамарошнага, батлеечнага, блазненскага раешніка, дзейства, пераўвасаблення.

Сумна, баця, жывяце:
Божкаеце, божкаеце.
А ўдалося ж сіраце,

З'ела курку ды з ножкамі —
Трапечацца ў жываце!

Адным словам, наведайце «Смаргонскую акадэмію»!

Пад канец трохі разваг агульнага парадку.

Ёсць свая логіка ў тым, што паэзія здаўна і паслядоўна засцерагаецца ад логік сілагізма. Пра гэта безліч разоў пасведчана самімі паэтамі. Хто не памятае славутае пушкінскае: паэзія, даруй божа, павінна быць дуркаватай. Калі мы цытуем гэта сёння ■ нейкімі абачлівымі агаворкамі, дык няйначай як збянтэжаныя крыху самой формай паэтавага выказвання. Але ж гэта, па сутнасці, тое, пра што з алімпійскім сур'ёзам казаў Гётэ: «Мне здаецца, што багатае, разнастайнае жыццё, якое праходзіць перад нашым узрокам, нечага вартае само па сабе, нават без відавочнай тэндэнцыі, якая можа памясціцца і ў адцягненае паняцце». «Адцягненае паняцце» — гэта не для паэзіі. А можа, і сапраўды? Французскі паэт і тэарэтык Рэнэ Шар ужо ў наш час піша: «Паэт на сваім шляху павінен пакідаць не доказы, а сляды. Толькі сляды прыцягальныя». Мы сказалі б: павінен пакладацца на метафару, на вобраз. Вось толькі — ці заўсёды? Бо ўспамінаецца славутае «Я вас любил...» таго ж Пушкіна. Памятаеце? Нетаропкая пульсацыя адно, здаецца, думкі, гэткі, бадай, пратакольны запіс яе: кахаў, можа, кахаю яшчэ, але не хачу надакучаць, жадаю... Ніякай так званай вобразнасці. Урачыстае панаванне сілагізма, і толькі праз канцоўку: «как дай вам бог любимой быть другим», якую мы не вымаўляем, а выдыхаем паводле законаў ці то пачуцця, хвалявання ці самога мастацтва, мы здагадваемся, што маем справу з вершам, цудоўным і горасным вершам!

Прыгадаем у Купалы:

Беларусь на куце
Ў хаце сваёй села.
Чарка мёду ў руцэ —
Пазірае смела.

Што можа быць прасцей і смялей у сваёй наглядлай вобразнасці! Але вось радкі з верша «Лён»:

Як на поле, на зямлю
Прыйшла раніца вясны,
Я пасеяла ў раллю
Жменю зёран ільняных.

Неба сеяла цяпло,
Цёплы дожджык церусіў

і г. д.

Проста-такі ваяўнічае панаванне нейкай «бязвобразнасці», але чаму тады гэтыя радкі ўражваюць? Мусіць, вобразная насычанасць страфы ці радка можа быць рознай у залежнасці як ад аўтаравай задачы, так і ягоных стылёвых магчымасцей. Не забудзем так-сама тую важную акалічнасць, што ў выпадку з Пушкіным і Купалам маем мы справу з уласна класічнай паэзіяй, з перыядам «першапачатковага накаплення», першапачатковай апрабацыі тэм, вобразных сродкаў — з непазбежным «тыпалагічным», як сказалі б цяпер, разуменнем як зместу, так і жанру, стылю. Тыпалагічным — усеагульным у сэнсе вызначальнасці з'явы, прадмета, стану праз характэрнае, агульнае ў першую чаргу. Рамантызм звычайна разбурае класічную сістэму ярка і часам дысгарманічна выказаным «я».

Сама прырода класічнай літаратуры, яе вобразнасці ў шырокім сэнсе слова, безумоўна, улічваецца творчай практыкай сучаснага паэта, але ўлічваецца своеасабліва, часта з парушэннем перспектывы самога вобраза і функцыянальнай дэфармацыяй яго. Адбываецца разам з тым і «канкрэтызацыя» агульнага ў межах самой творчай індывідуальнасці, што часта ў якасці выдаткаў вядзе да панавання «мікрастылю» і своеасаблівага маньерызму. Гэта — у горшых выпадках, вядома. Хоць нельга разам з тым не прызнаць, што абвостраны клопат пра арыгінальнасць — аднача-сова і сіла, і слабасць сучаснага стылю наогул. Толькі лепшым, па-сапраўднаму арганічным паэтам, надзеленым, акрамя ўласна-паэтычнага таленту, яшчэ і талентам жывога ўзаемадзеяння з папярэдняй літаратурнай традыцыяй, уменнем у час прыпасці да гаючых фальклорных крыніц, каб вярнуць вобразу першародны водар і расу на яго пялёсткі, надзеленым пастаяннай цікавасцю да жывога жыцця,— толькі такім паэтам суджана выявіць характэрныя рысы сённяшняй паэтычнай самасвядомасці, а значыць, вызначыць у пэўным сэнсе і кірунак самой паэзіі, і яе месца ў нашым жыцці.

Такі паэт — Рыгор Барадулін.

1984

ВЯСЁЛКА І СТРЭЧНЫ ВЕЦЕР

У празаіка Віктара Карамазава юбілей. Але ці толькі ў пісьменніка? Не, я не пра чытачоў, не пра літаратурную грамадскасць, хоць іх таксама гэта па-добраму не абмінае. Я — пра Віктара Карамазава, чалавека, лёгкага на хаду,— падарожніка, журналіста, паляўнічага, не чужога і яшчэ шмат якім захапленням чалавека. Этнаграфіі і гістарычнаму краязнаўству, музычнаму фальклору і прыкладному мастацтву — не ў тым сэнсе, што збірае калекцыі, пашпартызуе запісы песень ці абпальвае ды палівае, паводле свайго не боскага, а чалавечага занятку, гладышы ды гаршкі. Проста гэтым усім ён жыве, як натура ўражлівая, асоба дынамічная ды мабільная... Дальбог, ледзь не сказаў — аўтамабільная, згадаўшы чамусьці ягоную «Ніву», сваячку сціпламу якому-небудзь «казлу», ці як яго там яшчэ, асуджанаму на селавыя ды лясныя дарогі, на глыбокія катавіны, пясок ці гразюку і слату. А мо нават і сваячку рупліўцу і шчыруну каню, якога можна прывязаць да любой штакеціны ці да прыдарожнага дрэва, падкінуць якой канюшынкі ці шчуплага, зляжалага сянца, а самому падацца ў тлум, да грамады чалавечай. Гэта машына-трудзяга, не дзеля шыку нейкага ці паказухі, гэта адзін з сучасных сродкаў пазнання жыцця, а то і прылада працы, як, напрыклад, пішучая машынка ці дыктафон. Гэта той выпадак, калі даброты «цывілізацыі», рэчы не засланяюць чалавеку жыцця, не ператвараюцца ў «прычындалізм» (можа, гэтак перакласці тут рускае «вещизм»?), а служаць узбагачэнню душы і пазнанню навакольнага свету.

Зайздросная гэта якасць — надаваць духоўнасць, асэнсаванасць рэчам. Гэта не менш важна, як і талент жывой, ненатужнай цікавасці да самога жыцця, да адметнай шурпацінкі ў самім чалавеку, якую Леанід Ляонаў, вялікі знаўца розных прафесійных ды псіхалагічных рарытэтаў, здаецца, удала назваў «пупырышком» — накшталт мецінкі нейкай ці радзімкі, якой пазначаны чалавек і якой кідаецца ў вочы і запамінаецца стрэчнаму, ну а мастаку — тым болей. Але гэта не вонкавая прыкмета нейкая, а своеасаблівы вы-

датак выключнай любові да сваёй справы і прафесіі, якая, паводле Ляонава, нешта накшталт «прываднога паса», што лучыць чалавека з самім грамадствам,— на карысць як самой асобе, так і супольнасці людской. Прафесія — гэта не толькі веды, але і майстэрства, і спосаб рэалізацыі асобы, і пацвярджэнне яе годнасці, права заявіць свае дзейсныя адносіны да жыцця.

Мне невыпадкова згадаўся тут Ляонаў. Думаецца, што Карамазаў, задумваючы сваю «Пушчу», безумоўна раіўся з ягоным «Рускім лесам», пра што, дарэчы, напісаў і сам у пранікнёным эсэ «Калінава сіла». Паслухайце: «...свет Ляонава, ягоны лес маюць, здаецца, шмат ад майго роднага лесу, ад маёй Лімені, Ліменшчыны. А таму мне і радасна, што ад Пусташы ў жыццё пайшло гэткае шчодрае святло..., бо гэта як бы падказвае, што і ад Лімені ў жыцці светла».

Вядома, Карамазаў напісаў сваю «Пушчу» не толькі таму, што меў перад сабой творчы прыклад такога пісьменніка, як Ляонаў. Тут усё складаней. Зробленае мастаком такога рангу, як аўтар «Рускага лесу», любога іншага празаіка ў роўнай ступені можа як натхняць, так і абяззбройваць,— і дзе гарантыя, што табе наканавана не першае, а другое? Ляонаў быў наватарам, ён апярэджваў час, ён прабіваўся да «экалогіі» праз мастацтва, а цяпер — іншае, цяпер, можа, найпершая і найцяжэйшая задача, як з гэтай балючай усім нам «экалогіі», што душыць не толькі наша маральнае ды эстэтычнае пачуццё, але і самы празаічны, паўсядзённы быт,— як з гэтай абрыдлай «экалогіі» зрабіць «мастацтва»? І сапраўды, як? Можа, такі вось ход думкі прывёў Карамазава да ягонай «Пушчы», надаў яму смеласці ўзяцца за раман.

Не хачу, каб падалося, што ўся справа ў тым, каб напісаць абавязкова раман, хоць гэтая раманная спакуса ў нашым пісьменніцкім асяроддзі, што ні кажыце, ёсць. Раман існуе, пра яго пісалі, гаварылі, гавораць і, пэўна, будуць яшчэ гаварыць хаця б у сувязі з іншымі задумамі пісьменніка, сведкамі рэалізацыі якіх нам давядзецца, маем спадзяванне, яшчэ быць. Адно зразумела і бясспрэчна: мастацкі і грамадзянскі вопыт, няхай, можа, і не заўсёды пераканаўча рэалізаваны ў менавіта раманных формах, непрыдумана карамазаўскі, арганічны, ён тое, што караніцца ў асно-

ве ягонай творчай і чалавечай асобы, знаходзячы сабе рухомае, дзейснае грамадзянскае і грамадскае, этычнае і эстэтычнае выяўленне. Не проста так, не дзеля акрасы пішу я гэтыя блізкія нават паводле гучання і трохі ўзнёслыя словы.

Карамазаў празаік надзвычай сучасны, і самае дарагое ў гэтай ягонай, па-свойму таксама дарагой рысе тое, што ён падрыхтаваны, як не кожны сённяшні празаік, да творчай трансфармацыі сучаснага матэрыялу ўсім сваім жыццёвым і асабовым вопытам: выхаваннем, уласцівасцямі ўражлівай, артыстычнай паводле складу свайго натуры, любоўю да чалавечага ўмельства ў любой галіне, няхай нават і ў такой, здавалася б, далёкай ад літаратара, ды яшчэ і філалагічнай адукацыяй, галіне, як тэхніка. Гэта таксама карамазаўская «сучаснасць», якая так добра адпавядае спробе сучаснага чалавека захаваць у сабе ўнутраную гарманічнасць насуперак напорнаму наступу нашага тэхнічнага веку. Захаваць не праз адмаўленне даброт машыннай цывілізацыі, а «варожасць» тэхнікі, тэндэнцый да аўтаматызацыі духоўных і душэўных працэсаў нейтралізаваць сваёй уладай над імі, ачалавечыць іх, зрабіць працягам свайго духоўнага свету. З ворага зрабіць памочніка і сябра.

Колькі сёння ёсць у нас «аматараў прыроды», што дратуюць лугавіны і лясы, засмечваючы іх хлорвінілавай хіміяй, бутэлькамі ды бляшанкамі, аматараў нагрузіцца дабротамі лесу, не адыходзячы далёка ад уласнага легкавіка,— і ў ход ідзе якое-небудзь «цывілізаванае» прыстасаванне, каб адным махам абдзерці ягадны куст, каб успароць у вадзе жывот жывой рыбіне. Колькі сёння ёсць «аматараў» пракаветнасці, у сапраўднасці не столькі абаронцаў традыцый ды захавальнікаў гістарычнай народнай памяці, колькі драпежнікаў пад засенню «экалагічнай» ці якой іншай моды, сучасных мяшчан з вялікай здольнасцю сацыяльнай і грамадскай мімікрыі.

Карамазаў не піша сучаснай ідыліі, хоць любімы герой ягоны звычайна чалавек добры, уражлівы, трохі лятуценны нават. Такія Іван з аповесці «Дзень Барыса і Глеба», Арсен з «Бярозавых венікаў», Пракопчык са «Спіралі», Валошка з рамана «Пушча». Але ён і актыўны, гэты герой, не столькі, можа, ва ўчынку, калі разумець яго як пастаяннае напрошванне на кан-

флікт,— актыўны ўсім ладам і сэнсам сваёй жыццёвай, маральнай пазіцыі, наяўнасцю нечага цэльнага, глыбока чалавечнага і прыгожага ў натуры. Герой звычайна вельмі добра «закампанаваны» ў прыродзе, пастаўлены ў сувязь са сваім жыццёвым вопытам, прафесійным заняткам. Карамазаў любіць чалавека, які калі не цвёрда стаіць на зямлі (гэта не тое слова, неяк не ў характары не тое каб героя, а не ў характары самога пісьменніцкага падыходу), дык ведае, як быць у згодзе з гэтым светам, са сваёй душой, са сваёй прафесіяй, якая не проста сродак заробку, а сродак пазнання нейкіх жыццёвых каштоўнасцей, без якіх ні ў працы, ні ў адпачынку не будзе добра пачувацца чалавеку.

Ціма, Князь з аповесці «Дзень Барыса і Глеба», вунь як упэўнена ступае па зямлі — пры сваім стракатым гальштуку і заліхвацкім капелюшы, а хіба пазайздросціць яму вясковец Іван, сціплы працаўнік і добры, немітуслівы ў жыцці чалавек? А якой нікчэмнай, напрыклад, можа выглядаць ягоная жыццёвая «філасофія» побач з сапраўднай рабочай гордасцю Пракопчыка са «Спіралі»: не, ён не хлюст, не бяздумны энтузіяст нейкі, а чалавек, для якога праца стала не толькі патрэбай, але і сродкам выяўлення сваёй асобы, сваёй жыццёвай пазіцыі — без пастаяннай хапатлівай думкі пра гэта, а проста працоўнай і маральнай нормай.

Нечым дарагое мне ў Карамазава апавяданне «Прыліпала». Мо інтанацыяй сваёй, вельмі натуральнай, мо выбарам героя, мо таму, што яно з ранніх, тых, што шчасліва і неяк адразу раскрываюць нам не толькі душу пісьменніка, але і значаць жыццёвую лапінку — матэрыял, на якім найбольш раскрываецца пісьменнік — праз выбар героя і ягоную дапасаванасць да аўтарскага пошуку, як у жыцці, так і ў самім сабе...

Слухай, гэта ж не так даўно, здаецца, мы і пачыналі, дарагі мой сябра Віктар!

У тым апавяданні чуецца ды згадваецца мне зберажоная акалічнасцямі ды чалавечай руплівасцю лясная лапінка прыроды — верагодней за ўсё, што ў Чэрыкаўскім заказніку, які так добра выхадзіў ды вывучыў пісьменнік,— у тых мясцінах, вобраз якіх з дзяцінства запаў і ў маё сэрца. Ёсць, вядома, ёсць сувязь паміж душой чалавека і характарам, вобразам

акаляючай яго прыроды. І там, і тут як бы нябачная нейкая прысутнасць рухомай і няўлоўнай субстанцыі, што абзываецца то ва ўчынку чалавека, то ў абліччы ягоным, то ў зажуранасці ягонай або весялосці. «Расплюшчыўшы вочы, я разгледзеў над сабой месяц, убачыў надзіва вузкія пёры аблокаў. Празрыстыя, нібыта марлевыя, воблакі распаўзаліся па ўсім небе, і яно нагадвала зямлю, такую ж белую ад туману. Нібыта і тут, вакол капы, і там, вакол месяца, слалася адна і тая ж стыхія, а берагі ў іх былі таксама адны: круг лесу».

Так і наша пісьменніцкая стыхія: берагі ў яе адны — жыццё, родная мясціна, чалавечы лёс, што тчэ намітку нашых дум і парыванняў.

І ранні карамазаўскі герой, як той Сярожка-«прыліпала» — спагадны сам і такі даверліва-чуйны да чужой спагады і ласкі,— ахінуты таксама намiткай аўтарскага любавання, нават расчуленасці ягонай,— толькі не сентыментальнасці, не. Проста «намітка» тая сатканая найбольш з валаконцаў пачуцця, якое апярэджвае развагу, ці хоча так адгарадзіцца ад яе хоць на нейкі час: у маладосці мы ўсе трошкі рамантыкі. Хвала таму, хто не забываецца на тую рамантыку маладосці, хто бярэ ўспамін аб ёй у «ожесточающую зрелость», як сказаў некалі Гогаль. Такому чалавеку лягчэй жыць, бо чалавека з верай, і марай цяжэй зламаць жыццёвым выпрабаванням, цяжэй зрабіць з яго нечалавека. Бездухоўнасць, бяспамятнасць пра «другую стыхію» — вялікае зло і вялікае паражэнне чалавека.

Сталы празаік Віктар Карамазаў гаворыць пра гэта ў цудоўных сваіх, строгіх паводле як мастацкай фактуры, так і паводле спосабу выяўлення аўтарскіх адносін апавяданнях апошніх год, сярод якіх «Дзяльба кабанчыка», «Галуба», «Гарадскія», «Галапагосы» варта аднесці да лепшага, што было напісана ў гэтым жанры нашымі навелістамі за апошнія гады. Тут Карамазаў і адчуў сябе і рэалізаваў у дастатковай і ўражлівай ступені сапраўды сталым майстрам.

Яны востра надзённыя, гэтыя апавяданні. Мне здаецца, што яны не былі б напісаны Карамазавым без ягонага вопыту нарысіста, без вопыту мэтанакіраванага, у сацыяльна-маральным аспекце, вывучэння жыцця. Іменна вывучэння. Тут якраз той выпадак, калі

гэтая зацяганая фраза не выклікае ўнутранага супраціўлення, калі яна, дарэчы, і пішацца без усялякай натугі, бо сапраўды празаік ніколі не цураўся аналітычных і публіцыстычных магчымасцей слова, а вопыт нарысіста і эсэіста набываў упарта і паслядоўна, ставячы яго нароўні з іншым клопатам празаіка-мастака. Успомнім ягоныя «Руны мараны» пра паездку ў Карэлію, «Векавое» — пра нашы палескія лясы галоўным чынам, хоць і не толькі пра гэта, цудоўную «Вясёлку сярод зімы» — пра неглюбскіх вясковых ткаляў,— колькі гэтаму аддадзена часу, душэўнага парывання, шчыравання над словам!

У «Дзяльбе кабанчыка» па-мастацку жорстка і надзіва навочна, з выдатным пранікненнем у матэрыял пастаўлена праблема (зноў я чамусьці не баюся зацяганага азначэння) — укаранёнасці чалавека ў жыцці — укаранёнасці маральнай, духоўнай у першую чаргу, праблема адвечнай спадчыннасці нашага чалавечага абавязку, без якой мізарнее, абрастае поўсцю чалавечая душа, наліваецца жывёльным лоем.

У «Гарадскіх» — ці не тое ж. Нядаўнія вясковыя хлопцы, цяпер гараджане, як і тыя, што з'ехаліся ў вёску на дзяльбу матчынага кабанчыка, падмеліся на лета пасвіць калгасных кароў, і мы разам з аўтарам жахаемся таму, як нечувана скора выпетрала ў іх нешта (што?) любоў да сялянскай працы, да грамадскага набытку, як мала засталося людскога ў душах іхніх.

У «Галубе», гэтым трапятліва стрыманым паводле інтанацыі, скупа і проста напісаным (бадай адно дыялог) апавяданні пра вясковую кабету, жыццё якой бадай што адны страты — мужоў, дзяцей, надзеі — і якая не пахіснулася ўсё ж перад жыццём, не скамянела сэрцам, найбольш выразна паўстае цудоўная якасць прозы Карамазава: яе душэўная пранікլівасць і разам з тым датклівасць, расхінутасць перад чалавечай душой пры тактоўным адчуванні меры — псіхалагічнай і мастацкай. Не менш цікава, напрыклад, і тое, што аўтар тут, сам таго, можа, не хочучы і пра тое не здагадваючыся, выкарыстаў па-свойму матыў чэхаўскай «Душачкі» — але на якім новым матэрыяле і з якімі новымі высновамі!

У «Галапагосах» перад намі таксама адзінокі, пакрыўджаны лёсам стары, начны дзяжурны ў кацельні,

але ж летуценнік і чалавек з вялікім запасам жыццёвай мудрасці і жыццёвай трываласці і веры.

Людзі гэтыя не толькі дакор і папрок персанажам з апавяданняў «Дзяльба кабанчыка» і «Гарадскія», яны папрок і сумленню нашаму, заклік да грамадзянскай і маральнай актыўнасці і адначасова разумнае выхаванне нашага пачуцця.

Харошы, па-харошаму круты разгон узяў празаік Віктар Карамазаў на жыццёвай сваёй і творчай дарозе, над якой яму зырка свеціць вясёлка не толькі летам, але і сярод зімы. Не супыняйся, браце,— ідзі і імчы: так малодзіць душу стрэчны вецер!

1984

СВЯТА Ў БУДЗЕНЬ

Акрамя шмат якіх вартых ухвалы якасцяў, пісьменнік-празаік павінен валодаць найперш і найболей здольнасцю дакладнага мастацкага бачання. Гэта не механічнае, «дробязнае», паводле азначэння Чэхава, бачанне, што ўласціва некаторым спецыфічным прафесіям — скажам, касіра ці афіцыянта. Наглядальнасць — яшчэ далёка не бачанне, пісьменніцкі зрок не толькі для распазнання, ён, галоўным чынам, для ўзнаўлення, для падключэння рэальных, непрыдуманых падрабязнасцяў жыцця да новай, ажыўленай сілай фантазіі, дадзенасці. Звычайная падрабязнасць тады робіцца метафарай, набываючы буйны план.

Ёсць пісьменнікі выключнага ўмельства ў карыстанні метафарай. Гэта празаікі-эксцэнтрыкі. Такім празаікам быў, напрыклад, Ю. Алеша — рамантык і паэт у прозе. Алеша мог напісаць: «Пришла маленькая девочка, похожая на веник». Гэта добра, але не зусім добра тое, што яму часта даводзілася, як бы апраўдваючыся перад сабой і чытачом, тлумачыць, чаму гэта добра. «Дрожание икр» у Напалеона і «храшчыкі вушэй, што падпіралі брыль круглага капелюша» Карэніна, убачаныя Аннай, Талстому тлумачыць, здаецца, не даводзілася.

Метафара ў прозе — штука небяспечная і помслівая. Тое, што прымальнае і нават неабходнае ў вершаваным радку, можа выглядаць чужародным у празаічнай фразе, разбураць яе. Канечне, многае тут залежыць ад пачуцця меры, ад законаў, узятых майстрам для сябе, ад індывідуальнай мастацкай сістэмы. Талстой не прымаў у Горкага метафары «море смеялось», гэтак жа, як, дарэчы, і Чэхаў, які патрабаваў ад прозы строгасці і стрыманасці. «Море смеялось» — гэта, здаецца, з «Мальвы» — усё ж не лепшага горкаўскага апавядання, нягледзячы на ўсю ягоную экспрэсіўнасць. А вось навелу «Двацаць шэсць і адна», напісаную пра рэчы зусім непаэтычныя, Горкі з поўным правам мог назваць і назваў «паэмай».

Здаецца, асабліва не ў пашане «паэтызм» у прозы сённяшняй. Некаторыя бачаць у гэтым уплыў дакумента, метадаў дакладных навук, усеагульнай нашай

сённяшняй прылучанасці праз кінематограф і тэлеэкран да абсалютна неверагоднай у ранейшыя часы ілюзіі жыцця, перададзенага з дапамогай тэхнікі, пасрэдніцтва якой, аднак, разам з тым як бы мінае і нашу свядомасць, і наш зрок. Чалавек апынаецца сам-насам не з тэхнікай, не са сродкам, а зноў жа — з ілюзіяй рэальнасці, што ўмее быць мастаком. Прыём, сродак паглынаецца рэальнасцю экраннага руху і часу і нішчыцца ў іх. А ілюзія жыцця, што прыйшло і стала побач з табой, застаецца. І нават не адразу здагадваешся, што гэта ўсё ж мастацтва.

Імкненне наблізіць сферу мастацтва да межаў самой рэальнасці, разбурэнне звыклых мастацкіх клішэ і форм рухомай мерай «жывога жыцця» адчувальна ўплывае на пошукі сённяшняй прозы. Крытык С. Паліеўскі, напрыклад, піша: «Гэта немалаважная справа ва ўмовах, калі жыццё здольнае трапляць пад уладу розных канцэпцый, характараў, вынайдзеных папярэдне,— сярэдніх зручных пісьменніцкіх мадэляў, што падпільноўваюць жывыя, яшчэ нямоцныя парасткі, каб заключыць іх у «форму»... Дакументальныя вобразы супрацьстаяць гэтаму без высілку і паводле прыроды. Яны не маюць замыкальнай здольнасці, таму што не звязаны ні з якой прадвызначанай думкай, не залежаць ад раўнюткага стылю і ў поўным сэнсе індывідуальныя: на іх распаўзаецца па рубцу любы стэрэатып».

Што гэта азначае? Не больш, чым вяртанне форме яе зместу. Але форме не прадвызначанай, ш знойдзенай праз дакумент, некрануты ў сваіх сувязях жыццёвы матэрыял. Гэта азначае паглыбленне ў дакумент, уважлівае «прачытанне» яго і скарыстанне ягоных «сучкоў і задзірынак» так, як скарыстоўвае іх, абрабляючы дошку, сталяр. Тынянаў казаў: «Там, дзе канчаецца дакумент, я пачынаю». Супярэчнасць? Не, супярэчнасці тут няма, бо дакумент не выключае фантазіі: выяўляючы сваю форму, ён выяўляе і магчымасць мастацкага яе самаразвіцця. Выяўленне прадмета, уласцівасцяў матэрыялу сродкамі, найбольш уласцівымі іх прыродзе і «фактуры», найчасцей і стварае жаданую адэкватнасць формы.

У апавяданні Анатоля Кудраўца «Жулік» з кнігі апавяданняў «Дзень перад святам», напрыклад, чытаем:

«Пятрок прысеў ля сабакі, падняў яго за галаву і сунуў мордай у міску. Жулік таргануў галавой, аблізаў пысу, хлебтануў з міскі разы са два. На большае не хапіла сілы, і ён сунуўся галавой узбоч міскі на выпрастаныя лапы. На каляных, як дрот, чорных валасах пысы засталіся вісець крошкі бульбы. Сабака аслаб так, што не меў сілы нават хлябтаць. Пятрок зноў узяў яго за галаву, задраў угору, расціснуў шчэлепы і пачаў з міскі ліць жыжку ў рот. Яна цякла па азызлаваных пакусаных губах, з куткоў рота на шыю і зямлю, але тое-сёе трапляла і ў глотку, і сабака сутаргава глытаў, мутнымі вінаватымі вачыма пазіраючы на Петрыка. Калі на дне міскі засталася адна гушча, Пятрок шпурнуў міску на двор. На яе адразу ж наляцелі куры».

Урывак гэты не можа не спыніць на сабе ўвагу дакументальнай дакладнасцю апісання, тым знарачытым халадком аўтарскага адасаблення, якое наўрад ці сведчыць пра абыякавасць, а хутчэй пра аўтарскае імкненне ўнікнуць сентыментальна-таннага вырашэння задумы. Гэта як бы праверка славутага чэхаўскага: «чым аб'ектыўней, тым большае ўражанне».

Гадоў пятнаццаць назад, не сумняваюся, у нас знайшліся б добраахвотна-заўзятыя абаронцы чысціні мастацкага стылю, якія б крыкліва абвінавацілі аўтара ва ўсіх літаратурных грахах, у тым ліку і ў натуралізме. Не бяруся сцвярджаць абсалютна, але сёння на падобны крытычны «выезд», бадай, ніхто не рашыўся б. Доказ таго, які аграмадны крок у сэнсе эстэтычным зрабіла за апошнія гады наша проза, а разам з ёю і крытыка. Проза, паспяхова пазбаўляючыся ад стылёвай «сырамяціны», ад «охаў» і «ахаў», усталёўваючыся эстэтычна, усё больш і больш набліжаецца да усведамлення і творчага асваення ўласна сваіх жанравых законаў, прыёмаў і нормаў. Усё тыя ж пятнаццаць гадоў назад мы не сароме́ліся выдаваць за сакавітасць і каларытнасць пісьма наіўныя празаічныя практыкаванні, дзе яблык быў абавязкова «крамяны», груша ці бульба «сопкія», а дуб «пракаветны» і г. д. Гэта была «каларытнасць» агульнага, а не канкрэтнага, і то часцей за кошт гучання слова ці стылістычнага нагнятання.

Мне могуць запярэчыць: урывак заўсёды не больш як урывак, яго можна чытаць і так і гэтак; вялікай

тэорыі на ім не развядзеш. Сапраўды, адасабленне любога элемента формы бывае небяспечным: у яго раўна свае месца і свой працяг у функцыянальным, як сёння мы прывыклі пісаць і гаварыць, бытаванні мастацкай сістэмы ўсяго твора. На розных узроўнях зместу праяўляецца ён па-рознаму. Не ўлічваючы гэтага, не ўлічваючы самой прыроды мастацтва, не прымаючы навязанай ім «гульні», мы ад любога апавядання ўзялі б не больш, чым ад фразы: «Волга ўпадае ў Каспійскае мора». Мы атрымалі б інфармацыю на тым ці іншым узроўні, але інфармацыю немастацкую. Аб прыведзеным урыўку, без уліку аўтарскай «звышзадачы», кожны, вядома, можа меркаваць па-свойму, але, прымаючы законы мастацкай «гульні», наўрад ці можна адмовіць яму як у выяўленчай дакладнасці, так і ў свядомым імкненні паслабіць, а то і зусім паніштчыць ўражанне неэстэтычнасці выяўленнем самой формы яе. Гэта якраз той выпадак, калі мінус на мінус дае плюс. Жыццёва неэстэтычнае робіцца эстэтычна прыдатным — праз мастацтва.

Давер да самога матэрыялу адлюстравання — наогул характэрная рыса сённяшняй прозы, якая ўжо не надта баіцца быць нецікавай, дакладней, здацца такой, калі паслабляе ў сваёй сістэме, скажам, сюжэтны пачатак ці адкрыта запазычвае ў нарыса ягоную ўстаноўку на ўсё той жа дакумент, калі імкнецца выявіць не толькі фактуру, але і форму жыццёвага матэрыялу — якраз праз канструктыўныя магчымасці, заключаныя ў ім самім, не падрабляючы, не падвышаючы яго кананізаванымі сродкамі жанру. Змест — новы — ужо не прымае традыцыйна вызначанай для яго абалонкі.

Творчасць А. Кудраўца паказальная ў гэтым сэнсе. Яна найбольш «празаічная», калі можна так сказаць, у параўнанні з творчасцю ягоных літаратурных аднагодкаў, бо знарачыта не дэманструе ні стылістычнага бляску, ні прафесійнай вывучкі, не спакушаецца ні выйгрышным сюжэтам, ні эфектнай, шматзначнай канцоўкай. Памятаю тое ўражанне, якое зрабілі пры першым сваім з'яўленні такія ягоныя апавяданні, як «Марута і Зіна», «Сяструха» і іншыя, якія сталі, па сутнасці, дэбютам празаіка.

Не прайшоўшы па-за чытацкай увагай (а не заўважыць яго было цяжка), той дэбют не быў, аднак, у

свой час прынцыпова вытлумачаны ні на ўзроўні асабістага поспеху ці няўдач аўтара, ні на ўзроўні заяўленай ім тэндэнцыі. Разумею: тады гэта (гадоў дзесяць, здаецца, назад), калі ў малым жанры актыўна і небеспаспяхова працавалі іншыя маладыя празаікі, мастацкія здабыткі якіх былі ўжо замацаваны крытыкай у якасці пэўнага эталона мастацкіх пошукаў, з'яўленне апавяданняў, падобных да згаданых мной, вядома, магло здацца некаторым і выпадковасцю, хоць і цікавай, але і як бы безадноснай,— нешта накшталт літаратурнай анамаліі. Запаволенасць, нават нейкая няўклюднасць апавядальнай манеры, інтанацыйная арытмія, нязвыклая дзелавітасць тону, што і вабіла, і прымушала насцярожвацца, жаданне як найменш выходзіць за межы быту і яго рэалій, уражанне аўтарскага самавыключэння са стыхіі твора — вось што чапляла чытацкую ўвагу, падказвала запытанне: што ж гэта? Своеасаблівая лінія «мастацкіх паводзін», абраная ў адпаведнасці ■ аўтарскім крэда, ці паказчык недастатковай эмацыянальнай і змястоўнай насычанасці твораў?

Уся далейшая праца аўтара ў жанры прозы пацвердзіла, што справядлівым было першае. А. Кудравец застаўся верным сваім прынцыпам (а гэта былі менавіта прынцыпы) у адлюстраванні сучаснага жыцця і пераважна жыцця сучаснай вёскі, сацыяльная і духоўная панарама якой, як ні дзіўна гэта для нашай літаратуры, што мае такую багатую і даўнюю традыцыю вясковай тэмы, адчувальна пачынае знікаць з поля зроку нашай прозы. Ці не кантраст у параўнанні, напрыклад, ■ сучаснай рускай прозай, дзе існуе аж цэлая «вясковая» плынь, даволі пэўна акрэсленая ў сваіх мастацкіх і ідэйна-змястоўных пошуках? Параўнальны аналіз такога становішча мог бы даць шмат чаго для высвятлення сённяшніх тэндэнцый нашай беларускай прозы, але гэта, вядома, патрабуе спецыяльнай гаворкі — пры ўдзеле не адной мудрай крытычнай галавы.

«Дзень перад святам» — трэцяя кніга прозы Анатоля Кудраўца. Я не сказаў бы, каб аўтар прыкметна перамяніўся ў ёй у параўнанні са сваімі ранейшымі кніжкамі. Як празаік А. Кудравец надзвычай стабільны ў сваіх магчымасцях і сваіх «прыхільнасцях»: гаворка можа ісці хіба пра новую меру майстэрства,

пра ўдакладненне і пашырэнне нагляданняў, падказаных удала, у адпаведнасці з уласным жыццёвым і духоўным вопытам, знойдзенай тэмай. Простае азначэнне вонкавых прыкмет і контураў гэтай тэмы відавочна недастатковае для таго, каб меркаваць пра арыгінальнасць таго свету, што бачыцца аўтару праз жыццё ягоных герояў ці адкрываецца ў іх саміх. Часта бывае небяспечна расшыфроўваць назву кнігі як своеасаблівы аўтарскі намёк, але ў нашым выпадку, прыслухаўшыся да аўтара, падыдзем блізка да ісціны. Прадчуванне свята праз будзень ці, можа, нават праклямацыя свята будня як асновы паўнакроўных, здаровых адносін да жыцця, што ўяўляецца найперш як праца, як непарыклівае здзяйсненне абавязку, як доўг перад роднымі, перад сябрамі, перад будучым днём, і складае аснову светаўспрымання герояў А. Кудраўца, людзей пераважна сціплых, негаваркіх, але і цягавітых, і мужных. Можа, таму так па-харошаму і вылучае ягоныя апавяданні сярод апавяданняў іншых аўтараў менавіта мужны, «мужчынскі» тон, што так пасуе і да характару сучаснага чалавека, і да прыроды самой прозы як жанру.

Герой прозы А. Кудраўца — амаль заўсёды чалавек вясковы або гараджанін, першапачатковы жыццёвы вопыт якога ўсё там жа, у вёсцы. «Усе мы з хат» — мог бы ён сказаць крылатай формулай Я. Сіпакова, другога нашага пісьменніка, таксама занятага вясковай тэмай у сучаснай прозе. «Усе мы з хат» — гэта адчуванне сваёй біяграфічнай, духоўнай і, калі хочаце, гістарычнай радаслоўнай, не забываць пра якую так важна сучаснаму чалавеку, адлучанаму ходам цывілізацыі шмат ад якіх першапачатковых, наіўных радасцяў, замен якім, на жаль ці на шчасце, аднак, няма.

Аднак у апавяданнях А. Кудраўца нават пры ўсім жаданні мы не знойдзем таго, што завецца тугой па вёсцы з яе нібыта адвечна ўстаноўленай непарушнай завядзёнкай і гэткім жа непарушным маральным статусам, які можна і варта распаўсюдзіць як узор і прыклад на ўсе даступныя чалавеку сферы ягонай грамадскай дзейнасці. Аўтар разумее, што вёска не выпадае і не можа выпасці з-пад уздзеяння навукова-тэхнічнага прагрэсу, што, у сваю чаргу, рост яе матэрыяльнага дабрабыту спараджае ўсё новыя і новыя праблемы не толькі ў гаспадарчым жыцці, але і ў галіне чалавечых

адносін, што праблема духоўнай змястоўнасці жыцця не вырашаецца аўтаматычна з дапамогаю тэлевізара, шыфаньера і ўласнага матацыкла.

Нашы празаікі шмат пісалі пра так званую міграцыю сельскага насельніцтва, у прыватнасці, звязваючы яе з праблемай сельскай моладзі. І хутчэй за ўсё гэта выглядала прыблізна так. Хлопец або дзяўчына пасля заканчэння дзесяцігодкі ўсімі сіламі рвецца ў горад, і, вядома, праз паступленне ў інстытут. Але дзверы пры першым стуку не адчыняюцца, расчараваная маладая асоба вяртаецца ў вёску, і вось тут ужо ад аўтара патрабуецца ўся ягоная фантазія, каб любой цаной утрымаць героя ў вёсцы і каб прымусіць нанова яе палюбіць. І ў апавяданні А. Кудраўца «Другі варыянт» усё як быццам пачынаецца з гэтага: паступленне ў інстытут і няўдача, прыезд і ад'езд. Але «ўрастання» ў вёску не адбываецца. Больш таго, аўтар нават не ставіць такой праблемы. Апавяданне канчаецца зноў жа прыездам героя ў горад, з тым жа намерам — паступіць у інстытут. Гэта сапраўды «другі варыянт» вырашэння тэмы, магчыма, знарок палемічны, але безумоўна падказаны новымі абставінамі жыцця, новым тонусам вясковай праблематыкі.

Апавяданне «Вясёлыя людзі». Пачынаеш чытаць — знаёмая па шмат якіх творах і аўтарах сітуацыя. Хлопец прыйшоў з арміі, «адгульваецца», а потым, засумаваўшы, ідзе ўладкоўвацца на працу ў лясгас. Звычайная сітуацыя, пададзеная без шматзначнага падміргвання чытачу,— ніякай так званай праблемы выбару месца ў жыцці, раздвоенасці перад вёскай і горадам і г. д. Бо не гэта, часта такое важнае для іншых аўтараў, загадзя ўжо вылузанае як ідэя, наперад зададзенае, вартае толькі таго, каб падключыць яго «ў форму», цікавіць у даным выпадку празаіка. Для яго ўсё гэта — толькі своеасаблівыя «анкетныя дадзеныя», а сам цэнтр аўтарскай зацікаўленасці і ўвагі зусім у іншым. На першае месца ў апавяданні выступае не ўчарашні ваеннаслужачы Ячэйка Сцёпа, не турботы ягонага ўладкавання на работу, а нейкі «каравачнік з Куценя» — Рыгор Мельнічонак, чалавек вясёлы, гаваркі і, акрамя ўсяго іншага, па сённяшнім часе «шышка» ў вёсцы. Так, так, чалавек пагарджанай некалі прафесіі, па сутнасці, жабрацкай, сёння адчувае сябе няйначай як маленькім панком, не «каравачнікам»,

а шаноўным «утыльшчыкам» і спакушаным «гешэфтмайстрам». Паспрабуй абысціся без яго, калі ў вёсцы, дзе паспяхова вырашана «тэлевізарная» праблема, не так лёгка вырашыць праблему трохлітровага чыгунка, так патрэбнага ў гаспадарцы. Парадокс? Вядома, парадокс, але не сказаць каб нежыццёвы. Не менш жыццёвы і іншы парадокс, які, здаецца, найбольш і цікавіць аўтара: парадокс дабрабыту, які, як выяўляецца, можа павярнуцца не набыткам, а стратай, мошна, самага галоўнага ў чалавеку — сумленнасці, душэўнай шчырасці, спагады. Гэта на прыкладзе Мельнічонка адкрывае для сябе Ячэйка Сцёпа, і гэтае адкрыццё, мусіць, куды важнейшае для яго і нас, чым праблема ўладкавання на працу. Аўтар запрашае нас задумацца над тым, што некім дасціпна названа «выпрабаваннем на сытасць». Не кожная чалавечая душа вытрымлівае яго, а ва ўмовах нашага ладу такое «паражэнне» неабыякавае для грамадства.

Я казаў ужо, што ў новай кніжцы ўсюды пазнаеш Кудраўца-празаіка ранейшага. Гэта сапраўды так: пісьменнік не павінен без патрэбы адмаўляцца ад сябе самога. Але ёсць у ёй і тое, што прымушае гаварыць аб новых якасцях таленту аўтара, заяўленых даволі пэўна і выразна. Я назваў бы гэта новае ўвагай да псіхалагічнага парадоксу, да тых бакоў чалавечай псіхікі і чалавечых адносін, якія не заўсёды паўстаюць вызначанымі, якія не так лёгка вытлумачыць выхаваннем, умовамі, асяроддзем і г. д. Прыклад такой аўтарскай увагі — апавяданні «Мікола вярнуўся», «Дзяўчынка з чорнымі вачанятамі», «Жанчыны». Яны — сведчанне далейшага аўтарскага паглыблення ў жыццё, ягонага імкнення да філасафічнасці, да вырашэння на больш высокім узроўні праблем чалавечага існавання. І гэта зноў жа радуе ў сталай, змястоўнай кнізе таленавітага празаіка.

1976

ДЗЯЦІНСТВА, ЯКОЕ МЫ ПОМНІМ

Мае аднагодкі належаць да пакалення, чыё дзяцінства пазначана ваеннай і пасляваеннай парой. Незабыўная і па-свойму шчаслівая пара, нягледзячы на тое, што яна помніць жахі вайны, ведае смерць блізкіх, ведае, што такое голад і нястачы, ведае сіроцтва, але яно і шчаслівае веданнем высокай цаны самога жыцця, шчодрасці чалавечага сэрца, веданнем таго, што побыт, самы просты і бедны, не ганьбіць чалавека, а, як ні дзіўна, часта ўзвышае яго, адкрывае ў ім «душы залатыя россыпы» — мужнасць, самаахвярнасць, прыгажосць учынку, спагадлівасць, дабрыню, адчуванне знітаванасці і еднасці з другімі людзьмі.

Што мы помнім? Смак «ташноцікаў» з гнілой, перамерзлай бульбы, праснак з той жа бульбы і ячменных шароек, посную зацірку. Але мы помнім, і як прыходзілі ў хату партызаны, пакідаючы такую дарагую на той час газету ці лістоўку. Па іх мы вучыліся чытаць.

На тых газетах ды лістоўках выводзілі мы потым свае першыя літары — чарнілам з конскага шчаўя, са шкарлупак лясных арэхаў, з ліста ягады талакнянкі. У кожным партызане нам хацелася бачыць свайго бацьку, як пасля і ў кожным воіне-вызваліцелі, што частаваў нас абедам з салдацкага кацялка,— нічога смачнейшага за ўсё сваё пасляваеннае жыццё ніхто з нас, дальбог, не еў!

Не скора, не адразу абазваўся ў нашай творчасці той ваенны і пасляваенны вопыт. Усведамленне важнасці яго расло разам з намі, з чалавечым і грамадзянскім пасталеннем. Так было з усімі пісьменнікамі майго пакалення. Ужо дарослымі мы па-сапраўднаму адчулі сябе дзецьмі вайны. І тады напісалася апавяданне «На чацвёртым годзе вайны», аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь». Там — уражанні ваеннага дзяцінства, першапачатковы, можа, самы галоўны жыццёвы вопыт. Эмацыянальны вопыт майго пакалення і пакалення, якое не ведала вайны, паяднаўся. Паяднаўся на разуменні той цаны, якую заплацілі мы за мір, засталася Памяць — у майго пакалення біяграфічная, у новага — гістарычная. Памяць з вялікай літары.

1984

СЁННЯ: УЧОРА І ЗАЎТРА

«Движенья нет»,— сказал мудрец брадатый. Другой смолчал и стал пред ним ходить». Гэты пушкінскі паэтычны жарт успамінаецца, калі даводзіцца быць сведкам або ўдзельнікам спрэчак пра тое, што сучаснае ў літаратуры і жыцці, а што рэтраграднае, што трэба лічыць грамадзянскай дзейснасцю паэзіі, прозы і г. д. насуперак драбнатэмнасці, сацыяльнай інертнасці, стылістычнай аморфнасці. Гэтую пушкінскую ілюстрацыю прыгадваеш, калі задумваешся, як гэтая «грамадзянская дзейснасць» павінна трансфармавацца жанрава, тэматычна, стылістычна, гэта значыць «пачынаць хадзіць». Карацей кажучы, з усёй сваёй вастрынёй паўстае старая і вечна новая антыномія «житейского волненья» и «звуков сладких и молитв», што выявілася ў вядомым палемічным перабольшанні (не пушкінскім ужо): «Я не поэт, я — гражданин». У свой час і наш Купала гатовы быў адмовіцца ледзь не ад самога звання паэта («Я не паэта — о крый мяне божа!») дзеля сціплага жадання быць непасрэдным голасам самога народа. Але зноў жа — навошта пра гэта трэба было гаварыць менавіта вершам? Ды яшчэ надзіва і лірычным і «прыватным»?

Грамадзянскасць — дзеля чаго яна? Дзеля сучаснасці? Лірычная яна ці публіцыстычная? Мы найбольш насцярожаныя ў адносінах да лірыкі. Вядома, не кожная лірычная думка, не кожны лірычны «персанаж» сучасныя. Іншым разам нават і самая «сучасная» думка на паверку можа стацца не надта сучаснай. А іншым разам нешта, быццам бы нават пазбаўленае адзнак і статуса сучаснасці, самым сучасным якраз і бывае.

Трэба было быць Бялінскім, каб заўважыць у «Герої нашага часу» Лермантава Максіма Максімавіча — гэтае сапраўды наватарскае для рускай літаратуры адкрыццё народнага характару і сапраўднага «героя часу» — насуперак знарачытай лермантаўскай дэкларацыі, вынесенай у назву.

Наватарства Лермантава дало пасля, зрабіла магчымымі «Севастопальскія апавяданні» Талстога, дало Тушына з «Вайны і міру» і шмат чаго іншага. Тут,

дарэчы, і адказ на пытанне, ці абавязкова патрабуе сапраўдны гераізм выключнасці.

Аб прыродзе гераічнага класікі сказалі нам шмат адмысловага. Нехта ў свой час (здаецца, Дастаеўскі) звярнуў увагу на эпізадычны персанаж «Дуброўскага» ў Пушкіна, на персанаж, які дзеля выратавання на пажары нейкай няшчаснай кошкі безразважна кінуўся ў полымя. Што гэта? Адкуль у Пушкіна «чудики» нашага сучасніка Васіля Шукшына? Ці ў Шукшына гэта ад Пушкіна? Быццё літаратурнага працэсу цудоўнае як сваёй невычарпальнасцю, так і сваімі нечаканкамі і «паўторамі пройдзенага». Але кожны раз гэта, вядома, нібы сачыненне на вольную, сваю тэму.

Вось, дарэчы, новы твор таленавітага нашага празаіка Анатоля Кудраўца нават і называецца так — «Сачыненне на вольную тэму». Пра яго хочацца сказаць асобна. Гэты раман уяўляецца мне прынцыповай удачай аўтара, прынцыповай таму, што ў ім абазначаны адзін са шляхоў выхаду з крызісу, які перажывае, на мой погляд, наша раманная думка апошняга часу.

Пераўвасобленым выглядае ў Кудраўца найперш сам жанр. Ён напісаў твор, разгорнуты ў шырокім гістарычным часе, але скандэнсаваны, сціслы ў часе ўласна раманным. Часткова гэта яму ўдалося праз групоўку падзей вакол цэнтральнай фігуры рамана, часткова дзякуючы ўдалай «падсветцы» характару, ды і ўсёй жыццёвай пазіцыі героя кантраснай (але, зразумела, не заўсёды) прысутнасцю ўласна аўтарскага вопыту, які закладзены ў вобразе Валеры, гэтага душэўна зацікаўленага спадарожніка галоўнага героя Ігната Сцяпанавіча ў ягоным падарожжы ў далеч і блізкату свайго жыцця і свайго часу. Раман атрымаўся па-сапраўднаму эканомным і лаканічным.

Вось гэта дык і якраз прынцыпова важнае. Бо мы ж уведалі і, на жаль, ведаем яшчэ моду, не пазбыліся яе, на грувасткія «эпапеі», што маюць нахіл да храналагічнай бясконцасці і бескантрольнасці пры занядбанні арыгінальнай раманнай, якая б адпавядала сучаснаму ўзроўню мастацкага спасціжэння рэчаіснасці, канцэпцыі.

Галоўны герой А. Кудраўца — характар буйны, але не выключны, па-сапраўднаму дэмакратычны ў сваіх жыццёвых выяўленнях і сацыяльна актыўны. Здаец-

ца, што сам Апейка з «Палескай хронікі» Мележа паўстаў па-новаму ў новых гістарычных умовах, сцвярджаючы яе пераемнасць літаратурную, так і сацыяльна-грамадскую. Не пабаюся сказаць, што гэта вобразы не толькі сацыяльна блізкія, але ў нечым яны блізка стаяць і паводле ўзроўню мастацкага абагульнення і літаратурнага майстэрства.

І разам з тым я разумею ўсе цяжкасці пераходу А. Кудраўца ад вопыту навеліста і аўтара кароткіх аповесцяў да набыцця ўласна раманнага вопыту. Але я разумею таксама, што ранейшы навелістычны вопыт шмат у чым і дапамог яму. Дапамог навелістычнай меры усведамлення вострай канструктыўнасці кожнага з кампанентаў твора, даў магчымасць пры рабоце над раманам па-новаму знаходзіць тыя вузлы, што даюць «нацяжэнне» раманнай форме, і заўсёды памятаць пра мастацкую мэтазгоднасць. Благая інерцыя «эпапейнасці», прынамсі, менш за ўсё ціснула на яго.

У мяне пракінулася слова пра наяўнасць пэўных крызісных рысаў у сучасным беларускім рамане — і нездарма. Але толькі крызіс гэты не варта разумець як застой. Ідзе прыхаваная, несціханая творчая спрэчка (на жаль, не заўсёды хоча гэта заўважаць крытыка) пра мастацка-метадалагічны ўзровень спасціжэння рэчаіснасці. Менавіта пра ўзровень.

Бо пры здабытай свабодзе выхаду А. Адамовіча і В. Быкава ў «экзістэнцыяльную», умоўна кажучы, жыццёвую дадзенасць, пры імкненні на «малекулярным» узроўні разглядваць чалавека, пры наяўнасці творчасці Я. Брыля з ягоным выхадам на еўрапейскае, агульнакультурнае разуменне нацыянальнай свядомасці, што выявілася як у ягоным «Золаку, убачаным здалёк», як у «Ніжніх Байдунах», так і эсэістыцы апошняга часу,— існуюць і іншыя ўзроўні, што адлюстроўваюць шматслойную складанасць той з'явы, якую пачалі называць паскоранасцю і што ў дачыненні да нашых канкрэтных гісторыка-літаратурных умоў зусім не гук пусты. Бо ва ўмовах «паскоранага» развіцця могуць быць паяднанымі, сумешчанымі самыя разнародныя традыцыі і стылі. Могуць быць творча пераўвасоблены, але могуць і эклектычна суіснаваць.

Вось і выходзіць, што побач з прарывам да «еўрапейскага» ўзроўню ў нас існуюць як цяга да натуралізму, наіўнага рэалізму ў этнаграфічнай аздобцы, так

і памкненні да лірычнага імпрэсіянізму і алеаграфіі. З цяжкасцямі пазбаўляемся ад гэтага этнаграфізму і натуралізму, ад нейкай ускоснай апавядальнасці на шкоду аналітызму: таму прыклад таленавіцейшы наш І. Пташнікаў, які працуе часта на ўзроўні эмоцыі, значыцца, і не на ўзроўні псіхалагічна складанага пачуцця, што мае пацвярджэнне ў самой паэтыцы і стылі, калі абмежаваны правы аб'ектывізаванага, аналітычнага тэксту, калі даводзіцца ўспамінаць пра сціаласць, якая, як вядома, сястра таленту. Заўважце, сястра, а не маці, бо Пташнікаў несумненна і па-матчынаму таленавіты. Але тут выпадак, калі адчуць і рэалізаваць усю паўнату сваяцкіх сувязяў аўтару якраз не пашкодзіла б.

З другога боку, імкненне да вострасучаснага стылю і самай надзённай тэматыкі пры ігнараванні папярэдніх стылёвых традыцый, класічнага вопыту майстроў вядзе да вартага жалю эклектызму, да наіўнага неафіцтва, да наіўнай зноў жа спробы па-мастацку ілюстраваць рознага гатунку абывацельскія сенсацыі або пераказваць, як-кольвек белетрызуючы, вычытанае ўчора ці сёння з «Иностранной литературы» або з «Науки и жизни», што дае сябе адчуць, напрыклад, у рамане В. Гігевіча «Доказ ад супрацьлеглага».

Або ўзяць «вясковую» прозу. У ёй у свой час былі прынцыповыя дасягненні, пазначаныя імёнамі таго ж І. Пташнікава, І. Чыгрынава, Б. Сачанкі, А. Кудраўца, А. Жука, Я. Сіпакова, В. Казько — аўтараў, якія працуюць сёння часцей у іншых тэматычных сферах і іншых жанрах. «Вакуум» у так званай «вясковай» прозе запаўняецца пакуль слаба. Маладымі празаікамі пераважна бяруцца і развіваюцца нейкія прыватнасці з багатай палітры тэматычнага, выяўленчага і стылістычнага пошуку прозы ранейшай пары. Запозненым у іх здаецца матыў настальгіі па маральнай цэльнасці і духоўнай паўнаце быцця (запозненым у тым сэнсе, што ён не вырашаецца па-новаму), матыў, найчасцей укаранёны, паводле аўтараў, у сялянскім пабыткаванні. Магчыма, але ці дастаткова гэтага дзеля сцверджання жыццёва паўнакроўнага ідэалу?

Ёсць усё ж цікавыя спробы зірнуць на сучасную вёску аналітычна, паставіўшы сябе не з боку вёскі, а як бы ўвайшоўшы ў тую вясковую стыхію самахоць і не з гатовай наперад думкай — напрыклад, у творчас-

ці маладых У. Арлова, Х. Лялько, А. Наварыча, які, дарэчы, і філасафічны. Але маладым пакуль яшчэ, і гэта варта сказаць, бракуе глыбіні сацыяльнага аналізу, спеласці грамадзянскай думкі — якасцей, якімі яскрава надзелены нядаўнія выдатныя «вясковыя» апавяданні В. Карамазава «Дзяльба кабанчыка», «Галуба», «Гарадскія».

З чым жа павінны мы звязваць нашыя спадзяванні на будучае, якой можа ўяўляцца нам літаратура заўтрашняга дня? Спакусліва зазірнуць туды, у будучае, але і боязна: можна нагаварыць шмат несур'ёзнага. А больш-менш сур'ёзна і несумненна тое, што ўсе нашы трывогі, спадзяванні, расчараванні і нават няўдачы, як і смелы выхад паасобных літаратараў на тую паласу, дзе цяжка іншы раз разлічваць на забяспечаныя «тылы», на неадкладнае разуменне нават,— у рэшце рэшт будуць садзейнічаць станаўленню літаратуры па-сапраўднаму арганічнай і аналітычнай, але, можа, не без «шарму» лірызму; эпічнай і «міфалагізаванай», якая возьме нешта істотнае ад эсэістыкі і ад фальклору. Так, так, фальклор. Багдановіч некалі бачыў у ім адзін з магутнейшых сродкаў абнаўлення літаратурных структур. Для мяне ж, напрыклад, вялікія мажлівасці сучаснага звароту да багаццяў фальклорнага светаадчування, творчага падключэння іх да свядомага пошуку сучаснага мастака слова дэманструе творчасць нашага Рыгора Барадуліна — паэта па-сапраўднаму смелага ў набыцці новых сродкаў для выяўлення сучаснага зместу, у якім ёсць прытулак думцы пра нацыянальную самабытнасць самога слова. Думаю, не толькі мне сімпатычная такая пазіцыя Песняра і Майстра.

1985

«УСЕ ЖАНРЫ ДОБРЫЯ, АКРАМЯ СУМНАГА»

Клопат усялякага слова — знайсці найкарацейшы шлях да суразмоўніка, слухача, чытача. Зразумела, што і сродкі (жанр) уяўляюцца самымі «найкарацейшымі». Адзін сучасны французскі паэт (Рэнэ Шар) неяк сказаў: «Паэт на сваім шляху павінен пакідаць не доказы, а сляды». На доказы ў паэзіі проста не стае часу. Гэтым яна блізкая, дарэчы, музыцы. І, бадай, заўсёды хацела быць да яе яшчэ бліжэй. «О если б без слова сказаться душой было можно!» Гэта, здаецца, Фет. Але вось Цютчаў: «Мысль изреченная есть ложь». Цютчаў хацеў сказаць зусім не тое, што можна прыпісаць яму ў сэнсе нейкага агнастыцызму. Ён проста шкадаваў, як і старажытны філосаф, што нельга двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку. За час, які неабходны хаця б для вымаўлення слова, думка нашая шмат разоў паспявае пакідаць быццё-абалонку гэтага слова. Вада сцякае. Тут найвялікшая цяжкасць нават для паэта — сумясціць, так сказаць, суб'ект і аб'ект.

І недзе тут адказ, чаму сіла цэнтраімкнення (скажам, аднажанравасць) можа замяніцца на сілу цэнтрабежную: быццё імгнення не памірае, але, накладваючыся на далейшае імгненне (час), патрабуе ўдакладненняў і, зразумела, новых выхадаў у рэчаіснасць. Вось вам ужо і публіцыстыка, і проза, і крытыка, як заўгодна.

Магчыма, гэта трохі агульнавата, метафізічна, але пажаданая дыялектычнасць тут можа быць дасягнута толькі ў часе, хаця б жанравым.

Можна сказаць: усе жанры добрыя, акрамя сумнага. Але можна сказаць і іначай, як сказаў у свой, канкрэтна дарэвалюцыйны час наш Максім Багдановіч: «У нас цяпер усе жанры маюць сваю цану». Таму што ішоў працэс станаўлення новай беларускай літаратуры, працэс паскораны. Дарэчы, і паняцце паскоранасці ў дачыненні да літаратуры было ўпершыню, прынамсі, у нас уведзена тым жа Багдановічам, які быў не толькі паэтам, але і крытыкам. Вядома, калі на тое, радаводную гэтага паняцця можна весці і ад Г. Гачава, і ад В. Каваленкі — гэта як хочаце.

Можа ўзнікнуць пытанне, памагае ці замінае вопыт

крытыка, асэнсаванне «кухні пісання» стварэнню ўласна мастацкіх твораў?

Мне здаецца, памагае, хаця б у тым сэнсе, што перасцерагае ад спакусы браць штурмам адчыненыя дзверы.

Некалі існавала паняцце дасведчанага густу. Добры густ ацэначны, таму што крытычны, ён дастаткова шырокі, але не ўсяедны. Ён, як цяпер сказалі б, канструктыўны. Ён плённы. Алгебрай павяраюць гармонію не спачатку, а пасля. Ці, дакладней, у адзіным акце творчасці: так Пушкін пісаў вершы, спрабуючы варыянт за варыянтам, з пяром у руках. Ён пісаў, а не запісваў.

Крытыцызм, гэты погляд на сябе як бы збоку, гэты бакавы зрок, кантроль памагае потым зразумець і іншага пісьменніка, няхай ён нават творча і не блізкі табе. Але родніць нас у рэшце рэшт не майстэрства, не любоў да таго ці іншага прыёму, а жаданне гарманічнага цуду і «перла создания». У першую чаргу гэтай вернасці «тайнаму саюзу» заўсёды чакаеш ад крытыка, ад ягонай здольнасці зразумець, чаму Гейнэ або Глеб Успенскі маглі плакаць перад Венерай Мілоскай.

Сапраўдныя крытыкі рэдкая з'ява. Я рады, што ў нас ёсць сапраўдны крытык — Алесь Адамовіч. І зноў жа — не толькі крытык.

Крытык павінен быць публіцыстам, мастаком, літаратуразнаўцам. Вядома, гэта ў лепшым выпадку. Але тады ён будзе як мысліць літаратурным працэсам, так і перажываць яго. Тое і другое неабходна.

1985

ВУЗЕЛЬЧЫК НА ПАМЯЦЬ

Як ад сузірання начнога неба з яго невымерным, вусцішна-шапоткім і загадкавым жыццём у нейкі момант можа падацца, што вось зараз тая невымернасць раструшчыць, бы тая чалавечая нага якую-небудзь скарлупіну, ужо не толькі цябе, але і самую тваю свядомасць, так і ў зямным космасе нашага жыцця нам было б неверагодна няўтульна і вусцішна, каб не абдораныя былі мы пачуццем прыгажосці, наогул чалавечай здольнасцю ўпарадкоўваць як свет прадметны, так і свет дзейсных з'яў паводле шматлікіх адзнак паяднанасці, падобнасці і сувязі і, такім чынам, каб не займелі магчымасці чалавеку з чалавекам п е р а г у к н у ц ц а. Гэта ж на зямлі і дзеля зямлі адчута, а пасля і сказана, што з о р к а з о р ц ы г о л а с п а д а е, каб тым абяззброіць нашу вусцішнасць, нашу адзіноту пад агромністым сяйвом зорнага неба, што расхінаецца над намі ўначы як нейчы і аб нечым напамінак, а хутчэй за ўсё аб тым: няхай чалавек, як зорка зорцы, другому чалавеку голас падае! І больш нічога. Бо і гэтага даволі.

Перадад'ездны настрой бывае розны: паспешліва-хапатлівы, нудна-абыякавы, запаволена-роздумны. Нам выдаўся, бадай, апошні: так мы ад'язджалі з Ліменя. А мо лепей бы так сказаць пра сябе аднаго. Як бы бярэш нешта з сабой у дарогу, яшчэ не ведаючы, што пакідаеш тут назамен, а пакуль проста молішся няўзнак не запарушанай зайздрасцю жыццёвай удачы: памажы нам яшчэ калі-небудзь тут зноў, няхай хоць ва ўспамінах, а найболей памажы нам там, дзе будуць з намі гэтыя ўспаміны і яшчэ, можа, звыш таго.

Нешта пакідаю я тут, нешта бяжыць наўперад мяне па дарозе. Тутэйшае, яно ці не хоча, апярэдзіўшы, пазнаць мяне дома і адчыніць вароты.

У Мінску пазваню табе, дружа, каб падзячыць за радасць стрэчы з нечым неад'емна сваім, нашым, што там, у Ліменi, цярпліва чакала нас і, дзякаваць богу, не прачакалася. Наталіўшы, яно адпусціла нас, хочацца думаць, з лёгкім сэрцам, але наказала вяртацца сюды, можа, і з цяжарам на душы — па цудадзейныя

сваe лекі. Няхай будзе бласлаўлёная ўлада ўсяго роднага нам.

У рамане «Зямля» Чорнага дзядзька Тамаш расказвае сваім сябрукам Юрку і Клемуцю:

«— А гэта значыць, паехаў хлопец ваяваць, а яго забілі. Дык конь адзін без яго і прыбег дадому. Больш тысячы вёрст бег, а дадому трапіў. Прыбягае ён дадому, бачыць — вароты зачынены, у двор не ўвойдзе. Ён пацёрся мордаю ў акно, а маладая жонка таго хлопца, з якою ён пажыў усяго адзін дзень, не пускае таго каня ў двор. Кажа — калі ты нежывога яго не прывёз дадому, дык няма табе месца больш тут.

А конь разумее ўсё, ды, вядома, расказаць нічога не можа. Так стаіць і нудзіцца... Так і стаяў увесь час... пакуль тая маладая ламала рукі на ганку стоячы.

— Ну, а далей што?

— Далей у песні нічога не гаворыцца... Ну дык от і спяваецца: «Ах, мой божа, сівы конь стаіць».

А мне гэта, калі нядаўна перачытваў, нагадала радкі з Яніса Рыцаса:

...потому что звезду одиночеством
конь на холме
превосходит...

I яшчэ нагадалася, як конь вязе нябожчыка на апошняе его прыстанішча, а каня хто-небудзь са сталых людзей, не сваяк, вядзе пад вуздэчку. А кабетка нейкая ў натоўпе вяскоўцаў расказвае свой учорашні сон: «Ах, мой божа, сівы конь стаіць».

Купала ў мастацкіх сродках сваіх быў надзвычай і паслядоўна дэмакратычны, на свой, на беларускі, лад.

Ад мяне пайшла тады,
Як насталі халады:
Сцюжай выў я л о в ы плот,
Хохлік бегаў ля варот.

Што можа быць прасцей, празаічней і нават наіўней за гэта? Але ж чаму гэта ўражвае?

Відаць, можна гаварыць пра н а ц ы я н а л ь н а с ц ь эпітэта. Я л о в ы плот — гэта так па-беларуску, адразу ўяўляеш наш двор недзе ля ўрочышча са змрочнымі елкамі і сычамі. I гэты эпітэт тут не проста эпітэт, гэта — дэталь.

Ці не з трэцяга класа (тады, як мне цяпер здаецца, была цудоўная чытанка — у цвёрдых жоўтых корках, шыракаватая, таўсматая, з бела-шурпатай калянай паперай) — ці не з таго класа помніцца Багдановічава:

А вечарком мы выпускалі
Ў паветра белых галубоў:
Зрабіўшы некалькі кругоў,
У вышыню яны шыбалі,
Як чысты снег, кружылі там
І падалі на дахі к нам.

Тут можна было б і прадоўжыць цытату, але далей пра другое, і тое другое пасля яшчэ спатрэбіцца мне.

А пакуль што галубы.

Але ці былі тыя галубы? Былі, ды толькі надта сцярожкія, не бялюткія — дзікія, з тугім лопатам крылаў, імклівыя — прылятаді з лесу да сажалкі ў вёску — ці то напіцца, ці то яшчэ чаго. У рукі не тое што не даваліся, за трыццаць крокаў не падпускалі. А так хацелася злавіць і патрымаць у хаце. І з нейкай маркотай чыталася пра тых Багдановічавых, і з зайздрасцю:

Вясёла йшлі гулянкі нашы...—

быццам твае, вясковыя, былі сумнейшыя. Не былі, канечне!

Калі ж сачыўся беднаваты
Зор сініх свет праз небасхіл,
І уплятаўся вулак пыл,—
Мы ўсе пяялі каля хаты,
І напаўняў нягучны хор
Маркотнай песняй сціхлы двор.

А вось гэта было. Ну, можа, не столькі пяялі, як бегалі прыцемкамі вуліцай, пры месяцы, што купаўся ў туманным лузе за вёскай, пасля суцішваліся, міг маркоты нейкай находзіў, шкада развітвацца было.

Але на душы былі вялікія, аж страхоткія, замілаванасць і лагода, якія потым будуць успамінацца праз многа год — і так сабе, нечакана і не ў пару, можа, і тады хаця б, як прачытаеш пасля ў Блэйка:

Отголоски игры
Долетают с горы,
Оглашая темнеющий луг...
. . . .
— Дети, дети, домой—
Гаснет день за горой...

А я сёння думаю, як добра, што пра гэта прачытаў у Багдановіча — і раней. І што на ім толькі мая і Багдановічава мерка. Наша, першапачатковая.

На ялцінскіх могілках апошні прытулак Максіма Багдановіча і ўкраінца Сцяпана Руданскага, верш якога «Повій, вітре, на Вкраїну» стаўся народнай песняй.

На Багдановічавай пліце можна было б выбіць:

У краіне светлай, дзе
я ўміраю,
У белым доме ля сіняй
бухты...—

і далей цалкам усё гэтае журботнае, але і такое светлае чатырохрадкоўе.

На пліце ў Руданскага выбіта:

На могилі не заплаче
Ніхто в чужині,
Хіба хмаронька заплаче
Дощем по мені.

Кажуць, гэта трохі перайначаныя радкі з перакладу польскай песні, зробленага Сцяпанам Руданскім.

Ён пражыў 39 год. Сухоты. Рабіў доктарам у Ялце. Гады жыцця: 1834—1873. Імя ягонае перакладалася з грэчаскай мовы як «вянок». Такая ж была назва і адзінай прыжыццёвай кнігі Багдановіча.

Пра Гамера нехта сказаў, што ён не-не ды і прымгне вока над сваёй «Іліядай», а ў Талстога пракінулася слова пра «соринки» на паверхні крынічнай вады, якія адно падкрэсліваюць крышталёвую чысціню і непараўнальны холад той вады. «Соринок» у тэкстах самога Талстога не так і мала, пра іх згадвалася неаднойчы, ды бадай і кожны збольшага ўважлівы чытач ведае ім свой лік. Ну, кшталтам таго, што ў першай частцы «Уваскрэсення» судовы пратакол называе Масලаву Кацярынай Іванаўнай, а палітычныя ссыльныя ў частцы трэцяй завуць яе Кацярынай Міхайлаўнай. Талстой, як і перапісчыкі ці рэдактары, не заўважыў памылкі. Але больш цікавыя «неахайнасці» іншага парадку.

Талстой піша: «Слушая соловьев и лягушек, Нехлюдов вспомнил о музыке дочери смотрителя, вспомнив о смотрителе, он вспомнил о Масловой, как у нее, так же, как кваканье лягушек, дрожали губы,

когда она говорила: «Вы это совсем оставьте». Канечне, кожны рэдактар прычапіўся б тут не толькі да гэтага «кваканья лягушек», але і да няўклюдных «вспомнил-вспомнив-вспомнил», як і да не менш няўклюднай «музыки дочери смотрителя». У Талстога гэта «прайшло» — не ў суцяшэнне нам, а дзеля таго, можа, каб не забываліся, што мы не Талстыя, што ў нас такое «не пройдзе». І добра. Каб мы больш, разам з тым, дзівіліся магутнай выяўленчай сіле Талстога, роўнай хіба Гамеравай. Каб мы помнілі пра вочы Маславай, якія параўнаны са свежымі вільготнымі парэчкамі, каб неадлучнай ад нашага ўспрымання была іх раскосасць. Каб успаміналі, што Чэхаў у нейкім лісце, як на прыклад талстоўскага «ясновидения», спасылаўся на Карэніну, што бачыла ў цемрадзі свае вочы! Чэхаў, захапляючыся, гаварыў непрытворна: «Ён мяне палохае!» (А, здаецца, пра Леаніда Андрэева Талстой аднойчы выказаўся: «Ён палохае, а мне не страшна!»)

Не дзіўна, што Талстой разумеў навізну чэхаўскага пісьма. Пра гэта ёсць, калі не памыляюся, у ягоным нейкім інтэрв'ю пасля смерці Чэхава. Нешта наконт таго, што Чэхаў вынайшаў зусім новыя спосабы пісьма. Захапляўся другім разам тым, як паказаны ў Чэхава «У яры» адзін стары, той, што суцяшае Ліпу, у якой памерла дзіця,— той стары выглядае ў пісьменніка адначасова як дуркаваты і як святы. Ці не Чэхава ўспамінаў Талстой, калі пісаў сваіх «блаженных» ва «Уваскрэсенні» — эпізод на пароме (ч. VI, XXI)?

Бунін, напрыклад, заўсёды папракаў Талстога за грувасткасць стылю, мерыўся нават перапісаць «Карэніну» паводле свайго (і агульнапрынятага) разумення літаратурнай стылістыкі. Цікава, між іншым, было б.— Не ўзяўся.

Дэталь. Параўнанне. Аздобка літаратурная. Тут вялікая спакуса загаварыць прыгожа.

У рускага празаіка (харошага) С. Нікіціна: «На фоне темного ельника стояла одна-единственная березка — вся желтая и сквозная, и ветер уже рвал с нее первые листья, кидая на суровые ели, точно награждая их золотыми медалями за стойкость перед будущими холодами». (Разрадка мая.— *М. С.*) І так гэта кепска, што вачам

сваім не паверыў, а потым балюча стала. Быццам прачытаў «паэтызм» з дрэннага верша пачатку пяцідзесятых гадоў.

Як цяжка нават і таленавітаму мастаку быць арыгінальным у сваім пісанні. Вось і я, здаецца, завяршыў пад Прышвіна, ягоным словам — «писание».

Зноў дэталь. У Макса Фрыша — у «Мантоку». Ён — герой — пасля ночы блізкасці з каханкай як бы мімаходзь адзначае сабе, «спадзяецца, што ў сне не хроп». І далей думае пра нешта падобнае. Вось такая дробязь. А мне падумалася, як часта мы абыходзім вось такія дробязі, якім у мастацтве няма цаны. Каторы наш аўтар ці проста не звярнуў бы ўвагу на такое (банальна, дробязна!), ці такое, каб напісалася, выкрасліў бы маральна пільны рэдактар. Бо такое часам наша разуменне маральнасці і мастацкасці.

1982, 1985

ЗМЕСТ

Алесь Адамовіч. Міхась Стральцоў — учора і заўтра 3

I

АПАВЯДАННІ

Трыпціх

Трывожна крычыць птушка 10
Жураўліная песня 14
Падарожжа за горад 15

Дома 18
Пасля завірухі 21
Восеньскі ўспамін 29
Двое ў лесе 37
Волька 49
Перад дарогай 66
Блакітны вецер 74
На вакзале чакае аўтобус 80
Там, дзе зацішак, спакой 91
Сена на асфальце 100
Добрае неба 115
На чацвёртым годзе вайны 125
Што будзе сніцца 132
Роздум 135
I зноў, зноў горад 136
Свет Іванавіч, былы донжуан 145
Смаленне вепрука 173
Дзень у шэсцьдзесят сутак 182

АПОВЕСЦІ

Адзін лапаць, адзін чунь 220
Загадка Багдановіча 260

II

З кнігі «ЯДЛОЎЦАВЫ КУСТ» (1973)

Шчаслівая хвіліна 338
Мажорнае 338
*** Уздыхае мора, калышучы ўлонне хваль... 339
*** Разбіраюць барак пад маім акном... . 339
Мокрае дрэва 340
Эпіграф 340
*** Неспадзяванкі чакаеш... 340
*** Новы дзень. Вітаю новы дзень... . . 341
*** Такая цёплая вада... 341
*** Хачу я з тым, з маленства хлапчуком... 341
Глухата 342
Засцярога 342
*** Ты пайшла... 343
*** І нехта з горачкі спускаўся... 343
*** Ты — сяло, і я — сяло... 343
*** Мяне пакінула ў пакоі... 344
Эпіграма 344
*** Трамвай, як сараканожка... 345
*** Ноччу, тым часам, як спаў... 345
Лета. Ноч 345
На адпачынку 346
*** Жыць у суседстве дрэў, і траў, і купін... 346
*** Мне спавядаўся чалавек... 347
На аўтобуснай станцыі 347
Конскі базар 348
Летняй ноччу пад зорным небам 348
Пра мудрасць 349
Нервы 349
*** Цяжар душы — цяжар паднебных хмар... 350
*** Неўладкаваным быць паэт павінен... . 350
*** Не было... 350
Партрэт 351
Халадзільнік 351
Помста 352
Празарэнне 352
*** З дрэў... 353
*** Прысніўся верш — не верш, а два радкі... 353

Скончылася лета 353
Размова з часам 354
*** О як я вернасці баюся... 354
Жаўтацвет 355
Замест санета 355
*** Які прастор!.. 356
Плач па Гарсія Лорку 356
*** І безуважна, як пятак... 357
*** У горадзе... 358
*** І зняверваўся колькі, і колькі разоў... 358
*** Ты — ты, якую не спазнаў... 359
*** Згасаеш? Ну, згасай! Навошта варушыць... 360
Непагодлівы дзень у гарах 360
*** І зноў цябе заву... 361
*** Над словам і над гукам... 362
*** Яны талмудзяць і глякуюць... 362
Фальклорная экспедыцыя 362
*** Памыўся снегам ён... 363
Партрэты 363
З народнага 364
*** Зіма. Навошта сумаваць... 365
*** Над комінам дым — журба... 365
Месяц люты 366
На адыход зімы 367
Другая вясна 369
*** Прайшло, мінулася, як дым... 370
*** Абнаўлення хачу я, хачу абнаўлення!.. 370
Ода прозе 371

З кнігі «ЦЕНЬ АД ВЯСЛА» (1979)

*** Так! Пад ценем вясла... 372
*** Паяднай пачатак і канец... 373
*** Гэтым дрэвам вясёла шумець!.. . . . 373
Адгалоскі 374
*** Надыходзіць пара... 375
Учынак 375
*** Стамляецца нават метал... 376
*** Усім сказаць: была, была бамбёжка... 376
Партызанская гармата 376
Эпітафія 377
*** На міг здалося: век пячорны... . . . 377
Цыклопы 378
З дарогі 379

Позніцца вясна 379
*** Напярэймы нягодзе... 380
Жанчына ў акне 380
*** Мне звышнадзённай тэмы не падняць... 381
Першы снег 381
*** Ты пачакай. Навошта гэта?.. 382
*** Бывае ўсё-такі зайздросна... 382
Ускраіна. Мясакамбінат 383
І тады... 384
*** Вось тут, далёка ад сталіцы... 384
*** Як палягчэлі ў дрэваў кроны!.. . . . 385
*** У самых дальніх, дальніх гарадах... . 385
Балада вуліцы 386
Вяртанне з работы 387
Размовы 388
Думаў яшчэ нядаўна 389
*** А ў сне было, а ў сне было... 389
Вечаровае 390
Вяртанне 390
Два вершы 391
Вечаровы ўспамін пра Сож 393
*** А была, толькі хмарка была... 393
Накцюрн 394
Бывай! 394
*** Вунь і яно, успамінаў лісцё... 396
*** Пахмурным гэтым днём успомні... . . 396
*** Ну, а нам — сумненні вечарам... . . . 396
Лесавік 397
Маўчанне 398
Пейзаж са старадворышчам 398
Ранак 399
*** А ты сэрца мне... 399
*** Як пàлі белыя снягі... 400
Калі надзею хаваў... 400
Асацыяцыя 401
*** У зелянковых фарбах неба... 401
*** А мо чакаў я гэтага званка... 402
*** Мой дзень брыдзе дрымотнай каляінай... 403
Снег пры сонцы 403
*** Бяда знянацку налучыла... 404
*** Жыццё, жыццё... Не першы, не апошні... 404
Гэтае дрэва 405

З кнігі «МОЙ СВЕЦЕ ЯСНЫ» (1986)

Перад новай старонкай 406
Пачатак 406
*** Хто гадаваўся ў цішы дрэў... 408
Бацькаўшчына 409
Купала 409
Крынічка 410
На стозе бусел 410
Міцкевіч на Беларусі 411
Лявоніха 411
*** І рытмы тыя, ды ўжо лад... 412
*** Шчэ не пачаліся вятры... 413
*** Адвячоркам круціцца пласцінка... . . 413
*** Я не скажу, нібыта... 414
Два подступы да верша 415
*** Я на каханне і любоў... 417
Самалёцік-верталёцік 418
Бальніца ў полі 418
Экспромт 419
*** Не сумую сягоння: навошта?.. 420
*** Развагай сталае пары... 420
*** Чаму так згадваем былое... 421
*** Хоць ад пары, калі мяне... 421
*** А фотаздымак на стале... 422
*** Пабудзі мяне рана-раненька... 423
*** Напэўна, гусі на бяду... 424
*** Імгненні ёсць пакутлівага шчасця... . 425
*** Кіну, рыну — пакіну... 425
Сон 426
*** Пра што пісаць, і як пісаць, і дзе?.. . 426
*** — Пара асвойтаць і прагрэс... 426
Шматсерыйнае кіно 427
Фаэтон 428
Прыехаў сябра 429
*** Без парывання, без жадання... 429
*** Яшчэ не верачы зусім... 430
*** Вада асенняе крыніцы... 431
*** Пад шоргат кропель дажджавых... . . 431
*** За вёскаю, на адзіноце... 432
*** Вось гэта музыка сама... 433
Снежань 433
*** Цень-цень сініца! Добры дзень!.. . . . 434
Акварэлі 435
Прадвесне 436

*** Халодны дождж — не даспадобы вільгаць... 436
*** Снег асядае. І заспаны лес... 437
*** Ускраіна абвалаклася дымам... 437
Супакаенне 437
*** А будзе час, калі і без нагоды... . . 438
Разам з людзьмі 439
*** Калі стаяў на гэтай кручы... 439
Заўваж сабе 440

III

ЭСЭ

Дудар беларускі 442
На пачатку ўсіх пачаткаў 448
Шырокасць 459
Ад роднае зямлі 463
Чалавек з Малой Багацькаўкі 472
Слова ўдзячнасці 487
І жыццём і песняй 493
Адказ на анкету 497
Забыць — небяспечна 501
З плеяды першых 506
Спадчыннасць 513
Паклон з дарогі 518
Мужнасць да канца 523
Не іначай як подзвіг душы 526
Часоў былых і новых сувязь 528
Служэнне 535
Разам з людзьмі 544
Ад маладзіка да поўні 551
Вясёлка і стрэчны вецер 573
Свята ў будзень 580
Дзяцінства, якое мы помнім 588
Сёння: учора і заўтра 589
«Усе жанры добрыя, акрамя сумнага» . . 594
Вузельчык на памяць 596

Стральцоў М.

С 83 Выбранае: Проза, паэзія, эсэ./[Прадм. А. Адамовіча].— Мн.: Маст. літ., 1987.— 607 с., 1 л. партр.

Чытача беларускага і ўсесаюзнага прыцягвае шматграннасць таленту Міхася Стральцова. Празаік, паэт, эсэіст, даследчык імклівай плыні роднай і ўсесаюзнай літаратуры заўсёды ў пошуку, заўсёды ў клопатах пра заўтрашні дзень нашага слова.

У кнігу выбранага ўвайшлі апавяданні, аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь», «Загадка Багдановіча», вершы са зборнікаў «Ядлоўцавы куст», «Цень ад вясла», «Мой свеце ясны», літаратурна-крытычныя эсэ.

С $\frac{4702120200-141}{М 302(03)-87}$ 110—87 ББК 84 Бел 7

МИХАИЛ ЛЕОНТЬЕВИЧ СТРЕЛЬЦОВ

Избранное

Проза, поэзия, эссе

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Г. В. Роліч. Мастак В. П. Масцераў. Мастацкі рэдактар А. І. Цароў. Тэхнічны рэдактар А. Б. Барадзіна. Карэктар Л. Т. Калюжная.

ІБ № 2797

Здадзена ў набор 21.11.86. Падп. да друку 10.09.87. АТ 07681. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 31,92+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 32,45. Ул.-выд. арк. 31,85. Тыраж 10 000 экз. Зак. 3083. Цана 2 р. 50 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.